**Установа адукацыі**
**“Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”**

**А.М. Вабішчэвіч**

# НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

МАНАГРАФІЯ

Брэст 2008

УДК 94(476) “1921/1939”
ББК 63.3(4 Беи)
В 12

*Рэкамендавана да друку рэдакцыйна-выдавецкім саветам*
*установы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”*

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар,
гал. навук. супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Рэспублікі Беларусь
ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”
**У.І. Навіцкі**

доктар гістарычных навук, прафесар,
загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі
УА “Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны”
**Р.Р. Лазько**

*Навуковы рэдактар:*
доктар гістарычных навук, акадэмік,
гал. навук. супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці
ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”
**М.П. Касцюк**

**Вабішчэвіч А.М.**
В-12 Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія / А.М. Вабішчэвіч ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : Выдавецтва БрДУ, 2008. – 319 с.
ISBN

У манаграфіі даследуецца культурнае жыццё беларусаў і іншых этнічных супольнасцей у заходняй частцы Беларусі ў 1921–1939 гг. Аўтар прааналізаваў айчынную і замежную гістарыяграфію, выклаў асноўныя пытанні праблематыкі (дзяржаўна-прававыя механізмы, адукацыя, беларускі культурна-асветніцкі рух, гісторыка-культуралагічныя даследаванні, рэлігійныя і мастацкія каштоўнасці ў духоўным жыцці заходнебеларускага грамадства, культура этнічных супольнасцей (палякаў, яўрэяў, рускіх, украінцаў, літоўцаў, татараў) і інш.).

Выданне адрасуецца выкладчыкам ВНУ, аспірантам, студэнтам, настаўнікам сярэдніх навучальных устаноў.

**УДК 94(476) “1921/1939”**
**ББК 63.3(4 Беи)**

**ISBN**

# ЗМЕСТ

Уводзіны ........................................................................................... 4

Глава 1 Палітыка польскіх улад у галіне культуры і асветы этнічных супольнасцей: ідэалагічныя і тэарэтычныя пастулаты, прававыя падставы, механізмы рэалізацыі…...................................... 12

Глава 2 Беларуская культура ў Польскай дзяржаве
2.1 Адукацыя і культурна-асветніцкі рух як сродкі этнічнага самазахавання беларусаў…................................................................ 37
2.2 Гісторыка-культуралагічныя даследаванні беларускай спадчыны.......................................................................................... 64
2.3 Нацыянальна-культурная праблематыка ў канфесійным жыцці беларускага насельніцтва.......................................................... 88
2.4 Мастацкія каштоўнасці ў сацыякультурнай прасторы беларусаў 122

Глава 3 Польская культура ў заходнебеларускіх землях
3.1 Спецыфіка становішча польскай супольнасці…………………… 142
3.2 Польскае грамадска-культурнае жыццё…..................................... 149

Глава 4 Культурна-асветніцкае жыццё нацыянальных меншасцей
4.1 Грамадска-культурная дзейнасць яўрэйскай супольнасці……..... 182
4.2 Культура і асвета славянскіх меншасцей – рускіх і ўкраінцаў…. 204
4.3 Дзейнасць літоўскіх грамадскіх і асветніцкіх арганізацый…………………….................................................... 234
4.4 Грамадска-культурная дзейнасць татараў..................................... 248

Заключэнне ………………………………………………………..…… 261

Бібліяграфічны спіс ……………….................................................. 265

Пералік умоўных абазначэнняў…………………………………….. 319

# УВОДЗІНЫ

Заходнебеларуская праблематыка 1920 – 1930-х гг. ужо заняла трывалае месца ў айчыннай гістарыяграфіі. Яе распрацоўка ажыццяўлялася ў рамках некалькіх этапаў, якія адрозніваліся паміж сабой грамадска-палітычнымі абставінамі, навукова-метадалагічнымі падыходамі, наяўнай і даступнай базай гістарычных крыніц. Першыя працы па заходнебеларускай тэматыцы з’явіліся яшчэ ў даваенныя дзесяцігоддзі. Камісія АН БССР па вывучэнню Заходняй Беларусі, Інстытут польскай пралетарскай культуры, Інстытут гісторыі рабілі акцэнт на даследаванне сацыяльна-эканамічнага, палітычнага становішча краю ў складзе Польшчы, дзейнасць рэвалюцыйна-дэмакратычных партый і арганізацый. Толькі ў нешматлікіх публікацыях закраналіся асобныя аспекты асветніцкага, рэлігійнага жыцця [474; 461]. Аднак у тагачасных умовах была выключана магчымасць аб’ектыўнага вывучэння пытанняў нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускага краю. Выдадзеныя тады працы мелі характар прапагандысцкай літаратуры.

Тэндэнцыйнымі і павярхоўнымі былі работы польскіх аўтараў міжваеннага часу, што было выклікана наступствамі ўрадавай нацыянальнай палітыкі Польшчы і існуючымі грамадскімі стэрэатыпамі. Вывучэнне нацыянальных меншасцей, да якіх залічвалі і беларусаў, дыктавалася неабходнасцю высвятлення іх рэальнага становішча і выпрацоўкі канкрэтных механізмаў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне міжнацыянальных адносін. Інстытут даследавання нацыянальных спраў (Instytut badań spraw narodowościowych), які падтрымлівала МУС Польшчы, вынікі сваіх даследаванняў змяшчаў на старонках часопіса “Sprawy narodowościowe” (“Нацыянальныя справы”). Пытанні этнакультурнага жыцця заходнебеларускіх зямель ускосна закраналіся ў працах К. Сракоўскага [1128], Л. Васілеўскага [1182], С. Елскага [865], З. Урбанскага [1168] і іншых польскіх аўтараў. Вывучэннем займаліся таксама некаторыя навукова-даследчыцкія ўстановы, ВНУ, асобныя вучоныя. Польскія выданні таго часу, якія мелі пераважна ідэалагічна-прапагандысцкі характар, змяшчалі інфармацыю пра ўстанаўленне адміністрацыйнага апарату, разгортванне польскай адукацыі, узнікненне грамадскіх, культурна-асветніцкіх арганізацый і ўстаноў.

Заходнебеларуская праблематыка стала важным напрамкам беларускай савецкай гістарыяграфіі ў канцы 1950-х – 1980-я гг. Прыярытэтнае значэнне ў працах А.М. Мацко, П.І. Зялінскага, У.Ф. Ладысева, У.А. Палуяна, І.В. Палуяна і іншых вучоных у гэты час надавалася даследаванню рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў Заходняй Беларусі, асабліва КПЗБ. Пануючая метадалогія не дазваляла праводзіць

аб'ектыўныя даследаванні па шэрагу пытанняў заходнебеларускай праблематыкі. Хоць фрагменты культурнага жыцця Заходняй Беларусі паказваліся ў многіх манаграфіях, дысертацыях, аднак толькі ў асобных з іх аб'ектам вывучэння з'яўлялася заходнебеларуская культура і асвета. Г.Р. Сянкевіч у дысертацыі [606] і асобных публікацыях аналізавала стан адукацыі. У.А. Палуян адлюстраваў структуру ТБШ, асноўныя напрамкі яе дзейнасці і ідэйна-палітычную платформу ў кантэксце развіцця рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху Заходняй Беларусі 1927–1939 гг. [570]. С. Говін асвятляў гісторыю заходнебеларускага друку [95]. Сярод гісторыка-біяграфічных прац вылучаліся манаграфі А.С. Ліса пра Б. Тарашкевіча, Я. Драздовіча, П. Сергіевіча [443–445]. Дзейнасць рымска-каталіцкай царквы ў Заходняй Беларусі закранался ў манаграфіі Я.Н. Мараша [459]. Нягледзячы на ідэалагічныя абмежаванні, недаступнасць многіх архіўных матэрыялаў, гісторыкі БССР увялі ў навуковы абарот шырокае кола дакументальных крыніц, успамінаў. Менавіта ў канцы 1950-я – 1980-я гг. у айчыннай гістарыяграфіі былі выпрацаваны канцэптуальныя высновы па заходнебеларускай тэматыцы.

У гістарычнай навуцы ПНР на працягу некалькіх пасляваенных дзесяцігоддзяў не займаліся заходнебеларускай праблематыкай. Перашкодай з'яўляўся абмежаваны доступ да архіўных крыніц, якія знаходзіліся пераважна ў БССР, а таксама прызнанне прыярытэту ў вывучэнні гэтых пытанняў за беларускімі савецкімі гісторыкамі [900, с. 18]. Беларуская праблематыка міжваеннай Польшчы стала даследавацца польскімі вучонымі толькі з 1970-х гг. Тэарэтычнае асэнсаванне беларускай гісторыі ў польскай гістарычнай навуцы пачалося з прац А. Бергман. Сярод іх трэба адзначыць біяграфічнае даследаванне пра Б. Тарашкевіча, куды былі ўключаны яго біяграфія, аналіз творчай, навуковай і грамадска-палітычнай дзейнасці [810] (беларускі пераклад кнігі быў выдадзены ў Мінску ў 1996 г. [64]). У апублікаваных у розных выданнях артыкулах А. Бергман аналізавала спадчыну І. Дварчаніна, М. Бурсевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, У. Самойлы, А. Луцкевіча і іншых дзеячаў заходнебеларускай культуры. Намаганнямі Беластоцкага навуковага таварыства адрэдагаваныя работы А. Бергман выйшлі ў 1984 г. асобным зборнікам [811].

Вывучэнню нацыянальнай палітыкі ІІ Польскай рэспублікі былі прысвечана праца А. Хайноўскага [837]. Урадавую палітыку адносна беларусаў у 1919–1926 гг. аналізаваў у сваёй дысертацыі Ю. Пацук [1063]. Палітыкай польскіх улад адносна праваслаўнай царквы, украінскай праблематыкай займалася М. Папежынска-Турэк [1067–1068].

Акрамя беларускага насельніцтва міжваеннага часу, аб'ектам даследаванняў польскіх гісторыкаў з'яўляліся і іншыя этнічныя

супольнасці – украінцы, яўрэі, літоўцы, татары. I хоць іх культурнае жыццё на тэрыторыі Заходняй Беларусі разглядалася пераважна эпізадычна, фрагментарна, у кантэксце працэсаў, што адбываліся ва ўсёй II Польскай рэспубліцы, без вылучэння адметнасцей культурнага жыцця этнічных супольнасцей заходнебеларускіх зямель, аднак гэта адрознівала польскую гістарыяграфію ад беларускай савецкай, дзе не згадваўся поліэтнічны характар заходнебеларускай культуры і прытрымліваліся беларусацэнтрычнай тэматыкі. Акрамя таго, многія з гэтых польскіх выданняў абапіраліся на шырокае кола крыніц. У прыватнасці, пытанні асветы нацыянальных меншасцей разглядаліся ў працах С. Мауэрсберга [1030], М. Іваніцкага [906–907]. Актыўна займаўся згаданай праблематыкай Е. Тамашэўскі [1156]. Адзінай навукова-даследчыцкай установай, якая займалася яўрэйскай праблематыкай не толькі ў ПНР, але і ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, быў заснаваны ў Варшаве ў 1947 г. Яўрэйскі гістарычны інстытут (Żydowski instytut historyczny). У 1970-я – 1980-я гг. там былі падрыхтаваны М. Фуксам і іншымі вучонымі працы па адукацыі, друку яўрэяў міжваеннай Польшчы [1220, с. 16–22]. Істотны ўклад у распрацоўку яўрэйскай праблематыкі зрабіў сваёй манаграфіяй Е. Тамашэўскі [1160]. Сур'ёзным даследаваннем літоўскага пытання займаліся П. Ласоўскі, Б. Макоўскі і іншыя польскія навукоўцы. Стан адукацыі, дзейнасць літоўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый на тэрыторыі Віленшчыны знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі Б. Макоўскага [1018] (пазней у Вільнюсе быў выдадзены і літоўскамоўны варыянт [1017]). А. Міскевіч у сваёй рабоце прааналізаваў навуковую, культурна-асветніцкую і рэлігійную дзейнасць татараў [1044]. Хоць усе згаданыя польскія даследаванні па гісторыі і культуры этнічных супольнасцей вылучаліся тэматычнай навізной, базай крыніц, аднак яны былі пазбаўлены матэрыялаў з архіваў Беларусі, не давалі агульнага ўяўлення аб нацыянальна-культурным жыцці ў заходнебеларускіх землях.

У 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст. беларуская праблематыка ў Польшчы набыла большую тэматычную разнастайнасць, тэарэтычнае асэнсаванне. Для польскіх гісторыкаў істотна аблегчыўся доступ да дакументаў, што захоўваюцца ў архіўных установах Рэспублікі Беларусь. Актывізавалася супрацоўніцтва беларускіх і польскіх даследчыкаў у ходзе навуковых канферэнцый і семінараў, пры выданні навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Сярод прац беларускай тэматыкі трэба адзначыць даследаванні К. Гамулкі. У асобнай манаграфіі [888] і шэрагу артыкулаў даследчыца закранула асноўныя бакі жыцця беларусаў у міжваеннай Польшчы, дала абгрунтаваную ацэнку ўрадавай нацыянальнай палітыкі. Грамадска-культурная дзейнасць беларусаў і іншых этнічных супольнасцей раскрыта ў агульным плане ў манаграфічных даследаваннях

Р. Дамброўскага [845], М. Іваніцкага [908], Я. Тышкевіча [1166] і іншых аўтараў. Беларускамоўныя выданні, творчая спадчына асобных заходнебеларускіх дзеячаў былі аб'ектам вывучэння Ю. Туронка [1165; 661–662].

Асаблівай увагі заслугоўваюць выданні Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку. Яны падрыхтаваны на падставе польскіх, беларускіх, літоўскіх і іншых архіўных крыніц. Такі метадалагічны падыход назіраецца на прыкладзе прац Я. Міраповіча [464; 1040], шматлікіх біяграфічных нарысаў А. Глагоўскай аб прадстаўніках заходнебеларускай інтэлігенцыі [93–94; 886]. На старонках часопіса "Białoruskie zeszyty historyczne" ("Беларускі гістарычны зборнік") асобныя аспекты праблематыкі закрануты таксама М. Семакевічам, М. Мароз і іншымі даследчыкамі. Пытанні дзейнасці паліцэйска-адміністрацыйных органаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі асвятляюцца ў працах В. Сляшынскага [616; 1147]. Разнастайныя аспекты культурнага жыцця на беларуска-польскім памежжы вывучаюць даследчыкі універсітэта, навуковых устаноў Беластока Е. Мілеўскі, Г. Маецкі, А. Бабовік, А. Смалярчык і іншыя.

Публікацыі, дзе закранаюцца розныя аспекты жыцця заходнебеларускага грамадства 1920–1930-х гг., узгадваюцца імёны вядомых грамадскіх, культурных дзеячоў, параскіданы па многіх часопісах і газетах беларускай дыяспары. Яны даволі розныя па свайму характару (ад успамінаў, артыкулаў, прымеркаваных да пэўных угодкаў, да сур'ёзных навуковых прац), глыбіні разгляду пэўнай праблемы. Нярэдка ў іх утрымліваюцца арыгінальныя дакументальныя матэрыялы. Грамадска-царкоўнае жыццё праваслаўнай супольнасці Заходняй Беларусі міжваеннага часу закранута ў манаграфічных даследаваннях І. Касяка [404], А. Мартаса [460], артыкулах Л. Гарошкі і іншых прадстаўнікоў беларускай дыяспары. У адрозненне ад беларускай савецкай гістарыяграфіі аўтары з асяроддзя беларускага замежжа мелі іншыя канцэптуальныя падыходы і палажэнні ў асвятленні пытанняў заходнебеларускай праблематыкі. Недаступнасць архіўных крыніц з БССР нярэдка перашкаджала навукоўцам беларускай дыяспары праводзіць узважлівы, усебаковы аналіз падзей і асоб, адыйсці ад адзназначных ідэалагізаваных ацэнак. Сярод прац прадстаўнікоў беларускага замежжа сучаснага перыяду неабходна адзначыць гісторыка-біяграфічныя брашуры Л. Луцкевіча пра дзеячаў беларускай культуры ў Вільні, гісторыка-рэлігіязнаўчыя даследаванні А. Надсана [477–478] і іншых аўтараў.

У заходняй гістарыяграфіі толькі адзінкавыя працы былі прысвечаны беларускай гісторыі [1173]. Палітыку Польскай дзяржавы міжваеннага часу адносна нацыянальных меншасцей вывучаў С. Хорак. Больш актыўна

распрацоўвалася яўрэйская тэматыка – у ЗША (у асобных універсітэтах, Інстытуце яўрэйскіх даследаванняў у Нью-Йорку [359], сярод якіх былі працы па гісторыі яўрэйскай адукацыі ў міжваеннай Польшчы [864; 866]), Германіі [1025], Францыі [1038], Ізраіле, дзе друкаваліся матэрыялы па гісторыі асобных яўрэйскіх абшчын, энцыклапедычныя выданні [413], у тым ліку шматтомная “Encyklopaedia Judaica” (“Энцыклапедыя іудаікі”).

З канца 1980-х – 1990-я гг. у айчыннай гістарыяграфіі пачаўся якасна новы этап у распрацоўцы гісторыі Беларусі і заходнебеларускай праблематыкі ў прыватнасці. Гэта звязана з пазітыўнымі зменамі ў метадалогіі даследаванняў, выяўленнем і ўвядзеннем у навуковы абарот новых масіваў крыніц. Новыя канцэптуальныя падыходы знайшлі адлюстраванне ў калектыўных выданнях [88–89; 479]. Разам з прадстаўнікамі старэйшага пакалення (П.І. Зялінскім, У.Ф. Ладысевым [432–434], Р.Р. Лазько [435–437], У.М. Конанам [406], І.І. Коўкелем [410], І.П. Крэнем, А.С. Лісам, В.М. Чарапіцай [705–706] інш.) тэматычны дыяпазон нацыянальна-культурнага жыцця Заходняй Беларусі пашыраюць і паглыбляюць у сваіх працах маладыя даследчыкі – В.В. Даніловіч [105], А.М. Загідулін [357], А.М. Кротаў [416], В.І. Крывуць [415], Э.А. Мазько [455], А.В. Пашкевіч, В.Э. Рабышка [588], А.М. Свірыд [602], І.І. Трацяк [658], І.У. Цітовіч [679], А.М. Чарнякевіч, В.Р. Швайко [714] і іншыя. Асобныя аспекты грамадска-культурнага жыцця закрануты ў даследаваннях акадэміка НАН Беларусі М.П. Касцюка [403], А.А. Гужалоўскага [102]. Для даследавання грамадска-культурнага жыцця польскай этнічнай супольнасці карысным з’яўляецца даследаванне А.Ф. Смалянчука [617]. У манаграфічнай працы пад рэдакцыяй У.І. Навіцкага [399, с. 199–216] зроблены агляд канфесійнага жыцця ў Заходняй Беларусі. Пытанні захавання этнічнай культуры закранаюцца В.А. Лабачэўскай [426]. У працах па гісторыі беларускіх татараў, напісаных аўтарытэтным вучоным І.Б. Канапацкім [396–398] утрымліваюцца звесткі аб рэлігійна-асветніцкай дзейнасці асобных мусульманскіх абшчын у Заходняй Беларусі. У агульным кантэксце гісторыі Беларусі ХХ – пачатку ХХІ ст. разглядаецца татарская праблематыка ў працы Л.М. Лыча [453]. Цікаўнасць уяўляюць і манаграфічныя выданні Э.Р. Іофэ, а таксама яго артыкулы па гісторыі беларускіх яўрэяў [387–388].

У сучаснай расійскай гістарычнай навуцы заходнебеларуская праблематыка закранаецца пераважна пры вывучэнні савецка-польскіх адносін. Некаторыя аспекты культурнага жыцця беларусаў у міжваеннай Польшчы (дакументальныя помнікі, праваслаўную літаратуру, культуру) вывучаюць Ю. Лабынцаў і Л. Шчавінская [429–431]. Толькі ў агульным

кантэксце гісторыі культуры рускага замежжа міжваеннага часу разглядаецца культурнае жыццё рускіх эмігрантаў у Польшчы [589].

Сучасныя ўкраінскія гісторыкі асаблівую ўвагу звяртаюць на складаныя праблемы польска-ўкраінскіх адносін міжваенага перыяду [1082]. Узважлівымі ацэнкамі вылучаецца "Гісторыя Польшчы", напісаная Л. Зашкільняком і іншымі львоўскімі даследчыкамі [373]. Так як у савецкі перыяд украінскія гісторыкі мелі абмежаваныя магчымасці для вывучэння нацыянальна-культурнага жыцця (гэтым займаліся актыўна прадстаўнікі ўкраінскай дыяспары ў Канадзе, ЗША), то ў сучасных умовах актыўна распрацоўваюцца пытанні культуры і асветы ўкраінцаў. Дзейнасць таварыства "Просвіта" на тэрыторыі Заходняй Украіны разглядаецца ў манаграфіі і асобных публікацыях І.С. Зуляка [375–376]. Украінская культурна-асветніцкая дзейнасць у рэгіёне беларускага Палесся там фактычна не разглядаецца.

У літоўскай гістарыяграфіі ўваходжанне Віленшчыны ў склад Польшчы яшчэ з міжваеннага часу адназначна ацэньвалася негатыўна для нацыянальна-культурнага жыцця мясцовага літоўскага насельніцтва. Такія ацэнкі захоўваюцца пераважна і ў сучасных даследаваннях [374]. Дзейнасці літоўскіх школ і чытальняў на Віленшчыне прысвечана праца В. Марцінкенаса [1027]. Пераасэнсаванне розных аспектаў польска-літоўскіх узаемаадносін прысутнічае ў публікацыях А. Каспяравічуса. Літоўскія даследчыкі звярталі ўвагу пераважна на культурна-асветніцкае, рэлігійнае жыццё на тэрыторыі, якая знаходзіцца зараз у межах Літвы. Толькі асобныя працы апошняга часу закранаюць культуру, асвету літоўцаў у прыгранічных з Літвой мясцовасцях Беларусі [954]. Пытанні беларуска-літоўскіх узаемаадносін у пачатку 1920-х гг. разглядаюцца ў манаграфіі Э. Гімжаўскаса [885].

У цэлым, праведзены аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі сведчыць аб адсутнасці цэласнага даследавання аб нацыянальна-культурным жыцці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. У навуковых і навукова-папулярных працах пераважна закраналіся толькі асобныя аспекты тэматыкі. Да сённяшняга часу цэлы шэраг пытанняў не з'яўляўся аб'ектам сур'ёзных даследаванняў. На наш погляд, неабходна разам з вывучэннем культуры і асветы беларусаў, карэннай большасці насельніцтва, даследаваць і нацыянальна-культурнае жыццё іншых этнічных супольнасцей (палякаў, рускіх, украінцаў, літоўцаў, яўрэяў, татараў) у акрэслены храналагічны перыяд. Заходнебеларускія землі спрадвеку вылучаліся сваім полікультурным характарам. Пакуль не знайшлі адлюстравання ў беларускай гістарычнай навуцы праблемы культурнага жыцця палякаў (дзейнасць польскіх культурна-асветніцкіх, навуковых, грамадскіх арганізацый і ўстаноў; суадносіны палітычнага,

канфесійнага, культурнага і іншых уплываў палякаў у згаданым рэгіёне і інш.). Мяркуем, што варта імкнуцца да полідысцыплінарнага характару даследаванняў, выкарыстоўваючы дасягненні гістарычных, сацыяльна-гуманітарных, філалагічных, мастацтвазнаўчых, юрыдычных і іншых навук. Стварэнне цэласнай карціны нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. набывае ў сучасных умовах важнае ідэалагічнае значэнне.

Менавіта таму мэтай дадзенай манаграфіі з'яўляецца даследаванне нацыянальна-культурнага жыцця Заходняй Беларусі ў перыяд ад Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. да падзей верасня 1939 г. Для выканання пастаўленай мэты аўтар пастараўся рэалізаваць наступныя задачы: прааналізаваць ідэалагічныя і палітычныя пастулаты, прававыя падставы, механізмы рэалізацыі палітыкі польскіх улад у галіне культуры, асветы беларусаў і іншых этнічных супольнасцей; адлюстраваць стан беларускай адукацыі, культурна-асветніцкай працы; вызначыць ролю гісторыка-культуралагічных даследаванняў, навукова-асветніцкай работы ў захаванні, папулярызацыі спадчыны беларускага народа; прасачыць адносіны хрысціянскіх канфесій да пытанняў культуры, адукацыі, мовы, традыцый беларусаў, вызначыць характар іх грамадска-царкоўнай дзейнасці; разгледзець мастацкія каштоўнасці і іх прысутнасць у заходнебеларускім грамадскім жыцці; выявіць спецыфіку становішча палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, прааналізаваць дзейнасць польскіх культурна-асветніцкіх, грамадскіх арганізацый, устаноў і вынікі іх працы; паказаць функцыянаванне асноўных інстытуцыянальных структур рускіх, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў, татараў, выявіць асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-культурнай дзейнасці нацыянальных меншасцей. У адпаведнасці з гэтым і была выпрацавана структура манаграфіі. Аўтар імкнуўся вывучаць нацыянальна-культурнае жыццё заходняй часткі Беларусі ў кантэксце сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных працэсаў, з улікам тагачасных геапалітычных рэалій усходнееўрапейскага рэгіёна. Геаграфічныя межы даследавання ўключаюць у сябе тэрыторыю Заходняй Беларусі, якая прызнана ў афіцыйнай беларускай гістарыяграфіі. Пры правядзенні параўнальнага аналізу культурна-асветніцкай дзейнасці асобных меншасцей, асабліва ў памежных мясцовасцях, аўтар звяртаў увагу і на працэсы, падзеі, што адбываліся ў суседніх польскіх, літоўскіх, украінскіх землях, хоць гэта не з'яўлялася аб'ектам дадзенага манаграфічнага даследавання.

У ходзе напісання манаграфіі было выкарыстана шырокае кола гістарычных крыніц. Найбольш прадстаўнічую групу з іх складаюць дакументы з фондаў архіўных устаноў Рэспублікі Беларусь: Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага

архіва-музея літаратуры і мастацтва, аддзела рэдкай кнігі і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, Занальнага дзяржаўнага архіва ў Маладзечна. Сярод выкарыстаных матэрыялаў прысутнічаюць і дакументы архіваў Літвы (Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літвы, аддзела рукапісаў бібліятэкі АН Літвы), Польшчы (Архіва актаў новых у Варшаве, Дзяржаўнага архіва ў Беластоку, архіва дыяцэзіі ў Драгічыне над Бугам, архіва Яўрэйскага гістарычнага інстытута). Аўтар уласнаручна выявіў і апрацаваў усе выкарыстаныя архіўныя крыніцы, значная частка якіх упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак.

У ходзе даследавання тэмы выкарыстаны нарматыўна-прававыя дакументы (законы, указы, пастановы, распараджэнні, інструкцыі, актавыя матэрыялы і інш.), дакументы справаводства цэнтральных і мясцовых органаў улады (справаздачы, планы работы і праграмы, афіцыйная перапіска, скаргі, дэпутацкія запыты (інтэрпеляцыі) і інш.), дакументальныя матэрыялы грамадскіх аб’яднанняў, культурна-асветніцкіх арганізацый (статуты, інструкцыі, справаздачы, пратаколы пасяджэнняў кіруючых органаў, з’ездаў, канферэнцый і інш.). Аўтар карыстаўся шматлікімі статыстычнымі матэрыяламі 20–30-х гг. XX ст. Сярод выкарыстаных крыніц прысутнічае перыядычны друк на беларускай, польскай, рускай, украінскай мовах, а таксама агляды яўрэйскага, літоўскага друку, прадстаўленыя ў друкаваных выданнях, фондах архіваў. У працы выкарыстаны інфармацыйныя бюлетэні камісіі АН БССР па вывучэнню Заходняй Беларусі, зборнікі дакументаў і матэрыялаў, якія выдаваліся ў 1950–1980-я гг. і на сучасным этапе. Каштоўныя звесткі ўтрымліваюцца ў гісторыка-дакументальных хроніках “Памяць” асобных раёнаў і гарадоў Беларусі. Адметнае месца ў базе крыніц займаюць матэрыялы асабістага паходжання (дзённікі, успаміны людзей рознага сацыяльнага становішча, нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці, палітычных поглядаў). Хоць яны ўтрымліваюць часта суб’ектыўныя ацэнкі, аднак разам з іншымі крыніцамі дазваляюць паказаць featureрознабаковы характар нацыянальна-культурнага і рэлігійнага жыцця заходнебеларускіх жыхароў.

У цэлым, разнастайная база крыніц пры выкарыстанні агульнанавуковых метадаў, метадаў гістарычнага даследавання дазволіла аўтару падрыхтаваць дадзенае манаграфічнае выданне па актуальнай тэме айчыннай гісторыі. Асобныя вынікі працы былі апрабіраваны ў выглядзе дакладаў і рэфератаў на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, у ходзе ажыццяўлення беларуска-расійскага навуковага праекта, у навучальным працэсе.

# ГЛАВА 1. ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД У ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ І АСВЕТЫ ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ: ІДЭАЛАГІЧНЫЯ І ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПАСТУЛАТЫ, ПРАВАВЫЯ ПАДСТАВЫ, МЕХАНІЗМЫ РЭАЛІЗАЦЫІ

Для разумення працэсаў нацыянальна-культурнага жыцця на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд ад Рыжскага міру 1921 г. да пачатку Другой сусветнай вайны і ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР важнае значэнне мае аналіз колькасных параметраў нацыянальнай структуры насельніцтва, вызначэнне месцаў кампактнага пражывання нацыянальных меншасцей. Паводле афіцыйнай статыстыкі, у 1921 г. у Віленскім, Беластоцкім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах пражывала толькі 1 млн. 34,6 тыс. беларусаў, а ў 1931 г. – 984,1 тыс. чалавек, што складала адпаведна 31 і 28% усяго насельніцтва [1095, с. 18–22, 1024; с. 22]. У ходзе перапісу насельніцтва 1931 г. 707 тыс. чалавек у Палескім ваяводстве запісалі “тутэйшымі” [1024, с. 28]. Для павелічэння колькасці палякаў у іх склад наўмысна залічвалася значная частка беларусаў-католікаў, польскамоўных жыхароў, выкарыстоўваліся разнастайныя сродкі фальсіфікацыі вынікаў перапісу. Аднак яшчэ ў 1920-я гг. вучоныя імкнуліся ўдакладніць афіцыйныя статыстычныя матэрыялы. Паводле беларускага даследчыка Р. Паўстынскага, у 1925 г. у Беластоцкім ваяводстве ў гарадах і мястэчках палякі складалі 39,6% (у вёсках – 4,2%), Віленскай адміністрацыйнай акрузе – адпаведна 47,2% і 6,7%, Навагрудскім ваяводстве – 25,8% і 4,6%, Палескім ваяводстве – 14,9% і 1,2% [482, арк. 73–74]. Польскія навукоўцы абмяжоўвалі тады колькасць беларусаў лічбамі 1,4–1,6 млн. чалавек [1128, с. 5; 944, с. 61–62]. Іх падлікі разыходзіліся з пазіцыяй заходнебеларускіх дзеячаў, якія лічылі беларускую прысутнасць у Польшчы ў межах 2–3 млн. чалавек [634, с. 110–111].

Параўнальны аналіз вынікаў перапісаў 1921 і 1931 гг., які быў зроблены ў сярэдзіне 1935 г. супрацоўнікамі МУС Польшчы, засведчыў змяншэнне долі палякаў сярод насельніцтва 36 паветаў “усходніх крэсаў”, асабліва ў Палескім ваяводстве (у Кобрынскім павеце – на 46,5%, Пружанскім – на 27,2%) [742, арк. 7]. Неабходна адзначыць, што ў Палескім ваяводстве ў 1931 г. доля палякаў вагалася ў памеры 14,5–14,8%. Хоць у Віленскім і Навагрудскім ваяводствах палякі мелі большасць, аднак гэта дасягалася за кошт каталіцкага насельніцтва, якое прызнавала сябе палякамі, але ў побыце карысталася беларускай мовай [742, арк. 24–25]. “Польскае насельніцтва не з’яўляецца поўнасцю нацыянальна свядомым і можа ў пэўных умовах перайсці ў іншую этнічную групу”, – такую выснову зрабілі супрацоўнікі МУС Польшчы [742, арк. 39].

Да цяперашняга часу ў беларускай і польскай гістарычнай навуцы існуюць розныя метадалагічныя падыходы пры вызначэнні нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі. У беларускай савецкай гістарыяграфіі фігуравалі лічбы беларусаў ад 2 млн. 371 тыс. [593, с. 17] да 2,9 млн. чалавек [570, с. 31]. У цэлым шэрагу сучасных польскіх выданняў падвяргаецца сумненню афіцыйная статыстыка аб нацыянальнай структуры насельніцтва заходнебеларускіх зямель [728, с. 78]. Польскія даследчыкі Е. Тамашэўскі і З. Ландау ацэньваюць колькасць беларусаў у 1 млн. 948 тыс. чалавек [1161, с. 57]. Па самых завышаных ацэнках у 1921 г. колькасць мясцовых (“крэсовых”) палякаў на тэрыторыі 24 заходнебеларускіх паветаў (акрамя Сярэдняй Літвы) ацэньваецца прыкладна ў 600 тыс. чалавек (45,8% ад агульнай колькасці насельніцтва) [861, с. 59, 61–62; 1043, с. 38]. П. Эберхардт лічыць, што нельга абсалютызаваць моўны крытэрый пры вызначэнні нацыянальнай прыналежнасці [860, с. 66]. Наватарскія падыходы гэтага польскага вучонага ў вызначэнні нацыянальнай структуры насельніцтва не з’яўляюцца бясспрэчнымі і дасканалымі. У яго няма адзінага падыходу ў этнічным вызначэнні палякаў. Для часткі Віленшчыны, якая ўвайшла пасля 1939–1940 гг. у склад Літвы (тэрыторыя Віленска-Трокскага, Свянцянскага паветаў, Вільні), выкарыстаны моўны крытэрый, для заходнебеларускіх зямель – крытэрый веравызнання. Паводле яго падлікаў, у 1931 г. сярод жыхароў Заходняй Беларусі палякаў было 36% (1 млн. 351 тыс. чалавек), беларусаў – 47,6% (1 млн. 787,8 тыс. чалавек) [863, с. 51–52]. Нельга пагадзіцца з абсалютызацыяй П. Эберхардтам стабільнасці нацыянальнай структуры, нязменнасці працэнтных суадносін розных этнасаў пасля перапісу 1931 г. Менавіта пры такіх падліках колькасць беларусаў напярэдадні Другой сусветнай вайны ацэньваецца ім у 1 млн. 963,3 тыс. (47,6%), палякаў – 1 млн. 484,9 тыс. (36% мясцовага насельніцтва)[863, с. 53]. Праведзеныя яшчэ ў канцы 1930-х гг. асобныя даследаванні ставяць пад сумненне прамалінейны ход этнадэмаграфічных працэсаў у 1930-я гг. у інтэрпрэтацыі П. Эберхардта.

Імкненне да ўзважлівага вывучэння ўзнятай праблематыкі прысутнічае ў сучасных даследаваннях беларускіх вучоных. Доля беларускага насельніцтва ў 1931 г. ацэньваецца імі ў 65–67%, палякаў – 12–15% (больш чым 400 тыс. чалавек) [479, с. 221]. Даследчыкі У. Ладысеў і П. Брыгадзін вызначаюць колькасць беларусаў прыкладна ў 2 млн. чалавек (без уліку каля 500 тыс. бежанцаў, якія вярнуліся да сярэдзіны 1920-х гг.) [432, с. 164]. Паводле падлікаў В. Рабышка, доля беларусаў у 1931 г. складала 52,8% [588, с. 17, 18]. Толькі ў асобных працах у духу “крэсова-патрыятычнай” польскай публіцыстыкі міжваеннага часу не падвяргаюцца

сумненню дакладнасць і верагоднасць перапісаў насельніцтва 1921 і 1931 гг. [418, с. 178, 180–183; 582, с. 119].

Супярэчлівай з’яўляецца статыстыка яўрэйскага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы. На думку некаторых сучасных польскіх гісторыкаў і дэмографаў, патрэбную лічбу трэба шукаць паміж колькасцю іудзеяў і тых, хто ў якасці роднай мовы называў ідыш ці старажытнаяўрэйскую мову (іўрыт). У 1931 г. першых налічвалася ў Польшчы 3 млн. 113,9 тыс. (9,8%) (у 1939 г. – 3 млн. 460 тыс. (9,7%)), другіх – 2 млн. 733 тыс. (8,6%) [1052, с. 96–97]. У заходнебеларускіх землях ў 1931 г. колькасць яўрэяў вагалася адпаведна ў межах 342–375 тыс. (8,3–9,2%). Іх тэрытарыяльнае размяшчэнне выглядала наступным чынам: у 8 паветах Палескага ваяводства – 9,2–9,6%, у 5 паветах Беластоцкага – 13,4–13,5%, у Навагрудскім – 7,3–7,8%, у 8 паветах Віленскага ваяводства – 4,1–5,2% (у Вільні – 28,2%) [1043, с. 42–43; 1052, с. 161]. Большая частка яўрэйскага насельніцтва жыла ў гарадах і мястэчках. Яўрэі складалі больш 70% насельніцтва Бярозы-Картузскай, Кобрына, Слоніма. У Пінску іх было 63,4%, Лідзе – 61,7%, Навагрудку – 53,5%, Брэсце – 44,3%, Гродна – 42,6% [112, арк. 39; 111, арк. 2–8; 137, арк. 7; 1033, с. 48]. Прысутнасць яўрэяў у гандлі і рамястве ў Заходняй Беларусі была большай, чым у іншых рэгіёнах Польскай дзяржавы. Яўрэі складалі 77% усіх рамеснікаў у Навагрудскім ваяводстве, 59,7% – у Віленскім ваяводстве, 81,1% – у Палескім ваяводстве (у Пінску – 95%) [1189, с. 133], а таксама большасць сярод вольных прафесій (урачоў, юрыстаў, настаўнікаў і інш.) [1160, с. 22–28].

На тэрыторыі міжваеннай Польшчы выразна вылучаліся 3 групы рускага насельніцтва: 1) рускія і іх нашчадкі, якія апынуліся там у XIX – пачатку XX ст. (чыноўнікі, мяшчане, інтэлігенцыя); 2) эмігранты; 3) рускія стараабраднікі. Паводле перапісу насельніцтва 1931 г., у Польшчы налічвалася 138,7 тыс. рускіх (0,4% насельніцтва краіны). Большай была руская прысутнасць у заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх землях: у Віленскім ваяводстве – 43 тыс. (3,5%), Беластоцкім – 35 тыс. (2%), Палескім – 16,3 тыс. (1,4%), Навагрудскім – 6,8 тыс. (0,6%), Валынскім – 23,4 (1,1%) тыс. чалавек, у астатніх ваяводствах доля рускіх не пераўзыходзіла 0,2% агульнай колькасці жыхароў. Сярод рускамоўных 61,7% складалі вяскоўцы, 38,3% – жыхары гарадоў [1209, с. 78]. Колькасць рускіх эмігрантаў ацэньваецца сучаснымі польскімі вучонымі ў 30–35 тыс. чалавек [1210, с. 36]. Расійскія даследчыкі павялічваюць гэтую лічбу да 80–100 тыс. чалавек [589, с. 261]. Стараабраднікі пераважалі сярод рускага вясковага насельніцтва ў Віленскім і Беластоцкім ваяводствах. Асабліва вылучаліся Браслаўскі і Дзісенскі паветы (каля 25 тыс. чалавек) [728, с. 116]. Усяго ў 1937 г. у 48 абшчынах стараабраднікаў у Польшчы

налічвалася 50,2 тыс. чалавек (у некаторых крыніцах указваецца на 60 тыс. чалавек) [758, арк. 308–310, 318–322, 326].

Украінская меншасць на тэрыторыі заходнебеларускага краю кампактна пражывала ў Кобрынскім, Брэсцкім і іншых паўднёвых паветах Палескага ваяводства. У 9 паветах Палескага ваяводства (без уліку Сарненскага, які быў перададзены Валынскаму ваяводству) у 1921 г. украінцы складалі ў цэлым 6,6% (63,8 тыс. чалавек)(аднак сюды ўключаўся населены пераважна ўкраінцамі Камень-Кашырскі павет – 49,2 тыс. чалавек (71% жыхароў)). Паводле афіцыйных звестак, у 1931 г. у Палескім ваяводстве налічвалася 53,6 тыс. украінскамоўных жыхароў (4,8% насельніцтва) [46, арк. 5]. Неабходна адзначыць, што некаторыя ўкраінскія грамадскія і навуковыя дзеячы безапеляцыйна залічвалі тэрыторыю Палескага ваяводства да ўкраінскіх этнічных зямель. Падобная тэндэнцыя назіраецца і ў асобных сучасных украінскіх даследчыкаў [898, с. 54]. У шэрагу прац да ўкраінскага насельніцтва бяздоказна прыпісваюць значную частку „тутэйшых" Палескага ваяводства [1082, с. 20]. Наогул, афіцыйныя звесткі перапісу 1921 г. (3 млн. 898,4 тыс. украінцаў (14,3% насельніцтва Польшчы)) [1094, с. 12–14] аспрэчваліся польскімі даследчыкамі, якія павялічвалі іх колькасць да 4,5–5,5 млн. чалавек [1183, с. 505; 871, с. 14].

Даволі супярэчлівай з'яўляецца статыстыка літоўскага насельніцтва. Паводле афіцыйных звестак, у 1921 г. у Польшчы было 65,5 тыс. літоўцаў [1194, с. 245], у 1931 г. – 82,3 тыс. літоўцаў, з іх у Віленскім ваяводстве – 66,8 тыс., у Беластоцкім – 13,1 тыс., у Навагрудскім – 2,5 тыс. чалавек [1156, с. 153]. У навуковай літаратуры колькасць літоўцаў вагаецца ў межах ад 80 тыс. да 250 тыс. чалавек [1181, с. 247; 1194, с. 17, 22; 1168, с. 127; 70, с. 153; 1018, с. 26–28, 323; 908, с. 130; 374, с. 219; 1028, с. 170; 862, с. 126]. 96% літоўскага насельніцтва складалі малазямельныя вяскоўцы-сяляне, 4% – служачыя, купцы, рамеснікі, прадстаўнікі інтэлігенцыі. Літоўцы пражывалі кампактнымі групамі ў Свянцянскім, Віленска-Трокскім, Сувалкаўскім паветах. У памежных заходнебеларускіх паветах – Лідскім, Гродзенскім, Браслаўскім, Пастаўскім, Дзісенскім, Вілейскім, Навагрудскім, Ашмянскім – колькасць літоўцаў была нязначнай. Адчувальнай іх прысутнасць была толькі ў некаторых мясцовасцях – у гмінах Парэчча, Бершты Гродзенскага павета, Радунь Лідскага павета, Гервяты Віленска-Трокскага павета, Дзевянішкі Ашмянскага павета, Рымшаны Браслаўскага павета, у наваколлі населеных пунктаў Відзы, Міёры, Друя [1194, с. 244, 245]. Паўтараючы беспадстаўныя сцвярджэнні літоўскіх даследчыкаў міжваеннага часу, якія прызнавалі беларусаў-католікаў беларусізаванымі літоўцамі [720], у

асобных сучасных працах беларусы папракаюцца за асіміляцыю мясцовага літоўскага насельніцтва [374, с. 213, 219].

З 5–6 тыс. мусульманскага насельніцтва ў Польшчы, сярод якога дамінавалі татары (звесткі пра 10 тыс. чалавек у 1936 г. [764, арк. 20–21] не пацвярджаюцца), абсалютную большасць складалі жыхары заходнебеларускіх зямель. Найбольш кампактнай і прадстаўнічай была татарская прысутнасць на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства: у 1925 г. там дзейнічала 9 мусульманскіх абшчын (2 091 чалавек), якіх абслугоўвалі 9 мулаў, 9 муэдзінаў (мязімаў)(намеснікаў мулаў), дзе функцыянавалі 7 мячэцяў – у Навагрудскім павеце (Навагрудак (у 1921 г. – 5,7% жыхароў [1153, с. 57]), Католычы; у Лоўчыцах дзейнічала мячэць 1688 г., на мізары (могілках) быў пахаваны Св. Эўлія Контусь [940, с. 15–17]), Баранавіцкім (Ляхавічы), Слонімскім (Слонім – каля 2% жыхароў), Лідскім (Мураўшчызна (Іўе), Некрашунцы), Нясвіжскім (Іванава, Клецк; у Асмолава дзейнічала мячэць 1834 г.), Стаўбцоўскім паветах (Мір). Больш распыленым было рассяленне татараў у Віленскім ваяводстве: у 1925 г. яны былі згуртаваны ў 6 абшчынах (2 464 чалавекі), дзе было 6 мячэцяў, 6 мулаў, 3 муэдзіны – у Вільні, Віленска-Трокскім (Сорак Татараў, Немеж), Ашмянскім (Даўбуцішкі (Даўбучкі)), Пастаўскім (Мядзел), Браслаўскім паветах (Відзы – 1% жыхароў у 1937 г. [369, арк. 8]). У 1925 г. у Беластоцкім ваяводстве існавалі 2 мусульманскія абшчыны (878 чалавек) – у Крушынянах Гродзенскага павета і Багоніках Саколкаўскага павета, дзе 2 мулы абслугоўвалі адпаведна 2 мячэці [763, арк. 1–2, 43–48, 59–60, 62–63]. У Палескім ваяводстве не было мусульманскіх святынь і духавенства, слабой была татарская прысутнасць: у Лунінецкім павеце ў 1923 г. было 30 мусульман [763, арк. 7]. Узровень жыцця большасці татарскага насельніцтва быў невысокі, бо па сацыяльнаму складу 63% складалі сяляне і жыхары мястэчак, якія займаліся пераважна агародніцтвам, рамёствамі (асабліва гарбарствам, кушнерствам), рамізніцтвам [1153, с. 58]. Аналіз матэрыяльнага становішча татарскай супольнасці сведчыць аб маёмаснай і сацыяльнай дыферэнцыяцыі ў яе асяроддзі, што выклікала пэўныя супярэчнасці паміж гарадскімі і сельскімі жыхарамі, інтэлігенцыяй і сялянска-мяшчанскай большасцю.

У цэлым, праведзены аналіз нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі сведчыць пра выразную перавагу беларусаў, якія ўяўлялі сабой значную частку раз’яднанай беларускай нацыі. Мяркуем, што іх доля сярод заходнебеларускіх жыхароў складала да 70%. Адчувальнай была прысутнасць палякаў, яўрэяў, рускіх, якія мелі распылены характар рассялення. Украінская, літоўская, татарская меншасці ў заходнебеларускім краі характарызаваліся лакальным характарам рассялення.

Прававую аснову для наладжвання нацыянальна-культурнага жыцця розных народаў і этнічных супольнасцей у межах Польшчы складалі яе міжнародныя абавязацельствы, прынятыя ў рамках сістэмы адпаведных дагавораў Версальскай сістэмы і пасля завяршэння савецка-польскай вайны, а таксама ўнутранае заканадаўства. Дагавор аб абароне нацыянальных меншасцей (Малы Версальскі трактат), падпісаны польскім урадам 28 чэрвеня 1919 г., утрымліваў агульныя палажэнні адносна правоў нацыянальных меншасцей, пэўныя абавязацельствы адносна "аховы ў Польшчы інтарэсаў жыхароў, якія адрозніваліся ад большасці насельніцтва расай, мовай і рэлігіяй" [1162]. Цэлы шэраг артыкулаў прадугледжваў для іх гарантыі ў галіне культуры і асветы [853; 1145, с. 71–74]. Выкананне ўключаных ў трактат абавязацельстваў знаходзілася пад кантролем Лігі нацый. Умовы Рыжскага мірнага дагавору ад 18 сакавіка 1921 г. таксама ўтрымлівалі пэўныя абавязацельствы. Так, артыкул 7 гарантаваў нацыянальнае раўнапраўе, свабоду развіцця культуры, мовы, стварэння адпаведных таварыстваў [854]. Аднак недасканаласць Версальскай сістэмы не дазволіла наладзіць эфектыўны і дасканалы механізм абароны нацыянальных меншасцей, які павінен быў ўдакладняцца ў ходзе заключэння рэгіянальных дагавораў, стварэння ў кожнай краіне асобных адпаведных інстытутаў. Сама Ліга нацый была паралізавана ў сферы абароны нацыянальных меншасцей [1059, с. 50]. Выкладзеныя ў Малым Версальскім трактаце абавязацельствы былі прадубліраваны ў шэрагу артыкулаў канстытуцыі Польшчы 1921 г. [925; 1212]. Амаль без змен яны ўвайшлі ў тэкст канстытуцыі Польшчы 1935 г. [1169].

Міжнародныя пагадненні, Рыжскі мірны дагавор, канстытуцыйнае заканадаўства з'яўляліся добрай падставай для забеспячэння гарантый нацыянальна-культурнага жыцця ўсіх нацыянальных супольнасцей, аднак пад уплывам цэлага шэрагу культурна-гістарычных, эканамічных, знешніх і іншых фактараў яны ўступілі ў супярэчнасць з працэсам аднаўлення і станаўлення дзяржаўнасці Польшчы. Сярод шэрагу канцэпцый дзяржаўнага ўладкавання Польшчы вылучаліся інкарпарацыйная і федэралістычная (федэрацыйная). З канцэпцыяй інкарпарацыі заходнебеларускіх зямель у склад унітарнай Польскай дзяржавы выступалі польскія нацыянальна-дэмакратычныя сілы (эндэкі) [847]. Вялікадзяржаўная ідэя аднаўлення Рэчы Паспалітай, сфармуляваная эндэкамі, знайшла шырокае адлюстраванне ў свядомасці большасці польскага грамадства.

Асновы федэралістычнай канцэпцыі былі выкладзены ў асобнай адозве Ю. Пілсудскага "Да насельніцтва Вялікага княства Літоўскага" 22 красавіка 1919 г. Аднак сам Ю. Пілсудскі неўзабаве фактычна

адмовіўся ад яе. У прынятай польскім сеймам 2 мая 1919 г. віленскай дэкларацыі яе нават не ўзгадвалі. Фактычна канцэпцыя федэрацыі стала выгадным тактычным прыёмам у палітычнай барацьбе [889, с. 202]. У створанай на акупіраванай тэрыторыі Беларусі структуры Цывільнага ўрада ўсходніх зямель прыхільнікі інкарпарацыі пераважалі над прыхільнікамі федэрацыйнай канцэпцыі [883, с. 244–251].

Пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавору 18 сакавіка 1921 г. інкарпарацыйная канцэпцыя стала дамінуючай, а федэралістычная эвалюцыяніравала ў тэорыю "праметэізму", што прадугледжвала шляхам некаторых уступак адцягваць заходнебеларускія і заходнеўкраінскія землі ад арыентацыі на ўсход. Паводле некаторых ацэнак, тэорыя "праметэізму" не мела ніякага ўплыву на заходнебеларускае грамадства [616, с. 14]. Адзінай спробай звароту да ідэі федэрацыі была падрыхтоўка праектаў аўтаноміі для Усходняй Галіцыі і Віленшчыны. Сам Ю. Пілсудскі выказваў вялікія спадзяванні на вырашэнне віленскага пытання [843, с. 55]. Прыхільнае стаўленне да нацыянальна-культурных інтарэсаў беларусаў, літоўцаў, яўрэяў у Сярэдняй Літве ў 1920–1922 гг. насіла кан'юктурны, часовы характар. Аднак гэтую акалічнасць беларускія дзеячы вырашылі выкарыстаць для культурна-асветніцкай працы [75, с. 30–31]. У лістападзе 1920 г. Б. Тарашкевіч узначаліў беларускую секцыю ў дэпартаменце асветы Сярэдняй Літвы. Ужо ў студзені 1921 г. дзейнічала 121 беларуская пачатковая школа [972, арк. 30–37]. Да пачатку 1922 г. там налічвалася 186 беларускіх навучальных устаноў [1106, с. 50], сярод якіх 178 пачатковых школ [508, арк. 54], беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах, курсы для настаўнікаў, беларускія гімназіі ў Вільні і Радашковічах.

У духу федэрацыйнай канцэпцыі ва ўрадавых колах былі распрацаваны асобныя праекты (М. Арцышэўскага, Л. Экерта і інш.) [1041]. Пасля прыняцця віленскім сеймам 20 лютага 1922 г. рашэння аб далучэнні Віленшчыны да Польшчы там пачала праводзіцца палітыка гвалтоўнай і фарсіраванай асіміляцыі. Да сакавіка 1923 г. у заходнебеларускіх і ўсходнелітоўскіх землях засталося 37 беларускіх, 44 літоўскія, 20 украінскіх, 4 рускія школы. У той жа час колькасць польскіх дасягнула 3 280 [1128, с. 15]. З 178 дзяржаўных беларускіх пачатковых школ, якія існавалі ў Сярэдняй Літве ў канцы 1921 г., да 1924/1925 навуч. году засталося толькі 13 [73, с. 16].

Акрамя інкарпарацыйнай і федэрацыйнай, існавала таксама краёвая канцэпцыя, прадстаўленая нешматлікай групай "краёўцаў" у Вільні, якая гуртавалася вакол рэдакцый выданняў "Przegląd Wileński" ("Віленскі агляд"), "Kurier Wileński" ("Віленскі кур'ер") і інш. (Л. Абрамовіч, М. Здзяхоўскі і інш.). Аднак гэтая канцэпцыя не знайшла падтрымкі ва

ўрадавых колах, польскія правыя сілы яе рашуча не прынялі, а левыя парламенцкія аб’яднанні аднесліся фармальна.

Неабходна адзначыць, што да сённяшняга часу ў польскай гістарыяграфіі па ідэалагічных і палітычных меркаваннях міжваенная Польшча называецца Другой Рэччу Паспалітай. Аднак Польшча таго часу была унітарнай дзяржавай у адрозненне ад федэратыўнай (канфедэратыўнай) Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стст. Менавіта таму лічым паняцце “Другая Рэч Паспалітая”, што прысутнічае ў польскім навуковым друку, а апошнім часам сустракаецца і ў асобных працах беларускіх гісторыкаў, не столькі навуковым, колькі палітызаваным, бо яно не адлюстроўвае сутнасці дзяржаўнага ўладкавання тагачаснай Польшчы.

Для II Польскай рэспублікі, якая па складу насельніцтва была шматнацыянальнай і па ўладкаванню стала унітарнай дзяржавай, нацыянальная праблематыка набыла асаблівае значэнне. Варта праналізаваць асноўныя канцэпцыі, мадэлі і праекты вырашэння нацыянальных (нацыянальна-культурных) праблем Заходняй Беларусі, прадстаўленыя вядучымі польскімі палітычнымі сіламі. Па-першае, у кантэксце інкарпарацыйных планаў дзяржаўнага ўладкавання пашырэнне атрымала нацыянальна-дэмакратычная канцэпцыя. Хоць яе прытрымліваліся ў асноўным эндэкі і іншыя правыя польскія аб’яднанні, аднак і лагер пілсудчыкаў звяртаўся да яе, за што папракаўся палітычнымі апанентамі ў 1930-я гг. у “ідэалагічным плагіяце”. Канцэптуальныя ідэі Р. Дмоўскага сталі ажыццяўляцца на практыцы адразу пасля ўключэння заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы. Нацыянальна-дэмакратычная канцэпцыя надавала перавагу нацыянальным польскім інтарэсам, пра што яскрава сведчыў праграмны лозунг “Польшча для палякаў”. Эндэкі прадстаўлялі польскую культуру ў якасці вышэйшай, цывілізаванай, пагардліва сцвярджалі аб ніжэйшасці ўкраінцаў, беларусаў, таму выступалі за іх нацыянальна-культурную асіміляцыю гвалтоўнымі метадамі. Пераўтварэнне ўсходняй дзяржаўнай граніцы Польшчы на поўнач ад Прыпяці ў мяжу польскай нацыі прызнавалася галоўнай жыццёвай неабходнасцю [1107, с. 67]. Паводле ідэолага эндэкаў Р. Дмоўскага, асіміляцыя найбольш падатлівых беларусаў павінна была адбывацца пры ўдзеле польскай школы, культурна-асветніцкіх арганізацый і ўстаноў, пры стварэнні перспектывы цывілізацыйнага росту. Для хуткай асіміляцыі беларусаў і ўкраінцаў прадугледжвалася выкарыстоўваць таксама армію, адміністрацыйна-паліцэйскі апарат. Вырашэнне яўрэйскага пытання планавалася ажыццявіць шляхам ізаляцыі яўрэяў ад грамадскага жыцця. Так як яўрэі прызнаваліся эндэкамі прыналежнымі да іншай (чужой) цывілізацыйнай плыні, то іх нельга было асіміляваць [1227, с. 53].

Выключэнне складала толькі невялікая частка яўрэяў, якая падвяргалася поўнай нацыянальна-культурнай асіміляцыі [1110, с. 446].

Па-другое, кансерватыўныя колы прапаноўвалі свой праект вырашэння нацыянальных праблем, які ў адрозненне ад нацыянальна-дэмакратычнага вылучаўся меншым радыкалізмам, прадугледжваў паступовы шлях нацыянальнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва. Тэарэтычныя пастулаты кансерватараў актыўна выкарыстоўваліся пілсудчыкамі ў практычнай рэалізацыі нацыянальнай палітыкі, асабліва пасля майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту ў Польшчы. Ідэолагі віленскіх кансерватараў, якія былі аб’яднаны вакол выдання “Słowo” (“Слова”)(С. Цат-Мацкевіч і інш.), разглядалі дзяржаўную асіміляцыю ў якасці першага істотнага кроку ў напрамку дэнацыяналізацыі ўкраінцаў, беларусаў. На іх думку, гвалтоўныя праявы польскага нацыяналізму маглі толькі запаволіць гэтыя асіміляцыйныя працэсы [1081, с. 239; 1035, с. 83–99].

Па-трэцяе, варта вылучыць ліберальна-дэмакратычную мадэль, якой прытрымліваліся нешматлікія народніцкія, ліберальныя і сацыялістычныя партыі і аб’яднанні, частка мясцовай польскай інтэлігенцыі. Яны прыхільна ставіліся да ідэі тэрытарыяльнай аўтаноміі ўкраінцаў і беларусаў, выступалі супраць антысемітызму і нацыянальнай дыскрымінацыі. Значная частка іх тэарэтычных пастулатаў укладвалася ў кантэкст федэрацыйнай ці краёвай канцэпцый дзяржаўнага ўладкавання, нярэдка ўтрымлівала элементы тэорыі рэгіяналізацыі як аднаго са сродкаў дзяржаўнай кансалідацыі ці інтэграцыі. Менавіта таму заходнебеларускія землі лічыліся састаўной часткай Польскай дзяржавы. Рэгіяналізм, які прызнаваў існаванне асобных этнічных культур як рэгіянальных праяў агульнапольскай культуры, стаў тэарэтычным ядром польскага краязнаўчага руху і паспрыяў паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва [679, с. 12, 15]. Тыя ж “краёўцы” не адмяжоўваліся ад Польшчы, аднак падкрэслівалі адрознасць нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускіх зямель.

За паразуменне з няпольскімі прадстаўнікамі выступалі польскія сацыялісты. Адзін з іх відных дзеячаў – Л. Васілеўскі – прапаноўваў больш поўна ўлічваць культурныя і сацыяльна-эканамічныя інтарэсы беларусаў і іншых няпольскіх супольнасцей, хоць і лічыў іх грамадзянамі другой катэгорыі ці грамадзянамі, якія павінны былі выконваць перад Польскай дзяржавай пэўныя абавязкі. Хоць беларусы і ўкраінцы заслугоўвалі тэрытарыяльнай аўтаноміі, яўрэі – культурнай аўтаноміі [787], аднак беларусы ўяўляліся яму “племенем з даволі слабой нацыянальнай індывідуальнасцю і яшчэ даволі нізкім нацыянальна-палітычным рухам” [1107, с. 67]. Адчувальная колькасная вага беларусаў у Польскай дзяржаве,

значна горшае іх становішча як ў параўнанні з іншымі нацыянальнымі супольнасцямі (пра што сведчыла статыстыка беларускіх школ у Польшчы) [1181, с. 248], так і беларусамі ў БССР, якраз і надавалі беларускаму пытанню асаблівую значнасць. Выступаючы супраць планаў фарсіраванай паланізацыі эндэкаў, Л. Васілеўскі падтрымліваў дзяржаўную асіміляцыю. На яго думку, неабходна было спыніць дыскрымінацыю, забяспечыць свабоднае развіццё культуры і асветы, а таксама паспрыяць вырашэнню надзённых праблем беларускага насельніцтва, у тым ліку развіваць сетку школ і г. д. Стварэннем лепшых умоў для развіцця культуры, асветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў параўнанні з Савецкай Беларуссю можна было супрацьстаяць усходнім уплывам [1184]. Імкнучыся ў гэтым пераканаць польскія ўладныя структуры, Л. Васілеўскі папярэджваў іх аб прыцягальнасці для заходнебеларускага насельніцтва ідэй нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР [1180, с. 395]. Інтарэсы ўкраінцаў у Палескім ваяводстве прапаноўвалася разглядаць асобна ад заходнеўкраінскага насельніцтва, а палескі рэгіён падлягаў у перспектыве паланізацыі [1182, с. 22–23]. Вырашэнне літоўскай праблемы бачылася Л. Васілеўскаму ў кантэксце нармалізацыі міждзяржаўных адносін і ўзаемнага забеспячэння правоў літоўцаў у Польшчы і палякаў у Літве [1182, с. 13]. Большасць польскіх ідэолагаў лічыла, што літоўцы з-за невялікай колькасці не ўяўлялі значнай праблемы ў нацыянальнай палітыцы Польскай дзяржавы. Л. Васілеўскі адмаўляў існаванне ў Польшчы рускай меншасці, называючы рускіх і іх культуру “перажыткам русіфікатарскай эпохі” [788, арк. 7]. Самай складанай і адначасова найбольш бяспечнай для вырашэння ўяўлялася яўрэйская праблема. У стыхійнай моўнай асіміляцыі яўрэйскай інтэлігенцыі бачылася аслабленне адметнасці яўрэйскага насельніцтва ад польскага [786, арк. 369]. У рамках дзяржаўнай асіміляцыі прапаноўвалася задавальняць нацыянальныя інтарэсы яўрэяў у галіне адукацыі, зняць абмежаванні і аблегчыць іх эміграцыю [787, арк. 33]. Нягледзячы на асобныя ліберальныя ўступкі для няпольскага насельніцтва, для Л. Васілеўскага і іншых ідэолагаў першаснымі з’яўляліся інтарэсы забеспячэння польскай дзяржаўнасці [893, с. 52–62]. Такім чынам, ліберальна-дэмакратычная мадэль не давала магчымасці для паўнацэннага, свабоднага нацыянальна-культурнага жыцця няпольскага насельніцтва.

Па-чацвёртае, асобную пазіцыю займалі камуністы. Яны надавалі перавагу класавым інтарэсам над нацыянальнымі, выступалі супраць прыгнятальнай палітыкі польскіх урадаў, падтрымлівалі інтарэсы нацыянальных супольнасцей. Адзіным сродкам вырашэння нацыянальнага пытання яны прызнавалі пралетарскую рэвалюцыю. Польскія камуністы выступалі за права Заходняй Беларусі на самавызначэнне і ўз’яднанне яе з

БССР. На II з’ездзе Камуністычнай рабочай партыі Польшчы ў верасні 1923 г. было прызнана права “ўкраінскіх і беларускіх рабочых і сялян на вызваленне з-пад панавання памешчыцка-капіталістычнай Польшчы і далучэння іх зямель да Савецкай Украіны і Беларусі” [541, с. 23].

Хоць у нацыянальнай палітыцы Польшчы так і не ўдалося выпрацаваць адзінай палітычнай лініі, аднак вядучыя пазіцыі ў практычнай рэалізацыі набыла нацыянальна-дэмакратычная канцэпцыя. Сярод шэрагу фактараў, якія прадвызначылі менавіта такі напрамак польскай нацыянальнай палітыкі, неабходна адзначыць сацыяльна-псіхалагічныя. Пасля заключэння Рыжскага міру захоўвалася атмасфера, якая садзейнічала распаўсюджванню і ўмацаванню разнастайных варыянтаў ягелонскай ідэі, што паўплывала на нацыянальную палітыку, культуру [437, с. 26; 436, с. 16, 36–37]. Як і ідэолагі пераважнай часткі палітычных сіл, абсалютная большасць палякаў разглядала Польшчу ў якасці нацыянальнай дзяржавы. Такія настроі выключалі магчымасць нармальнага функцыявання поліэтнічнага грамадства. Такім чынам, назіралася пэўнае раздваенне грамадскай свядомасці: пры наяўнасці дэмакратычных канстытуцыйных гарантый для правоў няпольскага насельніцтва ў рэальнай рэчаіснасці праяўляўся шавінізм, нацыяналізм. Такія перакосы ў ментальнасці ў многім тлумачацца тым, што тагачаснае польскае грамадства не змагло пазбавіцца, паводле слоў Е. Гедройца, псіхалагічнага “комплексу непаўнацэннасці ў дачыненні да Захаду і комплексу вышэйшасці ў дачыненні да Усходу” [435; 653, с. 18]. У такіх абставінах быў непазбежны канфлікт з нацыянальна-культурнымі інтарэсамі беларусаў, украінцаў і іншых народаў.

Ва ўмовах напружанай грамадска-палітычнай сітуацыі, абвастрэння этнаканфесійных адносін у першай палове 1920-х гг. дзеячы лагеру пілсудчыкаў Л. Васілеўскі, Т. Галуўка і іншыя выступалі за замену палітыкі нацыянальнай асіміляцыі на палітыку дзяржаўнай асіміляцыі. Так і не былі выкарыстаны магчымасці ўтворанага ў снежні 1921 г. у Варшаве Інстытута даследавання нацыянальных спраў, галоўнай мэтай якога абвяшчаўся навуковы аналіз розных бакоў жыцця нацыянальных меншасцей на тэрыторыі Польшчы, выпрацоўка аптымальных рашэнняў у галіне міжнацыянальных адносін [851; 859]. Да сярэдзіны 1920-х гг. гэтая ўстанова дзейнічала з пэўнымі перапынкамі і без сур’ёзных вынікаў. У адной з прац, падрыхтаванай у Інстытуце даследавання нацыянальных спраў пры пасрэдніцтве ўрада У. Сікорскага, К. Сракоўскі сцвярджаў аб прымірэнні беларускіх нацыянальных пастулатаў з інтарэсамі польскай дзяржаўнасці пры ўмове выканання “мінімальнага беларускага праекта”, куды ўключаліся патрабаванні аб стварэнні беларускіх пачатковых школ, спрыянні ў адкрыцці гімназій, допуск да аграрнай рэформы беларускага

насельніцтва, забеспячэнне свабоды друку, таварыстваў, неабходныя інвестыцыі для павышэння ўзроўню жыцця і г. д. [1128, с. 25]. Для беларусаў была прапанавана культурная аўтаномія і падтрымка іх культурна-асветніцкіх інтарэсаў неабходнымі фінансавымі сродкамі. У напісаных пазней тэзісах “У справе нашай палітыкі адносна нацыянальных меншасцей” пасля наведвання ўсходніх ваяводстваў К. Сракоўскі выказваўся за правядзенне “добрасумленнай культурнай палітыкі”, лічыў “справядлівай справай” добраахвотную паланізацыю нацыянальных меншасцей” [974, арк. 144].

Неабходна адзначыць, што згаданы ўрад У. Сікорскага прыхільна ставіўся да магчымасці выкарыстання элементаў канцэпцыі рэгіяналізацыі. Адзін з падобных праектаў прадставіў 28 лютага 1923 г. палескі ваявода С. Даўнаровіч [740, арк. 1–7]. Для пераўтварэння Палесся ў “новы галоўны ключ для панавання на ўсходзе” прапаноўвалася абараняць яго ад беларусізацыі з поўначы і ўкраінізацыі з поўдня, а таксама стварыць на месцах згуртаваную дзяржаўную адміністрацыю, урэгуляваць адносіны дзяржаўных і царкоўных структур, праводзіць спрыяльную інвестыцыйную палітыку, аднаўляць, пашыраць і паланізаваць гарады, разгортваць сістэматычную, планавую польскую каланізацыю і г. д. [740, арк. 5–6].

Непасрэдная распрацоўка законаў аб мовах нацыянальных меншасцей ва ўсходніх ваяводствах (г. зв. “крэсовых законаў”) ажыццяўлялася ўрадам У. Грабскага. Прыняцце законаў павінна было прадэманстраваць еўрапейскай супольнасці пазітыўны імідж Польскай дзяржавы, дзе быццам абараняюцца правы нацыянальных меншасцей, канкрэтызуюцца палажэнні асобных артыкулаў канстытуцыі, адбываецца прававое ўрэгуляванне моўнага пытання [1059, с. 116]. На дамінаванне знешняга фактару ў прыняцці законаў указваў у сваім выступленні ў польскім сейме 9 ліпеня 1924 г. Б. Тарашкевіч [577, с. 22]. 31 ліпеня 1924 г. польскі сейм прыняў г. зв. “крэсовыя законы” – „Закон аб дзяржаўнай і службовай мове ў дзяржаўных установах і органах самакіравання”, “Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей”, “Закон аб мове ў судах, пракуратуры і натарыяльных установах”. Законы прадугледжвалі ўкраінскаму, беларускаму, літоўскаму насельніцтву пэўныя правы ў выкарыстанні роднай мовы ў адносінах з уладамі, судовымі ўстановамі, устанавілі прынцыпы арганізацыі адукацыі на нацыянальных мовах. Паводле артыкула 1 „Закона аб дзяржаўнай і службовай мове ў дзяржаўных установах і органах самакіравання”, польская мова атрымала статус дзяржаўнай, абавязковай для ўсіх органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання. Артыкул 2 таго ж закона даваў магчымасць падачы пісьмовых ці вусных зваротаў да мясцовых польскіх

улад на ўкраінскай, беларускай і літоўскай мовах [857; 516]. Такое права надавалася беларускаму насельніцтву Віленскага, Навагрудскага, Палескага ваяводстваў, Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў Беластоцкага ваяводства. На тэрыторыі Палескага ваяводства можна было складаць украінскамоўныя петыцыі. Літоўскамоўныя звароты дапускаліся на тэрыторыі Свянцянскага павета і ў гмінах з літоўскай большасцю Віленска-Трокскага павета.

Неабходна адзначыць, што заканадаўчая база функцыянавання сістэмы адукацыі ў Польскай дзяржаве складвалася павольна. Пасля прынятага 7 лютага 1919 г. "Закона аб школьным абавязку" [852] прававыя механізмы адукацыйнай сферы заставаліся слабымі. Толькі 13 лютага 1922 г. былі прыняты "Закон аб адкрыцці і ўтрыманні публічных усеагульных школ" [855] і "Закон аб структуры публічных усеагульных школ" [856], якія датычылі навучальных установаў з польскай мовай навучання. На тэрыторыі Заходняй Беларусі фармальна працягвала дзейнічаць часовае распараджэнне генеральнага камісара Цывільнага ўрада ўсходніх зямель ад 11 кастрычніка 1919 г., паводле якога былі ўведзены вельмі абмежаваныя магчымасці для школ з няпольскай мовай навучання [516, арк. 74–74адв.]. "Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей", які распрацоўваўся міністрам веравызнанняў і грамадскай асветы С. Грабскім, прадугледжваў адкрыццё школ з беларускай мовай выкладання пры наяўнасці дэкларацый з подпісамі 40 бацькоў дзяцей у тых мясцовасцях, дзе пражывала не менш 25% беларускага насельніцтва. Аднак закон замацаваў няроўнасць правоў беларускай і польскай супольнасцей. Калі меліся 20 подпісаў за навучанне па-польску, то адкрывалася двухмоўная (польска-беларуская) школа [858; 516, арк. 46–47]. Такім чынам, шляхам дзяржаўнага пратэкцыянізму (юрыдычнымі нормамі) умацоўваліся пазіцыі польскай адукацыі і культуры ў цэлым. Згаданы закон істотна абмежаваў канстытуцыйныя гарантыі свабоднага развіцця адукацыі няпольскага насельніцтва. Менавіта шляхам утраквізацыі планавалася ўзмацніць польскі ўплыў.

Г. зв. "крэсовыя законы" фармальна давалі некаторыя абмежаваныя правы для няпольскага насельніцтва, павінны былі аслабіць міжнацыянальнае напружанне. На наш погляд, былі зроблены захады ў напрамку палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі, за якую выступалі прыхільнікі Ю. Пілсудскага. Аднак законы мелі сур'ёзныя пралікі, абмежаваны характар. Па-першае, іх дзеянне не распаўсюджвалася на некаторыя паветы Беластоцкага ваяводства, дзе была істотнай беларуская прысутнасць. Стварэнне літоўскіх адуацыйных установаў было абмежавана толькі 2 паветамі – Свянцянскім і Віленска-Трокскім. На акрэсленых законамі землях не мелі права займацца стварэннем установаў на роднай

мове іншыя этнічныя супольнасці (яўрэі, рускія і інш.). У г. зв. "крэсовых законах" права яўрэяў на выкарыстанне ідыш ці іўрыта не прысутнічала. Надоўга расцягнуўся працэс распрацоўкі механізму практычнай рэалізацыі г. зв. "крэсовых законаў".

Прадстаўнікі лагеру пілсудчыкаў імкнуліся пераканаць урадавыя структуры ў неабходнасці задавальнення мінімальных патрабаванняў беларусаў у галіне культуры і асветы. Такія ўступкі былі выкладзены ў прапанаваным 1 мая 1925 г. С. Тугутам для ўзгаднення ва ўрадзе плане працы секцыі па нацыянальных справах Палітычнага камітэту [949, с. 85–87]. Аднак такія захады засталіся беспаспяховымі.

У першай палове 1920-х гг. на афіцыйным узроўні не было адзінства па яўрэйскаму пытанню. У розных сферах грамадскага жыцця Польшчы праводзіліся дыскрымінацыйныя меры па абмежаванню яўрэйскіх уплываў – уводзіліся ліміты пры паступленні ў ВНУ, амаль недаступнай была іх служба ў польскай арміі, моцна абмежаванымі былі шансы для службовай кар'еры ў дзяржаўных установах і інш. Для мясцовай польскай адміністрацыі яўрэйскае пытанне ўяўлялася незразумелым, таямнічым, а клопаты яўрэяў – надуманымі ці нават абсурднымі. Польскія ўлады не ўмешваліся ў грамадскае жыццё яўрэяў, аднак былі зацікаўлены, каб яно кіравалася яўрэйскімі рэлігійнымі дзеячамі. Аднак у выпадку радыкальных уплываў у асяроддзі яўрэяў польская адміністрацыя прымяняла разнастайныя рэпрэсіўныя меры.

У заключаным 4 ліпеня 1925 г. пагадненні (угодзе) ўрада У. Грабскага з яўрэйскімі парламентарыямі прадугледжвалася ўрэгуляванне прававога становішча яўрэйскіх гмін, адмена абмежаванняў на выкарыстанне іўрыта і ідыш у розных сферах жыцця, наданне статуса грамадскіх устаноў яўрэйскім школам і выдзяленне для іх дзяржаўных субсідый і інш. [390, с. 492; 1157]. Аднак гэтае пагадненне выклікала супярэчлівыя ацэнкі яўрэйскіх палітычных сіл. У прыватнасці, рашуча не прыняў яго Бунд [1055, с. 208–209, 298]. Пагадненне не спраўдзіла спадзяванняў яўрэйскай супольнасці.

Сіянізм здаваўся для польскіх улад меншым злом у параўнанні з сацыялістычнай і камуністычнай ідэалогіяй. Менавіта таму цэнтральныя польскія органы ўлады падтрымалі ў сакавіку 1926 г. сіяністкі рух. Адпаведныя тлумачэнні былі даведзены і мясцовай польскай адміністрацыі [748].

Шырокі грамадскі рэзананс набыла справа абмежавання з боку польскіх уладаў колькасці яўрэяў сярод студэнтаў ("numerus clausus"). Гэтая антысеміцкая кампанія была разгорнута эндэкамі яшчэ ў пачатку 1920-х гг. [1090, с. 134; 782]. У 1923/1924 навуч. годзе ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя яўрэі складалі каля 19,6% студэнтаў, у

1925/1926 навуч. годзе сярод першакурснікаў там было 38,8% [777, арк. 99]. Хоць польскі сейм не прыняў па справе “numerus clausus” станоўчага рашэння, аднак пазней неаднаразова гэтая праблема ўздымалася ў польскім грамадстве. Тым не менш, увядзенне прыкладна з 1923 г. неафіцыйнай працэнтнай нормы яўрэйскіх навучэнцаў і студэнтаў да канца 1920-х гг. прынесла адпаведныя вынікі. У 1929/1930 навуч. годзе ў ВНУ Польшчы яўрэі складалі 19,3% [833, с. 195].

Да сярэдзіны 1920-х гг. з-за ўрадавай нестабільнасці так і не была выпрацавана комплексная праграма ў галіне нацыянальна-культурнага жыцця. Фактычна ў рамках вызначанай палітыкі нацыянальнай асіміляцыі ўводзіліся ў дзеянне толькі асобныя праекты ці іх часткі. Тэндэнцыя ў бок пераходу да палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі ўжо вызначылася ў час дзеяння ўрадаў У. Сікорскага і асабліва У. Грабскага. Змяшчэнне акцэнтаў ў палітыцы польскага ўраду з нацыянальнай асіміляцыі ў бок дзяржаўнай асіміляцыі адчувалася ў дакуменце пад назвай “Некаторыя дырэктывы бягучай дзяржаўнай палітыкі ў справах усходніх ваяводстваў”, падрыхтаваным у красавіку 1926 г. міністрам унутраных спраў Польшчы У. Рачкевічам [133, арк. 10–12]. Выкладзеныя ў гэтай дырэктыве новыя тактычныя пазіцыі ў правядзенні нацыянальнай палітыкі набылі статус афіцыйных ужо пасля майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту ў Польшчы. У дакладзе, прадстаўленым міністрам унутраных спраў К. Младзяноўскім на пасяджэнні ўрада 18 жніўня 1926 г. [1016], стратэгічным напрамкам у нацыянальнай палітыцы была абвешчана дзяржаўная асіміляцыя. Параўнальны аналіз гэтага палітычнага курса у галіне нацыянальна-культурнага жыцця і палітыкі нацыянальнай асіміляцыі, што праводзілася польскімі ўрадамі ў першай палове 1920-х гг., сведчыць аб тым, што адбыўся пераход ад гвалтоўных, выразна канфрантацыйных метадаў да памяркоўных, аднак мэта (паланізацыя і асіміляцыя няпольскага насельніцтва) засталася нязменнай.

Менавіта разгром у 1927 г. Грамады прызнаецца асобнымі даследчыкамі ў якасці рубяжа, калі вырашэнне беларускага пытання было вернута ў русла палітыкі ўрадаў першай паловы 1920-х гг. [837, с. 242]. Аднак грамадаўскі ўздым, які разглядаўся польскімі ўладамі выключна праз прызму знешняга фактару і антыдзяржаўнай дзейнасці, прымусіў іх разам з ганеннямі зрабіць і нязначныя ўступкі, асабліва ў галіне культуры і асветы. Тым не менш, нават такія мінімальныя прапановы, з якімі ў лістападзе 1926 г. выступіў Л. Васілеўскі (пераўтварыць беларускія школы ў дзяржаўныя, аблегчыць падрыхтоўку настаўнікаў, павялічыць допуск беларускіх дзяцей у прафесійныя і сярэднія школы, стварыць кафедру беларусістыкі ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя і дзяржаўную беларускую настаўніцкую семінарыю ў Вільні, аказваць

матэрыяльную дапамогу студэнтам-беларусам, выдзяліць субсідыі для беларускіх асветніцкіх, навуковых таварыстваў, выдавецтваў, надрукаваць беларускамоўныя падручнікі і інш.) [789, арк. 36–37], былі рэалізаваны часткова.

З падобнымі прапановамі аб уступках выступаў і кіраўнік усходняга аддзела міністэрства замежных спраў Т. Галуўка. Аднак паланізацыя заставалася прыярытэтным напрамкам у нацыянальна-культурнай палітыцы. Як адзначаў той жа Т. Галуўка на адным з пасяджэнняў польскага сейму ў пачатку 1931 г., вялікадзяржаўныя інтарэсы дыктавалі ўмацаванне на "крэсах" не толькі Польскай дзяржавы, але і польскай культуры [1071, с. 175]. Школа па-ранейшаму з'яўлялася адным з галоўных інструментаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі.

Хоць мясцовы адміністрацыйны апарат і ў першай палове 1920-х гг. актыўна займаўся практычнай рэалізацыяй нацыянальнай палітыкі, аднак пасля майскага (1926 г.) заняў ў правядзенні палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі манапольныя пазіцыі. На наш погляд, гэта і прадвызначыла хуткі адыход мясцовых чыноўнікаў ад дэклараванай палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі ў бок ранейшай, звыклай па зместу і метадах правядзення палітыкі нацыянальнай асіміляцыі. Пры гэтым нельга перабольшваць ступень самастойнасці нізавых уладных структур, прадстаўляць ваяводскія ўлады і цэнтральныя органы кіравання ў якасці больш аб'ектыўных адносна нацыянальна-культурных інтарэсаў беларусаў [358, с. 35]. На самой справе ваяводскія і сталічныя польскія ўлады з прагматычных меркаванняў дзеля забеспячэння дзяржаўнай інтэграцыі, бяспекі абавязаны былі хоць фармальна ўлічваць інтарэсы няпольскага насельніцтва. Фактычна з канца 1920-х гг. насуперак афіцыйнай ідэалогіі як на ўрадавым узроўні, так і асабліва на рэгіянальным перайшлі да палітыкі нацыянальнай асіміляцыі.

Пэўную дапамогу ў рэалізацыі палітыкі рэжыму "санацыі" мог аказаць Інстытут даследавання нацыянальных спраў, які ў другой палове 1920-х гг. актывізаваў сваю дзейнасць. У Вільні была створана асобная літоўска-беларуская камісія, у якую ўвайшлі 5 падсекцый – літаратурная (кіраўнік – Л. Абрамовіч, рэдактар часопіса "Przegląd Wileński"), беларусазнаўства (С. Віславух), гістарычная і дэмаграфічна-статыстычная (С. Эрэнкройц), эканамічная (С. Свяневіч). З 1927 г. ажыццяўлялася выданне 1 раз у 2 месяцы часопіса "Sprawy narodowościowe". З функцыянаваннем гэтай установы была звязана дзейнасць Л. Васілеўскага, які з'яўляўся яе кіраўніком, Т. Галуўкі, В. Куманецкага, Е. Асмалоўскага, А. Сцебельскага, Г. Лёвенгерца і іншых палітычных і грамадскіх дзеячаў, вучоных. Аднак польскія ўлады праяўлялі слабую зацікаўленасць вынікамі працы ўстановы, нярэдка выказвалі незадаволенасць. Распрацоўкі вучоных (у

прыватнасці, даследаванні пачатку 1930-х гг. [865; 1168; 1201], па-ранейшаму былі імі незапатрабаванымі ў практычнай дзейнасці, выкарыстоўваліся выключна для ідэалагічных, інфармацыйных мэт ці для прадстаўлення ў міжнародныя структуры, хоць да асобных рэкамендацый ім варта было прыслухацца. Паводле заключэння С. Віславуха, жорсткая нацыянальная і сацыяльная палітыка польскіх улад абвастрала становішча ў Заходняй Беларусі, спрыяла пашырэнню сімпатый да БССР [1201, с. 4].

Пасля ўсталявання рэжыму "санацыі" большасць яўрэйскіх партый і арганізацый спадзявалася на змены ў нацыянальнай палітыцы адносна яўрэйскай супольнасці. Аднак кардынальных змен не адбылося, хоць рэжым "санацыі" не праводзіў антысеміцкай прапаганды, разглядаючы яе ў якасці дэстабілізуючага фактара ўнутранага жыцця і козыра для ўзмацнення апазіцыйных эндэкаў [1071, с. 237]. На афіцыйным узроўні так і не былі адхілены прававыя абмежаванні адносна яўрэяў. Для яўрэйскіх школ, якія не атрымалі правоў грамадскіх устаноў, не выдзяляліся сродкі, іх выпускнікі вымушаны былі здаваць экзамены на польскай мове [1073; 1100]. Аднак асобныя ўступкі былі зроблены. Пасля настойлівых патрабаванняў яўрэйскіх парламентарыяў [1032] было адхілена распараджэнне аб "numerus clausus" у ВНУ, на нявызначаны тэрмін былі прадоўжаны дазволы для ўтрымання існуючых яўрэйскіх школ і аблегчана іх атрыманне для новых устаноў, яўрэйская гімназія ў Вільні атрымала магчымасць здаваць экзамены на іўрыце. Было дазволена выкарыстоўваць ідыш і іўрыт пры правядзенні публічных мерапрыемстваў, сходаў [911, с. 47], урэгуляваны прававы статус яўрэйскіх рэлігійных абшчын [956, арк. 1], а таксама выдзелены нязначныя сродкі з дзяржаўнага бюджэту для яўрэйскіх адукацыйных устаноў. У многім пазітыўнае стаўленне тлумачылася неабходнасцю паляпшэння іміджу польскіх улад за мяжой.

Адной з сацыяльназначных праблем нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускіх зямель з'яўлялася непісьменнасць. Паводле перапісу насельніцтва 1921 г., доля непісьменных на тэрыторыі Заходняй Беларусі была наступнай: у Палескім ваяводстве – 71%, у Навагрудскім – 54,6%, на Віленшчыне – 58,3% (пры агульнапольскім паказчыку 33,1%). Найбольшая доля непісьменных прыходзілася на сельскую мясцовасць. Яскрава гэта можна прасачыць на прыкладзе звестак па Навагрудскім ваяводстве, дзе доля непісьменных вясковых жыхароў вагалася з 45,8% у Нясвіжскім павеце да 70,2% – у Слонімскім [199, арк. 38адв.–39]. Да канца 1920-х гг. польскія ўлады здолелі дасягнуць некаторых поспехаў у галіне адукацыі. Дзякуючы масаваму энтузіязму настаўнікаў і агульнаму патрыятычнаму ўздыму палякаў была адроджана польская асвета, пашырана сетка навучальных устаноў, распрацаваны змест адукацыі, заканадаўчая база, наладжана выданне падручнікаў, падрыхтоўка педагагічных кадраў [73,

с. 24]. Аднак праблема ўсеагульнага пачатковага навучання была далёкай ад вырашэння. У многіх заходнебеларускіх паветах існавалі “бясшкольныя акругі”. Павольна ішло развіццё сеткі польскіх школ у сельскай мясцовасці. Слабым было матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне існуючых пачатковых школ. Пры тых марудных тэмпах ліквідацыі непісьменнасці ў Польшчы (за перыяд паміж 1921 і 1931 гг. – прыкладна на 10%) канчатковае вырашэнне гэтай вострай сацыяльнай праблемы магло расцягнуцца на некалькі дзесяцігоддзяў.

У пачатку 1930-х гг. аўтарытарны рэжым “санацыі” ажыццявіў захады па абмежаванню грамадзянскіх правоў і свабод. “Закон аб сходах”, які быў прыняты 11 сакавіка 1932 г., даў адміністрацыйнаму апарату кантрольныя функцыі за грамадскімі арганізацыямі [1172; 1060]. Асаблівы грамадскі рэзананс атрымала рэформа адукацыі, ініцыятарам якой быў міністр веравызнанняў і грамадскай асветы Я. Янджэевіч. 11 сакавіка 1932 г. былі прыняты законы “Аб арганізацыі школьнай справы” [1170], “Аб прыватных школах, навучальных і выхаваўчых установах” [1171]. Новае заканадаўства вызначыла наступную структуру сістэмы адукацыі: усеагульная пачатковая (першая ступень – 4, другая – 6, трэцяя – 7 класаў), агульнаадукацыйная сярэдняя (4 класы гімназіі і 2 – ліцэя), прафесійная і вышэйшая. Пачатковае навучанне дзяцей з 7-гадовага ўзросту было абвешчана абавязковым. Польская дзяржава дэкларавала для ўсіх грамадзян вучобу дзяцей у школах больш высокай ступені. Аднак гарантыі для заходнебеларускага насельніцтва не былі практычна рэалізаваны: усеагульнае пачатковае навучанне не было дасягнута, у вясковай мясцовасці большасць складалі пачатковыя школы 1–2 ступеняў, захоўвалася непісьменнасць. Шматступенчатасць сістэмы адукацыі разам з матэрыяльнай незаможнасцю, перашкодамі польскіх улад істотна абмежавалі доступ заходнебеларускай моладзі да сярэдняй і вышэйшай школы. Толькі за ўступны экзамен у гімназію неабходна было заплаціць 10 злотых [928, с. 637]. З 1932 г. уступны ўзнос для студэнтаў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя павялічыўся да 270 злотых, за 2 і 3 курсы ўносілі адпаведна 250 і 220, за наступныя курсы – па 200 злотых [229, арк. 1; 389, с. 152]. Гэта пагоршыла становішча студэнтаў-беларусаў, доля якіх там у міжваенны час не пераўзыходзіла 3% [888, с. 112; 1127, с. 110–111]. Доля ж палякаў там няўхільна павялічвалася і стала дамінуючай. З-за немагчымасці заплаціць за вучобу многія з іх былі выключаны. Яшчэ больш абмежаваліся магчымасці для вучобы ў прафесійных установах – у 1936/1937 навуч. годзе доля беларусаў сярод навучэнцаў там скадала 0,5%, палякаў – 83,5% [1034, с. 300].

Нягледзячы на даволі супярэчлівы і незавершаны характар, рэформа адукацыі 1932 г. умацавала арганізацыйныя, вучэбна-метадычныя асновы

польскіх школ у Заходняй Беларусі. Новыя праграмы польскіх школ былі больш звязаны з грамадскай практыкай, улічвалі рэгіянальныя і мясцовыя асаблівасці. Аднак стала выразнай палітычна-ідэалагічная накіраванасць працэсу навучання і выхавання, хоць асобныя сучасныя польскія даследчыкі спрабуюць аспрэчыць высновы аб заідэалагізаванасці школьнай рэформы 1932 г. [1103, с. 288]. У распрацаваных новых вучэбных праграмах былі адлюстраваны погляды адносна асветы лідэраў лагеру пілсудчыкаў, на першы план узводзілася ідэя польскай дзяржаўнасці, заслугі лагеру пілсудчыкаў ў яе адраджэнні і ўзмацненні. Культ Ю. Пілсудскага насаджваўся і ў пазашкольнай дзейнасці – у тэатральных пастаноўках, на разнастайных тэматычных выставах, дзе асвятлялася яго грамадска-палітычная дзейнасць, вайсковыя паходы, дэманстраваліся яго фота, пейзажы і г.д.

Асобныя элементы канцэпцыі рэгіяналізму працягвалі фрагментарна выкарыстоўвацца ў палітыцы польскіх улад на тэрыторыі Палескага ваяводства, хоць палескі ваявода Я. Крагельскі спрабаваў строга прытрымлівацца палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі. У цыркуляры ад 22 жніўня 1930 г. ім былі падвергнуты крытыцы павятовыя старасты за празмерна адмоўнае стаўленне да беларусаў [255, арк. 653]. “Рускі элемент” (рускіх-служачых) за выкарыстанне рускай мовы прызнавалі небяспечным для Польскай дзяржавы [190, арк. 29]. У жніўні 1932 г. палескі ваявода Я. Крагельскі накіраваў міністру ўнутраных спраў Польшчы Б. Перацкаму асобны мемарандум па праблемах Палесся [176, арк. 1–39], у якім палітыка рэпрэсій у адносінах да беларускага руху прызнавалася памылковай. Пры гэтым ваявода лічыў немэтазгодным аказваць дапамогу беларускага руху ў стварэнні нейкіх пляцовак. Па меркаванню Я. Крагельскага, пры правядзенні адпаведнай палітыкі колькасць рускіх да наступнага перапісу павінна значна зменшыцца, абмежавацца толькі нешматлікай групай гарадской інтэлігенцыі [176, арк. 6]. У мемарандуме адзначалася, што “школа, асабліва грамадская, можа і павінна стаць адным з галоўных фактараў узмацнення польскага насельніцтва” [176, арк. 20].

Неабходна адзначыць, што З. Бечковіч, які ў 1926–1931 гг. з’яўляўся навагрудскім ваяводам, а ў 1931–1933 гг. – віленскім ваяводам, спрабаваў практыкаваць асобныя элементы, запазычаныя з рэгіянальнага “валынскага праекта” ці “валынскага эксперымента” Г. Юзэфскага, які таксама ажыццяўляўся ў рамках палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі [412, с. 15; 946; 1084]. У цэлым, канцэпцыя рэгіяналізму была выгаднай рэжыму “санацыі”, бо адцягвала ўвагу ад існавання асобных нацыянальных супольнасцей (беларусаў, украінцаў, літоўцаў) [729].

З сярэдзіны 1930-х гг. у кіруючым лагеры пілсудчыкаў выразнымі сталі клерыкальныя, нацыяналістычныя і таталітарныя погляды, што адбілася і на нацыянальнай палітыцы. Пад уплывам ваенных колаў міжведамасны Камітэт нацыянальных спраў (пераўтвораны ў снежні 1935 г. з утворанага ў сакавіку 1934 г. Нацыянальнага камітэта), які павінен быў выпрацаваць прапановы па нацыянальнай палітыцы, каардынаваць дзейнасць мясцовай адміністрацыі ў гэтым напрамку) узяў курс на ўзмацненне паланізацыі, пазбаўленне няпольскага насельніцтва грамадзянскіх і іншых правоў. 13 верасня 1934 г. міністр замежных спраў Польшчы Ю. Бэк заявіў на пасяджэнні Лігі нацый у Жэневе аб спыненні супрацоўніцтва ў справе правоў нацыянальных меншасцей [814, с. 617], што азначала адмову ад выканання Малога Версальскага трактату.

Асобныя аддзелы МУС Польшчы займаліся самастойнай распрацоўкай праектаў інтэграцыі “ўсходніх крэсаў”. У іх планавалася правядзенне прымусовай каланізацыі славянскага насельніцтва. У адным з такіх дакументаў (1935 г.) дзеянні па асіміляцыі насельніцтва, якое мела выразную беларускую ці ўкраінскую этнічную прыналежнасць, прызнаваліся ў тагачасных умовах нерацыянальнымі, непрадуктыўнымі [742; 1042]. У падрыхтаваным у чэрвені 1936 г. нацыянальным аддзелам МУС Польшчы асобным праекце [739, арк. 1–9] рэкамендавалася ўважліва падыходзіць да справы выбару метадаў нацыянальнай палітыкі ў залежнасці ад ступені нацыянальнай свядомасці этнічнай супольнасці. Асаблівы акцэнт рабіўся на тыя супольнасці, якія мелі нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці. “Моцнае выпраменьванне культуры кіруючага народа, пры адначасовым абмежаванні свабоды культурнага развіцця такіх меншасцей самымі прымітыўнымі сферамі этнічнага жыцця, можа прывесці да эвалюцыйнага здабыцця насельніцтва кіруючым народам…” [739, арк. 7]. Былі і больш авантурныя па свайму характару планы па дасягненню “стабільнай перавагі” польскага насельніцтва, якія ў выпадку рэалізацыі маглі рэзка абвастрыць этнаканфесійную сітуацыю ў Заходняй Беларусі.

Хоць кіруючыя колы Польшчы не лічылі беларускае пытанне пагражальным для ваенна-стратэгічнай бяспекі [1070, с. 425], аднак у 1936–1937 гг. ажыццявілі цэлы комплекс рэпрэсіўных мер: прыступілі да ліквідацыі беларускіх школ, арганізацый, газет, пашырэння польскіх уплываў праз паланізацыю праваслаўнай царквы, падпарадкаванне грамадска-культурнага жыцця моцнаму кантролю адміністрацыйна-паліцэйскага апарату.

У другой палове 1930-х гг. беларуская праблематыка па-ранейшаму разглядалася выключна ў якасці рэгіянальнай. Актывізавалася дзейнасць мясцовай адміністрацыі, ваенных колаў у напрамку ўзмацнення

нацыянальна-культурнай асіміляцыі. Так, 17 снежня 1936 г. кіраўніцтва IX КАП прадставіла навагрудскаму ваяводзе ўласныя прапановы па пытаннях грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця Палесся. Прапаноўвалася прымяняць самыя жорсткія меры, амаль да забароны дзейнасці і выдалення непажаданых “адзінак”. Важнае значэнне надавалася будаўніцтву школ. Прадугледжвалася кадравая чыстка сярод настаўнікаў, праваслаўнага і каталіцкага кліру Палескага і Навагрудскага ваяводстваў [189, арк. 4]. Начальнік грамадска-палітычнага аддзела Палескага ваяводства К. Ралевіч загадаў 14 студзеня 1937 г. перарабіць у месячны тэрмін на польскамоўныя ўсе надпісы ў грамадскіх месцах на шыльдах, плакатах, вывесках, вітрынах крам і г. д. Цэлы шэраг прапаноў па пашырэнню польскай адукацыі і прапаганды ўтрымліваўся ў асобным лісце ў МУС Польшчы, прадстаўленым у лютым 1937 г. палескім ваяводам В. Костэк-Бярнацкім [140, арк. 14–19]. Варта адзначыць, што планы паланізацыі мясцовага насельніцтва Палесся ў той час набывалі больш масіраваны, наступальны характар. Аднак да канца 1930-х гг. польскія ўлады так і не змаглі забяспечыць абяцанага ўсеагульнага пачатковага навучання, істотных зрухаў у вырашэнні праблемы непісьменнасці. У многіх мясцовасцях Заходняй Беларусі, асабліва на Палессі, працягвалі існаваць “бясшкольныя акругі”. У 1936 г. у Палескім ваяводстве з 236 тыс. дзяцей школьнага ўзросту 53 тыс. не былі ахоплены пачатковым навучаннем. У Віленскай школьнай акрузе 21,6% дзяцей не вучыліся [984, арк. 3]. Усяго ў Заходняй Беларусі ў 1938/1939 навуч. годзе не наведвалі школу больш 100 тыс. дзяцей [73, с. 98].

На адной з канферэнцый чыноўнікаў ваяводскіх упраўленняў і кіраўнікоў КАП (24 красавіка 1937 г.) былі выказаны прапановы па ўзмацненню паланізацыі. Выконваючы абавязкі палескага ваяводы Е. дэ Трамекурт у дыскусіі адзначыў, што палешукоў (у адрозненне ад беларусаў і ўкраінцаў) можна лёгка далучыць да польскай культуры. Прапаноўвалася таксама ў ходзе ажыццяўлення каланізацыі ствараць адпаведныя цэнтры пашырэння польскай культуры. Беластоцкі ваявода С. Кірцікліс галоўную ролю адводзіў польскай арміі, якой у справе ўзмацнення паланізацыі павінны дапамагаць рымска-каталіцкі касцёл, школа і адміністрацыйны апарат. “Гэтыя землі трэба зрабіць польскімі”, – гэтае выказванне навагрудскага ваяводы А. Сакалоўскага можна вылучыць у якасці рэзюмэ яго даклада [135, арк. 8]. Дзеля дасягнення паланізацыі навагрудскі ваявода дапускаў і поўнасцю апраўдваў гвалтоўныя метады. На яго думку, прызначэнне асветы якраз і заключалася ў ажыццяўленні паланізацыі. Летам 1937 г. той жа навагрудскі ваявода А. Сакалоўскі прадставіў на з’ездзе павятовых стараст дакумент “Актывізацыя польскага элементу” [199, арк. 36–47], дзе прапаноўваліся радыкальныя, гвалтоўныя

меры ў галіне культуры і асветы. У 1937/1938 навуч. годзе падлягалі ліквідацыі ўсе школы, дзе вывучалася беларуская мова, меркавалася звольніць настаўнікаў няпольскай нацыянальнасці, прызначаць дырэктарамі школ выключна мужчын-палякаў, былых вайскоўцаў [199, арк. 40адв.]. Планавалася таксама замест беларускіх самадзейных тэатральна-музычных калектываў ствараць польскія [199, арк. 45].

Нацыяналістычныя настроі выразна адчуваліся ў дзейнасці правых польскіх сіл. У 1937 г. бюро даследаванняў Віленска-Навагрудскай акругі Лагеру нацыянальнага аб'яднання (Obozu Zjednoczenia Narodowego) падрыхтавала дакумент пад назвай "Пробны нарыс мінімальнай праграмы ў беларускім пытанні" [910, с. 199–212]. "Усведамляючы сваю вялікасць і гістарычную ролю, польскі народ абавязаны да культурнай і творчай экспансіі. Мы павінны імкнуцца да таго, каб нацыянальна несвядомае беларускае насельніцтва было здабыта для нашай культуры і нашых гістарычных ідэалаў". Пры гэтым прапаноўвалася выкарыстоўваць "этычныя і дастойныя" сродкі асіміляцыі, каб не абуджаць нянавісці ці пагарды з боку беларусаў.

13 кастрычніка 1937 г. палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі загадаў павятовым старастам лічыць мясцовае насельніцтва Палесся польскім, нягледзячы на мясцовую гаворку і веравызнанне [116, арк. 30, 30адв.]. Такі падыход 5 красавіка 1938 г. быў замацаваны ў цыркуляры ваяводы для ўсіх органаў мясцовай улады [134, арк. 1]. На пасяджэнні павятовых стараст, якое адбылося 25–26 студзеня 1938 г. у Брэсце, той жа В. Костэк-Бярнацкі заявіў, што "Палессе павінна быць засвоена польскай культурай" [202, арк. 302адв.]. У падрыхтаванай ваяводскім упраўленнем у маі 1939 г. запісцы "Польскі стан валодання на Палессі" для ўзмацнення польскага ўплыву ў рэгіёне быў прапанаваны комплекс мер у розных напрамках сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага і канфесійнага жыцця [1083, с. 81–110]. Цэлы шэраг канкрэтных прапаноў у напрамку паланізацыі ўтрымліваўся ў запісках беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага ў Варшаву (1939 г.) [806; 207; 481; 432, с. 299–230; 24, с. 44–46]. "Беларуская меншасць знаходзіцца зараз яшчэ на такой стадыі нацыянальнага ўсведамлення, што пры адпаведных культурна-асветніцкіх захадах можа паддацца асіміляцыйнаму працэсу" [207, арк. 149]. Ажыццяўляць гэта прапаноўвалася праз "адпаведную дзейнасць і экспансію польскай культуры" [806, арк. 105]. Вырашэнне яўрэйскай праблемы, на думку Г. Асташэўскага, уяўлялася немагчымым у рамках аднаго ці некалькіх ваяводстваў, а толькі ў агульнадзяржаўным маштабе [806, арк. 105; 207, арк. 149].

Аналіз прадстаўленых планаў урадавых колаў, мясцовай адміністрацыі адносна ўзмацнення паланізацыі беларускага насельніцтва ў другой палове

1930-х гг. сведчыць аб наступным. Па-першае, аб частковай ці нават поўнай прыхільнасці іх ідэалагічных пастулатаў (нават самых радыкальных) нацыянальна-дэмакратычнай канцэпцыі вырашэння нацыянальных пытанняў. Па-другое, аб пераходзе да дзейсных механізмаў у справе насаджэння польскай культуры, нацыянальна-культурнай асіміляцыі мясцовага беларускага насельніцтва (асабліва мер каланізацыі). На выпрацоўку планаў паланізацыі Палесся ўплывалі не толькі асаблівасці этнаканфесійнага складу насельніцтва, але і востры характар аграрнага пытання, слабая ступень урбанізацыі, высокі ўзровень непісьменнасці, няразвітасць сацыяльнай інфраструктуры, дэмаграфічныя фактары і іншыя праблемы. Гэтыя землі, як і ўся Заходняя Беларусь, не мелі прагрэсіўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця, заставаліся другараднымі і адсталымі ў межах Польскай дзяржавы. Па-трэцяе, аб актыўным удзеле ваенных колаў, якія былі ініцыятарамі жорсткіх мер у нацыянальным пытанні. Такія падыходы выкарыстоўваліся кіруючым лагерам і адносна ўкраінцаў [1082, с. 28].

Хоць паводле ацэнак МУС (1935 г.) літоўская меншасць, “добра ўсвядомленая і арганізаваная”, з-за мізэрнай долі ў насельніцтве не ўяўляла вялікага значэння для польскай адміністрацыі [742, арк. 21–22], аднак польская адміністрацыя перайшла да рашучых антылітоўскіх дзеянняў. Адпаведны план бягучых і перспектыўных мерапрыемстваў падрыхтаваў і прадставіў у мемарандуме ад 11 лютага 1936 г. віленскі ваявода Л. Бацянскі [832]. Прадугледжвалася паэтапная ліквідацыя ўсіх літоўскіх арганізацый, якія не прызнавалі прыналежнасць Вільні і Віленшчыны да Польшчы. Выкладзеныя ў гэтым дакуменце меры адносна літоўскай меншасці патрэбна было практычна рэалізоўваць не толькі ў Віленскім, але і Беластоцкім, Навагрудскім ваяводствах. Для ўмацавання “польскага пануючага стану” ваявода Л. Бацянскі ў лісце да дырэктара палітычнага дэпартамента міністэрства замежных спраў Польшчы Т. Кабылянскага 30 красавіка 1937 г. прапанаваў разгарнуць сярод літоўцаў узмоцненую прапагандысцкую кампанію праз друк, лекцыйную і асветніцкую працу, фільмы, экскурсіі [1015, с. 289].

Калі ў 1930-я гг. адносна славянскага насельніцтва польскія ўлады праводзілі палітыку асіміляцыі, то асноўным сродкам вырашэння яўрэйскай праблемы лічылі іх эміграцыю [1158; 1155]. У 1926–1930 гг. сярод агульнай колькасці эмігрантаў з Польшчы яўрэі складалі 10,8%. Аднак з канца 1920-х гг. да пачатку 1930-х гг. пад уздзеяннем негатыўнага ўплыву сусветнага эканамічнага крызісу і ўзрастаючых антысеміцкіх настрояў у польскім грамадстве доля яўрэяў сярод эмігрантаў узрасла да 25,5% [1053, с. 50], а да сярэдзіны 1930-х гг. дасягнула 36,6% (у Палескім і Беластоцкім ваяводствах гэты паказчык вагаўся ў межах 40–50%) [1213,

с. 74]. Толькі ў другой палове 1930-х гг. эміграцыйная хваля зменшылася. На працягу 1921–1931 гг. з Польшчы эмігравала 292,8 тыс. яўрэяў [833, с. 97], а ўсяго на працягу 1920–1930-х гг. выехала, паводле розных звестак, ад 334 тыс. да 395,2 тыс. яўрэяў [1081, с. 114–115; 1052, с. 164].

У 1930-я гг. польскія праварадыкальныя сілы заклікалі да антысемітызму ў галіне культуры і асветы [1075, с. 28–35]. “Некалькі гадоў польскія нацыянальныя сілы праводзілі эканамічнае змаганне з яўрэямі, а зараз прыйшоў час “культурнай барацьбы”, якая не менш, а нават больш важная. Польская культура, мастацтва, літаратура, прэса, тэатр, кіно знаходзяцца пад магутным уплывам яўрэяў. Палякі павінны гэтаму неадкладна супрацьстаяць” [1178]. У гэтай “культурнай барацьбе” яны спадзяваліся не столькі на магчымасці дзяржаўнага апарату, колькі на мабілізацыю польскай грамадскай свядомасці [950, с. 224]. Антысемітызм разглядаўся часткай эндэкаў у якасці інтэграцыйнага фактару для польскага грамадства. Гучалі прапановы аб “numerus nullus”, г. зн. аб поўным выдаленні яўрэяў з вышэйшай школы, іншых сфер грамадскага жыцця, аднак такія радыкальныя меры не мелі шансаў на рэалізацыю [1227, с. 59]. Тым не менш, доля яўрэйскай моладзі ў ВНУ Польшчы зменшылася з 20,7% у 1925/1926 г. да 10% у 1938/1939 г. [1030, с.165].

У адрозненне ад цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы, антысеміцкая хваля ў заходнебеларускіх землях не набыла шырокага размаху. У многім гэта тлумачыцца большай сацыяльна-эканамічнай адсталасцю Заходняй Беларусі, дзе ў неяўрэйскага насельніцтва не было адчувальнага сярэдняга слоя, носьбіта нацыяналістычных поглядаў [1033, с. 116]. Аднак усё-такі адбываліся асобныя антысеміцкія акцыі. У лістападзе 1931 г. яны былі зафіксаваны ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя, пачатковых школах у Баранавічах [1226, с. 646–647]. Антысеміцкая акцыі адбылася 7 чэрвеня 1935 г. ў Гродна.

Адзін з яўрэйскіх пагромаў, які набыў моцны рэзананс ва ўсёй Польшчы і за мяжой, адбыўся ў Брэсце 13 мая 1937 г. [807, с. 81–82; 1154; 1148; 1228]. Летам 1937 г. назіралася ўзмацненне антысеміцкіх настрояў на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства [198, арк. 2]. У верасні 1937 г. у Гродна мясцовыя структуры польскіх правых партый у ходзе праведзенага месячніку “нацыянальнай салідарнасці” наладзілі своеасаблівае саперніцтва ў справе антысемітызму [195, арк. 48адв.].

У каталіцкай прэсе, выданнях эндэкаў яўрэяў абвінавачвалі у дэмаралізацыі грамадскага жыцця [897, с. 38–40]. Большасць абвінавачванняў яўрэяў мела неабгрунтаваны, надуманы і нават абсурдны характар. Акрамя нацыянальных, палітычных, эканамічных, дэмаграфічных і шэрагу іншых прычын, антысеміцкія настроі былі выкліканы і рэлігійнымі, культурнымі супярэчнасцямі – культура, рэлігія,

мова яўрэяў з’яўляліся адасобленымі, характарызаваліся адчужанасцю [812, с. 376–379]. Хаця каталіцкі прымас, кардынал А. Глёнд у пастарскім лісце ад 29 лютага 1936 г. асудзіў фізічны гвалт, аднак усё-такі прызнаў наяўнасць добрасумленных яўрэяў-вернікаў своеасаблівым выключэннем, прапанаваў адасобіць хрысціянскае грамадства ад яўрэйскага ва ўсіх сферах жыцця. “Трэба закрывацца ад шкодных маральных уплываў, г. зн. байкатаваць яўрэйскую прэсу і яўрэйскія дэмаралізатарскія выданні, але нельга нападаць на яўрэяў, біць іх, калечыць, зневажаць. У яўрэі трэба таксама паважаць чалавека і блізкага…” [1047, с. 339–340]. Згаданы пастарскі ліст выклікаў вострую крытыку ў перыядычным друку, асабліва ў яўрэйскіх выданнях.

У другой палове 1930-х гг. праварадыкальныя, нацыяналістычныя польскія сілы распрацавалі нават праекты пазбаўлення правоў яўрэяў, якія нагадвалі антысеміцкія меры нацысцкага рэжыму ў Германіі. Польскія ўлады адмовіліся іх прыняць, хоць асобныя прапановы былі адобраны ў сейме [1052, с. 199; 785]. У цэлым, у 1938 г. МУС Польшчы ацэньваў яўрэйскую супольнасць як небяспечную для інтарэсаў Польскай дзяржавы [1188, с. 21]. Польскія ўлады так і не змаглі да канца 1930-х гг. распрацаваць адназначнай палітыкі па яўрэйскай праблеме. У практычных дзеяннях як урадавых колаў, так і мясцовай адміністрацыі не назіралася ніякіх асобных мер ці элементаў тэорыі рэгіяналізацыі адносна яўрэяў на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Польскай дзяржавы.

Такім чынам, польскія ўлады на працягу ўсяго міжваеннага часу разглядалі пытанні задавальнення культурна-адукацыйных правоў беларусаў толькі ў кантэксце ажыццяўлення палітыкі нацыянальнай асіміляцыі, планаў каланізацыі заходнебеларускіх зямель. Часовы адыход ад палітыкі нацыянальнай асіміляцыі ў бок распрапагандаванай палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі з другой палове 1920-х гг. не ўнёс кардынальных змен у становішча беларускага насельніцтва. Эндэцкая мадэль вырашэння нацыянальна-культурных пытанняў фактычна заставалася асноўнай да верасня 1939 г. Асіміляцыйны характар насіла палітыка польскіх улад і адносна рускіх, украінцаў. На ўзроўні рэгіянальных уладных структур істотна абмяжоўвалася культура, асвета ўкраінцаў на тэрыторыі Палескага ваяводства. Вырашэнне літоўскай праблемы ставілася ў прамую залежнасць ад урэгулявання міждзяржаўных польска-літоўскіх адносін. Асобнага стаўлення да яўрэяў заходнебеларускіх зямель у польскіх улад не было. Іх разглядалі разам з яўрэйскім насельніцтвам іншых рэгіёнаў Польшчы. Пэўная этнаканфесійная адасобленасць яўрэяў не давала шансаў для іх паспяховай асіміляцыі, таму выкарыстоўваўся цэлы шэраг абмежавальных мер.

# Глава 2. БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ

## 2.1. Адукацыя і культурна-асветніцкі рух як сродкі этнічнага самазахавання беларусаў

Станаўленне заходнебеларускага культурна-асветніцкага руху адбывалася ў пачатку 1920-х гг. у Вільні, якая ўвайшла ў склад Сярэдняй Літвы. На пасяджэнні Цэнтральнай беларускай школьнай рады 22 лютага 1921 г. было вырашана стварыць асобнае ТБШ. Падрыхтоўкай яго статута займаўся Б. Тарашкевіч [508, арк. 18, 5адв.]. Узнікненне ТБШ на Віленшчыне было невыпадковым, бо там з 1915 г. існавалі беларускія школы. У зацверджаным 1 ліпеня 1921 г. дэпартаментам унутраных спраў Сярэдняй Літвы статуце ТБШ была абвешчана яго асноўная мэта – "пашыраць і памагаць асвеце ў беларускім нацыянальным, людскім і хрысціянскім духу". ТБШ мела права адкрываць, утрымліваць народныя школы, курсы для непісьменных дарослых, настаўніцкія семінарыі, бібліятэкі-чытальні, навучальныя ўстановы, адкрываць народныя дамы, праводзіць лекцыі і курсы, займацца выдавецкай дзейнасцю і г. д. [647, с. 3–4]. Восенню 1921 г. старшынёй кіруючага органа ТБШ – Цэнтральнай школьнай рады – стаў А. Смоліч, потым яго змяніў Б. Тарашкевіч, які стварыў ў снежні таго ж году ТБШ у Радашковічах. Вясной 1922 года ў склад Цэнтральнай школьнай рады ўваходзілі таксама А. Луцкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Неканда-Трэпка, М. Касцевіч, А. Станкевіч, П. Пліс, М. Кахановіч, П. Біндзюк. На агульным сходзе ТБШ у канцы 1924 г. у склад Цэнтральнай школьнай рады ўвайшлі 12 членаў і 4 кандыдаты, сярод якіх старшыня Б. Тарашкевіч, яго намеснікі – С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч [510, арк. 376].

У першай палове 1920-х гг. уплыў ТБШ быў абмежаваны пераважна Вільняй і Віленшчынай. Касцяк арганізацыі складалі настаўнікі і іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, студэнты, выпускнікі беларускіх гімназій [514, арк. 21–24]. Сумесна з беларускай секцыяй дэпартамента асветы Сярэдняй Літвы кіраўніцтва ТБШ праяўляла клопат пра беларускія пачатковыя школы, настаўніцкую семінарыю ў Барунах. Хоць павялічвалася колькасць беспрацоўных настаўнікаў-беларусаў [623], аднак у чэрвені-верасні 1921 г. былі наладжаны настаўніцкія курсы. Пасля далучэння Сярэдняй Літвы да Польшчы пазіцыі беларускай асветы значна аслаблі. З 514 беларускіх школ, якія існавалі ў 1919/1920 навуч. годзе, да 1922/1923 г. у заходнебеларускім краі засталося толькі 32 [1151, с. 5], перастала дзейнічаць беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах.

Дамінуючым напрамкам дзейнасці Таварыства з'яўлялася культурна-асветніцкая праца. Нягледзячы на цяжкасці і перашкоды, сумесна з іншымі

арганізацыямі і ўстановамі Заходняй Беларусі ТБШ змагло наладзіць кнігавыданне і часткова забяспечыць падручнікамі беларускія школы не толькі ў межах Польшчы, але і Латвіі, Літвы. Кніжная прадукцыя паступала таксама з Мінска, Каўнаса.

У першай палове 1920-х гг. заходнебеларускае грамадства атрымала магчымасць абароны сваіх нацыянальна-культурных правоў на парламенцкім узроўні. Прадстаўнікі Беларускага пасольскага клуба і на агульных пасяджэннях польскага сейма і сената, і ў час працы асобных секцый, камісій выступалі супраць закрыцця беларускіх школ, патрабавалі адкрыць беларускую настаўніцкую семінарыю, курсы, дапусціць выкладанне беларускай мовы ва ўстановах адукацыі, прыняць адпаведнае школьнае заканадаўства і г. д. Так, пры абмеркаванні бюджэта міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы 1 ліпеня 1924 г. А. Станкевіч дамагаўся матэрыяльнай падтрымкі для беларускіх адукацыйных устаноў [576]. На працягу 1922–1924 гг. беларускія дэпутаты накіравалі польскаму ўраду 12 запытаў адноснага грубых парушэнняў у галіне беларускай асветы [383, с. 4–6, 31, 36–37, 130–131, 174–175]. У выніку разгорнутай беларускімі пасламі і сенатарамі шырокай растлумачальнай працы ў заходнебеларускіх мястэчках і вёсках у 1923/1924 навуч. годзе адбываўся байкот польскіх школ ці непрыхільнае стаўленне да іх [247, арк. 149].

Да сярэдзіны 1920-х гг. ТБШ у асноўным пазбягала выкарыстання радыкальных палітычных метадаў і сродкаў абароны адукацыйных правоў беларусаў. Пераадолець нешматлікасць, вузкую сацыяльную базу ТБШ магло ў ходзе пераўтварэння ў каардынуючы орган па правядзенню кампаніі па складванню і падачы дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ, якая актывізавалася на месцах восенню 1924 г. Маючы структурныя адзінкі на Віленшчыне, у Клецку, Навагрудку, Радашковічах, ТБШ пачало распаўсюджваць свой уплыў і на іншыя мясцовасці. У такіх абставінах для дзейнасці Беларускага пасольскага клуба значнасць набывалі наступныя задачы: “дамагацца ажыццяўлення на практыцы моўнай уставы (закона), закрыцця польскіх школ і адкрыцця замест іх дзяржаўных беларускіх пачатковых школ, … заснавання беларускіх настаўніцкіх курсаў” [960, арк. 5]. У сакавіку 1925 г. у ТБШ у Вільні было зарэгістравана 6 524 дэкларацыі аб навучанні па-беларуску 9 520 дзяцей (табліца 2.1 [519, арк. 148–154]). У многіх паветах працягвалася распачатая школьная кампанія. ТБШ аказвала інструктыўна-метадычную дапамогу [520, арк. 22]. Па звестках ТБШ, да канца 1925 г. было пададзена каля 15 тыс. дэкларацый [61, с. 100]. Складваліся таксама дэкларацыі аб адкрыцці прыватных беларускіх пачатковых школ: у пачатку 1925 г. – на адкрыццё 95 такіх школ, да 1927 г. – 109 [524, арк. 3], аднак дазвол быў атрыманы толькі на

асобныя з іх. У 1927 г. налічвалася 33 беларускія прыватныя школы, якія былі заснаваны пераважна ў канцы 1924 – пачатку 1925 г. [518, арк. 46–46адв.].

Табліца 2.1 – Ход падачы дэкларацый аб адкрыцці дзяржаўных беларускіх пачатковых школ у Заходняй Беларусі (1924–1926 гг.) (пазначаныя* няпоўныя з-за адсутнасці звестак па асобных гмінах)

| Паветы | сакавік 1925 г. | | 1926 г. | |
|---|---|---|---|---|
| | Колькасць дэкларацый | Колькасць дзяцей | Колькасць дэкларацый | Колькасць дзяцей |
| Ашмянскі | 52 | 99 | - | - |
| Браслаўскі | - | - | 52 | 73 |
| Вілейскі | - | - | 830 | 1 280 |
| Віленскі | 592 | 895* | - | - |
| Дзісенскі | 587 | 988* | 394 | 673 |
| Дунілавіцкі | 181 | 197* | - | - |
| Маладзечанскі | - | - | 841 | 1 407 |
| Пастаўскі | - | - | 134 | 213 |
| Свянцянскі | 78 | 109 | - | - |
| Усяго ў Віленскім ваяводстве | 1 490 | 2 288* | 2 251 | 3 646 |
| Баранавіцкі | 40 | 55 | 324 | 486 |
| Валожынскі | 94 | 136 | 124 | 189 |
| Лідскі | 55 | 90 | 243 | 365 |
| Навагрудскі | 565 | 836 | 1 994 | 2 806 |
| Нясвіжскі | 570 | 906 | 20 | 30 |
| Слонімскі | 508 | 772 | 940 | 1 270 |
| Стаўбцоўскі | - | - | 644 | 909 |
| Усяго ў Навагрудскім ваяводстве | 1 832 | 2 795 | 4 289 | 6 055 |
| Косаўскі | 1 159 | 1 568 | 485 | 643 |
| Лунінецкі | 24 | 38 | - | - |
| Пінскі | 27 | 40 | 59 | 93 |
| Пружанскі | 1 294 | 1 754 | 725 | 980 |
| Столінскі | 32 | 40 | - | - |
| Усяго ў Палескім ваяводстве | 2 536 | 3 440 | 1 269 | 1 716 |
| Ваўкавыскі | 212 | 326 | 69 | 144 |
| Гродзенскі | 454 | 671 | 1 540 | 2 068 |
| Усяго ў Беластоцкім ваяводстве | 666 | 997 | 1 609 | 2 212 |
| Усяго ў Заходняй Беларусі | 6 524 | 9 520 | 9 418 | 13 629 |

Беларускі пасольскі клуб папярэдзіў спробу праўрадавай, паланафільскай Беларускай часовай рады на чале з А. Паўлюкевічам, якая ўзнікла ў верасні 1924 г., перахапіць у ТБШ ініцыятыву і падначаліць сабе існуючыя беларускія школы. Яе таварыства "Прасвета" імкнулася гэта зрабіць на сходзе настаўнікаў 18–19 снежня 1924 г. У асобным лісце на адрас польскага ўрада кіраўнікі "Прасветы" дзеля ўзмацнення пазіцыі польскай культуры прапаноўвалі рэалізаваць мінімальныя патрабаванні ў галіне адукацыі [31, арк. 4]. Аднак беларускія дэпутаты прадухілілі авантурную акцыю кола паланафільскіх дзеячаў, якія не карысталіся падтрымкай беларускага насельніцтва.

Станоўчы ўплыў на арганізацыйны рост ТБШ аказала Беларуская сялянска-работніцкая грамада, якая выступала за адзіную працоўную школу з выкладаннем на роднай мове вучняў, з бясплатным навучаннем за кошт дзяржавы [574, с. 10–11]. Лідэры Грамады настойліва адстойвалі нацыянальныя правы беларусаў у польскім сейме. Гурткі Грамады праводзілі працу па самаадукацыі людзей, стваралі ў вёсках бібліятэкі-чытальні, збіралі сродкі для будаўніцтва школьных будынкаў. На месцах была разгорнута масавая агітацыйная кампанія за адкрыццё дзяржаўных беларускіх школ [485, арк. 65; 38, арк. 55].

Паводле новага статута ТБШ, зацверджанага 18 мая 1926 г. віленскім ваяводай, асноўнымі кіруючымі органамі сталі Галоўная ўправа і Наглядная рада, дзейнасць ТБШ пашырылася на ўсю Заходнюю Беларусь [648, с. 3]. У склад выбранай 8 верасня 1926 г. Галоўнай управы ТБШ увайшлі Р. Астроўскі (старшыня) [959, арк. 15], яго намеснікі – А. Уласаў, А. Неканда-Трэпка, а таксама Б. Тарашкевіч, М. Кепель, М. Сіняўскі, Я. Шнаркевіч, М. Марцінчык, Ф. Стацкевіч, У. Лукашэвіч, А. Коўш, І. Савіцкі, П. Мятла, А. Мацейчык, І. Дварчанін, М. Шавель. У склад Нагляднай рады былі выбраны С. Рак-Міхайлоўскі (старшыня), К. Крук, У. Самойла, Ф. Акінчыц, С. Астапчык [515, арк. 317; 38, арк. 73]. Аналіз персанальнага складу кіраўніцтва ТБШ сведчыць аб перавазе там дзеячаў Грамады і яе прыхільнікаў з ліку інтэлігенцыі нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі.

Супрацоўніцтва з БСРГ дало магчымасць ТБШ стварыць уласную сетку арганізацыйных адзінак ва ўсім краі. Улічваючы складанае матэрыяльнае становішча радавых гурткоўцаў заходнебеларускіх вёсак і мястэчак, Галоўная ўправа ТБШ пагаджалася зменшыць ці нават вызваліць іх ад уплаты членскіх узносаў [76, с. 214]. Паводле няпоўных звестак, у канцы 1926 г. налічвалася больш 250 гурткоў, 3 акруговыя ўправы (у Вілейцы, Гродна, Навагрудку), а агульная лічба членаў дасягнула 3,5 тыс. чалавек, большасць якіх належала да Грамады [61, с. 100]. Параўнальны аналіз статыстычных матэрыялаў сведчыць аб тым, што пераўтварэнне

ТБШ у “другую лінію акопаў” Грамада пачала рэалізоўваць напярэдадні ці адразу пасля свайго разгрому. За перыяд з 26 лістапада 1926 г. да 15 лютага 1927 г. колькасць гурткоў ТБШ вырасла амаль у 2,5 разы, а колькасць іх членаў – у больш, чым 3 разы [табліца 2.2 [518, арк. 1]; 570, с. 108]. Такая сітуацыя спрыяла пераўтварэнню ТБШ у масавую арганізацыю. Уцалелыя ад ганенняў грамадаўцы пераходзілі ў яго гурткі. У наступны перыяд (да сярэдзіны 1927 г.) у сувязі з рэпрэсіўнымі дзеяннямі рэжыма “санацыі” назіралася нязначная адмоўная дынаміка ў колькасці гурткоў Таварыства пры адначасовым няўхільным павелічэнні іх колькаснага складу. Параўнанне геаграфічнага размяшчэння гурткоў Грамады і ТБШ у той перыяд паказвае, што сетка гурткоў Таварыства ахапіла ўсю тэрыторыю ўплыву былой Грамады, за выключэннем Ашмянскага, Віленска-Трокскага, Свянцянскага, Столінскага паветаў, дзе яе арганізацыйныя структуры былі нешматлікімі ці існавалі фармальна. Асабліва хуткае развіццё арганізацыйнай структуры ТБШ назіралася ў другой палове 1927 – першай палове 1928 гг. Большасць гурткоўцаў складалі сяляне, асабліва моладзь. Іх падтрымлівалі таксама рабочыя, прадстаўнікі дэмакратычнай інтэлігенцыі. Склаліся прынцыпы арганізацыйнай пабудовы (гурткі – павятовыя, акруговыя ўправы – агульны з’езд (у перапынках – Галоўная ўправа)), асноўныя метады і формы працы. У канцы 1927 г. у заходнебеларускіх землях дзейнічала 12 акруговых упраў ТБШ (у Баранавічах, Беластоку, Вілейцы, Вільні, Гродне, Глыбокім, Косаве, Лідзе, Міры, Навагрудку, Свіслачы, Слоніме). Вынікі арганізацыйнага развіцця Таварыства падвёў яго І з’езд у Вільні (28–29 снежня 1927 г.). У прынятай рэзалюцыі патрабавалася адкрыць дзяржаўныя беларускія пачатковыя школы, гімназіі, настаўніцкія курсы, семінарыю, стварыць пры школьных папячыцельствах асобныя аддзелы і г. д. У сувязі з выбыццём па працэсу Грамады некаторых членаў Галоўнай управы яе ўзначаліў А. Неканда-Трэпка. Гурткі ТБШ дзейнічалі на тэрыторыі Ашмянскага, Браслаўскага, Маладзечанскага, Навагрудскага, Пастаўскага, Дзісенскага, Вілейскага, Баранавіцкага, Слонімскага, Стаўбцоўскага, Нясвіжскага, Лідскага, Шчучынскага, Беластоцкага, Бельскага, Сакольскага, Ваўкавыскага, Гродзенскага, Косаўскага, Пружанскага, Пінскага паветаў, Вільні [табліца 2.2]. Да сярэдзіны 1928 г. колькасць гурткоў ТБШ дасягнула 430 (14–15 тыс. чалавек), а ў сярэдзіне 1930 г. перавысіла 500 (больш 15 тыс. чалавек) (лічба ў 30 тыс. чалавек не пацвярджаецца архіўнымі крыніцамі), пераважная большасць якіх дзейнічала ў сельскай мясцовасці.

Агітацыйнае забеспячэнне школьнай акцыі, стварэнне кааператываў, арганізацыя бібліятэк, народных дамоў і іншых культурна-асветніцкіх устаноў сталі асноўнымі напрамкамі дзейнасці ТБШ. Для правядзення

культурна-асветніцкай работы ТБШ стварала бібліятэкі, хаты-чытальні, клубы, народныя дамы, аказвала ім метадычную дапамогу. Кнігі і газеты можна было набыць ў беларускіх кнігарнях у Вільні, Гродна, Навагрудку, Слоніме. Паводле некаторых звестак, у канцы 1920-х гг. налічвалася 208 бібліятэк-чытальняў, 93 народныя дамы. Тэматыка лекцый, якія там наладжваліся, была даволі разнастайнай: пытанні вясковай гаспадаркі, кааперацыі, літаратуры, гігіены і іншыя. У асобных гуртках праводзілася барацьба з п'янствам, хуліганствам, праводзіўся збор фальклору і г. д.

Табліца 2.2 – Стан ТБШ (15.02.1927 г.)

| павет | Колькасць гурткоў | Колькасць членаў | Колькасць бібліятэк-чытальняў | Кольк. народных дамоў |
|---|---|---|---|---|
| г. Вільня | 3 | 333 | - | - |
| Браслаўскі | 5 | 150 | - | - |
| Вілейскі | 18 | 446 | 6 | 6 |
| Дзісенскі | 17 | 438 | - | - |
| Маладзечанскі | 17 | 412 | 1 | - |
| Пастаўскі | 14 | 263 | - | - |
| Беластоцкі | 13 | 325 | - | - |
| Бельскі | 6 | 125 | 1 | - |
| Ваўкавыскі | 9 | 231 | - | - |
| Гродзенскі | 63 | 1 242 | 9 | 5 |
| Сакольскі | 4 | 100 | - | - |
| Баранавіцкі | 5 | 85 | 1 | - |
| Валожынскі | 6 | 119 | - | - |
| Лідскі | 25 | 550 | - | - |
| Навагрудскі | 49 | 1 683 | 16 | 1 |
| Нясвіжскі | 5 | 146 | - | - |
| Слонімскі | 25 | 472 | 1 | - |
| Стаўбцоўскі | 30 | 582 | 5 | 1 |
| Брэсцкі | 1 | 18 | - | - |
| Косаўскі | 52 | 1 483 | 17 | 3 |
| Пінскі | 4 | 58 | 1 | - |
| Пружанскі | 1 | 244 | 2 | - |
| Усяго ў Заходняй Беларусі | 382 | 9 505 | 60 | 16 |

Арганізаваная ТБШ школьная кампанія набыла масавы характар – да сярэдзіны 1926 г. было складзена каля 16 тыс. дэкларацый на адкрыццё 412 беларускіх школ [38, арк. 55; 1150, с. 15]. У снежні 1926 г. Галоўная ўправа ТБШ у адкрытым лісце Ю. Пілсудскаму дамагалася аказаць уздзеянне на мясцовыя ўлады адносна дакладнага выканання г. зв. "крэсовых законаў", працягу тэрміну падачы дэкларацый на 3 месяцы [824, арк. 13–14]. Пасля разгрому Грамады кампанія па збору дэкларацый аб

адкрыцці беларускіх школ працягвалася. Да 1928 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі было пададзена больш 30 тыс. заяў на адкрыццё 1 229 беларускіх школ [524, арк. 2]. Аднак абсалютная большасць заяў пад рознымі падставамі была праігнаравана польскай адміністрацыяй. Пазітыўна ацэньваючы палітыку віленскага ваяводы У. Рачкевіча, Л. Васілеўскі ў ходзе паездкі ў заходнебеларускія землі ў студзені 1926 г. рэкамендаваў адкрываць беларускія школы там, дзе гэтага жадала насельніцтва. Аднак наступная хваля рэпрэсіўных дзеянняў выключыла такую магчымасць, хоць польскія ўлады ажыццявілі з тактычных меркаванняў некаторыя ўступкі. Так, у 1928/1929 навуч. годзе у 8 паветах Віленскай навучальнай акругі дзейнічала 14 беларускіх, 34 польска-беларускіх і 5 польскіх пачатковых школ, дзе вывучалася беларуская мова [976, арк. 5, 6, 9, 14–15, 18, 20–21, 23, 25], а ўсяго ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах функцыянавалі 21 дзяржаўная беларуская пачатковая школа, 4 прыватныя, 44 польска-беларускіх школ [524, арк. 2]. Асобныя прадстаўнікі польскай адміністрацыі для аслаблення структур ТБШ лічылі мэтазгодным абмежаваць выкладанне беларускай мовы толькі ў дзяржаўных школах. Нягледзячы на нязначныя рэальныя вынікі, праведзеная ТБШ школьная кампанія паспрыяла абуджэнню грамадскай і нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва.

Заходнебеларускі культурна-асветніцкі рух актывізаваўся пад уплывам паспяховага разгортвання ў 1920-я гг. нацыянальна-культурнай палітыкі ў Савецкай Беларусі. Адтуль аказвалася арганізацыйная, ідэалагічна-прапагандысцкая, вучэбна-метадычная, фінансавая дапамога. На пасяджэнні Бюро дапамогі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б 17 ліпеня 1924 г. было прынята рашэнне пра браніраванне па лініі Наркамасветы да 50 месцаў у ВНУ рэспублікі для заходнебеларускай моладзі [500, арк. 1]. У рамках рашэнняў, прынятых на нелегальнай нарадзе прадстаўнікоў цэнтральных камітэтаў КПП, КПЗБ, КП(б)Б з кіраўнікамі пасольскага клуба Грамады, якая адбылася ў канцы жніўня 1925 г. у Сопаце (каля Гданьска), прадугледжвалася матэрыяльная дапамога для беларускіх гімназій, ТБШ, Беларускага кааператыўнага банка. У тэзісах ЦК КП(б)Б “Беларускі рух за кардонам” ад 16 кастрычніка 1925 г. былі вызначаны меры па пашырэнню ў асяроддзі беларускай эміграцыі (у т. л. і ў Заходняй Беларусі) савецкага ўплыву, недапушчэнню стварэння там аб’яднанняў нацыянальнай арыентацыі [379, с. 195, 197]. Урад БССР на закрытым пасяджэнні 5 мая 1926 г. асігнаваў да канца 1926 г. 25 тыс. рублёў, а на 1927 г. прадугледзіў 30 тыс. рублёў. Выдзеленыя для заходнебеларускіх арганізацый на 1926/1927 г. 132 тыс. рублёў прызначаліся як на ўтрыманне Грамады, выданне яе газеты, так і на дапамогу 4 беларускім гімназіям, ТБШ [480, арк. 5]. У бюджэце КПЗБ на 1926/1927 г. з 468 тыс. рублёў для грамадскіх

арганізацый было прызначана 112 тыс. рублёў [586, с. 70–71]. Фінансаванне Грамады і заходнебеларускіх арганізацый ажыццяўлялася праз савецкае пасольства ў Варшаве і асабіста праз гандлёвага прадстаўніка А.Ф. Ульянава [380, с. 25]. На адной нарадзе А. Луцкевіч абмяркоўваў з ім пытанні матэрыяльнай падтрымкі ў школьнай справе. Арганізацыйнымі пытаннямі атрымання з БССР дапамогі для беларускіх гімназій, прэсы, выдавецтваў займаліся Р. Астроўскі, С. Рак-Міхайлоўскі, В. Рагуля і іншыя заходнебеларускія дзеячы [75, с. 74, 44–46; 590, с. 123]. У грамадаўскім друку БССР падавалася ў якасці “беларускага дому”. У Заходняй Беларусі былі зацікаўлены таксама ў атрыманні з БССР не толькі прапагандысцкай літаратуры (адтуль дастаўлялася абсалютная большасць друкаванай прадукцыі КПЗБ, Грамады), але і навуковых, вучэбных выданняў, твораў мастацкай літаратуры і інш. Пасля разгрому Грамады, узмацнення левасектанцкай тэндэнцыі ў заходнебеларускім камуністычным руху, прыняцця Камінтэрнам новай тактыкі ў адносінах да некамуністычнага лагеру матэрыяльная дапамога з краіны Саветаў пайшла на спад.

З усходу аказвалася і велізарная маральная падтрымка заходнебеларускаму руху, хоць яна рэгламентавалася дырэктыўнымі ідэалагічнымі мерамі савецкага партыйнага кіраўніцтва. Так, цэлы шэраг практычных дзеянняў быў нацэлены на пашырэнне хвалі пратэсту грамадскасці БССР у абарону разгромленай Грамады [403, с. 191–192]. Створаны для гэтай мэты камітэт навуковых работнікаў і пісьменнікаў на чале з Я. Купалам выступіў са зваротам “Да навуковых і культурных дзеячаў і працоўных усяго свету” [423, с. 14–16]. У цэлым, прызнаючы пераважна пазітыўны характар савецкага ўплыву на нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі да канца 1920-х гг., нельга перабольшваць яго маштабы і значэнне. Польскім уладам было выгадна прадстаўляць (асабліва еўрапейскай палітычнай эліце і грамадскасці) заходнебеларускі рух праз прызму камуністычнай пагрозы, інспіраваным і фінансуемым з усходу. Пад прыкрыццём прапагандысцкіх жупелаў (“рука Масквы”, “экспазітура камуністаў і Камінтэрна” і іншых) яны адмаўляліся прызнаць заганнасць уласнай палітыкі ў заходнебеларускіх землях. Менавіта ўнутраныя фактары (сацыяльна-эканамічнае прыгнечанне, нацыянальны ўціск, рост грамадскай і нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва і інш.) былі вызначальнымі ў развіцці масавага культурна-асветніцкага руху ў Заходняй Беларусі.

У адрозненне ад Грамады і КПЗБ, якія аказвалі адчувальны ўплыў на ТБШ, лідэры Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі прытрымліваліся іншай ідэалагічнай арыентацыі, выступалі супраць аддзялення школы ад царквы, дамагаліся выхавання дзяцей у школах у клерыкальным духу.

Пасля дасягнення паразумення з Беларускім сялянскім саюзам імі была створана альтэрнатыўная ТБШ культурна-асветніцкая арганізацыя – Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры (БІГіК), якая павінна была пашырыць сацыяльную базу БХД. Паводле статута БІГіК, зацверджанага 26 мая 1926 г., новая арганізацыя павінна была садзейнічаць развіццю сельскай гаспадаркі, промыслаў, народнага мастацтва, духоўнай культуры, навукі і адукацыі. Крыніцамі фінансавання былі вызначаны ўзносы, ахвяраванні, даходы ад рухомай і нерухомай маёмасці, мерапрыемстваў і г. д. [649, с. 1–3, 14]. Сярод заснавальнікаў і кіраўнікоў БІГіК былі А. Більдзюкевіч, А. Станкевіч, А. Назарэўскі, В. Рагуля, В. Багдановіч, А. Уласаў. Першая рэгіянальная арганізацыя (аддзел) БІГіК была створана 28 чэрвеня 1926 г. у Вільні [662, с. 46], пры якой былі створаны секцыі – тэатральна-мастацкая і лекцыйная. Пазней узніклі аддзелы ў Радашковічах, Навагрудку, павялічылася і колькасць нізавых адзінак – у пачатку 1927 г. дзейнічалі 50 гурткоў (каля 800 членаў), 22 бібліятэкі. Асноўнымі формамі працы гурткоў БІГіК сталі лекцыі, разнастайныя ўрачыстыя мерапрыемствы. У ліпені 1926 г. БІГіК заклікаў сваіх прыхільнікаў далучыцца да школьнай кампаніі. Гурткі БІГіК клапаціліся пра стварэнне прыватных беларускіх школ у Бельскім, Беластоцкім, Сакольскім, Аўгустоўскім паветах, якія не падпадалі пад дзеянне г. зв. “крэсовых законаў” [382, с. 17]. На працягу 1926–1928 гг. БІГіК падаваў заявы на адкрыццё некалькіх дзесяткаў прыватных беларускіх школ, аднак дазвол атрымаў толькі на адну. Фінансавыя магчымасці арганізацыі былі абмежаванымі, яна вымушана была карыстацца сродкамі, якія паступалі ад выдавецкай дзейнасці, ахвяраванняў [77, с. 77, 80]. У той час БХД працягвала эвалюцыяніраваць ад клерыкальна-дэмакратычнай арганізацыі да свецкай палітычнай партыі хрысціянска-дэмакратычнага напрамку. У яе другой праграме, прынятай у лістападзе 1927 г., было пацверджана права навучацца ў школах на роднай мове, патрабаванне аб абавязковым выкладанні там рэлігіі. У цэлым, БІГіК павялічваў свой уплыў сярод беларускага каталіцкага насельніцтва пераважна ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах. Ідэалагічныя супярэчнасці выключалі магчымасць супрацоўніцтва БІГіК з ТБШ.

Паланафільскае таварыства “Прасвета” спрабавала наладзіць уласную школьную акцыю пры дапамозе польскіх улад [487, арк. 74–78, 86–94; 31], аднак гэтыя дзеянні не мелі поспеху. Хоць у мемарандуме польскаму ўраду 16 чэрвеня 1926 г. Беларуская часовая рада выклала агульнадэмакратычныя патрабаванні ў галіне культуры і асветы, аднак не магла спадзявацца на пашырэнне свайго ўплыву. Паланафільская Беларуская нацыянальная рада, якая ўзнікла ў выніку перайменавання Беларускай часовай рады на сходзе ў канцы чэрвеня 1926 г., падверглася

жорсцкай крытыцы Грамады і беларускіх хадэкаў. Прапольскі накірунак дзейнасці яшчэ больш умацоўваў у беларусаў адмоўныя стэрэатыпы адносна палякаў [1029, с. 126]. Не атрымаўшы падтрымкі з боку заходнебеларускага грамадства, таварыства "Прасвета" прыйшло ў заняпад, не вытрымала канкурэнцыі з ТБШ і БІГіК.

У ходзе выбарчай кампаніі ў польскі сейм ў сакавіку 1928 г. мясцовы актыў ТБШ агітаваў за кандыдатаў левaрадыкальных поглядаў. Газеты арганізацыі "Змаганне" падрабязна асвятлялі дзейнасць Таварыства, прапагандавалі вопыт культурна-асветніцкай працы, заклікалі падаваць заявы аб адкрыцці беларускіх школ, адкрываць народныя дамы і бібліятэкі-чытальні.

Пасля некалькіх патрабаванняў аб выдаленні з ТБШ былых грамадаўцаў, камуністаў ("падрыўных элементаў") 28 жніўня 1928 г. была забаронена дзейнасць Галоўнай управы ТБШ. Яе функцыі да чарговага з'езда павінна была выконваць часовая камісія (А. Неканда-Трэпка, Я. Шнаркевіч, К. Крук). Разгром легальных структур ТБШ на месцах меў негатыўныя наступствы – заходнебеларускае сялянства было пазбаўлена ўсялякай культурна-асветніцкай працы. У такіх абставінах адкрываліся дадатковыя магчымасці для яго бесперашкоднай паланізацыі рознымі польскімі дзяржаўнымі і грамадскімі інстытутамі.

Неабходна адзначыць, што заходнебеларускія камуністы разам з былымі грамадаўцамі шырока выкарыстоўвалі легальны характар ТБШ, мелі моцны пазітыўны ўплыў у многіх яго акруговых управах, гуртках. У аснову задач па адстойванню нацыянальных правоў заходнебеларускага насельніцтва, сфармуляваных у прынятай рэзалюцыі на І з'ездзе КПЗБ у чэрвені-ліпені 1928 г., былі пакладзены патрабаванні агульнадэмакратычнага характару. Аднак у практычнай дзейнасці заяўленыя пастулаты не выконваліся. Заходнебеларускія дзеячы нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі разглядаліся камуністамі не як партнёры, а як непрымірымыя ідэалагічныя праціўнікі.

Ідэалагічна-палітычная раз'яднанасць у кіраўніцтве ТБШ узмацнілася пасля забароны яго Галоўнай управы. У адрозненне ад групы нацыянальна-дэмакратычных дзеячаў, якія імкнуліся абмежаваць ТБШ выключна культурна-асветніцкай працай, камуністы, прадстаўнікі "Змагання" І. Дварчанін, Я. Гаўрылік і іншыя выступалі за актыўную палітычную працу Таварыства. Барацьба супраць нацыянальнага ўціску звязвалася імі неадрыўна з класавым змаганнем. Якраз актыўная дзейнасць "Змагання" дазволіла захаваць рэвалюцыйна-дэмакратычны характар ТБШ [105, с. 93]. Імкненне да палітызацыі работы ТБШ было, па-першае, натуральным вынікам пашырэння рэвалюцыйна-дэмакратычных настрояў у заходнебеларускім грамадстве, па-другое, сведчыла адначасова аб

тэндэнцыі наўмыснага фарсіравання там палітычных працэсаў, што не магло не выклікаць узмацнення канфрантацыйнага характару ва ўзаемаадносінах розных ідэалагічных лагераў. Пераацэнка, спрашчэнне аб'ектыўных тэндэнцый развіцця грамадства заходнебеларускім камуністычным рухам, кіраўніцтва якога вылучала максімалісцкія лозунгі і патрабаванні [434, с. 85–86], нецярпімыя адносіны з нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыяй, якую абвінавачвалі ў здрадзе беларускаму народу, выключалі магчымасці іх супрацоўніцтва. Лідэры "Змагання" (І. Дварчанін і некаторыя іншыя) імкнулася супрацоўнічаць з правымі нацыянальна-дэмакратычнымі дзеячамі, аднак такая пазіцыя падвяргалася вострай крытыцы з боку камуністаў. Раскол у кіраўніцтве Таварыства адбіўся і на становішчы яго нізавых структур. З восені 1928 г. супрацьстаянне перакінулася ў акруговыя і павятовыя ўправы, што падрывала адзінства ТБШ. Заходнебеларускія камуністы заклікалі ўзмацніць барацьбу з прыхільнікамі згодніцтва. Дзякуючы актыўнай агітацыйнай працы клуба "Змаганне", на агульны з'езд ТБШ у Вільні ў снежні 1928 г., на правядзенне якога польскія ўлады не далі дазволу, былі выбраны пераважна прыхільнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў. У цэлым, рэпрэсіўныя дзеянні польскіх улад падрывалі пазіцыі ТБШ. На працягу 1928 – першай паловы 1929 гг. было закрыта больш 100 гурткоў, 5 акруговых упраў – у Глыбокім, Вілейцы, Навагрудку, Слоніме, Гродне [524, арк. 8].

Канфрантацыйныя адносіны ўнутры ТБШ набылі асаблівую вастрыню вясной 1929 г., калі праводзілася падрыхтоўка да правядзення агульнага з'езда. У духу рашэнняў VI кангрэса Камінтэрна (ліпень-верасень 1928 г.) ЦК КПЗБ прыняў рэзалюцыю з катэгарычным патрабаваннем да ўпраў і гурткоў Таварыства не падпарадкоўвацца часовай камісіі, абвастрыць барацьбу з "беларускімі сацыял-фашыстамі". Запланаваны з'езд адбыўся нелегальна ў Вільні 19 мая 1929 г. Большасць яго дэлегатаў, сярод якіх пераважалі камуністы, камсамольцы і іх прыхільнікі, была затрымана паліцыяй. Дзеячы нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, якія выступалі супраць палітызацыі ТБШ – Р. Астроўскі, А. Луцкевіч, А. Трэпка, В. Грышкевіч, А. Уласаў, Я. Станкевіч, Я. Шнаркевіч, А. Коўш, М. Чатырка і іншыя – былі выключаны з яго за "шкодную дзейнасць". У новы склад Галоўнай управы ўвайшлі Ф. Стацкевіч (старшыня), М. Пяткевіч, Р. Шырма, І. Дварчанін, Ф. Валынец, І. Грэцкі, П. Крынчык, М. Кепель, М. Марцінчык, П. Пяткун, Нагляднай рады – А. Лябецкая, Н. Ламашэвіч, А. Астравецкі, У. Рэшэта. Галоўнай задачай Галоўнай управы ТБШ стала легалізацыя ўласнай дзейнасці.

Пасля з'езда супрацьстаянне ўнутры ТБШ узмацнілася. Нізавыя гурткі былі ўцягнуты ў акцыю байкоту прыхільнікаў згодніцкіх дзеянняў.

Нацыянальна-дэмакратычнае крыло, якое аб'ядноўвала прыхільнікаў згодніцтва, правяло 9 ліпеня 1929 г. агульны сход ТБШ, на якім выказала сваю ранейшую пазіцыю аб выключна культурна-асветніцкім характары Таварыства, але пры гэтым у інтарэсах захавання арганізацыі зацвердзіла выбраную на з'ездзе 19 мая 1929 г. яе Галоўную ўправу [75, с. 84].

Адным з важных напрамкаў дзейнасці ТБШ з'яўлялася аказанне матэрыяльнай, вучэбна-метадычнай працы беларускім гімназіям. Сярод іх найперш вылучалася гімназія ў Вільні, заснаваная І. Луцкевічам яшчэ ў лютым 1919 г. У міжваенны час Віленскую гімназію ўзначальвалі М. Кахановіч, Б. Тарашкевіч, А. Неканда-Трэпка, Р. Астроўскі, С. Паўловіч, М. Анцукевіч. Віленская гімназія да 1932 г. была прыватнай 8-класнай навучальнай установай гуманістычнага тыпу. Акрамя сціплых матэрыяльных сродкаў ТБШ, бацькоўскага камітэта, выкарыстоўваліся прыватныя ахвяраванні, адлічэнні беларускіх паслоў і сенатараў, дапамога ад беларускай эміграцыі. Паступовым (да 1924 г.) з'яўляўся працэс пераходу гімназіі да выкладання ўсіх прадметаў на беларускай мове. У гімназіі працаваў кваліфікаваны педагагічны калектыў. Сярод настаўнікаў былі відныя дзеячы грамадска-культурнага жыцця Заходняй Беларусі М. Гарэцкі, А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, А. Станкевіч, А. Смоліч, С. Рак-Міхайлоўскі, С. Паўловіч, І. Дварчанін, Я. Драздовіч, Р. Шырма і іншыя. Выкладчыцкай і выхаваўчай працай там таксама займаліся Л. Чарняўская-Гарэцкая, аўтар чытанак "Родны край" для вучняў пачатковых школ, А. Сакалова-Лекант, Ю. Мэнке, А. Якубецкі, М. Красінскі і іншыя [995; 820; 825–826]. Нягледзячы на рознасць палітычных поглядаў, нацыянальную і канфесійную прыналежнасць, настаўнікі прывівалі вучням павагу да агульначалавечых каштоўнасцей, нацыянальнай гісторыі, культуры, мовы, фарміравалі гуманістычны светапогляд [686, арк. 8]. Настаўнікі Віленскай беларускай гімназіі актыўна займаліся вучэбна-метадычнай працай, удзельнічалі ў падрыхтоўцы і выданні вучэбнай літаратуры.

У пачатку 1920-х гг. непрацяглы час дзейнічалі некалькі беларускіх гімназій. Не вытрымаўшы ўціску і фінасавых цяжкасцей, спыніла сваё існаванне ў 1921/1922 навуч. годзе беларуская гімназія ў Гродна. У заснаванай прыватнай беларускай гімназіі гуманітарнага тыпу ў Гарадку Вілейскага павета спачатку існавалі толькі 4 асноўныя класы і 1 падрыхтоўчы. Сярод настаўнікаў неабходна адзначыць К. Тышкевіча, П. Баталіна, С. Караля, А. Агіевіча і іншых [508, арк. 10–11; 512, арк. 87; 513; 30, арк. 49–53; 53, арк. 69; 973]. З-за матэрыяльных цяжкасцей, адміністрацыйных перашкод, аддаленасці ад густанаселенай мясцовасці кіраўніцтва гімназіі ў Гарадку з 1922 г. беспаспяхова спрабавала перанесці

яе ў Валожын [509, арк. 5адв.]. У канцы 1923 г. польскія ўлады закрылі беларускую гімназію ў Гарадку.

Канцэсія (дазвол) на ўтрыманне прыватнай беларускай жаночай гімназіі ў Нясвіжы, адкрытай у 1921 г., была выдадзена памешчыку Е. Жаўняркевічу. Акрамя дырэктара К. Шчэнсновіча, педагагічнай працай там займаліся М. Заморын, Я. Шнаркевіч, Р. Якубёнак і іншыя настаўнікі [988, арк. 26адв.; 30, арк. 13, 55–61; 53, арк. 70]. У 1923 г. польскія школьныя ўлады адмовіліся выдаць дазвол на ўтрыманне гэтай навучальнай установы, спасылаючыся на адсутнасць адпаведнай зацікаўленасці з боку беларускага насельніцтва, нізкі ўзровень навучання, слабую матэрыяльна-тэхнічную базу і інш. [511, арк. 3]. Традыцыі гэтай установы былі прадоўжаны ў створанай у 1924 г. беларускай гімназіі ў Клецку.

Беларуская 8-класная гімназія гуманітарнага тыпу імя Ф. Скарыны ў Радашковічах Маладзечанскага павета была адкрыта ў 1922 г. рэгіянальнай арганізацыяй ТБШ, заснаванай сенатарам А. Уласававым. У гімназіі працаваў кваліфікаваны персанал – дырэктары А. Вернікоўскі, Ф. Стацкевіч, настаўнікі Я. Гаўрылік, С. Кароль, М. Касцевіч і іншыя. Акрамя платы за вучобу, матэрыяльная дапамога для гімназіі ў Радашковічах паступала як ад ТБШ і асабіста А. Уласава, так і з БССР. За ўвесь перыяд існавання Радашковіцкай гімназіі там вучылася больш 860 чалавек (з іх 86 атрымалі “матуру” (атэстат)) [535; 392, с. 75]. У якасці атрымальніка канцэсіі (дазволу) і будучы сенатарам А. Уласаў неаднаразова адстойваў інтарэсы гімназіі ў розных польскіх ведамствах і ўстановах.

Аўтарытэтам у мясцовага насельніцтва карысталася заснаваная яшчэ ў 1919 г. прыватная 8-класная беларуска-руская гімназія прыродазнаўчага тыпу ў Навагрудку. У 1923/1924 навуч. годзе вучнёўскі кантынгент дасягнуў 237 дзяцей, якія паходзілі пераважна з сялянскіх і мяшчанскіх сем’яў. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, там паступова ішоў працэс беларусізацыі навучальнага працэсу. У 1925/1926 навуч. годзе беларускамоўным выкладаннем прадметаў былі ахоплены 1–5-я класы. Акрамя дырэктараў Я. Цеханоўскага, П. Скрабца, выкладчыцкай працай там займаліся А. Данілевіч, М. Чатырка, А. Валынчык і іншыя. Навучэнцы былі ўцягнуты ў працу шэрагу гурткоў – па беларусазнаўстве, прыродазнаўстве, сусветнай літаратуры [517, арк. 1–1адв.; 987; 713, с. 23–36]. Пасля атрымання ў 1926 г. зямельнага ўчастка для будаўніцтва школьнага будынка праводзілася кампанія па збору ахвяраванняў. Ва ўрачыстай цырымоніі закладкі каменю пад будынак гімназіі у 1928 г. прысутнічаў прэзідэнт Польшчы Ю. Масціцкі, які ахвяраваў 3 тыс. злотых. Матэрыяльную дапамогу аказалі беларускія парламентарыі, якія таксама

дабіліся ад польскага сейма выдзялення датацыі ў памеры 300 тыс. злотых. Падтрымку аказалі і беларускія эмігранты ў ЗША.

Пазіцыі ТБШ у Клецкай беларускай гімназіі, якая мела матэматычна-прыродазнаўчы профіль, былі слабымі, бо атрымальнікам канцэсіі (дазволу) да 1930 г. з'яўляўся А. Якімовіч, адзін з кіраўнікоў паланафільскай культурна-асветніцкай арганізацыі "Прасвета". Акрамя яго і дырэктара Р. Якубёнка, настаўнікі В. Арэнь, В. Русак, А. Валынчык, Ю. Мушкат, В. Сініцына і іншыя на належным узроўні выкладалі вучэбныя прадметы, прывівалі павагу да нацыянальнай і сусветнай спадчыны. Створаны ў гімназіі літаратурны гурток быў пераўтвораны ў літаратурна-мастацкі [990; 982; 71; 536]. Нягледзячы на ідэалагічнае размежаванне, мясцовая беларуская грамадскасць імкнулася падтрымліваць гімназію. За перыяд з 1925/1926 да 1930/1931 навуч. году колькасць вучняў вырасла з 58 да 160 [622; 1137; 620, с. 29, 30]. Акрамя ўцалелых у другой палове 1920-х гг. 4-х беларускіх гімназій (у Вільні, Навагрудку, Радашковічах, Клецку) рабіліся спробы адкрыць такія навучальныя ўстановы ў Глыбокім, Гродна, Слоніме, Дзісне, Лідзе, Пінску і іншых гарадах. Аднак адсутнасць фінансавых сродкаў, рэпрэсіі польскіх улад і шэраг іншых прычын не дазволілі рэалізаваць праекты адкрыцця новых беларускіх сярэдніх школ.

Нягледзячы на прэтэнзіі польскіх школьных улад адносна слабога ўзроўню навучання ў беларускіх адукацыйных установах, што было адной з падстаў для іх закрыцця, гэтай праблематыцы надавалася прыярытэтнае значэнне ў беларускіх гімназіях (асабліва Віленскай). Пад уплывам вызваленчай барацьбы, грамадска-палітычнага руху за дэмакратызацыю адукацыі вызначаўся змест навучання і выхавання ў беларускіх гімназіях і пачатковых школах. Адным з актыўных прапагандыстаў ідэй дэмакратызацыі народнай школы з'яўляўся С. Паўловіч. У брашуры "Аб арганізацыі беларускай працоўнай школы" (1928 г.) [553], на старонках "Беларускага календара" на 1929 г. [62] і асобных публікацыях у друку ім былі дадзены канцэптуальныя тлумачэнні зместу, асноўных задач і напрамкаў выхаваўчага працэсу. Вучэбную літаратуру друкавала Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні. Акрамя Беларускага выдавецкага таварыства, на працягу 20–30-х гг. XX ст. буквары, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі друкаваліся таксама ў віленскіх друкарнях Б. Клецкіна, Я. Левіна, ТБШ, БНТ, Грамады, Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны і іншых. Аднак вучэбная літаратура складала нязначную долю сярод заходнебеларускіх выданняў (58 пазіцый – 13% ад агульнага аб'ёму беларускамоўнай друкаванай прадукцыі) [1165, с. 28].

Заходнебеларуская інтэлігенцыя выказвала рэзкую негатыўную рэакцыю ўвядзеннем з 1929/1930 навуч. года ў беларускіх і польска-беларускіх пачатковых школах буквара (лацінскай азбукай) дырэктара польскай гімназіі ў Вілейцы С. Любіч-Маеўскага. С. Паўловіч у брашуры “Некалькі ўваг аб беларускім “Лемантары” Ст. Любіч-Маеўскага” (1929 г.) [555] прызнаў яго шкодным для нацыянальнай свядомасці дзяцей. Адмаўляючы пераход на лацінскую азбуку, С. Паўловіч лічыў недапушчальным пазбаўленне ад кірылічнага пісьма і яго дасягненняў, якія былі арганічнай часткай агульнанацыянальнай спадчыны.

На педагагічныя погляды настаўнікаў беларускіх гімназій і пачатковых школ на тэрыторыі Заходняй Беларусі станоўчае ўздзеянне аказвалі поспехі ў галіне адукацыі ў БССР у 1920-я гг. У адрозненне ад заходнебеларускіх зямель, у Савецкай Беларусі назіраліся істотныя зрухі ў барацьбе з непісьменнасцю, складваліся перадумовы для рэалізацыі ўсеагульнага пачатковага навучання, ажыццяўляліся на практыцы асноўныя прынцыпы адзінай працоўнай школы, была створана сістэма народнай адукацыі. Адрозненні ідэалагічнага і палітычнага характару не перашкаджалі пераймаць з усходу і ўкараняць, развіваць у навучальным і выхаваўчым працэсе заходнебеларускіх нацыянальных адукацыйных устаноў прагрэсіўныя прынцыпы – дэмакратызм, гуманістычную накіраванасць, сувязь з грамадскай практыкай, вучобу на роднай мове вучняў і іншыя. Улічваючы тое, што беларускія гімназіі ў Польшчы не мелі правоў грамадскіх устаноў, г. зн. іх выпускнікі былі пазбаўлены магчымасці здаваць экзамены для атрымання атэстатаў і паступаць у ВНУ Польшчы (толькі ў 1928 г. Віленская і Навагрудская гімназіі атрымалі такое права), па матэрыяльных, нацыянальных, канфесійных, ідэалагічных падставах быў абмежаваны доступ да вышэйшай школы, то частка моладзі Заходняй Беларусі вымушаны была нелегальна ехаць вучыцца ў БССР. Пасля сканчэння навучальных устаноў яна актыўна ўключалася ў грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё рэспублікі. Па меры пераходу ў наступленне ў БССР супраць “нацыянал-дэмакратызму” з канца 1920-х гг. спрыяльныя адносіны да заходнебеларускай моладзі змяніліся на падазронасць і недавер, прымусовыя і рэпрэсіўныя меры. У такой напружанай маральна-псіхалагічнай атмасферы пад уздзеяннем савецкай прапаганды ў грамадскай свядомасці пачалі складвацца адмоўныя стэрэатыпы адносна заходнебеларускіх гімназій.

Нягледзячы на сваю нешматлікасць, беларускія гімназіі з’яўляліся не толькі нацыянальнымі адукацыйна-выхаваўчымі ўстановамі, але і цэнтрамі грамадска-палітычнага і культурна-асветніцкага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Заснаваны ў Віленскай гімназіі ў пачатку 1920-х гг. культурна-асветніцкі вучнёўскі гурток выдаваў часопіс “Маладое жыццё”, дзе

дэбютавалі маладыя паэты Н. Арсеннева, Х. Ільяшэвіч. Вучнёўскія газеты і часопісы выдаваліся і ў іншых беларускіх гімназіях. На выставе беларускай і ўкраінскай прэсы ў Варшаве ў верасні 1927 г. з 309 беларускіх экспанатаў дэманстраваліся і выданні беларускіх гімназій: часопісы “Покліч”, “Наперад”, “Рэха” (Вільня), “Да сонца”, “Маладая сіла”, “Колас” (Радашковічы), “Наша думка” (Навагрудак) [1072, с. 481]. Гімназісты актыўна прыцягваліся да разнастайных мерапрыемстваў нацыянальна-дэмакратычнай ідэалагічнай арыентацыі.

Гімназісты-камсамольцы аказвалі ўплыў на фарміраванне светапогляду навучэнцаў, арганізоўвалі культурна-асветніцкую работу. У Віленскай гімназіі найбольш актыўнымі ўдзельнікамі камсамольскага падполля з’яўляліся Я. Міско, В. Таўлай, Я. Урбановіч, П. Радзюк, А. Салагуб, М. Васілёк і іншыя. У ходзе забастоўкі ў канцы снежня 1928 г. вучні Віленскай беларускай гімназіі выказвалі пратэст супраць рэпрэсій польскіх улад, асуджалі дзеянні дырэктара Р. Астроўскага, які пасля судовага працэсу Грамады адстойваў пазіцыю супрацоўніцтва з рэжымам “санацыі” і жорстка падаўляў рэвалюцыйна-дэмакратычныя настроі сярод настаўнікаў і асабліва вучняў. Падставай для такога выступлення было выключэнне з гімназіі за “антыдзяржаўную дзейнасць” 18 вучняў [265]. Больш моцныя хваляванні назіраліся ў Віленскай гімназіі 27 лютага 1929 г., якія скончыліся масавымі выключэннямі гімназістаў. У знак пратэсту супраць гэтага пракацілася хваля забастовак у іншых беларускіх гімназіях. Мясцовым паліцэйскім органам было прадпісана ажыццяўляць пільны кантроль за былымі навучэнцамі [368].

Восенню 1929 г. у Віленскай і іншых беларускіх гімназіях выступленні прадоўжыліся [491]. Ізноў для іх падаўлення актыўна прымяняліся гвалтоўныя меры. Выкарыстанне камуністамі і дзеячамі “Змагання” грамадскага руху гімназістаў было для польскіх улад выгаднай падставай для абвінавачвання іх у антыдзяржаўнай дзейнасці. Дачыненне да “камуністычнай змовы” было асноўнай фармальнай падставай для закрыцця ў 1929 г. беларускай гімназіі ў Радашковічах, у 1931 г. – у Клецку.

Нягледзячы на неадназначную ацэнку вынікаў забастовак, акцый пратэсту ў беларускіх гімназіях, іх заангажаванасць у дзейнасць камуністаў і іх прыхільнікаў, варта іх лічыць у якасці акцый у абарону сацыяльных і нацыянальна-культурных правоў заходнебеларускага насельніцтва. У час выступленняў навучэнцы праявілі высокі ўзровень грамадскай і нацыянальнай свядомасці. Многія выключаныя з гімназій (Я. Скурко (М. Танк), В. Таўлай і іншыя) працягвалі актыўна ўдзельнічаць у заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым руху.

Ажыўленне заходнебеларускага культурна-асветніцкага руху назіралася пасля зняцця забароны дзейнасці Галоўнай управы ТБШ у канцы жніўня 1929 г. Такая ўступка польскіх улад дыктавалася тактычнымі меркаваннямі – імкненнем выкарыстаць правацэнтрысцкае крыло Таварыства для барацьбы з левымі сіламі [473, с. 211]. На той час дзейнічалі толькі 4 акруговыя ўправы ТБШ – у Баранавічах, Беластоку, Косаве, Міры. З 483 (паводле іншых крыніц – 432) гурткоў ТБШ больш 200 было ліквідавана. Найбольш разгалінаваная іх сетка заставалася ў Косаўскім (61), Слонімскім (57), Навагрудскім (50), Гродзенскім (48) паветах). Паслы "Змагання" актыўна займаліся аднаўленнем арганізацыйнай сеткі ТБШ у Палескім, Віленскім, Навагрудскім ваяводствах. Нягледзячы на рэпрэсіўныя дзеянні польскіх улад, актывізацыя легальнай дзейнасці структур Таварыства на месцах адбывалася пры цесным кантакце з дзеячамі "Змагання" [148, арк. 90–92]. Мясцовыя актывісты імкнуліся ажывіць культурна-асветніцкую дзейнасць. Як сведчыць аналіз звестак табліцы 2.3 [147, арк. 28; 169], у Палескім ваяводстве найбольш разгалінаваная сетка гурткоў была якраз у Косаўскім павеце. Замест забароненага Беларускага выдавецкага таварыства ў пачатку 1930 г. было створана ў Беластоку выдавецкае таварыства "Рунь" і кніжная крама [258, арк. 45].

Табліца 2.3 – Стан ТБШ у Палескім ваяводстве ў 1929–1933 гг.

| Павет | 1929 г. | | 1930 г. | | 1931 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. |
| Косаўскі | 44 | 868 | 44 | 860 | 45 | 970 |
| Пружанскі | 8 | 134 | 10 | 162 | 5 | 67 |
| Пінскі | 2 | 56 | 3 | 66 | 3 | 55 |
| Брэсцкі | 1 | - | 1 | - | - | - |
| Усяго ў ваяводстве | 55 | 1 058 | 58 | 1 088 | 54 | 1 092 |
| Працяг табліцы 2.3 | | | | | | |
| Павет | 1932 г. | | Сакавік 1933 г. | | Май 1933 г. | |
| | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. |
| Косаўскі | 46 | 991 | 23 | 662 | - | - |
| Пружанскі | 5 | 57 | 3 | 47 | - | - |
| Пінскі | - | - | - | - | - | - |
| Брэсцкі | - | - | - | - | - | - |
| Усяго ў ваяводстве | 51 | 1 048 | 26 | 709 | - | - |

Ужо з восені 1929 г. была адноўлена практыка складвання дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ, у тым ліку на Палессі [237]. На з'ездзе акруговай управы ТБШ у Міры 28 чэрвеня 1931 г. было вырашана разгарнуць школьную акцыю. Аднак пасля арыштаў польскіх улад у канцы

1931 г. структуры ТБШ не праяўлялі актыўнасці. У цэлым, рэальныя вынікі школьнай кампаніі былі нязначныя, бо мясцовыя ўлады паўсюдна адмаўляліся зацвярджаць подпісы, перашкаджалі іх збору.

Пры актыўным удзеле камуністаў структуры ТБШ выступалі як супраць польскіх улад, так і супраць “беларускай санацыі”. Адначасова з іх боку беспадстаўна праяўляліся падазроныя адносіны да І. Дварчаніна, Р. Шырмы і іншых кіраўнікоў ТБШ. У інтарэсах захавання Таварыства памяркоўныя дзеячы, прадстаўнікі інтэлігенцыі на пасяджэннях Галоўнай управы, асобнай канферэнцыі ў 1930 г. выступалі супраць левасектанцкай пазіцыі камуністаў, выказваючы адначасова незадаволенасць падзеямі ў БССР (калектывізацыяй, разгорнутай кампаніяй барацьбы супраць “нацыянал-дэмакратызму”) [501, арк. 95]. Нізавыя структуры ТБШ уцягваліся ў супрацьстаянне з Галоўнай управай. Такая барацьба паміж памяркоўным і радыкальным крылом разгарэлася вясной 1931 г. у акруговай управе ТБШ у Беластоку, яе нізавых структурах у Беластоцкім, Ваўкавыскім паветах [252, арк. 69адв.]. На акруговым з’ездзе ТБШ у Беластоку 20 лістапада 1932 г. радыкальныя дзеячы былі падвергнуты крытыцы [254, арк. 29–29адв.]. Польскія ўлады дамагаліся ад Беластоцкай акруговай управы ТБШ выдалення прадстаўнікоў камуністычных поглядаў, імкнуліся прыцягнуць яе да супрацоўніцтва з польскімі праўрадавымі грамадскімі арганізацыямі.

У абставінах ажыўлення дзейнасці ТБШ адначасова працягваліся ў адносінах да яго рэпрэсіі польскіх улад. За перыяд са жніўня 1930 г. да канца 1931 г. было закрыта каля 100 гурткоў. Да пачатку 1932 г. уцалелі толькі 3 акруговыя ўправы – у Беластоку, Косаве, Ваўкавыску. У студзені 1932 г. навагрудскі ваявода забараніў акруговую ўправу ТБШ у Міры і 31 гурток у Стаўбцоўскім павеце. Сярод фармальных падстаў указвалася прысутнасць там камуністаў, недакладнасць у справаводстве і іншыя [522, арк. 3]. Да восені 1932 г. агульная колькасць гурткоў зменшылася да 150 (каля 4 тыс. чалавек) [503, арк. 75]. У большасці паветаў іх дзейнасць спынілася. Гэта прывяло да закрыцця і іх бібліятэк, народных дамоў.

Арыштаваных членаў Галоўнай управы ТБШ абвінавачвалі ў падрыхтоўцы “камуністычнай змовы”. Вынікі судовага працэсу 1–4 лютага 1933 г. у Вільні, у ходзе якога Ф. Стацкевіч, Р. Шырма, М. Пяткевіч былі апраўданы, М. Церах, Ю. Саковіч атрымалі 3, Я. Скурко – 2 гады турэмнага зняволення [521, арк. 13–13адв.], засведчылі надуманасць прад’яўленых абвінавачванняў. Кіраўнікі ТБШ заяўлялі аб тым, што ў практычнай дзейнасці выступалі як супраць акцый польскай адміністрацыі, так і левасектанцкіх, дэструктыўных дзеянняў з боку КПЗБ.

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы існавання, Галоўная ўправа імкнулася нацэліць радавых гурткоўцаў на працяг культурна-асветніцкай

работы. На адным з сумесных пасяджэнняў Галоўнай управы і акруговай управы ў Беластоку у дадатак да правядзення школьнай кампаніі было вырашана ствараць групы самаадукацыі пры гуртках ТБШ [561]. У 1932 г. замест закрытага таварыства "Рунь" было створана выдавецка-асветніцкае таварыства "Сяўба", якое стварыла гурток для вучобы непісьменных, літаратурную секцыю. У пачатку 1934 г. планавалася адкрыць у Беластоку кніжную краму, выдаваць газету [495]. У пачатку 1933 г. дзеячам з Вільні ўдалося пры дапамозе гурткоў Беластоцкай акруговай управы ТБШ правесці сярод мясцовага беларускага насельніцтва цэлы цыкл лекцый па айчыннай гісторыі, культуры, мове [551]. Падобныя захады ажыццяўляліся і ў іншых рэгіёнах. Неабходнасць і значнасць культурна-асветніцкага напрамку дзейнасці прапагандавалася на старонках выданняў Галоўнай управы – "Бюлетэня ТБШ", газеты "Шлях", часопіса "Летапіс ТБШ".

З-за рэпрэсій польскай адміністрацыі так і не ўдалося правесці ў 1932–1933 гг. агульны з'езд ТБШ. Сітуацыя ўскладнялася і дэструктыўнай пазіцыяй заходнебеларускіх камуністычных арганізацый напярэдадні з'езда ТБШ 12 мая 1932 г. у Вільні, які з-за арыштаў не адбыўся. Адзіная ўцалелая акруговая управа Таварыства ў Беластоку ў канцы 1933 г. налічвала 50 гурткоў (600 чалавек) у Беластоцкім, Ваўкавыскім і Гродзенскім паветах. Ажыўленне працы гурткоў у канцы 1933 г. у асобных паветах (Слонімскі, Баранавіцкі, Вілейскі, Сакольскі і іншыя) прымушала кіраўніцтва ТБШ аднавіць акруговыя ўправы, склікаць агульны з'езд, аднак ажыццявіць гэта не ўдалося. Кіраўніцтва ТБШ лічыла, што для акруговых упраў і мясцовых гурткоў у той час галоўнымі напрамкамі дзейнасці з'яўляліся патрабаванні аб адкрыцці беларускіх школ, падтрымка друку (часопіса "Летапіс ТБШ") [103, с. 73–74]. У пачатку 1934 г. Галоўная управа ТБШ спрабавала ажывіць сваю дзейнасць на Віленшчыне. Радыкальна настроеныя лідэры КПЗБ дабіліся таго, каб акруговая ўправа ў Беластоку 4 лютага 1934 г. прыняла пастанову аб непрызнанні Галоўнай управы. Такая сітуацыя стала зручным момантам для забароны польскімі ўладамі ў сакавіку 1934 г. дзейнасці Беластоцкай акруговай ўправы. На нелегальным з'ездзе ТБШ у Вільні 17 чэрвеня 1934 г. функцыі Галоўнай управы былі неправамоцна перададзены выбранаму часоваму кіраўніцтву.

Неабходна адзначыць, што непрымірымае стаўленне заходнебеларускіх камуністаў да некамуністычных арганізацый, дэмакратычнай часткі інтэлігенцыі вынікала з рашэнняў III пленума (кастрычнік 1929 г.) і пастаноў VI пленума ЦК КПЗБ (лістапад 1932 г.). У эзалюцыі ЦК КПЗБ "Аб хістаннях сярод часткі дзеячаў руху Заходняй Беларусі" ад 30 сакавіка 1933 г. беспадстаўным абвінавачваннем падвяргаліся кіраўнікі Таварыства за тое, што ўдзельнічалі сумесна з БХД

у святкаванні юбілею Я. Купалы, што публічна дэкларавалі ў судзе аб сваім выступленні дзеля захавання арганізацыі і супраць рэжыма "санацыі", і супраць левасектанцтва камуністаў, іх прыхільнікаў [502, арк. 10; 494, арк. 22]. Адмоўныя ацэнкі кіраўніцтва ТБШ былі дадзены і ў прынятых у 1934 г. рэзалюцыях "Агонь барацьбы супраць нацыяналізму і нацыянал-апартунізму", "Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў КПЗБ". Гэта аказвала прыгнятальнае маральнае ўздзеянне на кіраўнікоў ТБШ [447, с. 25–26].

У пачатку 1930-х гг. творчая і навуковая інтэлігенцыя БССР была прыцягнута да прапагандысцкай кампаніі, накіраванай супраць рэпрэсіўных дзеянняў польскіх улад і на падтрымку левардыкальнага крыла заходнебеларускага руху. З лістом пратэсту супраць судовага працэсу над Б. Тарашкевічам восенню 1932 г. выступала група драматургаў і кампазітараў (М. Ільінскі, І. Гурскі, Р. Кобец, Б. Мікуліч, І. Харык, В. Галаўчынер і іншыя) [55, арк. 81а–81б]. З падобным лістом выступалі і беларускія савецкія пісьменнікі [422, с. 300–301]. Група пісьменнікаў, сярод якіх былі Я. Колас, П. Галавач, Ц. Гартны, А. Салагуб, А. Куляшоў, П. Броўка, З. Бядуля і іншыя, падпісалася пад рэзалюцыяй пратэсту супраць "крывавага фашысцкага тэрору" ў Заходняй Беларусі [54, арк. 46]. Пратэст выказвалі таксама супрацоўнікі Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР [580, арк. 1].

Рэпрэсіі ў Савецкай Беларусі аказвалі адмоўны ўплыў на заходнебеларускі культурна-асветніцкі рух. Яго былыя дзеячы М. Бурсевіч, П. Валошын, Ф. Валынец, Я. Гаўрылік, І. Дварчанін, П. Мятла, С.Рак-Міхайлоўскі і іншыя ў 1933 г. былі прыцягнуты да сфабрыкаванай АДПУ справы "Беларускага нацыянальнага цэнтра" [12]. Па той жа справе быў пазней рэпрэсіраваны Б. Тарашкевіч. Іх беспадстаўна абвінавачвалі ў супрацоўніцтве з польскай дэфензівай, прымушалі дэклараваць контррэвалюцыйны, нацдэмаўскі характар сваёй дзейнасці [505, арк. 10; 465, с. 299]. У 1937 г. ад А.Ф. Ульянава былі выбіты абсурдныя паказанні аб тым, што па ўказанню рэжыма "санацыі" ТБШ было выкарыстана для перакідвання антысавецкіх, контррэвалюцыйных сіл у БССР [380, с. 25].

Трывожныя звесткі аб рэпрэсіях у БССР супраць былых лідэраў Грамады і ТБШ дэзарыентавалі заходнебеларускую грамадскасць, унеслі перакосы ў ментальнасць людзей. Праз савецкі друк і радыё, агітацыйную дзейнасць актывістаў КПЗБ сярод заходнебеларускіх жыхароў пашыраліся негатыўныя адносіны да "здраднікаў", "польскіх шпіёнаў", "нацыянал-фашыстаў" і г. д. [505, арк. 10]. Такое становішча яшчэ больш узмацняла ідэйна-палітычную канфрантацыю ў заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым руху, выключала усялякую магчымасць перагляду характару

ўзаемаадносін розных лагераў. Адначасова гэта спрыяла фарміраванню ў грамадскай свядомасці жыхароў БССР адмоўных стэрэатыпаў не толькі адносна дзеячаў хрысціянска- і нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, але і былых грамадаўцаў, камуністаў і іх прыхільнікаў.

Калі ў пачатку 1930-х гг. праца ТБШ затухала, то адбывалася некаторае ажыўленне БІГіК. БХД па-ранейшаму надавала ўвагу пытанням беларускай асветы, што пацвердзіў яе IV з’езд 13 снежня 1931 г. У праграму партыі ўвайшлі патрабаванні абавязковасці, бясплатнасці пачатковага навучання на роднай мове вучняў, вывучэння рэлігіі, роўных правоў і аднолькавых субсідый для дзяржаўных і прыватных школ [575, с. 3–4]. У 1931 г. БіГіК налічваў 52 гурткі (каля 700 чалавек), з іх 36 мелі бібліятэкі. У іх наладжвалася чытанне рэфератаў, ставіліся спектаклі. На Віленшчыне актыўнасцю тады вылучаліся гурткі ў Браслаўскім, Ашмянскім, Вілейскім, Маладзечанскім паветах. Аказвалася дапамога адзінай прыватнай беларускай школе ў Шаўлянах Браслаўскага павета. Антыкамуністычныя погляды і непрыхільнае стаўленне да БССР беларускіх хадэкаў, левасектанцкая пазіцыя камуністаў надавалі ўзаемаадносінам БІГіК і ТБШ канфрантацыйны характар. Дзеячы БХД для абароны нацыянальна-культурных правоў беларусаў імкнуліся наладзіць супрацоўніцтва з памяркоўнымі літоўскімі і ўкраінскімі коламі.

Табліца 2.4 – Стан БІГіК (1933 г.)

| павет | Колькасць гурткоў | Колькасць членаў |
|---|---|---|
| Віленска-Трокскі | 6 | 128 |
| Ашмянскі | 5 | 105 |
| Браслаўскі | 7 | 91 |
| Вілейскі | 5 | 160 |
| Дзісенскі | 1 | 10 |
| Маладзечанскі | 1 | 15 |
| Пастаўскі | 2 | 30 |
| Свянцянскі | 3 | 41 |
| Бельскі | 2 | 35 |
| Ваўкавыскі | 1 | 10 |
| Баранавіцкі | 8 | 154 |
| Навагрудскі | 3 | 40 |
| Нясвіжскі | 3 | 35 |
| Слонімскі | 1 | 12 |
| Стаўбцоўскі | 2 | 36 |
| Пружанскі | 3 | 35 |
| Усяго ў Заходняй Беларусі | 53 | 937 |

Аднак нельга перабольшваць рэальны ўплыў БІГіК у заходнебеларускіх землях. Аналіз арганізацыйнага стану БІГіК у 1933 г.,

прадстаўленага ў таліцы 2.4 [961, арк. 171–171адв., 178; 11], па-першае, сведчыць аб слабой разгалінаванасці нешматлікіх гурткоў (не больш 8 у асобных паветах), па-другое, аб іх этнаканфесійнай абмежаванасці – толькі сярод беларускага каталіцкага насельніцтва Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў. Толькі адзінкавыя гурткі БІГіК існавалі ў Палескім і Беластоцкім ваяводствах. Трэба адзначыць, што ў беларускіх хадэкаў у культурна-асветніцкай дзейнасці пераважала адкрыццё бібліятэк-чытальняў, правядзенне ўрачыстых мерапрыемстваў (акадэмій), лекцый, арганізацыя маладзёжных таварыстваў, кааператываў. У 1932 г. было праведзена каля 60 лекцый, на якіх прысутнічала каля 10 тыс. чалавек [358]. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці і перашкоды польскай адміністрацыі, на працягу 1933 г. БІГіК утрымліваў каля 50 бібліятэк-чытальняў (амаль пры кожным гуртку), наладзіў каля 70 лекцый, больш 100 тэатралізаваных пастановак, займаўся выдавецкай працай [628; 696; 317, арк. 140–142]. Хоць БІГіК не мела шансаў пераўтварыцца ў масавую культурна-асветніцкую арганізацыю, аднак устойлівай заставалася тэндэнцыя паступовага ўмацавання пазіцый – у 1934–1935 гг. колькасць гурткоў перавысіла 80 (каля 1,2 тыс. чалавек) [524, арк. 9].

Іншы ідэалагічны напрамак культурна-асветніцкага руху прадстаўляла правацэнтрысцкая грамадска-палітычная арганізацыя – Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрасаюз), створаная ў верасні 1930 г. Яе лідэры (Р. Астроўскі, А. Луцкевіч, Ф. Акінчыц, Я. Станкевіч і іншыя) адзіна магчымым шляхам лічылі пошук кампрамісаў з аўтарытарным рэжымам Ю. Пілсудскага, за што былі празваны “беларускай санацыяй”. Цэлы шэраг патрабаванняў у галіне культуры і асветы ўтрымліваўся ў наказах яго кандыдатаў на парламенцкіх выбарах 1930 г. [39]. Аднак з-за правалу на выбарах патрабаванні так і засталіся на паперы. Кіраўніцтва Цэнтрасаюза дэкларавала “апалітычнасць”, выключна культурніцкі характар арганізацыі. Кіраўніцтва Цэнтрасаюза імкнулася праяўляць клопат пра адкрытую ў 1930 г. у Вільні беларускую дзяржаўную настаўніцкую семінарыю імя Ф. Багушэвіча, якую ўзначальвалі Р. Астроўскі, У. Манкевіч. Выкладчыцкай працай там займаліся А. Коўш, С. Кароль, Я. Станкевіч, У. Самойла і іншыя дзеячы [977; 991–992]. Настаўніцкая семінарыя, на першы курс якой у 1930 г. залічылі 40 чалавек, не змагла заняць моцныя пазіцыі сярод нешматлікіх беларускіх адукацыйных устаноў. На гэта ўплывала і перавага там прыхільнікаў згодніцтва, якія не змаглі захаваць нацыянальны статус семінарыі. У 1931 г. выкладанне большасці прадметаў праводзілася там па-польску. У чэрвені 1932 г. беларуская настаўніцкая семінарыя ў Вільні наогул была ліквідавана [980].

На базе Цэнтрасаюза была створана ў 1932 г. культурна-асветніцкая арганізацыя – Таварыства беларускай асветы (ТБА), якая з 1933 г. пачала выдаваць часопіс “Родны край”. Мэта ТБА ў яго статуце была вызначана так: “Праца над развіццём беларускай культуры, пашырэннем школьнай і пазашкольнай асветы беларусаў на іх роднай мове, уздымам маральнага ўзроўню і вывучэннем польскай культуры, культурных адметнасцей іншых народаў, якія жывуць на супольнай тэрыторыі з беларусамі” [35, арк. 3]. Ставілася задача аб “пошуках у вёсцы патрэбнай сілы для культурна-асветніцкай працы і стварэння невялікіх груп, гурткоў … на чыста культурным фронце” [492, арк. 42]. У 1933 г. ТБА здолела адкрыць у 33 населеных пунктах Віленскага ваяводства свае бібліятэкі-чытальні, яшчэ ў 12 ішла падрыхтоўчая праца. Праводзіліся лекцыі, наладжваліся тэатральныя выступленні. Аднак ТБА не змагла разгарнуць шырокай дзейнасці, бо пазіцыя “беларускай санацыі” негатыўна ўспрымалася як з боку КПЗБ, так і БХД. ЦК КПЗБ рэкамендаваў дзеля дыскрэдытацыі “беларускай санацыі” ствараць на месцах псеўдаструктуры ТБА [4].

Праведзены аналіз асобных архіўных матэрыялаў сведчыць аб падтрымцы “беларускай санацыі” з боку польскіх улад. Пры іх дапамозе было інспіравана з’яўленне ў Вільні ў чэрвені 1931 г. альтэрнатыўнага Беларускаму студэнцкаму саюзу нешматлікага Беларускага студэнцкага таварыства імя Ф. Скарыны (карпарацыі “Скарынія”), падкантрольнага Цэнтрасаюзу [743, арк. 51]. Для яго выдзяляліся значныя фінансавыя сродкі. Дэмаралізацыя “беларускай санацыяй” студэнцкай моладзі выклікала негатыўную рэакцыю з боку ТБШ, якое заявіла, што “для Астроўскага, як і для ТБА, паняцця маральнай адказнасці не існуе” [727]. У лістападзе 1934 г. кіраўніцтва ТБА звярталася ў нацыянальны аддзел МУС Польшчы з просьбай аб павелічэнні штомесячных субсідый для выдання часопісаў “Родны край” і “Саха” з 350 да 450 злотых [746, арк. 1–2]. Варта адзначыць, што асобныя матэрыялы часопіса “Родны край” мелі русафобскі характар, былі накіраваны супраць Р. Шырмы і іншых лідэраў ТБШ [72]. Польская адміністрацыя аказвала садзейнічанне ў стварэнні мясцовых структур таварыства. Аднак спадзявацца на пераўтварэнне ТБА у масавую арганізацыю нельга было, бо ў яго адсутнічала шырокая сацыяльная база, а матэрыяльная дапамога польскіх улад была кан’юнктурнай і не мела доўгатэрміновага характару, што тлумачылася адсутнасцю намераў падтрымліваць любую беларускую грамадскую актыўнасць, у тым ліку і паланафільскіх дзеячаў. Праведзенае даследаванне падвяргае сумненню абвешчаную апалітычнасць ТБА. Ва ўмовах падаўлення культуры і адукацыі беларускага насельніцтва, асабліва з канца 1920-х гг., былі выключаны ўсялякія партнёрскія культурныя ўзаемаадносіны палякаў і беларусаў. Таму дзейнасць нешматлікіх і неўплывовых паланафільскіх

культурна-асветніцкіх арганізацый не магла аказаць спрыяльнага развіцця на беларуска-польскія культурныя сувязі.

Пад выглядам дакладнага выканання новага школьнага заканадаўства польскія ўлады ў 1932 г. ажыццявілі захады па ліквідацыі 2 уцалелых беларускіх гімназій – Віленскай і Навагрудскай. Яны былі пераўтвораны ў філіялы дзяржаўных польскіх гімназій. З набыццём дзяржаўнага статуса гімназіі страцілі былую самастойнасць, толькі часова палепшылі вучэбна-матэрыяльную базу. У 1934 г. гімназія ў Навагрудку была наогул закрыта [403]. Такім чынам, у 1934/1935 навуч. годзе засталася толькі 1 беларуская гімназія ў Вільні як філіял польскай імя Ю. Славацкага і 16 беларускіх пачатковых школ [табліца 2.5 [888, с. 105]; 1177, с. 19]. У такіх абставінах катастрафічнага стану беларускай асветы праблема этнічнага захавання беларусаў у Польскай дзяржаве набывала асаблівую значнасць.

Табліца 2.5 – Беларускія школы ў Заходняй Беларусі ў 1922–1939 гг.

| Навучальны год | Беларускія пачатковыя школы | | Беларускія сярэднія школы | |
|---|---|---|---|---|
| | Колькасць школ | Колькасць вучняў | Колькасць школ | Колькасць вучняў |
| 1922/1923 | 32 | 1 884 | 2 | 200 |
| 1923/1924 | 32 | 2 091 | 3 | 250 |
| 1924/1925 | 23 | 1 750 | 3 | 300 |
| 1925/1926 | 3 | 1 750 | 3 | 400 |
| 1926/1927 | 8 | 2 000 | 4 | 500 |
| 1927/1928 | 26 | 2 254 | 4 | 520 |
| 1928/1929 | 26 | 2 100 | 3 | 500 |
| 1929/1930 | 26 | 2 021 | 3 | 400 |
| 1930/1931 | 26 | 2 000 | 2 | 250 |
| 1931/1932 | 26 | 2 000 | 2 | 200 |
| 1932/1933 | 26 | 2 000 | 2 | 200 |
| 1933/1934 | 16 | 2 000 | 1 | 200 |
| 1934/1935 | 16 | 2 100 | 1 | 200 |
| 1935/1936 | 16 | 2 000 | 1 | 200 |
| 1936/1937 | 8 | 1 200 | 1 | 100 |
| 1937/1938 | 5 | 500 | - | - |
| 1938/1939 | 5 | 500 | - | - |

Пазітыўная тэндэнцыя ў заходнебеларускім культурна-асветніцкім руху вызначылася з сярэдзіны 1930-х гг. У адпаведнасці з рашэннямі VII кангрэса Камінтэрна II з’езд КПЗБ (9–18 мая 1935 г.) прызнаў неабходным стварэнне шырокага антыфашысцкага народнага фронту. У жніўні-верасні 1935 г. адбыліся сустрэчы прадстаўнікоў ЦК КПЗБ і ЦК БХД. Беларускія хадэкі пагаджаліся на супрацоўніцтва з камуністамі пры ўмове істотных змен у грамадска-палітычным, нацыянальна-культурным жыцці Савецкай Беларусі [497, арк. 61–64; 633, с. 257]. З-за вострых

ідэалагічных і палітычных супярэчнасцей удалося дамовіцца толькі аб супрацоўніцтве ў галіне асветы. У лютым 1936 г. паміж ТБШ і БІГіК было заключана пагадненне аб адзінстве дзеянняў у школьнай справе, прынята сумесная дэкларацыя [344]. Паводле розных ацэнак, створаны агульны школьны сакратарыят разаслаў ад 30 тыс. да 50 тыс. дэкларацый [504, арк. 4].

Заходнебеларускае насельніцтва станоўча ўспрыняло школьную кампанію. Ужо ў пачатку 1936 г. у Гродзенскім павеце рознымі гурткамі і курсамі было ахоплена 1,5 тыс. чалавек. Інтэнсіўна ішло складванне дэкларацый у Баранавіцкім, Браслаўскім, Ваўкавыскім, Вілейскім, Маладзечанскім, Слонімскім і іншых паветах [526–527]. Школьны сакратарыят атрымаў з розных мясцовасцей Заходняй Беларусі каля 4,5 тыс. дэкларацый [507, арк. 32]. Навучэнцы многіх школ падтрымалі збор подпісаў забастоўкамі. Супраць сумеснай школьнай акцыі ТБШ і БІГіК выступіла ТБА [172, арк. 41адв.]. Нягледзячы на паўсюднае супрацьдзеянне школьнай кампаніі і яе нязначныя рэальныя вынікі, польскія ўлады зрабілі неістотныя ўступкі: былі ўведзены ў некаторых школах урокі беларускай мовы, адкрыты польска-беларускія школы. Беларускае пытанне стала аб’ектам часовай увагі афіцыйнай польскай прэсы, дыскусіі ў сейме.

У новых абставінах ажывілася дзейнасць ТБШ – у пачатку 1936 г. аднавілася выданне часопіса “Летапіс ТБШ”, Галоўная ўправа займалася аднаўленнем старых і стварэннем новых гурткоў, адкрыццём бібліятэк-чытальняў, курсаў для непісьменных. На старонках “Летапіса ТБШ” змяшчаліся матэрыялы аб культурна-асветніцкай працы ў заходнебеларускіх землях, артыкулы з тлумачэннем неабходнасці барацьбы за нацыянальную адукацыю [726]. Задачы Таварыства абмяркоўваліся на агульным сходзе яго кіраўнікоў і віленскага актыву 5 ліпеня 1936 г. У новы склад Галоўнай управы былі выбраны Ф. Стацкевіч (старшыня), М. Кепель, В. Склубоўскі, Ф. Грышкевіч, Р. Шырма, М. Пяткевіч, М. Марцінчык, Ф. Кізевіч, С. Паўловіч, М. Касцевіч і іншыя. Членамі Нагляднай рады сталі М. Манцэвіч, М. Хацяновіч, Н. Ламашэвіч і іншыя дзеячы. Пазітыўныя зрухі былі і ў лагеры беларускіх хадэкаў. У праграме Беларускага нацыянальнага аб’яднання (БНА) [41, арк. 6–7] разам з традыцыйнымі рэлігійнымі каштоўнасцямі былі замацаваны і свецкія.

У тагачасных умовах заходнебеларускай рэчаіснасці, калі ўжо амаль не існавала сістэма беларускіх адукацыйных устаноў, актуальным напрамкам культурна-асветніцкай работы станавілася разгортванне паўсюдна хатняга навучання, самаадукацыі [525, арк. 37]. Для хатняга навучання прызначаліся буквары “Першыя зерняткі” (1936 г.) [556] і “Засеўкі”

(лацінскай азбукай) [554] аднаго з кіраўнікоў ТБШ С. Паўловіча. Адзін з дзеячаў БНА С. Грынкевіч прапаноўваў ствараць народныя універсітэты (накшталт дацкіх універсітэтаў Грунтвіга) у кнізе “Асвета” (1936 г.) [99] папулярызаваў меры па самаадукацыі, навучанню па-за школай.

У ходзе сумеснай школьнай акцыі ставілася пытанне пра аб’яднанне дзвюх заходнебеларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый. Галоўная управа ТБШ адхіліла такую прапанову, спасылаючыся на рознасць ідэалагічных асноў, традыцый і сферы ўплыву, хоць і прызнала пажаданым супрацоўніцтва з БІГіК не толькі ў школьнай справе, але і ў галіне пазашкольнай асветы, выдавецкай працы. Аднак супрацоўніцтву ТБШ і БІГіК яшчэ перашкаджалі недаверлівыя адносіны паміж дзеячамі дзвюх партый, якія на іх уплывалі – КПЗБ і БНА. Як сведчаць матэрыялы ІІ пленума ЦК КПЗБ (сакавік-красавік 1936 г.), яшчэ захоўваліся рэцыдывы падазронасці да беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, у тым ліку і з ТБШ, недаацэньвалася значнасць барацьбы за паўсядзённыя нацыянальныя патрэбы і культуру, ігнараваліся традыцыі нацыянальна-вызваленчага руху, не выкарыстоўваліся легальныя формы барацьбы [606, арк. 65, 70–71, 115].

Нягледзячы на гэта, супрацоўніцтва ТБШ і БІГіК выйшла за межы адной толькі школьнай кампаніі. 13 снежня 1936 г. быў урачыста праведзены ў Вільні Дзень беларускай культуры. Сярод шэрагу выступленняў варта вылучыць даклад А. Станкевіча, які прааналізаваў суадносіны нацыянальнай і сусветнай культурнай спадчыны, паказаў дынаміку развіцця розных тыпаў цывілізацыйных плыняў [663; 107].

Аднак актывізацыя заходнебеларускага культурна-асветніцкага руху занепакоіла польскія ўлады. У канцы 1936 г. МУС Польшчы выпрацаваў план ліквідацыі ўсіх легальных беларускіх арганізацый. 2 снежня 1936 г. была забаронена за “правядзенне падрыўной дзейнасці” ТБШ, 4 снежня таго ж году – БІГіК [743, арк. 445]. 22 студзеня 1937 г. віленскі ваявода Л. Бацянскі пацвердзіў забарону ТБШ за яе “антыдзяржаўную дзейнасць” [167, арк. 9–9адв.].

Адмоўны ўплыў на заходнебеларускае нацыянальна-культурнае жыццё аказалі і сталінскія рэпрэсіі. У лютым 1936 г. органамі НКУС БССР быў арыштаваны палітычны сакратар ЦК КПЗБ І. Лагіновіч і асуджаны “як агент польскай палітычнай паліцыі” (пазней прысуд зменены на смяротнае пакаранне) [433, с. 171–175; 434, с. 87].У 1937 г. рэпрэсіям падвергліся іншыя кіраўнікі Кампартыі Польшчы і КПЗБ, якія знаходзіліся ў СССР. У жніўні 1938 г. на аснове беспадстаўнага абвінавачвання Выканкам Камінтэрна прыняў рашэнне аб роспуску КПП і яе састаўных частак – КПЗБ і КПЗУ.

Забарона дзейнасці заходнебеларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый дазволіла польскім уладам бесперашкодна знішчыць уцалелыя беларускія адукацыйныя ўстановы. Планавалася закрыць беларускую гімназію ў Вільні, хоць яна працягвала карыстацца аўтарытэтам у заходнебеларускім грамадстве. У канцы 1930-х гг. там дзейнічалі гісторыка-літаратурны, краязнаўчы, спартыўны гурткі, вучнёўскі кааператыў, школьная каса ашчаднасці, выпускалася насценная газета “Наша жыццё”. Сярод навучэнцаў значную долю складалі вучні былой беларускай гімназіі ў Навагрудку [981; 983; 986]. Незадаволены пераўтварэннем гімназіі ў 4-класную ўстанову, бацькоўскі камітэт беспаспяхова дабіваўся летам 1937 г. адкрыцця ў Вільні беларускага ліцэю гуманітарнага тыпу [691]. У 1938/1939 навуч. годзе рабіліся захады па скасаванню ў гімназіі першага класа, што сведчыла аб намеры канчаткова закрыць установу [692, арк. 1]. У 1937/1938 навуч. годзе дзейнічала толькі 5 пачатковых польска-беларускіх школ [табліца 2.5], яшчэ ў 44 польскіх пачатковых школах беларуская мова вывучалася ў якасці прадмета. Улічваючы тое, што бацькоў прымушалі пераводзіць сваіх дзяцей у польскія школы [293], то можна дапусціць, што ахоп дзяцей беларускамоўным навучаннем да верасня 1939 г. яшчэ больш зменшыўся.

Адсутнасць арганізацыйных структур вызначыла самадзейны і нелегальны характар заходнебеларускага культурна-асветніцкага руху ў канцы 1930-х гг. На старонках часопіса “Беларускі летапіс”, у выданні якога прымалі актыўны ўдзел Ф. Стацкевіч, С. Паўловіч, М. Танк, Р. Шырма, В. Тумаш і іншыя дзеячы забароненага ТБШ, актыўна прапагандавалася самаадукацыя. Паводле С. Паўловіча, самаадукацыя была не толькі сродкам авалодвання элементарных ведаў, навыкаў чытання, пісьма ў час хатняга навучання, але і сродкам нацыянальнага, культурнага, эканамічнага і палітычнага ўсведамлення [557–558]. Яго метадычныя распрацоўкі, буквары з’яўляліся найлепшымі тады дапаможнікамі як для дзяцей, так і непісьменных дарослых.

У некаторых мясцовасцях, дзе раней вялікі ўплыў мелі гурткі ТБШ, былі зафіксаваны выступленні. Напрыклад, восенню 1937 г. жыхары в. Ігнатавічы Гродзенскага павета патрабавалі выкладання рэлігіі пабеларуску. У многіх паветах назіраўся рух за адкрыццё беларускіх школ [370].

У цэлым, пры нявырашанасці польскімі ўладамі праблемы ліквідацыі непісьменнасці, закрыцці беларускіх школ, гвалтоўных метадах у адносінах да культурна-асветніцкіх арганізацый, адсутнасці рэальных перспектыў у задавальненні адукацыйных, культурных і іншых патрэбаў нельга было спадзявацца на пазітыўны характар беларуска-польскіх культурных сувязей. Пад уплывам грамадска-палітычнага руху пераважна

сялянскае заходнебеларускае грамадства ўцягвалася ў культурна-асветніцкі рух, які набыў масавы характар у сярэдзіне 1920-х – пачатку 1930-х гг. Ідэйна-палітычнае размежаванне не дазволіла разгортваць яго ў межах адзінай арганізацыйнай структуры. Аднак і ТБШ, і БІГіК актыўна займаліся супрацьдзеяннем паланізацыі, ажыццяўлялі ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці, спрыялі даступнымі сродкамі павышэнню грамадскай і нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва, далучалі яго да каштоўнасцей нацыянальнай культуры. Нешматлікія беларускія гімназіі і пачатковыя школы займаліся падрыхтоўкай кадраў нацыянальнай інтэлігенцыі, аднак не маглі карэнным чынам змяніць становішча ў сферы адукацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

## 2.2 Гісторыка-культуралагічныя даследаванні беларускай спадчыны

Ва ўмовах заходнебеларускай рэчаіснасці разам з культурна-асветніцкай працай важнае значэнне набывала і навукова-асветніцкая работа. Створанае 26 студзеня 1918 г. Беларускае навуковае таварыства (БНТ) актывізавала сваю дзейнасць у адносна ліберальных умовах Сярэдняй Літвы. Мэтай гэтай арганізацыі была “рознабаковая навуковая праца, развіццё любові да навуковых доследаў і пашырэнне ведаў” [84, с. 5; 699; 26]. Паводле статута, БНТ мела права ствараць і ўтрымліваць з дазволу ўлад музеі, бібліятэкі, навуковыя ўстановы, наладжваць выставы, экскурсіі, лекцыі, курсы, сходы, праводзіць конкурсы, займацца выдавецкай працай Пры БНТ у 1921 г. быў адкрыты Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І. Луцкевіча, які размясціўся разам з беларускай гімназіяй ў будынку ў базыліянскіх мурах, перададзеных праваслаўнымі ўладамі ў бясплатнае карыстанне [827, арк. 6–6адв.]. Прыватная калекцыя І. Луцкевіча была асновай для музейных фондаў. Новыя паступленні складаліся з закупленых ці пераважна тых, што ахвяраваліся прыватнымі асобамі. Асноўнай крыніцай фінансавання музея былі ахвяраванні заходнебеларускіх арганізацый і грамадскасці, якіх хапала толькі на правядзенне самых неабходных работ. Паводле А. Гужалоўскага, эклектычны падыход у структуры беларускага музея ў Вільні ўскладняў выкарыстанне яго фондаў у навуковых і асветніцкіх мэтах, аднак матэрыялы для экспазіцыі аб’ядноўваліся па калекцыйнаму прынцыпу [102, с. 107, 110]. Як сведчыць інвентарная кніга, упарадкаванне экспанатаў пачалося ў чэрвені 1922 г. Аднак з-за фінансавых цяжкасцей не было наладжана планамернае, сістэматычнае папаўненне, даследаванне

фондаў музея. Толькі ў сярэдзіне 1930-х гг. былі складзены каталогі музея, бібліятэкі і архіва.

З аддзелаў беларускага музея неабходна адзначыць археалагічны, нумізматыкі, помнікаў рэлігійнага мастацтва, свецкага жывапісу, народнага мастацтва, зброі, этнаграфічных матэрыялаў. З археалагічных знаходак (больш за 200 адзінак) там былі матэрыялы раскопак з 18 беларускіх паветаў. Сярод іх была і калекцыя Г. Татура. У аддзеле сфрагістыкі было больш за 100 пячатак, сярод іх пячаткі полацкіх князёў XI–XII стст. Усяслава і Барыса, князя ВКЛ Міндоўга і іншыя [449, с. 4]. У аддзеле нумізматыкі было сабрана каля 3 тыс. адзінак, у этнаграфічным аддзеле – каля 200 адзінак, у аддзеле выяўленчага мастацтва – больш за 2 тыс. адзінак [102, с. 107–108]. У аддзеле беларускага народнага мастацтва была прадстаўлена разьба па дрэве, лубкі, карціны, гравюры, адзенне, калекцыя слуцкіх паясоў і інш. [700; 702].

Аснову бібліятэкі беларускага музея стварылі калекцыя кніг і старадрукаў І. Луцкевіча, частка бібліятэкі Е. Раманава, кнігазбор Б. Даніловіча [449, с. 3–4]. У бібліятэцы музея налічвалася больш 14 тыс. кніг. З рукапісных кніг вылучаліся Жухавіцкае евангелле XIV ст., трэбнік 1545 г., кітаб XVI ст. і інш. Сярод старадрукаў меліся асабліва каштоўныя экспанаты – Трыёдзь каляровая 1491 г., частка пражскага выдання Бібліі Ф. Скарыны 1517 г., Статут ВКЛ 1588 г., кнігі друкарняў Беларусі XVI–XVIII стст. [701; 829]. У бібліятэцы былі таксама розныя па тэматычнай накіраванасці савецкія выданні на беларускай, рускай, польскай, літоўскай, ідыш і іншых мовах, перыядычны друк.

Пры беларускім музеі ў Вільні існаваў багаты архіў. Сярод рукапісаў (каля 6 тыс. адзінак) былі помнікі пісьменнасці XIV–XV стст., граматы XIV–XIX стст. [102, с. 109]. Сярод шэрагу персанальных матэрыялаў архіў утрымліваў рукапісы дзеячаў заходнебеларускай інтэлігенцыі (М. Гарэцкага, І. Дварчаніна, М. Танка, У. Жылкі, Р. Шырмы і іншых, а таксама многіх арганізацый, устаноў – Беларускага пасольскага клуба, Грамады, ТБШ, БІГіК, беларускіх гімназій, БНТ і іншых [51–52; 684; 701].

Навукова-асветніцкая дзейнасць БНТ разгортвалася ў асобных секцыях. Функцыі секцыі БНТ выконвала створаная 10 студзеня 1927 г. музейная рада, у якую ўвайшлі А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, А. Неканда-Трэпка [84, с. 13]. Восенню 1932 г. былі створаны гістарычная і літаратурна-мастацкая секцыі БНТ. Працягвала дзейнічаць мовазнаўчая секцыя. Дырэктарам беларускага музея на працягу 1921–1939 гг. быў А. Луцкевіч, бібліятэкарам – У. Самойла, скарбнікам – А. Неканда-Трэпка. Асноўнай формай працы БНТ з'яўляліся даклады і паведамленні па гісторыі, этнаграфіі, літаратуры, мове, фальклоры Беларусі, якія прадстаўляліся на яго пасяджэннях. БНТ праводзіла ўрачыстыя

мерапрыемствы да 400-годдзя беларускага кнігадрукавання (1925 г.), 400-годдзя Статута ВКЛ 1529 г. (1929 г.), 500-годдзя смерці Вітаўта (1930 г.) і іншыя.

У пачатку 1920-х гг. дзеячы БНТ займаліся распрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі, перакладам на беларускую мову педагагічнай, мастацкай і іншай літаратуры. Пад кіраўніцтвам БНТ у Віленскай беларускай гімназіі працавалі асобныя тэрміналагічныя камісіі па прадметах. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі прызначаліся для беларускіх гімназій і школ на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Частка іх набывалася ў БНТ для беларускіх школ у Латвіі. Нельга дакладна вызначыць колькасць кніг, якія былі падрыхтаваны дзеячамі БНТ. Паводле падлікаў Е. Туронка, з 261 назвы беларускіх кніг, выдадзеных у міжваеннай Польшчы, толькі ў 10 у выхадных звестках адзначана БНТ [1165, с. 15]. Пры адсутнасці лагатыпаў БНТ кнігі выдаваліся таксама ў Беларускім выдавецкім таварыстве, віленскім выдавецтве Б. Клецкіна, выдавецтве ТБШ, друкарні Я. Левіна [681, с. 7] і іншых выдавецтвах.

На адным з агульных сходаў БНТ у красавіку 1924 г. адзначалася, што яго галоўным клопатам з’яўлялася ўтрыманне беларускага музея, а таксама распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі, падрыхтоўка і выданне падручнікаў і іншыя праблемы [10]. Быў таксама прыняты зварот да Беларускага нацыянальнага камітэта аб скліканні нарады адносна далейшага лёсу базыліянскіх муроў, аб набыцці ўласнага будынку для музея [84, с. 12]. Яшчэ з 1922 г. планавалася выдаць штогоднік БНТ, аднак з-за фінансавых цяжкасцей гэтая справа адцягвалася. Важнае значэнне ў дзейнасці БНТ надавалася збіральніцкай працы.

Грамадаўскі ўздым аказаў непасрэдны ўплыў на становішча БНТ. Пасля арышту А. Луцкевіча і прыцягнення яго да судовага працэсу Грамады дзейнасць таварыства на пэўны час дэстабілізавалася. Усімі бягучымі справамі БНТ давялося тады займацца яго ўправе ў складзе А. Неканды-Трэпкі, І. Дварчаніна, І. Савіцкага, С. Паўловіча. Як ідэйна-палітычнае разыходжанне, так і суб’ектыўныя фактары, выкліканыя адмаўленнем А. Луцкевіча ад усялякага дачынення да Грамады, прывялі да расколу БНТ. З яго складу выйшлі дзеячы БХД, перасталі супрацоўнічаць прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў. Акрамя таго, БНТ падвяргалася неабгрунтаваным абвінавачванням з боку заходнебеларускага камуністычнага руху, што было прадвызначана рашэннямі VI кангрэса Камінтэрна (1928 г.).

Нягледзячы на аслабленне пазіцый, БНТ працягвала займацца нацыянальнай інтэрпрэтацыяй гісторыка-культурнай спадчыны заходнебеларускіх зямель. На агульным сходзе БНТ 26 лютага 1928 г. было вырашана разгарнуць прапагандысцкую кампанію па збору сродкаў

для будаўніцтва ў Вільні Дома беларускай культуры, дзе меркавалася размясціць культурна-асветніцкія арганізацыі, музей. Тады ж было вырашана перавесці ахвяраванні А. Шаптыцкага, што былі перададзены раней праз А. Станкевіча на куплю дома (1 тыс. долараў), на рахунак Беларускага кааператыўнага банка [84, с. 14; 77, с. 79]. У многіх мясцовасцях адгукнуліся на заклік аб дапамозе. Так, у маі 1929 г. гмінная рада ў Скідэлі Гродзенскага павета асігнавала 500 злотых [819, арк. 6]. У 1930 г. на рахунку налічвалася больш 10 тыс. злотых, аднак з-за цяжкага становішча банка сродкі не ўдалося выкарыстаць [84, с. 14].

БНТ не мела пастаяннага складу, што была выклікана як ідэалагічнымі разыходжаннямі, так і адтокам яго членаў у заходнебеларускія партыйныя структуры, вымушаным выездам у БССР. У першай палове 1920-х гг. у Савецкую Беларусь выехалі М. Гарэцкі, А. Грыневіч, М. Кахановіч, А. Смоліч і іншыя дзеячы. Б. Тарашкевіч, І. Лагіновіч і іншыя прадстаўнікі былі ўцягнуты ў актыўную палітычную дзейнасць у Заходняй Беларусі. З канца 1920-х гг. БНТ папоўнілася моладдзю з Віленскага і Пражскага універсітэтаў, заходнебеларускай інтэлігенцыяй. Сярод іх быў І. Дварчанін, які ў 1926 г. абараніў у Празе дысертацыю, прысвечаную аналізу дзейнасці і светапогляду Ф. Скарыны. Паводле І. Дварчаніна, Ф. Скарына нарадзіўся не пазней 1487 г. [106]. У працу БНТ ўключыліся Р. Шырма, М. Ільяшэвіч, В. Грышкевіч, М. Пецюкевіч, Б. Кіт, С. Станкевіч, М. Чарнецкі, М. Шкялёнак і іншыя. Прыток новых сіл ажывіў дзейнасць БНТ. У 1930 г. у яго структуры была створана краязнаўча-турыстычная секцыя, якую ўзначаліў М. Ільяшэвіч. Першай буйнай акцыяй гэтай секцыі была мастацка-этнаграфічная выстава ў Вільні вясной 1930 г., на якой экспанаваліся малюнкі Я. Драздовіча (яны былі набыты беларускім музеем), іконы і малюнкі П. Сергіевіча, этнаграфічныя фатаграфіі У. Грыневіча [84, с. 15]. У ходзе наладжаных у чэрвені 1930 г. урачыстасцей, прымеркаваных да 500-годдзя смерці князя ВКЛ Вітаўта, з рэфератамі выступалі М. Ільяшэвіч, Я. Станкевіч [84, с. 15]. Па прапанове БНТ студэнцкае аб'яднанне "Скарынія" наладзіла ў 1932 г. цыкл навукова-папулярных лекцый.

Адначасова з папаўненнем БНТ моладдзю нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі яе былыя члены, прыхільнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў І. Дварчанін, С. Рак-Міхайлоўскі і іншыя ў пачатку 1930-х гг. апынуліся ў БССР, дзе неўзабаве сталі ахвярамі рэпрэсій. БНТ негатыўна рэагавала на змены ў грамадска-палітычным і культурным жыцці ў Савецкай Беларусі ў 1930-я гг. Напрыклад, на надзвычайным агульным сходзе БНТ 31 кастрычніка 1933 г. рэформа правапісу ў БССР была ацэнена як "акт чыста палітычны", былі прыняты рэзалюцыі пратэсту [566, с. 12]. Пазней Я. Станкевіч выклаў сваю

пратэстную аргументацыю ў асобнай брашуры [645]. Аднак не ўсе дзеячы прытрымліваліся такой пазіцыі. Сярод прыхільнікаў рэформы правапісу быў С. Паўловіч.

Фінансавыя цяжкасці перашкаджалі нармальнаму функцыянаванню беларускага музея. Толькі з 1930 г. польскія ўлады пачалі выдзяляць для яго невялікую дапамогу, што дазволіла разгарнуць працу па інвентарызацыі экспанатаў музея і бібліятэкі. У 1931 г. беларускі музей атрымаў статус навуковай установы. Беларускі музей уваходзіў у агульнапольскі саюз музеяў, а таксама быў зарэгістраваны ў спісе музеяў, выдадзеных Лігай нацый. Хоць БНТ з’яўлялася грамадскім аб’яднаннем, аднак праяўляла актыўны інтарэс да навуковага жыцця. Прадстаўнікі БНТ (А. Луцкевіч, В. Грышкевіч) выступалі на VI Агульнапольскім з’ездзе гісторыкаў у 1935 г. у Вільні. А. Луцкевіч у сваім дакладзе “Народавольцы-беларусы і іх орган “Гоман”, асноўныя палажэнні якога прадстаўляліся ў 1934 г. у рэфераце з нагоды 50-годдзя выхаду часопіса ў свет [822], так вызначыў яго значэнне: гэта “доказ абуджэння актыўнасці беларускай інтэлігенцыі на сваім родным, нацыянальным грунце” [352, с. 85; 822, арк. 34; 823, арк. 32; 46, арк. 34]. Паводле А. Луцкевіча, на старонках часопіса ўпершыню быў сфармуляваны пастулат “дзяржаўнай самастойнасці Беларусі ў складзе Расійскай федэрацыі” [822, арк. 34]. Спасылаючыся на сведчанні А. Багдановіча, А. Луцкевіч памылкова сцвярджаў, што другі нумар “Гомана”, адзін экзэмпляр якога захоўваўся ў беларускім музеі ў Вільні, быў выдадзены студэнтамі-беларусамі не ў Пецярбургу, а ў Маскве. На тым жа з’ездзе ў дакладзе “Роля беларускіх зямель у польска-літоўскіх уніях” В. Грышкевіч паспрабаваў прасачыць станаўленне ВКЛ як поліэтнічнай дзяржавы. Як адзначаў дакладчык, гэты працэс адбываўся ў жорсткай барацьбе літоўскай і беларуска-ўкраінскай (усходнеславянскай) арыстакратыі [29]. Сярод прычын заняпаду ВКЛ адзначаў паланізацыю і акаталічванне “вярхоў”, якія імкнуліся да новых прывілеяў і вольнасцей, што “адыграла фатальную ролю ў лёсе ўсяго беларускага народа”. Даклад В. Грышкевіча атрымаў станоўчыя водгукі польскіх вучоных [1066, с. 99].

Калі ў 1920-я гг. беларускі музей наведвалі адзінкавыя даследчыкі, то ў 1930-я гг. актывізавалася навукова-асветніцкая праца з моладдзю, пашырылася кола зацікаўленых навукоўцаў. Фонды музея для навуковай працы выкарыстоўвалі даследчыкі з Літвы, Латвіі, Швецыі, Нарвегіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Бельгіі, Францыі, Іспаніі, ЗША і іншых краін. Напрыклад, у 1932 г. сярод наведвальнікаў трэба адзначыць замежных даследчыкаў (М. Біржышку з Коўна, Г. Віршубскага з Берліна), а таксама вучоных, грамадскіх дзеячаў з Вільні, студэнтаў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя, вучняў Віленскай беларускай гімназіі. Паводле розных

ацэнак, на працягу 1933–1938 гг. музей наведалі 14,5 тыс. чалавек, наладжана было 428 экскурсій [102, с. 112; 809, с. 365; 811, с. 192; 354, с. 34; 563]. Беларускі музей супрацоўнічаў з музеем Таварыства сяброў навукі, які рэпрэзентаваў польскую культуру, а таксама з музеем Літоўскага навуковага таварыства, яўрэйскім і татарскім музеямі, што спрыяла ажыўленню міжнацыянальнай навуковай і культурнай камунікацыі. Беларускі музей прымаў удзел у шэрагу выстаў – прысвечанай А. Міцкевічу (Навагрудак, 1932 г.), народнага мастацтва ў Варшаве, славянскай выстаўцы ў Рызе ў 1931 г., агульнапольскай выставе народнага мастацтва ў Варшаве ў 1937 г., палескай выставе ў Львове ў 1938 г. і іншых.

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, у 1933 г. удалося выдаць навуковы зборнік "Гадавік Беларускага навуковага таварыства ў Вільні" [84], дзе ў шэрагу артыкулаў разглядаліся разнастайныя аспекты гісторыі і культуры ВКЛ. Вынікі сваіх даследаванняў кітаба, выяўленага ў 1915 г. у в. Сорак татар каля Вільні, Я. Станкевіч прадставіў у артыкуле "Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом" (праца была выдадзена асобнай брашурай [643]). М. Шкялёнак у сваім артыкуле "У трохсотыя ўгодкі смерці Вялікага канцлера Льва Сапегі" стваральніка Статута ВКЛ 1588 г. ацэньваў у якасці мудрага палітыка, дыпламата, высокаадукаванай, талерантнай і справядлівай асобы. Сярод прычын заняпаду ВКЛ ім вылучаліся глыбокія супярэчнасці ўнутранага жыцця. Праблема падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. і інтэграцыі беларускіх зямель у Расійскую імперыю была ўзнята ў змешчанай у "Гадавіку БНТ" працы М. Ільяшэвіча пра палітыку Кацярыны II і Паўла I на землях былога ВКЛ (была надрукавана асобнай брашурай [381]). Там звернута ўвага на меры па уніфікацыі ў галіне адміністрацыйнага кіравання, правоў і абавязкаў гараджан, шляхты, яўрэйскага насельніцтва. Паводле аўтара, у рэлігійным пытанні Кацярына II імкнулася да падпарадкавання каталіцкага касцёла і пашырэння ўплыву праваслаўнай царквы, рашуча праследавала уніяцтва [381, с. 18]. У "Гадавіку БНТ" быў таксама змешчаны нарыс А. Луцкевіча пра беларускі музей у Вільні (праца выдадзена асобнай брашурай [449]), артыкул Б. Брэжга "Замкі Віцебшчыны".

З-за матэрыяльных праблем БНТ не змагло арганізаваць рэгулярнае выданне штогодніка. Толькі ў 1938 г. быў надрукаваны зборнік "Запісы Беларускага навуковага таварыства", дзе мінулае і сучаснасць былі прадстаўлены "у новым беларускім аспекце, раскрываючы праўду аб беларусах і Беларусі, часта скажоную чужацкімі даследчыкамі" [371, с. 69]. Сярод апублікаваных там артыкулаў трэба адзначыць "Канец існавання друкарні дому Мамонічаў" Х. Ільяшэвіча, "Мова дыпламатычнага ліста

Рыжскай рады 1271–1280" Я. Станкевіча і іншыя. У артыкуле М. Шкялёнка "Падзел гісторыі Беларусі на перыяды" падвергнута крытыцы перыядызацыя У. Ігнатоўскага, а за аснову перыядызацыі было прапанавана ўзяць глыбокія, пераломныя змены ў палітычным, сацыяльным і культурным жыцці беларускага народа [371, с. 39]. Аўтарам артыкула былі вылучаны наступныя перыяды: 1) асобных дзяржаў (княстваў) (IX – сярэдзіна XIII ст.); 2) суцэльнай дзяржаўнасці (сярэдзіна XIII – канец XVII ст.); 3) перыяд заняпаду беларускай дзяржаўнасці (з канца XVII ст.) [371, с. 39]. Люблінская унія 1569 г., Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. атрымалі адмоўную ацэнку ("падарвалі беларускую дзяржаўнасць"). Трэба адзначыць, што такое негатыўнае стаўленне да падзей XVII–XVIII стст. і ў іншых заходнебеларускіх працах было перанята ад ацэнак, прыведзеных у гістарычных, культуралагічных, літаратуразнаўчых працах беларускіх аўтараў пачатку XX ст. Пры характарыстыцы 2-га перыяду абвяргаўся тэзіс пра літоўскае заваяванне беларускіх зямель. Знешняя небяспека, хрысціянства, знешнегандлёвыя адносіны паспрыялі ўтварэнню суцэльнай дзяржавы – ВКЛ, якую М. Шкялёнак адназначна лічыў беларускай. Традыцыя менавіта беларускай дзяржаўнасці была празмерна абсалютызавана, ігнараваўся поліэтнічны, поліканфесійны характар ВКЛ. У цэлым, прапанаваная М. Шкялёнкам перыядызацыя з'яўлялася спрэчнай і недастаткова абгрунтаванай. У артыкуле "Прадмет беларускай гісторыі" той жа аўтар паспрабаваў асвятліць праблемы гісторыясофіі, прааналізаваць асноўныя метадалагічныя падыходы ў гістарычнай навуцы. У якасці найбольш правільнага быў прызнаны метад аналогіі паміж мінулым і сучаснасцю, распрацаваны французскімі вучонымі [719, с. 116–117]. М. Шкялёнак уступаў у палеміку з літоўскімі даследчыкамі, якія лічылі ВКЛ выключна літоўскай дзяржавай. Літоўскія даследчыкі да беларусаў залічвалі толькі праваслаўных, а беларусаў-католікаў прызнавалі беларусізаванымі літоўцамі [720]. Монаэтнічная інтэрпрэтацыя гісторыі ВКЛ у працах літоўскіх вучоных была для Літвы адным са сродкаў вырашэння віленскага пытання [618, с. 156].

Акрамя выданняў БНТ, навуковыя і навукова-папулярныя публікацыі гістарычнай тэматыкі друкаваліся ў часопісах "Шлях моладзі", "Студэнцкая думка", "Калоссе" і іншых заходнебеларускіх выданнях. На старонках маладзёжнага грамадска-палітычнага і літаратурна-мастацкага часопіса нацыянальна-дэмакратычнага кірунку "Шлях моладзі" (1929–1939 гг.) былі апублікаваны работы А. Станкевіча "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення", "Кастусь Каліноўскі і яго "Мужыцкая праўда". Рэдакцыя выдання заклікала стварыць фонд культурна-асветніцкай працы ў заходнебеларускіх вёсках.

Орган БСС – грамадска-палітычны, навуковы і літаратурны часопіс "Студэнцкая думка", які выдаваўся ў Вільні ў 1924–1926, 1928–1930, 1935 гг. – неаднаразова ўздымаў пытанне аб зберажэнні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. На яго старонках друкаваўся артыкул Ф. Грышкевіча пра беларускі музей у Вільні, яго пераклад з польскай мовы працы А. Ельскага "Адам Міцкевіч на Беларусі", нарыс М. Ільяшэвіча "Паходжанне, старадаўнія весткі і антрапалагічныя адзнакі беларусаў", даследаванні М. Шкялёнка пра статуты ВКЛ, яго спробы аналізу народнай гаспадаркі Беларусі адносна яе самазабеспячэння, устойлівасці, працы Я. Станкевіча, І. Сланеўскага аб этнонімах Беларусі.

На старонках літаратурна-навуковага часопіса "Калоссе" (1935–1939 гг.) змяшчалася шмат матэрыялаў па айчыннай гісторыі, культуры, краязнаўстве. А. Станкевіч публікаваў там працы аб Ф. Скарыне, газеце "Мужыцкая праўда", часопісе "Гоман" і іншыя. М. Шкялёнак у сваіх публікацыях заняў радыкальныя пазіцыі, якія ўтрымлівалі русафобскія і паланафобскія элементы. У яго артыкуле "Тэрыторыя Беларусі і яе дагістарычнае насельніцтва" на падставе дасягненняў тагачаснай гістарычнай навукі праведзены аналіз асноўных канцэпцый паходжання беларусаў – фінскай, балцкай і іншых. М. Шкялёнак лічыў балтыйска-славянскую канцэпцыю "найбольш праўдападобнай", выказваў гіпотэзу аб тым, што фіна-ўгорскае і балцкае насельніцтва засяляла поўнач і захад Беларусі, а славянскае – большасць тэрыторыі Беларусі, асабліва паўднёва-ўсходні рэгіён [719, с. 111]. У артыкуле "Сінтэза беларускай гісторыі" негатыўна ацэньваў Брэсцкую царкоўную унію 1596 г., якая паспрыяла заняпаду ВКЛ [719, с. 122]. Там жа выказана адмоўнае стаўленне да беларускай савецкай гістарычнай навукі 1930-х гг. [719, с. 126]. Гісторыі Полацкага княства была прысвечана праца С. Сахарава "Полацкі князь Усяслаў – нацыянальны беларускі асілак". Пытанні эканамічнай гісторыі Беларусі разглядаліся ў артыкулах А. Клімовіча "Апошнія гады паншчыны на Беларусі", "Скасаванне паншчыны на Беларусі". На старонках часопіса таксама змяшчаліся культуралагічныя працы У. Самойлы, нарыс М. Пецюкевіча пра беларускага этнографа М. Нікіфароўскага і іншыя.

Хоць А. Луцкевіч займаўся пераважна літаратуразнаўчай праблематыкай, аднак яму належыць аўтарства шэрагу гістарычных і культуралагічных прац. У яго брашуры "Польская акупацыя ў Беларусі" (1920 г.) [451] прыведзены цэлы шэраг фактаў нацыянальна-культурнага ўціску беларускага насельніцтва. Нягледзячы на мемуарны характар і адсутнасць архіўных крыніц, кніга А. Луцкевіча "За дваццаць пяць гадоў (1903–1928)" (1928 г.) [450], прысвечаная гісторыі Беларускай рэвалюцыйнай грамады (Беларускай сацыялістычнай грамады), з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння беларускага нацыянальнага руху

пачатку XX ст. У заходнебеларускім друку змяшчаліся яго публікацыі па гісторыі беларускай культуры, мастацтва. Асобныя яго матэрыялы па айчыннай гісторыі так і не былі надрукаваны. Сярод іх – рукапіс па айчыннай гісторыі, дзе ў кантэксце нацыянальна-дэмакратычнай гістарыяграфічнай канцэпцыі адлюстравана эвалюцыя дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі з глыбокай старажытнасці 821]. Паводле А. Луцкевіча, пасля князя Усяслава Брачыслававіча адбывалася аслабленне палітычнай магутнасці Полацкага княства. Сярод фактараў, якія спрыялі станаўленню дзяржаўнасці, адзначаны трывалыя вечавыя традыцыі, наяўнасць гарадоў [821, арк. 10]. Хоць у згаданым рукапісе адсутнічаў дэталёвы аналіз пытання аб прыняцці хрысціянства, аднак аўтар сцвярджаў, што яно прыйшло з польскіх зямель ці з Візантыі "праз беларускае варажскае купецтва" раней, чым у канцы X ст. Гісторыя ВКЛ ім не закранулася, але адзначалася, што "Літва мела шмат супольнага з Беларуссю" [821, арк. 9].

Нягледзячы на літаратуразнаўчы характар працы М. Гарэцкага "Гісторыя беларускай літаратуры" (1920 г.), сістэматызаваны і агульнадаступны аналіз развіцця беларускай літаратуры ажыццёўлены ім на падставе метадаў гістарычнага даследавання. Аўтар таксама ідэалізаваў "залаты век" пісьменнасці, літаратуры (летапісы, Статуты ВКЛ, творы Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, Л. Сапегі, М. Сматрыцкага і іншых дзеячаў), адзначаў пазітыўнае ўздзеянне дзяржаватворчых працэсаў у эпоху ВКЛ. М. Гарэцкі даваў высокую ацэнку агульнаму культурнаму ўзроўню ўсходнеславянскага насельніцтва на момант утварэння ВКЛ [87, с. 100]. Крызіс старабеларускай літаратуры М. Гарэцкі тлумачыў слабасцю яе сацыяльных структур, павярхоўнай "культурнасцю" большасці шляхецкага саслоўя, што арыентавалася на польскія духоўныя і рэлігійныя ўзоры [87, с. 11, 103]. Сярод негатыўных фактараў адзначаў таксама страту ВКЛ палітычнай незалежнасці, драматычнае супрацьстаянне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў на беларускіх землях. У М. Гарэцкага таксама ідэалізуецца роля уніяцкай царквы ў захаванні культурна-моўнай самабытнасці беларускага народа. Нацыянальна-дэмакратычнае бачанне працэсаў мінулага прасочваецца і пры аналізе ненадрукаваных канспектаў М. Гарэцкага па гісторыі сярэднявечча [698]. У ходзе аналізу гістарычнага развіцця беларускага народа І. Канчэўскі (І. Абдзіраловіч) у філасофскім эсэ "Адвечным шляхам" (1921 г.) вылучаў яго галоўную асаблівасць – "ваганне паміж Захадам і Усходам і шчырую непрыхільнасць ні да аднаго, ні да другога" [5, с. 9].

Лідэр беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў А. Станкевіч таксама пачынаў традыцыю дзяржаўнасці Беларусі з Полацкага, Турава-Пінскага княстваў, ВКЛ. "Пасля падзення дынастыі Рагвалодавічаў у XIV ст. пачынаецца аб'яднанне беларускіх княстваў з Літвой, якая сама трапіла

пад культурны ўплыў беларускага народа” [47, арк. 3–15; 634, с. 111]. Хоць А. Станкевіч па палітычных кан’юнктурных меркаваннях імкнуўся займаць пралітоўскую пазіцыю, аднак адмаўляў тэзіс аб гвалтоўным захопе заходнебеларускіх зямель літоўскімі феадаламі ў час станаўлення ВКЛ. У разуменні А. Станкевіча ВКЛ была літоўска-беларускай дзяржавай з некаторымі ўкраінскімі ўплывамі, дзе “палітыку тварылі перад усім літоўцы, а культуру – беларусы” [636, с. 8], г. зн. за ўсходнеславянскім этнічным кампанентам прызнавалася вядучае месца ў духоўным жыцці ВКЛ. Роля рэлігійных каштоўнасцей у часы Рэчы Паспалітай істотна завышалася ў параўнанні са свецкай культурай. Адбывалася ідэалізацыя уніяцтва – “унія стала адзінай апорай беларускай культурнай асобнасці” [636, с. 9]. У канцэпцыі гісторыі Беларусі А. Станкевіча Люблінская унія 1569 г. прызнавалася пачаткам агульнага заняпаду XVII–XVIII стст. Ацэнкі А. Станкевічам пачатковай гісторыі Рэчы Паспалітай, ролі рэлігіі ў гэтай дзяржаве не прымаліся асобнымі заходнебеларускімі аўтарамі.

А. Станкевіч даваў высокую ацэнку гуманістычнай, дэмакратычнай дзейнасці Ф. Скарыны ў брашуры “Доктар Францішак Скарына – першы друкар беларускі (1525–1925)” (1925 г.) [637], падрыхтаванай да 400-годдзя беларускага кнігадрукавання. 1925 г. для святкавання быў выбраны невыпадкова, бо многія даследчыкі лічылі, што Ф. Скарына вярнуўся з Прагі ў Вільню менавіта ў 1525 г. Геапалітычныя аспекты ў палітыцы ВКЛ, узаемаадносіны Вітаўта і Ягайлы і іншыя пытанні палітычнай гісторыі Беларусі канца XIV – пачатку XV стст. закраналіся А. Станкевічам у працы “Вітаўт Вялікі і беларусы” (1930 г.), якая была падрыхтавана для ўрачыстасцей з нагоды 500-годдзя смерці князя ВКЛ Вітаўта [635]. Сярод фактараў, што спрыялі культурнаму ўздыму ў XVI ст., А. Станкевіч вылучаў дзяржаўную самастойнасць ВКЛ, магдэбургскае права, Статут ВКЛ і іншыя. У асобнай працы ім прасочана прысутнасць беларускай мовы ў навучальным працэсе розных тыпаў канфесійных школ XVI–XVII стст. [632, с. 16–17]. Паводле А. Станкевіча, рукапісы М. Баброўскага, у тым ліку яго даследаванне “Гісторыя славянскіх друкарняў у Літве”, былі знішчаны па загаду мітрапаліта І. Сямашкі [639, с. 40].

Да 70-годдзя паўстання і гібелі К. Каліноўскага заходнебеларуская хрысціянска- і нацыянальна-дэмакратычная інтэлігенцыя наладзіла ў Вільні шэраг урачыстасцей. У прыватнасці, на святочнай акадэміі 25 сакавіка 1933 г. А. Станкевіч прачытаў асобны рэферат “Кастусь Каліноўскі, “Мужыцкая праўда” і ідэя незалежнасці Беларусі”, які быў выдадзены брашурай [638]. Адназначна і безапеляцыйна падкрэслівалася беларуская этнічная прыналежнасць кіраўніка паўстання. А. Станкевіч не меў ніякіх ілюзій наконт таго, што К. Каліноўскі быў “палітычным

рамантыкам”, але адначасова ўзвышана яго называў “вялікім барацьбітом за волю народа”, “змагаром за палітычную самастойнасць Беларусі і Літвы” [638, с. 21]. Адзначалася, што К. Каліноўскі галоўнай рухаючай сілай паўстання бачыў сялянства і падвяргаў сумненню яго паспяховасць у выніку далучэння буйных землеўласнікаў. Паводле версіі А. Станкевіча, аўтарам беларускіх вершаваных твораў агітацыйнага характару 1860-х гг. пад агульнай назвай “Гутарка двух суседаў” мог быць і К. Каліноўскі. Постаць К. Каліноўскага, “прадвесніка незалежнасці”, разглядалася А. Станкевічам у адным шэрагу з “Мужыцкай праўдай” і часопісам “Гоман”. Грамадска-палітычнае жыццё беларускіх зямель у XIX ст. падавалася ў агульнаеўрапейскім прававым і палітычным кантэксце [406, с. 42]. Ідэі еўрапейскага Асветніцтва (“рамантызм літаратурны і навуковы”) лагічна паўплывалі на працэсы нацыянальнага адраджэння (“рамантызм палітычна-народны”) [636, с. 12–13]. К. Каліноўскі прылічаны да пачынальнікаў беларускага палітычнага вызвалення, рэвалюцыйных народнікаў. На яго ідэйна-палітычнае самасцвярджэнне, паводле А. Станкевіча, аказалі ўплыў рэвалюцыйна-дэмакратычныя погляды А. Герцэна, М. Бакуніна, М. Кастамарава, Т. Шаўчэнкі і іншых дзеячаў. Закранаючы нацыянальныя аспекты паўстання, аўтар адзначаў, што “у Каліноўскага не было… беларускага нацыяналізму ў сучасным разуменні, але ў яго, як і ў многіх са шляхты, былі яшчэ жывыя традыцыі ВКЛ” [636, с. 23]. А. Станкевіч выступіў з вострай крытыкай беларускага савецкага гісторыка С. Агурскага, які адмаўляў дачыненне К. Каліноўскага да друкавання “Мужыцкай праўды”.

Празмерна рамантызаваны вобраз нацыянальнага героя К. Каліноўскага, створаны ў працах А. Станкевіча і іншых дзеячаў хрысціянска- і нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, актыўна прапагандаваўся ў асяроддзі нешматлікай беларускай інтэлігенцыі, студэнцкай і вучнёўскай моладзі. У супрацьвагу яму ў шэрагу твораў заходнебеларускай літаратуры (“Смерць Кастуся Каліноўскага” М. Машары (1934 г.), “Каліноўскі” М. Танка (1938 г.)) быў прадстаўлены іншы – знешне сугучны даследаванням беларускай савецкай гістарычнай навукі 1930-х гг. – вобраз К. Каліноўскага як тыповага рэвалюцыянера. М. Танку задума паэмы была падказана сакратаром ЦК камсамола Заходняй Беларусі М. Дворнікавым – супрацьпаставіць фальсіфікатарам (“беларускай буржуазна-нацыяналістычнай” і “польскай шавіністычнай” прэсе) “свой праўдзівы твор” [393, с. 46]. Аднак у адрозненне ад савецкай гістарыяграфіі, заходнебеларускія камуністы разглядалі К. Каліноўскага не як кіраўніка польскага руху, а як змагара з сацыяльным і нацыянальным прыгнётам беларусаў, што набліжала іх да дзеячаў БХД [78, с. 23].

У цэлым, у названых творах М. Машары, М. Танка мастацкі вымысел цесна пераплятаўся з метадамі гістарычнага даследавання.

Хоць “крывіцкая” канцэпцыя этнагенезу беларусаў Я. Станкевіча была сфармулявана ў 1940–1970-я гг. пераважна ў эміграцыйных выданнях, аднак у асобных працах 1930-х гг., у тым ліку і мовазнаўчых, прагледжваюцца фрагменты супярэчлівых і спрэчных поглядаў аўтара на айчынную гісторыю. Яго гістарычныя даследаванні не вызначаліся грунтоўнай метадалагічнай базай, у іх амаль адсутнічала крытычнае стаўленне да гістарычных крыніц ці проста яны запазычваліся з даследаванняў іншых аўтараў. Я. Станкевіч у працы “Беларускія плямёны і іхняе рассяленне” (1930 г.) спрабаваў ажыццявіць дэмаркацыю беларускай этнічнай тэрыторыі на падставе моўных звестак, высвятляў “беларускасць” некаторых славянскіх плямёнаў, праблему іх рассялення. Плямёны на тэрыторыі Беларусі падзяляў на 2 групы – паўднёва-заходнія (дрыгавічы, радзімічы, вяцічы, севяране) і паўночна-ўсходнія (крывічы). Тэрыторыяй рассялення крывічоў лічыў Віцебшчыну, значную частку Магілёўшчыны, Смаленшчыны, амаль усю Пскоўшчыну, частку Цвярской зямлі [644, с. 29–30]. У ходзе міфалагізацыі гістарычнага мінулага Я. Станкевіч прыпісваў полацкім князям XII ст. беларускую нацыянальную свядомасць. Паводле Я. Станкевіча, пасля ўтварэння моцнага дзяржаўнага цэнтру ў Полацку адтуль назіраліся моцныя ўплывы на захад. У пацвярджэнне гэтага ён называў працэс тэрытарыяльнага пашырэння Полацкага княства і звесткі гістарычнай геаграфіі. У час існавання ВКЛ (“новай беларускай дзяржаўнасці”) гэтыя ранейшыя ўплывы з’яўляліся адчувальным фактарам [644, с. 29–30]. ВКЛ уяўлялася Я. Станкевічу монаэтнічнай (беларускай) дзяржавай – Вялікім княствам беларускім, а яго правіцелі – адпаведна “вялікімі князямі беларускімі” (“літоўскімі”). Ім ідэалізаваўся Вітаўт, “геній якога не меў сабе роўнага” [643, с. 3]. Праблемы этнагенезу беларусаў разглядаліся аўтарам у яго працы “Час узнікнення беларускага і ўкраінскага народаў” (1931 г.). У ходзе абсалютызацыі нацыянальнай праблемы Я. Станкевіч прытрымліваўся пазіцыі аб поўнай асобнасці беларусаў адносна ўсіх іншых славянскіх народаў.

З БНТ цесна супрацоўнічаў навуковы гурток студэнтаў-беларусаў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя – Таварыства прыяцеляў беларусаведы (1931–1939 гг.), мэтай якога з’яўлялася папаўненне і паглыбленне ведаў у галіне беларусазнаўства, навуковая дапамога ў вучобе, падтрымка цеснай сувязі з іншымі аб’яднаннямі ці ўстановамі навуковага профілю [33, арк. 129]. Куратарамі таварыства былі Э. Кашмідэр (да 1936 г.), які выкладаў славянскую філалогію, Я. Станкевіч (1936–1939 гг.). Э. Кашмідэр імкнуўся да таго, каб гурток займаўся выключна навуковай дзейнасцю, рэкамендаваў гурткоўцам не прымаць

пастанову аб пратэсце супраць рэформы беларускага правапісу ў БССР (“пратэст – гэта не навуковая праца”) [32, арк. 50адв.–52адв.]. Аднак пасля наладжанай адпаведнай дыскусіі ў канцы студзеня 1934 г. адпаведная рэзалюцыя з пратэстам усё-такі была прынята 4 сакавіка 1934 г. Таварыства наладжвала этнаграфічныя экспедыцыі, збор фальклору ў заходнебеларускім рэгіёне [33, арк. 134]. Навуковыя даследаванні ажыццяўляліся ў асобных секцыях – мовазнаўчай (Я. Станкевіч), этнаграфічнай (М. Пецюкевіч), гісторыка-эканамічнай (М. Ільяшэвіч, Я. Касяк), літаратурнай (С. Станкевіч) [32, арк. 12адв.]), на сходах якіх студэнты выступалі з рэфератамі. 2 разы ў месяц адбываліся пасяджэнні ў сценах універсітэта [492, арк. 73]. Святочныя ўрачыстасці наладжваліся да 300-годдзя смерці Л. Сапегі (1933 г.) і іншых гістарычных юбілеяў. Таварыства прыяцеляў беларусаведы было нешматлікім – у канцы 1933 г. там было каля 40 чалавек [32, арк. 40адв.]. Намаганнямі БНТ ствaралася бібліятэка Таварыства прыяцеляў беларусаведы, якая ў 1937 г. налічвала больш 500 кніг [32, арк. 54; 34, арк. 25]. Шырокай даследчыцкай працы гуртка перашкаджалі матэрыяльныя цяжкасці.

Паралельна з БНТ дзеячы БХД імкнуліся праводзіць уласныя даследаванні. У 1934 г. у структуры БІГіК былі створаны навуковыя секцыі: эканомікі і статыстыкі (старшыня – А. Клімовіч) (мела свой друкаваны орган – часопіс “Самапомач”), этнаграфіі і археалогіі (М. Пецюкевіч), гісторыі і сацыялогіі (М. Шкялёнак), літаратуры і мастацтва (С. Станкевіч) (займалася друкаваннем часопіса “Калоссе”) [9; 353]. Планавалася стварыць пры БІГіК музей і бібліятэку. Новая музейная ўстанова задумвалася як партнёрская для існуючага беларускага музея, аднак пасля забароны дзейнасці БІГіК праект не быў рэалізаваны.

У канцы 1930-х гг. адсутнасць фінансавых сродкаў ускладняла існаванне беларускага музея ў Вільні. Управа БНТ беспаспяхова звярталася з лістом да польскага ўраду аб дапамозе для беларускага музея з боку Фонда нацыянальнай культуры (Funduszu kultury narodowej) [371, с. 67]. У 1938 г. ажыццяўляліся спробы ліквідаваць БНТ і закрыць беларускі музей, наладжваліся яго рэвізіі. Нягледзячы на гэта, Віленскі беларускі музей нават актывізаваў навукова-асветніцкую дзейнасць. Колькасць яго наведвальнікаў узрастала: толькі за 4 месяцы 1938 г. зафіксавана больш 4 тыс. чалавек Паводле А. Луцкевіча, Віленскае ваяводскае ўпраўленне планавала аб’яднаць беларускі музей з музеем Літоўскага навуковага таварыства ў адзіны рэгіянальны дзяржаўны музей. Польскія чыноўнікі прапанавалі менавіта яму заняцца арганізацыяй і кіраўніцтвам такога музея, аднак А. Луцкевіч рашуча адмовіўся [16, с. 192; 371, с. 40]. Менавіта з-за гэтага з чэрвеня 1938 г. былі спынены

штомесячныя дзяржаўныя субсідыі для беларускага музея ў Вільні, дзейнасць якога не адпавядала афіцыйнай ідэалагічнай дактрыне.

Як сведчыць праведзены аналіз, БНТ не здолела пераўтварыцца ў масавую арганізацыю. Колькасны склад яе членаў прызнаецца невялікім [187, с. 99]. Паводле архіўных звестак, у канцы 1930-х гг. у складзе БНТ налічвалася 64 чалавекі (у 1938 г. разам з членамі грамадскага фонду па падтрымцы беларускага музея – 120 чалавек [377, с. 15; 25; 27]). Сярод іх былі прадстаўнікі рознай палітычнай арыентацыі, у тым ліку хрысціянска-дэмакратычных поглядаў. Большасць складала заходнебеларуская інтэлігенцыя, студэнты, гімназісты (усе пераважна з Вільні).

Вялікую цікавасць да гісторыі і культуры заходнебеларускага краю праяўлялі польскія навуковыя ўстановы і аб’яднанні. Адным з буйных цэнтраў даследаванняў з’яўляўся Віленскі універсітэт імя С. Баторыя. Асноўныя навуковыя кадры гісторыкаў, культуролагаў былі прадстаўлены ў прафесарска-выкладчыцкім корпусе 3-х факультэтаў універсітэта з 5-ці – гуманітарнага, права і грамадскіх навук, мастацтва. Прыярытэтнае значэнне надавалася вывучэнню гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Г. Лаўмянскі выдаў працы “Вывучэнне пачаткаў грамадства і літоўскай дзяржавы” (у 2-х тт.)(1931–1932 гг.), “Гістарычны нарыс Навагрудскага ваяводства ў яго цяперашніх межах (да 1795 г.)” (1935 г.) і іншыя. К. Хадыніцкі, які да пераезду у 1928 г. у Познань узначальваў кафедру сярэдневяковай гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплін Віленскага універсітэта імя С. Баторыя, у публікацыях на старонках часопісаў “Przegląd historyczny” (“Гістарычны агляд”), “Kwartalnik historyczny” (“Гістарычны квартальнік”) і іншых закранаў палітычныя, прававыя, канфесійныя праблемы ВКЛ. Ім быў выдадзены гістарычны нарыс праваслаўнай царквы ў ВКЛ XIV–XVII стст. (1934 г.). С. Касцялкоўскі, які ўзначальваў кафедру гісторыі Польшчы, вывучаў дзейнасць падскарбія А. Тызенгаўза, гісторыю заснаваных ім мануфактур і эканомій. Пад навуковым кіраўніцтвам С. Касцялкоўскага студэнты выконвалі дыпломныя праекты па гісторыі Беларусі і Літвы. Р. Мяніцкі, які выкладаў курс архівазнаўства ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя, займаўся вывучэннем гісторыі Полаччыны. Яму належыць аўтарства шэрагу прац – “Віленская археаграфічная камісія (1864–1915 гг.)” (1925 г.), “Архіў старажытных актаў у Віцебску (1852–1903 гг.)” (1939 г.) і іншых. С. Віславух, які працаваў на факультэце права і грамадскіх навук, даследаваў адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел асобных мясцовасцей ВКЛ (Кобрынскага павета, землеўладанняў у Ласосне і Шарашове), шляхі зносін на Палессі, сацыяльна-эканамічнае развіццё Магілёва ў XVI–XVII стст. і іншыя праблемы [815; 389; 970].

Намаганнямі загадчыка кафедры этнаграфіі і этналогіі Ц. Эрэнкройц у 1925 г. у Віленскім універсітэце імя С. Баторыя быў заснаваны этнаграфічны музей. Фонды музея папаўняліся за кошт ахвяраванняў устаноў, прыватных асоб. У 1932 г. там налічвалася 2 106 экспанатаў [1214]. Ц. Эрэнкройц праводзіла этнаграфічныя даследаванні на памежжы Палесся і Падляшша. Сярод навукова-метадычных прац музея неабходна адзначыць “Парады для тых, хто збірае прадметы ў этнаграфічны музей” (1926 г.) Ц. Эрэнкройц, “Малы этнаграфічны апытальнік” (1932 г.) М. Знамяроўскай-Пруфер і іншыя. Музей меў арыгінальны архіў. Вынікі навуковага вывучэння твораў ткацтва і іншых відаў народнага мастацтва былі прадстаўлены ў публікацыях “Распісныя сялянскія куфры з ваколіц Віленшчыны і Палесся” (1925 г.), “Народнае мастацтва Віленшчыны і Навагрудчыны” (1935 г.) В. Дуноўскага, “Народнае кавальства ў Віленскім ваяводстве” (1936 г.) З. Карыбуцяка, “Народная рамесніцкая вытворчасць у Віленскім і Навагрудскім ваяводстве” (1935 г.) Л. Туркоўскага. З 1935 г. замест Ц. Эрэнкройц загадчыкам кафедры стаў К. Машынскі, які да гэтага працаваў у Ягелонскім універсітэце ў Кракаве.

Другім значным цэнтрам польскай навуковай думкі ў Вільні пасля Віленскага універсітэта імя С. Баторыя з’яўлялася Таварыства сяброў навукі (Towarzystwo przyjaciół nauk), заснаванае яшчэ ў кастрычніку 1906 г. З аднаўленнем дзейнасці універсітэта ў 1919 г. адбывалася рэарганізацыя Таварыства сяброў навукі. У структуры таварыства, статут якога быў прыняты 19 лістапада 1922 г., былі 3 аддзелы: адзін аб’ядноўваў даследчыкаў у галіне мовазнаўства, літаратуразнаўства, мастацтвазнаўства, другі – прыродазнаўчых, дакладных навук, медыцыны, трэці – грамадскіх дысцыплін, гісторыі. Пры таварыстве функцыянавалі бібліятэка, архіў і музей. Сярод ахвярадаўцаў былі “крэсовыя” памешчыкі, вучоныя. Сродкі атрымлівалі таксама ад Фонда нацыянальнай культуры, субсідый польскага ўрада і іншых дзяржаўных структур. Сярод членаў Таварыства сяброў навукі пераважалі прафесары і выкладчыкі Віленскага універсітэта імя С. Баторыя, чыноўнікі, настаўнікі з Вільні і Віленшчыны. Таварыства актыўна займалася выдавецкай дзейнасцю. У 1923–1939 гг. ім было надрукавала 14 нумароў гістарычнага часопіса “Ateneum Wileńskie”, рэдагаваннем якога займаліся польскія вучоныя К. Хадыніцкі, Т. Мадэльскі, Б. Віляноўскі, С. Заянчкоўскі. Акрамя рэдактараў, сярод аўтараў публікацый былі даследчыкі Віленскага універсітэта імя С. Баторыя і іншых ВНУ, навуковых устаноў Польшчы. Акрамя артыкулаў, там змяшчаліся рэцэнзіі, дакументы і іншыя гістарычныя крыніцы. Прадметам даследаванняў з’яўляліся разнастайныя аспекты гісторыі і культуры ВКЛ. Г. Лаўмянскі разам са сваёй жонкай Марыяй, С. Касцялкоўскім прыступіў у канцы 1920-х гг. да падрыхтоўкі да друку

грунтоўнага выдання крыніц “Кодэкс горада Вільні” (удалося надрукаваць т. 1 і частку т. 2). Каштоўнымі крыніцазнаўчымі выданнямі былі 3 тамы “Матэрыялаў па гісторыі літаратуры і асветы з архіва друкарні і кнігарні Я. Завадскага ў Вільні”, падрыхтаваныя Т. Туркоўскім. Пад рэдакцыяй Р. Мяніцкага ў 1939 г. быў выдадзены ў т. 5 “Крыніц і гістарычных матэрыялаў III аддзела Таварыства сяброў навукі” біябібліяграфічны слоўнік Віленскага універсітэта першай трэці XIX ст. на падставе матэрыялаў Л. Яноўскага.

Археалагічнымі даследаваннямі займалася Дырэкцыя дзяржаўных калекцый у Варшаве. У 1934 г. у час раскопак у Пінску былі выяўлены рэшткі сцен, каналаў, падземныя ходы замка князёў Вішнявецкіх. У Століне ў час будаўнічых работ на гарадской плошчы рабочыя натыкнуліся на надмагільныя пліты XV ст. Археалагічнымі даследаваннямі займаліся У. Антаневіч, У. Галубовіч, А. Цэгак-Галубовіч, Я. Савіцкі, С. Крукоўскі і іншыя. З 1933 г. у Вільні дзейнічаў музей дагістарычнай археалогіі. Археолагі А. Цэгак-Галубовіч, У. Галубовіч шукалі сляды славянскіх пасяленняў пры раскопках каля Наўраў Пастаўскага павета, возера Нарач і г. д. Вынікі сваіх даследаванняў яны змяшчалі ў часопісе “Rocznik archeologiczny” (“Археалагічны штогоднік”) і іншых навуковых выданнях.

Вывучэннем асобных пытанняў гісторыі, культуры беларусаў і іншых этнічных супольнасцей займаўся Інстытут даследавання нацыянальных спраў. Так, на старонках яго часопіса “Sprawy narodowościowe” былі змешчаны палемічныя нататкі аб паходжанні беларусаў і ўкраінцаў, артыкулы Я. Станкевіча аб рэформе беларускага правапісу 1933 г. у БССР і іншыя даследаванні. Заснаваны ў Вільні ў 1930 г. Навукова-даследчы інстытут Усходняй Еўропы, старшынёй управы якога быў С. Эрэнкройц, займаўся вывучэннем розных грамадска-палітычных, эканамічных, культурных, сацыялагічных праблем краін балтыйскага рэгіёну і еўрапейскай часткі СССР [926, с. 524–541; 1208, с. 618–629]. Акрамя штогодніка (“Rocznik Instytutu”) (выйшла ўсяго 2 нумары), выдаваўся часопіс „Balticoslavica”, дзе публікаваліся матэрыялы па гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, мовазнаўству. На яго старонках друкавалася праца А. Луцкевіча пра беларускі музей у Вільні, Ц. Эрэнкройц – пра кафедру этнаграфіі і этналогіі Віленскага універсітэта імя С. Баторыя, Я. Станкевіча – аб стане даследаванняў класіфікацыі беларускіх дыялектаў, а таксама артыкулы С. Заянчкоўскага, К. Машынскага і іншых польскіх вучоных.

З канца 1920-х гг. пачалі арганізоўвацца навукова-даследчыцкія экспедыцыі на Палессе для вывучэння помнікаў гісторыі і культуры, этнаграфіі і дойлідства. У верасні 1932 г. польскія даследчыкі К. Машынскі і Ф. Калеса наладзілі этнаграфічную экспедыцыю ў

Лунінецкім, Столінскім, Драгічынскім і іншых паветах, у ходзе якой адбываліся запісы народных песняў, інструментальных мелодый. Сярод абрадавых песняў цікавасць вучоных выклікалі калядныя, веснавыя, купальскія, дажынкавыя, вясельныя, пахавальныя, а таксама калыханкі, казацкія і рэкруцкія песні, балады і іншыя. Паводле Ф. Калесы, абрадавыя песні на Палессі добра захавалі архаічныя рысы [472, с. 28]. Матэрыялы сваіх экспедыцый К. Машынскі абагуліў у працах "Усходняе Палессе" (1928 г.), 2-х томным выданні "Народная культура славян" (1929, 1939 гг.), а таксама ў шэрагу артыкулаў ("Пра музычна-этнаграфічныя даследаванні на Палессі ў 1932 г." (1934 г.) і інш.). Неабходна адзначыць, што тагачасныя этналагічныя даследаванні польскіх вучоных вылучаліся высокім тэарэтычным узроўнем, наватарскімі метадамі даследаванняў (экспедыцыйным метадам, эвалюцыйным метадам, картаграфаваннем, лінгвістычным аналізам і інш.). Так, для правядзення параўнальнага аналізу Палесся і Навагрудчыны К. Машынскі выкарыстоўваў у сваіх працах матэрыялы, сабраныя даследчыкамі з іншых рэгіёнаў Беларусі [466]. Яму даводзілася аказваць арганізацыйную дапамогу маладым даследчыкам. Напрыклад, летам 1931 г. у асобным лісце ён прасіў мясцовыя ўлады аказаць падтрымку студэнтам Віленскага універсітэта імя С. Баторыя Л. Туркоўскаму, М. Пецюкевічу у час іх этнаграфічнай экспедыцыі на тэрыторыі Лунінецкага павета [117, арк. 6]. У лісце палескага ваяводы Я. Крагельскага ад 22 ліпеня 1931 г. не гарантавалася падтрымка з боку мясцовай адміністрацыі для М. Пецюкевіча, які быў прызнаны "адзінкай, што вызначаецца моцнай агрэсіўнасцю адносна польскай дзяржаўнасці на ўсходніх крэсах…" [117, арк. 5].

На працягу 1934–1937 гг. вучоныя з шэрагу ВНУ Польшчы праводзілі даследаванні Палесся. Першая экспедыцыя пачалася ў красавіку 1934 г. у Лунінецкім, паўночна-ўсходняй частцы Пінскага павета [141, арк. 40–41]. Восенню таго ж года навуковыя даследаванні былі перанесены на тэрыторыю Брэсцкага, Кобрынскага паветаў. Ю. Абрэмбскі разам з С. Дваракоўскім, Я. Тэадаровічам, З. Карыбуцякам, Р. Хамінскім і студэнтамі Познаньскага універсітэта збіраў этнаграфічныя матэрыялы таксама ў Столінскім павеце [868–869]. Некалькі навуковых экспедыцый пад кіраўніцтвам Л. Градзіцкага, Л. Асоўскага займаліся мовазнаўчымі даследаваннямі ў Брэсцкім, Лунінецкім, Столінскім і іншых паветах [142, арк. 38]. Ю. Абрэмбскі апрацаваў вынікі даследаванняў і часткова апублікаваў у 1936 г. у артыкулах "Этнічныя праблемы Палесся", "Сённяшнія людзі Палесся", "Праблема этнічных груп у этналогіі і яе сацыялагічнае разуменне", "Статычныя і дынамічныя падыходы ў нацыянальных даследаваннях" на старонках часопісаў "Sprawy narodowościowe" [1056], "Przegląd socjologiczny" ("Сацыялагічны агляд").

Ім была прааналізавана этнічная структура Палесся, абгрунтавана тэорыя этнічнай групы, адлюстраваны перамены ў традыцыйных этнічных супольнасцях.

Камісія навуковых даследаванняў ўсходніх зямель, якая была ўтворана ў 1934 г. для каардынацыі міждысцыплінарных даследаванняў, выпрацоўкі адпаведных рашэнняў, наладзіла 20–21 верасня 1936 г. у Варшаве I справаздачна-навуковы з'езд, прысвечаны ўсходнім землям. Для 300 дэлегатаў было прадстаўлена 16 дакладаў на пленарным пасяджэнні, у ходзе працы гуманітарнай і гаспадарчай секцый. Прадметам даследаванняў вучоных з'яўляліся розныя аспекты этнаграфіі, мовазнаўства, дэмаграфіі Палесся [138, арк. 27–27адв.].

Навуковымі даследаваннямі і папулярызацыяй гістарычных ведаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі займалася Польскае гістарычнае таварыства (Polskie towarzystwo historyczne) (ПГТ). У маі 1933 г. у Брэсце быў створаны яго аддзел, які ахопліваў тэрыторыю Палескага і Беластоцкага ваяводстваў (старшыня – інспектар сярэдніх школ Брэсцкай школьнай акругі А. Татамір). Агульная секцыя гэтага аддзела ажыццяўляла правядзенне лекцый і рэфератаў, дыдактычная секцыя клапацілася пра дыдактычнае забеспячэнне выкладання гісторыі, рэгіянальная секцыя займалася апрацоўкай бібліяграфіі, апісаннем помнікаў гісторыі і культуры, рыхтавала гісторыю польскага асадніцтва на Палессі [124, арк. 14–18].

Аддзел ПГТ у Гродна на чале з палкоўнікам Т. Фундальскім быў створаны ў верасні 1935 г. [306]. У яго склад уваходзілі як прыватныя асобы, так і ўстановы адукацыі, культуры (гімназіі, бібліятэкі) [306, арк. 26]. На пасяджэннях наладжваліся лекцыі, дыскусіі [310]. У аддзеле была створана секцыя вывучэння гісторыі. Арганізацыя не праяўляла вялікай актыўнасці, назіралася тэндэнцыя змяншэння колькасці яе членаў – у канцы 1937 г. іх было 23 [309, арк. 29–30; 307, арк. 14]. Была ўтворана асобная камісія для заснавання ў горадзе навуковай гістарычнай бібліятэкі ў гонар Ю. Пілсудскага [302, арк. 3], якая павінна была стаць "моцным вогнішчам польскіх ведаў і культуры". Паводле статута, мэтай бібліятэкі з'ўлялася навукова-даследчыцкая і інфармацыйная дзейнасць па праблематыцы ВКЛ [303]. Дапамогу ў бібліяграфічнай апрацоўцы, выкарыстанні і захаванні кніг бясплатна аказвалі члены мясцовага аддзела ПГТ [301, арк. 1, 53]. Бібліятэка фарміравалася на базе кнігазбору дзяржаўнага архіва ў Гродна (каля 2 тыс. тамоў). На працягу лютага-снежня 1937 г. у асобны інвентар і на карткі былі зафіксаваны 3 тыс. адзінак, з якіх большасць былі ахвяраваны з дзяржаўных і прыватных бібліятэк, вучонымі. Аднак да канца 1937 г. бібліятэка афіцыйна так і не была адкрыта [300]. Значная колькасць кніг для гістарычнай бібліятэкі ў

Гродна была перададзена з фондаў бібліятэк Львоўскага і Віленскага універсітэтаў, дзяржаўнай бібліятэкі імя Урублеўскіх у Вільні [304–305].

Распрацоўкай пытанняў рэгіянальнай гісторыі, краязнаўства займалася Польскае краязнаўчае таварыства (Polskie towarzystwo krajoznawcze) (ПКТ), заснаванае ў 1906 г. у Варшаве. Яно далучылся да практычнай рэалізацыі тэорыі рэгіяналізацыі ў культурным жыцці. На тэрыторыі Заходняй Беларусі таксама ствараліся нешматлікія структурныя ваяводскія і павятовыя адзінкі ПКТ, дзе абсалютную большасць складалі польскія настаўнікі і чыноўнікі [1113]. Самастойнае краязнаўчае таварыства ўзнікла восенню 1924 г. ў Пінску. На працягу 1924–1926 гг. праводзіўся збор матэрыялаў для музея, для якога польскія чыноўнікі, землеўладальнікі, мясцовая інтэлігенцыя ахвяравалі асобныя артэфакты культуры. Напрыклад, М. Бутрымовіч падаравала іконы і іншыя каштоўныя мастацкія творы XVIII–XIX стст., сенатар П. Алевінскі перадаў некалькі прадметаў зброі XVII–XIX стст., Р. Гарашкевіч – каштоўныя архіўныя матэрыялы, выданні. Восенню 1926 г. на чале ўправы краязнаўчага таварыства ў Пінску стаў галава горада Ч. Мергенталер. Краязнаўчае таварыства ў Пінску ў красавіку 1927 г. стала аддзелам ПКТ [677, с. 74], які праводзіў сустрэчы пад назвай “Краязнаўчая чорная кава”, наладжваў дыскусіі, лекцыі, выступленні мастацкіх калектываў, кінасеансы. Значны ўклад у адкрыцё музея ў Пінску ў 1926 г. унеслі Д. Геаргіеўскі, Р. Гарашкевіч, Ю. Абухоўскі і іншыя дзеячы. Гонар музея складаў этнаграфічны аддзел – калекцыі керамікі Гараднои, Пружан, Пагост-Загародскага і іншых ганчарных цэнтраў, вырабы з лазы, бяросты, саломы, народных палескіх строяў, тканін і інш. Даволі вялікім быў збор фотаздымкаў Д. Геаргіеўскага [425, с. 36–38]. Музей выстаўляў свае экспанаты на І Усеагульнай краёвай выстаўцы ў Познані (1929 г.), выстаўцы народнага мастацтва ў Варшаве (1930 г.), этнаграфічнай выстаўцы ў Кракаве (1931 г.). Да 1939 г. у фондах музея было 7,2 тыс. адзінак, а ў сярэдзіне 1941 г. – больш 11 тыс. адзінак аб прыродзе, побыце, гісторыі і культуры Заходняга Палесся [102, с. 133]. Р. Гарашкевіч рэдагаваў краязнаўчы альманах “Ziemia Pińska” (“Пінская зямля”). Яму належыць аўтарства кніг і брашур “Пінск і яго ваколіцы” (1926 г.), “Традыцыі Пінскай зямлі” (1928 г.), “Гістарычныя нататкі аб некаторых мясцовасцях Пінскага павета” (1928 г.), “Столінскі павет (гістарычныя нататкі)” (1930 г.) [86, с. 159–160]. У яго работах “Засцянковая шляхта на ўсходніх землях” (1936 г.) і “Спіс родаў засцянковай шляхты Пінскай зямлі” (1937 г.) прааналізавана гісторыя мясцовых шляхецкіх родаў, відазмяненне іх прозвішчаў, геральдыка, лёс некаторых населеных пунктаў.

Аддзел ПКТ у Брэсце, які быў створаны ў лістападзе 1924 г. (кіраўнік управы – інжынер Ф. Ксенжапольскі) наладжваў навукова-папулярныя лекцыі, займаўся апекай над помнікамі гісторыі і культуры. На працягу 1925 г. лекцыямі было ахоплена больш 800 чалавек, каля 440 чалавек удзельнічала ў 9 краязнаўчых экскурсіях у Брэсцкую крэпасць, Белавежскую пушчу, Пінск, Сяхновічы, Высока-Літоўск, Вільню [1093, с. 9]. Сярод лектараў былі краязнавец Р. Гарашкевіч з Пінска, археолаг Р. Якімовіч з Варшавы і іншыя вучоныя, грамадскія дзеячы. Планавалася стварыць бібліятэку, архіў і краязнаўчы музей [1093, с. 5–7]. Аддзел ПКТ у Брэсце, які ў пачатку 1926 г. налічваў звыш 100 чалавек [1093, с. 10–14], супрацоўнічаў як з цэнтральнымі органамі ПКТ, так і з іншымі грамадскімі арганізацыямі, якія займаліся пытаннямі краязнаўства і турызму. Сумесна з актывістамі ПГТ дзеячы аддзела ПКТ у Брэсце выступалі з прапановамі аб ахове помнікаў гісторыі і культуры, ушанаванні асобных персаналій. У культурна-асветніцкай працы актыўна выкарыстоўвалася манаграфія “Ілюстраванае Палессе” А. Нелярда (1923 г.) [1076], у якой былі сабраны народныя песні, вершы, загадкі. У 1926 г. пры падтрымцы аддзела ПКТ у Брэсце быў выдадзены “Rocznik Poleski” (“Палескі штогоднік”), дзе змяшчаліся статыстычныя матэрыялы, артыкулы па краязнаўстве. На старонках часопіса “Kresy ilustrowane” (“Ілюстраваныя крэсы”), які выдаваўся пры матэрыяльнай падтрымцы міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы і гарадскога магістрата Брэста, спачатку змяшчаліся краязнаўчыя рубрыкі, потым выданне было поўнасцю прысвечана краязнаўчай тэматыцы. Рэдактарам і выдаўцом часопіса быў В. Мандальскі, якому належыць таксама аўтарства шэрагу прац па краязнаўстве – “Сярод руін даўніны на Палессі” (1926 г.), “Ружаны, Камянец-Літоўскі” (1926 г.), “У справе нескладаных рэгіянальных навуковых даследаванняў (з асобным разглядам Палескага ваяводства)” (1927 г.), “Палессе: нарыс, паведамленні” (1927 г.), дзе адлюстраваны розныя аспекты народнага дойлідства, традыцыйнай культуры, геаграфічна-гістарычны нарыс Брэста (1929 г.) і іншыя. У 1930 г. ім была выдадзена “Бібліяграфія Палескага ваяводства”. У даведніку М. Марчака пра Палессе (1935 г.) [1026] утрымліваліся звесткі пра матэрыяльныя каштоўнасці рэгіёна.

У жніўні-верасні 1931 г. у рамках падрыхтоўкі “Геаграфічнага слоўніка Польскай дзяржавы” у шэрагу паветаў Палескага ваяводства асобныя дзеячы збіралі этнаграфічны матэрыял: М. Разанаў – у Пружанскім і іншых паветах, М. Аляхновіч – у Косаўскім павеце, Б. Аляхноўскі – у Брэсцкім і Столінскім паветах. Мясцовыя польскія ўлады пільна сачылі за даследчыкамі [117, арк. 10].

Касцяк збораў заснаванага ў 1933 г. рэгіянальнага музея ў Брэсце складала калекцыя ўпраўлення Палескай школьнай акругі, а таксама калекцыя Палескага таварыства дапамогі народным промыслам, якая фармальна знаходзілася на дэпазіце этнаграфічнага музея Віленскага універсітэта імя С. Баторыя. У 1936 г. у музеі налічвалася 210 экспанатаў [426, с. 338]. Аддзелы ПКТ на тэрыторыі Палескага ваяводства (у Пінску, Кобрыне, Косаве, Івацэвічах, Давыд-Гарадку) якія займаліся апісаннем мясцовых помнікаў гісторыі і культуры, наладжвалі экскурсіі, выступалі з ініцыятывамі аб ушанаванні памяці славутых землякоў [677, с. 73–79]. Асобнае таварыства ў Косаве, створанае ў 1930 г. для пабудовы народнага дома-музея імя Т. Касцюшкі, пасля бюракратычнай валакіты атрымала дазвол на ўтрыманне перасоўнага тэатра.

Вялікая цікаўнасць з боку грамадскасці Гродна да выстаўкі каштоўнасцей, наладжанай Ю. Ядкоўскім, Л. Вільконскім у верасні 1921 г., паспрыяла стварэнню ў Гродна гістарычнага музея [102, с. 120]. Адкрыты 9 снежня 1922 г. гістарычны музей, захавальнікам якога стаў Ю. Ядкоўскі, размяшчаўся спачатку ў будынку старавства [2], а ў 1924 г. музею быў перададзены Стары замак, які пачаў выкарыстоўвацца толькі ў 1931 г. пасля рэстаўрацыі. Нягледзячы на арганізацыйна-тэхнічныя перашкоды, невысокую зацікаўленасць мастацкай творчасцю з боку мясцовага польскага грамадства, гістарычны музей у Гродна наладзіў некалькі выставак, дзе выстаўляліся творы польскіх мастакоў Я. Казімероўскага, Я. Мальчэўскага, М. Сланецкага, К. Заморскага, З. Буйноўскага, З. Станкевіч, У. Гофмана і іншых. Да 1939 г. у фондах гістарычнага музея ў Гродна захоўвалася больш 16 тыс. адзінак – археалагічных знаходак, абразоў, старадрукаў, нумізматычных рэліквій, слуцкіх паясоў і інш. [102, с. 125; 675]. Археолаг Ю. Ядкоўскі даследаваў Стары замак і Новы каралеўскі замак у Гродна, гарадзішча ў Ваўкавыску [717]. Яму належыць аўтарства цэлага шэрагу навуковых прац па старажытнай гісторыі і культуры Гродзеншчыны – “Гродна”(1923 г.), “Дамініканская гімназія ў Гродна” (1924 г.), “Гродзенскія цэхі ў старажытнасці” (1926 г.), “Гродна і наваколле ў аглядзе гісторыі Нёманскай Літвы і Русі” (1928 г.), “Гродзенскія вуліцы ў святле гісторыі і тапалогіі” (1931 г.), “Назвы плошчаў і вуліц Гродна раней і цяпер” (1932 г.), турыстычны даведнік “Гродна і наваколле” (1934 г.), “Умацаваная царква на Каложы ў Гродна ў святле архіўных і археалагічных даследаванняў 1935 г.” (1936 г.) і іншыя. З-за канфлікту з археолагам, галоўным рэстаўратарам Варшаўскай акругі (да яе належала Беластоцкае ваяводства) Р. Якімовічам, які забараніў яму працягваць археалагічныя раскопкі ў Ваўкавыску як ненавуковыя і разбуральныя [534, с. 89] і выказаў негатыўную рэакцыю праведзенымі ў 1935 г. раскопкамі

Каложскай царквы ў Гродна, Ю. Ядкоўскі ў 1936 г. пакінуў Гродна і пераехаў у Варшаву.

У 1924 г. І. Стаброўскі наладзіў у Слоніме выстаўку кніг і старажытных пісьмовых крыніц. У верасні 1929 г. на аснове яго прыватных калекцый археалогіі, нумізматыкі, дакументаў і старадрукаў у горадзе пачаў дзейнічаць краязнаўчы музей. Сярод каштоўных артэфактаў у музеі захоўвалася галава старажытнага каменнага ідала, знойдзеная ў 1934 г. у час будаўніцтва жылога дома ў Слоніме [711, с. 47–48], старадрукі XVI–XVIII стст., нумізматычныя калекцыі, вялікі збор аўтографаў князёў і магнатаў ВКЛ, каралёў Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стст., булы папы Рыгора XV 1621 г., ліст А. Пушкіна, аўтографы і лісты Г. Дзяржавіна, генерала Б. дэ Толі, аўтографы Р. Пацёмкіна, Р. Арлова, А. Аракчэева, Л. Талстога, лістоўкі часоў паўстання 1863 г. і г. д. [324; 710; 549, с. 694–695; 615]. У 1930-я гг. фонды музея папаўняліся за кошт ахвяраванняў прыватных асобаў [325].

Намаганнямі павятовага рэгіянальнага камітэта ў Баранавічах у 1929 г. была наладжана гісторыка-краяўнаўчая выстаўка. Па ініцыятыве аднаго з яе арганізатараў – настаўніка Л. Турскага – восенню таго ж года там з’явіўся краязнаўчы музей. Паводле праекта заснавальніка, музей павінен быў дэманстраваць сувязь Баранавіцкага павета з гісторыяй Польшчы [102, с. 134]. З 3-х аддзелаў найбольш каштоўным быў гістарычны, дзе захоўваліся нумізматычныя адзінкі, посуд, калекцыя зброі і г. д.

Створаны ў 1929 г. аддзел ПКТ у Ваўкавыску пад кіраўніцтвам Ч. Будыны-Давідоўскага актыўна займаўся вывучэннем помнікаў гісторыі, культуры на тэрыторыі Ваўкавыскага павета. Адна з першых выставак была наладжана ў горадзе ў снежні 1933 г. Па ініцыятыве мясцовага аддзела ПКТ ў Ваўкавыску ў сакавіку 1935 г. быў заснаваны краязнаўчы музей. Яго адкрыццём непасрэдна займаўся Г. Пех, які праводзіў археалагічныя даследаванні шэрагу гарадзішчаў, займаўся зборам этнаграфічнага матэрыялу, нумізматыкай [543, с. 455; 70].

Адзел ПКТ у Браславе надрукаваў серыю паштовак з фотаздымкамі мясцовага фатографа А. Бейнаровіча. Актыўна займаўся гісторыяй Падзвіння О. Гедэман [1036; 901; 547, с. 550–552]. Салідную крыніцавую базу мела яго гісторыка-краязнаўчая праца па гісторыі Браслаўскага павета [899] і іншыя даследаванні.

Прадстаўнікі аддзелаў ПКТ прыцягваліся да розных ідэалагічных кампаній [329]. У прыватнасці, яны ўключаліся ў паланізацыю тапанімікі заходнебеларускіх зямель. У лютым 1938 г. пры падтрымцы павятовай адміністрацыі Гродна была створана асобная камісія па перайменаванню населеных пунктаў Беластоцкага ваяводства, асноўнай задачай якой дэклараваўся аналіз усіх назваў населеных пунктаў на “падставе

рукапісных і друкаваных крыніц, навуковых прац" [299, арк. 18]. У Берштаўскай гміне прапаноўвалася перайменаваць: Арлова гара – у Гара Орля, Зуброўка – у Жубруўка, Забінка – у Жабінка, Возера – у Падазер'е і г. д. [299, арк. 10–13].

Нягледзячы на ажыўлены характар краязнаўчага руху, ПКТ з'яўлялася нешматлікай арганізацыяй. У 1936 г. у заходнебеларускіх землях у мясцовыя аддзелы ПКТ уваходзіла 468 чалавек, з іх найбольш шматлікай была арганізацыя ў Навагрудку (208), у іншых месцах (Гродна, Ваўкавыску, Баранавічах, Лідзе, Слоніме, Брэсце, Пінску, Браславе) колькасць членаў вагалася ад 15 да 41 [102, с. 130]. Іх намаганнямі да канца 1930-х гг. было сфарміравана 9 краязнаўчых музеяў і калекцый. Акрамя адзначаных музеяў, музейныя экспазіцыі існавалі ў Лідзе, Дзісне, іх камплектаваннем займаліся аддзелы ПКТ у Глыбокім і Браславе [102, с. 137, 141].

Акрамя ваяводскіх і павятовых аддзелаў ПКТ, у многіх польскіх пачатковых і сярэдніх школах, у Віленскім універсітэце імя С. Баторыя дзейнічалі гурткі краязнаўчага профілю, якія у ходзе сваёй навукова-асветніцкай, краязнаўчай, экскурсійна-турыстычнай дзейнасці разглядалі помнікі гісторыі і культуры заходнебеларускіх зямель у якасці неадрыўнай часткі польскай спадчыны [239; 920; 678; 609, с. 61].

Збіральніцкай і даследчыцкай працай займаліся таварыствы дапамогі народным промыслам: у Вільні (узнікла ў 1924 г.), Брэсце (1925 г.), Навагрудку (1927 г.). Ваяводскія ўлады (у прыватнасці палескія ваяводы К. Младзяноўскі, Я. Крагельскі, навагрудскі ваявода З. Бечковіч) выступалі ў якасці ініцыятараў адкрыцця таварystваў, прымалі актыўны ўдзел у іх кіраўніцтве. Для каардынацыі дзейнасці таварystваў у 1930 г. у Вільні, Навагрудку, Брэсце і Беластоку была створана агульная рада. Актывісты таварства ў Брэсце добра разумелі, што развіццё народных промыслаў у заходнепалескім рэгіёне мае як гаспадарчае, так і культурнае значэнне. Паводле статута 1928 г., мэтай Палескага таварства было захаванне, развіццё і арганізацыя існуючых на тэрыторыі Палескага ваяводства народнага, хатняга промыслу, стварэнне яго новых напрамкаў, клопат аб захаванні этнічных рыс народных промыслаў [159, арк. 1, 5]. У 1928–1933 гг. было наладжана актыўнае даследаванне народнага мастацтва Палесся, збор калекцыі прадметаў народнага мастацтва (тканін, адзення, керамікі і інш.) [426, с. 203–204].

Паблематыка рэгіянальнай гісторыі разглядалася як на старонках цэнтральнага часопіса "Ziemia" ("Зямля"), так і мясцовых краязнаўчых выданняў. Так, на працягу 1936–1939 гг. пад рэдакцыяй У. Абрамовіча выдаваўся штомесячны часопіс "Ziemia Lidzka" ("Лідская зямля"), дзе было змешчана шмат матэрыялаў па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі,

краязнаўстве Лідскага краю. Сярод іх – артыкулы пра грамадскіх і культурных дзеячаў (лідскага старасту Ю. Ільініча, вучоных С. Юндзіла, М. Чарноцкага), успаміны М. Нарбута, публікацыя А. Хоміча “Навагрудская вёска і яе багацце”, запісы вясельных песняў М. Шумялевіча, жніўных песняў У. Урбановіча, вынікі археалагічных даследаванняў У. Галубовіча “Гарадзішчы і курганы Лідскай зямлі” і іншыя. На старонках газеты “Tygodnik Wołkowyski” (“Ваўкавыскі штотыднёвік”), якая з перапынкамі выдавалася ў 1927–1935 гг., змяшчаліся матэрыялы Ю. Ядкоўскага, М. Кэмпна і іншых аўтараў па гісторыі, краязнаўстве, дэмаграфіі Ваўкавыскага павета. Польскія ўлады планавалі з 1937 г. стварыць у Навагрудскім ваяводстве сетку структурных адзінак выдавецкага таварыства, якое павінна было займацца друкаваннем краязнаўчай літаратуры “ў дзяржаўным і нацыянальным духу” [199, арк. 44].

Польскія ўлады вымушаны былі рабіць адпаведныя захады ў справе аховы помнікаў дзеля выкарыстання іх у справе паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва. Заканадаўчую базу гэтага напрамку дзейнасці польскай адміністрацыі складалі законы “Аб ахове мастацтва і помнікаў старажытнасці” (1928 г.), “Аб апецы над грамадскімі зборамі” (1933 г.). Пры міністэрстве веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы дзейнічаў дэпартамент мастацтва з аддзелам помнікаў і музеяў. Пасля структурных пераўтварэнняў у 1930-я гг. тэрыторыя Віленскага, Навагрудскага ваяводстваў увайшла ў склад Віленскай рэстаўрацыйнай акругі, Палескага ваяводства – Люблінскай акругі. Адзін з кіраўнікоў Віленскай акругі Е. Рэмер займаўся сур’ёзным даследаваннем помнікаў гісторыі і культуры, вынікам якога стала манаграфічнае выданне [1091]. Фотамастак Я. Булгак прымаў актыўны ўдзел у фотафіксацыі кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў Вільні і Віленшчыны [424, с. 151]. Як сведчаць справаздачы ваяводскіх аддзелаў мастацтва, была праведзена шырокамаштабная фотафіксацыя гістарычных аб’ектаў (20 тыс. адзінак), падрыхтавана 4,5 тыс. планаў, схем размяшчэння помнікаў, абмерана 1 856 архітэктурных аб’ектаў. Толькі ў Палескім ваяводстве пад ахову Польскай дзяржавы было ўключана 148 помнікаў (культавых пабудоў, палацаў, сядзіб, рэшткаў замкаў і г. д.). У заходнебеларускіх паветах мясцовыя ўлады не толькі ажыццяўлялі комплекс мерапрыемстваў па ўліку, ахове і даследаванню помнікаў гісторыі і культуры, але і па іх выкарыстанню ў ідэалагічнай працы [144; 335; 363; 365; 319, арк. 2].

У цэлым, на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. адсутнічалі ўмовы для правядзення фундаментальных даследаванняў у галіне гісторыі і культуры беларускага народа. Аб’яднаныя ў БНТ і асобныя грамадскія таварыствы, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, студэнцкая моладзь

займаліся пераважна навукова-асветніцкай працай, захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны. Даследаванні заходнебеларускіх аўтараў мелі канцэптуальныя разыходжанні з працамі беларускай савецкай гістарычнай навукі, асабліва ў 1930-я гг. Негатыўныя наступствы нацыянальнай палітыкі польскіх уладаў адносна беларусаў, абсалютызацыя нацыянальных аспектаў у гістарычных даследаваннях польскіх, літоўскіх, украінскіх аўтараў, а таксама перавага нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычнай арыентацыі ў асяроддзі заходнебеларускіх даследчыкаў прадвызначылі пэўную ідэалізацыю, рамантызацыю падзей айчыннай гісторыі ў працах беларускіх аўтараў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У даследаваннях польскіх вучоных беларуская гісторыка-культурная спадчына асобна не вылучалася і не інтэрпрэтавалася, нярэдка падавалася ў якасці польскай. Польскія навуковыя таварыствы, якія імкнуліся разгарнуць у заходнебеларускіх землях гістарычныя, краязнаўчыя і іншыя даследаванні, не выходзілі ў сваёй дзейнасці за межы ідэй рэгіяналізацыі, прыцягваліся да пашырэння польскай культуры і гістарычнай свядомасці, аднак не набылі масавага характару ў Заходняй Беларусі.

## 2.3 Нацыянальна-культурная праблематыка ў канфесійным жыцці беларускага насельніцтва

Паводле канфесійнага падзелу большасць беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі складалі праваслаўныя. Заходнебеларускія землі ахоплівалі Віленская, Гродзенская і Палеская епархіі, дзе было каля 500 прыходскіх цэркваў, 5 мужчынскіх і жаночых манастыроў, дзейнічала праваслаўная семінарыя ў Вільні, выдавалася рэлігійная літаратура на рускай, беларускай, украінскай і польскай мовах. Геаграфічнае размяшчэнне праваслаўнага насельніцтва было нераўнамерным. Найбольшая прысутнасць праваслаўных назіралася ў Палескім ваяводстве (77,6% жыхароў (1931 г.)) [113 арк. 1]. Хоць доля праваслаўных у Навагрудскім, Віленскім і Беластоцкім ваяводствах была меншай, аднак даволі адчувальнай.

Польскі ўрад усяляк спрыяў таму, каб праваслаўная царква вызвалілася ад падпарадкавання маскоўскаму патрыярхату. 14 чэрвеня 1922 г. на саборы епіскапаў у Варшаве было прынята рашэнне аб аўтакефаліі праваслаўнай царквы ў Польшчы. “Часовыя правілы” 1922 г. рэгулявалі ўзаемаадносіны праваслаўнай царквы з дзяржаўнымі органамі Польшчы амаль да канца міжваеннага часу. Да сярэдзіны 1924 г. усе праціўнікі аўтакефаліі з ліку праваслаўнай іерархіі былі пазбаўлены пасад ці апынуліся за мяжой. 13 лістапада 1924 г. канстанцінопальскі патрыярх абвясціў аўтакефалію праваслаўнай царквы ў Польшчы. Афіцыйныя ўрачыстасці з гэтай нагоды адбыліся ў Варшаве 17 верасня 1925 г.

У новых абставінах памеры дзяржаўных датацый для праваслаўнай царквы, адносіны да яе адміністрацыйнага апарату былі пастаўлены ў прамую залежнасць ад адабрэння афіцыйнага курса польскіх уладаў. У1925 г. з 1 млн. злотых, запланаваных для праваслаўнай царквы, 70% прызначалася для ўтрымання духавенства [83]. Аднак выдзеленыя сродкі не задавальнялі патрэбы праваслаўнай царквы. У канцы лютага 1925 г. мітрапаліт Дыянісій звяртаўся з лістом да міністра веравызнанняў і грамадскай асветы аб павелічэнні запланаваных бюджэтных выдаткаў да 2 млн. 428,5 тыс. злотых (паводле прыблізных суадносін колькасці вернікаў) (на патрэбы рымска-каталіцкага веравызнання было запланавана больш 14,5 млн. злотых) [568]. Аднак у 1925 г. выдаткі міністэрства на праваслаўную царкву склалі 762 тыс. злотых, а ў наступным годзе зменшыліся да 642,5 тыс. злотых [1022, с. 248]. Толькі з канца 1920-х гг. фінансавая падтрымка з боку Польскай дзяржавы ўзрасла. Аднак дзяржаўная падтрымка не магла істотна палепшыць матэрыяльнае становішча духавенства. У 1926 г. у Палескім ваяводстве 35% праваслаўных святароў жыло ў нястачы, 59% – вельмі сціпла і толькі 6% у адносным дастатку [115, арк. 20].

Ва ўмовах мэтанакіраванай дзяржаўнай падтрымкі выключна рымска-каталіцкага касцёла праваслаўнай царкве было складана вытрымліваць канкурэнцыю з ім. Рэвіндыкацыя маёмасці праваслаўнай царквы не толькі падарвала яе эканамічныя пазіцыі [1032, с. 102; 357, с. 16], але і нанесла адчувальны ўрон праваслаўнай матэрыяльнай спадчыне. Да сярэдзіны 1920-х гг., калі ажыццяўляўся першы этап рэвіндыкацыі, актыўна выкарыстоўваліся стыхійныя і гвалтоўныя метады. Паводле некаторых звестак, толькі ў Палескім ваяводстве да канца 1920-х гг. да рымска-каталіцкага касцёла перайшло 19 праваслаўных храмаў, 5 было знішчана [114, арк. 14]. Паводле іншых звестак, Палеская епархія страціла 14 цэркваў і 2 капліцы [409, с. 81]. Да лета 1929 г. у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне было пераўтворана ў касцёлы больш 1 300 праваслаўных храмаў [45, арк. 94]. Другі перыяд рэвіндыкацыі, які разгортваўся ў канцы 1920-х – першай палове 1930-х гг., суправаджаўся масіраванай хваляй судовых разбіральніцтваў. Усяго ў польскія судовыя ўстановы было пададзена 755 іскавых заяў [1067, с. 344]. У Палескай епархіі такіх іскаў налічвалася 248 [274, арк. 9–10]. Усяго ў межах Польскай дзяржавы на працягу 1918–1930 гг. падвергліся рэвіндыкацыі 278 праваслаўных манастыроў, цэркваў, капліц, з іх у Віленскім ваяводстве – 40, Беластоцкім – 32, Навагрудскім – 28, Палескім – 19 [1063, с. 337]. Польскія ўлады імкнуліся не афішаваць сваёй падтрымкі рымска-каталіцкай царквы, займаючы быццам нейтральную пазіцыю. У ходзе рэвіндыкацыі ў адабраных праваслаўных храмах ламаліся іканастасы, знішчаліся творы

скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Назіраліся акты вандалізму адносна праваслаўных могілак.

Нягледзячы на тое, што заходнебеларускія партыі і арганізацыі надавалі мала ўвагі рэлігійным пытанням у параўнанні з грамадска-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі праблемамі, складаным быў характар царкоўна-дзяржаўных адносін, аднак пад уплывам палітычных працэсаў, ва ўмовах актывізацыі нацыянальнага фактару адбывалася станаўленне ў заходнебеларускім рэгіёне неаднароднага па сваіх праграмных установках беларускага грамадска-царкоўнага праваслаўнага руху. Першапачаткова яго арганізацыйныя структуры выступалі за спалучэнне рэлігійных і нацыянальных каштоўнасцей. Гэта стала магчымым пасля таго, як 16 чэрвеня 1922 г. сабор епіскапаў выказаўся станоўча адносна правядзення на Валыні пропаведзяў на ўкраінскай мове, а 14 снежня 1922 г. св. Сінод у Варшаве зацвердзіў рашэнне мітрапаліта аб выкарыстанні розных моў у богаслужэннях пры жаданні вернікаў і пасля зацвярджэння адпаведных тэкстаў царкоўнымі ўладамі. У рэлігійна-адукацыйнай дзейнасці беларуская мова дапускалася ў пэўных мясцовасцях пры выкарыстанні яе ў паўсядзённых зносінах беларускім насельніцтвам [276, арк. 18]. Дадзенае рашэнне насіла кампрамісны характар паміж праваслаўнай іерархіяй і польскімі ўладамі. Нягледзячы на фармальнае прызнанне моўных інтарэсаў беларусаў, на практыцы праваслаўнае духавенства працягвала актыўна выкарыстоўваць рускую мову. Магчымая беларусізацыя праваслаўнага грамадска-царкоўнага жыцця разглядалася польскімі ўладамі ў якасці сродка дэрусіфікацыі праваслаўнай царквы. На адной з нарад у міністэрстве веравызнанняў і грамадскай асветы ў верасні 1923 г. было прадэкларавана імкненне Польскай дзяржавы спыніць русіфікатарскую тэндэнцыю праваслаўнай царквы, праводзіць яе паланізацыю [888, с. 124]. За яе дэрусіфікацыю выступалі і апаненты тагачасных польскіх кіруючых колаў. Так, адзін з лідэраў лагеру пілсудчыкаў Т. Галуўка восенню 1924 г. заклікаў пераўтварыць праваслаўную царкву ў дзяржаўную, “прыпыніць яе фактычную залежнасць ад Расіі”. “Праваслаўную царкву ў Польшчы мы зробім польскай дзяржаўнай, калі паслядоўна правядзём на Валыні яе ўкраінізацыю, а ў Беларусі – зробім яе беларускай. Зрабіць гэта мы зможам толькі такім шляхам, адкрыўшы вялікую колькасць праваслаўных духоўных семінарый, якія будуць не толькі па мове, але і па духу ўкраінскімі і беларускімі. Гэтае маладое шматлікае духавенства, выхаванае ў іншых умовах у семінарыях з высокім навуковым узроўнем, якое пазнаёміцца з польскай мовай, польскай літаратурай і культурай, будзе складаць усё больш значную супрацьвагу старому духавенству” [1175].

У справе абароны правоў праваслаўнага насельніцтва ў 1920-я гг. актыўна выкарыстоўваліся магчымасці беларускага парламенцкага прадстаўніцтва. Неаднаразова ўздымаў у сваіх прамовах рэлігійныя пытанні сенатар В. Багдановіч. Напрыклад, 23 ліпеня 1924 г. пры абмеркаванні бюджэту міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ён выступіў супраць ушчамлення інтарэсаў праваслаўных, якім выдзяляліся сродкі адносна католікаў у прапорцыі 1/67, што было несуразмерна рэальным суадносінам колькасці вернікаў гэтых дзвюх канфесій. Ім выказваліся прапановы аб скліканні ўсеагульнага царкоўнага сабора, спыненні рэвіндыкацыі і ліквідацыі праваслаўных прыходаў, наданні польскага грамадзянства праваслаўнаму духавенству, падтрымцы праваслаўных семінарый у Вільні і Крамянцы, адкрыцці праваслаўнага тэалагічнага факультэта [404, с. 48, 50]. В. Багдановіч і надалей неаднаразова выступаў на парламенцкім узроўні ў абарону як беларусаў-праваслаўных, так і католікаў. Ажыўленне грамадскасці прымусіла царкоўныя ўлады зрабіць некаторыя ўступкі. Св. Сінод у Варшаве ў верасні 1924 г. дазволіў выкарыстанне беларускай, украінскай і іншых моў у час богаслужэнняў, малітваў, пры вывучэнні Закона Божага ў школах [19, с. 6].

Дэпутаты Беларускага пасольскага клуба былі ініцыятарамі выдання ў лютым-снежні 1925 г. у Варшаве беларускамоўнага грамадска-царкоўнага часопіса “Праваслаўны беларус”, рэдактарам якога з’яўляўся Я. Пачопка, а мастацкае афармленне ажыццяўляў Я. Драздовіч. Галоўнае значэнне на старонках выдання надавалася адраджэнню і ўмацаванню духоўнасці, там змяшчаліся матэрыялы па гісторыі, грамадска-палітычнаму, культурнаму і рэлігійнаму жыццю Заходняй Беларусі. Радыкальныя пазіцыі часопіса з’явіліся падставай для яго закрыцця польскімі ўладамі.

Навучэнцкая моладзь непасрэдна ці ўскосна таксама ўцягвалася ў грамадска-царкоўны рух. На створаным у 1924 г. факультэце праваслаўнай тэалогіі Варшаўскага універсітэта ў канцы мая 1925 г. пачаў дзейнічаць гурток праваслаўных багасловаў-студэнтаў [417], які ўзначальваў спачатку К. Літвіновіч, потым М. Лапіцкі. Гурток планаваў займацца дабрачыннай, культурна-асветніцкай працай [1131]. Пазней гурткоўцы, выхадцы з заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх зямель, дабіліся выдання студэнцкага часопіса “Путь правды” не толькі на рускай, але і беларускай, украінскай, польскай мовах. На наш погляд, публічнае дэкляраванне пэўнай часткай студэнтаў згаданага факультэта сваёй беларускай этнічнай прыналежнасці [421, с. 206], адбывалася пад уплывам Віленскай праваслаўнай семінарыі і грамадска-царкоўнага руху.

Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб’яднанне (ПБДА), якое ўзнікла ў Вільні ў красавіку 1927 г., выступала ў абарону рэлігійных,

нацыянальна-культурных, грамадска-палітычных і іншых інтарэсаў беларускага насельніцтва. Сярод яго кіраўнікоў былі сенатары В. Багдановіч і А. Назарэўскі, а таксама А. Коўш, протаіерэй Л. Голад і іншыя. Аб’яднанне выступала за ўвядзенне беларускай мовы ў пропаведзях, пры вывучэнні Закону Божага, дамагалася ўладкавання царквы на прынцыпах саборнасці, прыцягнення да канфесійнага жыцця свецкай грамадскасці. ПБДА не прызнавала аўтакефалію праваслаўнай царквы ў Польшчы, выступала за захаванне яе кананічнай залежнасці ад Рускай праваслаўнай царквы [573, с. 6]. Хоць за царквой прызнавалася адно з галоўных месцаў у жыцці грамадства, аднак хрысціянскія каштоўнасці разглядаліся ў цеснай сувязі з нацыянальна-культурнымі, грамадскім праблемам надавалася больш увагі, чым царкоўным пытанням. Аб’яднанне знаходзілася ў апазіцыі як да польскіх дзяржаўных улад, так і праваслаўных іерархаў. Актыў ПБДА прымаў удзел у складзе Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта ў выбарах у польскі сейм і сенат у сакавіку 1928 г. Друкаваным органам БПДА з’яўляўся часопіс “Праваслаўная Беларусь”, які выдаваўся на беларускай мове ў Вільні ў кастрычніку 1927–1928 гг. На старонках выдання змяшчаліся дакументы, якія асвятлялі пазіцыю заходнебеларускіх партый і арганізацый у час парламенцкай выбарчай кампаніі [567]. Ідэйным лідэрам БПДА з’яўляўся сенатар В. Багдановіч, лідэр “старацаркоўнікаў”, намаганнямі якога быў аб’яднаны шэраг праваслаўных груп беларускай і рускай супольнасцей, створана сумесная царкоўная камісія з прадстаўнікоў Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК) і віленскага аддзела Рускага народнага аб’яднання [462]. У 1930 г. ПБДА злучылася з Беларускім хрысціянска-дэмакратычным аб’яднаннем.

Адметнасць моўнай сітуацыі ў праваслаўнай царкве заключалася ў тым, што руская мова і паводле традыцыі, і з-за перавагі рускіх у складзе духавенства, выхаваных яшчэ ў дарэвалюцыйнай Расійскай імперыі, працягвала выкарыстоўвацца як у паўсядзённых узаемаадносінах праваслаўных, так і ў царкоўным жыцці. У сувязі з адсутнасцю поўнага беларускамоўнага перакладу Бібліі беларускія праваслаўныя аб’яднанні дапускалі захаванне царкоўнаславянскай у якасці літургічнай мовы, аднак выступалі за пашырэнне выкарыстання беларускай мовы ў пропаведзях, царкоўным справаводстве. В. Багдановіч не супрацьпастаўляў рускую і беларускую мовы. Прызнаючы права беларусаў і ўкраінцаў мець уласныя нацыянальныя літаратурныя мовы, папярэджваў іх аб недапушчальнасці адмаўлення ад царкоўнаславянскай мовы, высока ацэньваючы яе значэнне і ролю ў лёсе ўсходнеславянскай культурнай спадчыны. Патрабаванні пераводу богаслужэння на рускую, украінскую, беларускую і іншыя “жывыя” славянскія мовы В. Багдановіч тлумачыў палітычнымі, а не

царкоўнымі матывамі (адгароджванне ад “рускіх”), ацэньваў іх як “антыкультурнае зло”. “…Нашы ўкраінцы і нават беларусы (радзей), якія палітыканствуюць, змагаюцца супраць царкоўнаславянскай мовы, ды яшчэ як “русіфікатарскага сродку”, забываючы, што яна лягла ў аснову іх уласнай культуры, як і вялікарускай” [430, с. 45]. Паказваючы на канкрэтных гістарычных прыкладах культурныя запазычванні славянскіх народаў, В. Багдановіч раіў палякам праваслаўнага веравызнання дзеля “чыста культурнай карысці” не ўводзіць богаслужэнні на польскай мове, а захаваць царкоўнаславянскую мову, “на якой чулі першую евангельскую благую вестку іх продкі” [429, с. 192]. На думку В. Багдановіча, крытэрыем ісціннай культурнасці маглі быць паважлівыя адносіны да царкоўнаславянскай мовы. У падтрымку захавання царкоўнаславянскай мовы “як аднаго са сродкаў культурнага развіцця беларускай мовы” выступаў протаіерэй Л. Голад [96, с. 8] і іншыя актывісты грамадска-царкоўнага руху. Неабходна адзначыць, што асобныя абаронцы царкоўнаславянскай мовы ў 1930-я гг. хоць і дапускалі магчымасць яе рэфармавання, але заклікалі прапагандаваць “правільны погляд на богаслужэнне і яго мову”, якая ўсё-такі не з’яўлялася нацыянальна чужой для праваслаўных людзей [571, с. 67].

У ПБДА склаліся напружаныя адносіны з групай А. Каўша, якая ў верасні 1928 г. – красавіку 1929 г. наладзіла ў Вільні выданне беларускамоўнага царкоўна-грамадскага часопіса “Беларуская зарніца”. Новае выданне дэкларавала пераадоленне адчужэння праваслаўнай царквы ад грамадскіх, нацыянальна-культурных інтарэсаў. Праваслаўная праблематыка на старонках часопіса падавалася як ў рэлігійным, так і грамадскім, гістарычным кантэксце. У шэрагу публікацый аналізаваўся стан хрысціянскай царквы, міжканфесійныя і царкоўна-дзяржаўныя адносіны, рэлігійнае выхаванне моладзі, гісторыя праваслаўнай канфесіі ў Беларусі, помнікі рэлігіі і культуры. На старонках выдання акцэнтавалася ўвага на фарміраванне ў праваслаўных беларусаў нацыянальнай свядомасці, на гарманічнае і перспектыўна-выніковае ўзаемадзеянне рэлігійнага і нацыянальнага фактараў [442].

У снежні 1929 г. група А. Каўша прадставіла спачатку ліст у Віленскае ваяводскае ўпраўленне, а потым у міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы асобны мемарандум аб задавальненні рэлігійных і грамадска-культурных інтарэсаў мясцовага беларускага насельніцтва: У прыватнасці, яны дамагаліся паляпшэння ўмоў для задавальнення рэлігійных патрэбаў вучняў беларускай гімназіі ў Пятніцкай царкве ў Вільні, перадачы беларускай грамадскасці Мікалаеўскай царквы і інш. [755, арк. 4]. Аднак польскія ўлады не задаволілі хадайніцтва гэтай нешматлікай беларускай праваслаўнай групы.

Хоць перыяд да сярэдзіны 1930-х гг. характарызаваўся пануючай пазіцыяй рускай мовы ў праваслаўным грамадска-царкоўным жыцці, аднак духавенства ў многіх мясцовасцях выкарыстоўвала беларускую мову ў якасці дапаможнай пры навучанні дзяцей. Паводле распараджэння міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ад 18 лютага 1927 г., рэлігію ў пачатковых школах можна было выкладаць на роднай мове вучняў па жаданню іх бацькоў [273, арк. 43]. Аналіз стану вывучэння Закону Божага ў Віленскай епархіі ў 1928 г. паказвае, што з 668 анкетаваных школ (33 826 дзяцей) у большасці гэта адбывалася па-беларуску. Толькі ў 38 школах выкладалі на рускай мове, у 30 па розных прычынах Закон Божы наогул не выкладалі [631].

Разгорнутая прапагандысцкая кампанія адносна склікання царкоўнага сабору ў 1930 г. надала імпульс для грамадска-царкоўнага руху. 12 лютага 1930 г. паланафільскае таварыства "Прасвета" звярнулася да мітрапаліта Дыянісія з мемарандумам, у якім патрабавала "этнічнай чысткі" – выдалення са складу праваслаўнай кансісторыі ў Вільні "расійскага элементу" і замены яго беларусамі, беларусізацыі Віленскай праваслаўнай семінарыі, увядзення беларускай мовы ў пропаведзях, царкоўным справаводстве, пры выкладанні Закона Божага ў школах. Па ініцыятыве таварыства "Прасвета" 14 сакавіка 1930 г. адбыўся з'езд праваслаўных беларусаў у Вільні, дзе прысутнічалі прадстаўнікі грамадскасці Віленскай і Гродзенскай епархій, інтэлігенцыі з групы А. Луцкевіча–Р. Астроўскага, студэнцкая моладзь з Вільні. На з'ездзе разгарэлася дыскусія адносна характару і ролі праваслаўнай царквы ў беларускай гісторыі і культуры [31, арк. 6–7; 40]. Падкрэслівалася, што ў новых гістарычных рэаліях неабходна было максімальна выкарыстаць патэнцыял царквы для згуртавання праваслаўнага беларускага насельніцтва. Быў утвораны Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт (ЦБПК). Друкаваным органам новага аб'яднання стаў часопіс "Светач Беларусі" (1931–1933 гг.) (рэдактар – У. Більдзюкевіч), галоўнымі задачамі якога былі прызнаны "паглыбленне і ўмацаванне рэлігійнай свядомасці праваслаўных беларусаў праз беларусізацыю царквы" [600, с. 6]. У склад прэзідыума ЦБПК увайшлі Т. Вернікоўскі (старшыня), А. Коўш, У. Більдзюкевіч (намеснікі старшыні), С. Сарока (сакратар), М. Маскалік (скарбнік) і іншыя дзеячы [40, арк. 10]. Меркавалася накіраваць асобную дэлегацыю да мітрапаліта Дыянісія, міністраў і віленскага ваяводы, легалізаваць новую грамадскую арганізацыю, стварыць сетку яе філіялаў у прыходах. Выказваўся пратэст супраць рэвіндыкацыі, прапаноўвалася дамагацца перадачы Мікалаеўскай царквы ў Вільні (у асобным лісце да мітрапаліта Дыянісія прасілі прызначыць настаяцелем гэтага храма А. Каўша) [40, арк. 20–21]. Сярод асноўных задач аб'яднання былі дэрусіфікацыя праваслаўнай семінарыі ў

Вільні, стварэнне мясцовых царкоўных камітэтаў “для дапамогі настаяцелям прыходаў і царкоўным апякунам у кіраванні культурна-нацыянальным і гаспадарчым жыццём”. Уздымаліся таксама пытанні аб змяншэнні падатковага ўціску, аб скліканні Усяпольскага праваслаўнага сабору для зацвярджэння прававога статуса праваслаўнай царквы ў Польшчы. Быў прызнаны “шкодным для царкоўна-нацыянальнай справы” існуючы склад праваслаўнага духавенства. Беларуская мова павінна была прысутнічаць у пропаведзях для мясцовага насельніцтва і для беларусаў-вайскоўцаў, пры выкладанні Закона Божага, у зносінах з вернікамі, аднак мовай богаслужэнняў павінна заставацца царкоўнаславянская [40, арк. 13]. Для дасягнення пастаўленых задач ЦБПК абавязваўся “клапаціцца аб нацыянальнай беларускай асвеце ў духу навукі праваслаўнай царквы”, адкрываць і ўтрымліваць школы, курсы, прытулкі, бібліятэкі, чытальні, выдаваць царкоўнаславянскія богаслужэбныя і беларускія кнігі рэлігійнага зместу, школьныя падручнікі, брашуры, адозвы, выдаваць газеты, часопісы, арганізоўваць харавыя калектывы, склікаць з’езды [40, арк. 3)]. Хоць рускі і польскі характар праваслаўнай царквы на беларускіх землях не прызнаваўся, аднак яе роля ў этнакультурных працэсах атрымала станоўчую ацэнку.

Русафобская пазіцыя ЦБПК выклікала пратэсты з боку праваслаўнага духавенства, якое на сваіх сходах (у Стаўбцах і іншых месцах) выказалася ў абарону віленскага архіепіскапа Феадосія [671]. Імкненне арганізацыі надаць праваслаўнай царкве нацыянальны беларускі характар выклікала адмоўную рэакцыю з боку польскай адміністрацыі, аднак міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы падтрымлівала яе ў барацьбе супраць праваслаўнай кансісторыі ў Вільні. Хоць дзеячы ЦБПК патрабавалі спыніць рэвіндыкацыю праваслаўных храмаў (праўда, не лічылі яе вялікай пагрозай для інтарэсаў праваслаўнага беларускага насельніцтва), паспрыяць вяртанню ліквідаваных прыходаў, але схіляліся да згодніцтва, супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. Гэтае грамадска-царкоўнае аб’яднанне заставалася нешматлікім, хоць і ахапіла сваім уплывам тэрыторыю Віленскай, Гродзенскай і часткова Палескай епархій. У 1932 г. быў утвораны Саюз беларускай праваслаўнай моладзі. У цэлым, кіраўніцтва ЦБПК не атрымала шырокай падтрымкі з боку беларускай грамадскасці. Дзейнасць ЦБПК не мела сур’ёзных вынікаў, абмяжоўвалася складваннем хадайніцтваў да царкоўных і дзяржаўных структур і да сярэдзіны 1930-х гг. прыйшла ў заняпад. Толькі ў другой палове 1930-х гг. спробы рэанімацыі таварыства праводзіў для сваіх карыслівых мэтаў архімандрыт Філіп (Марозаў) [755, арк. 19].

У адрозненне ад іншых беларускіх арганізацый, БНК у пачатку 1930-х гг. адмовіўся ад ранейшай канфрантацыйнай тактыкі ва ўзаемаадносінах з

царкоўнымі ўладамі [813]. У рэлігійным пытанні мэты гэтага грамадска-палітычнага аб'яднання супадалі з ЦБПК. Пазіцыя БНК была прадстаўлена ў 2-х нумарах "Голаса праваслаўнага беларуса", які выдаваўся ў Вільні ў канцы 1931 г. пад рэдакцыяй А. Маркевіча. 20 студзеня 1932 г. праваслаўная фракцыя БХД прадставіла мітрапаліту Дыянісію мемарандум з патрабаваннямі аб правядзенні па-беларуску пропаведзяў, навучання рэлігіі ў школах, унутранай перапіскі царкоўных структур і інш. [633, с. 210]. У БНК у 1933 г. была створана праваслаўная камісія. У рэзалюцыі, прынятай на агульным сходзе БНК у Вільні 5 ліпеня 1933 г., утрымліваліся патрабаванні аб беларусізацыі царкоўнага жыцця, пропаведзях на беларускай мове, вывучэнні Закона Божага ў школах па-беларуску [595].

У жніўні 1932 г.–лютым 1933 г. у Вільні былі выдадзены ўсяго 2 нумары беларускамоўнага часопіса "Царква і народ", рэдактарам якога з'яўляўся І. Балтручак, выдаўцом – Я. Красоўскі. Гэты часопіс, які з'яўляўся друкаваным органам праваслаўнай фракцыі ў складзе БХД, настойліва абараняў інтарэсы праваслаўнага веравызнання, выступаў за беларусізацыю праваслаўнай царквы, супраць атэістычнага светапогляду. Асобныя матэрыялы мелі выразны апазіцыйны характар адносна царкоўнай адміністрацыі. У прыватнасці, быў надрукаваны мемарандум беларускай праваслаўнай групы студэнтаў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя да мітрапаліта Дыянісія, у якім утрымлівалася просьба аб кадравых зменах у кіраўніцтве Віленскай епархіі.

У цэлым, беларускі праваслаўны грамадска-царкоўны рух не атрымаў шырокага развіцця, разгортваўся пераважна на Віленшчыне і ў Вільні. Беларусізацыя праваслаўнай царквы адмаўлялася як польскімі ўладамі, так і праваслаўным духавенствам [1168, с. 329; 1032, с. 90]. Слабасць беларускага грамадска-царкоўнага руху тлумачыцца таксама другараднасцю нацыянальных праблем для беларускага насельніцтва у параўнанні з сацыяльна-эканамічнымі пытаннямі, нешматлікасцю інтэлігенцыі. Неабходна адзначыць, што праблема беларусізацыі праваслаўнай царквы неадназначна ўспрымалася рознымі ўзроставымі катэгорыямі беларускага насельніцтва. У адрозненне ад старэйшага пакалення, сярод моладзі было менш прыхільнікаў захавання рускага характару праваслаўнай царквы. Русафобскія погляды часткі беларускіх дзеячаў не надавалі ім папулярнасці сярод заходнебеларускага праваслаўнага насельніцтва. Польскія шавіністычныя арганізацыі і іх друк, рускія эмігранты-анархісты негатыўна рэагавалі на дзейнасць беларускіх царкоўна-грамадскіх арганізацый і іх выданні. Дзеячы БХД востра крытыкавалі пазіцыю А. Каўша і яго прыхільнікаў.

Нягледзячы на слабыя пазіцыі беларускага праваслаўнага грамадска-царкоўнага руху, польскія ўлады ўсё-такі вылучалі асобную тэндэнцыю

адносна надання праваслаўнай царкве беларускага характару [215, арк. 80]. Палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі лічыў, што у выніку дзейнасці праваслаўнай царквы мясцовае насельніцтва ўсё больш схілялася да рускай культуры і традыцый. У той час на мясцовым узроўні ў Палессі актыўна праводзіліся меры па дэрусіфікацыі грамадска-царкоўнага жыцця (уведзена забарона на выкарыстанне ў метрыках імёнаў рускай транскрыпцыі і інш.) [3]. Віленскі ваявода У. Яшчалд небяспеку бачыў не толькі ў рускім характары праваслаўнай царквы, але і ў абуджэнні нацыянальнай свядомасці беларусаў, у дзеяннях інтэлігенцыі, якая імкнулася надаць праваслаўю нацыянальны характар [214, арк. 19, 21].

Царкоўная іерархія вымушана была ажыццяўляць пэўныя захады па задавальненню нацыянальна-рэлігійных інтарэсаў беларускага насельніцтва. Як сведчыць пастанова св. Сіноду ад 18 кастрычніка 1932 г., выкладанне Закону Божага ажыццяўлялася па жаданню бацькоў на роднай мове вучняў [674, с. 1]. 7 кастрычніка 1935 г. віленскі архіепіскап Феадосій прадпісаў духавенству "дакладна выконваць загад аб выкладанні Закону Божага ў школах на роднай мове, … у прыходах з беларускім насельніцтвам – на беларускай мове" [23, с. 3]. Аднак рэалізацыя гэтых рашэнняў стрымлівалася шэрагам прычын, у тым ліку адсутнасцю беларускамоўных рэлігійных перакладаў, вучэбнай літаратуры. Толькі ў сярэдзіне 1930-х гг., пасля некалькіх мемарандумаў беларускіх грамадска-царкоўных аб'яднанняў, мітрапаліт Дыянісій даў згоду на падрыхтоўку беларускамоўных падручнікаў па Закону Божаму. Гэтым займаўся С. Паўловіч, які выдаў у 1926 г. "Свяшчэнную гісторыю Старога Завету" (пасля хадайніцтва Галоўнай управы ТБШ мітрапаліт Дыянісій благаславіў выкарыстанне кнігі ў беларускіх пачатковых школах і гімназіях) [515, арк. 340, 343]. Пад рэдакцыяй С. Паўловіча быў надрукаваны "Праваслаўны малітваслоў" на царкоўнаславянскай і беларускай мовах (1933 г.). Ім была таксама падрыхтавана "Першая навука Закону Божага" (1935 г.), "Свяшчэнная гісторыя Новага Завету" (1936 г.) (рэкамендавана для выкарыстання св. Сінодам). З мая 1937 г. С. Паўловіч рэдагаваў дзіцячы царкоўны, культурна-асветніцкі ілюстраваны часопіс "Снапок", які выдаваўся ў Варшаве. Юныя чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца на старонках выдання з хрысціянскім і народным календаром, дзейнасцю віленскіх пакутнікаў Іаана, Антонія, Яўстахія, заснавальнікаў славянскага пісьменства Кірылы і Мяфодзія, Е. Полацкай і іншых асветнікаў, помнікамі матэрыяльнай, духоўнай культуры Беларусі і свету. Аднак беларускамоўныя праваслаўныя выданні былі нешматлікімі (з 69 рэлігійных кніг праваслаўны характар мелі толькі 6, аўтарам ці рэдактарам якіх быў С. Паўловіч) [1165, с. 37].

Грамадска-царкоўны рух праявіўся не толькі ў дзейнасці беларускіх нацыянальна-рэлігійных таварыстваў, але і ў іншых формах – праваслаўных брацтвах, саветах і іншых аб’яднаннях. Напрыклад, царкоўна-будаўнічы камітэт у Баранавічах на чале з сенатарам А. Назарэўскім займаўся будаўніцтвам Пакроўскай царквы (сродкі папаўняліся за кошт ахвяраванняў, субсідый польскага ўраду) [82]. У 1929–1930 гг. ахвяраванні для рамонту Пятніцкай царквы ў Вільні збіраў асобны царкоўны камітэт, які ўзначальваў А. Коўш. У многіх мясцовасцях грамадска-царкоўныя аб’яднанні выступалі супраць рэвіндыкацыі, разбурэння культавых пабудоў. Так, праваслаўнае Сафійскае брацтва ў Гродна ў 1937–1938 гг. разам з мясцовымі рускімі арганізацыямі, друкам выступала супраць разбурэння ў горадзе царквы А. Неўскага, хоць выратаваць яе не змаглі [706, с. 43–48]. З-за шэрагу прычын так і не ўдалося арганізаваць на ўзроўні прыходаў шматлікія і дзеяздольныя грамадска-царкоўныя аб’яднанні. Уцалелыя арганізацыі да другой паловы 1930-х гг. прыйшлі ў заняпад, падвяргаліся адміністрацыйна-паліцэйскаму ўціску. Напрыклад, 7 студзеня 1936 г. была забаронена дзейнасць групы “старацаркоўнікаў” В. Багдановіча [888, с. 126].

З сярэдзіны 1930-х гг. у моўна-культурнай сферы грамадска-царкоўнага жыцця Заходняй Беларусі ўсё больш фарсіраваўся працэс выцяснення рускай мовы, узмацняліся пазіцыі польскай мовы, культуры. Школьныя ўлады ў многіх паветах настойвалі на польскамоўным выкладанні Закону Божага [294]. Для ўздзеяння на духавенства, што адмаўлялася выкарыстоўваць польскую мову ў грамадска-царкоўным жыцці, выкарыстоўваліся затрымкі дзяржаўных датацый [578; 333]. Паводле тэзісаў, распрацаваных у канцы 1935 г. Камітэтам нацыянальных спраў, праваслаўная царква павінна была стаць інструментам насаджэння польскай культуры ў заходнебеларускіх землях [837, с. 209]. Пашырэннем польскасці сярод беларускага насельніцтва пачалі займацца маладыя святары, выпускнікі Віленскай семінарыі і тэалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта. Першыя польскамоўныя богаслужэнні адбыліся 11 лістапада 1935 г. у кафедральным саборы ў Беластоку і гарнізоннай царкве ў Гродна. 1 сакавіка 1936 г. пры падтрымцы міністэрства вайсковых спраў пачалося друкаванне па-польску выдання “Gazeta Prawosławna” (“Праваслаўная газета”), якая павінна была спрыяць інтэграцыі праваслаўнай супольнасці з Польскай дзяржавай і польскай культурай [880]. Для салдат праваслаўнага веравызнання выдаваліся таксама брашуры, малітоўнік і іншая папулярная грамадска-рэлігійная літаратура.

Пры дапамозе разнастайных метадаў (сістэмы заахвочвання студэнтаў, кадравай чысткі выкладчыкаў і інш.) на тэалагічным факультэце Варшаўскага універсітэта ствараліся спрыяльныя ўмовы для правядзення

паланізацыі студэнцкага кантынгенту. Маладыя святары, выпускнікі факультэта, перавагу аддавалі польскай мове [460, с. 266]. У канцы 1930-х гг. замест звольненых прафесараў М. Арсеннева, У. Кулакова былі прызначаны асобы, якія паказвалі лаяльнае стаўленне да польскіх улад. Тады ж праваслаўная семінарыя ў Варшаве была пераўтворана ў праваслаўны ліцэй, была ліквідавана наогул праваслаўная семінарыя ў Вільні.

Дзеянні па ўзмацненню паланізацыі праваслаўнай царквы суправаджаліся чарговым (трэцім) этапам рэвіндыкацыі пры ўдзеле войска ў 1937–1939 гг. У ходзе гвалтоўнай акцыі ў гэты перыяд на Холмшчыне, Падляшшы, у Люблінскім ваяводстве было разбурана 127 праваслаўных культавых пабудоў [1032, с. 102]. Аналагічныя разбурэнні цэркваў і капліц адбываліся на Валыні. Хоць у заходнебеларускіх землях рэвіндыкацыйная кампанія ўжо не мела такіх памераў і агідных форм, як у папярэдні час, аднак працягвала выкарыстоўвацца ў палітыцы польскіх улад [356].

Для ўзмацнення паланізацыі польскія ўлады інспіравалі рух “праваслаўных палякаў”. Фармальнай падставай для гэтага з’яўлялася наяўнасць у структуры насельніцтва праваслаўных польскай этнічнай прыналежнасці: паводле перапісу насельніцтва 1921 г. іх налічвалася ў Польшчы каля 545,5 тыс. чалавек [842, с. 451], паводле перапісу насельніцтва 1931 г. – 516 тыс. чалавек, у пачатку 1935 г. – 500 тыс. чалавек [1207, с. 81]. Паводле польскіх даследчыкаў Л. Васілеўскага, К. Сракоўскага, А. Крысінскага і некаторых іншых, абсалютную большасць гэтай праваслаўнай супольнасці складалі ўкраінцы, беларусы і рускія. Хоць лічыцца праблематычным устанаўленне пэўнага часу ўзнікнення руху “праваслаўных палякаў” [431, с. 81–82], аднак найбольш верагоднай пачатковай падзеяй прызнаецца стварэнне ў лістападзе 1934 г. камісіі для польскамоўнага перакладу літургічных тэкстаў. Частку актывістаў новага грамадскага руху складалі чыноўнікі праваслаўнага веравызнання. Ініцыятарамі выступілі прадстаўнікі мясцовых беларускай і рускай супольнасцей – І. Марцінкевіч, А. Арцішэвіч, А. Ананчанка, Б. Смольскі і іншыя [604, с. 175]. Арганізацыйныя дзеянні пачаліся толькі пасля прыходу новага кіраўніка Гродзенскай епархіі Савы (Саветава), перакананага прыхільніка паланізацыі праваслаўнай царквы. На надзвычайным пасяджэнні св. Сінода ў Варшаве былі зацверджаны польскамоўныя пераклады літургічных тэкстаў, дадзены дазвол на іх выкарыстанне [916, с. 82].

Адначасова стваралася арганізацыйная структура руху “праваслаўных палякаў”. У 1935 г. у Беластоку ўзнікла таварыства “Праваслаўны дом імя Ю. Пілсудскага”. Як адзначаў яго старшыня П. Ярчак ў адным з лістоў у міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы, “варожыя Польшчы

элементы і старое даваеннае праваслаўнае духавенства, непадрыхтаванае да новага дзяржаўнага ладу і культурнага развіцця", займалася русіфікацыяй [297, арк. 1]. Для "усведамлення, уздыму культуры, асветы, маральнасці" пэўнай групы "праваслаўных людзей польскай нацыянальнасці" рабіліся запыты адносна субсідый для арганізацыі святкаванняў і падарункаў, выдання польскамоўнай "Праваслаўнай газеты". "Варожая руская прэса – "Русское слово", "Наше время", "Новая искра", якія выдаюцца ў Вільні, а таксама аддзелы Рускага дабрачыннага таварыства сваёй прапагандай з удзелам праваслаўнага духавенства не толькі шкодзяць дзяржаве, але і калечаць праваслаўны народ" [297, арк. 3–4].

Акрамя Беластока, аналагічныя таварыствы былі створаны ў Гродна, Навагрудку, Валожыне, Слоніме, Баранавічах, а таксама ў Вільні [735]. На іх арганізацыйных сходах рабіліся заклікі аб барацьбе з "наступствамі царскай русіфікацыі" [297–298]. Акрамя аб'яднання і салідарнасці, мэтамі таварыства "Дом палякаў праваслаўнага веравызнання імя С. Баторыя" (Гродна) абвяшчаліся таксама "прапаганда сярод членаў таварыства асноў выхавання дзяцей добрымі грамадзянамі Польскай рэспублікі; апека над дзецьмі (догляд дзяцей, утварэнне летніх лагераў, экскурсіі і г. д.)" [296, арк. 1; 331, арк. 1–6; 332]. Рэгулярны друк руху "праваслаўных палякаў" пачаўся пасля звароту мітрапаліта Дыянісія 16 лістапада 1936 г. да міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы аб фінансавай падтрымцы для выдання польскамоўнай рэлігійнай літаратуры [757, арк. 147].

Мясцовыя арганізацыі руху "праваслаўных палякаў" планавалі разгарнуць разнастайную культурна-асветніцкую і дабрачынную дзейнасць. Для гэтага неабходна было ствараць народныя дамы, клубы, бібліятэкі, праводзіць сходы, мастацкія і забаўляльныя мерапрыемствы, ажыццяўляць растлумачальную працу. У Гродна працаваў Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут, ініцыятарам стварэння якога з'яўляўся галоўны праваслаўны капелан польскага войска Сімяон (Федаронька) [707, с. 130]. Мэтай гэтай прапагандысцкай установы з'яўлялася арганізацыя навуковай і выдавецкай дзейнасці для паглыблення і пашырэння сярод праваслаўнага духавенства і вернікаў асноў веравучэння, канонаў праваслаўнай царквы, яе арганізацыі і гісторыі ("з асаблівым улікам гісторыі і становішча праваслаўнай царквы ў Польшчы") [296, арк. 20]. У структуры Праваслаўнага навукова-выдавецкага інстытута былі створаны 6 секцый – багаслоўская, гістарычная, архіўна-бібліяграфічная, тэрміналагічная, царкоўнага мастацтва і па падрыхтоўцы праваслаўнай энцыклапедыі. Супрацоўнікі ўстановы праводзілі лекцыі па багаслоўскіх праблемах і пытаннях царкоўнай гісторыі. Там друкавалі па-польску часопіс "Głos Prawosławia" ("Голас праваслаўя"), брашуры. Установа

ажыццяўляла сваю выдавецкую, навукова-прапагандысцкую дзейнасць выключна за кошт субсідый польскага ўрада і мясцовых органаў улады. Так, на 1939/1940 г. у каштарысе Праваслаўнага навукова-выдавецкага інстытута з агульнай сумы запланаваных прыбыткаў (73 390 злотых) большасць адводзілася на субсідыі міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы (50 670 злотых), частку выдаткаў пагадзілася пакрыць міністэрства вайсковых спраў [756, арк. 65–66, 77–78]. У студзені 1939 г. Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут пачаў выдаваць на польскай мове штомесячны часопіс “Przegląd prawosławny” (“Праваслаўны агляд”). Як адзначыў яго рэдактар, дырэктар інстытута Л. Касперскі, праваслаўная царква мела сваю культуру, традыцыі і ўласную ідэалогію, якая праяўлялася ў супрацоўніцтве з Польскай дзяржавай, народам і польскай культурай [1089, с. 3]. З мая 1939 г. у Вільні пачаў выдавацца польскамоўны “Праваслаўны двухтыднёвік”. Навукова-тэарэтычны ўзровень усіх выданняў Праваслаўнага навукова-выдавецкага інстытута быў слабым.

Нягледзячы на пратэкцыянісцкія меры з боку дзяржаўных структур, рух “праваслаўных палякаў” не атрымаў падтрымкі з боку беларускай праваслаўнай супольнасці, не набыў масавага характару. У друку наўмысна сцвярджалася аб прыкладана 600 тыс. паляках праваслаўнага веравызнання [887, с. 12–13], што абсалютна не адпавядала сапраўднаму становішчу. У царкоўна-прыходскім летапісе Кажанскай Крыжаўздвіжанскай царквы на Падляшшы прыхільнікі руху “праваслаўных палякаў” атрымалі адмоўныя ацэнкі – “здраднікі беларускага народа”, “іуды-здраднікі” [429, с. 235–236]. Знаходзячыся ў высылцы ў Слоніме, А. Станкевіч 19 мая 1939 г. адзначыў у сваіх каляндарных нататках, што “для народу гэтая “ідэя” дзікая і чужая”, што “розныя кар’ерысты і аферысты як сярод свецкіх, так і духоўных на гэта ідуць” [712, с. 198]. Большасць праваслаўных святарнікаў негатыўна ці стрымана рэагавала на планы паланізацыі праваслаўнай царквы. Аднак дзеля самазахавання духавенства вымушана было знешне захоўваць палітычную лаяльнасць адносна Польскай дзяржавы [604, с. 252]. Па ініцыятыве палескага ваяводы В. Костэк-Бярнацкага святарнікі павінны былі падпісвацца пад пісьмовай прысягай аб лаяльнасці і паслухмянасці адносна дзяржаўнай адміністрацыі [213, арк. 43]. Праціўнікі паланізацыі з ліку праваслаўнага духавенства падвяргаліся адміністрацыйна-паліцэйскаму ўціску, арыштам, турэмнаму зняволенню [404, с. 67]. Ва ўмовах фактычнай адсутнасці арганізаваных структур беларускага руху галоўную ролю ў супрацьдзеянні руху “праваслаўных палякаў” сыгралі русафільскія колы і мясцовыя аб’яднанні рускай супольнасці – Рускае дабрачыннае таварыства, РНА, Руская арганізацыя моладзі [706, с. 41, 49].

Меры ў напрамку паланізацыі праваслаўнай царквы ў другой палове 1930-х гг. з’яўляліся састаўной часткай планаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва і ўмацавання пазіцый польскай культуры. Адначасова адбывалася не толькі ідэалагічнае абгрунтаванне, але і практычнае паўсядзённае выкарыстанне структур праваслаўнай царквы ў якасці інструмента паланізацыі беларускага насельніцтва. Паводле пастановы св. Сінода ад 7 лістапада 1937 г., выкладанне Закона Божага павінна было праводзіцца на польскай мове (толькі ў некаторых выпадках дапускалася царкоўнаславянская). Мясцовыя гаворкі ці польскую мову разам з царкоўнаславянскай неабходна было выкарыстоўваць у пропаведзях. У час дзяржаўных святаў патрабаваліся польскамоўныя пропаведзі. Мовай богаслужэнняў заставалася царкоўнаславянская [275, арк. 17, 60]. Аднак частка мясцовай польскай адміністрацыі рашуча не прызнавала памяркоўную пазіцыю праваслаўных іерархаў адносна моўнай праблематыкі, што супярэчыла інтарэсам Польскай дзяржавы, заяўляла аб яе ігнараванні [215, арк. 43]. Чарговыя меры паланізацыі датычылі праваслаўнага насельніцтва Беластоцкага ваяводства (пераважна Ваўкавыскага, Гродзенскага, Бельскага, Беластоцкага і Саколкаўскага паветаў) [916, с. 102]. У адной са справаздач навагрудскага ваяводы адзначалася, што “большасць праваслаўнага клеру – гэта людзі старэйшага пакалення, прасякнутыя рускім духам і культурай, выразна нацэленых на былую нацыянальную Расію” [210, арк. 34адв.]. Таму прапаноўвалася шляхам адпаведных кадравых змен і іншымі мерамі дабівацца таго, каб каля 70% праваслаўнага духавенства Навагрудскага ваяводства перайшло да выкладання рэлігіі ў пачатковых школах па-польску [210, арк. 35адв.].

З 1938 г. польская адміністрацыя настойліва дамагалася царкоўных пропаведзяў на польскай мове. Вялікае значэнне надавалася ўдзелу праваслаўных святароў у розных дзяржаўных святочных мерапрыемствах. Паводле “Унутранага статута” праваслаўнай царквы, падпісанага 18 лістапада 1938 г. [846] замест “Часовых правілаў” 1922 г., які фактычна замацаваў яе поўнае падпарадкаванне Польскай дзяржаве, афіцыйнай мовай царкоўнага жыцця стала польская. Дэрусіфікацыя, барацьба з беларускім і ўкраінскім рухамі, выдаленне рускай мовы з навучання рэлігіі ў школах, царкоўных пропаведзяў былі ўключаны сярод асноўных мер у дырэктыўны ліст ад 21 снежня 1938 г. “Рэлігійная палітыка са спецыяльным разглядам праваслаўнай праблемы” міністра веравызнанняў і грамадскай асветы В. Свентаслаўскага [210, арк. 12–16].

Вясной 1939 г. адміністрацыя Палескага ваяводства распрацоўвала чарговыя меры паланізацыі, бо “праваслаўная маса на Палессі ў палітычных, нацыянальных адносінах уяўляе сабой неапрацаваны і наогул

падатлівы элемент для польскай дзяржаўнай асіміляцыі" [1083, арк. 28]. Паводле ацэнак польскіх уладаў, у 1939 г. у Палескім ваяводстве ўжо ва ўсіх школах навучанне рэлігіі адбывалася на польскай мове, пропаведзі ў цэрквах таксама праводзіліся па-польску. Аднак на самой справе – на ламанай польскай мове, бо свяшчэннікі не ведалі яе дасканала ці не ведалі наогул [211, арк. 9–10]). Акрамя таго, існуючая практыка складвання бацькамі школьнікаў 2-х экзэмпляраў (для царквы і школы) заявы аб мове навучання рэлігіі адпалохала значную частка іх публічна дэклараваць сваю этнічную прыналежнасць. Толькі ў тых прыходах, дзе вернікі старэйшага ўзросту не ведалі польскай мовы, то дапускалася мясцовая, палеская гаворка. Украінская і беларуская мовы не дазваляліся. Адбывалася замена былых рускіх імёнаў на польскія (напрыклад, Фама – на Томаш і г. д.). Прапаноўвалася ўзмацніць націск на праваслаўных іерархаў у справе прыняцця рашэння аб пераходзе на грыгарыянскі каляндар [1083, с. 29; 215, арк. 27]. Варта адзначыць, што праблему календара спрабавалі вырашыць яшчэ з пачатку 1920-х гг. [50]. Аднак у свядомасці праваслаўных вернікаў пераход на грыгарыянскі каляндар, які з'яўляўся сімвалічным адлюстраваннем адметнасці і глыбокай праваслаўнай традыцыі [1067, с. 233], успрымаўся як грубае ўмяшальніцтва ў праваслаўнае веравучэнне. Мітрапаліт Дыянісій вымушаны быў прыняць 8 верасня 1924 г. кампраміснае па свайму характару распараджэнне – дапускалася выкарыстанне адразу 2-х календароў. У заходнебеларускіх прыходах па-ранейшаму прытрымліваліся юліянскага календара, у дзяржаўных установах, войску, школах быў уведзены грыгарыянскі каляндар. У канцы 1930-х гг. палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі патрабаваў ад павятовых стараст, каб яны паспрыялі падрыхтоўцы адпаведных петыцый аб пераходзе на грыгарыянскі каляндар [209, арк. 2].

Беластоцкі ваявода Г. Асташэўскі прапаноўваў цэлы шэраг мер для ўзмацнення паланізацыі праваслаўнай царквы: правесці грунтоўную праверку грамадзянства ўсіх рускіх, якія прыбылі ў Польшчу пасля 1918 г., а тых, што "перашкаджаюць працэсам асіміляцыі" – пазбавіць грамадзянства і выселіць па-за межы дзяржавы; імкнуцца да рашучага ўвядзення толькі польскай мовы ў навучанне рэлігіі, пропаведзі і ўсё царкоўнае жыццё; "пастаянна і рашуча выдаляць з пасад свяшчэннікаў праваслаўнай царквы людзей, прасякнутых рускім духам і культурай, а на іх месца прызначаць адзінкі, выхаваныя ў польскім духу і адданыя польскай справе"; падтрымаць таварыствы "праваслаўных палякаў", Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут, дзейнасць якіх павінна прывесці "да выгнання рускага ўплыву з праваслаўнай царквы і яе паланізацыі" [207, арк. 145].

У цэлым, у канцы 1930-х гг. польскія дзяржаўныя ўлады значна актывізавалі дзеянні ў напрамку надання праваслаўнай царкве польскага характару і адначасова па пераўтварэнню яе ў дзейсны сацыяльны інстытут па нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва. Рэалізацыя такіх планаў на практыцы адмоўна адбівалася на захаванні праваслаўнай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны і магла ў бліжэйшай перспектыве прывесці да большых незваротных негатыўных наступстваў і страт.

Пасля 1921 г. каталіцкае насельніцтва заходнебеларускіх зямель фармальна было ахоплена Віленскай і Мінскай дыяцэзіямі. З 1925 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі ўваходзіла ў склад Віленскай, Пінскай (яны ахоплівалі большасць католікаў), Ломжынскай дыяцэзій. Па стану на 1 студзеня 1937 г. усяго ў заходнебеларускіх землях у 48 дэканатах налічвалася 5 480 парафій. Самымі шматлікімі былі дэканат у Вільні (46 касцёлаў, 148 тыс. вернікаў), Лідскі (адпаведна 21 і 78,5 тыс. чалавек), Ашмянскі (19 і 63,9 тыс. чалавек), Гродзенскі (19 і 42,9 тыс. чалавек) [399, с. 200–201].

Польскія ўлады спрыялі прыярытэтнаму развіццю рымска-каталіцкай царквы, асабліва пасля падпісання 10 лютага 1925 г. канкардату паміж Ватыканам і Польшчай [923]. У параўнанні з іншымі цэрквамі ў Польшчы, рымска-каталіцкі касцёл атрымоўваў больш дзяржаўных датацый: у 1926 г. – 16 млн. злотых, у 1938 г. – 20 млн. злотых [459, с. 23]. Акрамя таго, рымска-каталіцкая царква валодала шматлікай нерухомай уласнасцю, з’яўлялася буйным землеўладальнікам. Да канца 1930-х гг. яна мела ў Беластоцкім, Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах 14 565 га ворыўнай зямлі (без зямель, што належалі віленскаму арцыбіскупу і пінскаму біскупу) [1051, с. 101]. Буйнымі землеўладальнікамі былі каталіцкія манаскія ордэны. Частку прыбыткаў для рымска-каталіцкай царквы давала выдавецкая праца, кніжны гандаль і іншыя віды камерцыйнай дзейнасці. Умацаванню матэрыяльных пазіцый рымска-каталіцкай царквы спрыяла і разгорнутая кампанія рэвіндыкацыі.

Рымска-каталіцкаму касцёлу была адведзена важная роля ў паланізацыі заходнебеларускіх зямель. Большасць каталіцкіх святароў прапагандавала польскую дзяржаўнасць, культуру, выступала за панаванне ў касцёле польскай мовы. Польскія шавіністычныя ідэі прысутнічалі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе рымска-каталіцкіх семінарый у Вільні, Пінску. Так як школа не была аддзелена ад царквы, то рымска-каталіцкі касцёл аказваў велізарны ўплыў на адукацыйную сістэму, пазашкольнае выхаванне. Касцёлы і кляштары адкрывалі школы, падтрымлівалі дзіцячыя дамы, выхоўвалі дзяцей і моладзь у духу каталіцкай веры і адданасці Польскай дзяржаве.

У 1925–1939 гг. у Заходняй Беларусі амаль пры кожным касцёле былі створаны таварыствы Акцыі каталіцкай. Інстытут Акцыі каталіцкай, што размяшчаўся ў Вільні пры архідыяцэзіі, падпарадкоўваўся непасрэдна Ватыкану. Асноўнай яго мэтай з'яўлялася выхаванне моладзі ў духу каталіцтва, супраць атэізму. Актыўна займаліся прапагандай каталіцкай веры, культурна-асветніцкай працай Каталіцкая ліга (з 1932 г. Каталіцкае дзеянне), шматлікія рэлігійна-грамадскія арганізацыі, хоць эфектыўнасць іх працы не задавальняла польскую адміністрацыю. Так, у многіх мясцовасцях каталіцкая акцыя праходзіла марудна з-за слабога зацікаўлення мясцовых вернікаў, слабой актыўнасці ксяндзоў. Польскі ўрад асобным распараджэннем ад 28 студзеня 1934 г. выказаў падтрымку каталіцкім грамадскім таварыствам [1090]. Дзякуючы каталіцкаму духавенству і польскай інтэлігенцыі ў розных мясцовасцях наладжвалася культурна-асветніцкая і рэлігійна-асветніцкая праца сярод каталіцкага насельніцтва. Напрыклад, найбольшую актыўнасць у Пружанскім павеце ў канцы 1935 – пачатку 1936 гг. праяўляў парафіяльны аддзел каталіцкага таварыства "Caritas" [186, арк. 1]. Аднак каталіцкая акцыя не выклікала адназначнай падтрымкі польскіх адміністрацыйных улад да канца 1930-х гг. Беластоцкі ваявода Г. Асташэўскі летам 1939 г. адзначаў, што разгорнутая кампанія магла выклікаць непажаданыя вынікі, "адпіхнуць ад польскасці праваслаўных і абудзіць у іх беларускі сепаратызм" [207, арк. 146].

Манаскія ордэны, польскія клерыкальныя арганізацыі выдавалі газеты, часопісы, бюлетэні, брашуры і іншую літаратуру. Акрамя афіцыйных царкоўных выданняў ("Piński przegląd diecezjalny"("Агляд Пінскай дыяцэзіі"), "Wiadomości archidiecezjalne wileńskie" ("Ведамасці Віленскай архідыяцэзіі") распаўсюджваліся таксама "Nowe życie" ("Новае жыццё"), "Słowo" ("Слова"), "Gazeta kartuzka" ("Картузская газета"), "Dziennik wileński" ("Віленскі дзённік"), "Nasz przyjaciel" ("Наш прыяцель") і іншыя. У сярэдзіне 1930-х гг. у заходнебеларускіх ваяводствах друкавалася каля 300 газет і часопісаў для католікаў, штодзённы тыраж якіх дасягаў 1 млн. экз. [459, с. 62]. Абсалютная большасць з іх выдавалася на польскай мове.

У адрозненне ад слабога і неаднароднага беларускага праваслаўнага грамадска-царкоўнага руху, каталіцкі рух быў больш кансалідаваным, з'яўляўся прыкметным фактарам этнаканфесійнага жыцця Заходняй Беларусі, асабліва ў першай палове 1920-х гг. Яго арганізацыйнае станаўленне адбывалася яшчэ ў 1917–1920 гг. На з'ездзе беларускіх ксяндзоў у Вільні 12–13 ліпеня 1921 г., арганізаваным А. Станкевічам, У. Талочкам, І. Бобічам, закраналіся пытанні аб неабходнасці стварэння асобнай грамадскай арганізацыі беларускага каталіцкага духавенства, аб

далейшых захадах па ўвядзенню беларускай мовы ў пропаведзях і рэлігійнай практыцы, аб беларускім рэлігійным выдавецтве і інш. Былі прыняты рэзалюцыі з патрабаваннямі беларусізацыі каталіцкага грамадска-царкоўнага жыцця [641, с. 130]. Прынятае на з’ездзе рашэнне аб стварэнні арганізацыі беларускіх ксяндзоў “Светач” не было рэалізавана, бо польскія ўлады яе не зарэгістравалі. З лістапада 1921 г. беларускія ксяндзы А. Станкевіч, В. Гадлеўскі, Я. Германовіч, Я. Рэшаць, К. Стаповіч, П. Татарыновіч, Ф. Чарняўскі, В. Шутовіч і іншыя атрымалі дазвол на правядзенне богаслужэнняў, беларускамоўных пропаведзяў у Мікалаеўскім касцёле ў Вільні [641, с. 132], хоць такое кампраміснае рашэнне царкоўных улад (рэлігійную практыку ў храме ажыццяўляць у свабодны час ад літоўскіх богаслужэнняў) выклікала незадавальненне беларускай інтэлігенцыі [1049, с. 107–108].

Дзейнасць беларускіх ксяндзоў была абмежавана пераважна Віленскай дыяцэзіяй – у Вільні, Дзісенскім, Свянцянскім, Ашмянскім, Валожынскім, Лідскім, Ваўкавыскім паветах. З пачатку 1920-х гг. богаслужэнні, пропаведзі па-беларуску сталі рэгулярнымі ў Шаркаўшчынскай парафіі Дзісенскага павета (пасля ксяндза М. Пятроўскага, які займаўся святарскай дзейнасцю там у 1917–1924 гг., яго змяніў З. Якуць), у Ідолце Браслаўскага павета (у 1917–1920 гг. пробашчам быў І. Бобіч, у 1925–1927 гг. – М. Борык), у Троіцкім касцёле ў Новым Пагосце Браслаўскага павета (у 1921–1924 гг – Я. Жук), у касцёле Св. Іосіфа ў Барадзінічах Браслаўскага павета (у 1917–1927 гг. – В. Шутовіч), Троіцкім касцёле ў Засвіры Свянцянскага павета (у 1920–1926 гг. – К. Стаповіч), Троіцкім касцёле ў Друі Браслаўскага павета (з 1926 г. богаслужэнні там праводзіў Ф. Абрантовіч), у касцёле Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Задарожжы Дзісенскага павета (Ф. Рамейка). Нерэгулярны характар мелі беларускія пропаведзі ў касцёле Божага цела ў Іказні Браслаўскага павета, касцёле Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Германавічах Дзісенскага павета, касцёле Святых апосталаў Пятра і Паўла ў Барунах Ашмянскага павета (М. Пятроўскі), касцёле Св. Іахіма ў Клюшчанях Свянцянскага павета (К. Стаповіч), касцёле Св. Станіслава ў в. Далёкія Браслаўскага павета, касцёле Бязгрэшнага Зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Удзела Дзісенскага павета (Ф. Аляшкевіч), у в. Ёды Дзісенскага павета і іншых месцах [641, с. 124–125, 162]. Беларускія ксяндзы заклікалі мясцовае насельніцтва падаваць заявы аб адкрыцці беларускіх школ, распаўсюджвалі беларускамоўны друк, літаратуру, займаліся культурна-асветніцкай працай. Вялікай папулярнасцю ў мясцовага насельніцтва карыстаўся харавы калектыў у Клюшчанях Свянцянскага павета пад кіраўніцтвам К. Стаповіча, у рэпертуары якога былі як рэлігійныя, так і беларускія народныя песні.

З сярэдзіны 1920-х гг. пачалося згортванне беларускага каталіцкага грамадска-царкоўнага руху. Па-першае, пасля падпісання згаданага канкардату паміж Ватыканам і польскім урадам магчымасці выкарыстання беларускай мовы ў рэлігійнай практыцы, пропаведзях былі пастаўлены ў прамую залежнасць ад рашэння канферэнцыі біскупаў. Супраць такіх абмежавальных палажэнняў канкардату выступалі ў друку, на публічных сходах А. Станкевіч, Ф. Абрантовіч, В. Гадлеўскі, Я. Рэшаць і іншыя беларускія ксяндзы [641, с. 143]. Група ксяндзоў-беларусаў у лісце, адрасаваным 19 мая 1925 г. канферэнцыі біскупаў, патрабавала выкладання беларускай мовы ў каталіцкіх семінарыях у Вільні і Пінску, урэгулявання пытання аб выкарыстанні роднай мовы беларускіх вернікаў ў богаслужэннях і г. д. [697, арк. 5; 641, с. 143–145]. У адказ агульнапольская канферэнцыя біскупаў запэўніла ў гатоўнасці аказаць падтрымку.

Па-другое, змены ў кіраўніцтве Віленскай архідыяцэзіі выклікалі негатыўныя наступствы для дзейнасці беларускіх ксяндзоў. Ранейшы віленскі біскуп Ю. Матулевіч (Матулайціс) хоць і непаслядоўна, аднак пазітыўна і талерантна ставіўся да беларускага каталіцкага грамадска-царкоўнага руху. Да прызначэння віленскім арцыбіскупам сейненскі біскуп Р. Ялбжыкоўскі, прыхільнік эндэкаў, у першай палове 1920-х гг. лічыў нацыянальна-культурную дзейнасць беларускіх і літоўскіх ксяндзоў пагрозай для адзінства рымска-каталіцкага касцёла, перашкаджаў стварэнню няпольскіх школ, культурна-асветніцкай працы ксяндзоў [1050, с. 27]. Беларускія хадэкі 12 лістапада 1926 г. у мемарандуме Р. Ялбжыкоўскаму дамагаліся неадкладнага ўвядзення беларускай мовы, гісторыі і літаратуры ў Віленскай рымска-каталіцкай семінарыі, перадачы беларусам аднаго з касцёлаў у Вільні, дазволу на выкарыстанне ва ўзаемаадносінах з царкоўнай адміністрацыяй беларускай мовы нароўні з польскай і лацінскай, распараджэння аб беларускамоўных пропаведзях і недапушчальнасці пераводу ксяндзоў з беларускіх парафій у польскія [20]. Хоць каталіцкія ўлады адмовіліся выконваць дадзеныя патрабаванні, аднак Р. Ялбжыкоўскі першапачаткова спрабаваў лавіраваць паміж інтарэсамі польскай і беларускай каталіцкіх супольнасцей [641, с. 179–180].

Па-трэцяе, моўная праблематыка абвастрыла этнаканфесійную сітуацыю ў асобных заходнебеларускіх мясцовасцях, што выкарыстала для сваіх мэтаў польская грамадзянская адміністрацыя і каталіцкія ўлады. У некаторых касцёлах польскае насельніцтва выказвала дэманстратыўны пратэст у час правядзення беларускамоўных богаслужэнняў, пропаведзяў. Асабліва востры характар набыў канфлікт у Жодзішках Свянцянскага павету, дзе В. Гадлеўскі з верасня 1924 г. праводзіў пропаведзі на беларускай мове [1211]. На працягу 1925–1927 гг. яго неаднаразова падвяргалі арыштам, турэмнаму зняволенню. Супраць беларускіх ксяндзоў

актыўна выкарыстоўвалася практыка шматлікіх праверак, пераводаў у парафіі з польскім насельніцтвам і іншыя прымусовыя меры. Так, у Шаркаўшчыне польскія адміністрацыйна-паліцэйскія ўлады прымушалі ксяндза З. Якуця адмовіцца ад беларускамоўных пропаведзяў, канфіскавалі хадайніцтва з подпісамі больш 50 вернікаў аб правядзенні пропаведзяў па-беларуску [641, с. 138]. Неабгрунтаваныя прэтэнзіі высоўваліся кантралюючай камісіяй супраць ксяндза касцёла ў Барадзінічах Браслаўскага павета В. Шутовіча, якога ў студзені 1927 г. перавялі ў іншую парафію, а неўзабаве прымусілі выехаць на некалькі гадоў у ЗША [63, с. 220]. Працы былі пазбаўлены Ф. Рамейка, М. Шалкевіч і некаторыя іншыя святары. У пастарскім лісце 10 снежня 1928 г. віленскі біскуп Р. Ялбжыкоўскі забараніў ксяндзам належаць да БХД, чытаць газету "Беларуская крыніца", бо яна быццам паказвала прыхільнасць да "рэлігійнай індэферэнтнасці і бальшавізму". Аднак рэальнай прычынай была нацыянальная, культурна-моўная арыентацыя БХД і беларускіх ксяндзоў [1146, с. 66]. Гэтыя і іншыя дыскрымінацыйныя меры ў канфесійным жыцці Заходняй Беларусі адзначалі прадстаўнікі Беларускага пасольскага клубу ў Лігу нацый 15 жніўня 1929 г. [45, арк. 90–96; 745]. Беларуская хадэцыя працягвала выкарыстоўваць магчымасці парламенцкай формы барацьбы праз паслоў і сенатараў А. Стаповіча, П. Карузу, К. Юхневіча, Ф. Ярэміча, В. Багдановіча і іншых.

Неадназначную пазіцыю адносна беларускага каталіцкага руху займаў пінскі біскуп З. Лазінскі. З аднаго боку, ім актыўна аказвалася падтрымка каталіцкім грамадскім арганізацыям. З другога боку, біскуп выступаў супраць БХД, газеты "Беларуская крыніца" [1050, с. 148, 152]. У адрозненне ад яго, прынцыповую пазіцыю адносна ўмацавання польскага ўплыву сярод каталіцкага насельніцтва, актывізацыі яго грамадска-царкоўнага жыцця заняў прызначаны 10 ліпеня 1932 г. пінскі біскуп К. Букраба [792–793]. К. Букраба актыўна выступаў супраць ваяўнічага атэізму ў СССР. У яго пастарскім лісце "Аб праўдзівым вобліку бальшавізму" ад 27 студзеня 1937 г. падкрэслівалася, што "бязбожны камунізм не стварае, не будуе, а толькі разбурае і знішчае" [794, с. 16].

Такім чынам, з канца 1920-х гг. беларускія ксяндзы пазбавіліся магчымасці ўдзельнічаць у публічнай нацыянальна-культурнай і асветніцкай працы сярод беларускага насельніцтва. Ва ўмовах ажыццяўлення пратэкцыянісцкай канфесійнай палітыкі польскага ўраду адносна рымска-каталіцкай царквы з-за сваёй малалікасці беларускія ксяндзы не маглі моцна змяніць характар грамадска-рэлігійнага жыцця. Нягледзячы на грамадска-царкоўную актыўнасць у першай палове 1920-х гг., беларускія ксяндзы складалі меншасць сярод каталіцкага духавенства. У працы А. Станкевіча "Родная мова ў святынях" (1929 г.) [641]

прыведзены прозвішчы больш 60 ксяндзоў (разам з прадстаўнікамі інтэлігенцыі – каля 100), якія займаліся беларускай грамадска-царкоўнай дзейнасцю ў першай чвэрці XX ст. Паводле звестак П. Татарыновіча, у 1920-я гг. налічвалася каля 200 беларускіх каталіцкіх святароў. Сярод прычын аслаблення актыўнасці трэба ўлічваць і слабы ўзровень грамадскай, нацыянальнай свядомасці беларускага каталіцкага насельніцтва [658, с. 16].

У абставінах адыходу беларускіх ксяндзоў з другой паловы 1920-х гг. ад актыўнай нацыянальна-культурнай дзейнасці беларуская інтэлігенцыя рымска-каталіцкага веравызнання пачала выкарыстоўваць легальныя магчымасці структур БІГіК для правядзення культурна-асветніцкай працы. Беларускія хадэкі і ў праграмных дакументах, і ў ходзе практычнай дзейнасці імкнуліся спрыяць задавальненню рэлігійных і адукацыйных інтарэсаў беларускага каталіцкага насельніцтва. Такая пазіцыя негатыўна ўспрымалася іх ідэалагічнымі праціўнікамі – заходнебеларускімі камуністамі. У асобным цыркуляры ЦК КПЗБ прапаноўвалася выкрываць ролю "барацьбітоў" за беларусізацыю царквы і касцёла, якія імкнуліся да ўзмацнення ўплыву папоў і ксяндзоў. Аднак пры гэтым заходнебеларускія камуністы імкнуліся рэальна ацэньваць суадносіны сіл розных ідэйна-палітычных лагераў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У адной са справаздач (1933 г.) адзначалася, што БХД падтрымлівала моцныя сувязі з беларускім каталіцкім насельніцтвам і мела шансы для пашырэння свайго ўплыву [492, арк. 32].

З пераўтварэннем БХД у БНА у 1936 г. пытанням захавання і развіцця беларускай культуры, асветы па-ранейшаму надавалася важнае значэнне. У праграме партыі былі патрабаванні аб дэмакратызацыі адукацыйнай сферы, навучанні дзяцей на іх роднай мове, ураўнаванні ў правах дзяржаўных і прыватных школ. БНА выступала за бесперашкодную пазашкольную культурна-асветніцкую працу. У галіне рэлігіі патрабавалася свабода веравызнанняў, выкарыстанне роднай мовы вернікаў у грамадска-царкоўным жыцці [41, арк. 6].

Важнымі напрамкамі дзейнасці беларускіх хадэкаў з'яўляліся выдавецкая дзейнасць, навукова-публіцыстычная работа. А. Станкевіч у 1926 г. заснаваў у Вільні Беларускую друкарню імя Ф. Скарыны, дзе да 1940 г. было надрукавана больш 146 беларускіх кніг і брашур. Яго намаганнямі было заснавана ў 1928 г. Беларускае каталіцкае выдавецтва. А. Станкевіч з'яўляўся таксама рэдактарам і выдаўцом каталіцкага беларускамоўнага (на лацінцы, толькі асобныя нумары ў 1938 г. надрукаваны кірыліцай) грамадска-асветніцкага часопіса "Хрысціянская думка" (1928–1939 гг.). Выданне адстойвала хрысціянска-дэмакратычныя каштоўнасці, выступала за нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі,

супраць паланізацыі, у абарону заходнебеларускага насельніцтва. Мэтамі рэдакцыі былі абвешчаны наступныя: абуджэнне ў беларусаў-католікаў рэлігійнай і нацыянальнай свядомасці, аб’яднанне беларускага каталіцкага духавенства і беларускай інтэлігенцыі каталіцкага веравызнання, аказанне садзейнічання ў практыцы беларускамоўных пропаведзяў у парафіях [104]. На старонках часопіса былі не толькі багаслоўскія матэрыялы, але і філасофскія, культуралагічныя артыкулы, нарысы А. Станкевіча, П. Татарыновіча і іншых аўтараў, хроніка грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі. Рэдакцыя часопіса дамагалася беларусізацыі каталіцкай царквы ў Заходняй Беларусі, актыўнага ўдзелу ксяндзоў і вернікаў у беларускім каталіцкім руху. У пачатку 1933 г. рэдакцыя заклікала чытачоў ствараць адзіны, агульнабеларускі апалітычны каталіцкі цэнтр. На старонках выдання змяшчаліся гістарычныя, публіцыстычныя матэрыялы да юбілейных дат айчыннай і сусветнай гісторыі (70-годдзя беларускага друку (1933 г.), 950-годдзя хрысціянства на Беларусі (1938 г.) і інш.). Рэдакцыя часопіса сачыла за падзеямі ў СССР, выказвала пратэст супраць палітычных рэпрэсій, калектывізацыі, палітыкі ваяўнічага атэізму, змен у культурным будаўніцтве ў БССР у 1930-я гг. У часопісе змяшчаліся творы Я. Германовіча (В. Адважнага), К. Стаповіча (К. Сваяка), Я. Семашкевіча (Я. Быліны), Д. Аніські, М. Машары, М. Танка і іншых аўтараў. На старонках часопіса прапагандаваўся здаровы лад жыцця, змяшчаліся матэрыялы антыалкагольнай накіраванасці. Рэдакцыя імкнулася выкарыстоўваць арыгінальныя прыёмы для папулярызацыі свайго выдання. Так, у адным з нумароў быў змешчаны заклік да чытачоў: “Мала прачытаць газету самому! Трэба яе прачытаць сабраным разам суседзям” [360]. У 1937 г. пачаў друкавацца “аддзел для дзяцей” “Васількі” (фальклор, паэзія, гістарычныя публікацыі В. Ермалковіча пра князёў ВКЛ Кейстута, Ягайлу, Вітаўта і іншыя матэрыялы). У 1938–1939 гг. асобным выданнем (таксама лацінкай) выдаваўся дзіцячы дадатак да часопіса “Хрысціянская думка” – “Зорка”, у кожным нумары якога належнае месца займаў дзіцячы фальклор В. Адважнага, М. Машары, С. Новіка-Пяюна і іншых аўтараў. Гэты дзіцячы часопіс прызначаўся не толькі для дзяцей католікаў, але і праваслаўных.

Пытанні царкоўных і этнаканфесійных адносін, хрысціянскай духоўнай спадчыны разглядаліся А. Станкевічам у шэрагу свецкіх і рэлігійных гісторыка-культуралагічных прац. Выкарыстанне аўтарам разнастайнага кола крыніц, сярод якіх былі ўласныя ўспаміны, эпісталярныя матэрыялы (перапіска з беларускімі ксяндзамі), архіўныя дакументы і іншыя, дазволіла напісаць працу “Родная мова ў святынях”, дзе фактаграфічныя звесткі адлюстроўваюць захады па беларусізацыі грамадска-царкоўнага жыцця, а таксама асобныя аспекты станаўлення беларуска-

га каталіцкага руху з пачатку XX ст. да канца 1920-х гг. На думку А. Станкевіча, літургічныя мовы ў хрысціянстве (лацінская для каталіцызму, царкоўнаславянская для праваслаўя) выконвалі стабілізуючую ролю [459, с. 15]. У ходзе гісторыка-культуралагічнага аналізу аўтар даў адмоўную ацэнку духоўнаму жыццю Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай у XVIII ст., ахарактарызаваўшы яго культурна-моўным заняпадам [459, с. 46]. Негатыўна ацэнена ім і канфесійная палітыка расійскага царызму адносна рымска-каталіцкай царквы ў канцы XVIII–XIX стст. [459, с. 59].

Больш дэталёва гісторыя беларускага каталіцкага руху была прадстаўлена ў гістарычным нарысе А. Станкевіча “Беларускі хрысціянскі рух” (1939 г.) [633]. У першых двух раздзелах кнігі прааналізаваны асноўныя фактары, якія аказвалі ўплыў на грамадска-царкоўнае жыццё беларускай каталіцкай супольнасці. Як і ў папярэдніх сваіх працах, А. Станкевіч лічыў, што ў канцы XVII–XVIII стст. у беларускіх землях выразнай была тэндэнцыя культурнага рэгрэсу, хоць у дадзенай рабоце гэтая ацэнка была менш катэгарычнай. Перавагу прадстаўнікоў каталіцкага веравызнання сярод дзеячаў беларускай культуры XIX ст. А. Станкевіч тлумачыў уплывам канфесійнай палітыкі царскага ўраду, апазіцыйнымі настроямі адносна яе каталіцкага насельніцтва, высокім узроўнем свядомасці каталіцкай інтэлігенцыі. Станаўленню арганізаванага беларускага каталіцкага руху ў 1910–1915 гг. быў прысвечаны асобны раздзел кнігі. Сярод ідэолагаў і настаўнікаў стваральнікаў БХД А. Станкевіч вылучаў Б. Эпімах-Шыпілу, С. Данісевіча. Як прынаваўся аўтар, непасрэдны ўплыў на фарміраванне яго хрысціянска-дэмакратычнага і нацыянальнага светапогляду аказаў ксёндз А. Лісоўскі [633, с. 41–42]. У даследаванні адлюстравана ідэйна-палітычная эвалюцыя БХД ад клерыкальна-каталіцкага аб’яднання да палітычнай партыі свецкага тыпу БНА. Аўтар паказаў дзейнасць беларускіх хадэкаў у кантэксце іх узаемаадносін з іншымі грамадска-палітычнымі, культурнымі структурамі Заходняй Беларусі. У працы зроблены агляд праваслаўнага грамадска-царкоўнага руху Заходняй Беларусі, аднак вынікі яго дзейнасці недаацэнены (“у беларускай праваслаўнай культуры ніякіх слядоў не пакінула”) [633, с. 210]. Адметнасцю працы з’яўлялася яго салідная крыніцавая база (успаміны, дакументальныя матэрыялы, многія з якіх цалкам ці часткова змешчаны ў тэксце працы, і іншыя крыніцы з уласнага архіва аўтара, з архіваў асобных беларускіх арганізацый), навукова-папулярны стыль выкладання, гісторыка-храналагічны падыход.

У абагульняючым даследаванні А. Станкевіча “Хрысціянства і беларускі народ” (1940 г.), якая была надрукавана кірыліцай па-беларуску [642], прааналізаваны асноўныя этапы ў развіцці хрысціянства на

беларускіх землях, вызначана месца яго розных напрамкаў у гісторыі і культуры. Гэтае даследаванне А. Станкевіча па айчыннай філасофіі, гісторыі, рэлігіязнаўстве высока ацэньваецца на сучасным этапе [406, с. 94]. Адзначаючы варажскае паходжанне этнонімаў “Русь”, “рускі” [642, с. 18–19], А. Станкевіч фактычна далучыўся да “крывіцкай” тэорыі В. Ластоўскага, Я. Станкевіча і іншых беларускіх даследчыкаў. У ходзе праведзенага гісторыка-культуралагічнага аналізу і філасофска-тэарэтычнага асэнсавання аўтар прапаноўваў уласныя сродкі і механізмы для дасягнення пазітыўных вынікаў у грамадска-культурным і палітычным развіцці беларускага народу, у пошуках “беларускага шляху”, “рэлігійнага і нацыянальнага сінтэзу”. Паводле А. Станкевіча, дасягнуць гэтага можна было пры этнаканфесійным і культурным адзінстве беларускага народа, на падставе хрысціянска-дэмакратычных каштоўнасцей, пры гарманічным нацыянальным і рэлігійным суіснаванні беларусаў-католікаў і праваслаўных [642, с. 178]. Аднак прапанаваныя метады для дасягнення такога адзінства нельга ацаніць адназначна. Разам з дэмакратычнымі падыходамі (талерантнасць, супрацоўніцтва з іншымі хрысціянскімі коламі) прапаноўваліся і радыкальныя меры наступальнага характару (“выжываць чужы і хрысціянству, і народу элемент палітычны”) [642, с. 179]. Даволі супярэчлівай з’яўляецца аўтарская ацэнка уніяцтва. З аднаго боку, уніяцтва прызнавалася “верай беларускай”, давалася высокая ацэнка яго ўкладу ў захаванне нацыянальна-культурнай адметнасці беларускага народа ў мінулым. З другога боку, уніяцтва не стала нацыянальнай рэлігіяй у многім таму, што асноўнымі яго праваднікамі былі езуіты, “да якіх праваслаўны народ не мае даверу” [642, с. 169–170]. Неабходна адзначыць, што ў параўнанні з ранейшымі працамі А. Станкевіча, дзе адчувалася празмерная ідэалізацыя уніяцтва, у дадзенай працы аўтар паспрабаваў даць больш узважлівую і аб’ектыўную ацэнку уніяцтву. Паводле яго высновы, гістарычны вопыт (у тым ліку 1920–30-х гг.) паказаў, што царкоўная унія фактычна не аб’ядноўвала, а ўносіла яшчэ большае раз’яднанне ў этнаканфесійнае жыццё беларускага народа [642, с. 177]. Пры гэтым аўтар кнігі прадэманстраваў непрыхільнае стаўленне да праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі (“трымаецца ўпорыста маскоўшчыны і нават рабіла спробы завядзення польшчыны”), назваў іезуітаў і іх часопіс “Да злучэння” прымітыўнымі, убогімі [642, с. 170–171]. Падвяргаючы рэзкай крытыцы праваслаўную царкву, аўтар тым не менш выступаў за супрацоўніцтва на аснове хрысціянскіх і нацыянальных каштоўнасцей. Паводле А. Станкевіча, хрысціянства было асновай развіцця еўрапейскай цывілізацыі, а таксама беларускай нацыянальнай культуры. Характэрнай рысай беларускай нацыянальнай ідэалогіі аўтар лічыў яе умеранасць, якая адмаўляла крайнасці ідэалагічных сістэм Усходу і Захаду.

Сярод мноства артыкулаў і публікацый У. Талочкі ў заходнебеларускім друку былі як публіцыстычныя, палемічныя, так і навукова-папулярныя матэрыялы па айчыннай гісторыі і культуры. У прыватнасці, некалькі яго гістарыяграфічных артыкулаў і рэцэнзій было прысвечана адлюстраванню асобных бакоў жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны ў працах асобных вучоных [598; 652] і іншых дзеячаў беларускай культуры, гісторыі. У адрозненне ад А. Станкевіча, В. Гадлеўскага і іншых беларускіх хадэкаў, якія займалі радыкальныя пазіцыі адносна беларусізацыі грамадска-царкоўнага жыцця католікаў, У. Талочка выступаў за памяркоўныя метады яе ажыццяўлення, хоць і актыўна выступаў супраць паланізацыі.

З сярэдзіны 1920-х гг. беларускія ксяндзы разам з праваслаўнымі і пратэстанцкімі святарамі перакладалі Біблію на беларускую мову, потым займаліся гэтым самастойна. У Беларускім каталіцкім выдавецтве ў пачатку 1930-х гг. былі выдадзены па-беларуску (лацінкай) кнігі біблейскай гісторыі Старога і Новага Запавету В. Гадлеўскага, якія з'яўляліся адначасова і рэлігійнымі выданнямі для шырокага кола чытачоў, і вучэбнымі дапаможнікамі для беларускіх вучняў-католікаў [894–895]. В. Гадлеўскі займаўся перакладам тэкстаў Бібліі, бо пратэстанцкі пераклад выклікаў у яго незадавальненне [565, с. 175]. Беларускі пераклад Новага Запавету Бібліі В. Гадлеўскага – "Чатыры Евангеліі і Дзеі апосталаў" – выйшаў у Вільні ў 1939 г. [835]. У падрыхтоўцы да друку рэлігійнай літаратуры прымалі ўдзел беларускія ксяндзы і прадстаўнікі інтэлігенцыі каталіцкага веравызнання. Варта пагадзіцца з высновай Я. Трацяка, што тагачасныя рэлігійныя выданні можна ацэньваць у якасці этнаканфесійных каштоўнасцей, а пераклады рэлігійнай літаратуры на беларускую мову з'яўляліся істотным прызнакам нацыянальна-культурнага адраджэння [658, с. 12].

У сярэдзіне 1930-х гг. польскія ўлады ўзмацнілі ганенні супраць беларускіх хадэкаў. Магчымасці свецкай культурна-асветніцкай працы рэзка звузіліся пасля забароны БІГіК. Пастаянна аказваўся адміністрацыйна-паліцэйскі ўціск на рэдакцыю газеты "Беларуская крыніца" [633, с. 219], якая вымушана была з 15 красавіка 1937 г. часова спыніць друкаванне выдання. 28 лістапада 1938 г. з Вільні былі выселены беларускія каталіцкія дзеячы А. Станкевіч, У. Талочка, А. Клімовіч.

Набыццё рымска-каталіцкім касцёлам фактычна дзяржаўнага статусу спрыяла акаталічванню заходнебеларускага насельніцтва. Вынікі перапісаў насельніцтва засведчылі, што за перыяд 1921–1931 гг. доля католікаў у насельніцтве Віленскага ваяводства ўзрасла з 42,1% да 48,4%, Палескага ваяводства – з 7,9% да 11,5%, Навагрудскага ваяводства – з 39,5% да 40,2%. У 1930-я гг. тэмпы акаталічвання насельніцтва паступова павялічваліся. У Віленскай архідыяцэзіі ў 1927–1939 гг. узнікла 17 новых і

падзелена больш 150 існуючых парафій. У 1929–1938 гг. там зафіксавана 19 742 пераходы ў каталіцтва лацінскага абраду (найбольш з праваслаўя – 18 915, а таксама з пратэстантызму – 488, іудаізму – 125, сектанцтва – 214) [741, арк. 1–14]. З пераходам у каталіцтва значна ўзрасталі магчымасці працаўладкавацца, вучыцца, весці гаспадарку і г. д. Польскія ўлады дамагаліся, каб пераход у каталіцтва вёў і да змены нацыянальнай прыналежнасці.

Такім чынам, прыярытэтнае становішча рымска-каталіцкай царквы мэтанакіравана падтрымлівалася польскім дзяржаўным апаратам. Каталіцкі клір прапагандаваў польскую дзяржаўнасць, культурна-моўныя каштоўнасці. Беларускі каталіцкі грамадска-царкоўны рух, які быў у першай палове 1920-х гг. адчувальным фактарам нацыянальна-культурнага жыцця ў мясцовасцях, населеных пераважна беларускім каталіцкім насельніцтвам, не набыў масавага характару і з-за шэрагу аб'ектыўных, суб'ектыўных фактараў быў згорнуты ў канцы 1920-х гг. Культурна-асветніцкую дзейнасць сярод беларускага каталіцкага насельніцтва ў другой палове 1920-х – першай палове 1930-х гг. працягвала свецкая беларуская інтэлігенцыя рымска-каталіцкага веравызнання.

З пачатку 1920-х гг. у заходнебеларускім рэгіёне рабіліся спробы аднаўлення традыцый уніяцкай царквы. У 1924 г. Ватыкан надаў віленскаму, луцкаму, люблінскаму, пінскаму біскупам правы на адкрыццё уніяцкіх парафій. Актыўнымі прапагандыстамі уніяцтва сталі манахі-місіянеры, каталіцкія святары. У верасні 1924 г. езуіты заснавалі місію ў Альбярціне Слонімскага павета, дзе займаліся распаўсюджваннем усходняга (візантыйска-славянскага) абраду. 24 ліпеня 1925 г. там была легалізавана першая парафія ўсходнеславянскага (візантыйска-славянскага) абраду. У 1926 г. місія ў Альбярціне была зацверджана ў якасці навіцыята, які заснаваў філіял у в. Сынкавічы Слонімскага павета, які стаў цэнтрам парафіі ўсходнеславянскага абраду.

Станаўленне місіянерскіх цэнтраў, парафій візантыйска-славянскага абраду абцяжарвалася адсутнасцю неабходных прававых механізмаў [744]. Паводле канкардату паміж Ватыканам і Польшчай ад 10 лютага 1925 г. былі ўраўнаваны правы грэка-каталіцкага духавенства з правамі рымска-каталіцкага кліру, а статус візантыйска-славянскага абраду там не быў пэўна вызначаны. Адносна формы ажыццяўлення неауніі ў асяроддзі каталіцкіх іерархаў існавалі рознагалоссі: адныя патрабавалі далучэння непасрэдна да рымска-каталіцкай царквы, другія (сярод іх і пінскі біскуп З. Лазінскі) выступалі за двухабраднасць, трэція – за стварэнне каталіцкіх парафій усходняга (візантыйска-славянскага) абраду [1140, с. 150–151]. Львоўскі мітрапаліт А. Шаптыцкі імкнуўся распаўсюдзіць на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўплыў грэка-каталіцкай царквы. Мясцовая польская

адміністрацыя ўсяляк перашкаджала яму, аддаючы перавагу больш выгаднаму візантыйска-славянскаму абраду. Польскія ўлады спадзяваліся выкарыстаць неаунію ў справе нацыянальнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва [1101, с. 64–65]. У красавіку 1925 г. міністр веравызнанняў і грамадскай асветы С. Грабскі ўзгадняў з пінскім біскупам З. Лазінскім умовы функцыянавання візантыйска-славянскага абраду каталіцкай царквы. Пры пераходзе ва уніяцтва дапускалася літургія на царкоўнаславянскай мове, але прадугледжвалася падпарадкаванне рымска-каталіцкай іерархіі. Калі уніятамі станавіліся жыхары цэлай вёскі, то яны не атрымалі магчымасці стварыць асобную парафію, а толькі філіяльны храм з вікарыем. Выпрацаванага ў ходзе сустрэчы С. Грабскага і З. Лазінскага падыходу адносна неауніі польскія дзяржаўныя структуры імкнуліся прытрымлівацца ў далейшым [601, с. 56].

Аднак несупадзенне інтарэсаў рымска-каталіцкага касцёла і Польскай дзяржавы працягвала захоўвацца. Акрамя таго, у планах Ватыкана акцыя неауніі разглядалася як сродак пашырэння ўплыву рымска-каталіцкай царквы ў Расіі. Менавіта таму уніяцкая місіянерская дзейнасць да 1930 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі мела выключна рускі характар, за што падвяргалася крытыцы як з боку польскіх улад, каталіцкіх святароў, так і дзеячаў заходнебеларускага нацыянальнага руху. Уніяцкія святары пры выкананні рэлігійнай практыкі карысталіся пераважна рускай мовай [1067, с. 409]. Польскія палітычныя сілы, мясцовая адміністрацыя з ажыццяўленнем неауніі звязвалі абвастрэнне этнаканфесійнай сітуацыі ў заходнебеларускіх землях. Вясной 1926 г. палескі і навагрудскі ваяводы заяўлялі аб непажаданасці неауніі для інтарэсаў Польскай дзяржавы. Польскія правыя партыі адназначна выступалі за пашырэнне толькі лацінскага абраду рымска-каталіцкай царквы. Польскія памешчыкі, асаднікі, чыноўнікі прызнавалі неаунію “антыпольскай дэманстрацыяй”. Моўная арыентацыя неауніі не прызнавалася польскімі ўладамі: руская мова лічылася праявай русіфікацыі, беларуская мова – сепаратысцкіх і антыдзяржаўных настрояў. Большасць удзельнікаў дыскусіі, узнятай у польскім друку ў 1930–1932 гг., падтрымлівала пазіцыю па ўзмацненню інтарэсаў Польскай дзяржавы.

Супраць акцыі неауніі выступіла і праваслаўная царква. Праваслаўнае духавенства лічыла уніятаў ерэтыкамі. Уніяцкая царква разглядалася у якасці канкурэнта праваслаўнай у папаўненні прыбыткаў, а таксама прэтэндэнта на яе царкоўныя будынкі, маёмасць. Для правядзення антыуніяцкай прапаганды ў праваслаўных епархіях ствараліся місіянерскія камітэты. Самі праваслаўныя святары павінны былі ўсяляк супрацьдзейнічаць ажыўленню уніяцтва [277, арк. 13; 278, арк. 19].

Менавіта ў такіх абставінах адбывалася развіццё акцыі неауніі. Як у гістарычных крыніцах, так і ў даследаваннях вучоных, царкоўных дзеячаў існуюць разыходжанні адносна колькасці вернікаў-уніятаў. Хоць колькасныя паказчыкі даволі супярэчлівыя, аднак яны сведчаць аб тым, што найбольшага ўздыму уніяцкая кампанія ў Заходняй Беларусі дасягнула ў канцы 1920-х гг. – пачатку 1930-х гг. Паводле розных ацэнак, на працягу 1927–1932 гг. колькасць уніяцкіх парафій павялічылася з 14 да 36, а лічба вернікаў вагалася ў памеры 16,5–24 тыс. [459, с. 15; 741, арк. 6, 12–13; 610, с. 75]. Згодна падлікаў С. Абламейкі, у складзе дыяцэзій у міжваенны час было створана 25 беларускіх парафій візантыйска-славянскага абраду (каля 30 тыс. вернікаў) [733, с. 211].

Пры адсутнасці адназначных урадавых дырэктыў адносна неауніі яе рэалізацыя фактычна пераводзілася на рэгіянальны ўзровень. Адносна спрыяльныя ўмовы былі да 1932 г. на тэрыторыі Пінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі. Разам з Альбярцінам і Вільняй Пінск стаў буйным місіянерскім цэнтрам. Пачынаючы з 1929 г., там рэгулярна праводзіліся уніяцкія канферэнцыі. Пінскі біскуп З. Лазінскі пастаянна падтрымліваў сувязь з украінскімі грэка-каталікамі. Калі пінскі біскуп З. Лазінскі падтрымліваў неаунію, то віленскі архібіскуп Р. Ялбжыкоўскі выказваў незадавальненне, лічыў візантыйска-славянскі абрад перашкодай для пераходу праваслаўных у лацінскі абрад каталіцтва, хоць адкрыта не выступаў супраць рашэнняў Ватыкана. Колькасны рост уніяцкіх парафій прымусіў польскія ўлады правесці ў чэрвені 1928 г. канферэнцыю ў Варшаве. Адзінай стратэгіі ў адносінах мясцовых уладаў да неауніі выпрацаваць не ўдалося. Канферэнцыя прызнала неабходным выкарыстоўваць дыферэнцыяваны падыход да візантыйска-славянскага абраду каталіцтва, з улікам асаблівасцей яго развіцця ў пэўнай мясцовасці [754; 601, с. 56].

У канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. Ватыкан актывізаваў дзейнасць па уніяцкаму адраджэнню. Былі праведзены спецыялізаваныя канферэнцыі для святароў, створана некалькі навучальных устаноў. Для заходнебеларускіх зямель уніяцкіх святароў рыхтавалі ў Альбярціне, а таксама ў духоўнай семінарыі ў Дубне (Заходняя Украіна), місіянерскім інстытуце ў Любліне. Камісіі “Pro Russia”, якая стала ў красавіку 1930 г. самастойнай арганізацыяй, была перададзена прапаганда візантыйска-славянскага абраду. Адначасова адбываўся перагляд нацыянальна-культурнай і моўнай арыентацыі неауніі. Паводле II уніяцкай канферэнцыі, якая адбылася ў Пінску 1–3 верасня 1931 г., у рэлігійную практыку уніяцкіх парафій дапускаліся ўкраінская і беларуская мовы. Усе гэтыя змены Ватыкана асобныя даследчыкі расцэньваюць у якасці пераломных у правядзенні неауніі [1147, с. 212–213]. На наш погляд, зробленыя захады мелі толькі тактычны характар, яны фактычна легалізавалі ранейшую

практыку выкарыстання гэтых моў. Хоць частка прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі падтрымала неаунію, аднак карэнных зрухаў у бок нацыянальна-культурнага жыцця уніяцкія святары ажыццявіць у 1930-я гг. не здолелі. Справа ў тым, што з 1932 г. у Пінскай дыяцэзіі пачалася паступовая ліквідацыя існуючых уніяцкіх парафій, а новыя амаль не ствараліся. Пінскі біскуп К. Букраба хаця праяўляў лаяльныя адносіны адносна неауніі, аднак не аказваў падтрымкі. У лютым 1932 г. школьныя інспектары атрымалі ўказанні не дапускаць рэлігійнай практыкі уніяцкіх святароў у адукацыйных установах без дазволу мясцовых уладаў. Выкладанне рэлігіі ва уніяцкіх парафіях дапускалася толькі па-польску. Нягледзячы на намаганні А. Шаптыцкага пашырыць на Палессі грэка-каталіцкі абрад каталіцтва, вялікіх поспехаў дасягнуць не ўдалося. На тэрыторыі Пінскай дыяцэзіі царкоўныя ўлады ўзмацнялі пазіцыі каталіцтва лацінскага абраду, а не уніяцтва.

Нягледзячы на тое, што місіянерскія цэнтры, уніяцкія кляштары і храмы актыўна праводзілі культурна-асветніцкую, дабрачынную дзейнасць, аднак у большасці сваёй яны былі слаба ўцягнуты ў задавальненне нацыянальна-культурных інтарэсаў беларускага насельніцтва. Гэта датычыла і кляштара марыянаў у Друі Браслаўскага павета, рашэнне пра заснаванне якога было прынята ў 1923 г. (перадача царкоўных пабудоў адбылася 7 мая 1924 г.), першым адміністратарам якога быў прызначаны беларускі ксёндз А. Цікота. Манахі Друйскага кляштару атрымалі ахвяраванні ад княгіні М. Радзівіл, хаця і ажыццявілі іх нямэтавае выкарыстанне [478, с. 87–90]. Большасць свецкіх і царкоўных даследчыкаў перабольшвае ўдзел кляштара марыянаў у Друі ў беларускім нацыянальна-культурным жыцці [661, с. 51; 673, с. 24]. Варта адзначыць, што беларускамоўныя пропаведзі для каталіцкага насельніцтва Друі праводзіліся яшчэ з 1917 г. Парадак выкарыстання беларускай і польскай моў у пропаведзях у кляштары быў зацверджаны толькі ў пачатку 1925 г. [478, с. 239]. У кляштары марыянаў у Друі ў 1924 г. была заснавана школа (гімназія) імя С. Баторыя, дырэктарам якой да 1933 г. быў А. Цікота. Акрамя яго, выкладчыкамі ў школе былі беларускія ксяндзы Я. Германовіч, Ф. Абрантовіч, якія перайшлі ў манаства. Іх намаганнямі патрабаванні беларусізацыі грамадска-царкоўнага жыцця былі выкладзены ў мемарандуме, накіраваным уніяцкаму з’езду біскупаў, які праходзіў 8–10 лістапада 1926 г. у Вільні [477, с. 9]. Аднак беларуская мова выкарыстоўвалася абмежавана ў пропаведзях і пры навучанні дзяцей. Магчымасці для дзейнасці манахаў значна ўскладніліся пасля абвастрэння адносін з мясцовым рымска-каталіцкім духавенствам у 1929 г. [693]. Па рэкамендацыі следчай камісіі ў сакавіку 1930 г. у Друйскім кляштары марыянаў спыніліся беларускамоўныя пропаведзі [912]. Прызнаючы ўклад манахаў-марыянаў ў рэлігійна-асветніцкую працу,

іх патэнцыяльныя магчымасці, Я. Трацяк справядліва лічыць, што ў іх дзейнасці арыентацыя на нацыянальныя каштоўнасці не стала вызначальнай [659, с. 58; 658, с. 11]. Уклад кляштара марыянаў ў спробы пашырэння уніі падвяргаецца сумненню і А. Надсанам [478, с. 140, 143]. З пачатку 1930-х гг. манахі праяўлялі пасіўнасць (за выключэннем Я. Германовіча) у грамадска-культурным жыцці, паступова адыйшлі ад нацыянальнай арыентацыі, спрыялі пашырэнню польскай культуры. Істотных змен у бок беларускіх нацыянальна-культурных каштоўнасцей не назіралася і пасля адкрыцця друйскімі манахамі беларускага марыянскага дома студый у Вільні ў сярэдзіне 1930-х гг. Замест выселеных у 1938 г. марыянаў-беларусаў у Друю накіравалі манахаў-палякаў [694].

Слабой была нацыянальна-культурная арыентацыя і кляштара езуітаў у Альбярціне, хоць там і праводзіліся богаслужэнні па-беларуску. Пры кляштары дзейнічалі гурткі скаутаў, тэатральная студыя, бібліятэка. Вядомасцю карыстаўся царкоўны хор “Круцыяты”. Значны ўклад у дзейнасць кляштара ў Альбярціне ўнёс А. Неманцэвіч, які ўступіў у ордэн езуітаў у 1929 г. У 1932–1937 гг. ён выдаваў у Вільні (рэдакцыя была ў Слоніме, з 1934 г. – у духоўнай семінарыі ў Дубна) па-беларуску уніяцкую газету “Да злучэння”. На старонках выдання змяшчалася Евангелле, праца М. Бярдзяева “Аб’яднанне хрысціян Усходу і Захаду”, артыкулы аб неабходнасці неауніі, хроніка рэлігійнага жыцця. Акрамя рэдактара, сярод аўтараў выдання былі Б. Пачобка, які праводзіў беларускамоўныя пропаведзі ў Бабровічах Косаўскага павета, Я. Урбан і іншыя. Пасля закрыцця газеты А. Неманцэвіч наладзіў у 1939 г. у Варшаве выданне часопіса “Злучэнне”.

Сярод нешматлікіх уніяцкіх цэнтраў, якія актывізавалі нацыянальна-культурнае жыццё мясцовага насельніцтва, вылучалася парафія ў Альпені Столінскага павета, заснаваная ў 1926 г. Там да 1935 г. беларускамоўныя богаслужэнні праводзіў В. Аношка [909]. Грамадска-царкоўная дзейнасць святара аказала ўплыў на нацыянальнае самаўсведамленне мясцовага насельніцтва. Калі ў 1921 г. большасць насельніцтва называла сябе “тутэйшымі”, то ў 1931 г. у Альпені 1 050 чалавек заявілі аб сваёй беларускай этнічнай прыналежнасці [1083, с. 23]. Дзякуючы клопатам В. Аношкі была пабудавана капліца, клуб, дзе паказваліся беларускія тэатральныя пастаноўкі, дзейнічаў духавы аркестр, які іграў у час царкоўных святаў. Разам з аркестрам В. Аношка выязджаў у суседнюю вёску Харомск і іншыя уніяцкія парафіі [272, арк. 16; 212, арк. 11]. У час свята Успення Божай Маці 28 жніўня 1932 г. удзельнічалі таксама мясцовыя праваслаўныя і іудзеі. Я. Германовіч высока ацэньваў працу В. Аношкі, прысвяціў яму асобную брашуру “Унія на Палессі” (Альбярцін, 1932). Польскія ўлады імкнуліся перасяліць В. Аношку, якога абвінавачвалі ў

беларускім сепаратызме, у Гарадную Столінскага павета, дзе была калонія ўкраінскіх перасяленцаў з Галіцыі. Пасля пераводу В. Аношкі на Навагрудчыну распаўсюджваннем уніяцкай акцыі займаўся беларускі святар П. Татарыновіч, які ў 1932–1939 гг. праводзіў багаслужэнні ў Гарадной, Альпені, Калцы, Мярлінскіх хутарах Столінскага павета. П. Татарыновіч праявіў сябе таленавітым аратарам, друкаваўся на старонках газеты "Да злучэння" і іншых заходнебеларускіх выданняў [695, арк. 303; 279, арк. 1–12]. Яго аўтарству належала некалькіх кніг "Святы Ізідар хлебароб" (1928 г.), "Купалле" (1930 г.), "Шляхам дзіваў і ўражанняў" (1934 г.), літаратурных перакладаў.

У 1930-я гг. адбываўся заняпад уніяцкіх парафій у заходнебеларускіх землях. Паводле звестак міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы, у пачатку 1938 г. налічвалася больш 16 тыс. вернікаў [759, арк. 314–318]. У працах даследчыкаў прысутнічае разыходжанне: 14–17 тыс. чалавек у 1937 г. (паводле Ф. Жэмянюк [1101, с. 138]), 7,7–10 тыс. чалавек напярэдадні 1939 г. (паводле І. Касяка [404, с. 56]). У Палескім ваяводстве ў 1939 г. налічвалася 7 уніяцкіх парафій, якія аб'ядноўвалі каля 3 тыс. вернікаў [1083, с. 22; 216, арк. 2–3]. Польскія ўлады ў дзейнасці многіх святароў вылучалі прыхільнасць да нацыянальна-культурнай дзейнасці. Ксяндза парафіі ў Тараканях Кобрынскага павета Д. Навіцкага падазравалі ў тым, што "прадстаўляў і надалей спрытна прыхаваны рускі напрамак", пробашча парафіі ў Гарадной Столінскага павета Л. Гарошку, псаломшчыка М. Яструбецкага – у "выразнай украінскай агітацыі" [210, арк. 31; 1083, с. 23]. У канцы 1938 г. з Варшавы было дадзена ўказанне наконт адносін да місіянерскай дзейнасці каталіцкага касцёла візантыйска-славянскага абраду – захоўваць ранейшае адмоўнае стаўленне [210, арк. 15]. У пачатку 1939 г. навагрудскае ваяводскае ўпраўленне негатыўна ацэньвала дзейнасць ксяндзоў візантыйска-славянскага абраду за прапаганду сярод вернікаў беларускай мовы, "пашырэнне выразных беларускіх нацыяналістычных тэндэнцый" [210, арк. 34адв.]. Палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі сур'ёзнай пагрозай для Палесся лічыў дзейнасць украінскіх місіянераў. "Яны прапагандавалі беларускія нацыяналістычныя лозунгі сярод маладога каталіцкага кліру. Асяродкам беларуска-ўкраінскага нацыяналізму стала семінарыя ў Пінску, якой кіраваў італьянец Алексі Петрані, што спрыяў існаванню няпольскіх груп" [210, арк. 31–37].

Праведзены аналіз разнастайных крыніц і літаратуры сведчыць аб тым, што толькі частка уніяцкіх святароў уносіла свой уклад у захаванне беларускай нацыянальнай культуры. Аднак нельга перабольшваць іх беларускую нацыянальную арыентаванасць. Акцыя неауніі не набыла масавага характару. Уніяцкія традыцыі з цяжкасцю аднаўляліся ў

рэлігійнай свядомасці беларускага насельніцтва. Насуперак стэрэатыпам, замацаваным у шэрагу публіцыстычнай і навукова-папулярнай літаратуры, трэба адзначыць, што марыяне і часткова іезуіты не аказалі адчувальнага ўплыву на беларускую культуру, асвету. Хаця місіянерскія цэнтры ў Вільні, Друі, Альбярціне ўнеслі ажыўленне ў грамадска-рэлігійнае жыццё, аднак не змаглі прыцягнуць вернікаў да нацыянальна-культурнай дзейнасці.

Паступова распаўсюджваў свой ўплыў у Заходняй Беларусі пратэстантызм. Найбольш шматлікімі былі баптысты, хрысціяне веры евангельскай (пяцідзесятнікі), метадысты і іншыя. Рэлігійнае сектанцтва атрымала вялікае пашырэнне сярод часткі праваслаўных беларусаў. Істотную падтрымку пратэстантызму аказвалі замежныя місіянерскія цэнтры. Яны заснавалі шэраг абшчын баптыстаў і евангельскіх хрысціян, пераважная большасць якіх была ў Палескім ваяводстве. Сусветны саюз баптыстаў, амерыканская місія метадыстаў, Саюз славянскіх аб'яднанняў евангельскіх хрысціян-баптыстаў і іншыя арганізацыі дапамагалі ў будаўніцтве малітоўных дамоў, правядзенні канферэнцый, выданні і распаўсюджванні літаратуры, ажыццяўлялі дабрачынную дзейнасць. Праз свае прадстаўніцтвы ў Лодзі і Гданьску Чыкагская місія пяцідзесятнікаў накіроўвала грошы абшчынам у Брэсцкім, Пружанскім і іншых паветах. Нямецкія і польскія місіянеры мелі непасрэдныя адносіны да пашырэння на Палессі адвентыстаў 7-га дня. Аднак у 1924 г. польскія ўлады афіцыйна забаранілі дзейнасць місіянераў, а іх нерухомасць была перададзена розным дзяржаўным установам. Абмежавальныя меры польскіх улад прымусілі пратэстанцкія абшчыны заняцца выключна пытаннямі ўнутранага характару, задавальненнем толькі рэлігійных патрэбаў часткі заходнебеларускага насельніцтва [1008, с. 204]. Каталіцкая і асабліва праваслаўная цэрквы негатыўна рэагавалі на рост пратэстанцкіх абшчын. У канцы 1920-х гг. праваслаўная царкоўная адміністрацыя распрацавала асноўныя метады барацьбы з распаўсюджваннем пратэстантызму, але з-за недахопу сродкаў гэта не дало значных вынікаў.

Буйнымі арганізацыямі евангельскіх хрысціян былі агульнапольскія – Аб'яднанне цэркваў хрыстовых евангельскага веравызнання, што выдавала ў Кобрыне часопіс "Хрысціянскі саюз" (мясцовую арганізацыю ўзначальваў К. Ярашэвіч), Таварыства ўзаемнай дапамогі евангельскіх хрысціян і іншыя. Асабліва хутка развіваўся баптызм на Палессі. Намаганнямі прапаведніка Л. Дзекуць-Малея Брэст стаў значным цэнтрам евангельскага руху. Там праводзіліся агульнапольскія канферэнцыі, працавалі біблейскія і рэгенцкія курсы, дзе праходзілі падрыхтоўку служыцелі пратэстанцкіх цэркваў Заходняй Беларусі. Пры баптысцкай царкве ў Брэсце працавала нядзельная школа, дзе для дзяцей выкладаліся

не толькі асновы веравучэння, але і агульнаадукацыйныя прадметы. На працягу 1920–1924 гг. Л. Дзекуць-Малей пераклаў на беларускую мову з рускай і польскай моў 17 рэлігійных брашур. У чэрвені 1923 г. у Брэсце адбыўся з’езд, на якім евангельскія хрысціяне і баптысты аб’ядналіся ў адзіны саюз. Аднак пасля яго распаду з 1930 г. у заходнебеларускіх землях дзейнічалі паасобку Саюз баптыстаў, Саюз евангельскіх хрысціян і Саюз цэркваў Хрыстовых. Л. Дзекуць-Малей прымаў удзел у перакладзе на беларускую мову Новага Запавету Бібліі, які выдаваўся ў 1926–1930 гг. асобнымі брашурамі ў баптысцкім выдавецтве “Компас” (Лодзь) [93, с. 34]. А. Луцкевіч адрэдагаваў пераклад Л. Дзекуць-Малея, дапоўніў яго ўласным перакладам асобных кніг Бібліі і выдаў па-беларуску “Новы запавет і псалмы” (надрукавана ў 1931 г. у Лодзі, аднак у выхадных звестках пазначаны Гельсінгфорс, дзе была рэзідэнцыя Брытанскага і замежнага біблейскага таварыства). Пераход А. Луцкевіча ў пратэстантызм А. Латышонак тлумачыць яго расчараваннем ва уніяцтве, якое разглядалася часткай заходнебеларускіх дзеячаў у якасці нацыянальнай рэлігіі беларусаў [581, с. 4].

У 1920-я гг. нязначная частка беларускай інтэлігенцыі разглядала пратэстантызм у якасці нацыянальнай альтэрнатывы “польскаму каталіцызму” і “рускаму праваслаўю”. У 1924 г. праз І. Ляўковіча (вядомы пад псеўданімам Г. Леўчык), які быў сакратаром амерыканскага камітэту метадыстаў у Варшаве, былі наладжаны кантакты царквы метадыстаў з беларускай інтэлігенцыяй у Вільні. У склад утворанага ў 1924 г. Віленскага амерыканскага камітэта ўваходзілі А. Уласаў, Б. Тарашкевіч, Я. Гаўрылік, А. Більдзюкевіч і іншыя дзеячы. Падобны камітэт існаваў у Радашковічах [937, с. 368]. У сакавіку 1926 г. І. Ляўковіч, А. Уласаў, Ф. Стацкевіч звярнуліся да Брытанскага і замежнага біблейскага таварыства з просьбай аб падтрымцы перакладу Бібліі на беларускую мову. Нягледзячы на ідэалагічную платформу Грамады, якая не дапускала падтрымкі палажэнняў рэлігійнага характару, частка яе кіраўнікоў належала да пратэстантаў ці іх прыхільнікаў, была звязана з метадыстамі [937, с. 369]. Такі незвычайны “саюз” неабходна тлумаць узаемнымі кан’юнктурнымі планамі. Метадысты былі зацікаўлены ў падтрымцы ўплывовай Грамады. А. Бергман на прыкладзе М. Бурсевіча паказала выкарыстанне дзейнасці метадыстаў для прыкрыцця легальнай грамадска-палітычнай дзейнасці грамадаўцаў [811, с. 249–259]. Такая заангажаванасць дзеячаў пратэстантызму выклікала рэпрэсіўныя дзеянні з боку польскіх уладаў.

Актыўнай грамадска-царкоўнай дзейнасцю займаўся шведскі місіянер Дж. Віт, які пераехаў з Рыгі ў Старое сяло Слонімскага павета. У ходзе паездак і сустрэч з беларускімі дзеячамі Дж. Віт цікавіўся станам

беларускага культурнага і адукацыйнага жыцця [937, с. 369]. Яму даводзілася займацца стварэннем школ, інтэрнатаў для беларускай моладзі ў Вільні, Радашковічах, Слоніме. Метадысты аказвалі матэрыяльную дапамогу Радашковіцкай і Клецкай беларускім гімназіям. Дж. Віт выказваў гатоўнасць заняцца атрыманнем дазволу на ўтрыманне беларускай гімназіі ў Клецку. 14 верасня 1929 г. пасля чарговага набажэнства святар Дж. Віт перадаў Клецкай гімназіі грошы для інтэрната [250, арк. 45; 251, арк. 117адв.]. Метадысты аказвалі падтрымку і БІГіК. Ажыўленае супрацоўніцтва Дж. Віта з беларускімі дзеячамі, яго дачыненне да грамадска-палітычнай і нацыянальна-культурнай дзейнасці не атрымалі адабрэння з боку кіраўніцтва Польскай царквы метадыстаў, таму ў 1931 г. яго прымусілі пакінуць Польшчу і выехаць у Швейцарыю. У 1932–1936 гг. пастар абшчыны метадыстаў у Дзярэчыне Слонімскага павета М. Пятроўскі атрымоўваў ад Польскай царквы метадыстаў невялікія фінансавыя сродкі, каб неафіцыйна друкаваць часопіс “Светач Хрыстовай навукі”.

Наогул, з боку хрысціянскіх цэркваў не было адназначнага стаўлення да пытанняў беларускай культуры, адукацыі, мовы, традыцый. Задавальняючы рэлігійныя патрэбы вернікаў, праваслаўная царква імкнулася захоўваць традыцыяналісцкі падыход у моўным пытанні, культывуючы рускую і царкоўнаславянскія мовы, аднак па меры ўзмацнення яе залежнасці ад польскіх свецкіх уладаў усё больш актыўна ўцягвалася ў дэрусіфікацыю і паланізацыю. Ва ўмовах наяўнасці фактычна дзяржаўнага статуса рымска-каталіцкі касцёл разам з акаталічваннем ажыццяўляў і паланізацыю беларусаў. Толькі намаганнямі нешматлікіх беларускіх каталіцкіх ксяндзоў, беларускай інтэлігенцыі рымска-каталіцкага веравызнання пашыраліся нацыянальныя і хрысціянска-дэмакратычныя каштоўнасці. Спробы адраджэння візантыйска-славянскага абраду каталіцтва (неауніі) не далі значных вынікаў. Толькі ў асобных уніяцкіх парафіях святары імкнуліся падтрымліваць беларускую грамадска-культурную дзейнасць. Менш выразнай была нацыянальная арыентацыя ў дзейнасці разнастайных пратэстанцкіх плыняў.

## 2.4. Мастацкія каштоўнасці ў сацыякультурнай прасторы беларусаў

Традыцыі беларускага тэатральнага жыцця ў Вільні былі пакладзены яшчэ ў пачатку XX ст. Ва ўмовах станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў 1917–1919 гг. тэатральнае мастацтва пачало выконваць важную ідэалагічную функцыю. Паводле М. Гарэцкага, творы беларускіх драматургаў павінны дапамагчы народу ў ацэнцы рэчаіснасці і далейшым

палітычным, духоўным вызначэнні, а тэатр стаць “храмам Адраджэння” [533]. На думку Л. Родзевіча, у такіх абставінах інтэлігенцыя павінна была настроіцца на стваральную працу ў галіне мастацкага жыцця: “не прасіць і не чакаць, браць і тварыць, тварыць вечнае, сусветнае, роднае, здаровае” [594]. Асаблівую актуальнасць праблема стварэння беларускага нацыянальнага тэатра ў Вільні набыла ў пачатку 1920-х гг. У канцы 1920 – пачатку 1921 г. Ф. Аляхновіч стварыў вандроўную тэатральную трупу і паказаў некалькі спектакляў на Віленшчыне. У Вільні ў лістападзе 1921 г. Л. Родзевіч, М. Красінскі, А. Канчэўскі арганізавалі музычна-драматычны гурток, дзейнасць якога пачалася з тэатральнай пастаноўкі “На папасе” Я. Купалы. Гурток неаднаразова паказваў гэты і іншыя беларускамоўныя сцэнічныя творы [955]. Арганізатары гуртка, да якіх далучыўся А. Міхалевіч, заснавалі ў 1922 г. Беларускую драматычную майстроўню. У склад гэтай аматарскай тэатральнай студыі, якая павінна была стаць базавай для заснавання прафесійнага беларускага тэатра, уваходзілі вучні і настаўнікі Віленскай беларускай гімназіі, студэнты, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Польская адміністрацыя перашкаджала дзейнасці студыі. Толькі ў пачатку 1924 г. Беларуская драматычная майстроўня дабілася легалізацыі ў якасці аднайменнага кааператыўнага таварыства працы. Заснавальнікі студыі былі нацэлены на інсцэніроўку беларускай і замежнай драматургіі, стварэнне перасоўнага тэатра для вясковага насельніцтва, падрыхтоўку кадраў акцёраў [828, арк. 3–5]. Сцэнічныя пастаноўкі Беларускай драматычнай майстроўні ўяўлялі сабой сінтэз драматургічных твораў, харавых выступленняў, танцаў, дэкламацый і іншых мастацкіх элементаў. Для творчай моладзі наладжваліся лекцыі па актуальнай тэматыцы беларускага тэатральнага і музычнага мастацтва. Сярод пастаўленых твораў вылучаліся “Раскіданае гняздо” Я. Купалы, “У зімовы вечар” Э. Ажэшкі, “Лес шуміць” У. Караленкі, “Апошняе спатканне” У. Галубка, а таксама вадэвілі Л. Родзевіча “Збянтэжаны Саўка”, “Пасланец”, “Конскі партрэт”, “Багаты і бедны”, драма “Пакрыўджаныя”. На сцэне ставіліся таксама творы Ф. Аляхновіча (быў запрошаны ставіць спектаклі ў студыі ў 1923 г., у пачатку 1924 г. быў выбраны дырэктарам Беларускай драматычнай майстроўні), у тым ліку напісаныя ім у першай палове 1920-х гг. п’есы “Заручыны Паўлінкі”, “Птушка шчасця”, камедыі “Шчаслівы муж”, “Пан Міністар”, драма “Дрыгва”. Ф. Аляхновічу належыць аўтарства кнігі “Беларускі тэатр” (1924 г.), дзе ў 6-і раздзелах зроблены агляд развіцця сцэнічнага мастацтва ад старажытнасці да 1920 г. З рознай ступенню паўнаты разгляду, яго самастойнасці закранаюцца пытанні пра вытокі тэатральнага мастацтва, каляндарную абраднасць, скамарохаў, батлейку, школьныя тэатры, беларускую драматургію XIX ст., станаўленне беларускага тэатра ў

пачатку XX ст. Ф. Аляховіч самакрытычна прызнаваўся, што рэпертуар беларускага тэатра ў пачатку 1920-х гг. заставаўся “яшчэ небагаты ў параўнанні з тым, што маюць народы са старэйшай культурай” [15, с. 113]. Манаграфічны нарыс Ф. Аляховіча, які лічыцца першым навуковым даследаваннем па гісторыі беларускага тэатра, з’яўляецца больш інфармацыйна-пазнавальным выданнем, якое пазбаўлена навуковай самастойнасці, насычана суб’ектыўнымі і тэндэнцыйнымі ацэнкамі аўтара [539, с. 53–54]. На наш погляд, заангажаванасцю Ф. Аляховіча ў паланафільскім руху трэба тлумачыць замоўчванне ім шэрагу з’яў і падзей гісторыі тэатраў (прыватнаўласніцкіх тэатраў XVIII ст. і інш.). Аднак дынамізм дзеяння, каларытныя характары герояў, выразнасць сцэнічнай мовы і іншыя адметныя рысы творчасці Ф. Аляховіча знайшлі яскравае адлюстраванне ў яго п’есе “Нясконачаная драма”, прэм’ера якой з поспехам адбылася 19 лютага 1922 г. у залі беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні [92, с. 227; 562]. Паводле М. Гарэцкага, п’еса Ф. Аляховіча “Нясконачаная драма” вельмі ўдала адлюстравала беларускі нацыянальны рух, з адкрытым паказам яго станоўчых і адмоўных бакоў [87, с. 363]. Такую ацэнку ён даў і п’есе Ф. Аляховіча “Пан Міністар”, хаця У. Няфёд справядліва лічыць твор палітызаваным, насычаным нацыяналістычнымі і русафобскімі праявамі [539, с. 53–54]. Матэрыяльныя цяжкасці, мэтанакіраваныя перашкоды з боку польскіх улад спрыялі заняпаду як музычна-драматычнага гуртка, так і Беларускай драматычнай майстроўні. На наш погляд, сярод прычын трэба таксама адзначыць наўмысныя статутныя абмежаванні гэтай аматарскай тэатральнай студыі, якая не магла прымаць у свой склад вучняў беларускіх пачатковых і сярэдніх школ [828, арк. 81]. Заняпаду Беларускай драматычнай майстроўні спрыяла і тое, што яе кіраўнікі актыўна ўключыліся ў грамадска-палітычнае жыццё, неаднаразова арыштоўваліся, многія былі вымушаны ў 1925 г. перайсці ў БССР.

Актыўнае супрацоўніцтва Ф. Аляховіча з Беларускай часовай радай не змагло станоўча паўплываць на стварэнне пастаяннага беларускага тэатра ў пачатку 1920-х гг. Паводле М. Гарэцкага, Ф. Аляховіч спадзяваўся на матэрыяльную падтрымку з боку паланафільскага лагеру [487, арк. 118]. Пацвярджэннем гэтага з’яўляецца тое, што пры дапамозе Беларускай часовай рады была надрукавана п’еса Ф. Аляховіча “Дрыгва” (1925 г.). Пытанне аб неабходнасці стварэння беларускага тэатра Ф. Аляховіч уздымаў на з’ездзе Беларускай часовай рады ў канцы чэрвеня 1926 г. У лісце ў абарону Ф. Аляховіча пасля яго арышту ў Мінску ў канцы 1926 г. М. Гарэцкі беспаспяхова імкнуўся дэзавуіраваць ранейшыя цесныя кантакты драматурга з польскімі ўладамі і паланафільскім лагерам. Паводле М. Гарэцкага, у п’есе “Нясконачаная

драма”, прысвечанай падзеям нямецкай акупацыі Вільні, ідэалізаваўся беларускі нацыянальны рух, а п’еса “Пан Міністар” была нацэлена супраць аднаго з кіраўнікоў таварыства “Прасвета” Т. Вернікоўскага, які быў там прадстаўлены “ў вельмі адмоўным і агідным выглядзе” [487, арк. 118].

Хоць тэатральны рух у першай палове 1920-х гг. разгортваўся пераважна ў Вільні, аднак тагачасныя дасягненні нацыянальнай драматургіі, інтарэс з боку грамадскасці да даступных сродкаў перадачы актуальных праблем стваралі перадумовы для пашырэння папулярнасці беларускага тэатральнага мастацтва. Сцэнічныя жанры мастацтва з іх непасрэдным уплывам на масавую аудыторыю адэкватна адказвалі на запатрабаванні часу [92, с. 224–225].

З сярэдзіны 1920-х гг. у тэатральным жыцці Заходняй Беларусі назіраліся супярэчлівыя тэндэнцыі. З аднаго боку, адбываліся крызісныя з’явы ў прафесійным тэатральным мастацтве, выкліканыя адсутнасцю кваліфікаваных кадраў мастацкай інтэлігенцыі, рэпертуарным голад, рэпрэсіямі польскіх улад, матэрыяльныя цяжкасцямі, шавіністычнай прапагандай польскіх палітычных сіл [91, с. 267]. З другога боку, масавы характар набывала народная тэатральная дзейнасць, якая было звязана з культуратворчай працай беларускіх грамадскіх, асветніцкіх і маладзёжных арганізацый – ТБШ, БІГіК, ТБА, БСС. Мастацкая тэатральная самадзейнасць вышла за межы інтэлігенцка-вучнёўскага асяроддзя Вільні і пашырылася па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Аматарскія спектаклі і канцэрты драматычных, харавых і музычных секцый гурткоў ТБШ карысталіся поспехам сярод заходнебеларускага сялянства, былі формай пратэсту супраць палітыкі паланізацыі. Рух мастацкай самадзейнасці стаў масавым у другой палове 1920-х гг., калі адбываўся дынамічны арганізацыйны рост ТБШ. Кіраўніцтва Таварыства імкнулася прыцягнуць нізавыя структуры да актыўнай папулярызацыі народных мастацкіх каштоўнасцей сярод мясцовага насельніцтва.

Створаныя пры гуртках ТБШ калектывы мастацкай самадзейнасці ставілі п’есы пераважна сацыяльнай тэматыкі як беларускіх, так і рускіх, украінскіх, польскіх драматургаў – “Паўлінка” і “Прымакі” Я. Купалы, “Модны шляхцюк” К. Каганца, “Збянтэжаны Саўка” Л. Родзевіча, “Мікітаў лапаць” М. Чарота і іншыя [498]. Пры адсутнасці памяшканняў для тэатральных пастановак нярэдка ўпрыгожваліся гаспадарчыя пабудовы [447, с. 25].

Найбольш адметныя самадзейныя калектывы мелі гурткі ТБШ у Старым Свержані Стаўбцоўскага павета, Вялікай Кракотцы Слонімскага павета, Нягневічах Навагрудскага павета, Шэнях Пружанскага павета, Вялікіх Грынках Ваўкавыскага павета і іншых населеных пунктах. Акрамя іх, высокай выканальніцкай культурай вызначаліся харавыя калектывы

гурткоў ТБШ у Вілейцы, Навагрудку, Заполлі Навагрудскага павета, Ярэмічах і Новым Свержані Стаўбцоўскага павета, Беластоку, Гарадку Беластоцкага павета [723]. Так, тэатральна-харавая секцыя гуртка ТБШ у Старым Свержані Стаўбцоўскага павета першыя п'есы "На вёсцы", "Стараста", выступленні хора на чале з М. Гарановічам прымеркавала да калядных святаў 1927 г. Другая вечарына секцыі ўтрымлівала народныя песні і п'есу "Птушка шчасця" Ф. Аляхновіча. Папулярнасць гэтых выступленняў пашырылася і ў навакольных мясцовасцях. Восенню 1928 г. беларуская, польская, яўрэйская грамадскасць Стаўбцоў прыхільна прыняла пастаноўку гурткоўцаў са Старога Свержаня. Потым было выступленне ў Новым Свержані. У рэгіянальным конкурсе хораў калектыў гуртка ТБШ у Старым Свержані быў прызнаны адным з лепшых. Да свята Сёмухі ў 1931 г. хор выканаў песні "Наш край", "Люблю наш край", "Не пагаснуць зоркі ў небе", "Дуда" і іншыя. Харавы калектыў неаднаразова выступаў у 1933 г. у Стаўбцах і Стаўбцоўскім павеце [476].

Пры гуртку ТБШ у в. Вялікая Кракотка Слонімскага павета і заснаванай ім бібліятэцы імя Я. Купалы (дзейнічала ў 1927–1929 гг., налічвала больш 1 тыс. кніг) былі створаны драматычны, харавы, музычныя самадзейныя калектывы (кіраўнікі – В. Трафімовіч, А. Жыткевіч). Драматычны гурток ставіў спектаклі "Раскіданае гняздо", "Прымакі", "На папасе", "Паўлінка" Я. Купалы, "Заручыны Паўлінкі" Ф. Аляхновіча, "Збянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча і іншыя п'есы беларускіх, украінскіх аўтараў. Пасля ліквідацыі гуртка ТБШ яго функцыі фактычна выконваў кааператыў "Дабрабыт", частка сродкаў якога ішла на набыццё літаратуры для бібліятэкі, на правядзенне культурна-асветніцкай работы. З узвядзеннем у 1930 г. народнага дома, дзе размясцілася бібліятэка-чытальня, глядзельная зала на 300 месцаў, кааператыў, культурна-асветніцкая і мастацка-самадзейная дзейнасць актывізавалася. Праз некалькі гадоў бібліятэка-чытальня была закрыта польскімі ўладамі, а кнігі былі канфіскаваны [709, с. 197–200]. Адной з апошніх тэатральных пастановак у в. Вялікая Кракотка была наладжаная 21 верасня 1936 г. п'еса Я. Купалы "Раскіданае гняздо" [386].

Пасля забароны гуртка ТБШ у в. Вострава Слонімскага павета ў 1929 г. на ахвяраванні мясцовага насельніцтва быў узведзены народны дом, які стаў цэнтрам мастацкай самадзейнасці – там дзейнічалі драматычны гурток і народны хор. Творчыя аб'яднанні паставілі каля 10 твораў, сярод якіх былі "Паўлінка", "Раскіданае гняздо" Я. Купалы, "Збянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча. Існуючая там бібліятэка-чытальня, якая налічвала больш 1 тыс. экзэмпляраў, была значным культурна-асветніцкім цэнтрам, аднак была закрыта польскімі ўладамі ў 1929 г. [670, с. 231–232]. Гурток ТБШ у мястэчку Азарніца Слонімскага павета толькі ў 1929 г. арганізаваў

18 спектакляў і вечарын. Тэатральная і харавая секцыі гуртка ТБШ у в. Вялікія Грынкі Ваўкавыскага павета, які быў заснаваны ў кастрычніку 1928 г., актыўна займаліся папулярызацыяй беларускай культуры і асветы. Там паказвалі гледачам п’есу “Пан Міністар”, камедыю “Шчаслівы муж” Ф. Аляхновіча, “Пасланец” Л. Родзевіча і іншыя пастаноўкі [627]. Актыўнасцю выдзяляўся тэатр і хор у в. Лявонавічы Нясвіжскага павета. Заснавальнік мясцовага самадзейнага тэатральнага калектыву С. Новік-Пяюн здолеў нават надрукаваць уласныя п’есы “Ёлка Дзеда Мароза”, “Пакой у наймы”, “Цудоўная ноч”. Гурток ТБШ у Беластоку на працягу 1927–1931 гг. паказваў 18 пастановак, сярод якіх былі “Модны шляхцюк”, “Збянтэжаны Саўка”, “Мядзведзі” і іншыя.

Паводле звестак Галоўнай управы ТБШ, толькі некаторыя гурткі да канца 1920-х гг. давалі больш 40–50 спектакляў штогод. Большасць гурткоў ТБШ абмяжоўваліся 3–5 пастаноўкамі, прыбытак якіх ішоў на набыццё літаратуры для бібліятэк-чытальняў і іншыя культурна-асветніцкія патрэбы [348]. Пасіўнасць многіх гурткоў ТБШ, члены якіх былі абцяжараны гаспадарчымі праблемамі, стрымлівала рух мастацкай самадзейнасці. Аднак найбольшую перашкоду складалі паліцэйска-адміністрацыйны ўціск, арышты кіраўнікоў творчых калектываў, цэнзурныя абмежаванні, рэвізіі і забароны пастановак [110; 120; 130]. Кіраўнік аддзела бяспекі Навагрудскага ваяводскага ўпраўлення ў сакрэтным лісце ад 12 лютага 1930 г. загадваў павятовым старастам ажыццяўляць цэнзуру ўсіх тэатральных прадстаўленняў і пры наяўнасці фактаў “антыдзяржаўнай дзейнасці” неадкладна іх забараняць [168, арк. 20]. Выклікана гэта было паступленнем інфармацыі аб тым, што нярэдка паказаныя персанажы тэатральных пастановак беларускай ці рускай класічнай драматургіі (царскія чыноўнікі) выклікалі ў публікі непажаданыя асацыяцыі з польскім адміністрацыйна-паліцэйскім апаратам.

Занепад дзейнасці ТБШ у першай палове 1930-х гг. прывёў да згортвання руху мастацкай самадзейнасці ў большасці паветаў. Толькі ў асобных паветах працягвалі дзейнічаць творчыя калектывы. Так, у праграме ўрачыстасцей, наладжаных 22 кастрычніка 1933 г. да 5-годдзя гуртка ў в. Вялікія Грынкі Ваўкавыскага павета, былі выступленні хора (кіраўнік – А. Сахарчук), які выканаў песні “Зязюленька”, “Дзе ты, хмелю, зімаваў”, “Ці свет, ці світае”, а таксама п’еса “Лекары і лекі”, пастаўленая драматычнай секцыяй гуртка. З-за вялікай прысутнасці публікі з навакольных вёсак і абмежаванасці памяшкання Р. Шырма, які прадстаўляў Галоўную ўправу ТБШ, вымушаны быў 2 разы прачытаць лекцыі “Літаратура і яе значэнне ў жыцці грамадства і адзінкі”, “Беларускія народныя песні” [475]. Самадзейны тэатральны калектыў у

в. Шэні Пружанскага павета на працягу 1930–1932 гг. паказваў 10 спектакляў. Прыбытак ад адной з пастановак – “Сурдут і сярмяга” – складаў 206 злотых, якія пайшлі на культурна-асветніцкія мэты [548, с. 83]. Аднак у лютым 1932 г. польскія ўлады забаранілі гуртку праводзіць аматарскія спектаклі [121].

Захады па актывізацыі тэатральнага руху рабілі і дзеячы БІГіК. У маі 1926 г. быў створаны Беларускі народны тэатр пад кіраўніцтвам П. Булгака. На працягу 1927–1928 гг. ён быў пераўтвораны ў Вандроўны беларускі народны тэатр пры Віленскім аддзеле БІГіК [456, с. 53–54] (адным з яго кіраўнікоў быў кампазітар П. Каруза, дырыжор хору БІГіК, збіральнік беларускага музычнага фальклору), а пасля яго забароны – у тэатральную секцыю Віленскага гуртка БІГіК (кіраўнік – П. Булгак) [696, арк. 5, 13]. На старонках газеты “Крыніца” у 1927 г. быў змешчаны цыкл публікацый па тэатразнаўстве С. Грынкевіча “Аб тэатры” (надрукаваны таксама асобным выданнем [98]). Толькі на працягу чэрвеня-верасня і лістапада 1927 г. Вандроўны беларускі народны тэатр паказаў 49 пастановак у Ашмянскім, Валожынскім, Баранавіцкім, Стаўбцоўскім, Пастаўскім, Свянцянскім, Браслаўскім, Дзісенскім, Вілейскім паветах [456, с. 56–57]. Сярод пастановак Вандроўнага беларускага народнага тэатра і тэатральнай секцыі БІГіК вылучаліся “Хам” Э. Ажэшкі, “Залёты” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Паўлінка” Я. Купалы, “Заручыны Паўлінкі”, “Пан Міністар” Ф. Аляхновіча, “Збянтэжаны Саўка” Л. Родзевіча і іншыя. У адрозненне ад гурткоў ТБШ, у мастацкай самадзейнасці структурных адзінак БІГіК пераважаў беларускамоўны рэпертуар нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, вострыя сацыяльныя праблемы не закраналіся. Польскія ўлады больш не дазволілі гастрольныя паездкі калектыва, а фінансавыя цяжкасці прывялі да заняпаду тэатральнай трупы і хору пры Віленскім аддзеле БІГіК [1048, с. 131–132]. Пасля гастроляў Вандроўнага беларускага народнага тэатра ў 1927 г. узніклі самадзейныя тэатральныя гурткі ў Ляхавічах Баранавіцкага павета, Жодзішках Вілейскага павета, Шутавічах Ашмянскага павета. Актыўнасцю выдзяляўся гурток БІГіК у Шутавічах, які толькі ў ліпені 1927 г. ажыццявіў 5 пастановак [346–347]. У 1929 г. на базе некалькіх гурткоў БІГіК у Ашмянскім павеце была заснавана Тэатральная аб’яздная трупа на чале з В. Шутовічам [468], якая паказвала беларускім сялянам “Залёты” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Апошняе спатканне” У. Галубка і іншыя творы. Кіраўнік трупы і яе ўдзельнікі падвяргаліся арыштам. Добрую рэпутацыю мелі хоры БІГіК пры цэнтральнай управе ў Вільні, у мястэчку Будслаў [723]. На працягу 1931–1934 гг. гурткі БІГіК арганізавалі не менш 275 пастановак у заходнебеларускіх паветах [456, с. 57–58]. Такім чынам, у адрозненне ад ТБШ, якое ў першай палове 1930-х гг. не змагло ўтрымаць ранейшыя

пазіцыі ў культурна-масавай рабоце, арганізацыйныя структуры БІГіК з’явіліся найбольш паслядоўнымі прадаўжальнікамі традыцый мастацкай самадзейнасці, хоць і на лакальным узроўні. Аднак з-за рэпрэсіўных дзеянняў польскіх улад самадзейныя пастаноўкі БІГіК, як і ТБШ, у сярэдзіне 1930-х гг. амаль спыніліся.

У першай палове 1930-х гг. спробы стварэння пастаяннага тэатра рабіліся і дзеячамі паланафільскага ТБА. Праз газету “Родны край” прапагандаваўся рух мастацкай самадзейнасці. Беларускае насельніцтва заклікалі ствараць народныя хоры, тэатры, праводзіць канцэрты. У снежні 1932 г. Ф. Акінчыц наладзіў у Стаўбцах урачыстасці з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа. На канцэрце хор выконваў песенныя творы беларускіх класікаў [596]. Створаная тэатральная трупа ТБА пад кіраўніцтвам А. Міхалевіча з-за матэрыяльных цяжкасцей праіснавала нядоўга.

Драматычная секцыя БСС да пачатку 1930-х гг. абмяжоўвала сваю дзейнасць толькі Вільняй. Нешматлікія спектаклі пільна кантраляваліся польскімі ўладамі. Так, БСС не атрымаў дазволу на арганізацыю 13 снежня 1925 г. тэатральнай пастаноўкі “Шчаслівы муж” Ф. Аляхновіча [529, арк. 3]. Яе ўдалося паказаць толькі 6 лютага 1926 г. [672]. Аднак паліцэйска-адміністрацыйныя меры не стрымалі актыўнасці студэнтаў-беларусаў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя. У канцы 1926 г. планавалася правесці 3 вечарыны, адна з якіх прызначалася для супрацоўнікаў народных дамоў ТБШ, дзе меркавалася паставіць п’есы “Паўлінка” і “На папасе” Я. Купалы [529, арк. 13–13адв.]. У снежні 1927 г. намаганнямі БСС былі паказаны п’еса “На вёсцы” Ф. Аляхновіча і камедыя “Мядзведзь” А. Чэхава [532, арк. 8]. У першай палове 1930-х гг. БСС наладжваў нешматлікія пастаноўкі і па-за межамі Вільні [530].

Частка беларускай студэнцкай моладзі ў Вільні ўвайшла ў хор працоўнай і студэнцкай моладзі (пазней – хор БСС), які па прапанове БСС быў створаны пры Віленскім універсітэце імя С. Баторыя Р. Шырмай летам 1931 г. З 1934 г. хор Р. Шырмы папулярызаваў беларускія народныя песні на віленскім радыё.

Цэнтрамі папулярызацыі беларускага тэатральнага і музычнага мастацтва ў міжваеннай Польшчы з’яўляліся беларускія гімназіі. Пры Нясвіжскай беларускай гімназіі дзейнічалі тэатральны гурток і хор, якія праводзілі беларускія вечарыны з тэатральнымі пастаноўкамі п’ес “Паўлінка” Я. Купалы, “Чорт і баба”, “Дзядзька Якуб” Ф. Аляхновіча, з выкананнем беларускіх народных песняў, дэкламацыяй вершаў. Паводле ацэнак Р. Шырмы, лепшыя гімназічныя хоры існавалі ў Віленскай, Навагрудскай, Радашковіцкай і Клецкай гімназіях [723]. У Віленскай беларускай гімназіі аматарскі тэатральны гурток паказваў “Паўлінку”

Я. Купалы, “Апошняе спатканне” У. Галубка і іншыя творы нацыянальнай драматургіі не толькі ў Вільні, але і ў іншых населеных пунктах Заходняй Беларусі [91, с. 268]. Створаны Р. Шырмай у 1926 г. хор складаўся з гімназістаў, навучэнцаў Віленскай праваслаўнай семінарыі. Хоць Р. Шырма ў 1927 г. быў звольнены з выкладчыцкай працы, але працягваў кіраваць хорам. Менавіта па яго ініцыятыве пачалі наладжвацца “Вечары славянскай песні”. Першы такі вечар, што адбыўся 17 чэрвеня 1928 г., паклаў пачатак творчаму супрацоўніцтву Р. Шырмы і К. Галкоўскага (Галкаўскаса) у справе аранжыроўкі беларускіх народных песень [447, с. 24]. Гэта дазволіла ўзбагаціць рэпертуар хора, надаць яго выступленням большую артыстычнасць [452, с. 9]. Аднак у 1928 г. Р. Шырма быў канчаткова звольнены з Віленскай беларускай гімназіі, а хор распушчаны [725, с. 317]. З пераўтварэннем беларускай гімназіі ў Вільні ў 1932 г. у філіял польскай гімназіі імя Ю. Славацкага там былі страчаны нацыянальныя харавыя традыцыі, перастаў існаваць тэатральны гурток.

Паводле некаторых звестак, на працягу 1928–1938 гг. К. Галкоўскі апрацаваў 54 песні для невялікага змешанага хору, 17 – для вялікага хору, 3 – для жаночага хору, а таксама напісаў 2 народныя сюіты – “Дуда”, “Каханне” [452, с. 10; 724, с. 88]. Менавіта К. Галкоўскі першым з музычных дзеячаў міжваеннай Польшчы напісаў музыку да вершаў Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, М. Танка. Праўда, не змог у 1930-я гг. атрымаць належнай падтрымкі з боку беларускіх арганізацый у стварэнні оперы паводле паэмы Я. Коласа “Сымон-музыка” [452, с. 12–13, 16]. Акрамя К. Галкоўскага, Р. Шырма таксама прыцягваў да справы апрацоўкі беларускай народнай песні А. Грачанінава, А. Кошыца, М. Гайваронскага, якія ажыццяўлялі харавую апрацоўку беларускай народнай песні на высокім прафесійным узроўні.

Акрамя Віленскай гімназіі, намаганнямі настаўнікаў разгортвалася мастацкая самадзейнасць і ў іншых беларускіх гімназіях. У Радашковіцкай гімназіі гурток вучнёўскай моладзі, драматычную і вакальна-музычную секцыі ўзначальваў пэўны час Я. Гаўрылік [695, арк. 84; 53, арк. 74адв.]. Выступленні вучнёўскага калектыва часта заканчвалася гімнамі “Ад веку мы спалі”, “Мы выйдзем шчыльнымі радамі”. Сярод пастановак драматычнай секцыі найбольшай папулярнасцю карысталіся п’есы “Збянтэжаны Саўка” Л. Родзевіча, “Страхі жыцця” Ф. Аляхновіча, “Паўлінка” Я. Купалы. З-за адсутнасці ўласнага памяшкання спектаклі і канцэрты праводзіліся ў вялікай прыватнай стадоле [17, с. 93].

Вялікую папулярнасць сярод мясцовага насельніцтва меў хор і аркестр Клецкай беларускай гімназіі пад кіраўніцтвам дырыжора і кампазітара А. Валынчыка. Пасля яго пераходу ў Навагрудскую беларускую гімназію там быў арганізаваны хор і аркестр, а існуючы музычна-харавы гурток

набыў якасна новы ўзровень [713, с. 41]. Даходы ад платных спектакляў вучняў Навагрудскай беларускай гімназіі ішлі на патрэбы навучальнай установы. У цэлым, рух мастацкай самадзейнасці ў беларускіх гімназіях аказваў пазітыўны ўплыў на культурнае жыццё мясцовага насельніцтва, актыўна прапагандаваў беларускае мастацтва і культуру. Аднак гімназічныя самадзейныя творчыя калектывы мелі часовы характар, што было звязана са зменай іх персанальнага складу і выхадам з яго выпускнікоў гімназій, з рухам настаўніцкага персаналу. Пасля закрыцця адукацыйных установ яны пераставалі існаваць.

Ва ўмовах захавання аграрна-патрыярхальнага ўкладу ў тагачасным заходнебеларускім грамадстве важнае значэнне набывала праблема вывучэння яго традыцыйнай музычнай і тэатральнай спадчыны. Пачынальнікам збору і апрацоўкі беларускага песеннага фальклору быў А. Грыневіч, які ў 1923 г. выдаў першы беларускі падручнік па музыцы “Навука спеву”, а ў 1928 г. – “Дзіцячы спеўнік” [646, с. 6]. Р. Шырма прадоўжыў традыцыю, прыцягнуўшы да збору фальклору студэнцкую моладзь. Выдадзеныя ім зборнікі “Беларускія народныя песні” (1929 г.), “Наша песня” (1938 г.) былі прызначаны для школьных і самадзейных хораў. Кампазітар Я. Тарасевіч збіраў народныя песні на Беласточчыне, першым звярнуўся да паэзіі М. Багдановіча [613; 922]. Музыку да папулярнага раманса М. Багдановіча “Зорка Венера” напісаў С. Рак-Міхайлоўскі. Яму прыпісваюць аўтарства дуэта-балады “Што за хлопец, што за дзяўчына?” [65]. А. Стаповіч, які выкладаў музыку ў школах і Віленскай беларускай гімназіі, кіраваў беларускім хорам пры касцёле св. Мікалая ў Вільні, змяшчаў сабраныя народныя песні на старонках заходнебеларускіх выданняў. Менавіта яму належыць аўтарства гімна БІГіК “Дзе чутны мовы нашай гукі”, музыкі да вершаў Я. Купалы, М. Машары, свайго брата Канстанціна (К. Сваяка) і іншых беларускіх паэтаў [94].

У сярэдзіне 1930-х гг. мастацкая самадзейнасць у межах заходнебеларускіх арганізацый фактычна спынілася. У Вільні ў серыі „Тэатральная бібліятэчка” было надрукавана некалькі зборнікаў і асобных сцэнічных твораў: “Цешча ў дом – усё ўверх дном” (1935 г.), “Лёкай на гадзіну” (1936 г.), “Сцэнічныя творы” Я. Коласа (1937 г.), “Абразкі жыцця” (1937 г.). Чарговую спробу стварыць стацыянарны беларускі прафесійны тэатр ажыццяўляў Ф. Аляхновіч, які ў выніку абмену вязнямі ў 1933 г. вярнуўся са сталінскіх лагераў у Вільню. Частка беларускай віленскай грамадскасці падтрымала яго ініцыятыву ў лютым 1935 г., аднак з-за фінансавых цяжкасцей і супраціўлення польскіх улад рэалізаваць гэта не ўдалося. Непрымірымыя адносіны заходнебеларускіх камуністаў да дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі стваралі дадатковыя

перашкоды для руху мастацкай самадзейнасці. Ад мясцовых актывістаў патрабавалася паўсюдна байкатаваць прасякнутыя “беларускім буржуазным нацыяналізмам” творы Ф. Аляхновіча, М. Машары [494, арк. 13].

Пасля забароны ў снежні 1936 г. ТБШ і БІГіК у асобных мясцовасцях рабіліся спробы ажывіць мастацкую самадзейнасць. На базе былога Віленскага гуртка БІГіК быў створаны музычна-драматычны гурток. На працягу 1937–1938 гг. зафіксавана дзейнасць адзінкавых самадзейных тэатральных калектываў былога БІГіК у населеных пуктах Баранавіцкага, Стаўбцоўскага паветаў, у 1939 г. – у Браслаўскім павеце (в. Новыя Казяняты) [350; 1; 351]. Зарэгістраванае ў лютым 1937 г. Аб’яднанне работнікаў беларускага тэатру “Полымя”, заснавальнікамі якога былі В. Лукашык, К. Сідарэвіч, планавала разгарнуць рух мастацкай самадзейнасці на тэрыторыі асобных паветаў Беластоцкага ваяводства. Выканаць свае статутныя задачы арганізацыя не змагла, бо грамадска-палітычны аддзел Беластоцкага ваяводства 14 ліпеня 1937 г. забараніў павятовым старастам выдаваць дазволы для яе тэатральных пастановак [167, арк. 1–2]. У такіх абставінах арганізацыя прыйшла ў заняпад. Наогул, назапашаны гурткамі ТБШ вопыт у правядзенні мастацкіх, культурна-масавых выступленняў (паводле няпоўных звестак, да пачатку 1939 г. на іх рахунку налічвалася каля 1,5 тыс. канцэртаў і спектакляў [723]) выкарыстоўваўся і пасля іх забароны. Неабходна адзначыць, што некаторыя польскія грамадскія арганізацыі ў канцы 1930-х гг. уключалі ў свой рэпертуар і беларускія тэатральныя пастаноўкі. Асобныя беларускія песні, якія гучалі ў час вясковых забаў ці сямейных урачыстасцей на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства, прызнаваліся польскай паліцыяй небяспечнымі, “падрыўнымі” [328, арк. 3–6].

Свой уклад у прапаганду беларускай народнай песні ўнёс спявак М. Забэйда-Суміцкі. Пасля вымушанай эміграцыі ў Кітай, вучобы ў Італіі, у 1935 г. ён пераехаў у Польшчу, дзе спачатку працаваў у оперным тэатры ў Познані, а потым – на радыё ў Варшаве. Як лірычны тэнар, М. Забэйда-Суміцкі займеў у Заходняй Беларусі шмат прыхільнікаў свайго таленту. Свой першы канцэрт у Вільні ён даў на вечары беларускай паэзіі і песні 15 сакавіка 1936 г. [56, арк. 14]. Другі яго канцэрт быў прымеркаваны да Дня беларускай культуры 13 снежня 1936 г. і суправаджаўся выступленнем хора БСС [685, арк. 23]. Акрамя станоўчай ацэнкі выступлення спевака, у мясцовым друку адзначалася таксама дасканаласць і густ у выбары праграмы хора БСС, які здолеў “паказаць свае артыстычныя дасягненні і незвычайнае багацце беларускай народнай музычнай творчасці” [57, арк. 2].

Нягледзячы на адміністрацыйныя перашкоды, у маі 1937 г. М. Забэйда-Суміцкі даваў 2 вялікія канцэрты ў Вільні [685, арк. 23]. Першы канцэрт меў велізарны поспех і прайшоў у перапоўненай залі Снядэцкіх Віленскага універсітэта імя С. Баторыя. Віленскі перыядычны друк адзначаў рэдкую прыгажосць голаса, добрую школу і высокую музычную культуру М. Забэйды-Суміцкага [58, арк. 2]. Польскія музыказнаўцы вылучалі ў спевака гарманічнае спалучэнне мілагучнага голаса і вялікай артыстычнай культуры, яго дасканалае адчуванне зместу і характару твораў, а ў заслугу Р. Шырме ставілі ўзгодненасць хора БСС, які "спяваў чыста, прыгожа, адценьваючы разнастайнай дынамікай і выразнай дыкцыяй" [400]. У 1938 г. прайшлі канцэрты М. Забэйды-Суміцкага ў шэрагу заходнебеларускіх гарадоў і мястэчак. Выступленні адбываліся пад кантролем польскай адміністрацыі. М. Забэйда-Суміцкі быў абмежаваны ў жанравых адносінах, яму даводзілася выконваць пераважна этнаграфічныя, бытавыя беларускія песні. Былі выпадкі выдалення з рэпертуару вельмі папулярных беларускіх народных песняў "Малады дубочак", "Лявоніха" [56, арк. 20]. На канцэрце ў Брэсце 30 красавіка 1938 г., арганізаваным мясцовым аддзяленнем Рускага дабрачыннага таварыства, М. Забэйда-Суміцкі выконваў пад акампанемент піяністкі Э. Волкавай італьянскія, польскія, рускія, беларускія песні. Нягледзячы на слабую рэкламу, наладжаны байкот з боку польскай і часткова рускай супольнасці, выступленне спевака прайшло даволі паспяхова [58, арк.3; 401]. Актыўная канцэртная дзейнасць М. Забэйды-Суміцкага непакоіла польскія органы бяспекі, якія адзначалі вялікую ўвагу беларускага насельніцтва да народнай песні, асабліва ў выкананні спевака [779, арк. 112]. Беларускі рэпертуар М. Забэйды-Суміцкага пастаянна папаўняўся пры дапамозе Р. Шырмы, К. Галкоўскага. Спявак меў кантакты з многімі дзеячамі музычнага мастацтва Польшчы. У 1939 г. да яго трапілі літоўскія песні ў апрацоўцы кампазітара Ш. Стасіса.

Выкананыя М. Забэйда-Суміцкім беларускія песні "Малады дубочак", "Лявоніха", "Чаму ж мне не пець, чаму не гудзець", "Ляціць сарока", "Конь бяжыць, зямля дрыжыць", "Рабіна-рабіначка", "Як памерла матулька" і іншыя ў апрацоўцы кампазітараў А. Туранкова, М. Красева, А. Грачанінава, К. Галкоўскага і С. Казуры былі ўключаны ў асобныя грампласцінкі [640, с. 10], якія карысталіся папулярнасцю ў заходнебеларускім грамадстве. Для праслухоўвання грампласцінак часта збіраліся цэлыя вёскі.

У канцы 1938 – пачатку 1939 г. польскія ўлады істотна абмежавалі канцэртную дзейнасць М. Забэйды-Суміцкага. Не атрымаўшы дазволу ад гарадскіх ўлад Вільні, усё-такі ўдалося наладзіць 10 снежня 1938 г. канцэрт у сценах Віленскага універсітэта імя С. Баторыя [56, арк. 18–20]. Паводле

водгукаў у прэсе, канцэрт прайшоў паспяхова, асабліва 2-я яго частка, у ходзе якой выконваліся беларускія песні. Сярод новых нумароў хора БСС выдзялялася кампазіцыя М. Гайваронскага “Спакойна дрэмле Нарач” на словы М. Танка [58, арк. 6]. Аднак чарговы канцэрт М. Забэйды-Суміцкага ў Вільні ў маі 1939 г. правесці не дазволілі. У адным з лістоў ён адзначаў, што сам “нічога зрабіць не можа” [56, арк. 21].

У 1920–30-я гг. Вільня заставалася асноўным цэнтрам выяўленчага мастацтва заходнебеларускіх зямель. Кадры мастакоў рыхтаваў асобны факультэт прыгожых мастацтваў адкрытага ў 1919 г. Віленскага універсітэта імя С. Баторыя. Нягледзячы на адсутнасць строгага падзелу на спецыялізацыі, факультэт прыгожых мастацтваў меў высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі калектыў. Пад кіраўніцтвам Ф. Рушчыца, які быў загадчыкам кафедры жывапісу, дэканам факультэта прыгожых мастацтваў, у Віленскім універсітэце імя С. Баторыя развіваўся стыль віленскага неакласіцызму. Хоць Ф. Рушчыц у 1919–1931 гг. займаўся пераважна педагагічнай дзейнасцю, аднак аказваў велізарны ўплыў на маладых мастакоў. Ф. Рушчыц займаўся рэканструкцыяй універсітэцкіх будынкаў і памяшканняў, сцэнічнымі дэкарацыямі, кніжнай графікай, арганізоўваў вечары-балі, якія набылі папулярнасць сярод віленскай інтэлігенцыі, аказваў дапамогу ў правядзенні ва універсітэце рэгіянальных выстаў народнай творчасці і мастацтва. На факультэце прыгожых мастацтваў працавалі таксама Л. Сляндзінскі, майстар прынцыпаў строгай формы і добрага малюнка, які выкладаў з 1925 г. мастацтва дэкарацыі, а ў 1932–1939 гг. быў дэканам факультэта прыгожых мастацтваў, А. Штурман і іншыя мастакі. Гісторыю архітэктуры выкладаў Ю. Клос, які быў дэканам факультэта, загадчыкам кафедры архітэктуры, з майстэрствам пластычнага мастацтва знаёміў загадчык кафедры скульптуры Б. Балзукевіч. Разам з класічнымі відамі мастацтва выкладаў тэхналогію фотамастацтва Я. Булгак, заснавальнік і старшыня Віленскага фотаклуба. У 1930-я гг. Я. Булгак прымаў удзел у рэдагаванні спецыялізаваных выданняў “Przegląd fotograficzny” („Фатаграфічны агляд”), “Fotograf Polski” (“Польскі фатограф”). Фатаграфіі Я. Булгака ўпрыгожвалі краязнаўчыя, турыстычныя даведнікі па Вільні Ю. Клоса, Е. Ромера [919; 1092]. Вялікая калекцыя яго краязнаўчых фотаздымкаў захоўвалася ў Таварыстве сяброў навукі ў Вільні. Тэорыю і практычную частку кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры студэнтам выкладаў галоўны рэстаўратар Віленскай акругі ў 1930-я гг. С. Лорэнц [1190, с. 15–49; 1074, с. 80, 83–85; 722, с. 34–36].

Сярод таленавітых выпускнікоў факультэта прыгожых мастацтваў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя былі беларускія мастакі П. Сергіевіч, М. Сеўрук, літоўскі скульптар Р. Яхімовіч і іншыя.

П. Сергіевіч, які вучыўся на факультэце з перапынкам з 1920 па 1928 гг., пазнаваў мастацкае майстэрства ў Ф. Рушчыца, а таксама ў вучня І. Рэпіна Б. Кубіцкага, які прытрымліваўся рацыяналістычнай манеры выканання. У Кракаўскай акадэміі мастацтваў (1924–1925 гг.) П. Сергіевіч вучыўся ў майстэрні мастака і графіка Ю. Панкевіча, які быў прыхільнікам імпрэсіянізму і постімпрэсіянізму. З-за фінансавых цяжкасцей тэрмін яго навучання абмежаваўся толькі адным навучальным годам [886, с. 200]. Пасля вяртання ў Вільню вучыўся ў Л. Сляндзінскага. З заходнееўрапейскай мастацкай спадчынай П. Сергіевіч меў магчымасць пазнаёміцца ў час творчай камандзіроўкі ў Італію. Падтрымліваў цесную сувязь з таленавітым скульптарам Р. Яхімовічам, які разам з іншымі прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі быў заснавальнікам Віленскага таварыства незалежных мастакоў, якое рэгулярна наладжвала з пачатку 1930-х гг. мастацкія выставы. На працягу 1932–1939 гг. П. Сергіевіч удзельнічаў ва ўсіх выставах гэтай творчай суполкі [49; 886, с. 203].

П. Сергіевіч стварыў у гістарычным жанры палотны “Усяслаў Полацкі” (1932 г.), “Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў” (1936 г.). Алегарычна-рамантычныя творы П. Сергіевіча набывалі ў заходнебеларускай рэчаіснасці беларускі патрыятычны характар. Яго палотны “Вясляр” (пачатак 1930-х гг.), “Юнацтва” (1937 г.) і іншыя выконвалі вялікае грамадскае і сацыяльнае значэнне [90, с. 298]. Не меншую сацыяльную значнасць мела яго палатно “Шляхам жыцця” (“Падарожныя”) (1934 г.). На першай персанальнай выставе П. Сергіевіча ў Вільні ў 1935 г. разам з яго гістарычнымі палотнамі выстаўляліся працы, прысвечаныя сялянскай працы і побыту – “Калыска” (1929 г.), “Залёты” (1930 г.), “Сялянскае падворышча” (1930 г.) і іншыя. Любоўю да сялян, паэтызацыяй народных звычаяў і традыцый прасякнуты яго працы “Перавозка будаўнічага грузу цераз возера Богін” (1926 г.), “За прасліцай” (1929 г.), “Жыццё” (1929 г.), “Вяселле на Беларусі” (1929 г.), “Каваль куе каня” (1939 г.), серыя партрэтаў “Беларускія народныя тыпы”.

П. Сергіевіч змяшчаў уласныя артыкулы па гісторыі і тэорыі мастацтва на старонках часопісаў “Нёман”, які сам рэдагаваў, “Калоссе” і іншых заходнебеларускіх выданняў. На яго думку, крыніцай для развіцця народнага мастацтва з’яўлялася заходнебеларуская вёска, з якой трэба было трымаць цесную сувязь [608, с. 43]. “Беларусы, што праходзяць навуку ў чужых школах усходняй ці то заходняй часткі нашага краю, – адно павінны памятаць, каб не парваць сувязі са сваім народам і той крыніцай, дзе б’е несвядомае яшчэ жыццё, але здаровае і незмеханізаванае цывілізацыяй” [607, с. 118]. Мастак рэкамендаваў не губляцца ў стылявых напрамках і арыентацыях усходняй ці заходняй школы, а пазнаваць беларусам саміх сябе. Гуманістычная творчасць П. Сергіевіча аддавала

пашану чалавеку працы, была "арганічна звязана з духоўным жыццём беларускага народа, з яго культурным развіццём і будаўніцтвам" [682, арк. 27]. Яна была заснавана на "глыбокай нацыянальнай аснове, у ёй тыпаж – гэта пераважна прадстаўнікі працоўнага сялянства і рабочага класа" [683, арк. 2]. У разуменні мастака, беларускае выяўленчае мастацтва павінна развівацца ў арганічнай сувязі з нацыянальнай гісторыяй, працоўным укладам, звычаямі і традыцыямі [445, с. 31].

Сярод кніжнай графікі П. Сергіевіча вылучаліся вокладкі часопіса "Нёман" (1932 г.), зборнікаў вершаў М. Машары "На сонечны бераг" (1934 г.), "Вяселле" (1934 г.), "На прадвесні" (1935 г.) і іншых выданняў. На заходнебеларускі перыяд прыходзяцца яго партрэты, якія прасякнуты глыбокім псіхалагізмам, вылучаюцца мастацкай завершанасцю: "Партрэт маці" (1929 г.), С. Глякоўскага (1938 г.) і іншыя. Яго партрэтны жывапіс вызначаўся някідкімі фарбамі, але характарызаваўся аўтарскай псіхалагічнай прасякнутасцю вобраза, пранікненнем у характар прадстаўленай асобы, што яскрава прасочваецца на прыкладзе партэтаў М. Машары (1937 г.), Р. Шырмы і іншых дзеячаў [90, с. 300–301]. Да твораў сакральнага жывапісу адносяцца зробленыя П. Сергіевічам роспісы Бернардзінскага касцёла ў Гродна, касцёлаў у Вільні, Жодзішках, Смаргоні, Поразава, Шарашове, іншых гарадах і мястэчках.

На творчасць выпускніка факультэта прыгожых мастацтваў (1932 г.) М. Сеўрука таксама адчувальны ўплыў аказалі Ф. Рушчыц, Л. Слядзінскі, А. Штурман. У 1929 г. была наладжана ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя персанальная выстава твораў студэнта М. Сеўрука. Гарманічнай завершанасцю вылучаліся яго пейзажы – "Бег" (1930 г.), "У полі" (1930 г.). Майстар рэалістычнага напрамку М. Сеўрук вылучаўся дасканалымі партрэтамі. Лепшыя традыцыі розных стылявых напрамкаў (класічнага мастацтва, імпрэсіянізму і іншых), узятыя мастаком у сваіх універсітэцкіх педагогаў, знайшлі адлюстраванне ў яго партрэтным жывапісе – Старая" (1929 г.), "Партрэт дзяўчыны ў профіль" (1930 г.), "Групавы партрэт" (1932 г.), які дапаўняўся вострым псіхалагізмам. Пасля сканчэння універсітэта М. Сеўрук працаваў у Вільні, быў сярод заснавальнікаў Віленскага таварыства незалежных мастакоў. Своеасаблівым гімнам чалавеку зямлі была яго кампазіцыя "Жніво" (1937 г.), прадстаўленая на выставе ў Варшаве, а потым набытая беларускім музеем у Вільні. Цэнтральным вобразам гэтай кампазіцыі стала беларуская мадонна. Паводле асобных ацэнак, гэты класічны мастацкі твор уяўляў сабой "квінтэсэнцыю тагачаснай беларускай эстэтыкі", а яго вобразы можна аднесці да беларускіх культурных архетыпаў [669].

У адрозненне ад П. Сергіевіча, М. Сеўрука, Я. Драздовіч не меў завершанай прафесійнай мастацкай адукацыі. У яго творчасці справядліва

вылучаецца як узровень прафесійнага мастацтва, так і праявы наіўна-самадзейнай творчасці. Па свайму сацыяльнаму статусу, адукацыі, творчых прынцыпах Я. Драздовіч быў тыповым прадстаўніком заходнебеларускай інтэлігенцыі, а яго творчасць сімвалізавала адпаведны этап у развіцці нацыянальнай культуры.

У пачатку 1920-х гг. Я. Драздовіч займаўся стварэннем беларускіх школ, а ў 1924–1926 гг. выкладаў маляванне ў польскай школе ў Глыбокім Дзісенскага павета. Мастак-інсітнік Я. Драздовіч унёс пэўны ўклад у справу ўдасканалення мастацкай падрыхтоўкі ў нешматлікіх беларускіх гімназіях. Выкладчыцкай працай яму даводзілася займацца ў Радашковіцкай беларускай гімназіі імя Ф. Скарыны. дзе была ў 1927 г. наладжана выстаўка яго палотнаў, а таксама прац вучняў [444, с. 133]. Менавіта напісаным спецыяльна для Радашковіцкай беларускай гімназіі і прадстаўленым на выставе партрэтам беларускага першадрукара Ф. Скарыны, пачыналася яго серыя карцін Скарыніяны. На гэтай выставе выстаўлялася таксама алегарычна-сімвалічнае палатно Я. Драздовіча “Дух цемры”, партрэты А. Бурбіса, Цёткі (А. Пашкевіч), Ф. Стацкевіча.

Пасля вяртання Я. Драздовіча ў Вільню там была наладжана восенню 1927 г. яшчэ адна выстава твораў гімназістаў. З арганізаванай Я. Драздовічам пры Віленскай беларускай гімназіі мастацкай студыі выйшлі жывапісцы Р. Семашкевіч, М. Васілеўскі, В. Сідаровіч і іншыя. Многія з навучэнцаў нелегальна перайшлі ў БССР, дзе працягвалі вучобу ў розных мастацкіх навучальных установах. У прыватнасці, Р. Семашкевіч вучыўся на скульптурным аддзяленні мастацкага тэхнікума ў Віцебску, на факультэце жывапісу Вышэйшага мастацка-тэхнічнага інстытута ў Маскве. У мінскі перыяд жыцця Р. Семашкевіч напісаў партрэты Я. Купалы, Я. Коласа і іншых прадстаўнікоў беларускай савецкай інтэлігенцыі. У час знаходжання ў Маскве прымаў удзел у мастацкіх выстаўках. Заходнебеларускай праблематыцы былі прысвечаны яго партрэты А. Грыневіча (дэманстраваўся на Усебеларускай мастацкай выставе 1925 г.), В. Таўлая, палотны “Паны забіраюць апошнюю карову”, “Самаволя паліцыянтаў”, “Бойка з секвестратарамі” і цэлы шэраг іншых твораў [90, с. 315–316; 546, с. 145–146].

На працягу 1927–1930 гг. Я. Драздовічу давялося выкладаць маляванне ў Навагрудскай беларускай гімназіі. Пры выдатным мастацкім таленце, павазе і любові з боку гурткоўцаў, Я. Драздовіч быў пасрэдным педагогам, бо “меры, якія ён прымаў пры парушэнні парадку і дысцыпліны, былі залішне мяккімі, недастатковымі” [713, с. 29]. Некаторыя настаўнікі праяўлялі да яго непрыхільныя адносіны [13, с. 530].

Палотны Я. Драздовіча гістарычнай тэматыкі вылучаліся рамантычнымі матывамі. Сімволіка-алегарычныя матывы даволі

распаўсюджаныя ў мастака. У карціне Я. Драздовіча “Пагоня Ярылы” (1921 г.) паэт К. Сваяк убачыў максімальна сканцэнтраванае сімвалічнае выяўленне беларускай душы. На думку паэта, ва ўмовах нацыянальна-культурнага адраджэння былі запатрабаваны якраз мастакі “вялікай ідэалогіі, якія абудзяць заспаную народную творчасць”, і творцам вобразаў абагуленай беларускай ідэалогіі яму бачыўся Я. Драздовіч [599, с. 16, 18]. Імкненне чалавека да шчасця, справядлівасці, асуджэнне рэгрэсу, адмоўных сіл прысутнічала ў яго сімвалічных працах “Пагоня” (1927 г.), “Дух зла” (1930 г.), “Дух цемры” (1932 г.) і іншых.

У пачатку 1920-х гг. Я. Драздовіч стварыў графічную серыю партрэтаў полацкіх князёў (“Рагвалод – дзед князёў полацкіх”, “Князь Усяслаў-Чарадзей”, “Князь Брачыслаў”, “Князь Барыс-каменакоў”), якія пры эстэтычным адзінстве вызначаліся тонкай псіхалагічнай індывідуальнасцю, адметнасцю старадаўняга адзення [458, с. 133]. Я. Драздовіч першым з заходнебеларускіх мастакоў закрануў вобраз полацкага князя Усяслава Брачыслававіча, якому прысвяціў некалькі прац – “Князь Усяслаў у порубе Кіеўскага князя” (1923 г.), “Князь Усяслаў пад Гародняй”, “Пярсцёнак Усяслава”, якія перадаў у чэрвені 1922 г. беларускаму музею ў Вільні [444, с. 82].

Народнасць займала выключнае месца ў творчасці Я. Драздовіча разам з праўдай жыцця, рэалізмам і іншымі творчымі прынцыпамі [731, с. 14]. У творах мастака панавала аб’ектыўнасць, дакладнасць. Адначасова мастацкая творчасць Я. Драздовіча вызначалася паглыбленым псіхалагізмам, рамантычным, сімвалічным і алегарычным адлюстраваннем жыцця.

Кніжная графіка Я. Драздовіча пачатку 1920-х гг. сведчыць аб уплыве на яго творчага аб’яднання мастакоў С.-Пецярбурга “Свет мастацтваў”. Сярод кніжнай графікі таго часу вылучаўся аформлены ім зборнік “Заходняя Беларусь” (1924 г.). У час знаходжання з 1933 г. на Дзісеншчыне Я. Драздовіч стварыў скульптурныя партрэты А. Грыневіча, М. Машары, Я. Пачопкі.

Сваімі карцінамі-цыкламі “Жыццё на Марсе”, “Жыццё на Сатурне”, “Жыццё на Месяцы” Я. Драздовіч паклаў пачатак касмічнай (касмалагічнай) тэме ў беларускім выяўленчым мастацтве. У гэтых творах Я. Драздовіча пераважалі матывы зямнога ландшафту, сваёй прыземленасцю яны адрозніваліся ад абстрагаваных ад рэчаіснасці прац літоўскага мастака М. Чурлёніса [444, с. 171; 90, с. 312; 730, с. 21]. Безумоўна, што мастацкае бачанне касмічнай прасторы ў Я. Драздовіча было наіўным (інсітным), непераканаўчым. Пры маральнай падтрымцы Я. Пачопкі Я. Драздовіч стварыў у першай палове 1930-х гг. шэраг новых прац касмічнай тэматыкі. У карціне “Артаполіс” (з лацінскай мовы –

“горад мастацтва”) мастак увасабляў мару аб будучыні, аб грамадскім ладзе са свабодай чалавечага духу, творчасці [730, с. 22; 668]. Творы Я. Драздовіча на касмічную тэму нельга разглядаць асобна ад выдадзенай ім навукова-папулярнай брашуры па астраноміі “Нябесныя бегі” (1931 г.), дасланай у АН БССР рукапіснай працы “Гармонія планет Сонечнай сістэмы” (1931–1932 гг.), рукапісу “Бяседы аб утварэнні свету. Небазнаўства” (1937–1938 гг.), з апісаннямі астральных падарожжаў на Месяц, Венеру, Марс і Сатурн.

Збіральніцкая дзейнасць займала значнае месца ў творчасці Я. Драздовіча. Летам 1926 г. па заданню БНТ мастак знаходзіўся ў творчай экспедыцыі ў Пінскім, Столінскім, Лунінецкім паветах, дзе замалёўваў помнікі драўлянага дойлідства, народныя строі, прылады сялянскага побыту, прадметы хатняга ўжытку [687]. Аб’ектам яго замалёвак была сакральная архітэктура малых форм – міжвулічныя крыжы, капліцы і іншыя помнікі [688, арк. 1]. Мастак таксама збіраў народныя песні і іншыя фальклорныя матэрыялы [689; 690, арк. 2]. Пасля вяртання з камандзіроўкі мастак праводзіў лекцыю ў Віленскай беларускай гімназіі, паказваў замалёўкі цэркваў, капліц і іншых помнікаў [444, с. 121]. “Палескі краявід” Я. Драздовіча быў уключаны ў сярэдзіне 1930-х гг. разам з іншымі малюнкамі ў буквары для хатняга навучання С. Паўловіча.

Акрамя Палесся, мастак у час вандровак вывучаў этнаграфію і фальклор Дзісеншчыны, Навагрудчыны. У час знаходжання ў Навагрудку Я. Драздовіч напісаў графічныя серыі – альбомы “Мірскі замак”, “Наваградак”, “Гальшанскі замак”, “Гальшанскае гарадзішча”, “Крэва”, “Трокскі замак”, якія з’яўляюцца шэдэўрамі краяўнаўча-этнаграфічнай графікі. У Мінск (Інстытут беларускай культуры, потым – Беларускую акадэмію навук) ім былі накіраваны ілюстрацыі да слоўнікавых матэрыялаў, некалькі альбомаў палескіх народных строяў драўлянага культавага дойлідства, графічных прац этнаграфічнага характару (“Драўлянае будаўніцтва Навагрудчыны і Піншчыны. Хаты”, “Гумны”, “Храмавае дойлідства Навагрудчыны і Дзісеншчыны”), калекцыя беларускіх народных песень (каля 200) і іншыя. Асобныя матэрыялы былі набыты ў яго беларускім музеем у Вільні [817–818]. Сярод шэрагу замалёвак захавалася яго прадстаўнічая група этнаграфічных малюнкаў (прылады працы, транспартныя сродкі, інтэр’ер жылля, народныя строі, заняткі і рамёствы і іншыя). У цэлым, створаныя Я. Драздовічам у другой палове 1920-х гг. графічныя серыі, прысвечаныя замкам, культавым помнікам, гарадзішчам – “Мір”, “Глыбокае”, “Навагрудак і навагрудцы”, “Крэва”, “Ліда”, “Гальшаны”, “Меднікі”, “Трокі”, вылучаліся высокім прафесійным узроўнем. Мастацкія роспісы народных тканін, дываноў, паясоў, зробленыя ў час вандровак Я. Драздовіча па Заходняй Беларусі і

падараваныя беларускаму музею ў Вільні, М. Танк называў рэдкім скарбам, "якому некалі і цаны не будзе" [654, с. 178].

З Вільняй звязана таксама творчасць Я. Горыда, П. Жынгеля, В. Пракаповіч, К. Чурыла і іншых мастакоў. Як і Я. Драздовіч, мастак Я. Горыд таксама не меў вышэйшай мастацкай адукацыі, хоць і наведваў у якасці вольнага слухача ў 1923–1925 гг. факультэт прыгожых мастацтваў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя, а потым непрацяглы час вучыўся ў Францыі. Вялікі ўплыў на станаўленне яго творчасці аказалі універсітэцкія педагогі Л. Слядзінскі, Е. Гопэн. Талент карыкатурыста Я. Горыда праявіўся на старонках прагрэсіўнага сатырычнага часопіса "Маланка" (1926–1928 гг.). Часопіс карыстаўся вялікай папулярнасцю ў заходнебеларускага насельніцтва, пра што сведчыць перапіска яго рэдакцыі з чытачамі [36–37]. Акцэнт на адлюстраванне вострых праблем сацыяльна-эканамічнага, грамадскага і культурнага жыцця заходнебеларускіх зямель паслужыў падставай для канфіскацый і забароны выдання ў 1928 г. Традыцыі "Маланкі" былі прадоўжаны ў часопісе "Асва", які выдаваўся ў 1934 г. студэнтам Віленскага універсітэта імя С. Баторыя П. Радзюком.

Хоць з-за незацікаўленасці польскіх улад у развіцці прамысловасці і транспарту ў заходнебеларускім краі стрымліваўся рост горадабудаўніцтва, але знешняе аблічча гарадоў і мястэчак змянялася. Разнастайныя новыя будынкі (пераважна ў стылі канструктывізму) сфарміравалі цэнтральную частку Гродна, моцна паўплывалі на планіроўку Брэста і іншых гарадоў. У 1924–1931 гг. у Баранавічах быў узведзены цагляны Пакроўскі сабор. Туды былі перавезены з варшаўскага сабора А. Неўскага, які ўзарвалі польскія ўлады, выкананыя яшчэ ў пачатку XX ст. у Пецярбургу мазаічныя пано па кардонах мастакоў В. Васняцова, М. Бруні, М. Кошалева, В. Думітрашкі. Новым метадам апрацоўкі дрэва, арыгінальнымі драўлянымі пабудовамі была адметная творчасць віленскага архітэктара Л. Вітан-Дубейкаўскага, які аднаўляў кляштар у Друі, праектаваў царкву ў Відзах і шмат іншых пабудоў у Вільні і на Віленшчыне. У тагачасных умовах пасведчанне на правядзенне будаўнічых работ неабходна было атрымліваць у МУС Польшчы [43, арк. 28]. 26 жніўня 1925 г. грамадскі камітэт пабудовы касцёла ў Дрысвятах Браслаўскага павета звяртаўся да Л. Вітан-Дубейкаўскага з просьбай аб аказанні дапамогі ва ўзвядзенні храма [44, арк. 87]. Пабудаваны паводле яго праекта драўляны Петрапаўлаўскі касцёл у Дрысвятах меў рысы стылю мадэрн. Сучасныя даследчыкі ў дойлідскай творчасці Л. Вітан-Дубейкаўскага вылучаюць асобны беларускі стыль [153].

Асіміляцыйны працэс не так выразна закрануў традыцыйную народную культуру беларусаў. Творы рамеснікаў з заходнебеларускіх вёсак і мястэчак часткова кампенсавалі недахоп прамысловых мастацкіх вырабаў – дэкаратыўных тканін, маляваных дываноў, мэблі і іншага. Шырокую вядомасць атрымалі нарачанска-дзісенскія маляваныя дываны з арнаментальна-расліннымі кампазіцыямі на чорным палатне. У Палескім ваяводстве былі пашыраны ганчарныя, ткацкія, гарбарна-аўчынныя і іншыя промыслы. Вырабы ганчароў з Гарадной, Пружан, Ружан, Пагоста-Загародскага і іншых мясцін задавальнялі патрэбу ў керамічным посудзе гаспадарчага і мастацкага прызначэння. З разнастайных па арнаменту, колеру, каларыту самаробных тканін шылася традыцыйнае сялянскае адзенне. У 1920-я гг. на Палессі пашырыўся вышывальны промысел, творы якога вывозілі на продаж за мяжу [427–428]. Пераважна патрыярхальна-натуральны ўклад побыту заходнебеларускіх сялян, нізкі ўзровень урбанізацыі, адсутнасць індустрыялізацыі ў многім перашкаджалі разбурэнню традыцыйнай культуры.

У цэлым, мастацкае жыццё заходнебеларускай вёскі, дзе жыла большасць беларускага насельніцтва, абмяжоўвалася пераважна самадзейнымі формамі музычна-тэатральнай дзейнасці ў межах культурна-асветніцкага руху. Гэта тлумачылася спецыфікай сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі. Менавіта агульнадаступнасць, дэмакратызм, нацыянальна-культурная арыентацыя надавалі папулярнасць самадзейным творчым калектывам. Аднак па меры ліквідацыі арганізацыйных структур заходнебеларускага руху былі страчаны магчымасці для народнай самадзейнасці, што негатыўна адбілася на характары грамадскага жыцця. У 1920–1930-я гг. у асяроддзі заходнебеларускіх сялян працягвалі захоўвацца этнакультурныя артэфакты, якія пазбеглі разбуральных асіміляцыйных уплываў. З-за нешматлікасці заможных слаёў беларускага грамадства, інтэлігенцыі элітарная мастацкая спадчына мела абмежаваны характар, аднак вылучалася высокім узроўнем выканальніцкай культуры, дастойным прадстаўленнем нацыянальнага кампаненту ў рэгіянальным і ўсходнееўрапейскім кантэксце, тэматычна-сюжэтнай і відавой арыгінальнасцю, адметнасцю.

# ГЛАВА 3. ПОЛЬСКАЯ КУЛЬТУРА Ў ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

## 3.1. Спецыфіка становішча польскай супольнасці

Хоць на тэрыторыі Заходняй Беларусі палякі не мелі большасці ў нацыянальным складзе насельніцтва, аднак яны займалі прывілеяванае становішча ў сацыяльнай структуры. У першую чаргу асобы польскай этнічнай прыналежнасці складалі абсалютную большасць паліцэйска-адміністрацыйнага апарату. Так, у студзені 1923 г. з 1 115 чыноўнікаў мясцовай адміністрацыі Віленскага, Навагрудскага, Палескага ваяводстваў 1081 дэкларавалі сябе палякамі. На думку кіруючых колаў, выключная польская прысутнасць у мясцовай адміністрацыі магла гарантаваць яе поўную лаяльнасць, забяспечыць паступальную паланізацыю мясцовага насельніцтва [1147, с. 248; 736, арк. 77]. Значная частка чыноўнікаў была прыслана з іншых рэгіёнаў Польшчы, не ведала мясцовых традыцый, мовы, нярэдка праяўляла да іх пагардлівыя адносіны. Бюракратычны стыль кіравання, хабарніцтва і іншыя заганы чыноўнікаў выклікалі незадаволенасць не толькі ў няпольскага насельніцтва, але нават у палякаў. Зрэдку прапагандавалася большая адкрытасць мясцовай адміністрацыі для насельніцтва. Так, у лютым 1926 г. на з’ездзе павятовых стараст палескі ваявода К. Младзяноўскі заяўляў аб неабходнасці ўстанаўлення паважлівых і даверлівых адносін мясцовага насельніцтва да Польскай дзяржавы, інакш будзе прайграна справа “ўсходніх крэсаў” [738, арк. 130]. Нягледзячы на абвешчаныя намеры, да карэннай перабудовы ўладных структур справа не дайшла. Для мясцовага селяніна польская адміністрацыя працягвала заставацца чужой [486, арк. 36–43]. Адмоўна адносіліся да чыноўнікаў нават “крэсовыя” палякі [704, с. 260]. Рэпрэсіўны характар улады з’яўляўся адным з галоўных фактараў, які фарміраваў негатыўныя адносіны беларускага насельніцтва да польскай дзяржаўнасці.

Аналіз статыстычных звестак сведчыць аб тым, што ў 1932 г. з 5 120 чыноўнікаў мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі і служачых органаў самакіравання Палескага ваяводства палякі складалі 88%, рускія – 5,8%, беларусы – 3,6%, яўрэі і ўкраінцы – па 1,3% [176, арк. 28]. У асобных паветах Палескага ваяводства польская прысутнасць сярод чыноўнікаў была дамінуючай. Панаванне палякаў сярод чыноўніцкіх кадраў назіралася і ў іншых ваяводствах. У 1930-я гг. узмацнялася тэндэнцыя поўнага выдалення няпольскіх прадстаўнікоў з дзяржаўнага апарату.

Палякі займалі прывілеяваныя пазіцыі ў арміі. У асабовым складзе польскай арміі беларусы не пераўзыходзілі 10%, аднак гэтыя лічбы прызнаюцца заніжанымі, бо беларусаў-католікаў лічылі пераважна

палякамі [97, с. 71]. Большая доля беларусаў у польскай арміі адзначана ў асобных сучасных польскіх выданнях [1046, с. 17].

Польскае армейскае камандаванне бачыла ў няпольскіх прадстаўніках ненадзейных вайскоўцаў, таму штучна абмяжоўвала іх прысутнасць у розных родах войск. Польская армія камплектавалася па экстэрытарыяльнай прыкмеце, таму заходнебеларускіх прызыўнікоў накіроўвалі служыць на тэрыторыю цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы. Аднак выкананне экстэрытарыяльнага прынцыпу камплектавання арміі ў поўным аб'ёме не забяспечвалася, таму частка мясцовых прызыўнікоў заставалася ў заходнебеларускіх землях. У пяхоце, кавалерыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў ўстаноўлены цэнз беларусаў ў 10%, у іншых родах войск – 20–25% [1185, с. 101–102]. У 1934 г. было прынята рашэнне аб устанаўленні нацыянальнага цэнзу ў вайсковых частках ва ўсходніх ваяводствах: у пяхоце і кавалерыі павінна быць ад 70 да 100% палякаў (для КАП – 80%), артылерыі – ад 70 да 90%, жандармерыі і сувязі – 100%, сапёрных падраздзяленнях – 70% [929, с. 107]. Павятовым вайсковым камендатурам Палескага, Навагрудскага, Беластоцкага ваяводстваў прадпісвалася камплектаваць свой склад толькі з прадстаўнікоў рымска-каталіцкага, грэка-каталіцкага ці праваслаўнага веравызнання шляхецкага паходжання. У 1938 г. у пяхоце, кавалерыі, артылерыі і сапёрных часцях КАП беларусы складалі 3% [1185, с. 103, 105].

У адрозненне ад салдацкага саставу, у афіцэрскім корпусе абсалютную большасць складалі палякі. У 1930 г. у польскай арміі было зафіксавана толькі 6 афіцэраў беларускага паходжання, што было выклікана найперш мэтанакіраванай палітыкай на паступовае выцісканне непалякаў [97, с. 95]. У 1936 г. міністэрства вайсковых спраў прыняло распараджэнне, паводле якога ў афіцэрскія і падафіцэрскія школы прымаліся толькі палякі [888, с. 141]. Для заходнебеларускіх жыхароў польскі афіцэр, як і чыноўнік, паліцэйскі, з'яўляўся "панам", правадніком дырэктыў польскага ўраду. Армія разглядалася ўрадавымі коламі як дзейсны інстытут ажыццяўлення нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва.

Акрамя чыноўнікаў, у гарадах жылі таксама прадстаўнікі польскай інтэлігенцыі, нешматлікія купцы, рамеснікі, рабочыя. Ідэі адраджэння Польскай дзяржавы актывізавалі грамадскую і палітычную актыўнасць інтэлігенцыі, большасць якой складалі палякі (75–80%) (на долю беларусаў, украінцаў і рускіх разам прыходзілася 6,6%) [651, с. 27; 867, с. 135; 1080, с. 315]. Аднак нельга пагадзіцца з тымі даследчыкамі, якія ролю польскай інтэлігенцыі адназначна ацэньваюць станоўча [405, с. 52]. Польскія кіруючыя колы на працягу ўсяго міжваеннага часу імкнуліся ўцягнуць інтэлігенцыю ў правядзенне палітыкі паланізацыі

заходнебеларускага насельніцтва. Прапагандысцкая машына падавала гэта ў якасці выканання пачэснай цывілізатарскай і культурнай місіі на ўсходзе. Іншая справа, што малалікая польская інтэлігенцыя не магла ўключыцца ў актыўную грамадскую працу. Таму невыпадкова ідэолагі рэжыму “санацыі” першачарговае значэнне для паспяховай паланізацыі надавалі выхаванню з мясцовага насельніцтва кадраў інтэлігенцыі, польскай па поглядах і культуры [884, с. 84]. Нават у такіх абставінах за палякамі было забяспечана пануючае становішча. Так, нацыянальны склад інтэлігенцыі Палескага ваяводства (па стану на 15 лютага 1932 г.) быў наступным – палякі складалі 75,5%, яўрэі – 9,8%, рускія – 9,5%, украінцы і беларусы – па 2,5% [176, арк. 23]. Для польскіх уладаў важнае значэнне набывала паланізацыя і акаталічванне гарадоў, пераўтварэнне іх у моцныя ачагі пашырэння польскай культуры, асветы.

У сацыяльнай структуры надзейнай апорай польскіх урадаў лічыліся памешчыкі. Менавіта таму ў параўнанні з цэнтральнымі і заходнімі ваяводствамі Польшчы замест 180 га норма землеўладання ў заходнебеларускіх землях павышалася да 400 га, а пры наяўнасці прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі – да 1 тыс. га [68, с. 26]. Інтарэсы польскіх землеўладальнікаў патрабавалі сацыяльна-эканамічнага ўмацавання памешчыцкіх гаспадарак. Паводле перапісу насельніцтва 1921 г., у Заходняй Беларусі сярод буйных землеўладальнікаў дамінавалі палякі – ім належала 84,4% гаспадарак. Гэты паказчык польскай прысутнасці сярод землеўладальнікаў быў вышэйшы, чым агульнапольскі (82%). Беларуская этнічная прыналежнасць адзначана ў 8,7% (485) землеўладальнікаў (у межах Польскай дзяржавы гэта складала ўсяго 2,5%). Амаль палова польскіх гаспадарак (46,4%) – гэта землеўладанні памерам ад 50 да 100 га (сярод гэтай катэгорыі гаспадарак беларусы мелі самы высокі ўласны паказчык – 12%, а па Палескаму ваяводству – нават 39,4%). Агульная доля беларусаў сярод буйных землеўладальнікаў складала ў Віленскім ваяводстве – 8,2%, Навагрудскім – 8,2%, Палескім – 17,9%. Прадстаўнікам іншых этнічных супольнасцей належала ў Заходняй Беларусі ў той час 6,9% буйных гаспадарак [621, с. 25, 191]. Па плошчы буйных землеўладанняў ў Заходняй Беларусі палякі таксама складалі большасць – 78,5%, беларусам належала 4,1%, іншым этнічным супольнасцям – 17,4%. Калі беларуская прысутнасць пры размеркаванні буйной зямельнай уласнасці не мела істотнай рэгіянальнай адметнасці, то польская вагалася – ад 68,3% у Палескім ваяводстве (27,1% належала там прадстаўнікам іншых этнічных супольнасцей, беларусам – толькі 4,6%) да 92,3% у Беластоцкім ваяводстве [621, с. 26]. У Палескім ваяводстве ў пачатку 1937 г. мелі менш 1 га зямлі больш 8,3 тыс. гаспадарак (каля 50 тыс. чалавек), 13 тыс. гаспадарак – 1–2 га (каля 80 тыс. чалавек), 2–5 га –

60 тыс. гаспадарак (245 тыс. чалавек), 6–50 га – 80 тыс. гаспадарак [202, арк. 318]. У свядомасці пераважна незаможнага няпольскага насельніцтва польскія памешчыкі выступалі як прыгнятальнікі і прадстаўнікі пануючай нацыі. Польскія ўлады не маглі дапусціць радыкальнай аграрнай рэформы, бо гэта прывяло б да ліквідацыі памесцяў, аплотаў польскага культурнага ўплыву. Буйныя землеўласнікі захоўвалі традыцыі былой шляхецкай арыстакратыі, адрозніваліся ад іншых сацыяльных слаёў матэрыяльнымі ўмовамі і ладам жыцця.

Дамінуючае становішча польскіх памешчыкаў захавалася і ў канцы 1930-х гг. У Палескім ваяводстве ў 1939 г. было 600 сем’яў польскіх памешчыкаў [1083, с. 13]. Аналіз асобных статыстычных матэрыялаў сведчыць аб тым, што ў 1939 г. доля палякаў сярод уладальнікаў гаспадарак плошчай 50–100 га асобных паветаў Віленскага ваяводства вагалася ад 66% у Браслаўскім павеце да 97,1% у Пастаўскім павеце. Беларуская прысутнасць была нязначнай – ад 0,2% у Маладзечанскім павеце да 3,6% у Дзісенскім [136, арк. 12–13].

Пазіцыі польскага землеўладання павінны былі ўмацавацца ў ходзе ажыццяўлення вайсковага асадніцтва. Да 1923 г. ва ўсходніх ваяводствах Польшчы 7 918 вайсковым каланістам былі перададзены і размеркаваны землі 785 маёнткаў агульнай плошчай 137 тыс. га (ворныя землі складалі 89,5 тыс. га) [915, с. 271]. Насаджэнне вайсковага асадніцтва, якое не змагло істотна змяніць нацыянальнай структуры, выклікала незадаволенасць з боку няпольскага насельніцтва, у вачах якога было сімвалічным прадстаўніцтвам польскай палітыкі. Варожае стаўленне мясцовага насельніцтва да асаднікаў прызнавала частка польскай палітычнай эліты, ліберальнай інтэлігенцыі. Ва ўмовах росту антыпольскіх і антыдзяржаўных настрояў вайсковае асадніцтва ставілася пад сумненне, у польскага грамадства не было адзінства адносна яго мэтазгоднасці [1128, с. 19–20]. Асаднікі павінны былі спрыяць асіміляцыі беларусаў, стрымліваць антыдзяржаўныя выступленні, з’яўляцца апорай мясцовай адміністрацыі (да гэтага заклікаў на з’ездзе старастаў 4–5 лістапада 1924 г. навагрудскі ваявода М. Жэгота-Янушайціс) [322, арк. 8–9].

У параўнанні з вайсковым асадніцтвам, цывільнае асадніцтва не насіла планавага характару. Пасля прыняцця закона аб аграрнай рэформе 28 снежня 1925 г. асаднікі страцілі ранейшыя правы, хоць і захоўвалі прывілеяванае становішча. Улічваючы тое, што насаджэнне польскага элементу, асіміляцыя мясцовага насельніцтва з’яўляліся адной з мэтаў каланізацыйнай палітыкі ў Заходняй Беларусі, аграрныя рэформы павінны былі аблегчыць інкарпарацыю гэтага рэгіёна ў склад Польшчы [101, с. 15]. Узаемаадносіны польскіх вайсковых і цывільных каланістаў з заходнебеларускімі сялянамі заставаліся складанымі і супярэчлівымі.

Нягледзячы на тое, што на асаднікаў ускладваліся сур'ёзныя ідэалагічныя задачы, польскія ўлады праяўлялі недастатковы клопат пра іх патрэбы [208, арк. 8].

Абсалютная большасць асад была заснавана яшчэ да 1926 г. – 7,2 тыс. асад з плошчай 130 тыс. га. У 1931 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі было больш 8 тыс. асаднікаў, з іх 2 630 – у Віленскім ваяводстве, 2 539 – у Палескім ваяводстве, 2 444 – у Навагрудскім ваяводстве [621, с. 162]. У 1935 г. дзейнічала каля 7,9 тыс. вайсковых асад на плошчы 143 тыс. га. Сярэдні памер вайсковай асады складаў 18 га [837, с. 46–48]. Пасля 1936 г. планавалася ўзнавіць асадніцтва ў большых памерах, аднак гэта не было рэалізавана. У 1937 г. ва ўсходніх ваяводствах колькасць вайсковых асаднікаў дасягнула 9–9,1 тыс. чалавек, а разам з цывільнымі – 16,6 тыс. чалавек. Амаль палова з іх прыходзілася на Валынскае ваяводства (41,5%), 21,7% – на Навагрудскае ваяводства, 13,3% – на Віленскае ваяводства, 12,6% – на Палескае ваяводства [1141, с. 102, 103, 243]. У 1939 г. у Віленскім ваяводстве налічвалася 1 112 вайсковых асад, якія валодалі 18 496 га зямлі (пераважна па 16 га) [136, арк. 11]. У Палескім ваяводстве ў 1939 г. было 4 тыс. сем'яў вайсковых і цывільных асаднікаў [1083, с. 13].

Пашырэнне асадніцтва запавольвалася аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі фактарамі. Да канца 1930-х гг. асаднікі не змаглі спаўна выканаць ускладзеную на іх ідэалагічную функцыю па ўзмацненню польскага ўплыву. Як адзначала ў 1939 г. Палескае ваяводскае ўпраўленне, асадніцтва не здолела ўстанавіць пастаянны і непасрэдны кантакт з мясцовымі сялянамі, не далучылася сур'ёзна да паскарэння працэсу паланізацыі Палесся [1083, с. 14].

За кошт асаднікаў ўмацоўвалася сялянска-серадняцкае польскае землеўладанне ў Заходняй Беларусі. У параўнанні з каланістамі-палякамі зямельныя надзелы беларускіх сялян выглядалі мізэрнымі. У 1939 г. у Віленскім ваяводстве 75,9% набытай у ходзе парцэляцыі зямлі дасталася палякам, 18,6% – беларусам, 1,8% – літоўцам, 0,9% – рускім, 0,5% – яўрэям. Сярэдні памер зямлі на 1 чалавека беларускай прыналежнасці (каля 4 га) адставаў ад памеру, які прыходзіўся для палякаў (6,8 га) [136, арк. 16]. Для прадстаўнікоў няпольскага насельніцтва на Палессі і ў іншых рэгіёнах былі ўведзены наўмысныя абмежаванні, забароны на набыццё зямлі. Так, на з'ездзе служачых сельскагаспадарчага апарату Палескага ваяводства 16 красавіка 1937 г. патрабавалася забараніць продаж зямлі праваслаўным. "Той, хто ўказвае ў дэкларацыі нацыянальнасць беларус, украінец ці яўрэй, не можа купіць зямлю" [202, арк. 303адв.]. Менавіта таму, як і ў адносінах да памешчыкаў, так і асабліва адносна асаднікаў адмоўныя сацыяльныя стэрэатыпы цесна дапаўняліся і перапляталіся з нацыянальнымі. Супярэчнасць інтарэсаў паміж памешчыкамі-палякамі і

сялянамі-беларусамі складала аснову класавага канфлікту, які пераважаў нацыянальныя антаганізмы. Гэты сацыяльны антаганізм рабіў немагчымым супрацоўніцтва польскіх памешчыкаў з беларускай супольнасцю. Безумоўна, што негатыўны стэрэатып “белапаляка”, “ляха-пана” складваўся таксама пад уздзеяннем іншых дзейсных фактараў, у тым ліку беларускага перыядычнага друку [416; 935].

У адрозненне ад сельскай мясцовасці, у гарадах і мястэчках эканамічныя пазіцыі належалі яўрэям. Напрыклад, у Палескім ваяводстве ў 1939 г. у прамысловасці яўрэйскіх уласнікаў было 59,6%, у гандлі – 70,9%, у рамястве – 76,1%. Польская прысутнасць там складала адпаведна 23,7%, 16,1% і 9,8%. Мясцовыя палешукі мелі таксама слабыя пазіцыі – адпаведна 15,7%, 12,7%, 13,9% [1083, с. 56]. З 24 229 аб’ектаў гарадской нерухомасці ў Палескім ваяводстве ў 1939 г. 16,3% належала палякам, 46,2% – яўрэям, 36,2% – “тутэйшым” [1083, с. 63]. Іншыя суадносіны былі ў Віленскім ваяводстве – ў 1939 г. палякі дамінавалі ў валоданні матэрыяльнымі каштоўнасцямі [136, арк. 7]. У цэлым, у грамадскай свядомасці няпольскага насельніцтва прывілеяваныя слаі грамадства амаль паўсюдна атаясамліваліся з палякамі, хаця ў асобных сферах грамадскага і асабліва гаспадарчага жыцця (у прамысловасці, гандлі, рамястве, вольных прафесіях і інш.) яны былі аўтсайдэрамі і значна ўступалі яўрэям.

Змястоўныя звесткі пра становішча польскай супольнасці на тэрыторыі Палескага ваяводства змяшчае асобны мемарандум палескага ваяводы Я. Крагельскага (жнівень 1932 г.) [176, арк. 1–39]. Планавалася павялічыць долю палякаў на працягу 10 гадоў найперш за кошт “вельмі пасіўнага элементу” (мясцовага няпольскага насельніцтва) у ходзе яго істотнай паланізацыі. Толькі 3,8% насельніцтва (гарадскія жыхары) з’яўляліся “польскім элементам добрай якасці”, хаця і адарваным ад народных мас. Палова вясковых палякаў прылічана да поўнасцю пасіўнага насельніцтва. Усяго актыўнага польскага элементу налічвалася толькі 4–5% [176, арк. 8]. Існуючае рассяленне нешматлікіх, распыленых груп каланістаў прызнавалася нерацыянальным. Новая хваля засялення асаднікамі звязвалася з ажыццяўленнем меліярацыі Палесся. Польскія памешчыкі, якія валодалі велізарнымі латыфундыямі (у Лунінецкім павеце іх уладанні складалі да 70% лясных плошчаў; у паўночнай частцы Брэсцкага павета, Кобрынскім, Пружанскім паветах памер зямельных уладанняў вагаўся ад 100 да 500 га), слаба ўдзельнічалі ў палітычным жыцці, абмяжоўваліся адстойваннем толькі прыватнаўласніцкіх інтарэсаў. Польскія купцы і рамеснікі былі нешматлікай, слабой групай у параўнанні з яўрэйскімі гандлярамі і рамеснікамі [176, арк. 12]. Нешматлікай і распыленай заставалася польская інтэлігенцыя. Слабаактыўнай прызнавалася засцянковая шляхта Пінскага, Столінскага і іншых паветаў, дзе “традыцыі

польскай шляхты яшчэ не загінулі і могуць паслужыць асновай для вяртання да польскасці” [176, арк. 13]. Вайсковыя асаднікі прызнаваліся “свядомым польскім элементам”, які прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, аднак з-за распыленасці, даволі малой колькасці і вельмі цяжкага матэрыяльнага становішча не адыгрываў сваёй функцыянальнай ролі [176, арк. 14].

Ацэнка становішча польскай супольнасці давалася ў другой палове 1930-х гг. пры распрацоўцы мясцовай адміністрацыяй, урадавымі коламі планаў па ўзмацненню польскага ўплыву. У лютым 1937 г. палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі выказваўся за разгортванне меліярацыйных работ, пашырэнне камасацыі, асабліва для засцянковай шляхты, паскарэнне перадачы памешчыцкіх маёнткаў дзяржаве для іх наступнай парцэляцыі [140, арк. 15]. “Палессе становіцца зручнай тэрыторыяй для гарадской каланізацыі. Сучасныя палескія гарады і мястэчкі заселены … пераважна яўрэйскім элементам, значным працэнтам рускіх і русіфікаваных палешукоў. Польскі элемент у гарадах і мястэчках – гэта амаль выключна чыноўнікі і дзяржаўныя служачыя” [140, арк. 19]. На адной з канферэнцый чыноўнікаў ваяводскіх упраўленняў і кіраўнікоў КАП 24 красавіка 1937 г. адзначалася, што асадніцтва не толькі спрыяла паланізацыі, але нават яе абцяжарвала, бо гаспадаркі асаднікаў – “гэта пераважна бедныя, ўбогія і нешматлюдныя асяродкі” [135, арк. 5адв.]. Летам 1937 г. навагрудскі ваявода А. Сакалоўскі прапаноўваў да канца 1938 г. паланізаваць 5 780 сем’яў былых шляхецкіх засценкаў, дзе ў побыце пераважала беларуская мова [199, арк. 36–47].

З уласнымі планамі ўмацавання пазіцыі польскай супольнасці выступалі і асобныя правыя партыі. Так, на з’ездзе Лагеру нацыянальнага аб’яднання (Obozu Zjednoczenia Narodowego) 19 красавіка 1938 г. быў прапанаваны шэраг мер па ўмацаванню сярэдняга саслоўя, ролі інтэлігенцыі ў павышэнні культуры насельніцтва ўсходніх ваяводстваў [201, арк. 3–11]. Заганнай была прызнана практыка падбору адміністрацыйных кадраў з “элементу, пераважна менш каштоўнага ў прафесійнай падрыхтоўцы, грамадскіх вартасцях”. “Гэты прышлы элемент даволі цяжка прыжыўся ў новым асяроддзі, не навязаўшы цесных сувязей з мясцовым насельніцтвам” [201, арк. 8адв.]. Эфектыўнасць палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі ставілася ў залежнасць ад наяўнасці адпаведных кадраў польскай інтэлігенцыі. “Кожны польскі інтэлігент на гэтых землях – гэта павелічэнне нашага нацыянальнага патэнцыялу, узмацненне таго элементу, які будзе праводзіць ва ўсходніх землях грамадскую працу” [201, арк. 9].

Важнае значэнне ў павелічэнні польскай прысутнасці ў нацыянальнай структуры заходнебеларускага насельніцтва надавалася ў разнастайных

планах каланізацыі, сутнасць якіх ужо разглядалася вышэй. Аднак цэлы шэраг аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў не даваў магчымасці для іх рэалізацыі. У тагачасных умовах асноўны рэзерв польскага ўплыву забяспечвала нацыянальна-культурная асіміляцыя, а не каланізацыя.

У цэлым, становішча палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час было супярэчлівым. З аднаго боку, у межах Польскай дзяржавы яны сталі пануючым народам, атрымалі прывілеяванае становішча ў вядучых сферах грамадскага жыцця. У адрозненне ад беларусаў і іншых этнічных супольнасцей палякі мелі асобны сацыяльны статус. Польскі этнас абавязваўся ажыццявіць на практыцы цывілізацыйную місію ў заходнебеларускіх землях. З другога боку, па колькасных і якасных параметрах палякі не атрымалі пераважнага становішча ў насельніцтве краю, займалі нязначныя пазіцыі ў асобных галінах гаспадаркі. Павелічэнне колькасці адбывалася не столькі праз каланізацыю, колькі шляхам правядзення мэтанакіраванай паланізацыі і асіміляцыі мясцовага няпольскага (пераважна беларускага) насельніцтва. Гэта набывала актуальнасць асабліва ў 1930-я гг., калі ва ўмовах разгортвання дэмаграфічных працэсаў не забяспечвалася колькасная перавага польскага элементу ў Заходняй Беларусі.

## 3.2. Польскае грамадска-культурнае жыццё

Працэс утварэння грамадскіх арганізацый пачаўся ў Польскай дзяржаве яшчэ ў 1918 – пачатку 1920-х гг. Розныя палітычныя лагеры меркавалі ўмацаваць свае пазіцыі не толькі праз партыйныя структуры, але і пры дапамозе падкантрольных ці ідэалагічна блізкіх грамадскіх аб’яднанняў. Яшчэ ў час савецка-польскай вайны сваю актыўнасць праявіла Таварыства стражы крэсовай (Towarzystwo straży kresowej), якое імкнулася да замацавання польскага ўплыву ў заходнебеларускіх землях. Таварыства стражы крэсовай у 1920 г. налічвала больш 35 тыс. чалавек (вайскоўцаў, каталіцкіх святароў і інш.). Падобныя мэты мелі Саюз палякаў “усходніх крэсаў”, Касцёр крэсовы і іншыя аналагічныя арганізацыі. Так, мэтай Польскага таварыства апекі над “крэсамі” з’яўлялася аказанне ўсялякай дапамогі польскаму насельніцтву [1132, с. 3; 149, арк. 36]. У такія арганізацыі маглі ўступіць толькі палякі-католікі, прадугледжваўся ўступны ўзнос.

Новыя перспектывы для разгортвання польскага грамадска-палітычнага і культурна-асветніцкага руху ў Заходняй Беларусі адкрываліся пасля Рыжскага мірнага дагавору. Пры дапамозе Таварыства стражы крэсовай на тэрыторыі Сярэдняй Літвы (склала аснову створанага ў 1923 г. Віленскага ваяводства) і часткі Навагрудскага ваяводства

ствараліся гурткі адной з арганізацый праўрадавай арыентацыі – Саюза вясковай моладзі (СВМ) (Związek młodzieży wiejskiej), якая выступала за "пашырэнне асветы і грамадзянскага ўсведамлення ў вёсцы" [772, арк. 173]. Восенню 1921 г. налічвалася 118 гурткоў СВМ (4 тыс. чалавек) [772, арк. 173]. Былі арганізаваны таксама 25 клубаў (святліц). Да сярэдзіны 20-х гг. гурткі СВМ дзейнічалі ў Віленскім, Ашмянскім, Лідскім, Вілейскім, Браслаўскім, Гродзенскім, Слонімскім, Бельскім і іншых паветах [771, арк. 100–101].

Аднак працэс станаўлення і развіцця польскіх арганізацый у Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гг. ішоў марудна. Па-першае, гэта было выклікана напружанай грамадска-палітычнай сітуацыяй у рэгіёне, а таксама разбуральнымі вынікамі Першай сусветнай і грамадзянскай войн. Па-другое, саперніцтва і ўзаемная барацьба польскіх партый у краіне перашкаджалі стварэнню масавых арганізацый. Па-трэцяе, у структуры насельніцтва Заходняй Беларусі польская прысутнасць была слабой. Нешматлікая польская інтэлігенцыя не змагла ўключыцца ў актыўную грамадскую працу. Як адзначала кіраўніцтва IX КАП, у пачатку 1920-х гг. на Палессі "польскі рух вельмі слабы, адчуваецца адсутнасць якога-небудзь патрыятызму, … захоўваецца апатычнасць, адсутнасць польскіх школ і якіх-небудзь таварыстваў" [244, арк. 22]. Камендант пастарунка паліцыі ў в. Гожа Гродзенскага павета ў пачатку 1922 г. адзначаў, што мясцовае польскае насельніцтва мела нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, не праяўляла цікаўнасці да грамадскай дзейнасці [280, арк. 23адв.]. У канцы 1922 г. улады фіксавалі слабыя пазіцыі польскай культуры і негатыўнае стаўленне да яе беларускага, рускага насельніцтва ў Ашмянскім павеце. "Адчуваецца адсутнасць польскіх бібліятэк і чытальняў, асветніцкіх гурткоў і кааператываў, асабліва ў гмінах Беніца і Смаргонь, дзе акрамя некалькіх пачатковых школ у галіне асветы нічога не зроблена" [366, арк. 14адв.–15]. У сваю чаргу ў Лідскім павеце мясцовае польскае насельніцтва праяўляла цікаўнасць да ўласнай культуры, імкнулася аказваць магчымую падтрымку [312, арк. 76]. Як сведчыць прыклад з в. Руда таго ж павета, часта палякамі прызнавалі толькі паводле прыналежнасці да рымска-каталіцкага веравызнання, яны мелі нізкі адукацыйны ўзровень, не адрозніваліся ні мовай, ні звычаямі ад беларусаў [313, арк. 31, 32].

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы працы, настойліва прапагандавала польскую культуру, мову Польска мацеж школьна (ПМШ) (Polska macierz szkolna). Хоць арганізацыя была створана яшчэ ў 1905 г., аднак толькі ў 1920–30-я гг. змагла сфарміраваць сваю структуру, выпрацаваць асноўныя формы і метады працы. Гэтая культурна-асветніцкая арганізацыя знаходзілася пад уплывам польскіх правых сіл (эндэкаў), рымска-

каталіцкага касцёла. Паводле статута, галоўнай мэтай ПМШ з’яўлялася “распаўсюджванне і падтрымка асветы ў хрысціянскім і нацыянальным духу” [1133, с. 3]. ПМШ мела права адкрываць і ўтрымліваць школы розных тыпаў, народныя чытальні, бібліятэкі, праводзіць курсы, лекцыі, гутаркі, выставы, канферэнцыі і іншыя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, выдаваць і распаўсюджваць вучэбную, навуковую і іншую літаратуру. Сярод важных задач ПМШ была пазашкольная асвета для “пашырэння агульных, грамадзянскіх і прафесійных ведаў, выхаванне характару і дзяржаўнага разумення” шляхам ліквідацыі непісьменнасці, малапісьменнасці не толькі моладзі, але і дарослага насельніцтва [1139, с. 54].

У дзейнасці ПМШ асобна вылучалася задача па пашырэнню і паглыбленню ўплыву польскай культуры ва ўсходніх ваяводствах Польшчы. На тэрыторыі Палескага і большай часткі Навагрудскага ваяводства ствараліся гурткі і ўправы ПМШ, падпарадкаваныя цэнтральнаму кіраўніцтву ў Варшаве. З 1924 г. у мясцовай структуры ПМШ з’явіліся ваяводскія ўправы [773, арк. 3–7]. Польскія ўлады прыхільна ставіліся да стварэння гурткоў ПМШ. Праз бібліятэкі, чытальні, школы, народныя дамы, лекцыі, курсы, святочныя мерапрыемствы не столькі задавальняліся культурныя і адукацыйныя патрэбы мясцовых палякаў, колькі праводзілася паланізацыя беларускага насельніцтва. Актыў гурткоў і ўпраў быў прадстаўлены настаўнікамі, чыноўнікамі, заможнымі сялянамі, асаднікамі. Неабходна адзначыць, што выніковасць работы гурткоў ПМШ заставалася нізкай.

Адна з самастойных рэгіянальных арганізацый ПМШ – Польска мацеж школьна ўсходніх зямель (Polska macierz szkolna ziem wschodnich) – дзейнічала на тэрыторыі Віленскага і часткі Навагрудскага ваяводстваў (Лідскі і Валожынскі паветы). Да 1925 г. колькасць яе гурткоў павялічылася да 56. Пры падтрымцы дзяржаўных школьных улад у 1926 г. таварыства ўтрымлівала 118 польскіх пачатковых школ (4 850 дзяцей) [945, с. 90–91, 87]. У гуртках ПМШ усходніх зямель выкарыстоўваліся як уласныя формы пазашкольнай асветы, так і прапанаваныя кіраўніцтвам арганізацыі з Варшавы [1138]. У створаных народных універсітэтах праводзіліся курсы для непісьменных ці малапісьменных дарослых. У 1925 г. было арганізавана 16 курсаў для дарослых, у 1926 г. – 69 (імі былі ахоплены 1 589 слухачоў) [945, с. 94]. Асноўны цяжар пазашкольнай асветы неслі бібліятэкі, чытальні. У цэлым, з-за нешматлікасці ПМШ у 1920-я гг. яе ўплыў у Заходняй Беларусі быў слабым.

Адной з галоўных задач створанага ў 1919 г. Стралецкага саюза (Związek strzelecki) з’яўлялася ваенная падрыхтоўка дапрызыўной моладзі. Хоць Стралецкі саюз лічыўся грамадска-палітычнай арганізацыяй, аднак

актыўна праводзіў культурна-асветніцкую работу па “выхаванню на крэсах усведамлення еднасці з усёй дзяржавай” [569, с. 178; 496, арк. 105–137]. Таварыства мела права праводзіць канферэнцыі, лекцыі, тэатральныя прадстаўленні, кінасеансы, экскурсіі, канцэрты, адкрываць і ўтрымліваць бібліятэкі, чытальні, курсы, займацца друкаваннем кніг, разавых і перыядычных выданняў і інш. [154, арк. 4; 362, арк. 5]. Адным са сродкаў выхавання моладзі было наведванне памятных гістарычных мясцін. Конныя атрады стральцоў (крокусы) наладжвалі паходы, вечары, урачыстыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да польскіх народных і дзяржаўных святаў [496, арк. 71]. Прысутнасць прадстаўнікоў няпольскага насельніцтва ў Стралецкім саюзе была нязначнай. З адабранай няпольскай моладзі большасць складалі беларусы-католікі, часткова праваслаўныя [493, арк. 83; 496, арк. 71].

З усталяваннем у Польшчы ў 1926 г. рэжыму “санацыі” пачалі складвацца новыя тэндэнцыі ў развіцці грамадскіх аб’яднанняў. Урадавыя структуры ініцыявалі больш актыўны ўдзел чыноўнікаў мясцовай адміністрацыі ў дзейнасці грамадскіх арганізацый. Ідэолагі лагеру пілсудчыкаў планавалі больш актыўна ўключаць грамадскія арганізацыі ў ажыццяўленне ўрадавай палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва [884, с. 84]. У першую чаргу польскія ўлады аказвалі ідэалагічную і фінансавую падтрымку арганізацыям праўрадавай арыентацыі. У жніўні 1932 г. палескі ваявода Я. Крагельскі ў асобным лісце ў МУС Польшчы сярод шэрагу праблем Палесся уздымаў і пытанне аб актывізацыі культурна-асветніцкай працы, асабліва з боку грамадскіх аб’яднанняў [176, арк. 20].

Аднак негатыўны ўплыў сусветнага эканамічнага крызісу сур’ёзна ўскладніў у канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. дзейнасць большасці (пераважна нешматлікіх) польскіх арганізацый. Так, вясной 1928 г. гурткі Стралецкага саюза ў Пінскім павеце не праявілі ніякай актыўнасці [154, арк. 46]. У 1929 г. гурток Стралецкага саюза ў Крынках Гродзенскага павета не мог заплаціць за арэндаванае памяшканне [281, арк. 23].

Хоць і непаслядоўна, аднак у пачатку 1930-х гг. адбывалася кансалідацыя таварыстваў асобных палітычных лагераў, аб’яднанне рэгіянальных структур арганізацый. Гэтаму садзейнічала таксама адпаведная заканадаўчая база [1087]. Дзяржаўная адміністрацыя ўзмацніла кантроль за дзейнасцю ўсіх грамадскіх арганізацый. Паводле выдадзенага ў ліпені 1933 г. распараджэння МУС Польшчы, акрамя штомесячных справаздач аб грамадска-палітычнай сітуацыі павятовыя старасты абавязваліся рыхтаваць асобныя штоквартальныя справаздачы аб грамадскіх арганізацыях [140, арк. 1].

Арганізацыі праўрадавай арыентацыі (Стралецкі саюз, СВМ) праводзілі культурна-масавую работу ў русле палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі [415, с. 16]. Польская армія кантралявала выхаваўчую працу ў Стралецкім саюзе. Стралецкі саюз арганізоўваў правядзенне ўрачыстасцей, прымеркаваных да дня нараджэння Ю. Пілсудскага, розных іншых акцый. Так, члены арганізацыі ў Пружанскім павеце прыцягваліся да добраўпарадкавання новай вуліцы імя Ю. Пілсудскага ў Пружанах (1933 г.) [177, арк. 41]. Стралецкі саюз кантактаваў з шэрагам арганізацый былых вайскоўцаў, аказваў уплыў на СВМ, аддзелы пажарнай аховы і іншыя арганізацыі [175, арк. 12адв.–13]. Аднак пазіцыя Стралецкага саюза ў многіх мясцовасцях Заходняй Беларусі выклікала адмоўнае стаўленне з боку каталіцкіх святароў, памешчыкаў [171, арк. 29; 161, арк. 46; 800, арк. 20; 799, арк. 20]. Аналіз статыстычных звестак сведчыць аб тым, што ў пачатку 1933 г. на тэрыторыі IX КАП у склад акруговай і павятовых упраў Стралецкага саюза ўваходзілі пераважна чыноўнікі мясцовай адміністрацыі (68,5%), настаўнікі (19%), прадстаўнікі вольных прафесій (12,5%) [139, арк. 7]. Перавага чыноўнікаў у кіраўніцтве структур Стралецкага саюза назіралася тады і на тэрыторыі Віленскай школьнай акругі [753, арк. 18–19]. Таварыства прыяцеляў Стралецкага саюза ў Гродна ўзначальваў начальнік акруговага корпуса генерал Літвіновіч [796, арк. 55адв.–56].

У новых абставінах Стралецкі саюз здолеў пераўтварыцца ў масавую маладзёжную арганізацыю, большасць якой складалі беларусы-каталікі, зрэдку праваслаўныя [493, арк. 83]. Аднак пры яе колькасным росце ў Польшчы (з больш 100 тыс. членаў (1932 г.) да 485 тыс. (1937 г.)), матэрыяльная база аддзелаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі заставалася слабой, фінансавае становішча ў значнай ступені залежала ад датацый Польскай дзяржавы і органаў мясцовага кіравання [361, арк. 34]. У Брэсцкай школьнай акрузе (Палескае, частка Беластоцкага ваяводства) прыкладна 20% клубаў (святліц) Стралецкага саюза не мелі ўласных памяшканняў, асобныя былі вымушаны размяшчацца ў будынках школ, якіх таксама не хапала. У 1932/1933 навуч. годзе на тэрыторыі Брэсцкай школьнай акругі самай шматлікай арганізацыяй быў Стралецкі саюз, які меў 543 аддзелы. У Палескім ваяводстве вылучаліся сваёй актыўнасцю аддзелы ў Столінскім (27), Лунінецкім (22) паветах. Пры гэтым каля 20% святліц не мелі ўласных памяшканняў, асобныя размяшчаліся ў будынках мясцовых школ. У Віленскім ваяводстве ў 1935 г. толькі 60% аддзелаў Стралецкага саюза мелі ўласныя клубы (святліцы), 30% выкарыстоўвалі для гэтых мэт школьныя будынкі [753, арк. 36–38]. Паводле справаздачы кіраўніцтва Стралецкага саюза ад 8 кастрычніка 1938 г., на тэрыторыі IX акругі (Брэст) цяжкае эканамічнае становішча і моцная камуністычная

агітацыя перашкаджалі дзейнасці арганізацыі, даводзілася абапірацца толькі на польскае сялянства і вайсковых асаднікаў. З-за матэрыяльнай незаможнасці вёскі крытычным прызнавалася становішча Стралецкага саюза на тэрыторыі III акругі (Гродна) [1058, с. 67]. Збліжэнне Стралецкага саюза з ваеннымі коламі, мілітарызаванымі грамадскімі арганізацыямі тлумачыцца рэакцыяй на негатыўныя адносіны да яго беларускага насельніцтва [1058, с. 65]. Як сведчаць справаздачы Стралецкага саюза за 1936–1939 гг., у заходнебеларускіх землях яго падтрымлівалі толькі вёскі, населеныя пераважна палякамі, вайсковыя асады. У 1939 г. у Віленскім ваяводстве налічвалася 254 аддзелы Стралецкага саюза, у якіх 82,2% складалі палякі, 15,7% пазначаны як тутэйшыя [136, арк. 42].

Разам са Стралецкім саюзам масавай грамадска-палітычнай арганізацыяй станавіўся СВМ. У канцы 1928 г. ў Палескім ваяводстве налічвалася 84 гурткі СВМ, а таксама 48 клубаў [1077, с. 12]. У Брэсцкім, Пінскім, Лунінецкім і шэрагу іншых паветах школьныя ўлады аказвалі мясцовым гурткам дапамогу праз настаўнікаў, інструктараў. Пасля правядзення ў 1930 г. рэарганізацыі СВМ у Палескім ваяводстве перад ім стаялі задачы “павышэння духоўнага і гаспадарчага ўзроўню, грамадзянскага пачуцця сваіх членаў, узбагачэнне культуры вёскі і Польшчы” [834, с. 3]. Да сярэдзіны 1930 г. колькасць зарэгістраваных гурткоў арганізацыі ў Палескім ваяводстве дасягнула 214 [158, арк. 192адв.–193адв.]. У 1932 г. у Віленскім ваяводстве дзейнічаў 181 гурток СВМ (2,1 тыс. чалавек), Навагрудскім ваяводстве – 338 гурткоў (10,2 тыс. чалавек) [158, арк. 192адв.–193адв.; 753, арк. 19–21]. Усяго ж СВМ у Польшчы налічваў у 1932 г. больш 38 тыс. чалавек [175, арк. 15]. Саюз вясковай моладзі “Віці”, які дзейнічаў з 1927 г. пасля аддзялення ад СВМ, часткова меў уплыў у Навагрудскім ваяводстве, а таксама ў цэнтральных польскіх ваяводствах. Ваенныя колы пагаджаліся аказваць новай арганізацыі матэрыяльную падтрымку пры ўмове кантролю за яе дзейнасцю [323, арк. 9].

Па ініцыятыве міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ў 1932 г. быў створаны Камітэт па справах вясковай моладзі. На ваяводскія і павятовыя структуры, што ствараліся ў Заходняй Беларусі, ускладваліся не толькі задачы па разгортванню культурна-асветніцкай работы, але і ідэалагічныя – займацца грамадзянскім выхаваннем, ваеннай падрыхтоўкай моладзі [1088, с. 74–75; 752, арк. 3]. Каардынацыя культурна-асветніцкай працы была ўскладзена на асветніцкіх інструктараў пры школьных інспекцыях, аддзелы школьных акруг. Праўда, у 1932/1933 навуч. годзе у Віленскай школьнай акрузе было ўсяго 11 інструктараў, у Брэсцкай акрузе – 12 [751, арк. 212]. Праводзіліся канферэнцыі для інструктараў асветніцкай працы, бібліятэкараў [753, арк. 4]. Дзейнасць

польскіх настаўнікаў, якія выконвалі асноўны аб'ём культурна-асветніцкай працы, асабліва на Палессі, прадстаўлялася як выкананне імі патрыятычнай місіі. У пазашкольнай працы ў Брэсцкай школьнай акрузе было занята прыкладна 90% настаўнікаў [907, с. 85].

Табліца 3.1 – Стан польскіх грамадска-культурных і асветніцкіх арганізацый на тэрыторыі Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў (1932 г.) (пазначаныя * не маюць звестак)

| Назва арганізацыі | Колькасць гурткоў (аддзелаў) | Колькасць клубаў (святліц) | Колькасць спектакляў |
|---|---|---|---|
| СВМ | 337 | 279 | 1 025 |
| Стралецкі саюз | 171 | 234 | 441 |
| Саюз польскай моладзі | 114 | 72 | 496 |
| Пажарная стража | 153 | 34 | * |
| Гурткі народнага тэатра | 41 | * | * |
| Польска мацеж школьна | 20 | * | 45 |
| Гурток вясковых гаспадынь | 18 | * | 31 |
| Саюз грамадзянскай працы жанчын | 15 | 7 | 33 |
| Саюз народнай моладзі | 12 | 6 | 33 |
| Федэрацыя клерыкальных саюзаў | * | 18 | * |
| Грамадскія клубы (святліцы) | * | 248 | * |
| Усяго | 881 | * | 2 447 |

Хоць эфектыўнасць культурна-асветніцкай і выхаваўчай работы СВМ была нізкай, аднак у клубах (святліцах), бібліятэках праводзілася сельскагаспадарчая асветніцкая работа (курсы, лекцыі), функцыянавалі самадзейныя тэатральныя, харавыя калектывы. Паводле некаторых звестак, у 1932 г. у Віленскім і Навагрудскім ваяводствах рознымі формамі культурна-асветніцкай работы СВМ было ахоплена каля 250 тыс. чалавек [384, с. 121–122]. Колькасныя паказчыкі аб праведзенай СВМ культурна-асветніцкай працы прадстаўлены ў табліцы 3.1 [75; 76; 77, с. 53]. У Палескім ваяводстве ў 1934 г. СВМ меў 85 бібліятэк, 93 святліцы, 132 тэатральныя і 45 харавых гурткоў [1112, с. 4–5]. Разам з пераважнымі польскамоўнымі прадстаўленнямі наладжваліся і польска-беларускія, беларускія ("Збянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча і іншыя) [22; 721, с. 19]. У многім такая пазіцыя была часовай і тлумачылася недастатковым веданнем польскай мовы беларускім вясковым насельніцтвам. Дзейнасць такіх тэатральных гурткоў часткова спрыяла папулярызацыі беларускага мастацтва [676, с. 62]. Аднак аматарскія пастаноўкі, танцы ставілі не ўсе гурткі СВМ [186, арк. 15]. СВМ супрацоўнічаў з іншымі праўрадавымі аб'яднаннямі, асабліва з Стралецкім саюзам. У маі 1933 г. у Палескім ваяводстве паміж імі была дасягнута адпаведная дамоўленасць [177,

арк. 83]. Сярод іх сумесных мерапрыемстваў у 1934 г. былі павятовыя і ваяводскія (палескія) дажынкі [182, арк. 52]. Неабходна адзначыць, што ў адрозненне ад Стралецкага саюза ў СВМ прымалі і няпольскую моладзь. Напрыклад, у пачатку 1935 г. у гуртках СВМ у Дзісенскім павеце беларусаў і палякаў было амаль пароўну – адпаведна 49% і 51%, а ў Пастаўскім – 53% і 47% (табліца 3.2 [187, арк. 76]). Аналіз статыстычных звестак сведчыць, што ў 1934 г. у Віленскім ваяводстве ўзнік 61 новы гурток СВМ (найбольш – у Ашмянскім, Дзісенскім і Браслаўскім паветах – ад 12 да 14), аднак з-за бяздзейнасці за аналагічны перыяд было закрыта 28 гурткоў (у Браслаўскім і Дзісенскім паветах) [187, арк. 76].

Табліца 3.2 – Нацыянальны склад гурткоў СВМ у Віленскім ваяводстве (па стану на студзень 1935 г.)

| паветы | Колькасць гурткоў | Чалавек | З іх | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | палякаў | беларусаў | літоўцаў |
| Браслаўскі | 48 | 602 | 582 | 20 | - |
| Дзісенскі | 42 | 555 | 282 | 273 | - |
| Маладзечанскі | 9 | 161 | 148 | 13 | - |
| Ашмянскі | 42 | 556 | 488 | 37 | 31 |
| Пастаўскі | 48 | 466 | 219 | 247 | - |
| Вілейскі | 22 | 218 | 172 | 46 | - |
| Свянцянскі | 70 | 711 | 614 | 97 | - |
| Віленска-Трокскі | 31 | 412 | 412 | - | - |
| Усяго ў Віленскім ваяводстве | 302 | 3 681 | 2 917 | 733 | 31 |

Сярод праўрадавых арганізацый быў і створаны ў 1928 г. Саюз грамадзянскай працы жанчын (Związek pracy obywatelskiej kobiet), асноўным партнёрам якога выступаў Стралецкі саюз. Гурткі гэтай арганізацыі наладжвалі лекцыі грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай тэматыкі, займаліся дабрачыннай дзейнасцю дзеля “выхавання жанчын добрымі грамадзянамі Польскай дзяржавы, прыцягнення іх да разнастайнай грамадскай працы” [915, с. 93]. Яны актыўна прапагандавалі здаровы лад жыцця, выступалі супраць п’янства, прастытуцыі. Аднак вялікага ўплыву на заходнебеларускае грамадства гэтая жаночая арганізацыя не аказала [753, арк. 36–38]. Хрысціянска-дэмакратычная ідэалогія была пакладзена ў аснову заснаванай яшчэ ў 1921 г. Нацыянальнай арганізацыі жанчын, якая выступала за “культурнае развіццё і ўздым эканамічнага стану ў краіне на дэмакратычных асновах” [152, арк. 42адв.]. У праграму асветніцкай дзейнасці гурткоў вясковых

гаспадынь (koła gospodyń wiejskich) уваходзілі лекцыі грамадска-палітычнай тэматыкі. Неабходна адзначыць, што жаночыя арганізацыі прымалі актыўны ўдзел у свецкім культурным жыцці – праводзілі музычныя канцэрты, танцавальныя вечары, выступленні самадзейных калектываў, арганізоўвалі экскурсіі.

З праўрадавых арганізацый больш вылучаліся грамадскія аб’яднанні польскіх каланістаў. Хоць створаны ў 1922 г. Цэнтральны саюз вайсковых асаднікаў (з 1925 г. – Цэнтральны саюз асаднікаў) з’яўляўся пераважна гаспадарчай арганізацыяй, аднак займаўся і пытаннямі асветы [1130, с. 4]. З пераўтварэннем яго ў 1929 г. у Саюз асаднікаў (Związek osadników) культурна-асветніцкі напрамак стаў адным з асноўных і ўключаў стварэнне асветніцкіх і гаспадарчых пляцовак, народных дамоў, школ, агульнаадукацыйных і прафесійных курсаў, бібліятэк, музеяў, правядзенне экскурсій, выстаў і іншых мерапрыемстваў [1135, с. 3–4]. Саюз асаднікаў налічваў у 1932 г. каля 50 павятовых аддзелаў і каля 800 гурткоў (ачагоў) [175, арк. 2адв.–4, 9]. У 1933 г. у ім было аб’яднана 17 тыс. вайсковых і цывільных асаднікаў [915, с. 276]. Для ажыццяўлення статутных задач у многіх гурткоў арганізацыі не было адпаведных сродкаў, што адбівалася на выніковасці іх працы. Так, гурток асаднікаў у Антопалі Пружанскага павета, які налічваў 30 чалавек, не меў уласнай бібліятэкі, пачатковай школы, на працягу 1933 г. з-за адсутнасці сродкаў не правёў ніводнага культурна-асветніцкага мерапрыемства [155, арк. 21].

Дзейнасць Саюза асаднікаў была накіравана на падтрымку палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі, узмацненне польскага ўплыву ў Заходняй Беларусі. У планах выхаваўчай работы гурткоў Саюза асаднікаў асобна вылучаліся мерапрыемствы па ўмацаванню культу Ю. Пілсудскага [188, арк. 5, 57]. Гурток, школа і сямейнае выхаванне прызнаваліся галоўнымі фактарамі выхаваўчай работы [188, арк. 5]. З сярэдзіны 1930-х гг. кожная гадавіна смерці Ю. Пілсудскага адзначалася жалобнымі ўрачыстасцямі, іх трэба было ўключаць у агульны план выхаваўчай работы гурткоў (ачагоў) асобным раздзелам [188, арк. 17адв.]. Гурткі павінны былі супрацоўнічаць з дзяржаўнай адміністрацыяй, іншымі грамадскімі арганізацыямі ў культурна-асветніцкім жыцці, у справе дзяржаўнай асіміляцыі мясцовага насельніцтва, актывізацыі польскага элементу і г. д. [188, арк. 18адв.–19]. Праграма хораў Саюза асаднікаў уключала творы, якія выконваліся пастаянна – дзяржаўны гімн Польшчы, “Першая брыгада”, жалобная песня ў сувязі са смерцю Ю. Пілсудскага, песні для асобных святаў – Дня незалежнасці 11 лістапада, спартыўных мерапрыемстваў і інш., народныя песні (“са спецыяльным разглядам рэгіянальных крэсовых песень”), песні вядомых польскіх аўтараў [188, арк. 57].

Важнымі цэнтрамі грамадска-культурнага жыцця асаднікаў былі іх народныя дамы, колькасць якіх узрасла з 48 (1933 г.) да 72 (1937 г.) [1141, с. 234]. Аднак большасць асад не была ахоплена дзейнасцю народных дамоў, якія размяшчаліся пераважна на Валыні. У 1930-я гг. ствараліся клубы (ачагі) для моладзі ў Брэсце, Гродна, Лідзе, Навагрудку, а таксама ў шэрагу гарадоў Заходняй Украіны [1097, с. 256]. Асноўным іх кантынгентам былі дзеці асаднікаў. Пры клубах (ачагах) ствараліся аркестры, харавыя калектывы. Члены гэтых клубаў прымалі актыўны ўдзел у фестывалях моладзі, якія праводзіліся штогод у Польшчы з 1935 г. Правядзеннем такога фестываля ў Брэсце ў 1938 г. займалася непасрэдна Палеская ваяводская рада Саюза асаднікаў. У праграме фестываля моладзі ў Гродна (май 1939 г.), у якім удзельнічала 1,4 тыс. чалавек, былі выступленні хораў, аркестраў, спартыўныя спаборніцтвы. Саюз асаднікаў уваходзіў у створаную пілсудчыкамі ў 1927 г. Федэрацыю польскіх саюзаў абароны Айчыны, куды было ўключана больш 20 розных грамадскіх аб’яднанняў былых польскіх вайскоўцаў. Гэтыя арганізацыі актыўна супрацоўнічалі ў культурна-асветніцкай працы са Стралецкім саюзам і іншымі праўрадавымі грамадскімі арганізацыямі. У цэлым, Саюз асаднікаў прымаў актыўны ўдзел як у культурным, так і грамадска-палітычным жыцці, што дае падставы не пагадзіцца з пазіцыяй польскіх аўтараў аб тым, што асаднікі праяўлялі апалітычнасць [1141, с. 221, 223].

У адрозненне ад Стралецкага саюза і СВМ, створанае ў межах Каталіцкай акцыі Таварыства польскай моладзі (ТПМ) (Stowarzyszenie młodzieży polskiej) рабіла акцэнт на рэлігійным выхаванні моладога пакалення рымска-каталіцкага веравызнання. У пачатку 1930-х гг. у 587 гуртках Віленскай, Беластоцкай і Лідскай акруг ТПМ было аб’яднана 11,5 тыс. чалавек, значную частку якіх складалі вясковыя католікі-беларусы Віленскага, Ашмянскага, Браслаўскага, Пастаўскага, Лідскага, Шчучынскага і іншых паветаў. ТПМ знаходзілася пад моцным уплывам правай польскай апазіцыі, атрымлівала маральную і матэрыяльную падтрымку з боку ксяндзоў і непасрэдна самога віленскага арцыбіскупа Р. Ялбжыкоўскага [753, арк. 17]. Паразумення паміж ТПМ і маладзёжнымі праўрадавымі арганізацыямі не было. Напрыклад, на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства паміж імі назіраліся канфліктныя адносіны, саперніцтва. Паліцэйскія ўлады фіксавалі негатыўную і нават варожую рэакцыю часткі рымска-каталіцкага кліру да Стралецкага саюза, які абвінавачваўся ў ігнараванні хрысціянскіх каштоўнасцей. У асобных паветах ксяндзы заклікалі выходзіць са складу Стралецкага саюза, супрацьдзейнічалі яму [207, арк. 252; 171, арк. 29; 161, арк. 46]. Толькі ў некаторых мясцовасцях назіраліся выпадкі супрацоўніцтва пры правядзенні культурна-асветніцкай работы. Кваліфікаваныя штатныя

інструктары ТПМ актыўна праводзілі рэлігійную і культурна-асветніцкую работу, накіраваную на паланізацыю і акаталічванне заходнебеларускай моладзі. Для гэтага выкарыстоўваліся прывабныя формы народнай самадзейнасці. У 1930 г. пры 270 клубах (святліцах) на тэрыторыі Віленскай рымска-каталіцкай архідыяцэзіі было 129 хораў, 32 музычна-драматычныя калектывы, 53 рэлігійна-асветніцкія гурткі ТПМ. На працягу таго ж года ў клубах было праведзена 495 лекцый, 1 867 пастановак. Актыўна распаўсюджвалася каталіцкая перыёдыка, асабліва выданне "Rycerz Niepokalanej", тыраж якога ў 1939 г. дасягнуў 800 тыс. экз. [1065, с. 243].

Умацаванне пазіцыі ваенных колаў ва ўрадавай палітыцы Польшчы з сярэдзіны 1930-х гг. паўплывала на агульныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага і культурна-асветніцкага жыцця ў краіне. У рамках агульнадзяржаўных кампаній па ўмацаванню абароназдольнасці Польшчы адбывалася ўзмацненне мілітарызацыі выхаваўчага працэсу навучэнцкай моладзі. Стралецкі саюз, СВМ усё больш уцягваліся ў правядзенне ваенна-прапагандысцкіх акцый. Так, на з'ездзе СВМ Палескага ваяводства, які адбыўся 19 чэрвеня 1939 г. у Брэсце, адна з прынятых рэзалюцый была прысвечана супрацоўніцтву с польскай арміяй [791, арк. 4]. Адначасова разгарнулася работа па стварэнню новай ваенізаванай арганізацыі – Саюза маладой вёскі (Związek młodej wsi). Яе з'езд у чэрвені 1937 г. засведчыў поўную адданасць пілсудчыкам, польскай арміі і асабіста маршалу Э. Рыдз-Сміглы [194, арк. 36]. Польскія ўлады пільна сачылі за паланізатарскай дзейнасцю гурткоў новага аб'яднання. Невыпадкова, што ў лютым 1938 г. у гуртку Саюза маладой вёскі ў Гавезна Нясвіжскага павета быў выяўлены "беларускі нацыяналізм" [203, арк. 12адв.]. Стралецкі саюз і Саюз маладой вёскі ўзаемадзейнічалі паміж сабой дзеля "падрыхтоўкі маладога пакалення да службы для ідэі вялікадзяржаўнага развіцця дзяржавы". Адпаведнае пагадненне аб супрацоўніцтве на тэрыторыі Палескага ваяводства было заключана ў канцы 1938 г. [200, арк. 3].

Ва ўмовах нявырашанасці пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця заходнебеларускіх зямель польскім кіруючым колам была выгаднай дзейнасць не толькі грамадска-палітычных, але і гаспадарчых, культурна-асветніцкіх, дабрачынных і іншых арганізацый. Пры непасрэдным удзеле ўрадавых ведамстваў у першай палове 1930-х гг. было створана некалькі новых грамадскіх арганізацый. Так, у 1933 г. па ініцыятыве міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы ўзнікла Таварыства падтрымкі будаўніцтва грамадскіх пачатковых школ (Towarzystwo popierania budowy publicznych szkół powszechnych), якое ў пачатку 1934 г. аб'яднала больш 22 тыс. чалавек (каля 1 тыс. гурткоў) [182, арк. 4адв.]. Таварыства развіцця

ўсходніх зямель (ТРУЗ) (Towarzystwo rozwoju ziem wschodnich), створанае ў 1933 г. пад патранажам пілсудчыкаў, разам з эканамічнымі ставіла перад сабой цэлы шэраг задач у сферы культурнага і асветніцкага жыцця: пашырэнне польскай культуры, абарона і ўздым рэгіянальных каштоўнасцей; правядзенне грамадскіх акцый, выхаваўчай, культурна-асветніцкай і навукова-даследчыцкай працы; задавальненне інтарэсаў чытачоў праз бібліятэкі, клубы (святліцы), чытальні; падтрымка фізічнага выхавання і турызму [915, с. 6; 775, арк. 2]. Летам 1934 г. у Варшаве былі арганізаваны курсы для студэнтаў ВНУ, якія паходзілі з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, а таксама для зацікаўленых асоб і патэнцыяльных каланістаў [775, арк. 17; 776]. У заходнебеларускіх землях былі заснаваны Віленска-Навагрудская і Палеская акругі, для арганізацыі мясцовай структуры якіх Галоўная ўправа дэлегавала адпаведна генерала Л. Жалігоўскага і пасла Э. Дунін-Маркевіча [182, арк. 87]. Пры актыўным удзеле мясцовых улад у нешматлікія гурткі аб’ядноўваліся пераважна польскія памешчыкі, чыноўнікі, прадстаўнікі інтэлігенцыі. Напрыклад, у склад управы гуртка ў Століне, які ўзначаліла І. Радзівіл, жонка ўладальніка Давыд-Гарадоцкай ардынацыі К. Радзівіла, уваходзілі стараста Г. Граф, памешчыкі Ц. Кеневіч, К. Алеша, У .Сянкевіч, дырэктар ашчаднай касы Ф. Сабоцкі, уладальнік друкарні С. Маторын і іншыя [775, арк. 20–21]. Быў створаны шэраг бібліятэк ТРУЗ – пры акруговай управе ў Вільні, павятовай управе Стралецкага саюза ў Маладзечна, камендатуры IX КАП, управе Стралецкага саюза ў Брэсце, чытальні для асаднікаў у Драгічыне, клубе (святліцы) у Століне, гуртку ў Пружанах, гміннай бібліятэцы ў в. Опса Браслаўскага павета і іншых месцах [775, арк. 11]. Нярэдка для дзяцей арганізоўваліся летнія лагеры адпачынку [109, арк. 71адв.–72]. Сумесна з Польскім бюро падарожжаў “Orbis” ТРУЗ займалася арганізацыяй летніх лагераў у маёнтках на Віленшчыне, наладжвала наведванне азёраў Нарач і Свіцязь, Навагрудка, Нясвіжа, Слоніма, Белавежскай пушчы.

У сярэдзіне 1930-х гг. палітычныя і ваенныя колы Польшчы інспіравалі рух засцянковай шляхты. У 1936 г. ТРУЗ стварыла асобны Камітэт па справах засцянковай шляхты, навуковая камісія якога праводзіла даследаванні, асабліва на Палессі. Р. Гарашкевіч у сваіх працах вылучаў 3 групы засцянковай шляхты: палескую (на тэрыторыі Пінскага, Лунінецкага, Столінскага паветаў), валынскую, прыкарпацкую [902–903]. Паводле яго ацэнак, да засцянковай шляхты належала да 600 тыс. чалавек [904, с. 171–174]. Армейскія спецыялісты налічвалі засцянковай шляхты ва ўсходніх ваяводствах да 800–880 тыс. чалавек (10% насельніцтва) [1058, с. 50; 373, с. 492], з іх у Палескім ваяводстве – 100 тыс. чалавек, у Віленскім і Навагрудскім ваяводствах – 250 тыс. чалавек [1203, с. 163].

Польскае ваеннае ведамства планавала шляхам паланізацыі вярнуць гэтай групе насельніцтва “нацыянальна-дзяржаўную веру”. Для правядзення культурна-асветніцкай працы з прызванымі ў армію прадстаўнікамі засцянковай шляхты была распрацавана асобная праграма курсаў [1203, с. 164]. Была створана асобная грамадская арганізацыя – Саюз засцянковай шляхты (Związek szlachty zaściankowej), якая імкнулася далучыць сваіх членаў да польскай культуры, замацаваць у іх польскую нацыянальную свядомасць. Да лютага 1939 г. агульная колькасць гурткоў засцянковай шляхты дасягнула 450 (41 тыс. чалавек) [1058, с. 52]. Пры падтрымцы польскіх улад арганізацыя наладзіла ўласную выдавецкую дзейнасць, стварыла сетку клубаў (святліц), бібліятэк. Сетка структурных адзінак Саюза засцянковай шляхты разгортвалася пераважна на Валыні і ў Галіцыі. Як ваенныя колы, так і цывільныя ўлады палічылі немэтазгодным і нават шкодным для польскіх інтарэсаў у Заходняй Беларусі разгортванне там арганізацыйнай структуры Саюза засцянковай шляхты, што магло выклікаць абвастрэнне міжнацыянальных адносін [1058, с. 50; 97, с. 88]. Аднак прадстаўнікі ІІІ КАП прымалі ўдзел у стварэнні гурткоў Саюза польскіх засценкаў у Гродзенскім, Ваўкавыскім, Шчучынскім, Лідскім паветах [1058, с. 49–51]. У Беластоцкім ваяводстве засцянковая шляхта не іграла важнай ролі, бо паводле ацэнак улад “стаяла на нізкім культурным узроўні, не была прыцягальным фактарам” [207, арк. 9]. Гаспадаркі засцянковай шляхты на Палессі былі нешматлікімі (каля 6 тыс. (прыкладна 27 тыс. чалавек) з 243 тыс. усіх гаспадарак), таму не змаглі стаць сур’ёзным патэнцыялам для разгортвання паланізацыі [202, арк. 302адв.].

У масавыя ваенізаваныя арганізацыі пераўтвараліся Ліга супрацьпаветранай і хімічнай абароны (Liga obrony powietrznej i przeciwgazowej), Марская і каланіяльная ліга (Liga morska i kolonialna). Ліга супрацьпаветранай і хімічнай абароны, якая дэкларавала сваю апалітычнасць, у 1932 г. мела ў Польшчы каля 7 тыс. гурткоў (больш 600 тыс. чалавек) [175, арк. 31]. Марская і каланіяльная ліга прапагандавала ідэю набыцця Польшчай заморскіх калоній. Штогод 28 чэрвеня наладжвалася Свята мора (Каланіяльныя дні). Актыўная прапаганда каланіяльнай ідэалогіі ў 1930-я гг. лагічна ўкладвалася ў кампанію дзяржаўных органаў Польшчы па мабілізацыі вялікадзяржаўных лозунгаў для інтарэсаў рэальнай палітыкі [436, с. 160]. Арганізацыя пашырала свой уплыў сярод навучэнцаў і вучнёўскай моладзі. Калі ў пачатку 1930-х гг. у складзе гэтай арганізацыі было каля 35 тыс. чалавек, то да 1934 г. яе рады дасягнулі 100 тыс. чалавек [175, арк. 2адв.–3адв.; 915, с. 89]. Хуткі рост аддзелаў Марской і каланіяльнай лігі назіраўся ў яго Палескай акрузе – з 18 (1934 г.) да 30 (больш 6 тыс. чалавек) (1936 г.) [175, арк. 31, 32адв.; 186, арк. 103; 915, с. 89].

Ва ўсіх заходнебеларускіх паветах актыўна ствараліся аддзелы Саюза пажарнай аховы (Związek straży pożarnych). У параўнанні з іншымі рэгіёнамі Польскай дзяржавы іх стварэнне на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гг. не выклікала зацікаўленасці з боку мясцовага насельніцтва. У 1925 г. у Віленскім ваяводстве было 50, Навагрудскім – 82, Палескім – 45 аддзелаў. Толькі з другой паловы 1920-х гг. пад націскам дзяржаўнай адміністрацыі пачалося стварэнне разгалінаванай ваяводскай і павятовай структуры пажарнай аховы: у 1930 г. у Палескім ваяводстве налічвалася ўжо 310 аддзелаў, Віленскім ваяводстве – 158 (1932 г.). Да 1934 г. ва ўсёй Польшчы колькасць аддзелаў перавысіла 11 тыс. (каля 500 тыс. чалавек) [915, с. 90]. Аддзелы Саюза пажарнай аховы арганізоўвалі тэатральныя прадстаўленні, розныя забавы [805, арк. 5]. Аддзелы пажарнай аховы ствараліся ў многіх мясцовасцях Заходняй Беларусі пасля забароны там гурткоў ТБШ. У Жарабковічах Баранавіцкага павета ў будынку пажарнай аховы часта наладжваліся гулянні моладзі, тэатральныя пастаноўкі, нярэдка паказвалі кіно [13, с. 90–91]. У кінатэатры “Strażak” („Пажарнік”) у Століне, калектыўным уладальнікам якога быў мясцовы аддзел пажарнай аховы, 2 разы на тыдзень паказвалі кіно [550, с. 147]. У цэлым, культурна-асветніцкая праца апалітычных аддзелаў пажарнай аховы разглядалася польскімі ўладамі як сродак адцягнення мясцовага насельніцтва ад уплыву “антыдзяржаўных арганізацый”.

У адрозненне ад грамадска-палітычных, ваенізаваных арганізацый, польскія культурна-асветніцкія аб’яднанні ў 1930-я гг. заставаліся нешматлікімі. Пытаннямі мастацкай самадзейнасці займаўся Саюз народных тэатраў і хораў (Związek teatrów i chorów ludowych). У 1930 г. была створана трэцяя (пасля Любліна і Познані) яго ўправа – у Брэсце, пры якой узніклі музычна-харавая і тэатральная групы. Акрамя ўправы ў Брэсце, у першай палове 1930-х гг. былі заснаваны 4 аддзелы таварыства ў Брэсцкім, Пінскім, Касаўскім паветах [158, арк. 85адв]. Палескі Саюз народных тэатраў і хораў ахапіў амаль палову настаўнікаў грамадскіх школ. Пры дапамозе Галоўнай управы ваеннай падрыхтоўкі на чыгунцы ў Брэсце быў утвораны аматарскі перасоўны тэатр “Przodownica” (“Перадавік”). Сярод яго асноўных задач былі вызначаны наступныя: штогод ставіць 20 пастановак этнаграфічнай і гістарычнай тэматыкі, класічнага рэпертуару, дзіцячых твораў, а таксама аказваць інструктарскія і кансультацыйныя паслугі адносна працы клубаў (святліц), самадзейных калектываў, праводзіць адпаведныя курсы. Прадстаўленні этнаграфічнага характару тэатра “Перадавік” (песні і танцы, у тым ліку палескія) карысталіся папулярнасцю. Толькі ў першай палове 1934 г. тэатр ажыццявіў больш за 300 пастановак. Рабіліся спробы набыць пастаянную сцэнічную пляцоўку ў Брэсце ці Пінску, аднак беспаспяхова [122, арк. 1, 7,

15; 124, арк. 12, 36, 47, 50; 125, арк. 26–28]. Палескі саюз народных тэатраў і хораў разам з іншымі грамадскімі арганізацыямі, органамі мясцовай улады арганізаваў у студзені 1938 г. у Брэсце грамадскі тэатр імя Ю. Нямцэвіча, дзе акцёрскія групы працавалі пад кіраўніцтвам рэжысёра У. Выганоўскага [123, арк. 1–2]. Сваю дзейнасць тэатр разгортваў не толькі ў Брэсце, але і на тэрыторыі Палескага, Беластоцкага і Люблінскага ваяводстваў [123, арк. 3–4]. Музычнае таварыства ў Брэсце было ініцыятарам адкрыцця ў горадзе прыватнай музычнай школы імя К. Шымaноўскага [154, арк. 6адв.–7адв.]. Оперна-канцэртная секцыя гэтага таварыства рэгулярна наладжвала музычныя вечары. Мясцовы хор, балетная трупа, аркестр выконвалі класічныя творы польскай і сусветнай класікі – “Галька”, “Страшны двор” С. Манюшкі, “Травіята” Д. Вэрдзі, “Яўген Анегін” П. Чайкоўскага. Перад мясцовай публікай выступалі таксама вядомыя дзеячы польскага мастацтва З. Пінінска, Б. Костшэўска і іншыя [913, с. 30–31; 914, с. 24]. Акрамя музычнай школы ў Брэсце, напярэдадні Другой сусветнай вайны ў заходнебеларускіх землях дзейнічалі яшчэ 3 – у Пінску (школа імя Г. Веняўскага), Навагрудку (музычны інстытут), Баранавічах (школа імя К. Шыманоўскага)(з 149 ва ўсёй Польшчы) [240, арк. 2–5адв.].

Часопіс “Wieczory świetlicowe” (“Вечары ў святліцы”), які выдаваўся з 1936 г. намаганнямі Палескага саюза народных тэатраў і хораў, стаў практычным дапаможнікам для правядзення культурна-асветніцкай працы. Школьныя ўлады аказвалі падтрымку выданню, тыраж якога ў 1937/1938 навуч. годзе складаў 10,2 тыс. экз. На старонках часопіса была прапанавана праграма вечароў для клубаў (святліц). Для выхавання прызыўной моладзі былі падрыхтаваны асобныя тэматычныя нумары з матэрыяламі 2-х “рыцарскіх” вечароў. У адным з нумароў (№ 7-8, 1937 г.) друкаваліся матэрыялы па ваеннай польскай гісторыі, вытрымкі з асобных літаратурных і гістарычных твораў аб вайсковай славе (урыўкі Ю. Крашэўскага, фрагмент “Хронікі” Я. Длугаша пра Грунвальдскую бітву 1410 г., урывак пра заканчэнне гэтай бітвы з рамана “Крыжакі” Г. Сянкевіча, рыцарскія песні (С. Манюшкі, народныя і інш.). У другім нумары (№ 9, 1939 г.) прыводзіліся прыклады гераізму польскага салдата ў час барацьбы за незалежнасць II Польскай рэспублікі.

З сярэдзіны 1930-х гг. пачалася праца Віленскага саюза народных тэатраў і хораў. Мэтай арганізацыі з’яўлялася прапаганда польскай культуры. Арганізацыяй народных тэатраў, хораў, аркестраў займаліся і іншыя польскія грамадскія арганізацыі. У 1934/1935 навуч. годзе на тэрыторыі Віленскай школьнай акругі было 206 пастаянных і 1125 часовых тэатральных калектываў, якія зладзілі 4 611 прадстаўленняў, а таксама 628 хораў. Найбольшая колькасць тэатральных (харавых) калектываў была

зафіксавана ў наступных паветах: Вілейскім і Маладзечанскім – 137 (60), Лідскім – 135 (61), Стаўбцоўскім і Нясвіжскім – 132 (62) [1205, с. 193]. Звесткі аб дзейнасці клубаў, калектываў мастацкай самадзейнасці ў Палескім ваяводстве ў 1930-я гг. прадстаўлены ў табліцы 3.3 [1083, с. 43].

Табліца 3.3 – Святліцы, народныя хоры, народныя тэатры Палескага ваяводства

| Навучальны год | Клубы (святліцы) | Народныя хоры | Народныя тэатры |
|---|---|---|---|
| 1932/1933 | 349 | 49 | 80 |
| 1936/1937 | 742 | 148 | 231 |
| 1937/1938 | 617 | 173 | 332 |

Польскамоўны рэпертуар самадзейных тэатральных калектываў быў дамінуючым. Так як беларускае насельніцтва недастаткова ведала польскую мову, то дапускалася ўключаць у рэпертур такія беларускамоўныя творы, як “Паўлінка” Я. Купалы, “Птушка шчасця”, “Дрыгва”, “Няскончаная драма”, “Дзядзька Якуб”, “На вёсцы” Ф. Аляхновіча, “Атрута” М. Гарэцкага, “Модны шляхцюк” К. Каганца, “Пашыліся ў дурні” М. Крапіўніцкага і іншыя [1205, с. 200]. Аднак нельга сцвярджаць пра пазітыўнае стаўленне да беларускай культуры і мовы, бо ў красавіку 1936 г. школьныя ўлады падтрымалі стварэнне Саюза народных тэатраў і хораў як найбольш удалую арганізацыйную форму для пашырэння польскай мовы ў паўсядзённым жыцці [241, арк. 17]. Усяго ў 1937 г. у Польшчы існавалі 18 176 самадзейных тэатральных гурткоў, студый, якія былі створаны намаганнямі розных устаноў, грамадскіх арганізацый, з іх 1984 – у заходнебеларускім краі. З існуючых у Польшчы ў 1936 г. 103 прафесійных тэатраў большасць складалі польскія (67). Акрамя стацыянарных, дзейнічалі і перасоўныя тэатральныя трупы (асабліва ў 1930-я гг.) (56 з 103) [1024, с. 338, 346]. У заходнебеларускіх землях атрымалі вядомасць польскія тэатры ў Вільні (Вялікі тэатр на Пагулянцы, тэатр імя У. Сыракомлі, перасоўныя тэатры “Рохі”, пад кіраўніцтвам Будзінскага), ў Гродна (гарадскі тэатр і створаны пры ім перасоўны тэатр). Аснову іх рэпертуару складалі творы польскіх аўтараў. Галоўнай функцыяй гэтых устаноў з’яўлялася пашырэнне польскай культуры. У Вільні дзейнічалі таксама прыватная кансерваторыя імя М. Карловіча, школа арганістаў В. Монтвіла, музычная школа Я. Ваяводскай. Неабходна адзначыць, што Саюз аўтараў і сцэнічных кампазітараў “Zaiks” (Варшава) неаднаразова звяртаў увагу цэнтральных і мясцовых польскіх улад на парушэнне закона аб аўтарскім праве ад 29 сакавіка 1926 г. [327, арк. 5, 8–9]. Нельга пагадзіцца са сцвярджэннямі аб тым, што польскія тэатры з’яўляліся канкурэнтназдольнымі ў параўнанні з тэатрамі іншых этнічных супольнасцей [676, с. 61]. Аналіз дзейнасці польскіх тэатраў у Заходняй Беларусі сведчыць аб тым, што

нягледзячы на пэўныя поспехі ў папулярызацыі польскай і сусветнай тэатральнай, музычнай спадчыны, усё-такі недахоп польскай публікі, ігнараванне нацыянальна-культурных інтарэсаў беларускага і іншага няпольскага насельніцтва, фінансавыя цяжкасці перашкаджалі іх нармальнаму функцыянаванню.

Неабходна адзначыць, што асноўная польская культурна-асветніцкая праца ў заходнебеларускіх землях адбывалася ў клубах (святліцах). Адной з новых форм работы ў 1930-я гг. сталі нядзельныя і грамадскія універсітэты, курсы. Усяго ў Польшчы ў 1937/1938 навуч. годзе дзяржаўная адміністрацыя і органы самакіравання, грамадскія арганізацыі ўтрымлівалі больш 6 тыс. агульнаадукацыйных курсаў (каля 132 тыс. слухачоў), звыш 650 школ і вячэрніх курсаў (каля 14,6 тыс. слухачоў), каля 600 вясковых нядзельных універсітэтаў, каля 140 народных універсітэтаў (12,7 тыс. слухачоў), каля 19 тыс. святліц, больш 11 тыс. тэатральных калектываў і каля 6 тыс. хораў [867, с. 276]. Статыстычныя звесткі аб культурна-асветніцкіх установах на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў той час прадстаўлены ў прапанаванай табліцы 3.4 [паводле: 1024, с. 338]. У цэлым трэба адзначыць, што з-за недахопу фінансавых сродкаў дзяржаўная палітыка Польшчы ў сферы культуры і асветы абмяжоўвалася ліквідацыяй непісьменнасці і пачатковай адукацыяй. Менавіта таму значная частка культурна-асветніцкіх устаноў утрымлівалася органамі самакіравання, грамадскімі арганізацыямі, за кошт ахвяраванняў прыватных асоб. Нягледзячы на разнастайнасць форм, культурна-асветніцкая праца знаходзілася на нізкім арганізацыйным, матэрыяльна-тэхнічным узроўні.

Табліца 3.4 – Стан культурна-асветніцкіх устаноў у Заходняй Беларусі ў 1937/1938 навуч. годзе

| Ваяводства | Нядзельныя універсітэты | Грамадскія універсітэты (у тым ліку курсы) | | Клубы (святліцы) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Кольк. | слухачоў | усяго | У тым ліку | |
| | | | | | грамадск. | арганізацый |
| Віленскае | 62 | 7 (4) | 179 | 763 | 211 | 476 |
| Навагрудск. | 18 | 3 | 42 | 947 | 265 | 530 |
| Палескае | 10 | 25 (14) | 864 | 617 | 341 | 216 |
| Беластоцкае | 26 | 18 (4) | 1 502 | 789 | 312 | 408 |
| Усяго ў Польшчы | 591 | 456 (317) | 12 660 | 18 636 | 2 673 | 13 378 |

Пад уздзеяннем сусветнага эканамічнага крызісу колькасць гурткоў ПМШ у межах усёй Польскай дзяржавы зменшылася ў 1931 г. да 240 (25,1 тыс. чалавек) (для параўнання – ў 1917 г. налічвалася 450 гурткоў)

[907, с. 118]. Разначынны характар кіраўніцтва многіх гурткоў ПМШ не забяспечваў там панавання прыхільнікаў рэжыму “санацыі”. Аналіз архіўных дакументаў паказвае, што ў пачатку 1930-х гг. сярод гурткоўцаў ПМШ у Палескім ваяводстве былі асобы, якія мелі пераважна палітычныя сімпатыі да польскіх хадэкаў і эндэкаў, а ва ўправах знаходзіліся людзі з праўрадавымі поглядамі [173, арк. 40; 170, арк. 3]. Польскія мясцовыя ўлады зрабілі адпаведныя захады па кадраваму і ідэалагічнаму ўмацаванню структурных падраздзяленняў ПМШ. Палескую ваяводскую ўправу ПМШ узначалілі пінскі біскуп К. Букраба, пасол Э. Дунін-Маркевіч. Адпаведныя кадравыя змены адбыліся і ў акруговых управах ПМШ у Брэсце і Пінску [170, арк. 25адв.]. У Палескім ваяводстве ПМШ у жніўні 1933 г. мела ў сваім падпарадкаванні 37 гурткоў (1215 чалавек), у 1934 г. там налічвалася 92 бібліятэкі (каля 24,5 тыс. кніг). Колькасць чытальняў-святліц дасягнула 27 (1 310 членаў). Акрамя гімназіі, у Палескім ваяводстве дзейнічалі таксама 19 пачатковых, 2 рамесніцкія школы (у Пружанах і Пінску), 6 прафесійных школ (1 463 дзяцей), 3 інтэрнаты (74 дзяцей). Адсутнасць фінансавых сродкаў не дазваляла структурным адзінкам ПМШ праводзіць актыўную дзейнасць. Праведзенае аб’яднанне ўсіх рэгіянальных арганізацый (у тым ліку ПМШ усходніх зямель) часткова спрыяла ўмацаванню ПМШ. У Навагрудскім ваяводстве ў пачатку 1934 г. налічвалася 53 чытальні-святліцы (1 680 членаў), 1 пачатковая, 3 прафесійныя школы (321 вучань), 4 інтэрнаты (66 дзяцей), 97 бібліятэк (21,2 тыс. кніг). Аднак выніковасць працы там была слабой – адбыліся толькі 3 лекцыі [1078, арк. 153].

У сярэдзіне 1930-х гг.назіраліся змены ў формах і метадах працы ПМШ. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці былі прызнаны стварэнне школ у “бясшкольных акругах”; падтрымка бібліятэк-чытальняў; апякунства гурткоў ПМШ з цэнтральных ваяводстваў Польшчы над школамі “ўсходніх крэсаў”. Ва ўмовах няздольнасці польскіх улад забяспечыць усеагульнае пачатковае навучанне для усіх дзецей школьнага ўзросту ПМШ прапанавала пашырыць сетку прыватных школ. Асаблівы акцэнт рабіўся на ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых.

Сетка адукацыйных устаноў ПМШ размяшчалася нераўнамерна. Калі ў заходнебеларускіх землях у 1936 г. было каля 75% яе пачатковых школ (асабліва вылучаліся Гродзенскі (21 школа), Брэсцкі (19), Баранавіцкі (12) паветы (табліца 3.5 [падлічана паводле: 1114, с. 14–20]), то большасць яе сярэдніх, прафесійных школ знаходзілася па-за межамі заходнебеларускага рэгіёна: з 9 сярэдніх агульнаадукацыйных школ – 2 (мужчынская гімназія ў Гродна, жаночая гімназія ў Брэсце), з 9 гандлёвых школ – таксама 2 (у Гродна і Баранавічах), з 13 прафесійных школ – толькі 4 (у Гродна, Баранавічах, Навагрудку, Пінску), з 10 прафесійных жаночых школ – 5 (у

Брэсце, Лунінцы, Пінску, Слоніме, Новай Вілейцы) [1114, с.12–13, 58–59]. У заходнебеларускіх землях размяшчалася палова ўсіх бібліятэк ПМШ (асабліва на Віленшчыне) (табліца 3.6 [1114, с. 24, 58–59]), якія былі даступнымі дзецям з заможных сем'яў.

Табліца 3.5 – Размяшчэнне адукацыйных устаноў ПМШ у Заходняй Беларусі (1936 г.)

| Ваяводства | Павет | Колькасць пачатк. школ | Колькасць вучняў | Іншыя адукацыйныя ўстановы | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | Кольк. вучняў |
| Віленскае | Віленска-Трокскі | 6 | 252 | - | - |
| | Ашмянскі | 3 | 133 | - | - |
| | Браслаўскі | 1 | 42 | - | - |
| | Вілейскі | 7 | 268 | Прафесійная жаночая школа (Новавілейка) | 87 |
| | Дзісенскі | 3 | 127 | - | - |
| | Маладзечанскі | 3 | 128 | - | - |
| | Пастаўскі | 3 | 134 | - | - |
| | Свянцянскі | 5 | 209 | - | - |
| Навагрудскае | Навагрудскі | 2 | 88 | Сталярная школа (Навагрудак) | 8 |
| | Баранавіцкі | 12 | 646 | Гандлёвая школа, 4-кл. мужчынская сярэдняя прафесійная школа (Баранавічы) | 363 |
| | Валожынскі | 5 | 246 | - | - |
| | Лідскі | 8 | 356 | - | - |
| | Нясвіжскі | 3 | 140 | - | - |
| | Слонімскі | 1 | 94 | Прафесійная жаночая школа (Слонім) | 33 |
| | Стаўбцоўскі | 1 | 41 | - | - |
| | Шчучынскі | 4 | 187 | - | - |
| Палескае | Брэсцкі | 19 | 1 179 | Жаночая гімназія, прафесійная жаночая школа (Брэст) | 399 |
| | Драгічынскі | 10 | 430 | - | - |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Кобрынскі | 8 | 436 | - | - |
| | Косаўскі | 7 | 320 | - | - |
| | Лунінецкі | 6 | 278 | Прафесійная жаночая школа (Лунінец) | 77 |
| | Пінскі | 8 | 356 | Школа рамёстваў, прафесійная жаночая школа (Пінск) | 171 |
| | Пружанскі | 10 | 488 | Сталярныя майстэрні (Пружаны) | - |
| | Столінскі | 6 | 283 | - | - |
| Беластоцкае | Ваўкавыскі | 1 | 40 | - | - |
| | Гродзенскі | 21 | 923 | Мужчынская гімназія, гандлёвая школа, школа рамёстваў (Гродна) | 301 |
| Усяго | - | 157 | 7 572 | - | 1 439 |

Табліца 3.6– Стан бібліятэк ПМШ у Заходняй Беларусі (1936 г.)

| Ваяводства | Усяго бібліятэк | З іх | | Колькасць кніг | Колькасць чытачоў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | стацыянарных | перасоўных | | |
| Віленскае | 386 | 27 | 359 | 49 953 | 5 043 |
| Навагрудскае | 116 | 14 | 102 | 24 986 | 2 862 |
| Палескае | 263 | 68 | 195 | 37 076 | 6 043 |
| Беластоцкае | 107 | 31 | 76 | 15 654 | 2 127 |

Табліца 3.7 – Стан пачатковых школ ПМШ у Палескім ваяводстве (1931–1939 гг.)

| Навучальны год | Колькасць пачатковых школ | Колькасць вучняў |
|---|---|---|
| 1931/1932 | 13 | 531 |
| 1932/1933 | 20 | 835 |
| 1933/1934 | 24 | 1 069 |
| 1934/1935 | 38 | 1 851 |
| 1935/1936 | 66 | 3 382 |
| 1936/1937 | 82 | 4 164 |
| 1937/1938 | 108 | 5 292 |
| 1938/1939 | 115 | 5 684 |

Найбольш дынамічным у 1930-я гг. было развіццё ПМШ на Палессі (табліца 3.7 [1079, с. 35]). У канцы 1938 г. з 300 пачатковых школ ПМШ

(13 865 дзяцей) у Палескім ваяводстве налічвалася 116 (5 658 вучняў) – пераважна 4-класных, дзе вучыліся ў асноўным дзеці асаднікаў і чыноўнікаў. Агульная колькасць гурткоў ПМШ у той час у Польскай дзяржаве дасягнула 268 (каля 37,4 тыс. чалавек) [1115, с. 7, 13]. З сярэдзіны 1930-х гг. супрацоўніцтва ПМШ з польскай адміністрацыяй, органамі самакіравання набыло сістэматычны характар. ПМШ змагла актывізаваць сваю дзейнасць пры актыўным удзеле ваенных колаў, чыноўнікаў, настаўнікаў. На мясцовым узроўні асноўны аб'ём культурна-асветніцкай працы выконвалі настаўнікі, з якімі гурткі ПМШ заключалі дамовы. Апякунскія гурткі, якія аказвалі матэрыяльную дапамогу, з'яўляліся сувязным звяном паміж ПМШ і польскай супольнасцю [560, с. 46]. У справах культурна-асветніцкай дзейнасці быў наладжаны цесны кантакт з мясцовымі аддзяленнямі шэрагу польскіх грамадскіх арганізацый, сумеснымі намаганнямі ствараліся польскія народныя дамы. У цэлым, да канца 1930-х гг. становішча ПМШ стабілізавалася, хоць і не вызначалася тэндэнцыяй ператварэння яе ў масавую арганізацыю. Акрамя таго, колькасны рост школ ПМШ на Палессі не забяспечваў там паспяховага правядзення паланізацыі. Адзін з актывістаў ПМШ Ф. Лешчалоўскі ў пачатку 1939 г. самакрытычна падкрэсліваў, што "ў большасці сваёй палескія гарады не з'яўляюцца асяродкамі польскай культуры, не выпраменьваюць тую культуру на вёску… У некаторых гарадах і мястэчках Палесся вясковец яшчэ да нядаўняга часу сутыкаўся з польскай культурай толькі ў школе і адміністрацыі" [1079, с. 22].

Нягледзячы на адсутнасць дакладных статыстычных звестак, наяўныя матэрыялы даюць агульнае ўяўленне аб стане польскіх грамадскіх арганізацый у канцы 1930-х гг. У 1937/1938 навуч. годзе ў Беластоцкім ваяводстве было 942 грамадскія арганізацыі, якія налічвалі 2 940 аддзелаў (гурткоў). З іх каталіцкія таварыствы моладзі мелі каля 18 тыс. чалавек, Стралецкі саюз – 395 аддзелаў (9 575 чалавек), Саюз маладой вёскі – 285 (5 819 чалавек), Ліга супрацьпаветранай і хімічнай абароны – 537 (30 560 чалавек), Марская і каланіяльная ліга – 98 (21 000 чалавек), ПМШ – 15 (1 387 чалавек), Таварыства падтрымкі будаўніцтва грамадскіх пачатковых школ – 927 гурткоў (14 723 чалавек) [207, арк. 46–49]. У пачатку 1938 г. у Навагрудскім ваяводстве шматлікасцю вылучаліся аддзелы пажарнай аховы – 8 павятовых аддзелаў (427 гурткоў, якія аб'ядноўвалі больш 12 тыс. чалавек). На другім месцы па колькасці гурткоў была адна з прафесійных арганізацый работнікаў адукацыі – Саюз польскіх настаўнікаў (Związek nauczycielstwa polskiego) – 90 (1 754 чалавекі). Таварыства падтрымкі будаўніцтва грамадскіх школ налічвала ў тым жа Навагрудскім ваяводстве 393 адзінкі (7 422 чалавекі), Ліга супрацьпаветранай і хімічнай абароны – 129 (14 843), Марская і

каланіяльная ліга – 64 (7 799), каталіцкая арганізацыя “Caritas” – 33 (4 890), ПМШ – 7 (894) [197, арк. 7–8]. У Палескім ваяводстве лідэрства сярод грамадскіх арганізацый трымалі Стралецкі саюз, Саюз маладой вёскі, Ліга супрацьпаветранай і хімічнай абароны, Таварыства падтрымкі будаўніцтва грамадскіх школ, аддзелы пажарнай аховы [1083, с. 45–48].

Аднак колькасныя паказчыкі не адлюстроўвалі рэальнага ўплыву польскіх арганізацый, які нярэдка перабольшваўся. На наш погляд, цэлы шэраг структурных адзінак існаваў толькі на паперы. Асобныя мясцовасці (асабліва ў вёсках) былі слаба ахоплены дзейнасцю польскіх грамадскіх арганізацый. У ходзе даследаванняў у 1937–1938 гг., праведзеных С. Віславухам разам з вучонымі Віленскага універсітэта імя С. Баторыя ў рамках праекта Інстытута даследаванняў нацыянальных спраў, вывучаўся ўзровень нацыянальнай свядомасці ў 2-х рэгіёнах – з пераважным каталіцкім насельніцтвам (77 вёсак Віленска-Трокскага, Ашмянскага паветаў) і з пераважным праваслаўным насельніцтвам (107 вёсак 6 паўночна-ўсходніх і ўсходніх паветаў Віленскага ваяводства). Анкетаванне на тэрыторыі Віленска-Трокскага і Ашмянскага паветаў не паказала росту польскай нацыянальнай свядомасці мясцовага насельніцтва (пераважна беларусаў рымска-каталіцкага веравызнання). Назіралася атаясамліванне этнічнай прыналежнасці з канфесійнай, дзяржаўнай. З 52 апытаных вёсак згаданых 2-х паветаў толькі ў 7 быў “добры ўзровень нацыянальнай свядомасці польскага насельніцтва” [1200, с. 19, 57]. Параўнальны аналіз гэтага даследавання з вынікамі перапісу насельніцтва 1931 г. паказаў, што задэкларававаны ў ходзе перапісу насельніцтва польска-беларускі характар тэрыторыі паміж Вільняй і Ашмянамі не пацвердзіўся. У якасці роднай мовы мясцовае каталіцкае насельніцтва называла беларускую ці “простую”, хоць польская мова таксама выкарыстоўвалася [1200, с. 17–18]. Сацыялагічныя даследаванні С. Віславуха паказалі, што праваслаўныя беларусы ў вёсках больш цягнуліся да беларускай, чым да польскай культуры. У ходзе даследавання высветлілася таксама, што на тэрыторыі Віленска-Трокскага і Ашмянскага паветаў толькі ў 5 з 53 вёсак былі гурткі ці аддзелы польскіх арганізацый. Актыўнасць там засведчылі толькі гурткі каталіцкай моладзі, якія мелі святліцы, бібліятэкі, радыёпрыёмнікі, бясплатна распаўсюджвалі каталіцкую прэсу (“Mały dziennik”, “Przewodnik katolicki”, “Rycerz Niepokalanej” і інш.). Дзейнасці масавых арганізацый (Стралецкага саюза і СВМ) там фактычна не адчувалася [1200, с. 49, 53, 55, 59]. Вынікі згаданага даследавання пацвярджаюцца высновамі сучасных вучоных пра тое, што працэс далучэння беларусаў-католікаў да каштоўнасцей польскай культуры меў пэўны вынік пры актыўнай дзейнасці касцёла і польскіх школ [657, с. 168].

Пытанне аб выніковасці працы польскіх грамадскіх арганізацый неаднаразова ўздымалася ў кантэксце выпрацоўкі ўрадавых планаў другой паловы 1930-х гг. па далейшай каланізацыі Заходняй Беларусі і паланізацыі яе насельніцтва. Ва ўмовах ліквідацыі большасці грамадскіх арганізацый няпольскага насельніцтва меркавалася фарсіраваць дзейнасць польскіх аб’яднанняў. У асобным дакладзе, падрыхтаваным у сярэдзіне 1935 г. супрацоўнікамі палітычнага дэпартамента МУС Польшчы, былі падвергнуты крытыцы Стралецкі саюз, Саюз рэзервістаў і іншыя грамадскія арганізацыі, якія не дапускалі ў свае рады няпольскае насельніцтва, што спрыяла адтоку яго актыўных дзеячаў у беларускі і ўкраінскі рух. Эфектыўнасць дзейнасці польскіх арганізацый была ацэнена наступным чынам: “ніякай арганізацыйнай працы не праводзяць, накіроўваюць свае намаганні толькі на ўзаемную барацьбу” [742, арк. 36, 30–31]. Крытычныя заўвагі да грамадскіх арганізацый выказваліся і з боку ваенных улад, ваяводскай адміністрацыі. У канцы 1936 г. кіраўніцтва IX КАП хадайнічала аб прыцягненні грамадскіх і асветніцкіх арганізацый да працэсу паланізацыі. Акцэнт у гэтай справе рабіўся на тыя аб’яднанні, якія не вылучалі яскравых палітычных задач, імкнуліся да вырашэння актуальных для сялян праблем гаспадарчага, сацыяльна-культурнага жыцця – пажарную ахову, сельскагаспадарчыя гурткі, СВМ і інш. На з’ездзе служачых сельскагаспадарчага апарату Палескага ваяводства 16 красавіка 1937 г. прадугледжвалася правесці чыстку бібліятэк гурткоў Саюза польскіх настаўнікаў, дзе былі выданні В. Васілеўскай і іншая “шкодная” літаратура, у якой уздымаліся актуальныя сацыяльна-эканамічныя, палітычныя праблемы, становішча ўкраінцаў, беларусаў і яўрэяў у “духу ўльтралібералізму”. “Такая літаратура прызначана для інтэлігента, але не для селяніна, які знойдзе ў ёй толькі камуністычныя тэндэнцыі” [202, арк. 321].

Паводле беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага, грамадскія арганізацыі слаба ажыццяўлялі паланізацыю няпольскага насельніцтва. Таму ім прапаноўвалася мэтанакіравана і пад кантролем улад ствараць густую сетку польскіх культурна-асветніцкіх цэнтраў у населеных цэнтрах, якія мелі добрую камунікацыю з навакольнымі вёскамі, дзе размясціць пачатковую школу вышэйшага тыпу, народны дом, тэатр, бібліятэку і інш. Улады абавязваліся пільна каардынаваць дзейнасць усіх грамадскіх арганізацый [207, арк. 51, 153]. Як адзначаў Г. Асташэўскі, тагачаснае польскае грамадскае жыццё характарызавалася празмернай дыферэнцыяцыяй лозунгаў, лішкам розных арганізацый, дэвальвацыяй іх мэт і задач [806, арк. 106–107; 207, арк. 44, 51, 152–153]. У красавіку 1939 г. мясцовым структурам польскіх арганізацый Навагрудскага ваяводства давалася ўказанне аб наладжванні выдання вясковых і насценных газет

[330, арк. 1]. Намеснік палескага ваяводы С. Бенеўскі ў маі 1939 г. таксама адмоўна ацэньваў “непамерны рост арганізацый з роднаснымі задачамі, які вядзе да распылення грамадскай энергіі”, а таксама нездаровае саперніцтва паміж імі [1083, с. 47]. Палескае ваяводскае ўпраўленне ініцыявала працэс інтэграцыі грамадскіх арганізацый яшчэ з сярэдзіны 1930-х гг. [193, арк. 13–14]. У 1939 г. адпаведныя структуры ўзніклі амаль ва ўсіх паветах Палескага ваяводства. Аднак па суб’ектыўных прычынах значных поспехаў дабіцца не ўдалося. Адчувалася і адсутнасць энергічных, зацікаўленых асоб.

Акрамя грамадскіх арганізацый, важную ролю ў культурным жыцці палякаў і іншых супольнасцей заходнебеларускіх зямель ігралі бібліятэкі. Самыя буйныя з іх знаходзіліся ў Вільні. У прыватнасці, бібліятэка Віленскага універсітэта імя С. Баторыя ў верасні 1936 г. налічвала 350 тыс. экзэмпляраў кніг, 12,5 тыс. рукапісаў, 211 інкунабул [1038, с. 300] (паводле іншых звестак, яе фонды складалі ў 1939 г. 598 тыс. экз.) [831, с. 628–629]. Дзяржаўная публічная бібліятэка імя Я. і Э. Урублеўскіх (бібліятэка Урублеўскіх) мела напярэдадні Другой сусветнай вайны каля 200 тыс. адзінак. Яе фонды папаўняліся за кошт прыватных ахвяраванняў і кнігазбораў асобных арганізацый, устаноў. У прыватнасці, туды трапілі зборы Навукова-даследчага інстытута Усходняй Еўропы (каля 10 тыс. кніг). Дзякуючы М. Пецюкевічу, які працаваў у 1930-я гг. у бібліятэцы Урублеўскіх, многія дзеячы заходнебеларускай інтэлігенцыі мелі магчымасць патаемна чытаць савецкую літаратуру [564, с. 112; 703, арк. 62, 75]. У 1937 г. бібліятэка Урублеўскіх папоўнілася за кошт фондаў ліквідаванай у 1937 г. Віленскай праваслаўнай семінарыі (23,7 тыс. экз.) [831, с. 635, 705]. Буйныя кнігазборы мелі рымска-каталіцкія семінарыі ў Вільні і Пінску. У бібліятэцы Віленскай семінарыі ў 1937 г. было 56,3 тыс. экз. [831, с. 624–625]. Фонды бібліятэкі Пінскай рымска-каталіцкай семінарыі налічвалі 42,3 тыс. кніг (1939 г.). Сярод іх было 4 тыс. старадрукаў, больш 600 рукапісаў XVII–XIX стст. У бібліятэку трапіў і ўласны кнігазбор біскупа З. Лазінскага. У Гродна гарадская бібліятэка налічвала 31,1 тыс. экз., бібліятэка гістарычнага музея – 20 тыс. экз., у 3-х бібліятэках магістрата было яшчэ 31,2 тыс. экз. [831, с. 187–188]. Папулярнасцю ў мясцовага насельніцтва карысталася гарадская бібліятэка ў Лідзе, заснаваная ў 1922 г. Аснову яе кніжных фондаў складала прыватная калекцыя гарадскога бургамістра Р. Бергмана. У 1938 г. у гэтай бібліятэцы налічвалася 10 тыс. кніг [831, с. 295]. У цэлым, агульны стан бібліятэк у заходнебеларускіх землях прадстаўлены ў табліцы 3.8 [831, с. 703–704]. Аналіз звестак табліцы 3.9 [831, с. 712] сведчыць аб тым, што і па колькасці ўстаноў, і па аб’ёму фондаў польскія бібліятэкі дамінавалі.

Табліца 3.8 – Бібліятэкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі

| Ваяводства | Паветы | Колькасць бібліятэк | Мясцовасці з найбольшымі кніжнымі фондамі | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Колькасць бібліятэк | Фонды (экз.) |
| Віленскае | Віленска-Трокскі | 408 | Вільня | 389 | 1 903 606 |
| | Свянцянскі | 81 | - | - | - |
| | Браслаўскі | 64 | - | - | - |
| | Дзісенскі | 47 | - | - | - |
| | Вілейскі | 32 | - | - | - |
| | Пастаўскі | 20 | - | - | - |
| | Маладзечанскі | 27 | - | - | - |
| | Ашмянскі | 23 | Ашмяны | 8 | 14 694 |
| Навагрудск. | Баранавіцкі | 68 | Баранавічы | 29 | 19 624 |
| | Навагрудскі | 67 | Навагрудак | 22 | 24 154 |
| | Стаўбцоўскі | 55 | - | - | - |
| | Лідскі | 48 | Ліда | 23 | 26 394 |
| | Слонімскі | 48 | Слонім | 20 | 13 893 |
| | Нясвіжскі | 28 | Нясвіж | 15 | 22 882 |
| | Шчучынскі | 24 | - | - | - |
| | Валожынскі | 23 | - | - | - |
| Беластоцкае | Гродзенскі | 104 | Гродна | 68 | 118 939 |
| | Ваўкавыскі | 46 | Ваўкавыск | 20 | 16 033 |
| Палескае | Брэсцкі | 143 | Брэст | 91 | 93 494 |
| | Пінскі | 46 | Пінск | 34 | 92 914 |
| | Лунінецкі | 38 | - | - | - |
| | Кобрынскі | 33 | - | - | - |
| | Драгічынскі | 23 | - | - | - |
| | Пружанскі | 22 | - | - | - |
| | Столінскі | 17 | - | - | - |
| | Косаўскі | 13 | - | - | - |

Табліца 3.9 – Падзел бібліятэк ва ўсходніх ваяводствах Польшчы паводле этнічнай прыналежнасці

| Прыналежнасць бібліятэк да этнічнай супольнасці | Колькасць установ | Фонды (экз.) |
|---|---|---|
| польскія | 2 427 | 5 182 785 |
| украінскія | 1 059 | 578 202 |
| яўрэйскія | 313 | 533 723 |
| літоўскія | 63 | 52 362 |
| беларускія | 49 | 29 622 |
| Усяго | 4 067 | 6 674 781 |

Сетка грамадскіх бібліятэчных устаноў складвалася павольна, таму розныя таварыствы, прыватныя асобы імкнуліся стварыць уласныя. Прыведзены вышэй аналіз дзейнасці асобных польскіх грамадскіх арганізацый паказаў, што іх бібліятэкі, якія мелі невялікія кнігазборы (пераважна 60–100 кніг і перыядычных выданняў), праводзілі разнастайную культурна-асветніцкую працу. У чытачоў найбольшым попытам карысталася перыёдыка ў адрозненне ад кніг. Пазітыўная дынаміка ў росце бібліятэчнай сістэмы назіралася ў 1930-я гг. Гэта можна прасачыць на прыкладзе Палескага ваяводства, дзе ў 1930/1931 г. было 176 бібліятэк (98 249 кніг), у 1933/1934 г. – 392 (91 336), 1936/1937 г. – 641 (146 402), 1937/1938 г. – 793 (163 833) [1083, с. 39]. Аднак бібліятэкі на Палессі ахоплівалі мізэрную частку насельніцтва – ад 1,3 да 2,9% жыхароў, а ў асобных мясцовасцях – менш за 1% жыхароў (напрыклад, у Пружанскім і іншых паветах) [1083, с. 42; 548, с. 83]. У многім гэта тлумачыцца непісьменнасцю і малапісьменнасцю, дрэнным веданнем польскай мовы, слабым фінансаваннем устаноў культуры, матэрыяльнымі цяжкасцямі насельніцтва, асабліва вясковага.

Табліца 3.10 – Размеркаванне часопісаў Заходняй Беларусі па мове выдання (1926, 1929 гг.)

| Ваяводства | Год | Усяго | У тым ліку на мовах | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | польск. | белар. | ідыш (іўрыт) | руск. | украін. | інш. |
| Віленскае | 1926 | 63 | 33 | 14 | 11 | 2 | - | 3 |
| | 1929 | 81 | 45 | 13 | 13 | 2 | - | 8 |
| Навагрудскае | 1926 | 10 | 9 | - | 1 | - | - | - |
| | 1929 | 16 | 11 | - | 5 | - | - | - |
| Палескае | 1926 | 24 | 16 | - | 5 | 3 | - | - |
| | 1929 | 24 | 15 | - | 7 | 1 | 1 | - |

Бібліятэкі і кнігарні папаўняліся друкаванай прадукцыяй цэнтральных і мясцовых друкарняў. Польскія даследчыкі налічваюць у міжваеннай Польшчы каля 560 выдавецтваў [1192, с. 329]. Яны выдавалі пераважна літаратуру, перыёдыку на польскай мове. На працягу міжваеннага часу колькасць перыядычных выданняў у Польшчы ўзрасла з прыкладна 500 (1918 г.) да 2,6 тыс. (1939 г.), з якіх польскамоўныя складалі 80% [373, с. 496]. Аб перавазе польскамоўных перыядычных выданняў і складаным становішчы беларускай, рускай і іншай няпольскай перыёдыкі сведчаць даныя табліц 3.10 [1186, с. 260, 299] і 3.11 [1065, с. 344]. Польскія друкаваныя сродкі масавай інфармацыі былі нацэлены на правядзенне масіраванай прапаганды, інкарпарацыю Заходняй Беларусі і паланізацыю яе насельніцтва [402, с. 56]. У заходнебеларускіх землях пераважалі невялікія прыватнаўласніцкія друкарні. Польскамоўныя выданні складалі

большасць рэгіянальнай прэсы. Так, ў 1937 г. у Палескім ваяводстве з 18 перыядычных выданняў на польскай мове друкавалася 11, у тым ліку штодзённыя газеты "Dziennik Brzeski" („Брэсцкі дзённік") (Брэст), "Słowo Polesia" („Слова Палесся") (Пінск), тыднёвік "Gazeta Poleska" („Палеская газета") (Брэст) [132, арк. 11–12].

Табліца 3.11 – Размеркаванне перыёдыкі Польшчы па нацыянальных мовах (1923–1937 гг.) (пазначаныя * не маюць звестак)

| Мова перыядычнага выдання | Па стану на 1.07.1923 | Па стану на 31.12.1925 | Па стану на 31.12.1932 | Па стану на 31.12.1935 | Па стану на 31.12.1937 |
|---|---|---|---|---|---|
| Украінская | 35 | 48 | 64 | 94 | 125 |
| Беларуская | 9 | 7 | 6 | 13 | 8 |
| Ідыш (іўрыт) | 72 | 81 | 93 | 102 | 130 |
| Руская | 7 | * | * | * | 9 |

Сярод аўтарытэтных польскамоўных перыядычных выданняў варта адзначыць тыднёвік "Przegląd Wileński", які выдаваўся ў Вільні ў 1912–1913 гг., а потым быў адноўлены ў лістападзе 1921 г. і праіснаваў да кастрычніка 1938 г. Яго неадменным рэдактарам і выдаўцом з'яўляўся Л. Абрамовіч, адзін з ідэолагаў краёвай ідэі. На старонках выдання знаходзіла адлюстраванне нацыянальна-культурнае жыццё розных этнічных супольнасцей (беларусаў, палякаў, літоўцаў, яўрэяў). Акрамя рэдактара, з публіцыстычнымі артыкуламі, культуралагічнымі матэрыяламі выступалі асобныя беларускія дзеячы (У. Талочка, А. Стаповіч, У. Самойла, А. Луцкевіч і іншыя). Крытычнае стаўленне да мясцовай польскай адміністрацыі было падставай для рэпрэсіўных дзеянняў з яе боку. У другой палове 1930-х гг. кожны другі нумар тыднёвіка "Przegląd Wileński" падвяргаўся канфіскацыі [18, с. 235].

Акрамя друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, польскія ўлады імкнуліся выкарыстаць для прапагандысцкіх мэтаў магчымасці радыё. Калі ў 1925 г. у Польшчы было ўсяго каля 200 радыёпрыёмнікаў (пераважна ў арміі), то напярэдадні Другой сусветнай вайны агульная колькасць абанентаў радыё складала каля 1 млн. 100 тыс. – з улікам як прыватных асобаў, так і асабліва розных дзяржаўных структур, школ, святліц, культурна-асветніцкіх устаноў грамадскіх арганізацый і інш. [1065, с. 323]. Больш хуткімі тэмпамі ішла радыёфікацыя з сярэдзіны 1930-х гг. Аднак у вёсках радыёпрыёмнікі былі нешматлікімі. 70% абанентаў размяшчалася ў гарадах [1215, с. 275, 298]. Па радыёфікацыі заходнебеларускія землі значна адставалі ад цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы: у 1938 г. колькасць радыёпрыёмнікаў на 1 тыс. жыхароў складала 9–12 (агульнапольскі паказчык – 25), а на Палессі – у некалькі разоў менш

[1068, с. 326]. У заходнебеларускім рэгіёне радыёэфір забяспечваўся радыёстанцыяй у Варшаве, а з сярэдзіны студзеня 1928 г. – у Вільні, дзе сярод шэрагу перадач неабходна адзначыць літаратурныя. Пануючай мовай на радыё была польская, перадачы на іншых мовах былі рэдкімі і выпадковымі. Адміністрацыйна-паліцэйскія органы праводзілі ўлік і кантроль усіх уладальнікаў радыёпрыёмнікаў, выносілі жорсткія пакаранні за ўхіленне ад рэгістрацыі. Такія прэвентыўныя меры павінны былі істотна абмежаваць практыку нелегальнага праслухоўвання заходнебеларускімі жыхарамі савецкага радыё, якое прызнавалася "рассаднікам сепаратысцкага нацыяналізму і камунізму". Улічваючы слабы ўзровень радыёфікацыі на Палессі – у 1937/1938 г. налічвалася ўсяго 352 радыёпрыёмнікі, у снежні 1938 г. ваенныя колы для супрацьдзеяння "шкоднай дзейнасці радыёстанцыі ў Мінску" прапаноўвалі пабудаваць альтэрнатыўную радыёстанцыю, "насыціць тэрыторыю вялікай колькасцю танных радыёпрыёмнікаў, якія будуць прымаць перадачы толькі варшаўскай ці мясцовай станцыі" [189, арк. 5]. Неабходна дадаць, што 31 красавіка 1938 г. пачала сваю працу радыёстанцыя ў Баранавічах. Выкарыстоўваць радыёпрыёмнікі дазвалялася толькі ў святліцах, народных дамах.

Адначасова з радыё набывала папулярнасць і кіно, асабліва ў другой палове 1930-х гг. Як сведчаць статыстычныя звесткі з табліцы 3.12 [917, с. 149–150], заходнебеларускія землі мелі самыя нізкія паказчыкі па колькасці кінатэатраў ці кіназалаў, наяўнасці ў іх месцаў гледачоў. Дазвол на адкрыццё кінатэатраў выдавала МУС Польшчы [119]. Значную частку рэпертуару кінатэатраў складалі замежныя стужкі, якія запаланілі кінарынак Польшчы. У другой палове 1920-х гг. амерыканскія фільмы складалі больш 80% замежных стужак, а ўсяго за перыяд 1924–1939 гг. з імпартных стужак амерыканскія складалі 64,1%, нямецкія – 12,5%, французскія – 10,8% [1215, с. 290]. Так, у спісе кінафільмаў, якія дэманстраваліся ў гарадскім кінатэатры Навагрудка ў ліпені-верасні 1937 г., былі пераважна замежныя: "Мазур", "Толькі ты", "Шлях да славы", "Злы кароль", "Я не вінаваты", "Егіпет", "Сузы", "Музычны кактэйль", "Кабінет васковых фігур", "Сын адмірала", "Герой з Тэхаса", "Сан-Францыска" і інш. Сярод адзінкавых польскіх стужак быў інфармацыйны штотыднёвік Польскага тэлеграфнага агенства ("Tygodnik PAT") [195, арк. 48].

Як сведчыць аналіз рэпертуару кінатэатраў Палескага ваяводства ў 1936–1938 гг., пераважалі прыгодніцкія, забаўляльныя фільмы, меладрамы [127–129]. Польскія органы бяспекі сачылі за рэпертуарам, выдавалі кінатэатрам асобныя дазволы на дэманстрацыю фільмаў [318; 326]. У асноўным кінатэатры адкрываліся ў буйных гарадах. У Брэсце працавала 3

кінатэатры – “Адрыя”, “Міраж”, а таксама прыватны кінатэатр Сарвера, які стаў папулярным грамадска-культурным цэнтрам у горадзе. У Пінску дзейнічалі кінатэатры “Казіно” (на 320 месцаў), у чыгуначным клубе (190 месцаў). Сярод уладальнікаў і арандатараў кінатэатраў адчувальнай была прысутнасць яўрэяў [321]. Папулярнасць гэтага масавага віда мастацтва адбілася і на кошце білетаў на кінасеансы – у сярэднім 0,74 злотага ў канцы 1930-х гг. [1024, с. 346–348].

Табліца 3.12 – Кінатэатры ў Заходняй Беларусі ў 1932–1937 гг.

| Ваяводства | 1932 г. | 1933 г. | 1934 г. | 1935 г. | 1936 г. | 1937 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | Кінатэатраў | Месцаў для гледачоў |
| Віленскае | 19 | 19 | 19 | 17 | 18 | 21 | 6 259 |
| Навагрудскае | 14 | 11 | 12 | 11 | 13 | 13 | 3 588 |
| Палескае | 12 | 11 | 11 | 11 | 13 | 14 | 3 374 |
| Усяго ў Польшчы | 752 | 728 | 707 | 722 | 741 | 769 | 272 812 |

Польскія ўлады актыўна выкарыстоўвалі магчымасці кіно для прапаганды. Асабліва вылучалася ў гэтым напрамку створаная ў 1935 г. студыя “Пантафільм”. Яскравымі прыкладамі прапагандысцкага польскага кіно з’яўляліся фільмы “Цуд на Вісле”, “Палымянае сэрца” і іншыя [414, с. 310]. Прэм’ера фільма “Палымянае сэрца” (рэжысёр – Р. Ганткоўскі) у кінатэатры “Свет” у Беластоку 27 лютага 1937 г. пераўтварылася ў ідэалагічную акцыю, у якой прымалі ўдзел ваяводскія ўлады, вайскоўцы, каталіцкае духавенства, інтэлігенцыя [1011, с. 125]. З сярэдзіны 1930-х гг. міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы распрацоўвала планы па кінафікацыі адукацыйных, культурна-асветніцкіх установ.

У пашырэнні польскай культуры і мовы на тэрыторыі Заходняй Беларусі важную ролю выконвала польская армія. Па-першае, гэта адбывалася ў ходзе цэлага комплексу адукацыйна-выхаваўчых, прапагандысцкіх мерапрыемстваў з прызыўнікамі і ваеннаслужачымі, якія паходзілі з заходнебеларускіх зямель. Па-другое, ваенныя колы актыўна ўключаліся ў распрацоўку і ажыццяўленне планаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва, асабліва ў 1930-я гг. Па-трэцяе, Карпусы аховы памежжа і вайсковыя фарміраванні, якія дыслакаваліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, праводзілі самастойна і сумесна з дзяржаўнымі структурамі, польскімі грамадскімі арганізацыямі культурна-асветніцкую работу сярод розных катэгорый цывільнага насельніцтва. Выкарыстоўваючы нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, слабую пісьменнасць і адукаванасць прызыўнікоў-беларусаў, павятовыя

камендатуры часта запісвалі іх палякамі [1058, с. 13]. Гэтыя 2-е адзначаныя этнакультурныя адметнасці ў 1920-я гг. успрымаліся ваенным кіраўніцтвам у якасці спрыяльных фактараў для нацыянальна-культурнай і моўнай асіміляцыі прызыўнікоў-беларусаў. У ходзе ліквідацыі іх непісьменнасці і малапісьменнасці адбывалася паланізацыя, бо разам з авалодваннем польскамоўнага пісьма яны засвойвалі і элементы польскай культуры [888, с. 141; 905].

Праца з прызыўнікамі ажыццяўлялася пераважна ў святліцах, дзе праводзіліся гутаркі наконт характару будучай службы, уголас чыталіся артыкулы з армейскіх перыядычных выданняў (“Żołnierz Polski”)(“Польскі салдат”) (друкавалася з 1919 г. для салдат), “Polska Zbrojna” (“Узброеная Польшча”) і іншых. У святліцах ствараліся невялікія бібліятэкі з адпаведнай грамадска-палітычнай і пазнавальна-папулярнай літаратурай, частку якой бясплатна раздавалі ў якасці заахвочвання за ўдзел у розных конкурсах. У памяшканнях святліц вывешваліся плакаты з выказваннямі Ю. Пілсудскага, прапагандысцкія стэнды, табліцы, карты. У асобных святліцах выкарыстоўвалі тэхнічныя сродкі – радыёпрыёмнікі, патэфоны з наборам пласцінак з салдацкімі песнямі, а таксама наладжваліся выступленні школьных аркестраў і хораў [1187, с. 13]. Прызыўнікам даводзілі, што яны грамадзяне адной краіны – Польшчы, на карысць якой трэба было самаахвярна служыць [1187, с. 15].

Асветніцкай працай сярод салдат польскай арміі займаўся створаны ў 1921 г. Вайсковы навукова-выдавецкі інстытут (ВНВІ)(у 1934 г. пераўтвораны ў Вайсковы навукова-асветніцкі інстытут). З канца 1920-х гг. ВНВІ пераўтварыўся з адукацыйна-выхаваўчай структуры ў каардынуючы і арганізацыйны орган прапагандысцкай работы ў польскай арміі. На створаны ў яго межах у чэрвені 1929 г. самастойны сектар прапаганды і армейскай прэсы ўскладваўся цэлы шэраг задач у напрамку правядзення палітыкі “дзяржаўнага выхавання” салдат, пашырэння культа Ю. Пілсудскага. Пры правядзенні агульнадзяржаўных і рэгіянальных святочных мерапрыемстваў актыўна выкарыстоўвалася дзяржаўная сімволіка, партрэты і бюсты Ю. Пілсудскага [839, с. 13–14]. Больш інтэнсіўнае насаджэнне культу Ю. Пілсудскага адбывалася ў пачатку 1930-х гг., а пасля смерці кіраўніка Польскай дзяржавы гэты працэс значна паскорыўся. Асноўнай формай насаджэння культу Ю. Пілсудскага былі гутаркі з салдатамі, выкарыстоўваліся таксама магчымасці армейскага друку. У польскай арміі шырока выкарыстоўваліся для пашырэння культу Ю. Пілсудскага і яго ідэалагічных паплечнікаў дакументальныя стужкі “Пахаванне Маршалка Польшчы”, “Пахаванне сэрца Маршалка”, “Успаміны аб Маршалку Польшчы”, “Няхай жыве Маршалак Рыдз-Сміглы” і іншыя.

У 1930-я гг. у ходзе выкарыстання сярод салдат розных форм культурна-асветніцкай працы паказвалася культурная вышэйшасць палякаў [1203, с. 229]. Планавалася таксама прапагандаваць пазітыўны імідж польскай арміі пры дапамозе перыядычнага друку, радыё і кіно, кніг, лекцый і іншых форм працы з цывільным беларускім насельніцтвам. Культурна-асветніцкая і выхаваўчая праграма работы з салдатамі мела комплексны характар. У арміі салдатаў знаёмілі з гісторыяй, геаграфіяй Польшчы, для іх праводзілі экскурсіі, яны вучылі польскія песні. Аднак выніковасць паланізатарскіх мер не была здавальняючай. Як адзначалася ў данясенні агентуры IX КАП 23 снежня 1936 г., “салдаты-беларусы размаўляюць адзін з другім на сваёй мове”. “Гэта выклікана тым, што многія з іх дрэнна валодаюць польскай мовай. Такое становішча адрознівае беларусаў ад салдатаў-палякаў, прымушае іх заўсёды трымацца асобна. У сваю чаргу палякі з заходніх ваяводстваў здзекліва адносяцца да беларускай мовы. У цэлым, каля 80% беларусаў ведаюць польскую мову, аднак размаўляюць на ёй з памылкамі” [227, арк. 9]. Наогул, з-за недахопу фінансавых сродкаў, кваліфікаваных кадраў культпрасветработнікаў культурна-асветніцкая работа ў арміі была абмежаванай і зводзілася найперш да ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, вывучэння польскай мовы, маральнага і дзяржаўнага выхавання. Аматарскі тэатральны рух сярод салдат адсутнічаў, уся культурна-асветніцкая праца адбывалася звычайна ў клубах (святліцах).

Польская армія далучалася да правядзення культурна-асветніцкай працы сярод мясцовага цывільнага насельніцтва Заходняй Беларусі шляхам правядзення экскурсій, спартыўных і забаўляльных мерапрыемстваў, аматарскіх тэатральных пастановак, дэманстрацыі фільмаў, праслухоўвання радыё і г. д. Так, жыхары Брэста штогод з 1926 г. збіраліся на святкаванне Купалля на набярэжнай каля Цярэспальскіх варот у Брэсцкай крэпасці, дзе маглі назіраць за арганізаванымі падраздзяленнямі 9 сапёрнага палка воднымі феерыямі на рацэ Заходні Буг [79, с. 177–178]. Пры непасрэдным удзеле ВНАІ восенню 1936 г. пры Карпусах аховы памежжа былі створаны самастойныя асветніцкія сектары, якія павінны былі кіраваць культурна-асветніцкай працай мясцовай польскай адміністрацыі, грамадскіх устаноў і арганізацый, збіраць і захоўваць звесткі пра грамадскае жыццё на месцах, інфармаваць пра гэта вышэйшыя ваенныя інстанцыі, прапагандаваць ідэі мілітарызму сярод насельніцтва.

Як і грамадска-культурнае жыццё сялян, рабочых, інтэлігенцыі, дзе каштоўнасці масавай культуры атрымалі паўсюднае распаўсюджванне, духоўнае жыццё памешчыцкіх сядзіб з яго элементамі шляхецкай культуры таксама адчувала ўздзеянне цэлага шэрагу фактараў. Многія з

памешчыцкіх маёнткаў былі разбураны, спалены ці разрабаваны ў час Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Таму іх уладальнікам даводзілася аднаўляць палацы, набываць для іх арыгінальную мэблю, творы жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш. У маёнтках па-ранейшаму імкнуліся захоўваць сямейныя традыцыі, цікавіцца гісторыяй і генеалогіяй. Салоны, паляванні набылі больш рэпрэзентатыўны характар. Напрыклад, уладальнік Давыд-Гарадоцкай ардынацыі К. Радзівіл запрашаў на шматдзённае паляванне, якое мела добрае арганізацыйнае забеспячэнне, не толькі памешчыкаў Столінскага павета, сваякоў, але і ўплывовых польскіх палітычных дзеячаў (графа К. Замойскага, князёў Любамірскіх, Друцкіх-Любецкіх і інш.), дыпламатаў. Вельмі часта ў паляванні ўдзельнічаў кіраўнік англійскай ваеннай місіі ў Польшчы генерал А.К. дэ Віярт. За сваё апякунства над ласямі на тэрыторыі сваёй ардынацыі К. Радзівіл атрымаў шэраг міжнародных узнагарод [74, с. 460]. Нягледзячы на ваенныя страты і разбурэнні, у большасці маёнткаў працягвалі існаваць бібліятэкі і архівы, дзе захоўваліся старадрукі і рэдкія кнігі на розных мовах, каштоўныя гістарычныя дакументы. Так, старажытныя рукапісныя матэрыялы і каштоўная бібліятэка знаходзіліся ў памесці Р. Скірмунта ў Парэччы Пінскага павета [540, арк. 18]. Прыватны кнігазбор Скірмунтаў, які ў 1920 г. налічваў 1 тыс. экз. на польскай, французскай і іншых мовах, знаходзіўся ў Моладава Драгічынскага павета [831, с. 413]. Сярод буйных прыватнаўласніцкіх бібліятэк на тэрыторыі Заходняй Беларусі неабходна адзначыць таксама бібліятэку Радзівілаў у Нясвіжы (каля 10 тыс. экз.), С. Касакоўскага ў Вялікай Бераставіцы Гродзенскага павета, Віславухаў у Пярковічах Драгічынскага павета, Г. Грабоўскага ў Грушаўцы Баранавіцкага павета, пісьменніцы М. Радзевічуўны (Радзевіч) у Грушава Кобрынскага павета, К. Трымбіцкага ў Лінова Пружанскага павета і іншыя [831, с. 426, 122, 453, 214, 297]. Шырокую вядомасць ва ўсёй Польшчы атрымаў заснаваны ў 1922 г. графіняй Умястоўскай навуковы фонд імя У. і Я. Умястоўскіх, якому яна перадала фальваркі маёнтка Жамыслаў на Віленшчыне. У адным з гэтых фальваркаў быў узведзены і ўрачыста адкрыты ў жніўні 1938 г. дом адпачынку для навуковай і творчай інтэлігенцыі. У асобных маёнтках іх гаспадары наладжвалі розныя культурна-забаўляльныя мерапрыемствы. Напрыклад, у маёнтку Багданава Валожынскага павета, які належаў мастаку Ф. Рушчыцу, часта збіраліся грамадскія і культурныя дзеячы. Папулярнасцю ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі карысталіся вечары музыкі і літаратуры ў маёнтку Флер’янова Баранавіцкага павета, які належаў Т. Бохвіцу.

Такім чынам, культурнае жыццё польскай супольнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі наладжвалася як мясцовымі ўладамі, так і асабліва рознымі грамадскімі аб’яднаннямі, ўстановамі. Польскія грамадскія арганізацыі адрозніваліся паміж сабой мэтамі, задачамі, ідэалагічнай

арыентацыяй, структурай, масавасцю, сацыяльнай базай, аднак выступалі за пашырэнне каштоўнасцей польскай культуры. У межах заходнебеларускіх зямель іх аб’ядноўвала накіраванасць на ўключэнне ў рэалізацыю палітыкі нацыянальнай ці дзяржаўнай асіміляцыі мясцовага насельніцтва. Першапачаткова “крэсовыя” палякі мелі нізкі культурны ўзровень, аднак пры ўсямернай падтрымцы з боку дзяржаўных структур, грамадскіх інстытутаў да канца 1930-х гг. змаглі істотна ўзмацніць пазіцыі польскай культуры, але не забяспечылі яе панаванне. Паланізацыі спрыялі не толькі грамадска-палітычныя, культурна-асветніцкія арганізацыі, але і фармальна апалітычныя (рэлігійныя, жаночыя, пажарныя і інш.) аб’яднанні. Польскія ўлады ажыццяўлялі поўны ці частковы кантроль над грамадскімі аб’яднаннямі, імкнуліся павысіць эфектыўнасць іх культурна-асветніцкай і выхаваўчай работы.

У дзейнасці польскіх грамадскіх арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі можна вылучыць 3 асноўныя перыяды. Першы перыяд (першая палова 1920-х гг.) характарызаваўся ўзнікненнем нешматлікіх структурных адзінак арганізацый, накіраваных на польскую экспансію на ўсход. Другі перыяд (другая палова 1920-х–першая палова 1930-х гг.) вызначаўся структурнымі пераўтварэннямі вядучых грамадскіх арганізацый, набыццём некаторых з іх масавага характару, узмацненнем дзяржаўнага ўплыву ў праўрадавых арганізацыях і кантролю з боку польскай адміністрацыі над іншымі аб’яднаннямі, больш актыўным удзелам арганізацый у ажыццяўленні палітыкі паланізацыі беларускага насельніцтва. Ідэалагічная барацьба, саперніцтва, разнароднасць напрамкаў абцяжарвалі працу грамадскіх арганізацый. Хоць трэці перыяд (другая палова 1930-х гг.) па свайму зместу з’яўляўся працягам другога, аднак ён адлюстроўваў агульныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Польскай дзяржавы з сярэдзіны 1930-х гг. На фоне закрыцця беларускіх, украінскіх, рускіх, літоўскіх арганізацый рабіліся спробы па актывізацыі дзейнасці польскіх грамадскіх аб’яднанняў у справе паланізацыі мясцовага насельніцтва.

# ГЛАВА 4. КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЕ ЖЫЦЦЁ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ

## 4.1 Грамадска-культурная дзейнасць яўрэйскай супольнасці

У міжваеннае дваццацігоддзе на ўсё духоўнае жыццё яўрэйскага насельніцтва Заходняй Беларусі, яго побыт моцны ўплыў працягвалі аказваць традыцыйны ўклад і каштоўнасці іудаізму. Яўрэйская супольнасць вылучалася высокім узроўнем этнічнай свядомасці, кансерватыўнымі поглядамі, свядома ізалявалася ад неяўрэйскага асяроддзя дзеля захавання сваёй этнакультурнай самабытнасці. Зусім іншая абраднасць, традыцыі і звычаі, якой прытрымліваліся рэлігійныя яўрэі, сведчыла аб іх этнічнай адметнасці 1053, с. 47]. Артадоксы прызнавалі іўрыт свяшчэннай мовай літургіі, ідыш – мовай паўсядзённых зносін, а польскую мову – у якасці дзяржаўнай [250, арк. 2]. Па-ранейшаму важную ролю ў культурнай трансмісіі яўрэяў іграла іх рэлігійная адукацыя, якая складалася з 4-х тыпаў навучальных устаноў: хедэраў, талмуд-тораў, школ “Бет-Якаў” (“Bejs Jaków”) для дзяўчат і іешыў (ешыботаў) для хлопцаў. Традыцыйная асвета яўрэяў была накіравана на пазнанне рэлігіі, вышэйшым увасабленнем якой з’яўлялася Тора (Пяцікніжжа) [597, с. 10].

Вялікая ўвага рэлігійнаму выхаванню надавалася ў хедэрах, пачатковых школах для хлопцаў. Так як гэтыя навучальныя ўстановы не рыхтавалі дзяцей да рэальнага жыцця, то ў гарадах і вялікіх мястэчках у 1920-я гг. пачалі дзейнічаць рэфармаваныя хедэры, дзе выкладаліся і свецкія прадметы. Вучоба ў такіх навучальных установах залічвалася ў якасці выканання школьнага абавязку. Рэлігійныя прадметы выкладаліся пераважна на ідыш па ўласных праграмах, свецкія – па-польску ў адпаведнасці з праграмай міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы [230, арк. 2]. Заняткі пачыналіся з чытання малітваў. Польскую мову вывучалі з першага класа. У 1934/1935 навуч. годзе ў хедэрах ў Польшчы вучылася каля 100 тыс. яўрэйскіх хлопцаў [836, с. 40].

У адрозненне ад хедэраў, у талмуд-торах больш увагі надавалі вывучэнню свецкіх прадметаў, рэлігійныя прадметы выкладаліся там на іўрыце. Талмуд-торы не вызвалялі ад наведвання дзяржаўных пачатковых школ. У рэлігійных артадаксальных школах “Бет-Якаў” дзяўчаты раніцай ці вечарам засвойвалі на іўрыце толькі рэлігійныя дысцыпліны і яўрэйскія традыцыі. У 1934/1935 навуч. годзе школы “Бет-Якаў” ахоплівалі 20 тыс. дзяцей па ўсёй Польшчы [1224, с. 700]. У другой палове 1930-х гг. была праведзена рэарганізацыя адукацыйнага жаночага аб’яднання “Бет-Якаў”. Нягледзячы на змяншэнне матэрыяльнай падтрымкі з боку замежнай

яўрэйскай дыяспары, асабліва ад амерыканскай дабрачыннай арганізацыі “Джойнт” [778, арк. 650], у 1938 г. у межах Польскай дзяржавы арганізацыйная структура “Бет-Якаў” ахоплівала ў 250 установах 38 тыс. вучняў [1052, с. 245].

Значная частка талмуд-тораў функцыянавала ў заходнебеларускім краі. У Пінску з 5 яўрэйскіх рэлігійных школ былі 2 талмуд-торы – 2-класная (пры ёй у 1930 г. была адкрыта 3-класная рэлігійная школа “Бет-Якаў”) і 4-класная для хлопцаў, а таксама школа “Tuszia” („Тушыя”), 8-класная рэлігійная школа культурна-асветніцкага таварыства “Хорэў” (“Chorew”), якому падпарадкоўваліся ўсе талмуд-торы ў Польшчы [230, арк. 1; 231, арк. 2, 5, 8, 26; 232, арк. 15; 233, арк. 3]. У Гродна таксама дзейнічалі 2 талмуд-торы. На прыкладзе талмуд-торы №1 у Гродна, дзе ў 1928 г. 12 настаўнікаў навучалі 309 юнакоў і дзяўчат [288, арк. 46; 289, арк. 191], можна прасачыць змест і характар навучання, выхавання ў гэтых установах. Сярод прадметаў фігуравалі Талмуд, гісторыя яўрэяў, іўрыт, ідыш, польская мова, рэлігійныя спевы, гісторыя Польшчы, арыфметыка і геаметрыя, геаграфія, прыродазнаўства, маляванне, гімнастыка [285, арк. 83]. У пазашкольнай працы актыўна выкарыстоўваліся экскурсіі, гурткі. Так як вучнёўскі кантынгент паходзіў з незаможных яўрэйскіх сем’яў, пра што сведчыць аналіз сацыяльнага складу бацькоў (1932 г.)(рабочыя – 17,2%, краўцы – 15,4%, шаўцы – 10,4%, фурманы – 10%, рамеснікі – 9%, гандляры – 7,5%, насільшчыкі – 7%, столяры – 5,5%, маляры – 4,3%, урачы – 4,2% [падлічана паводле: 290, арк. 125–126], то частка дзяцей вызвалялася ад платы за навучанне. Большасць выдаткаў пакрывалася не столькі за кошт аплаты вучняў, колькі дапамогі яўрэйскай абшчыны, субсідый гарадскога магістрату, прыватных ахвяраванняў [290, арк. 132]. Да 1932 г. для 6 яўрэйскіх школ Гродна, у якіх вучылася каля 1,9 тыс. вучняў, выдзяляліся ад гарадской управы субсідыі ў памеры 75–80 тыс. злотых [290, арк. 253]. Вучні карысталіся паслугамі бібліятэк, што існавалі пры Гродзенскай яўрэйскай абшчыне, мясцовым цэнтры сіянісцкіх партый і арганізацый [291, арк. 93; 345, с. 218–222].

Яўрэйская абшчына (кагал), якая ў дарэвалюцыйны час захоўвала яўрэйскую традыцыйную культуру [597, с. 12], вымушана была займацца не толькі ўтрыманнем сінагог, малітоўных дамоў, могілак, сацыяльным забеспячэннем, выплатай пенсій рабінам і іншымі рэлігійнымі пытаннямі, але і клапаціцца пра школы, клубы і розныя культурна-асветніцкія ўстановы. У яўрэйскіх абшчынах Палескага ваяводства ў міжваенны час памер такой дапамогі вагаўся ў памеры 10–35% іх агульных выдаткаў [223, арк. 6]. Так як на адукацыйныя патрэбы ішла значная частка сродкаў яўрэйскіх абшчын, то нярэдка даводзілася звяртацца за падтрымкай да грамадскасці.

Сусветны эканамічны крызіс значна пагоршыў становішча яўрэйскіх рэлігійных навучальных установў. З 1932 г. гарадскі магістрат Гродна ўхіліўся ад ранейшых выплат на вывучэнне польскай мовы і асобных прадметаў па-польску, а гарадская рада зменшыла на 8,4% выдаткі на яўрэйскія школы [290, арк. 141, 146, 257]. Асноўны цяжар па ўтрыманню яўрэйскіх школ прыходзіўся на яўрэйскі кагал. Аналіз статыстычных матэрыялаў аб фінансаванні талмуд-торы №1 Гродна ў 1935–1938 гг. [290, арк. 236адв., 289, 335] сведчыць, па-першае, аб вымушаным пакрыцці яўрэйскім кагалам нявыкананых польскімі гарадскімі ўладамі фінансавых абавязацельстваў, па-другое, пра неплацяжаздольнасць яўрэйскага насельніцтва, якое моцна пацярпела ад сусветнага эканамічнага крызісу.

Частка выпускнікоў хедэраў і талмуд-тораў працягвала бясплатна вучобу ў іешывах (ешыботах), якія былі цэнтрамі іудзейскай тэалагічнай думкі, месцамі выхавання духоўнай эліты. Там найперш вывучалі Талмуд з каментарыямі і рыхтавалі рабінаў. Гэтыя навучальныя ўстановы ўтрымліваліся на ахвяраванні яўрэйскіх арганізацый, абшчын і прыватных асоб. Для падтрымкі навучэнцаў з незаможных сем’яў ў гродзенскай іешыве “Шаарэй Тора” у 1935 г. была заснавана стыпендыя імя Х. Ховеца (рабіна І.-М. Кагана) [292, арк. 19]. У 1934 г. рабін Х.О. Гродзенскі звяртаўся з заклікам аб падтрымцы ешывы “Тора Хэсэд” у Баранавічах [848, с. 68]. Пасля антысеміцкіх выступленняў у 1937 г. дырэкцыя іешывы “Тора Хэсэд” у Брэсце (рабіны І.В. Салавейчык, І.Х. Каплан) таксама звярталася да замежнай яўрэйскай дыяспары з просьбай аб матэрыяльнай падтрымцы [1012, с. 102].

У адрозненне ад малых іешыў (ktana), якія з’яўляліся сярэднімі школамі, былі і вялікія ешыботы (gdola), якія лічыліся вышэйшымі ўстановамі. Узорам для іншых талмудычных школ стаў ешыбот у Валожыне, “маці ешыботаў”, самы ранні не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Усходняй Еўропе, які быў заснаваны яшчэ ў 1802 г. (1803 г.) (паводле іншых звестак – у 1806 г.) Х. Валожынерам і атрымаў назву “Эц Гахаім” (“Дрэва жыцця”), тройчы беспаспяхова закрываўся расійскім царызмам. Ешыбот у Валожыне ведалі далёка за межамі Еўропы, установа карысталася папулярнасцю ў артадаксальных яўрэйскіх колах. Менавіта там вучыўся “яўрэйскі Купала” – паэт Х.Н. Бялік [387, с. 32–35]. Валожынскі ешыбот у 1920–30-я гады працягваў рыхтаваць яўрэйскіх інтэлектуалаў, праіснаваў да 1942 г. Сусветную вядомасць яшчэ ў пачатку XX ст. атрымаў пад кіраўніцтвам талмудыста, рабіна Э. Фінкеля ешыбот у Міры, заснаваны ў 1815 г. У міжваенны час большасць студэнтаў Мірскага ешыбота паходзіла з заходнебеларускіх зямель і іншых рэгіёнаў Польскай дзяржавы, а чвэрць студэнцкага кантынгенту складала моладзь з замежных краін (ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Бельгіі, Францыі, Паўднёвай Афрыкі і

іншых). Сярод студэнтаў ешыбота ў Міры былі і выпускнікі універсітэтаў [666; 1225, с. 194]. Акрамя ешыботаў у Валожыне і Міры, іешывы дзейнічалі таксама ў Вільні, Беластоку, Баранавічах, Брэсце (разам з хедэрам размяшчаўся ў будынку талмуд-торы, дзе навучалася каля 1 тыс. дзяцей з горада і навакольных мястэчак), Гродна, Камянцы, Клецку, Кобрыне (там дзейнічалі таксама рэфармаваны хедэр, талмуд-тора), Лідзе, Навагрудку, Пінску, Слоніме [747, арк. 18; 1052, с. 249]. Усяго ў Польшчы ў 1936 г. налічвалася 147 ешыботаў [836, с. 50].

Яўрэйскае артадаксальнае палітычнае аб'яднанне "Агудат Ісраэль" (з іўрыта "Agudat Israel" ("Саюз Ізраіля")), якое ў сваёй дзейнасці ў галіне адукацыі абапіралася на традыцыі іудаізму [184, арк. 116], а таксама сіяністкая партыя "Мізрахі" ("Mizrachi")(на іўрыце – "Merkaz Ruchani" ("Духоўны цэнтр")), лідэры якой імкнуліся спалучыць сіяністкія ідэі з каштоўнасцямі іудаізму, традыцыі яўрэйскай культуры з тагачаснымі дасягненнямі сусветнай цывілізацыі [336, арк. 162], аказвалі падтрымку хедэрам і іешывам. Шматлікія ешыботы, як і большасць хедэраў, талмуд-тораў, падпарадкоўваліся створанай у 1929 г. "Агудат Ісраэль" арганізацыі "Хорэў" ("Chorew"), якая аб'ядноўвала ў канцы 1936 г. 589 навучальных устаноў (73 тыс. вучняў) [1121, с. 145; 778, арк. 661]. Па некаторых звестках, у 1937 г. "Хорэў" падпарадкоўваліся 1 208 іешыў [1225, с. 194]. У 1927 г. у 400 аддзелах "Мізрахі" па ўсёй Польшчы было аб'яднана каля 100 тыс. чалавек [958, арк. 1]. Акрамя таго, "Мізрахі" мела разгалінаваную адукацыйную сетку (дзіцячыя садкі, пачатковыя і сярэднія школы, семінарыю па падрыхтоўцы рабінаў). Яе адукацыйныя ўстановы знаходзіліся пераважна на тэрыторыі Беластоцкага і Віленскага ваяводстваў. Партыя "Мізрахі" мела ўласную культурна-асветніцкую арганізацыю "Ябнэ" („Jawne"), мэтай якой з'яўлялася пашырэнне іўрыту, культуры і асветы сярод яўрэйскага насельніцтва ў рэлігійна-артадаксальным духу [295, арк. 150]. Таварыства "Ябнэ" мела ў 1927 г. 65 школ (5 686 дзяцей), дзе працавалі 344 настаўнікі. Асаблівасцю гэтых устаноў з'яўлялася арганічнае перапляценне рыс традыцыйных хедэраў і новых свецкіх школ. У адрозненне ад школ "Ябнэ" заходніх ваяводстваў Польшчы, дзе выкладанне ажыццяўлялася ў асноўным па-польску, на тэрыторыі Заходняй Беларусі перавага аддавалася іўрыту.

Уплывовай яўрэйскай культурна-асветніцкай арганізацыяй у заходнебеларускіх гарадах і мястэчках было заснаванае сіяністамі ў снежні 1922 г. таварыства "Тарбут" ("Tarbut") (з іўрыта – "Культура"). Новае таварыства ўзнікла на аснове існуючага з 1919 г. Бюро выхавання і адукацыі [844, с. 251]. У 1922 г. "Тарбут" перайшла разгалінаваная сетка іўрытамоўных устаноў – усяго 264 (34 320 вучняў, 1 019 настаўнікаў), з іх пачатковых школ налічвалася 227, гімназій – 4 [844, с. 250–251]. Яго

лідэры рашуча не прызнавалі клерыкальны характар "Агудат Ісраэль", хедэры і іешывы. Таварыства "Тарбут" мела права засноўваць і ўтрымліваць дзіцячыя садкі, пачатковыя школы, гімназіі і настаўніцкія семінарыі, бібліятэкі [295, арк. 9; 338, арк. 85]. У школах "Тарбут" яўрэйскую моладзь выхоўвалі ў нацыянальна-рэлігійным духу, рыхтавалі да жыцця і працы ў Палесціне, аднак акцэнт рабіўся не столькі на вывучэнне іудаізму, колькі на выкладанне іўрыту, пазнанне свецкай яўрэйскай культуры. Акрамя школ, адкрываліся народныя універсітэты, бібліятэкі, вячэрнія і рэлігійныя курсы не толькі ў буйных гарадах, але і ў невялікіх мястэчках.

У самым пачатку свайго існавання таварыства "Тарбут" перажывала крызіс, выкліканы складаным фінансавым становішчам адукацыйных устаноў, скарачэннем іх колькасці з-за нізкага ўзроўню навучання, малалікасці вучнёўскага кантынгенту. Аднак да канца 1920-х гг. сітуацыя нармалізавалася, пра што сведчыць дынаміка колькасці ўстаноў: у 1923/1924 навуч. годзе ў Польшчы дзейнічалі 144 пачатковыя школы, у 1924/1925 г. – 150, у 1925/1926 г. – 113 (паводле іншых звестак, да 1927 г. "Тарбут" мела каля 200 пачатковых школ) [958, арк. 1], у 1929/1930 г. – 151. Паводле звестак МУС Польшчы, у 1930 г. налічвалася 269 устаноў "Тарбут", з іх 173 пачатковыя школы і 10 гімназій (табліца 4.1 [1121, с. 145; 844, с. 251, 262; 1052, с. 249; 413, с. 754–756]).

Табліца 4.1 – Адукацыйныя ўстановы "Тарбут" у Польшчы ў 1925–1934 гг.

| Год | Пачатк. школы | Гімназіі | Настаўніцк. семінарыі | Педагагічныя курсы | Дзіцячыя садкі | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1925 | 113 | 13 | 3 | 1 | 46 | 176 |
| 1926 | 123 | 16 | 5 | 2 | 58 | 204 |
| 1927 | 141 | 15 | 5 | 2 | 71 | 234 |
| 1928 | 143 | 12 | 5 | 2 | 75 | 237 |
| 1929 | 151 | 11 | 5 | 2 | 78 | 247 |
| 1930 | 173 | 10 | 5 | 2 | 79 | 269 |
| 1931 | 175 | 9 | 3 | 1 | 65 | 253 |
| 1932 | 182 | 9 | 3 | 1 | 63 | 258 |
| 1933 | 191 | 9 | 4 | 1 | 64 | 269 |
| 1934 | 183 | 8 | 4 | - | 72 | 267 |

Паводле некаторых ацэнак, узровень пісьменнасці яўрэяў у мястэчках Палескага ваяводства быў самым нізкім у Польшчы [833, с. 177]. Так як на Палессі польскія ўлады не змаглі стварыць разгалінаванай сеткі дзяржаўных адукацыйных устаноў, то яўрэйскай супольнасці даводзілася ўтрымліваць прыватныя школы. Невыпадкова, што ў 1931 г. у Палескім ваяводстве з 4 950 іудзеяў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі, у сферы адукацыі і культуры было занята 1 945 [1159, с. 57]. Аналіз статыстычных матэрыялаў

паказвае, што кардынальных зрухаў у стварэнні сеткі дзяржаўных адукацыйных устаноў да сярэдзіны 1930-х гг. там не адбылося. Калі ў 1924/1925 навуч. годзе 52,5% яўрэйскіх дзяцей у Палескім ваяводстве вучылася ў прыватных яўрэйскіх школах (у цэлым у Польшчы – 17,8%), то да 1934/1935 навуч. года гэтыя паказчыкі склалі адпаведна 42,3% (19,2%) [1124, с. 32–74]. Амаль палову гэтых устаноў на Палессі складалі школы “Тарбут” – да 1927/1928 навуч. году іх агульная колькасць дасягнула там 23 (разам з установамі Сарненскага і Камень-Кашырскага паветаў, якія не ўключаны ў табліцу 4.2 [234, арк. 5–10; 235, арк. 2–14; 1176, с. 289]). З гімназій “Тарбут” толькі 2 ва ўсёй Польшчы (у Пінску і Беластоку) атрымалі правы грамадскіх устаноў [1052, с. 247]. Сярод выкладчыкаў пінскай гімназіі “Тарбут”, заснаванай у 1926 г. на базе 4-класнай школы (з 1937 г. пры ёй дзейнічаў гуманітарна-прыродазнаўчы ліцэй), былі вопытныя, кваліфікаваныя кадры. Вялікім аўтарытэтам карыстаўся Д. Альпер, які з 1931 г. быў дырэктарам гімназіі [378, с. 89]. Гімназія “Тарбут” мела самую вялікую ў Пінску бібліятэку, якая налічвала ў 1936 г. 4,5 тыс. кніг [831, с. 457]. Пры гэтай гімназіі ў 1927 г. была заснавана пачатковая школа. Гімназія “Тарбут” была даступнай для дзяцей з заможных яўрэйскіх сем’яў, хаця строгай сацыяльнай селекцыі пры прыёме ў склад вучняў не было. Навучэнцы прымалі актыўны ўдзел у грамадскай дзейнасці, падрыхтоўцы выданняў. Так, была надрукавана газета “Выхаванне-культура” да прыезду восенню 1931 г. паэта Х.Н. Бяліка (пры наведванні гарадоў і мястэчак выступаў з лекцыямі на іўрыце аб яўрэйскай культуры) [1119, с. 119–120]. У Палескім ваяводстве другая гімназія “Тарбут” пасля пінскай узнікла ў Брэсце (дырэктар – Ш. Лютвак), якая мела гуманітарны профіль [732, с. 268–269].

Намаганнямі сіяністаў на месцах праводзіліся лекцыі, канферэнцыі, разгортвалася выдавецкая дзейнасць, адкрываліся прафесійныя курсы. Пры адкрытай у 1925 г. у Брэсце першай яўрэйскай публічнай бібліятэцы былі заснаваны вячэрнія курсы, сярод слухачоў якіх быў актывіст мясцовай сіяніцкай арганізацыі М. Бегін, будучы прэм’ер-міністр Ізраіля. Палесцінская тэматыка была найбольш пашыранай у культурна-асветніцкай працы сіяністаў. Так, аддзел Агульнай сіяніцкай арганізацыі ў Пінску з 1925 г. наладзіў чытанне лекцый “Яўрэі і адраджэнне Палесціны”, “Яўрэйская моладзь і аднаўленне Палесціны”, “Вёска і горад у Палесціне” і інш. [150, арк. 25]. Там жа таксама праводзіліся зрэдку шматлюдныя мерапрыемствы ў гонар заснавальніка сіяніцкага руху Т. Герцля. Заснаваны ў 1925 г. у Пінску філіял Таварыства прыяцеляў Яўрэйскага універсітэту ў Іерусаліме праводзіў публічныя лекцыі, збіраў ахвяраванні для гэтай ВНУ [160, арк. 2–4; 164, арк. 13–14, 24, 31, 35]. Брэсцкае аддзяленне сіяніцкай арганізацыі ажыўлена праводзіла лекцыі па гісторыі

Палесціны, яе каланізацыі [219, арк. 34, 67, 141, 150, 156]. Нярэдка ў якасці лектараў выступалі запрошаныя прадстаўнікі яўрэйскай інтэлігенцыі. Напрыклад, у снежні 1923 г. з Варшавы ў Навагрудак прыязджаў кіраўнік Палесцінскага эміграцыйнага бюро, які падзяліўся ўласнымі ўражаннямі ад наведвання Палесціны, даў карысныя парады патэнцыяльным эмігрантам [337, арк. 41]. Палесцінская праблематыка нярэдка дапаўнялася міжнароднымі аглядамі жыцця яўрэйскай дыяспары, паведамленнямі па культуралогіі, літаратуры.

Табліца 4.2 – Школы “Тарбут” у Палескім ваяводстве ў 1927/1928 навуч. годзе

| Павет | Населены пункт | Тып школы | Колькасць вучняў | Колькасць настаўнікаў |
|---|---|---|---|---|
| Брэсцкі | Брэст | 4-класн. | 136 | 5 |
| | Брэст | 3-класн. | 121 | 4 |
| | Камянец | 2-класн. | - | 2 |
| Драгічынскі | Драгічын | 7-класн. | 131 | 8 |
| | Янаў-Палескі | 7-класн. | - | 6 |
| Кобрынскі | Кобрын | 7-класн. | 231 | 7 |
| Косаўскі | Косава | 5-класн. | 124 | 5 |
| | Ружаны | 7-класн. | 107 | 5 |
| Лунінецкі | Лунінец | 4-класн. | 87 | 3 |
| | Ганцавічы | 4-класн. | 65 | 3 |
| Пінскі | Пінск | 7-класн. | 228 | 7 |
| | Пінск | 1-класн. | 31 | 2 |
| Пружанскі | Пружаны | 7-класн. | 229 | 8 |
| | Бяроза-Картузская | 4-класн. | 92 | 4 |
| | Шарашоў | 4-класн. | 98 | 4 |
| Столінскі | Столін | 7-класн. | 226 | 6 |
| | Давыд-Гарадок | 7-класн. | 241 | 7 |
| | Высоцк | 2-класн. | 57 | 2 |

У буйных гарадах Галоўная управа “Тарбут” заснавала рэгіянальныя прадстаўніцтвы, якія мелі высокую ступень самастойнасці. У прыватнасці, у Вільні было заснавана прадстаўніцтва Віленскага ваяводства, у Гродна – Беластоцкага ваяводства. Паступова складвалася сетка аддзелаў “Тарбут”. Толькі на працягу 1929–1930 гг. у Палескім ваяводстве іх было адкрыта каля 30 [163, арк. 5]. У Навагрудскім ваяводстве найбольш актыўныя аддзелы “Тарбут” былі ў Слоніме, Лідзе, Іўі, Шчучыне, Міры [338, арк. 85]. “Яўрэі ў сваіх культурна-асветніцкіх гуртках робяць шмат працы, намаганні накіраваны найперш на азнаямленне мас з культурнымі і мастацкімі здабыткамі сучасных яўрэйскіх пісьменнікаў, – адзначалася ў адной са справаздач IX КАП за 1929 г. – Маладое яўрэйскае мастацтва ўсё

больш знаходзіць падтрымку як сярод сіяністаў, так і нават артадоксаў” [161, арк. 46адв.]. Аднак развіццю сіянісцкага руху перашкаджалі адсутнасць арганізацыйнага і ідэалагічнага адзінства, фракцыйная барацьба.

З-за негатыўных наступстваў сусветнага эканамічнага крызісу, абмежавальных мер польскіх улад, недахопаў школьнай рэформы да сярэдзіны 1930-х гг. значна аслаблі пазіцыі ўстаноў “Тарбут”, як і ўсёй яўрэйскай адукацыі. На канферэнцыі “Тарбут” у канцы верасня-пачатку кастрычніка 1931 г. уздымаліся пытанні аб шляхах паляпшэння фінансавага становішча, аздараўленні арганізацыйнай структуры [1117, с. 106; 1118, с. 103]. Нягледзячы на складаны фінансавы стан, з канца 1931 г. назіралася актывізацыя мясцовых аддзелаў “Тарбут”, руху за адраджэнне іўрыта ў якасці гутарковай мовы і накіраванасць на перасяленне ў Палесціну [1120, с. 97]. У сувязі з закрыццём школ “Тарбут” сіянісцкія арганізацыі Польшчы звярталіся ў красавіку 1934 г. з адозвай аб падтрымцы да яўрэйскага насельніцтва ў Палесціне [780, арк. 1–40]. Аднак неабходна адзначыць, што калі ў 1920-я гг. значную частку прыбытку “Тарбут” складала знешняя дапамога, то ў 1930-я гг. даводзілася спадзявацца на грашовую дапамогу мясцовых сіянісцкіх арганізацый, у тым ліку маладзёжных [864, с. 50]. Усяго ў Польшчы ў 1934/1935 навуч. годзе налічвалася 192 пачатковыя школы і 9 гімназій “Тарбут”, што ахоплівалі каля 37 тыс. дзяцей [1030, с. 165].

Хоць і з вялікімі цяжкасцямі, аднак у другой палове 1930-х гг. працягваўся працэс аднаўлення адукацыйнай сеткі “Тарбут”. Усяго ў 1937/1938 навуч. годзе ў Віленскім ваяводстве было 37, Навагрудскім – 35, Беластоцкім – 27, Палескім – 11 школ “Тарбут” розных тыпаў [864, с. 97]. У сувязі з закрыццём у чэрвені 1936 г. настаўніцкай семінарыі “Тарбут” у Гродна абвастрылася пытанне аб настаўніцкіх кадрах. Таму невыпадкова, што ў студзені 1937 г. на пасяджэнні кіраўніцтва “Тарбут” было вырашана стварыць асобную настаўніцкую семінарыю ў Варшаве [778, арк. 804].

Рэлігійныя каштоўнасці аказвалі значны ўплыў на культуру і асвету яўрэяў, аднак ужо не займалі выключна дамінуючае становішча ў іх жыцці. У грамадска-культурным жыцці яўрэяў станавілася выразнай свецкая тэндэнцыя, якая знаходзіла падтрымку ў розных сацыяльных, прафесійных, узроставых групах яўрэйскай супольнасці. Наватарскія ідэі з іх дэмакратызмам, адсутнасцю абсалютызацыі іудаізму імпанавалі інтэлігенцыі, моладзі. Ідэі свецкай адукацыі і культуры знаходзілі ўсё больш прыхільнікаў не толькі ў буйных гарадах, але і мястэчках. Артадаксальнае мястэчка (sztetł) працягвала захоўваць традыцыйны ўклад жыцця яўрэяў, аднак моладзь усё больш адыходзіла ад рэлігіі, звычаяў продкаў [878, с. 236; 1105, с. 71; 542, с. 662–663]. Можна сцвярджаць аб

канфлікце пакаленняў, барацьбе паміж мінулым (яўрэйскія традыцыі і звычаі) і будучыняй (прагрэс), які насіў яшчэ і ідэалагічнае адценне. Паводле ўспамінаў А. Шаца, яго набожны дзядуля ў Бярозе-Картузскай Косаўскага павета, які не прызнаваў газет і ўсе навіны даведваўся ў сінагозе, хацеў бачыць сваіх унукаў таксама іудзеямі-артадоксамі [1061, с.49]. Праведзеныя ў 1926 г. сацыялагічныя даследаванні засведчылі, што практыку штодзённых малітваў мела больш 80% яўрэйскіх дзяцей да 14 гадоў. Аднак ва ўзроставай групе звыш 20 гадоў гэты паказчык змяншаўся да 48,5% у гарадах і 35,7% у малых мястэчках [878, с. 232]. Нельга поўнасцю пагадзіцца са сцвярджэннямі, што складанае матэрыяльнае становішча, дыскрымінацыйная палітыка польскіх уладаў вызначылі маргінальнасць яўрэйскага насельніцтва Заходняй Беларусі [605, с. 365]. Па-першае, маргінальнасць пачала праяўляцца ў яўрэйскім асяроддзі яшчэ задоўга да ўключэння заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы. Па-другое, маргіналізацыя не пераважала ў яўрэйскім грамадстве, якое мела замкнуты этнаканфесійны, моўны, культурны характар, хаця працэсы мадэрнізацыі, свецкасці не з’яўляліся для яго чужымі.

Нягледзячы на сацыяльна-эканамічныя цяжкасці, антысемітызм, у асяроддзі мясцовай яўрэйскай супольнасці разгортваліся працэсы нацыянальна-культурнага адраджэння (“постГаскалы” (ПостАдраджэння), “адаптаванай Гаскалы”), тэарэтычнае абгрунтаванне якога пачалося ў пачатку ХХ ст. У вытокаў канцэпцыі ідышызму як свецкай яўрэйскай культуры, заснаванай на роднай мове яўрэяў-літвакоў – ідыш, былі відныя грамадскія дзеячы, вучоныя (лідэр Бунда Х. Жытлоўскі, гісторык С. Дубноў і іншыя). Ідыш прызнаваўся фундаментам яўрэйскай нацыянальнай тоеснасці. Ідэолагі ідышызму выступалі за дэмакратызацыю адукацыі і культуры, пераўтварэнне ідыш з гутарковай мовы ў мову навукі, літаратуры, павышэнне яе грамадскага прэстыжу. Для яўрэйскага насельніцтва заходнебеларускіх зямель мова ідыш выконвала інтэгратыўную ролю [619, с. 50], займаючы пануючае становішча ў яго паўсядзённым жыцці, адукацыі, культурным жыцці. Паводле вынікаў перапісу насельніцтва 1931 г., у Навагрудскім ваяводстве 84,2% яўрэяў прызналі сваёй роднай мовай ідыш, у Палескім ваяводстве – 84,6%, Віленскім ваяводстве (акрамя Вільні) – 85,5% (агульнапольскі паказчык складаў 79,9%). Стварэнне свецкай яўрэйскай нацыянальнай культуры на ідыш з’яўлялася своеасаблівым эксперыментам, сур’ёзным аргументам на карысць нерэалізаванай яўрэйскай нацыянальнай аўтаноміі [1033, с. 97].

Хоць у міжваенны час ранейшыя ўплывы рускай культуры ў асяроддзі яўрэяў паступова змяняліся ўплывамі польскай культуры, мовы, найперш пад уздзеяннем сістэмы адукацыі, аднак даволі прадстаўнічая частка яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі (асабліва

сярэдняга і старэйшага пакалення) перавагу аддавала рускай культуры і мове, прызнавала польскую культуру чужой [1189, с. 130]. Рускія культурныя ўплывы аказвалі істотны ўплыў на фарміраванне яўрэйскай інтэлігенцыі, асабліва ў 1920-я гг. Такая сітуацыя ў моўнай сферы выклікала занепакоенасць польскіх улад.

Першыя свецкія адукацыйныя ўстановы з выкладаннем на ідыш пачалі ствараццa яшчэ ў пачатку XX ст. У 1906 г. у Вільні з’явіліся школы для дарослых, народныя вучылішчы, клубы. Хоць царскія ўлады і перашкаджалі, аднак там жа ў 1914 г. сіяністы адкрылі нешматлікія школы з выкладаннем на іўрыце [864, с. 18]. Далейшае станаўленне ідышамоўнай яўрэйскай адукацыі адбывалася ў час Першай сусветнай вайны [454, с. 14]. Дзеячы Бунда, якія падтрымлівалі канцэпцыю ідышызму, стаялі ў вытокаў стварэння ў ліпені 1921 г. у Варшаве Цэнтральнай яўрэйскай школьнай арганізацыі (ЦЯША) (Centrale Jidisze Szuł-Organizacje (CISzO)) [1025, с. 150]. Выхаванне моладзі ў духу яўрэйскай нацыянальнай культуры, фарміраванне ў яе нерэлігійнага светапогляду, пашырэнне ідэй сацыялізму з’яўляліся галоўнымі мэтамі гэтай культурна-асветніцкай арганізацыі. Адукацыя павінна набыць свецкі характар, з засваеннем прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін [1052, с. 246]. Навучальныя ўстановы ЦЯША, якія супрацьпастаўляліся хедэрам, павінны былі ўяўляць сабой новы від “яўрэйскай свецкай школы сацыялістычнага тыпу” [927, с. 48], без нацыяналізму, клерыкалізму, з выкладаннем на ідыш, прызначаны для дзяцей яўрэйскіх працоўных. У адрозненне ад устаноў “Тарбут” там асаблівая ўвага надавалася вывучэнню ідыш, польскай мовы і іншых прадметаў [1224, с. 668]. Разам з вывучэннем ідыш прадугледжвалася вывучэнне літаратуры ідыш (твораў М. Сфорыма, Ш. Алейхема, І. Перэца і іншых класікаў). У ЦЯША пераважалі ўплывы Бунда і Паалей Цыён, партыі сацыял-сіяніскага напрамку. Сацыялісты імкнуліся стварыць арганізацыі, пазбаўленыя шматлікіх абмежаванняў традыцыйнага іудаізму, перасталі быць “ідэалагічным гета” [1052, с. 241; 1217, с. 115]. Ідышамоўная свецкая культура павінна была стаць агульнадаступнай.

Табліца 4.3 – Адукацыйныя ўстановы ЦЯША у Польшчы ў 1924–1938 гг.

| Навучальны год | Колькасць школ | Кантынгент вучняў (тыс. чалавек) |
|---|---|---|
| 1924/1925 | 102 | 12,9 |
| 1926/1927 | 123 | 14,4 |
| 1928/1929 | 166 | 21,5 |
| 1929/1930 | 177 | 19,1 |
| 1931/1932 | 110 | 15,4 |
| 1934/1935 | 87 | 12,3 |
| 1936/1937 | 74 | 9,7 |
| 1937/1938 | 57 | 8,1 |

З-за спрыяльнай этнакультурнай атмасферы для яўрэйскага жыцця пераважная большасць школ ЦЯША размяшчалася на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Да заняпаду, які назіраўся ў 1922–1923 гг. (было закрыта 44 установы) [1030, с. 181], ЦЯША мела самую разгалінаваную сетку адукацыйных устаноў, значна апераджаючы “Тарбут”. Працэс стварэння гэтых устаноў паскорыўся з другой паловы 1924 г. пасля з’яўлення адпаведнага школьнага заканадаўства пад уздзеяннем праведзенай прапагандысцкай акцыі. Так, у лістападзе 1924 г. у Брэсце быў наладжаны вулічны збор ахвяраванняў для яўрэйскіх школ, прыём новых членаў у культурна-асветніцкую арганізацыю [339, арк. 521]. У лютым 1925 г. на III з’ездзе ЦЯША было вырашана рабіць акцэнт на ідыш і свецкі характар устаноў. Хаця ідыш прызнаваўся ў іх абавязковай мовай, аднак дапускалася выкладанне і іўрыта [732, с. 373].

Табліца 4.4 – Размяшчэнне школ ЦЯША у Палескім ваяводстве ў 1929/1930 навуч. годзе

| Павет | Населены пункт | Тып школы |
|---|---|---|
| Брэсцкі | Брэст | 4-класн. |
| | Брэст | 6-класн. |
| | Брэст | 6-класн. |
| | Высока-Літоўск | 7-класн. |
| Косаўскі | Ружаны | 3-класн. |
| Пінскі | Пінск | 7-класн. |
| | Пінск | 7-класн. |
| Пружанскі | Пружаны | 5-класн. |
| | Бяроза-Картузская | 5-класн. |
| Столінскі | Столін | 1-класн. |

У адрозненне ад “Тарбут”, працэс аднаўлення сеткі адукацыйных устаноў ЦЯША ў 1924–1928 гг. ішоў больш павольна, асабліва на тэрыторыі Палескага ваяводства [1176, с. 291]. Нягледзячы на рэпрэсіўныя дзеянні з боку польскіх улад, на працягу 1927/1928 і 1928/1929 навучальных гадоў установы ЦЯША ва ўсёй Польшчы павялічылі ахоп дзяцей з 13,5 тыс. да 24 тыс. Колькасныя паказчыкі за адзначаныя гады (пачатковых школ – адпаведна 95 (114), гімназій – 6 (3), настаўніцкіх семінарый – 1 (1), дзіцячых садкоў – 33 (46), вячэрніх школ – 65 (52)) сведчаць аб захаванні і ўмацаванні асобных пазіцый ЦЯША. Пазітыўнай была дынаміка колькасці вучняў пачатковых школ і выхаванцаў дзіцячых садкоў: у 1926 г. – 10 тыс., у 1928 г. – 14 тыс. [1052, с. 246; 488, арк. 63]. Нягледзячы на разыходжанні з прыведзенай вышэй колькасцю школ і вучняў, дынаміку адукацыйных устаноў ЦЯША у 1924–1938 гг. можна прасачыць па табліцы 4.3 [1030, с. 182]. Як сведчаць звесткі, прыведзеныя ў табліцы 4.4 [339, арк. 521; 234, арк. 9, 10, 13, 15, 29, 31; 235, арк. 2, 5, 10,

13, 14, 184; 236, арк. 10, 22], да 1929/1930 навуч. года ў Палескім ваяводстве ўдалося адкрыць 10 школ ЦЯША (з улікам 3-класнай школы ў Сарнах – 11), дзе займаліся дзеці пераважна з незаможных яўрэйскіх сем'яў.

Негатыўныя вынікі сусветнага эканамічнага крызісу, дыскрымінацыйная нацыянальная палітыка польскіх урадаў, узмацненне аўтарытарнай тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці, заняпад дзейнасці Бунда, канкурэнцыя з боку "Тарбут" абумовілі ў першай палове 1930-х гг. аслабленне пазіцый ЦЯША, асабліва яе пачатковых школ – да 1934 г. іх засталося 68 [315, арк. 14]. У Палескім ваяводстве пасля закрыцця школ ЦЯША ў Століне і Пружанах іх засталося 9. Актывісты ЦЯША у сваёй дзейнасці аддавалі перавагу палітычнай прапагандзе. Напрыклад, у Лідскім павеце восенню 1933 г. культурна-асветніцкай працы надавалася мала ўвагі, бо мясцовае яўрэйскае насельніцтва было празмерна зацікаўлена выбарамі ва ўправы абшчын [778, арк. 123]. Аналіз асноўных тыпаў адукацыйных устаноў ЦЯША у Польшчы сведчыць, што разам са змяншэннем колькасці пачатковых школ, адбывалася скарачэнне дзіцячых садкоў, гімназій – у 1934/1935 навуч. годзе іх засталося адпаведна 11 і 2 (у Вільні (мела статус грамадскай установы) і Беластоку). Стабільнай заставалася толькі колькасць вячэрніх школ – 65 (як і 10 гадоў назад) [836, с. 69–70].

Толькі ў пачатку 1935 г. назіралася некаторае ажыўленне дзейнасці ЦЯША, выкліканае агульным уздымам рабочага руху ў Польшчы. У кастрычніку 1935 г. на канферэнцыі рабочых прафсаюзаў было вырашана падтрымаць школы з выкладаннем на ідыш. Агульная колькасць дзяцей ва ўстановах арганізацыі ЦЯША складала ў 1935/1936 навуч. годзе 10 тыс. (па іншых ацэнках – 15,5 тыс.) [1052, с. 246; 1030, с. 167], у 1936/1937 навуч. годзе – каля 17 тыс. [488, арк. 65]. Са 169 розных устаноў (1935 г.) было 11 дзіцячых дамоў, 86 пачатковых школ, 2 гімназіі, 65 вячэрніх школ, 5 дзённых школ [295, арк. 9; 1224, с. 669–700]. Нягледзячы на гэта, значная частка яўрэйскай рабочай моладзі не была ахоплена адукацыйнай сеткай ЦЯША, вымушана была вучыцца ў польскіх дзяржаўных школах ці яўрэйскіх рэлігійных установах. Хоць так і не ўдалося рэалізаваць на практыцы ў поўным аб'ёме праект стварэння свецкай яўрэйскай адукацыі, аднак у справе стварэння яўрэйскіх навучальных устаноў ЦЯША з'яўлялася другой нацыянальнай арганізацыяй пасля сіяніцкай "Тарбут".

Састаўной часткай ЦЯША быў Цэнтральны камітэт па адукацыі (ЦКА) з сядзібай у Вільні, створаны левым крылом ідышысцкага руху. У склад кіраўніцтва гэтай арганізацыі ўваходзілі старшыні Г. Каварскі, Ц. Шабад, А. Розенталь, Б. Каган, І. Чэрніхаў і іншыя дзеячы яўрэйскай супольнасці.

Урач Ц. Шабад, актыўны дзеяч і заснавальнік Яўрэйскай дэмакратычнай партыі, адстойваў ідэю яўрэйскай нацыянальна-культурнай аўтаноміі не толькі ў межах ЦЯША і ЦКА, але і ў органах гарадскога самакіравання Вільні, у польскім сейме. Арганізацыяй курсаў, правядзеннем асветніцкай працы займалася Віленскае яўрэйскае школьнае таварыства (“Вільбіг” (Wilner Jidisze Bildungs-Gezelszaft „Wilbig”).

Лідэры Аб’яднання яўрэйскіх школ (АЯШ) таксама выступалі за новую школу, свабодную ад нацыяналістычнага і рэлігійнага ўплыву. На працягу 1920-х гг. аддзелы АЯШ узніклі ў многіх заходнебеларускіх гарадах і мястэчках. У Палескім ваяводстве ў 1924 г. было 9 аддзелаў АЯШ (каля 800 чалавек) [166, арк. 23]. Аддзелы АЯШ, як і структурныя адзінкі ЦЯША, фактычна з’яўляліся прапагандысцкімі пляцоўкамі Бунда [471, с. 245], за што падвяргаліся вострай крытыцы з боку сіяністаў.

У другой палове 1920-х – першай палове 1930-х гг. бундаўскія арганізацыі праз свае рабочыя кааператывы, якія мелі свае клубы, бібліятэкі, народныя універсітэты, узмацнілі культурна-асветніцкую працу. Тэматычны дыяпазон іх навукова-папулярных лекцый закранаў разнастайныя аспекты літаратуры, грамадскіх навук, гісторыі і г. д. Напрыклад, у маі-чэрвені 1928 г. у Брэсце быў праведзены цыкл лекцый па яўрэйскай літаратуры, сацыялогіі, сусветнай гісторыі [1176, с. 291]. З сярэдзіны 1930-х гг. у бундаўскіх арганізацыях мала ўвагі надавалі культурна-асветніцкай працы, што было выклікана ўзмацненнем барацьбы за ўплыў у яўрэйскіх абшчынах, палітычнай актыўнасцю Бунда ў кантэксце стварэння адзінага антыфашысцкага дэмакратычнага фронта, хваляй антысемітызму ў Польшчы. Адчувалася і тое, што ў адрозненне ад сіянісцкіх, рэлігійных артадаксальных аб’яднанняў пазіцыі яўрэйскай інтэлігенцыі ў бундаўскіх арганізацыях былі слабейшымі.

У міжваенны час ў межах Польскай дзяржавы разгарнула сваю дзейнасць яшчэ адна яўрэйская культурна-асветніцкая арганізацыя – “Культур-Ліга” (“Kultur-Liga”)(створана ў 1922 г. паводле пагаднення паміж Бундам, Паалей Цыёнам, “Ферайнігтэ” на аснове існуючай яшчэ з 1917 г. “Лігі пралетарскай культуры”). Спачатку “Культур-Ліга” была нацэлена на прапаганду сярод яўрэйскіх працоўных мас ідэй аб перабудове існуючага грамадскага ладу ў духу пралетарскай культуры, потым выступала ў абарону развіцця культуры ідыш [222, арк. 106, 186]. У другой палове 1920-х гг. у Віленскім, Беластоцкім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах была створана сетка структурных адзінак гэтай арганізацыі, якія разам з аддзеламі ЦЯША з’яўляліся элементамі арганізацыйнай структуры Бунда [470, с. 13]. У Палескім ваяводстве налічвалася каля 30 аддзелаў “Культур-Лігі” – у Брэсце, Пінску, Кобрыне, Пружанах, Дамачава, Бярозе, Століне, Давыд-Гарадку і іншых гарадах, мястэчках

[185, арк. 16; 166, арк. 23; 1176, с. 292]. На тэрыторыі Навагрудскага ваяводства вылучаліся аддзелы “Культур-Лігі” у Навагрудку, Шчучыне, Баранавічах, Нясвіжы, Міры, Лідзе, Быцені, Слоніме, у Беластоцкім ваяводстве – у Беластоку, Гродна, Ваўкавыску, Гарадку і Крынках [806, арк. 49]). Акрамя лекцый, аддзелы наладжвалі вечары, тэатральныя прадстаўленні, музычна-канцэртныя праграмы. Пасля перыяду заняпаду ў дзейнасці “Культур-Лігі”, які назіраўся з канца 1920-х гг., у другой палове 1930-х гг. пачалося ажыўленне, у ходзе якога рабіўся акцэнт на асветніцкую працу і барацьбу з непісьменнасцю. У межах Польшчы ў 1937 г. знаходзілася 160 аддзелаў [778, арк. 807], аднак матэрыяльныя цяжкасці моцна абмяжоўвалі іх дзейнасць.

Традыцыйная яўрэйская сям’я, кагал не змаглі ўжо спаўна задаволіць усіх зацікаўленняў моладзі, таму гэта з’яўлялася адной з прычын прытоку ў 1930-я гг. яўрэйскай моладзі як ў палітычныя партыі, так і грамадскія арганізацыі [1030, с. 77, 92]. Бунд актыўна ажыццяўляў культурна-асветніцкую дзейнасць сярод яўрэйскай моладзі, асабліва пры дапамозе сваіх маладзёжных арганізацый “Цукунфт” (“Cukuhft”) (“Будучыня”), “Скіф” (“Skif”), спартыўнай арганізацыі для падлеткаў “Jutrznia” (“Зара”). Бундаўская маладзёжная арганізацыя “Цукунфт” стала масавай, у асобных гарадах і мястэчках пад яе ўплывам знаходзілася практычна ўся яўрэйская моладзь [483, арк. 15; 499, арк. 293]. Аддзелы “Цукунфт” стваралі клубы, бібліятэкі, вячэрнія школы для рабочай моладзі, гурткі самаадукацыі, драматычныя і харавыя калектывы, аркестры. Пры падтрымцы Бунда ў 1936–1938 гг. “Цукунфт” і “Скіф” арганізавалі для яўрэйскай моладзі сетку летніх лагераў адпачынку. У Палескім ваяводстве буйны лагер быў утвораны ў Дамачаве Брэсцкага павета, дзе для моладзі праводзіліся экскурсіі, турпаходы, дыскусіі і г. д. [192, арк. 7].

Неадназначнае ўспрыняцце часткай яўрэйскай інтэлігенцыі выключнай прыхільнасці да іўрыту з боку сіяністаў, а таксама сацыялістычных поглядаў бундаўцаў з іх абсалютызацыяй ідыш, выклікала стварэнне ў 1928 г. таварыства “Шуль-Культ” (“Школьны і культурны саюз” (“Szul und Kultur Farband” – скарочана “Szul-Kult”), куды ўваходзілі прадстаўнікі розных груп сіяністаў, Паалей Цыён-правіцы, людоўцы [1217, с. 135]. Дзеячы “Шуль-Культ” займаліся стварэннем школ з выкладаннем на ідыш (свецкія агульнаадукацыйныя дысцыпліны) і іўрыце (рэлігійныя прадметы), што было пэўным кампрамісам паміж навучальнымі ўстановамі “Тарбут” і ЦЯША. Аднак найперш з-за супрацьдзеяння польскіх улад таварыства “Шуль-Культ” не здолела разгарнуць шырокай сеткі ўстаноў адукацыі – у 1934/1935 навуч. годзе ўтрымлівала 23 установы рознага тыпу, з іх толькі 10 школ (2,1 тыс. вучняў) [1052, с. 247]. Калі да школ з польскай мовай і іўрытам польская адміністрацыя

адносілася лаяльна, то да устаноў, дзе выкладанне было на ідыш і іўрыце – непрыхільна, спасылаючыся быццам на непапулярнасць іх сярод яўрэйскага насельніцтва. У цэлым, яўрэі да канца 1930-х гг. так і не атрымалі матэрыяльнай падтрымкі для прыватных школ з выкладаннем на ідыш і іўрыце. Такія школы ўтрымліваліся за кошт платы за вучобу, невялікіх субсідый рэлігійных абшчын, ахвяраванняў яўрэйскага насельніцтва, дапамогі замежнай яўрэйскай дыяспары. Аб арганізацыйнай прыналежнасці гэтых устаноў яскрава сведчаць звесткі табліц 4.5 [1121, с. 145; 778, арк. 661] і 4.6 [864, с. 96].

Табліца 4.5 – Стан адукацыйных устаноў яўрэйскіх культурна-асветніцкіх арганізацый у Польшчы (канец 1936 г.)

| Арганізацыя | Колькасць навучальных устаноў | Кантынгент вучняў | Колькасць настаўнікаў |
|---|---|---|---|
| “Тарбут” | 269 | 37 000 | 1 300 |
| ЦЯША | 215 | 23 000 | 754 |
| “Хорэў” | 589 | 73 000 | 2 200 |
| “Ябнэ” | 65 | 56 000 | - |

Табліца 4.6 – Сетка адукацыйных устаноў яўрэйскіх культурна-асветніцкіх арганізацый Польшчы (1937 г.)

| Арганізацыя | Колькасць школ | Кантынгент вучняў |
|---|---|---|
| “Тарбут” | 269 | 44 780 |
| ЦЯША | 169 | 16 486 |
| “Шульт-Культ” | 16 | 2 343 |
| “Ябнэ” | 229 | 15 923 |
| “Хорэў” | 177 | 49 123 |
| “Бет-Якаў” | 248 | 35 586 |
| Усяго | 1 275 | 180 182 |

Заходнебеларускія камуністы непрыхільна ставіліся да яўрэйскіх палітычных партый і падкантрольных ім культурна-асветніцкіх арганізацый. У лісце “Нашы адносіны да школ ЦЯША” (1933 г.) кіраўніцтвам КПЗБ былі дадзены неабгрунтаваныя ацэнкі дзейнасці гэтай бундаўскай культурна-асветніцкай арганізацыі. Школы ЦЯША разглядаліся як “сацыял-фашысцкія” і рэакцыйныя. Выступаючы супраць нацыянальнага прыгнёту польскіх уладаў, кіраўніцтва КПЗБ адназначна не прызнавала ЦЯША масавай арганізацыяй. “Яна не дапускае рабочых у кіраўніцтва школ, а накіроўвае туды сваіх людзей, адданых сацыял-фашызму, Бунду”. Падкрэслівалася “контррэвалюцыйная” роля ЦЯША ў барацьбе супраць рэвалюцыйных настрояў у школах [490, арк. 230]. У асобным “Цыркуляры аб яўрэйскай рабоце” ЦК КПЗБ заклікаў да

безупыннай барацьбы “супраць сацыял-здраднікаў і нацыяналізму ў яўрэйскім рабочым асяроддзі, … супраць бундызму і сіянізму ва ўсіх яго адценнях, супраць духавенства і артадоксаў”. Прадугледжвалася паўсюдна “выкрываць усе грамадскія, палітычныя, гаспадарчыя, культурныя і іншыя арганізацыі (яўрэйскі сямейны клуб, кааператыўныя таварыствы, школьныя таварыствы, органы гарадскога самакіравання, абшчынныя саветы), паказваючы іх сапраўдны класавы характар, іх варожасць да інтарэсаў яўрэйскіх працоўных мас” [489, арк. 17–19.]. Вылучэннем лозунгаў з патрабаваннямі аб дзяржаўнай школе на роднай мове вучняў, супраць урадавага антысемітызму, нацыянальнага прыгнёту, усхваленнем становішча яўрэяў у СССР і г. д. планавалася “вырваць яўрэйскія працоўныя масы з абдымкаў буржуазіі і сацыяльных здраднікаў” [489, арк. 20].

У рамках ажыццяўлення новай стратэгіі і тактыкі, распрацаваных VII кангрэсам Камінтэрна, КПЗБ імкнулася перагледзець свае адносіны да яўрэйскага пытання. Былі самакрытычна прааналізаваны памылкі, пралікі камуністаў: нігілістычнае стаўленне да яўрэйскага пытання, “хвасціцкія адносіны цэлага шэрагу арганізацый і таварышаў (асабліва ў Вільні)” да ЦЯША. Адначасова патрэбна было разгортваць змаганне супраць “контррэвалюцыйнай, паланізатарскай” яўрэйскай рэлігійнай абшчыны [489, арк. 25–26, 28].

Больш прыязныя адносіны да яўрэйскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў мелі заходнебеларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі. Нярэдка яны выкарыстоўвалі для ўласных інтарэсаў кан’юнктурную апазіцыйнасць яўрэйскіх аб’яднанняў. Яўрэйская інтэлігенцыя ў Вільні прыхільна ставілася да беларускіх праблем. У жніўні 1923 г. А. Луцкевіч змог атрымаць ад яўрэяў Варшавы фінансавыя сродкі для друку і ліквідацыі запазычанасці па зарплаце ва ўсіх беларускіх арганізацыях, гімназіях. Вясной 1925 г. лідэр віленскай яўрэйскай супольнасці Ц. Шабад абяцаў у выпадку неабходнасці аказаць матэрыяльную дапамогу і маральную падтрымку ў замежным друку [704, с. 270]. У 1920-я гг. неаднаразова беларускія культурна-асветніцкія арганізацыі разам з іншымі няпольскімі (у тым ліку яўрэйскімі) таварыствамі выступалі сумесна супраць нацыянальна-культурнага прыгнечання.

Вялікі ўплыў на духоўнае жыццё яўрэяў у заходнебеларускіх землях аказвалі ўстановы Вільні, “літоўскага Іерусаліма” (“Іерусаліма дыяспары”), як ахрысцілі горад яшчэ з новага часу, дзе склаўся міжнародны цэнтр яўрэйскага культурнага, мастацкага і літаратурнага жыцця на мове ідыш [7; 1193; 1191–1192; 387; 1038; 1198]. Буйнейшай установай сусветнага значэння з’яўляўся Яўрэйскі навуковы інстытут (ЯНІ) (Jidiszer

Wissenszaftlecher Institut) (JIWO). Рашэнне аб яго ўтварэнні ў Вільні было адобрана на II з’ездзе яўрэйскіх настаўнікаў у Варшаве ў красавіку 1925 г., асобнай канферэнцыі ў жніўні 1925 г. [891, с. 91–96]. Сярод заснавальнікаў установы былі прадстаўнікі свецкай ідышамоўнай інтэлігенцыі, што сімпатызавала сацыялістам – М. Вайнрайх, З. Рэйзен, І. Чэрніхаў і іншыя. У 1927–1933 гг. у склад кіраўніцтва ЯНІ уваходзілі таксама Ц. Шабад, заснавальнік Бунда А. Крэмер, кнігавыдавец Б. Клецкін і іншыя дзеячы [962, арк. 74, 116–120, 121–124]. Адлюстраванне любых праяў жыцця яўрэяў, вывучэнне з дапамогай новых метадаў іх мінулага – гэтыя і іншыя задачы ставіліся перад ЯНІ [1221, с. 3]. Гістарычная секцыя ЯНІ у 1929–1939 гг. выдала на ідыш 3 тамы часопіса “Historisze Szriftn” (“Гістарычныя лісты”), апублікавала ў навуковых часопісах шэраг прац па гісторыі яўрэяў Усходняй Еўропы [1149, с. 250]. Усяго ў міжваеннай Польшчы (не толькі ў Вільні, але і ў Варшаве, Кракаве, іншых гарадах) даследаваннямі гісторыі яўрэяў займаліся каля 200 даследчыкаў. Працы М. Балабана, І. Схіпера і іншых гісторыкаў змяшчаліся на старонках больш 20 перыядычных выданняў на ідыш, іўрыце, польскай мове [890, с. 22, 23; 872, с. 182–194]. Са студзеня 1931 г. пачаў выдавацца на ідыш часопіс “Веснік ЯНІ” (“JIWO-Bleter”), дзе змяшчаліся артыкулы па яўрэйскай гісторыі, сацыялогіі, псіхалогіі, літаратуры, музыцы, выяўленчаму мастацтву. Акрамя гістарычнай, філалагічнай, эканамічна-статыстычнай, педагагічна-піхалагічнай секцый, у ЯНІ былі створаны бібліяграфічны цэнтр, архіў, бібліятэка, музей мастацтва, музей тэатразнаўства, педагагічны музей. У канцы 1930-х гг. бібліяграфічны цэнтр меў на ўліку больш чым 200 тыс. розных адзінак, бібліятэка налічвала звыш 40 тыс. экзэмпляраў. Архіў ЯНІ, які быў створаны ў 1926 г., налічваў тады некалькі тысяч рукапісаў, аўтографаў, каля 100 тыс. плакатаў, лістовак, справаздач, статутаў, каля 10 тыс. экзэмпляраў перыядычных выданняў [1222, с. 8; 831, с. 622]. Там збіраліся дакументальныя матэрыялы і з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Так, Таварыства прыяцеляў ЯНІ накіравала 31 жніўня 1928 г. на адрас рэлігійнай абшчыны ў Гродна ліст з просьбай аб высылцы дакументаў у архіў [287, арк. 84–86].

Дзейнасць асобных секцый ЯНІ была даволі выніковай: сабрана каля 100 тыс. адзінак яўрэйскага фальклору, больш 25 тыс. асобных выразаў ідыш, некалькі соцен камплектаў тэрміналогіі. Даследаванні праводзіліся пераважна на Віленшчыне – у Вільні, Ашмянскім, Браслаўскім, Дзісенскім і іншых паветах. Палявыя даследаванні ажыццяўлялі ў асноўным збіральнікі (замлэрс) [1121, с. 145; 778, арк. 657].

ЯНІ ажыццяўляў міжнароднае супрацоўніцтва, стварыў уласныя аддзелы за мяжой – у Берліне, Варшаве, Нью-Йорку. Была сабрана вялікая калекцыя фатаграфій, частка якой захавалася ў ЗША [8; 359]. ЯНІ

падтрымліваў да пачатку 1930-х гг. навуковыя сувязі з яўрэйскім сектарам Інбелкульта (потым Беларускай акадэміі навук), БДУ і іншымі ўстановамі БССР.

Ахвяраванні розных яўрэйскіх арганізацый, устаноў, прыватных асоб, асабліва з-за мяжы, з’яўляліся асноўнай крыніцай папаўнення бюджэту ЯНІ. Так, за перыяд 1925–1934 гг. прыбытак інстытута склаў 582 тыс. злотых, з якіх толькі 104 тыс. паступілі ад яўрэяў Польшчы, 248,3 тыс. злотых – з замежных краін, найперш ЗША [1222, с. 19]. У 1927/1928 г. да падтрымкі далучыліся мясцовыя яўрэйскія рэлігійныя абшчыны: з Вільні паступіла 3 тыс. злотых, з Беластока – 300, Гродна – 1 тыс., Ліды – 300, Глыбокага – 50 злотых. У 1928/1929 г. дапамога пайшла і з органаў мясцовага самакіравання – Вільні (3 тыс. злотых) [967, арк. 217адв.], Беластока (1 тыс. злотых), Гродна, Ліды, Пінска, Слоніма, Крынак, Ваўкавыска, Баранавічаў, Брэста, Глыбокага, Ашмянаў, Стаўбцоў, Пружанаў, Высока-Літоўска [1221, с. 7–9]. Магістрат Вільні ў 1930/1931 г. прызначыў ЯНІ 3 тыс. злотых [968, арк. 274–344]. Пад уздзеяннем сусветнага эканамічнага крызісу гарадская рада Вільні больш не выдзяляла сродкі ЯНІ і Таварыству прыяцеляў ЯНІ. Паўнацэннай дзейнасці інстытута перашкаджала і істотнае скарачэнне замежнай дапамогі ў 1930-я гг.

Акрамя ЯНІ, у Вільні ў 1920–30-я гг. дзейнічала больш 100 розных яўрэйскіх грамадскіх арганізацый, таварыстваў, працавала адзіная ў Польшчы настаўніцкая семінарыя з мовай выкладання ідыш, якая рыхтавала настаўнікаў для яўрэйскіх ідышамоўных школ усёй краіны. У Вільні ў 1927 г. дзейнічалі 18 яўрэйскіх школ [966, арк. 297], у 1930 г. – 23, 1931 г. – 22 (4 233 вучні) [968, арк. 341; 969, арк. 223]. Разам з іншымі прадстаўнікамі яўрэйскай інтэлігенцыі Ц. Шабад быў сярод арганізатараў гісторыка-этнаграфічнага таварыства яўрэйскай археалогіі (потым называлася гісторыка-этнаграфічным таварыствам імя С. Ан-скага). Пры згаданым таварыстве дзейнічаў музей (заснаваны яшчэ ў 1913 г.), зборы якога перайшлі ЯНІ. Летам 1934 г. там захоўвалася больш 2 тыс. экспанатаў, у тым ліку граматы каралёў Рэчы Паспалітай, прадметы рэлігійнага культу, іконы, палотны, творы разьбы (сярод іх – некалькі помнікаў М. Антакольскага), партрэты, фатаграфіі яўрэйскіх дзеячаў і іншыя каштоўных рарытэты [28, арк. 5].

У Вільні былі вызначаны асноўныя напрамкі развіцця мастацкай культуры ідыш. Хоць з 1923 г. там штогод наладжваліся выставы яўрэйскіх мастакоў, аднак ад сваёй ізаляванасці яўрэйская мастацкая інтэлігенцыя пачала адыходзіць толькі ў канцы 1920-х гг. [1074, с. 73]. Плённа працавалі ў Вільні Б. Цукерман, Б. Залкінд, М. Ляйбоўскі і іншыя жывапісцы [1019, с. 15–49; 1020, с. 391–400]. Вядомай з’яўлялася школа мастацкіх рамёстваў у Вільні. У першай палове 1930-х гг. актыўнай

выставачнай дзейнасцю займаўся А. Сапіра. Самабытныя асяродкі яўрэйскага выяўленчага мастацтва былі створаны ў Беластоку, Гродна і іншых гарадах.

З 1922 г. у Вільні дзейнічала Таварыства падтрымкі яўрэйскага мастацтва, якое мела асобныя секцыі – літаратуры, музыкі, опернага і пластычнага мастацтваў. Менавіта гэтае таварыства з’яўлялася ініцыятарам стварэння ў канцы 1924 г. Яўрэйскага музычнага інстытута, які атрымаў статус дзяржаўнай кансерваторыі, адзінай ва ўсёй Еўропе з выкладаннем на ідыш [8]. Гэтая ўстанова заваявала вялікую папулярнасць далёка па-за межамі Польшчы. Пашанай карыстаўся не толькі таленавіты піяніст, дырэктар Яўрэйскага музычнага інстытута Р. Рубінштэйн, але і выкладчыкі фартэпіяна і вакалу Т. Гіршовіч, Ф. Крэвер, Х. Дугоўская, Э. Ігдал, Ю. Кружанка і іншыя. У 1932 г. І. Герштэйн заснаваў у Вільні хор таварыства “Вільбіг”, якім апекавалася Таварыства падтрымкі яўрэйскага мастацтва. Пазней яго ўзначаліў А. Слеп [870, с. 171–176]. Рэпертуар хора “Вільбіг”, які выступаў з канцэртамі па ўсёй Віленшчыне, уключаў творы заходнееўрапейскіх, рускіх, польскіх кампазітараў, яўрэйскія народныя, рэлігійныя песні. У Вільні былі створаны яўрэйскі драматычны тэатр, Саюз яўрэйскіх акцёраў, якія вылучаліся высокім узроўнем выканальніцкай культуры. У лютым 1926 г. быў адкрыты Яўрэйскі народны тэатр (Jidiszer Folks-Teater). Самабытнымі пастаноўкамі вылучаўся тэатр марыянетак “Майдзім” (1935–1936 гг.). Усяго у Вільні ў 1935 г. існавала 15 яўрэйскіх тэатральных калектываў. Напярэдадні Другой сусветнай вайны ў горадзе была распачата кампанія будаўніцтва буйнага яўрэйскага тэатра [1195, с. 349–371, 402–438; 1192, с. 255–268].

У Вільні таксама сфарміраваўся адзін з цэнтраў літаратуры ідыш. Мясцовыя паэты і празаікі аб’ядналіся ў групу “Юнг Вільне” (“Yuhg Vilnè”). Сярод іх вылучаліся арганічным спалучэннем у сваёй творчасці традыцый і наватарскіх падыходаў, шырокім тэматычным дыяпазонам Х. Градэ, А. Суцкевер і іншыя літаратары [1007; 390, с. 495].

Паспяховая яўрэйская нацыянальна-культурная дзейнасць у Вільні на працягу 1920–30-х гг. (за выключэннем перыяду Сярэдняй Літвы) у многім тлумачыцца эфектыўнасцю функцыянавання там рэгіянальнай мадэлі польска-яўрэйскага суіснавання, аналагаў якой не было ў тагачаснай Польшчы [1198, с. 336, 339]. Нягледзячы на ўскладненне ўзаемаадносін палякаў з мясцовымі яўрэямі, якія ў пачатку 1920-х гг. былі настроены непрыхільна да Польшчы, праяўлялі сімпатыі да Літвы, пасля 1923 г. паступова наладзіліся іх пазітыўныя ўзаемаадносіны, магістрат Вільні выдзяляў пэўныя сродкі для яўрэйскіх рэлігійных аб’яднанняў і прыватных школ [963]. Аналіз архіўных матэрыялаў сведчыць аб тым, што штогадовае фінансаванне яўрэйскіх школ Вільні з боку гарадскіх улад да пачатку 1930-

х гг. насіла ўстойлівы характар [964, арк. 102; 965, арк. 180; 966, арк. 250; 967, арк. 214; 968, арк. 338–341; 969, арк. 223]. Эканамічны крызіс прымусіў гарадскую раду пасля 1932 г. абмежаваць дапамогу яўрэйскім аб'яднанням і ўстановам.

Цэнтрамі грамадска-культурнага жыцця яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі з'яўляліся шматлікія кнігарні, бібліятэкі, якія ўтрымліваліся яўрэйскімі партыямі, культурна-асветніцкімі арганізацыямі, сінагогамі, прыватнымі асобамі. У вялікіх гарадах з ініцыятывай стварэння бібліятэк часта выступала яўрэйская інтэлігенцыя, якая актыўна ўдзельнічала ў свецкім культурным жыцці. У 1933 г. у Варшаве было 50 яўрэйскіх бібліятэк, з іх 10 прыватных, фонд якіх складаў 265,3 тыс. кніг. Імі карысталіся каля 20 тыс. пастаянных чытачоў. У вялікіх гарадах каля 70% кніжных фондаў яўрэйскіх бібліятэк складалі польскамоўныя выданні, каля 20–25% – на ідыш, астатнія – на іўрыце і іншых мовах [1111, с. 19–20; 878, с. 218]. Папулярнасцю ў віленскіх чытачоў карысталася бібліятэка ЦКА, якая ў 1939 г. мела 40 тыс. кніг [831, с. 622]. У Вільні з канца ХІХ ст. працавала бібліятэка імя М. Страшуна з чытальняй, уласнікам якой з'яўлялася мясцовая яўрэйская рэлігійная абшчына. У 1930 г. яна налічвала больш 25 тыс. тамоў, сярод якіх былі 5 інкунабул канца XV ст., каля 300 выданняў XVI ст., больш 100 рукапісаў. Да 1937 г. агульны яе кнігазбор складаў 39,1 тыс. экзэмпляраў [1194, с. 269; 1038, с. 299; 831, с. 615]. Бібліятэка Таварыства падтрымкі яўрэйскай асветы і культуры ў Брэсце і Пінску ў 1936 г. налічвалі па 10 тыс. кніг кожная. Буйныя фонды мелі бібліятэкі яўрэйскіх рэлігійных абшчын (звесткі за 1929 г.) у Гродна – 7,3 тыс. экз., Міры – каля 5,6 тыс. экз., Слоніме – 5 тыс. экз., Ружанах – 1,5 тыс. экз. (1938 г.), іншых гарадах і мястэчках [831, с. 112, 458, 187, 408, 528, 503].

Сярод яўрэйскіх бібліятэк самыя вялікія фонды мелі бібліятэкі культурна-асветніцкіх арганізацый, прафсаюзаў (каля 60% кніжнага фонду яўрэйскіх бібліятэк, якімі карысталіся 85,6% чытачоў усіх яўрэйскіх бібліятэчных устаноў) [878, с. 219]. Таварыства "Тарбут" у 1928 г. налічвала ўсяго ў Польшчы 211 бібліятэк у 178 гарадах і мястэчках (кнігазборам, які налічваў каля 45 тыс. кніг, карысталася звыш 20 тыс. чалавек) [1096, с. 257]. Да канца 1930-х гг. ва ўсходніх ваяводствах Польшчы дзейнічала 60 бібліятэк таварыства "Тарбут" (69,8 тыс. кніг) [831, с. 709]. Уласную бібліятэчную сетку мелі бундаўскія культурна-асветніцкія арганізацыі. "Культур-Ліга" у 1928 г. мела каля 400 бібліятэк, якія абслугоўвалі больш 30 тыс. чытачоў (пераважна навучэнцкую і працоўную моладзь, рабочых), у 1937 г. іх колькасць павялічылася да 800 [1096, с. 258; 778, арк. 807]. У цэлым, яўрэйскія бібліятэкі былі пераважна невялікімі, раскіданымі ў розных мясцовасцях, не атрымлівалі дзяржаўных

датацый, многія існавалі без рэгістрацыі. Ідэалагічнае размежаванне яўрэйскай супольнасці часта перашкаджала эфектыўнай дзейнасці бібліятэк, аднак яны ў многім залежалі ад матэрыяльнай падтрымкі таго ці іншага палітычнага аб'яднання. Яўрэйскія рэлігійныя абшчыны толькі зрэдку дапамагалі свецкім бібліятэкам. У мястэчках свецкія бібліятэкі ствараліся пераважна па ініцыятыве моладзі.

Яўрэйскае насельніцтва мела магчымасць чытаць разнастайныя мясцовыя перыядычныя выданні пераважна на ідыш, а таксама іўрыце і польскай мове. Яўрэйская бібліяграфія міжваеннага часу ў Польшчы налічвае 1 715 перыядычных выданняў на ідыш (у тым ліку аднадзёнак) [1052, с. 261]. У канцы 1930-х гг. штодзённы тыраж яўрэйскай прэсы ў Вільні (пераважна на ідыш; у 1936 г. там было 18 перыядычных выданняў на ідыш) дасягаў 40 тыс. экзэмпляраў, а ўсяго ў Польшчы (разам з польскамоўнымі выданнямі) – да 300–350 тыс. экз. (паводле асобных падлікаў, у 1936 г. – да 450 тыс. экзэмпляраў) [1065, с. 353; 1064, с. 340]. Сярод іх вылучаліся сіяніcцкая "Цайт" ("Cajt"), артадаксальная "Дас Ворт" ("Das Wort"), „Вільнер Тог" ("Wilner Tog"), "Унзэр Тог" („Uncer Tog") і іншыя. Даследчыкі падлічылі, што ў міжваенны час у Польшчы яўрэйская супольнасць друкавала 364 перыядычныя выданні (з іх 19 штодзённых) на польскай мове. Польскамоўныя газеты і часопісы (сярод іх вылучалася выданне сіяніcцкага напрамку "Nasz przegląd", якое друкавалася ў Варшаве ў 1923–1939 гг., і іншыя) садзейнічалі наладжванню польска-яўрэйскіх узаемаадносін [873, с. 145–153; 874, с. 137–143; 875; 876, с. 55–75]. Паводле В. Каранеўскай, у заходнебеларускіх гарадах выходзіла не менш 60 яўрэйскіх рэгіянальных перыядычных выданняў – пераважна на ідыш [408, с. 130]. У Брэсце сярод яўрэйскай перыёдыкі трэба адзначыць штодзённую газету "Унзэр полесер экспрес" ("Unzer Poleser Ekspres") (выдавалася з 1928 г.), "Полесер тог" ("Poleser Tog") (1934 г.), штодзённую газету "Брескер вохэнблат" ("Bresker Vochnblat") ("Брэсцкі штотыднёвік"). Аддзяленне Сусветнай сіяніcцкай арганізацыі ў Брэсце фінансавала выданне рэгіянальных газет „Полесер шціме" ("Poleser Sztime"), "Унзэр морген" ("Unzer Morgen"), "Полесер лебн" ("Poleser Lebn"). У Пінску выдаваліся такія газеты, як штодзённая "Пінскер Ворт" ("Pinsker Wort") (1931–1938 гг.), "Пінскер Вох" ("Pinsker Voch") ("Пінскі тыдзень")(1932–1937 гг.), "Пінскер шціме" ("Pinsker Sztime") (1928–1939 гг.), "Полесер найс" ("Poleser Najs")(1934–1935 гг.) і іншыя. У Ваўкавыску друкаваліся газеты "Wolkowysker Lebn" („Жыццё Ваўкавыска") (1926–1939 гг.), „Wolkowysker Vochnblat" ("Ваўкавыскі штотыднёвік") (1928–1930 гг.), "Wolkowysker Sztime" ("Голас Ваўкавыска") (1927–1936 гг.).

Нягледзячы на ўсе намаганні па захаванню і развіццю традыцыйнай культуры, яўрэйская супольнасць не змагла пазбегнуць паланізацыі і

культурна-моўнай асіміляцыі, хоць гэтыя працэсы і не набылі для яе пагражальнага характару. Асобныя даследчыкі ацэньваюць колькасць асіміляваных яўрэяў у міжваеннай Польшчы ў 150–200 тыс. чалавек [1038, с. 250]. Даныя перапісу насельніцтва 1931 г. сведчаць аб тым, што яўрэйскае насельніцтва заходнебеларускіх зямель менш падверглася асіміляцыі ў параўнанні з цэнтральнымі і заходнімі ваяводствамі Польшчы, Галіцыяй. Польскую мову ў якасці роднай у Навагрудскім ваяводстве назвалі 6,9% яўрэяў, Віленскім – 2,7% (у самой Вільні – толькі 0,7%), Палескім – 0,8%) [падлічана паводле: 1033, с. 55].

Акультурацыя назіралася асабліва сярод яўрэйскай інтэлігенцыі, частка якой была інтэгравана ў польскую культуру, асвету, іграла важную ролю ў грамадскім жыцці не толькі яўрэйскай супольнасці, але і польскага грамадства. Адчувальным быў яе ўплыў на дзейнасць устаноў навукі і культуры [877, с. 134]. У яе існавалі супярэчнасці з большасцю яўрэйскага ідышамоўнага насельніцтва, якое трымалася пераважна артадаксальных рэлігійных поглядаў. Нягледзячы на ідэалагічныя разыходжанні, ніводная з яўрэйскіх грамадскіх і культурна-асветніцкіх арганізацый не выступала з пазіцыі нацыянальнага нігілізму. У большасці польскамоўнай яўрэйскай інтэлігенцыі інтэграцыя ў польскую культуру не атаясамлівалася з нацыянальнай асіміляцыяй [1053, с. 47]. Выключэнне складалі нешматлікія аб’яднанні, сярод якіх быў Яўрэйскі клуб дзяржаўнай думкі, заснаваны ў 1929 г. прыхільнікамі рэжыму “санацыі”. Яго ўдзельнікі падтрымлівалі ідэю пілсудчыкаў аб асіміляцыі няпольскага (у тым ліку яўрэйскага) насельніцтва. У Палескім ваяводстве дзейнічала 15 аддзелаў аб’яднання (каля 1,5 тыс. чалавек). Разгалінаваная сетка ў пачатку 1930-х гг. ствbooралася ў Віленскім ваяводстве [1198, с. 228–231]. У снежні 1933 г. яўрэйскі клуб дзяржаўнай думкі ў Ваўкавыску займаўся пытаннем аб сумесным удзеле яўрэяў і палякаў у выбарах у гарадскую раду [800, арк. 248]. Аднак Яўрэйскі клуб дзяржаўнай думкі не атрымаў масавай падтрымкі і фактычна спыніў сваю дзейнасць у сярэдзіне 1930-х гг.

Вясной 1939 г. Беластоцкая ваяводская адміністрацыя прызнавала слабую выніковасць асіміляцыі мясцовых яўрэяў. “Нягледзячы на працяглыя ўплывы, “літвакі” не змаглі прывязацца да польскай дзяржаўнасці і культуры. Да цяперашняга часу карыстаюцца рускай мовай, складаюць пераважна дэструктыўны, у лепшым выпадку абыякавы да Польскай дзяржавы элемент” [207, арк. 6].

У цэлым, у 1920–1930-я гг. каштоўнасці іудаізму па-ранейшаму займалі вызначальнае месца ў грамадскім і сямейным жыцці яўрэяў, заставаліся фундаментам яўрэйскай культуры, хоць і тлумачыліся па-новаму. Спробы развіцця свецкай адукацыі і культуры як альтэрнатывы іудзейскай традыцыйнай спадчыне не рэалізаваліся спаўна, аднак яны мелі

наватарскі характар, паўплывалі на розныя бакі побыту яўрэяў, набылі гучны міжнародны рэзананс. Нягледзячы на супярэчнасці паміж рознымі яўрэйскімі ідэалагічнымі і палітычнымі лагерамі, сацыяльнымі групамі, прыхільнікамі свецкай тэндэнцыі і традыцыяналістамі, удалося засцерагчы яўрэйскую супольнасць ад асіміляцыйных працэсаў. Саперніцтва культурна-асветніцкіх арганізацый, якія вылучаліся складанай структурай і markup рознай ідэалагічнай накіраванасцю, адбывалася не столькі з-за моўнага пытання (падтрымка ідыш ці іўрыта), колькі з-за прыхільнасці да адной ці другой канцэпцый яўрэйскай будучыні, прадстаўленых сіяніцкімі і сацыялістычнымі партыямі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі была створана разгалінаваная сетка структурных адзінак “Тарбут”, ЦЯША і іншых арганізацый. Яны займаліся адкрыццём і ўтрыманнем адукацыйных устаноў, бібліятэк, правядзеннем асветніцкай работы, культурна-масавых мерапрыемстваў, падтрымкай аматарскага мастацкага руху, што спрыяла захаванню этнічнай самабытнасці яўрэяў і супрацьдзейнічала іх асіміляцыі.

## 4.2. Культура і асвета славянскіх меншасцей – рускіх і ўкраінцаў

Грамадска-культурнае жыццё рускага насельніцтва ў гарадах пачало ажыўляцца ў пачатку 1920-х гг. Створанае ў 1922 г. па ініцыятыве В. Соніна ў Варшаве Рускае дабрачыннае таварыства (РДТ) (Русское благотворительное общество) мела права ствараць і ўтрымліваць гімназіі, школы, бібліятэкі, праводзіць культурныя мерапрыемствы і г. д. [665, с. 5–6]. На тэрыторыі Заходняй Беларусі да сярэдзіны 1930-х гг. былі створаны аддзелы РДТ у шэрагу гарадоў – Брэсце (яго заснавальнікам ў пачатку 1924 г. быў П. Король [716, с. 265–268]), Пінску, Лунінцы, Гродна, Навагрудку, Баранавічах, Стаўбцах [259, арк. 1; 261, арк. 335]. Менавіта пры аддзелах РДТ гуртавалася мясцовая руская інтэлігенцыя, ствараліся літаратурныя, тэатральныя гурткі, іншыя творчыя аб’яднанні. Аналіз дзейнасці аддзелаў РДТ у Заходняй Беларусі пацвярджае высновы даследчыкаў аб тым, што выніковасць іх дзейнасці ў многім залежала ад кампактнасці і колькасці мясцовага рускага насельніцтва [656, с. 219]. Аддзел РДТ у Брэсце галоўным клопатам лічыў ўтрыманне рускай гімназіі. У Брэсце пры гімназіі і мясцовым аддзеле РДТ дзейнічалі бібліятэкі. У складзе Брэсцкага аддзела РДТ да пачатку 1930-х гг. функцыянаваў гурток аматараў драмы на чале з П. Аляксеевым. Высокім узроўнем вызначаліся пастаноўкі А. Пушкіна, А. Астроўскага і іншых класікаў рускай літаратуры [262, арк. 9]. Брэсцкі аддзел РДТ актыўна супрацоўнічаў з таварыствам царкоўных спеваў, заснаваным настаяцелем Мікалаеўскай

брацкай царквы С. Жукоўскім, якое некалькі разоў у год праводзіла харавыя канцэрты [153, арк. 3; 190, арк. 48]. Рэгентам царкоўнага хора з'яўляўся адвакат В. Панцелевіч. З лістапада 1933 г. тэатральныя пастаноўкі наладжваліся ў Брэсце створаным культурна-асветніцкім пададдзелам мясцовага аддзела РДТ на чале з піяністкай Э. Волкавай [261, арк. 12; 263, арк. 77]. Драматычная секцыя пададдзела аказвала дапамогу рускім самадзейным тэатральным аб'яднанням Брэсцкага павета [262, арк. 8адв.].

Аддзел РДТ у Гродна быў заснаваны восенню 1925 г. па ініцыятыве В. Кошалева. У бібліятэцы аддзела РДТ у Гродна неаднаразова праводзіліся лекцыі вядомых грамадскіх дзеячаў рускай супольнасці, вучоных [706, с. 177–178]. У лістападзе 1932 г. у Гродна на сходзе мясцовага аддзела РДТ быў прыняты зварот да Віленскага школьнага папячыцельства аб дазволе навучання рэлігіі на рускай мове для дзяцей праваслаўнага веравызнання [798, арк. 187адв.].

Аддзел РДТ у Пінску, які ўзнік у 1925 г., займаўся ўтрыманнем 7-класнай рэальнай гімназіі. Пасля страты ў 1928 г. дазволу на ўтрыманне гімназіі аддзел РДТ у Пінску праяўляў клопат пра бібліятэку і арганізоўваў розныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, даходы ад якіх ішлі на дабрачынныя мэты. У сярэдзіне 1931 г. у складзе Пінскага аддзела РДТ быў створаны гурток моладзі на чале з Д. Майковым, у рамках якога ўзніклі літаратурная, драматычная, музычная секцыі [190, арк. 44]. Польскія ўлады выказвалі занепакоенасць ажыўленнем мясцовай рускай вучнёўскай і студэнцкай моладзі. Лідэрства яе прыпісвалася інжынеру К. Пятроўскаму, "рускаму нацыяналісту", актывісту "Брацтва рускай праўды". У верасні 1931 г. група творчай моладзі (П. Хініч, Д. Майкоў, В. Каратышэўскі і іншыя) пры падтрымцы Пінскай праваслаўнай кансісторыі выдала рускамоўную брашуру "Пад небам Палесся", дзе былі змешчаны артыкулы аб рэвіндыкацыі праваслаўных святынь. У кастрычніку 1931 г. у Пінску пад рэдакцыяй П. Хініча выдаваўся аднайменны штотыднёвік. Па загаду пінскага старасты быў канфіскаваны ўвесь тыраж выдання, "органа рускіх нацыяналістаў, якія прапагандавалі ідэю 3-х плыняў рускага народа і змагаліся з нацыянальнай палітыкай ураду на Палессі" [190, арк. 37адв.–38]. З-за ганенняў польскіх улад, фінансавых цяжкасцей ў першай палове 1932 г. выданне перастала выходзіць. Намаганнямі рускай творчай моладзі Пінска 11 снежня 1932 г. у Вільні ў Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны выдадзены першы нумар тыднёвіка "Пинский голос" [190, арк. 39]. Акрамя бібліятэкі аддзела РДТ, у Пінску дзейнічала з 1926 г. прыватная бібліятэка-чытальня М. Ключановіча, якая з'ўлялася цэнтрам асветніцкага, мастацкага,

літаратурнага жыцця мясцовай рускай супольнасці горада [165, арк. 74]. У 1929 г. яе фонды складалі 2,5 тыс. экз. [831, с. 456].

Аддзел РДТ у Лунінцы, які ўзнік у верасні 1925 г. па ініцыятыве адваката М. Булгакава і праваслаўнага святара В. Мінкевіча, таксама займаўся ўтрыманнем да 1930 г. рускай гімназіі [190, арк. 45адв.]. Мясцовы аддзел РДТ і прыватная асоба І. Савіч з'яўляліся ўладальнікамі там рускай бібліятэкі. Пасля закрыцця рускай гімназіі ў Лунінцы назіраўся заняпад дзейнасці мясцовага аддзела РДТ. Руская гімназія ў Баранавічах таксама мела бібліятэку, якая пасля закрыцця гэтай навучальнай установы ўтрымлівалася мясцовым аддзелам РДТ. Бібліятэку ўтрымліваў аддзел РДТ у Камянцы Брэсцкага павета.

Віленскае рускае таварыства, якое ўзнікла ў 1920 г., выконвала функцыю мясцовай арганізацыі РДТ. Ім наладжвалася шмат розных асветніцкіх, мастацкіх мерапрыемстваў. Так, у лютым 1933 г. з вялікім поспехам у Вільні прайшоў вечар, прысвечаны 50-гадоваму юбілею навуковай дзейнасці і літаратурнай творчасці прафесара М. Здзяхоўскага [178, арк. 62]. Сам юбіляр прызнаваўся духоўным апекуном віленскіх паэтаў [1074, с. 74]. У чэрвені 1933 г. у межах Дня рускай культуры ў Новай Вілейцы былі арганізаваны 2 лекцыі, у тым ліку В. Багдановіча на тэму "Уплывы рускай культуры на заходнюю культуру", выступленне мужчынскага хору з Вільні [179, арк. 25адв.]. Урачыстасці потым праводзіліся і ў Вільні.

Дзякуючы падтрымцы РДТ, на тэрыторыі Заходняй Беларусі наладжваліся гастролі рускіх тэатральных труп з Варшавы, Вільні – Рускага драматычнага тэатра (кіраўнік – Е. Гагарынава), Віленскага тэатра рускай драмы (кіраўнік – Ю. Скіпетраў), Рускага тэатра-кабарэ "Эльдарада" (кіраўнік – Ю. Гасюк) і іншых [118, арк. 160]. У канцы верасня 1927 г. палескі ваявода Я. Крагельскі загадаў павятовым старастам не дазваляць пастаноўкі рускіх вандроўных тэатральных труп у мясцовасцях, дзе "руская калонія мізэрная, а таксама там, дзе прадстаўленні на рускай мове могуць разбудзіць нацыянальны антаганізм" [133, арк. 40].

Абарона рускай культуры і асветы з'яўлялася адным з галоўных напрамкаў дзейнасці Рускага народнага аб'яднання (РНА) (Русского народного объединения), створанага М. Сярэбранікавым у Варшаве ў 1926 г. [270, арк. 51; 1168, с. 36]. У снежні 1926 г. РНА заснавала ў Брэсце Палескі клуб, які стаў цэнтрам гуртавання мясцовай рускай інтэлігенцыі. На І з'ездзе РНА ў Львове 2 лютага 1927 г. была зацверджана праграма РНА, выбрана кіраўніцтва арганізацыі, старшынёй якой стаў П. Король з Брэста. Было заяўлена пра супрацоўніцтва з рускімі эмігрантамі ў культурна-асветніцкай галіне. З'езд канстатаваў стварэнне мясцовых

структурных адзінах у заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх землях (да 1935 г. там было заснавана 26 аддзелаў РНА, якія аб’ядноўвалі больш 4 тыс. членаў і прыхільнікаў арганізацыі) [260, арк. 7]. Акрамя Вільні, Львова, Сарны, аддзелы РНА былі створаны ў Брэсце, Гродна, Пінску, Нясвіжы, Баранавічах і шэрагу іншых гарадоў Заходняй Беларусі. Сярод выбарчых лозунгаў РНА у 1928 г. былі патрабаванні аб адкрыцці рускіх школ і абавязковым вывучэнні рускай мовы ў польскіх школах, захаванні праваслаўных традыцый [190, арк. 34]. З адкрытых у ходзе выбарчай кампаніі 1928 г. у Палескім ваяводстве 8 бібліятэк РНА (у Трышыне, Вялікарыце, Макранах, Прыбараве, Маларыце, Высока-Літоўску (Брэсцкі павет), Кобрыне, Янаве (Драгічынскі павет)) да пачатку 1930-х гг. уцалела 4 (у Брэсце, Маларыце; бібліятэка з Прыбарава пераехала ў Тамашоўку Брэсцкага павета; была адкрыта бібліятэка ў Воўчыне Брэсцкага павета; летам 1929 г. у час пажару мястэчка загінула бібліятэка ў Янаве Драгічынскага павета) [190, арк. 35], а потым толькі 1 з іх працягвала працаваць – бібліятэка РНА у Брэсце [165, арк. 81]. Праваслаўная царква клапацілася пра бібліятэку-чытальню ў Кобрыне, якая была адкрыта ў 1929 г. у памяшканні Я. Давідзюковай. РНА передало туды частку кніг перасоўнай бібліятэкі.

Закрыццё рускіх бібліятэк польскія ўлады тлумачылі адсутнасцю чытачоў. Аднак не толькі рускія, але і прадстаўнікі іншых этнічных супольнасцей праяўлялі цікаўнасць да розных рускамоўных перыядычных выданняў – усяго на працягу міжваеннага часу ў Польшчы іх выходзіла больш 30. Найбольш папулярнымі былі рускамоўныя газеты “Русский голос” (Львоў, 1921–1939 гг.), “Наше время” (Вільня, 1929–1939 гг.), “Новая искра” (Вільня, 1936–1939 гг.), “Русское слово” (Варшава, 1929–1939 гг.) [131, арк. 2]. Акрамя свецкіх, у Варшаве друкаваліся праваслаўныя выданні – часопіс “Воскресное чтение” (Варшава, 1924–1939 гг.), газета “Слово” (Варшава, 1929–1938 гг.).

Акрамя аўтахтоннага рускага насельніцтва, культурна-асветніцкай працай займаліся і арганізацыі рускай эміграцыі ў Польшчы. Рускі папячыцельскі камітэт, Рускі грамадскі камітэт мелі асобныя культурна-асветніцкія камісіі, якія займаліся пытаннямі функцыянавання рускіх навучальных устаноў, бібліятэк, правядзеннем урачыстых мерапрыемстваў. У многім гэта тлумачылася наяўнасцю ў эміграцкім асяроддзі дастатковай колькасці творчай інтэлігенцыі [714, с. 10]. У пачатку 1920-х гг. Рускі папячыцельскі камітэт аказваў фінансавую дапамогу Віленскаму рускаму таварыству, рускім гімназіям у Вілейцы, Пінску, школе ў Брэсце [715, с. 28].

У выніку ідэйна-палітычных супярэчнасцей, канфлікту паміж старэйшым пакаленнем і максімалісцкі настроенай моладдзю ў 1933 г.

узнікла Руская арганізацыя моладзі (РАМ) (Русская организация молодежи), якая нацэльвалася на больш актыўны ўдзел рускай моладзі ў грамадскім жыцці [1156, с. 52]. Акрамя Варшавы, аддзелы РАМ былі заснаваны ў Вільні, Брэсце, Пінску, Гродна, Слоніме, Баранавічах і шэрагу іншых гарадоў [1123, с. 92]. Дзеячы РАМ прымалі актыўны ўдзел у правядзенні ўсіх значных культурных акцый рускай супольнасці, наладжвалі лекцыі, курсы, канцэрты, тэатральныя прадстаўленні, стваралі харавыя калектывы, гурткі, аказвалі маральную і матэрыяльную падтрымку вучням рускіх школ, студэнтам [181, арк. 37; 268, арк. 1, 35адв.]. Пад ціскам польскай адміністрацыі рэгіянальныя аддзелы арганізацыі абмежавалі сваю дзейнасць выключна пытаннямі культуры і асветы [271, арк. 30]. Гэта яскрава прасочваецца на прыкладзе аддзела РАМ у Пінску (сярод заснавальнікаў былі Д. Майкоў, В. Каратышэўскі), дзе з пачатку 1935 г. былі прыняты меры па згортванню яго "шавіністычнай" публічнай дзейнасці [271, арк. 53; 190, арк. 47адв.]. Пінскі аддзел РАМ быў вымушаны абмежаваць сваю дзейнасць дабрачыннасцю, а ў маі 1938 г. страціў права на існаванне. Брэсцкі аддзел РАМ, які быў створаны ў 1935 г. дзеячамі мясцовага аддзела РДТ, праводзіў разнастайныя культурныя мерапрыемствы: вечары, выставы, паэтычныя гасцёўні, выступленні аркестра, экскурсіі. Так, 21 лістапада 1935 г. быў праведзены літаратурны вечар, прымеркаваны да 25-годдзя з дня смерці Л. Талстога [269, арк. 2, 35; 265, арк. 80]. Вясной 1936 г. мясцовыя аддзелы РДТ і РАМ у Гродна займаліся барацьбой супраць паланізацыі праваслаўнай царквы, разбурэння праваслаўнага храма горада. Галоўным ініцыятарам гэтай акцыі быў старшыня мясцовай РАМ М. Седлярэвіч [803, арк. 40].

Неабходна адзначыць, што сярод рускіх грамадскіх дзеячаў існавала размежаванне не толькі паміж пакаленнямі, але і паміж кансерватыўнымі традыцыяналістамі, якія імкнуліся абмежавацца выключна ўласным асяроддзем і накіроўвалі сваю дзейнасць на падтрымку рускай мовы, традыцый і звычаяў, і прыхільнікамі працэсу мадэрнізацыі (пераважна з творчай інтэлігенцыі), настроеных на большую адкрытасць, засваенне элементаў чужой (найперш польскай) культуры [1129, с. 53–54].

У Вільні функцыянаваў шэраг рускіх тэатральных калектываў (ансамбль сцэнічных дзеячаў, тэатр "Рэдута", музычна-драматычны гурток і інш.), якія вылучаліся высокім прафесійным узроўнем. Напрыклад, сярод пастановак рускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні неабходна адзначыць драму М. Арцыбашава "Рэўнасць" і іншыя творы [531, арк. 53]. 27 лютага 1938 г. аддзел РАМ у Вільні праводзіў вечар шырокай масленіцы [531, арк. 65]. Запрашаліся таксама таленавітыя майстры музычнага і тэатральнага мастацтва з Варшавы, замежных краін. Так, 22

мая 1938 г. у Вільні адбыўся канцэрт саліста міланскай оперы “Ла скала” С.Д. Беноні з удзелам хора Саюза рускіх студэнтаў Віленскага універсітэта пад кіраўніцтвам Л. Фёдарава, акампаніраваў якому прафесар В. Троцкі. Першая частка канцэрта была прысвечана 750-годдзю “Слова аб палку Ігаравым”, другая частка ўтрымлівала ўрыўкі з оперы “Барыс Гадуноў”, трэцяя – рамансы і песні ў гонар Ф. Шаляпіна [531, арк. 53].

Частка праваслаўных святароў прымала актыўны ўдзел у грамадска-культурным і мастацкім жыцці рускай супольнасці. У час праваслаўных святаў у храмах наладжваўся збор сродкаў для дапамогі рускім школам [267, арк. 46]. Так, Мікалаеўская брацкая царква ў Брэсце аказвала матэрыяльную і маральную падтрымку мясцовай рускай гімназіі, пачатковай школе [243, арк. 76]. Аматарскі гурток моладзі ў Давыд-Гарадку Столінскага павета, створаны ў канцы 1920-х гг. намаганнямі праваслаўнага святара Д. Перапечына, паказваў некалькі разоў у год рускія, украінскія п’есы, прыбытак ад якіх выкарыстоўваўся на дабрачынныя мэты і набыццё тэатральнага рэквізіту. У пачатку 1932 г. з-за мэтанакіраванага ўціску з боку польскіх улад гурток самараспусціўся, а яго былыя ўдзельнікі ўступілі ў польскі спартыўны клуб “Гарынь” [190, арк. 47]. У пачатку 1933 г. у Кобрынскім павеце па ініцыятыве праваслаўнага святара Ц. Дзьякава на імя павятовага школьнага інспектара была пададзена адпаведная заява з некалькімі сотнямі подпісаў за ўвядзенне рускай мовы ў навучанне [177, арк. 7].

Хоць праваслаўная царква аказвала матэрыяльную і маральную падтрымку рускім культурна-асветніцкім арганізацыям, аднак нельга пагадзіцца з высновамі папярэдніх даследчыкаў аб тым, што праваслаўнае веравызнанне з’яўлялася галоўным аб’ядноўваючым фактарам для рускага насельніцтва міжваеннай Польшчы [714, с. 11]. Працэс прававога ўрэгулявання Праваслаўнай аўтакефальнай царквы ў Польскай дзяржаве выклікаў неадназначную рэакцыю ў грамадстве і сярод праваслаўнага кліру, што спрыяла паглыбленню расколу рускай меншасці [1067, с. 199]. У канцы 1936 г. дэлегаты з’езда РНА звярталіся да мітрапаліта Дыянісія з просьбай адмовіцца ад яго тактыкі ўступак польскаму ўраду ў адносінах да рускага насельніцтва, ад богаслужэнняў і выкладання рэлігіі на польскай мове і мясцовых дыялектах [705, с. 180]. Аднак царкоўныя ўлады не адрэагавалі на гэтыя патрабаванні. Тым не менш, рускія арганізацыі прынялі актыўны ўдзел у змаганні супраць руху “праваслаўных палякаў” [706, с. 41, 49].

У цэлым, у першай палове-сярэдзіне 1930-х гг. назіраўся спад у дзейнасці рускіх таварыстваў. Структуры РНА фактычна спынілі сваю дзейнасць, вельмі абмежаванай была праца РАМ [743, арк. 10]. Актыўнасць праяўлялі толькі асобныя мясцовыя арганізацыі. Негатыўны

ўплыў на эфектыўнасць працы рускіх аб'яднанняў аказвалі і спрэчкі паміж іх лідэрамі [845, с. 235].

У 1936 г. адбылася рэарганізацыя РДТ – у яго склад увайшоў цэлы шэраг рускіх арганізацый. На чале РДТ стаў М. Племяннікаў. Асноўны акцэнт быў зроблены на культурна-асветніцкую работу, дапамогу гімназіям. Увага надавалася правядзенню Дзён рускай культуры, якія з 1925 г. сталі традыцыйнымі ў Польшчы. Яны звычайна праходзілі штогод у пачатку чэрвеня і былі першапачаткова прымеркаваны да чарговай гадавіны з дня нараджэння А. Пушкіна. 18 чэрвеня 1933 г. у Гродна ўрачыстымі мерапрыемствамі былі адкрыты Дні рускай культуры [799, арк. 147адв.]. У 1930-я гг. тэрміны правядзення змяніліся і названыя мерапрыемствы прысвячаліся розным падзеям з гісторыі рускай культуры, літаратуры. Так, 11–12 лютага 1937 г. Дні рускай культуры ў Польшчы былі прымеркаваны да 100-годдзя з дня смерці А. Пушкіна. Ролю галоўнага арганізатара гэтай акцыі выконвала РДТ і яго мясцовыя аддзелы, якія стварылі спецыяльныя Пушкінскія камітэты [174, арк. 212; 264, арк. 27]. Да святкавання далучаліся актывісты РАМ і іншых грамадскіх аб'яднанняў. У праграме ўрачыстасцей, складзеных Брэсцкім аддзелам РДТ, было богаслужэнне ў Мікалаеўскай брацкай царкве, Пушкінскія літаратурныя чытанні і вечар у рускай гімназіі, музычны канцэрт і опернае прадстаўленне па твору А. Пушкіна "Яўген Анегін" у выкананні ўдзельнікаў драматычнай секцыі аддзела РДТ [266, арк. 14–15].

У пачатку 1920-х гг. у межах Польшчы дзейнічала 20 рускіх гімназій [469, с. 28]. Так як руская супольнасць была нешматлікай і мела распылены характар рассялення, то не змагла пераадолець неабходны колькасны бар'ер для стварэння дзяржаўных рускіх школ. Выключэнне складалі пачатковыя школы ў Вільні для дзяцей стараабраднікаў. Колькасць дзяржаўных рускіх школ скарацілася з 14 у 1923/1924 навуч. годзе (2 296 вучняў) да 2 (234 вучні) у 1927/1928 г., 1 стараабрадніцкай (292 вучні) у 1937/1938 г. [1030, с. 124].

Да 1932 г. у заходнебеларускіх землях існавалі нешматлікія рускія прыватныя навучальныя ўстановы – пачатковыя і рэальныя школы, гімназіі. Адзіная прыватная руская гімназія імя А.С. Пушкіна ў Вільні, створаная ў выніку аб'яднання гімназіі Л. Паспелавай і гімназіі Віленскага рускага таварыства, якой апекавалася ўдава малодшага сына А.С. Пушкіна Рыгора – Варвара Аляксееўна Пушкіна, знаходзілася ў цяжкай фінансавай сітуацыі [242, арк. 16; 178, арк. 140].

Мясцовыя аддзелы РДТ, РНА, настаўнікі рускіх гімназій і школ выступалі галоўнымі арганізатарамі як свецкіх мерапрыемстваў (вечароў, баляў і інш.), так і праваслаўных святкаванняў (калядных, велікодных).

З удзелам праваслаўнай царквы ў рускіх навучальных установах часта арганізоўвалі рэлігійна-асветніцкія акцыі.

У Палескім ваяводстве дзейнічала руская гімназія ў Брэсце, рэальныя школы ў Пінску, Лунінцы. Ахвяраванні мясцовага насельніцтва, дапамога дабрачынных арганізацый (у тым ліку замежных) дазволілі ўтрымаць у пачатку 1920-х гг. рускую гімназію ў Брэсце [448, с. 18–19]. У сувязі з праведзенымі ў лістападзе 1925 г. польскай паліцыяй арыштамі шэрагу вучняў рускай гімназіі ў Брэсце, якіх абвінавачвалі ў камуністычнай дзейнасці, аддзел РДТ прызначыў новага дырэктара гімназіі А. Федзяя, які правёў адпаведную “санацыю” у школе: звольніў некалькіх настаўнікаў, выключыў асобных вучняў [190, арк. 40]. У рускай гімназіі ў Брэсце была створана бібліятэка (3 тыс. кніг), потым яшчэ адна (каля 2 тыс. кніг), якой карысталася шырокая грамадскасць, набыты вучэбныя дапаможнікі, абсталяваны асобныя кабінеты. З-за празмернай лаяльнасці А. Федзяя да польскіх улад кіраўніцтва РДТ у канцы 1927/1928 навуч. года прызначыла замест яго дырэктарам гімназіі грамадскага дзеяча РДТ і РНА В. Трушынскага. Уся мясцовая руская грамадскасць праяўляла цікаўнасць да праблем гімназіі. На яе падтрымку ішлі прыбыткі ад прадстаўленняў Брэсцкага аддзела РДТ. У ходзе праведзенай у канцы 1920-х гг. акцыі па збору сродкаў для пабудовы мясцовага “Рускага дома” (такія грамадска-культурныя цэнтры ўзніклі ў канцы 1920-х гг. у Варшаве, Львове, Вільні) удалося ўзвесці асобны будынак, які быў выкарыстаны для патрэб Брэсцкай рускай гімназіі. Менавіта перашкоды адміністрацыйна-паліцэйскіх органаў, недахоп фінансавых сродкаў не дазволілі заснаваць у Брэсце асобны “Рускі дом” [560, с. 63–64]. Гімназісты ўдзельнічалі ў працы літаратурнага, драматычнага, музычнага, спартыўнага гурткоў, выпускалі літаратурную газету “Проблески”. Карысталіся папулярнасцю тэатральныя пастаноўкі рускай класікі, вечары паэзіі, штогадовыя ўрачыстасці ў гонар А. Пушкіна. Выпускнікі гімназіі, якія вучыліся ў ВНУ, у час канікул, святаў прымалі актыўны ўдзел у правядзенні канцэртаў, забаў, прадстаўленняў у падтрымку рускіх школ, РДТ. У 1932 г. В. Трушынскі быў вызвалены з пасады дырэктара гімназіі, замест яго прызначылі былога дырэктара Віленскай рускай гімназіі К. Разеновіча [190, арк. 42]. Паводле асобных звестак, на працягу міжваеннага часу ў рускай гімназіі ў Брэсце вучылася каля 8,5 тыс. школьнікаў [263, арк. 52].

Гімназія ў Пінску, дырэктарам якой быў А. Фёдараў, атрымлівала матэрыяльную дапамогу ад мясцовай руская інтэлігенцыі, служачых, памешчыкаў. Паводле ацэнак польскіх уладаў, гімназія “прывівала вучням нянавісць да Польшчы”, з’яўлялася “ачагом рускага шавінізму”, дзе вучням загадвалі чытаць творы П. Краснова, К. Брэшка-Брэшкоўскай,

гераізавалі Б. Каверду, які зрабіў 7 чэрвеня 1927 г. замах на савецкага пасла П. Войкава [190, арк. 43].

Дырэктарам гімназіі ў Лунінцы быў М. Царэўскі. Вучні і настаўнікі прымалі актыўны ўдзел у палітычнай дзейнасці, асабліва ў правядзенні выбарчай агітацыі 1928 г. Спасылаючыся на быццам слабы аўтарытэт установы ў мясцовага насельніцтва, ў пачатку 1929/1930 навуч. года не праводзіўся набор у 1 і 2 класы рускай гімназіі ў Лунінцы, а ў канцы таго ж навуч. года яна спыніла сваю дзейнасць [190, арк. 45адв.].

У Навагрудскім ваяводстве існавалі 2 рускія школы – пачатковая школа РДТ у Баранавічах і гімназія ў Нясвіжы [238, арк. 2]. У прыватнай 5-класнай пачатковай школе РДТ у Баранавічах ў канцы 1934/1935 навуч. года было 49 вучняў [993, арк. 9], выкладанне праводзілася на рускай і польскай мовах. У пачатку мая 1935 г. папячыцель Віленскай школьнай акругі К. Шэлянгоўскі паведаміў кіраўніку гэтай школы В. Пуньковай аб намеры закрыць навучальную установу за наяўнасць там “шкоднага выхаваўчага ўплыву на моладзь”: існаванне нелегальнай скаўцкай дружыны, адсутнасць для вучняў дзяржаўных урачыстасцей, слабы клопат пра вывучэнне дзяржаўнай (польскай) мовы [993, арк. 5]. Кіраўнік школы В. Пунькова абвяргала звесткі пра нелегальную скаўцкую дружыну, паведамляла аб складаным матэрыяльным становішчы вучняў (палова з іх не магла набыць падручнікі, школьныя прыналежнасці). Аднак напярэдадні новага навучальнага года было прынята рашэнне польскіх улад аб закрыцці 1-га класа гэтай школы за “несупраціўленне шкодным уплывам” [993, арк. 2].

Асобна разгортвалася духоўнае жыццё рускіх старaабраднікаў, якія жылі кампактна ў заходнебеларускіх землях з XVII–XVIII стст. і мелі ўласную царкоўную структуру. Ва ўзаемаадносінах старaабраднікаў з іншымі групамі рускага насельніцтва можна вылучыць 2 асноўныя перыяды. У час першага (1920-я гг.) старaабраднікі не дапускалі іх атаясамлівання з іншымі групамі, трымаліся адасоблена. Другі этап (1930-я гг.) характарызаваўся супрацоўніцтвам усіх груп дзеля абароны сваіх канфесійных і асветніцкіх інтарэсаў. Аналіз узаемаадносін рускіх старaабраднікаў з польскімі ўладнымі структурамі паказвае, што ў адносінах да Польскай дзяржавы старaабраднікі з самага пачатку праяўлялі палітычную лаяльнасць, што паспрыяла набыццю імі правоў польскіх грамадзян. Паўсядзённае жыццё рускіх-старaабраднікаў, аўтахтонных жыхароў заходнебеларускага краю, было менш палітызаваным, яны адрозніваліся ў сацыяльна-псіхалагічным плане ад рускіх-эмігрантаў.

Выключную ролю ў наладжванні паўнацэннага рэлігійнага і культурнага жыцця старaабрадніцкай меншасці іграла яе нешматлікая інтэлігенцыя, асабліва ў Вільні. Вядомымі грамадскімі і палітычнымі

лідэрамі стараабраднікаў з'яўляліся прадстаўнікі ўплывовай і заможнай сям'і Піманавых [1168, с. 135]. Аўтарытэтны галава сям'і А.М. Піманаў, буйны прадпрымальнік, з'яўляўся кіраўніком Віленскай стараабрадніцкай абшчыны [1004, арк. 41, 53].

Спробы дасягнення паразумення з польскімі ўладамі былі зроблены на І Усяпольскім з'ездзе стараабраднікаў-беспапоўцаў (Вільня, 15–17 кастрычніка 1925 г.), які прадэманстраваў абсалютную палітычную лаяльнасць да Польскай дзяржавы [1004, арк. 14]. Быў утвораны асобны Вышэйшы стараабрадніцкі савет (ВСС) у Польшчы, які ўзначаліў А. Піманаў. У склад ВСС увайшлі Б. Піманаў, Г. Піманаў, В. Андрэеў, П. Голубеў, духоўны настаўнік С. Егупёнак, Д. Самазванаў, Ф. Арцем'еў і іншыя дзеячы. У ходзе працы з'езда былі абмеркаваны актуальныя пытанні рэлігійнага і грамадскага жыцця стараабраднікаў [660, с. 36]. Акрамя задач царкоўнага жыцця, ВСС дабіваўся адкрыцця асобных школ для дзяцей стараабраднікаў, выкладання Закона Божага ва ўсіх дзяржаўных школах [343, с. 39]. Сярод асноўных задач ВСС у галіне культуры і асветы прадугледжвалася патрабаваць для дзяцей стараабраднікаў вывучэння не толькі польскай, але і рускай мовы, выкладання на ёй усіх прадметаў (за выключэннем польскай мовы, гісторыі і краязнаўства); ураўнаваць стараабрадніцкія пачатковыя школы з адпаведнымі польскімі не толькі ў правах, але і ў матэрыяльным забеспячэнні; ажыццяўляць падбор падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, выкладчыцкіх кадраў і інш. Да выкладання Закона Божага, царкоўна-славянскай мовы, чытання, царкоўных спеваў неабходна было прыцягваць духоўнага настаўніка пэўнай абшчыны ці свецкую асобу (са згоды ўправы абшчыны) [1004, арк. 34–36].

Пасля праведзенага з'езда значна паскорыўся працэс урэгулявання прававога становішча стараабрадніцкіх абшчын. На фоне нявызначанага статусу праваслаўнай царквы і дыскрымінацыйных мер у адносінах да яе падтрымка стараабрадніцкай царквы азначала, што польскія ўлады меркавалі ў перспектыве пераўтварыць яе ў канкурэнта праваслаўнай царквы, пэўную супрацьвагу ёй [930, с. 195; 1059, с. 223]. На працягу некалькіх гадоў было ўрэгулявана прававое становішча Усходняй стараабрадніцкай царквы без духоўнай іерархіі. Паводле закона, выдадзенага 26 сакавіка 1928 г. прэзідэнтам Польшчы, былі вызначаны адносіны дзяржавы да стараабрадніцкай царквы, а распараджэннем урада 29 жніўня 1928 г. зацверджаны яе статут [750, арк. 1–3], паводле якога абшчыны стараабраднікаў мелі права праводзіць рэлігійную, культурна-асветніцкую, дабрачынную дзейнасць [758, арк. 13; 750, арк. 1–3, 7–19].

Прынятыя дакументы паспрыялі адкрыццю дзяржаўных пачатковых школ для дзяцей стараабраднікаў. На пленарным пасяджэнні ВСС

16 кастрычніка 1928 г. была зацверджана праграма выкладання Закона Божага ў дзяржаўных школах для дзяцей старaабраднікаў [584; 1002, арк. 1–8]. Для забеспячэння старaабрадніцкіх школ падрыхтаванымі кадрамі былі арганізаваны адпаведныя курсы ў Вільні [999, арк. 1–2]. Вучэбная праграма Віленскай 7-класнай пачатковай старaабрадніцкай школы, якая размяшчалася ў асобным памяшканні, выдзеленым Віленскай абшчынай, з’яўлялася базавай для школ для дзяцей старaабраднікаў. Менавітыя гэтыя школы былі адзінымі рускімі навучальнымі ўстановамі ў Польшчы, што атрымалі дзяржаўнае фінансаванне. Аднак недахоп адпаведных кадраў, вучэбных дапаможнікаў ускладняў іх дзейнасць [1000, арк. 56]. Да пачатку 1930-х гг. у Вільні засталася толькі згаданая 7-класная пачатковая старaабрадніцкая школа.

Вынікі арганізацыйнай працы падвёў II Усяпольскі старaабрадніцкі з’езд (сабор) (Вільня, 15–16 кастрычніка 1930 г.), у якім прымалі ўдзел 92 дэлегаты, з іх 30 духоўных настаўнікаў [998, арк. 180]. Друкаваным органам ВСС быў зацверджаны часопіс “Вестник Высшего Старообрядческого Совета в Польше”, рэдакцыйную раду якога ўзначаліў А.М. Піманаў. На працягу 1932–1933 гг. часопіс выдаваўся ў Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны [998, арк. 189].

У пачатку 1930-х гг. група рускіх дзеячаў на чале з намеснікам старшыні ВСС, паслом польскага сейма Б. Піманавым, якая выступала за ўзаемадзеянне і супрацоўніцтва з польскім урадам, складала сур’ёзнае палітычнае саперніцтва лідэрам РНА (М. Сярэбранікаву і інш.), што рэзка крытыкавалі палітыку польскіх улад адносна рускага насельніцтва. Менавіта таму па ініцыятыве МУС Польшчы Б. Піманаў і быў вылучаны на становішча лідэра рускай меншасці. Гэта адбылося на І з’ездзе САРМ (Варшава, 28–29 чэрвеня 1931 г.), дзе было заяўлена аб адмове ад вялікадзяржаўных ідэй, якіх раней прытрымліваўся РНА [260, арк. 8–10]. На з’ездзе выказваліся патрабаванні аб наданні рускай мове раўнапраўнага статуса з іншымі мовамі ў Польскай дзяржаве, адкрыцці дзяржаўных рускіх школ, матэрыяльнай падтрымцы для ўжо існуючых рускіх навучальных устаноў і інш. [1098, с. 476]. Новая арганізацыя, якую ўзначаліў Б. Піманаў, павінна была каардынаваць дзейнасць усіх рускіх аб’яднанняў. Абвясціўшы аб сваёй апалітычнасці, САРМ абмежаваў сваю дзейнасць выключна пытаннямі рускай культуры і асветы: займаўся падтрымкай нешматлікіх рускіх навучальных устаноў, грамадска-культурнай і рэлігійна-асветніцкай дзейнасцю. Як і РНА, САРМ настойліва дабіваўся надання рускай мове статуса мовы нацыянальнай меншасці [1116, с. 48]. Па ініцыятыве САРМ у 1933 г. у Варшаве быў створаны Фонд рускай школы для матэрыяльнай падтрымкі навучальных устаноў, умацавання і развіцця рускай культуры [260, арк. 15]. У Гродна

14 мая 1933 г. на сходзе мясцовай рускай супольнасці вырашылі стварыць філіял Фонда рускай школы, у склад управы якога ўвайшло 10 чалавек. 21 мая 1933 г. на чарговым сходзе ў Гродна з удзелам пасла Б. Піманава выказвалася спадзяваннне, што пытанне аб адкрыцці рускіх школ будзе вырашана [799, арк. 128]. Аднак з-за нешматлікасці сход рускай грамадскасці Гродна 22 кастрычніка 1933 г. не змог прыняць рашэнне аб адкрыцці рускай школы [1799, арк. 219].

У дзейнасці ВСС пытанні адукацыі займалі прыярытэтнае значэнне разам з клопатам пра культавыя святыні. Можна сцвярджаць аб валюнтарысцкіх адносінах польскіх улад да адукацыйных інтарэсаў стараабрадніцкага насельніцтва, бо пытанне аб выкладанні Закона Божага фактычна прымалася па кожнай школе асобна. У Залескай школе Дзісенскага павета было дазволена па-за раскладам выдзяляць для дзяцей стараабраднікаў 2 гадзіны рэлігіі [996, арк. 31]. Школьныя ўлады рабілі перашкоды для вывучэння рускай мовы ў Ластовіцкай абшчыне таго ж павета [997, арк. 94–94адв.]. Восенню 1933 г. было адмоўлена адкрыць грамадскую пачатковую школу для дзяцей стараабраднікаў у Ніўніках і Мацеўках Браслаўскага павета, бо мясцовых дзяцей іншых веравызнанняў трэба было пераводзіць у іншыя школы [1002, арк. 13]. Вучоба дзяцей стараабраднікаў ўскладнялася і матэрыяльнай нястачай. У лютым 1934 г. газеты паведамлялі, што сярод сялян Дзісенскага і іншых паветаў Віленскага ваяводства назіраўся голад. ВСС выдзяляў стыпендыі для навучання, аказваў матэрыяльную падтрымку незаможным вучням. Так, у 1935/1936 навуч. годзе 15 вучняў-стараабраднікаў былі залічаны ў якасці стыпендыятаў ў Віленскую рускую гімназію імя А.С. Пушкіна. Памер стыпендыі складаў 12,5 ці 25 злотых [1001, арк. 166].

Адна з першых бібліятэк-чытальняў стараабраднікаў была адкрыта ў верасні 1931 г. у Варонкаўскай абшчыне Браслаўскага павета (727 кніг) [758, арк. 329]. У 1933 г. бібліятэка-чытальня была арганізавана ў Кірылінскай абшчыне Браслаўскага павета. У пачатку 1937 г. такія бібліятэкі-чытальні дзейнічалі ў 11 абшчынах (Браслаўскі павет – 5, Віленска-Трокскі – 2, Свянцянскі – 2, Сувалкаўскі – 1, Дзісенскі – 1) [табліца 4.7 [1006, арк. 22]; 758, арк. 329]. Больш паловы бібліятэк-чытальняў узнікла ў 1935–1936 гг., іх фонды былі нешматлікімі – усяго 3 417 кніг, што тлумачылася адсутнасцю моцнай ўласнай паліграфічнай базы, незаможнасцю стараабрадніцкіх сем’яў.

Сярод мясцовага стараабрадніцкага насельніцтва папулярнасцю карысталіся рэлігійна-асветніцкія гурткі моладзі. Як сведчыць статут, асноўнымі задачамі гуртка ў мястэчку Дукшты Свянцянскага павета былі наступныя: вывучэнне свяшчэнных кніг, хрысціянскіх дагматаў, царкоўных спеваў, рускай мовы, літаратуры, гісторыі Расіі і

стараабрадніцтва, правядзенне лекцый, стварэнне бібліятэк-чытальняў [1003, арк. 1, 123, 135]. Рэлігійна-асветніцкія гурткі стараабрадніцкай моладзі дзейнічалі ў Відзаўскай, Турмонтаўскай, Віленскай, Дукштанскай, Ніўнікскай абшчынах. Гурток у Відзах, створаны ў маі 1935 г., наладзіў працу бібліятэкі-чытальні, паслугамі якой бясплатна карысталіся ўсе жадаючыя, праводзіў гутаркі на рэлігійна-духоўныя тэмы. У ліпені 1935 г. гурток аб’ядноўваў 43 чалавекі. Драматычная секцыя гуртка ў жніўні 1935 г. паказвала п’есу А. Астроўскага “Не ў свае сані не садзіся”, пазней рыхтавала яго п’есу “Свае людзі – паладзім”. Гурток наладжваў навагоднія і велікодныя святкаванні. Аднак матэрыяльныя цяжкасці перашкаджалі плённай культурна-асветніцкай працы гуртка [1003, арк. 68адв., 80].

Табліца 4.7 – Стараабрадніцкія бібліятэкі-чытальні (люты 1937 г.)

| Абшчына | Час заснавання | Месцазнаходжанне | Бібліятэкар | Колькасць кніг |
|---|---|---|---|---|
| Варонкаўская | 25.09.1931 | Варонка (Браслаўскі павет) | Е. Сямёнаў | 727 |
| Ніўнікская | 26.12.1935 | Ніўнікі (Браслаўскі павет) | М. Гушчанка | 342 |
| Міхалоўская | 5.02.1935 | Міхалова (Свянцянскі павет) | духоўны настаўнік Я. Іваноў | 303 |
| Аляксандраўская | 28.11.1934 | Аляксандраўск (Сувалкаўскі павет) | П. Пятроў | 145 |
| Мікалаюнская | 15.07.1932 | Мікалаюнцы (Браслаўскі павет) | І. Ягораў | 162 |
| Віленская | 1932 г. | г. Вільня | - | 226 |
| Дукштанская | 25.07.1933 | Дукшты (Свянцянскі павет) | - | 245 |
| Відзаўская | 8.05.1935 | Відзы (Браслаўскі павет) | - | 375 |
| Ракаўская | 4.01.1935 | Ракаўцы (Дзісенскі павет) | Д. Самазванаў | 322 |
| Кірылінская | 27.12.1935 | Кірыліна (Браслаўскі павет) | А. Масцюлін | 285 |
| Мітрафанаўская | 24.12.1936 | Мітрафанаўка (Віленска-Трокскі павет) | К. Сасноўскі | 285 |

Актуальныя праблемы культурна-асветніцкага жыцця абмяркоўваліся на ІІІ Усяпольскім стараабрадніцкім з’ездзе (саборы) (Вільня, 17–18 лютага 1936 г.), удзельнікамі якога былі 119 дэлегатаў і духоўных настаўнікаў. У спісе фігуравала 49 стараабрадніцкіх абшчын [1005, арк. 31–32].

Хоць на працягу 1928–1938 гг. стараабрадніцкая царква атрымала дзяржаўных датацый на суму 339 877 злотых [758, арк. 135], аднак у канцы 1930-х гг. дзяржаўная падтрымка стараабраднікаў-беспапоўцаў з боку Польскай дзяржавы аслабла. Не ўдалося ўтрымаць ранейшых пазіцый ў галіне асветніцкага жыцця. Намаганнямі аднаго з кіраўнікоў ВСС, пасла Б. Піманава дзейнічала толькі адзіная дзяржаўная руская школа для дзяцей стараабраднікаў у Вільні. Удалося дабіцца выкладання ў дзяржаўных польскіх пачатковых школах Закона Божага для дзяцей стараабраднікаў на роднай (рускай) мове – у 1937/1938 навуч. годзе іх было 153 [1006, арк. 11–14]. 20 лютага 1937 г. Б. Піманаў уздымаў ў польскім сейме цэлы шэраг пытанняў – аб меншасцях і школьнай палітыцы, роднай мове дзяцей у школе, адукацыйных патрэбах рускай меншасці, рускіх школах у Польшчы [591, с. 6–8, 13–17]. На той час ва ўсёй Польшчы існавала ўсяго 5 прыватных рускіх гімназій, 5 пачатковых школ. Аднак нават такая памяркоўная прапанова не была прынята польскім сеймам. У маі 1938 г. пасол Б. Піманаў на чале дэлегацыі прадстаўнікоў рускай меншасці быў прыняты прэм'ер-міністрам Ф. Славой-Складкоўскім, якому была ўручана дакладная запіска аб патрэбах рускага насельніцтва. Частка патрабаванняў (найперш у галіне школьнай асветы) была задаволена [467, с. 101].

Табліца 4.8 – Абшчыны стараабраднікаў у Браслаўскім, Ашмянскім, Дзісенскім, Пастаўскім паветах (1937 г.)

| Назва абшчыны, год яе заснавання, тэрытарыяльная прыналежнасць, лічба вернікаў | Год будаўніцтва храма, матэрыял | Імя і прозвішча духаўніка абшчыны, год нараджэння і дата асвячэння | Склад прэзідыума абшчыны |
|---|---|---|---|
| Барсучынская, 1906 г., в. Барсучына і інш., 1 158 вернікаў | 1894 г. (1889 г.), драўл. | Войтаў Фёдар Нар. 8.II.1878 г.; 1.IV.1925 г. | Міхайлаў С., Міхайлаў Э. |
| Буеўшчынская, 1875 г., Перабродская гміна, 1 716 вернікаў | 1875 г., драўл. | Нікіцін Сысой Нар. 6.VIII.1880 г.; 6.VII.1931 г. | Пушкароў Ф. Дзевятнікаў |
| Буловішская, 1880 г., Плюская гміна, 730 вернікаў | 1880 г., драўл. | Коласаў Пётр Нар. 29.VIII.1880 г.; 21.VII.1929г. | Данілаў Н. Рыбакоў М. |
| Відзаўская, 1680 г., Відзаўская гміна, 2 012 вернікаў | 1910 г., мурав. | Бабіч Сава Нар. – ; 9.VII.1935 г. | Бірулін М. |
| Варонкаўская, 1914 г., Гміна Ёды, 814 вернікаў | 1914 г., драўл. | Марозаў Фёдар Нар. 8.II.1872 г.; 31.I.1917 г. | Сямёнаў Цярэнцьеў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Грыгораўская, 1905 г., Богінская гміна, 792 вернікі | - драўл. | Яфімаў Флор Нар. 18.VIII.1846 г.; 26.IX.1902 г. | Кузняцоў Іваноў |
| Даведзінская, 1920 г., Відзаўская гміна, 465 вернікаў | 1909 г., драўл. | Арцем’еў Федасей Нар. 11.X.1864 г.; 10.I.1920 г. | Іваноў Г., Прусакоў П. |
| Друйская, 1620 г., Друйская гміна, 952 вернікі | 1898 г., драўл. | Аляксееў Арсеній Нар. – ; 25.III.1934 г. | Аляксееў Калітончык |
| Ерзоўская,1926 г., Гміна Ёды, 671 вернік | 1912 г., драўл. | Кандрацьеў Іларыён Нар. 1.X.1869 г.; 28.V.1926 г. | Ротчанкаў Марозаў С. |
| Кірылінская, 1706 г., Слабодская гміна, 970 вернікаў | 1912 г., драўл. | Масцюлін Андрэй Нар. – ; 12.V.1935 г. | Масцюлін А. |
| Кублішчынская, 1745 г., Гміна Новы Пагост, 2 512 вернікаў | 1905 г., драўл. | Не было | Міхайлаў Пушкоў Г. |
| Лаўнікская,1705 г., Плюская гміна, 905 вернікаў | 1905 г., драўл. | Кавалёў Аляксей Нар. 1861 г.; 11.X.1923 г. | Абжыгайлаў Г. Зелянкоў А. |
| Мікалаюнская, 1917 г., Дрысвяцкая гміна, 643 вернікі | 1920 г., драўл. | Ульянаў Сямён Нар. 3.II.1879 г.; 24.III.1922 г. | Ягораў І. Ягораў Е. |
| Мінкавіцкая, 1878 г., Дрысвяцкая гміна, 637 вернікаў | 1924 г., драўл. | Рыжэшчанка Пётр Нар. 22.VI.1871 г.; 8.V.1930 г. | Багамольнікаў Е. Кузняцоў Д. |
| Мацешская, 1884 г., Гміна Ёды, 1193 вернікі | 1884 г., драўл. | Зуеў Іван Нар. – ; 18.III.1934 г. | Зуеў І. Іваноў Ф. |
| Ніўнікская, 1880 г., Гміна Пераброддзе, 1774 вернікі | 1912 г., драўл. | Смерцьеў Карп Нар. 1880 г.; 29.VIII.1912 г. | Смерцьеў К. Іваноў П. |
| Астравіцкая, 1906 г., Відзаўская гміна, 472 вернікі | 1912 г., драўл. | Скачкоў Савер’ян Нар. – ; 25.IX.1906 г. | Лук’янаў Ф. |
| Рымутская, 1907 г., Гміна Опса, 702 вернікі | 1915, драўл. | Волкаў Іван Нар. 29.VIII.1878 г.; 21.IV.1925 г. | Рыбнікаў Т. Памялаў А. |
| Гедзейская, 1910 г., Гміна Граўжышкі | 1885 г., драўл. | Зубкоў Іван Нар. 19.V.1872 г.; 8.IV.1923 г. | Сініцын А. Каваленка Г. |
| Масцішская, 1864 г., Гальшанская гміна, 811 вернікаў | 1864 г., драўл. | Гуцянскі Андрэй Нар. 19.VIII.1877 г.; 6.I.1920 г. | Калеснікаў А. Апочкін М. |
| Германавіцкая, 1926 г., Германавіцкая гміна, 1 170 вернікаў | 1926 г. (1900 г.), драўл. | Аляксееў Іван Нар. - ; 18.II.1933 г. | Халява І. Аляксееў І. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Ластовіцкая, 1865 г., Глыбоцкая гміна, 769 вернікаў | 1875 г., драўл. | Осіпаў Еўсцігней Нар. 1860 г.; 25.XII.1925 г. | Федараў I. Естаф'еў М. |
| Залеская, 1865 г., Гміна Залессе, 530 вернікаў | 1926 г., драўл. | Сямёнаў Еўдакім Нар. 31.VII.1875 г.; 1.I.1921 г. | Савельеў П. Сямёнаў К. |
| Ракаўская, 1911 г., Шаркаўшчынская гміна, 526 вернікаў | 1921 г., драўл. | Зуеў Авін Нар. 13.VIII.1876 г.; 27.XII.1931 г. | Самазванаў Д. Фёдараў Ф. |
| Захараўская, 1876 г., Груздаўская гміна, 493 вернікі | 1876 г., драўл. | Не было | Артамонаў П. Кузмін А. |
| Лучайская, 1826 г., Лучайская гміна, 612 вернікаў | 1914 г., драўл. | Дзямідаў Міна Нар. 1870 г.; 20.III.1918 г. | Лукашонак Ф. Русалоўскі А. |

Да канца 1930 гг. у стараабраднікаў-беспапоўцаў назіралася ўстойлівая тэндэнцыя захавання сваёй адметнасці ў складзе Польскай дзяржавы. Яны працягвалі жыць традыцыйным укладам, прытрымліваліся сваёй веры, мовы. Агульны стан стараабрадніцкіх абшчын у заходнебеларускіх землях у 1937 г. прадстаўлены ў табліцы 4.8 [758, арк. 318–319, 321–322; 420, с. 56, 220]. Адасоблены характар этнаканфесійнага жыцця стараабраднікаў стрымліваў яго асіміляцыю. Гэтую акалічнасць адзначалі ваяводскія ўлады Беластоцкага ваяводства, дзе прысутнасць стараабраднікаў была нязначнай (у пачатку 1939 г. налічвалася ўсяго 8 абшчын (7 745 чалавек)). "Як маса, стараабраднікі з'яўляюцца замкнутым асяроддзем, якое не паддаецца асіміляцыйным уплывам і не страціла свайго маскоўскага фальклору, у палітычных адносінах не выклікае пярэчанняў". "Не праяўляюць тэндэнцыі да польскай культурнай асіміляцыі. Знаходзячыся ў памежнай паласе, з'яўляюцца хутчэй непажаданым элементам, хоць прызнаюцца лаяльнымі" [210, арк. 26адв.; 207, арк. 30].

У цэлым, становішча стараабраднікаў у міжваеннай Польшчы было складаным. Як і іншыя прадстаўнікі рускай меншасці, яны паспыталі на сабе вынікі нацыянальнай палітыкі польскіх урадаў. Аднак стараабраднікі атрымалі юрыдычныя падставы для свайго этнакультурнага і канфесійнага жыцця. У параўнанні з праваслаўнай царквой, на якую праводзіўся наступ праз дэрусіфікацыю, паланізацыю царкоўных тэкстаў, мовы набажэнстваў, рэвіндыкацыю і закрыццё храмаў, стараабраднікі-беспапоўцы ўзамен на ідэйна-палітычную лаяльнасць атрымоўвалі падтрымку з боку Польскай дзяржавы. У такіх умовах ажыццяўляліся меры па захаванню традыцыйнай культуры, мовы, абрадаў стараабрадніцкага насельніцтва. ВСС у Польшчы шмат увагі надаваў культурна-асветніцкай працы – стварэнню школ, бібліятэк-чытальняў, маладзёжных рэлігійна-асветніцкіх гурткоў.

Нягледзячы на колькасны рост вернікаў, у канцы 1930-х гадоў з-за паступовага згортвання грамадска-палітычнай актыўнасці рускай меншасці і іншых фактараў магчымасці для шырокага развіцця ў сферы духоўнага і канфесійнага жыцця стараабраднікаў былі абмежаванымі.

Наогул, у культурным жыцці рускай меншасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. праявіўся цэлы шэраг тэндэнцый. Па-першае, мясцовыя аддзелы рускіх арганізацый разам з грамадска-палітычнай, дабрачыннай працай займаліся і культурна-асветніцкай дзейнасцю, падтрымкай рускіх навучальных установ, бібліятэк. Па-другое, кансерватыўна-традыцыяналісцкі напрамак быў вызначальным у захаванні як свецкіх, так і рэлігійных каштоўнасцей рускай меншасці. Па-трэцяе, у асяроддзі як рускіх, так і беларусаў канфесійная прыналежнасць пераважала нацыянальную ці ідэалагічную, аднак праваслаўная царква не стала кансалідуючым фактарам, бо сама ператваралася ў інструмент паланізацыі. Пры гэтым трэба ўлічваць і тое, што невялікая частка рускіх не праяўляла сваёй канфесійнай прыналежнасці, аддаючы перавагу свецкім каштоўнасцям. Па-чацвёртае, большую ўстойлівасць да польскай палітыкі асіміляцыі праявілі рускія стараабраднікі, якія змаглі захаваць сваё веравызнанне, мову, уклад жыцця, культурныя артэфакты.

У адрозненне ад рускіх грамадскіх і асветніцкіх аб’яднанняў украінскі культурна-асветніцкі рух быў абмежаваны пераважна Палескім ваяводствам. Яго традыцыі пачаліся на Палессі яшчэ ў час Першай сусветнай вайны. У пачатку 1920-х гг. там не назіралася актыўнай украінскай дзейнасці, за выключэннем адзінкавых клубаў, аматарскіх музычных і драматычных гурткоў. У склад мясцовай арганізацыі “Просвіта” у Брэсце ў красавіку 1921 г. уваходзіла толькі 32 чалавекі [218, арк. 34]. 6 жніўня 1921 г. група ўкраінскай інтэлігенцыі, сярод якіх быў будучы пасол у польскім сейме В. Дзмітрыюк, П. Лешчынковіч, Р. Дрозд, А. Тураўскі, М. Альховы і інш., падала заяву аб рэгістрацыі таварыства “Просвіта на Палессі” (“Просвіта на Поліссі”) [440, с. 1–2]. Паводле іншых звестак, праект статута быў пададзены на рэгістрацыю ў снежні 1922 г [1144, с. 138]. Сярод стваральнікаў “Просвіты на Палессі” пераважалі прыхільнікі Украінскага нацыянальна-дэмакратычнага аб’яднання (УНДА). Пасля працяглай бюракратычнай валакіты палескі ваявода зацвердзіў у сакавіку 1923 г. статут “Украінскага культурнага таварыства “Просвіта на Палессі” з цэнтральнай управай у Брэсце [221, арк. 4]. Таварыства фармальна з’яўлялася рэгіянальным аб’яднаннем, незалежным ад галаўной арганізацыі “Просвіта” у Львове, што існавала з 1868 г., мела асобную структуру: акрамя цэнтральнай управы ў Брэсце, былі створаны 2 акруговыя камітэты ў Брэсце і Кобрыне.

Важным клопатам для “Просвіты” з’яўляліся пытанні адукацыі, якія надавалі асаблівую вастрыню польска-ўкраінскім адносінам. У 1922/1923 навуч. годзе з 2 996 украінскіх школ у Польшчы на Палескае ваяводства прыходзілася толькі 22 (0,7%)[1030, с. 63–64]. У 1923 г. на тэрыторыі Брэсцкага і Кобрынскага паветаў праводзілася кампанія па байкоту польскіх школ і складванню дэкларацый аб адкрыцці ўкраінскіх школ [248, арк. 42]. Паводле справаздачы Палескага ваяводскага ўпраўлення за чэрвень 1923 г., “акцыя ўкраінскіх дзеячаў супраць польскай пачатковай школы падтрымлівалася ўкраінскім насельніцтвам, у некаторых мясцовасцях знаходзіла добрую аснову” [246, арк. 27]. Сяляне падвяргаліся штрафам за адмову пасылаць дзяцей у польскія школы [248, арк. 7]. У жніўні 1923 г. украінскія дзеячы беспаспяхова спрабавалі змяніць кіраўніцтва рускай гімназіі ў Брэсце, спадзяючыся на яе пераўтварэнне ў сярэднюю школу з рускай і ўкраінскай мовамі навучання. Планавалася таксама будаўніцтва народнага дома ў Жабінцы Брэсцкага павета [790, арк. 14]. Як адзначана ў адной са справаздач IX КАП (1923 г.), дзеячы “Просвіты” аб’ядноўваліся пад выглядам кааператываў, выступалі за незалежную Украіну. “Гэты рух больш небяспечны за бальшавізм, бо яго кіраўнікі з’яўляюцца людзьмі інтэлігентнымі, пераважна з вышэйшай адукацыяй. … Арганізацыя наогул вельмі актыўная, паспяхова развівае агітацыю ў вёсках. У гэтым асабліва вылучаюцца папы (свяшчэннаслужыцелі) і настаўнікі ўкраінскага паходжання. Чым далей на поўдзень, тым мацнейшая дзейнасць “Просвіты”. На гэтых тэрыторыях агітатары паводзяць сябе вельмі варожа, проста абуральна, яскрава настройваюць насельніцтва супраць Польшчы. Акрамя Брэста, апорнымі пунктамі “Просвіты” з’яўляюцца Пінск, Лунінец, Сарны…” [1245, арк. 25].

Мясцовая ўкраінская інтэлігенцыя ўсталявала сувязі з кіраўніцтвам “Просвіты” у Львове, украінскімі прадстаўнікамі ў польскім сейме і сенаце. Была ўрачыста ўвекавечана памяць украінскага пісьменніка А. Старажэнкі (1806–1874 гг.), апошнія гады жыцця якога прайшлі ў Брэсце і навакольнай вёсцы Трышын [349, с. 3]. Яго імя атрымала адкрытая ў 1924 г. прыватная 7-класная ўкраінская школа (каля 100 вучняў), пры якой былі наладжаны курсы для дарослых [235, арк. 2].

На з’ездзе “Просвіты” (Львоў, 26 снежня 1923 г.) планавалася стварыць сумесны камітэт для аб’яднання на месцах (у тым ліку на Палессі) уласных структурных адзінак з пляцоўкамі дабрачыннай арганізацыі “Рідна хата”. Аднак да рэалізацыі гэтага сумеснага праекту справа не дайшла [906, с. 50]. Аддзелы “Ріднай хаты” на Палессі з’яўляліся нешматлікімі. Адзін з іх быў заснаваны ў в. Дзмітравічы Брэсцкага павета [80, с. 3].

У першай палове 1920-х гг., калі адбывалася арганізацыйнае станаўленне таварыства “Просвіта на Палессі”, яе сацыяльная база была

вузкай. У сакавіку 1925 г. у Брэсце налічвалася каля 100 чалавек [257, арк. 42] (у лістападзе 1925 г. – 140 чалавек [440, с. 2]), у павятовай ячэйцы ў Кобрыне ў чэрвені 1925 г. – 60 чалавек [220, арк. 54]. Да таго ж арганізацыя ў Кобрыне не была легалізавана, бо фармальна таварыства "Просвіта" не мела права ствараць свае мясцовыя структурныя адзінкі, хаця яго статутныя паўнамоцтвы распаўсюджваліся на ўсё Палескае ваяводства [218, арк. 114]. Прадстаўнікі Украінскага пасольскага клуба праводзілі адпаведную працу па легалізацыі мясцовай арганізацыі "Просвіты", а таксама неаднаразова выстаўлялі патрабаванні аб адкрыцці ўкраінскіх школ, працаўладкаванні беспрацоўных настаўнікаў і г. д., аднак польская адміністрацыя адмаўлялася іх задавальняць. Рускія манархісты не прызнавалі ўкраінскі рух самастойным.

Нягледзячы на перашкоды, украінскі культурна-асветніцкі рух пашыраўся. На працягу 1925/1926 навуч. года ў адзінай украінскай школе ў Брэсце было наладжана 5 выстаў, некалькі ўрачыстых мерапрыемстваў у гонар Т. Шаўчэнкі, І. Франко, А. Старажэнкі, праводзіліся агульнаадукацыйныя курсы для дарослых [655, с. 3; 718, с. 4; 537, с. 3]. На надзвычайны агульны збор членаў таварыства "Просвіта" у Брэсце 29 жніўня 1926 г. акрамя членаў таварыства прыбылі кіраўнікі і прадстаўнікі бібліятэк-чытальняў з населеных пунктаў Стараселле, Стрэльна, Янава Драгічынскага павета, Арэвічы, Аросава, Глініцы, Новыя Задворцы Брэсцкага павета. Самакрытычна прызнавалася, што "інтэлігенцыя, духавенства, настаўнікі, за вельмі малым выключэннем, стаялі збоку ад культурна-асветніцкага руху", што адчуваўся недахоп арганізатарскіх кадраў на месцах [538, с. 3]. Неабходна адзначыць, што тады пры бібліятэках ствараліся хоры і драматычныя гурткі – у Кобрыне, Стрэльна, Янава [538, с. 3].

У лютым 1924 г. міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы ў сваіх цыркулярах лічыла, што "можна дазволіць універсітэт украінцам у Львове (за адпаведную цану) (падпольна там дзейнічаў у 1921–1923 гг.; дазвол так і не быў атрыманы, была ўтворана толькі кафедра ўкраінскай мовы ў Кракаўскім універсітэце – А.В.), аднак на Палессі, якое з'яўляецца і стратэгічным, і маральным вузлом польскай пазіцыі, трэба ўтрымліваць выключна польскія школы" [908, с. 46]. Таму невыпадкова, што да 1924/1925 навуч. года засталіся толькі 2 грамадскія пачатковыя школы з украінскай мовай навучання [1030, с. 63–64]. Пасля прыняцця польскім сеймам 31 ліпеня 1924 г. "Закона аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў" на Палессі была праведзена кампанія па збору дэкларацый аб адкрыцці ўкраінскіх школ. Вясной 1925 г. "Просвіта" і Украінскае сацыялістычнае аб'яднанне "Сельсаюз" праводзілі гэтую акцыю на тэрыторыі Кобрынскага, Брэсцкага,

Драгічынскага, Пружанскага паветаў [145, арк. 46, 68; 217, арк. 18; 151, арк. 55]. На працягу красавіка 1925 г. актывістамі "Просвіты" было сабрана каля 200 дэкларацый [220, арк. 276], аднак ніводная з іх не была задаволена. Супраць школьнай акцыі выступала не толькі мясцовая адміністрацыя, але і польскія палітычныя партыі, культурна-асветніцкія арганізацыі. "Няхай беларус ці ўкраінец вывучыць сваю мову ў дзяржаўных школах, а не ў ТБШ ці "Просвіце", – адзначалася ў адной са справаздач IX КАП. – "Няхай гісторыя беларускага ці ўкраінскага народа будзе прадстаўлена моладзі польскім педагогам, а не самавучкам, кіраўніком беларускіх ці ўкраінскіх асветніцкіх курсаў" [249, арк. 24]. У 1927/1928 навуч. годзе ў Палескай школьнай акрузе была толькі адна 3-класная ўкраінская прыватная школа ў Брэсце, а таксама 3 польска-ўкраінскія школы і 40 польскіх, дзе ўкраінская мова выкладалася ў якасці прадмета: у Брэсцкім павеце – 4, Кобрынскім павеце – 4, Драгічынскім павеце – 1, іншыя прыходзіліся на населеныя ўкраінскім насельніцтвам Сарненскі (21) і Камень-Кашырскі (8) паветы [143, арк. 9–12]. Да 1928/1929 навуч. году дзяржаўных украінскіх школ у Палескім ваяводстве не было. Нязначныя ўступкі рэжыма "санацыі" не змянілі становішча – у 1930/1931 навуч. годзе існавала некалькі польска-ўкраінскіх школ [881, с. 34]. "Просвіта" утрымлівала адзіную сярэднюю ўкраінскую школу ў Брэсце, займалася асветніцкай дзейнасцю.

Вялікі ўплыў на развіццё ўкраінскага культурна-асветніцкага руху з 1926 г. аказалі Грамада і Украінскае сялянска-рабочае сацыялістычнае аб'яднанне "Сельраб" (Сельраб). На тэрыторыі Палескага ваяводства Сельраб меў акруговы камітэт, 7 павятовых камітэтаў, больш 100 гурткоў (каля 1,5 тыс. чалавек), асабліва ў Брэсцкім, Кобрынскім, Пінскім і іншых паветах. Дзеячы Сельраба ў канцы 1926 г. па ініцыятыве КПЗБ пераходзілі ў гурткі і бібліятэкі-чытальні "Просвіты", выкарыстоўваючы іх легальны статус. Гэта дазволіла таварыству "Просвіта" стварыць сетку мясцовых структурных адзінак. У пачатку 1927 г. таварыства "Просвіта" мела 61 бібліятэку-чытальню, з іх 6 размяшчаліся ў Брэсце. На працягу лютага-красавіка 1927 г. узнікла 16 новых бібліятэк ў Брэсцкім, Кобрынскім, Пінскім паветах [157, арк. 6], а ўсяго на працягу 1927 г. была адкрыта 21 новая бібліятэка-чытальня [1144, с. 139]. Бібліятэкі-чытальні размяшчаліся пераважна ў непрыстасаваных прыватных памяшканнях.

Папярэднія вынікі арганізацыйнага развіцця рэгіянальнай "Просвіты" падвёў яе з'езд, які адбыўся ў Брэсце ў лютым 1927 г. Акрамя старшыні з'езда У. Крыніцкага, у склад управы таварыства ўвайшлі дырэктар украінскай школы імя А. Старажэнкі П. Арцемук, М. Гаршчарук, І. Алесіюк [438, с. 1–2]. Планавалася пабудаваць народны дом у Брэсце [69, с. 3]. У лютым-сакавіку 1927 г. у Брэсце былі арганізаваны

кааператыўныя курсы, на якіх з лекцыямі па методыцы культурна-асветніцкай працы выступаў кіраўнік "Просвіты" з Львова М. Галушчынскі [603, с. 4]. У канцы 1928 г. там жа праводзіліся курсы для кіраўнікоў вясковых чытальняў [585, с. 3]. Літаратура набывалася ў галаўной арганізацыі "Просвіта" у Львове, а таксама ў Луцку, Хелме.

Адносіны польскіх улад да гурткоў "Просвіты" былі выказаны на з'ездзе стараст Палескага ваяводства 16 сакавіка 1927 г., г. зн. пасля ліквідацыі Грамады. "Урад не дапусціць кансалідацыі і цэнтралізацыі асобных гурткоў "Просвіты" ў адну моцную арганізацыю" [156, арк. 5]. Паводле канцэпцый польскіх улад, Палессе павінна было стаць бар'ерам для распаўсюджвання ўкраінскага руху на поўнач. Таму там мэтанакіравана не дапускалася ўсялякая дзейнасць украінскіх арганізацый.

На выбарах у польскі сейм у 1928 г. дзеячы "Просвіты" аказвалі падтрымку Сельрабу. Пазней парламенцкія фракцыі клуба "Змагання" і Сельраба часта сумесна выступалі супраць нацыянальна-культурнай асіміляцыі беларусаў і ўкраінцаў. Украінскі клуб распрацаваў законапраект аб арганізацыі адукацыі няпольскага насельніцтва, аднак ён быў адхілены ў сейме [1197, с. 66–69].

Да свайго 60-годдзя ў 1928 г. "Просвіта" у межах Польскай дзяржавы дасягнула ў арганізацыйным развіцці даваеннага ўзроўню, аб'яднаўшы ў сваіх структурах 12 508 чалавек [1167, с. 550], мела 37 стацыянарных бібліятэк, 1 779 бібліятэк-чытальняў, 1 тыс. клубаў (святліц) [906, с. 53–54]. Разам з іншымі арганізацыямі "Просвіта" імкнулася рэалізаваць цэлы комплекс мер па ліквідацыі непісьменнасці насельніцтва праз стварэнне курсаў, выдавецкую дзейнасць і іншымі сродкамі [376, с. 110]. Таварыства "Просвіта" для папулярызацыі ўкраінскамоўнага друку праводзіла розныя акцыі (Тыдзень украінскай кніжкі і інш.), у ходзе якіх збірала кнігі для ўкраінскага насельніцтва Палесся [906, с. 50].

Ва ўмовах актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця на тэрыторыі Палескага ваяводства адбываўся далейшы арганізацыйны рост "Просвіты". Па ініцыятыве пасла В. Дзмітрыюка былі ўнесены адпаведныя змены ў статут для таго, каб ствараць свае структурныя адзінкі па-за межамі Брэста [552, с. 357–375]. У канчаткова зацверджанай у 1928 г. рэдакцыі статута адзначалася, што мэтай арганізацыі з'яўлялася "развіццё асветы і ўздым культурнага становішча ўкраінскага насельніцтва Палесся" [650, с. 3.]. У канцы снежня 1928 г. акруговы камітэт КПЗБ даў распараджэнне ўласным актывістам арганізоўваць ячэйкі Сельраба і "Просвіты". У такіх абставінах колькасць гурткоў "Просвіты" ўзрасла з 112 (1601 чалавек) у 1928 г. да 127 (1754 чалавекі) у 1929 г. – у Брэсцкім, Кобрынскім, Драгічынскім, Пінскім, Столінскім і Пружанскім паветах [147, арк. 69]. Эфектыўна працавалі павятовыя ўправы ў Брэсце і Кобрыне.

Самадзейныя мастацкія калектывы “Просвіты” наладжвалі тэатральныя пастаноўкі для мясцовага ўкраінскага насельніцтва. У рэпертуары былі ўкраінскамоўныя п’есы “Наталка Палтаўка”, “Яўрэйка-выхрэстка”, “Нявольнік”, “У калядную ноч”, “Мітусня” і іншыя. Выступалі і вандроўныя ўкраінскія тэатральныя трупы, за якімі быў устаноўлены пільны кантроль з боку мясцовай адміністрацыі. Так, косаўскі стараста дакладваў 30 кастрычніка 1928 г. палескаму ваяводзе аб тым, што кіраўніцтва тэатра Р. Бугаёва і артысты “не праявілі ў сваёй дзейнасці палітычных тэндэнцый” [126, арк. 5]. Не было адзначана “палітычных тэндэнцый, непрыхільных Польскай дзяржаве” і ва ўкраінскамоўных выступленнях хора Д. Котка і тэатральнай трупы А. Лявіцкага на тэрыторыі Столінскага павета [126, арк. 9]. Важным элементам грамадзянскага выхавання ўкраінскага насельніцтва ў гарадах і вёсках Палесся з’яўляліся ўрачыстасці ў гонар Т. Шаўчэнкі [583, с. 48]. Распаўсюджваліся ўкраінскамоўныя газеты і часопісы “Діло”, “Сельроб”, “Наше життя”, выданні “Просвіты” (“Народна Просвіта”, “Аматорскій театр”, “Бібліотечній порадник”) і іншая літаратура, якая друкавалася пераважна ў Львові. У 1929 г. у Польшчы было 83 украінскамоўныя выданні, агульны тыраж якіх дасягаў 267 575 экзэмпляраў [871, с. 122].

Адначасова з ростам сеткі гурткоў адкрываліся новыя бібліятэкі-чытальні “Просвіты” – у канцы 1928 г. у Палескім ваяводстве іх налічвалася 106, у тым ліку ў Брэсцкім павеце – 38, Кобрынскім – 44, Драгічынскім – 19, Пінскім і Столінскім – 5 [161, арк. 58адв.], а да пачатку 1929 г. іх колькасць павялічылася да 127. Паводле польскіх паліцэйскіх органаў, большая частка бібліятэк-чытальняў мела “антыдзяржаўны характар”, бо знаходзілася пад уплывам камуністаў і Сельраба. Так, у час вобыску ў кіраўніка чытальні “Просвіты” у Дружылавічах Драгічынскага павета Г. Казінскага паліцыя знайшла друкаваныя выданні Кампартыі Заходняй Украіны [162, арк. 10]. Польскія ўлады вымушаны былі прызнаваць, што “Просвіта” “ў многіх выпадках выконвала дапаможныя заданні, якія ўплывалі на культурна-асветніцкае развіццё ўкраінцаў” [161, арк. 46адв.]. У прыватнасці, многія гурткі “Просвіты” (як і ТБШ) праводзілі кампанію барацьбы з п’янствам. У гуртках Сельраба ў Ілаўскай гміне Кобрынскага павета абавязалі сваіх членаў устрымацца ад ужывання алкаголю, тытуню, каб зэканомленыя грошы выкарыстаць для культурна-асветніцкай працы [587, с. 4].

З-за незаможнасці сялянскага ўкраінскага насельніцтва таварыства “Просвіта” адчувала востры недахоп фінансавых сродкаў для ўтрымання ўкраінскай сярэдняй школы ў Брэсце, будаўніцтва там народнага дома. “Просвіта” пазбавілася ўласнага памяшкання – Палеская праваслаўная кансісторыя выселіла яе з брацкага дома. Пэўную падтрымку арганізацыя

атрымоўвала ад украінскіх паслоў, цэнтральнай рады “Просвіты” у Львове, заходнеўкраінскіх партый. Матэрыяльную дапамогу аказвалі і з усходу. Так, у прадстаўленым для абмеркавання на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)У праекце каштарысу выдаткаў на ўкраінскую працу за мяжой (дакумент датуецца 6 студзеня 1927 г.) сярод іншых пазначаны сродкі на ўтрыманне сярэдніх школ у Брэсце і Пінску (па 400 рублёў аднаразова), стварэнне там жа сярэдніх школ (па 3 тыс. рублёў), узвядзенне народнага дома ў Брэсце (4 тыс. рублёў), арганізацыю структурных адзінак “Просвіты” у Кобрыне і Пінску (па 200 рублёў) [81, с. 269–270]. Дапамога паступала ад заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх камуністаў, якіх мэтанакіравана падтрымлівалі Камінтэрн і УКП(б) [403, с. 193]. Украінская моладзь, якая вучылася ва Украінскім універсітэце ў Празе, Украінскай сельскагаспадарчай акадэміі ў Падэбрадах і іншых ВНУ Чэхаславакіі, атрымоўвала дапамогу ад урада гэтай краіны [1068, с. 308].

Табліца 4.9 – Стан таварыства “Просвіта” у Палескім ваяводстве ў 1928 –1933 гг.

| Павет | 1928 г. | | 1929 г. | | 1930 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. |
| Брэсцкі | 53 | 732 | 54 | 746 | 32 | 689 |
| Драгічынскі | 9 | 86 | 20 | 189 | 6 | 84 |
| Кобрынскі | 44 | 693 | 44 | 693 | 35 | 675 |
| Пінскі | 3 | 56 | 4 | 68 | 3 | 56 |
| Пружанскі | 2 | 34 | 3 | 44 | 2 | 29 |
| Столінскі | 1 | - | 2 | 14 | 1 | - |
| Усяго | 112 | 1 601 | 127 | 1 754 | 79 | 1 534 |
| Працяг табліцы 4.9 | | | | | | |
| Павет | 1931 г. | | 1932 г. | | 1933 г. | |
| | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. | гурткоў | чал. |
| Брэсцкі | 20 | 501 | 16 | 375 | 2 | 48 |
| Драгічынскі | 7 | 23 | 7 | 33 | - | - |
| Кобрынскі | 27 | 478 | 27 | 478 | - | - |
| Пінскі | - | - | - | - | - | - |
| Пружанскі | 2 | 29 | 2 | 29 | - | - |
| Столінскі | - | - | - | - | - | - |
| Усяго | 56 | 1 031 | 52 | 915 | 2 | 48 |

Хоць таварыства “Просвіта” мела пэўныя поспехі на тэрыторыі Палескага ваяводства, асабліва ў 1927–1929 гг., аднак яго дзейнасці перашкаджалі ідэалагічныя супярэчнасці паміж кіраўніцтвам і нізавымі структурамі. Управа таварыства ў Брэсце, дзе пераважалі прыхільнікі УНДА і пятлюраўцы, у 1929 г. закрыла ў Брэсцкім павеце больш 30 вясковых бібліятэк-чытальняў [355, с. 3]. Як сведчаць звесткі табліцы 4.9 [146, арк. 33], найвышэйшага арганізацыйнага развіцця “Просвіта”

дасягнула ў 1929 г. Разгорнутыя рэпрэсіі польскіх улад у пачатку 1930-х гг. выклікалі негатыўныя наступствы для "Просвіты". У 1931 г. дзейнічалі толькі 79 гурткоў "Просвіты" (1 534 чалавекі), у наступным годзе – 56 (1 031 чалавек) [147, арк. 69]. Актыўнасць уцалелых структурных адзінак "Просвіты" была слабой. Так, у лютым 1931 г. было праведзена толькі 7 сходаў і 1 аматарскае прадстаўленне [253, арк. 33адв.]. Сход дэлегатаў і членаў таварыства "Просвіта" Палескага ваяводства (Брэст, 29 сакавіка 1931 г.) паказаў аслабленне пазіцый арганізацыі, заняпад гурткоў у некаторых мясцовасцях не толькі з-за ганенняў польскіх улад, але і адсутнасці зацікаўленасці дзейнасцю арганізацыі з боку вясковага насельніцтва [171, арк. 5адв.–6]. У пачатку 1932 г. налічваліся 44 украінскія гаспадарчыя пляцоўкі, а таксама 53 чытальні "Просвіты" – у Кобрынскім (26), Брэсцкім (21), Драгічынскім (3), Пружанскім (2) і Пінскім (1) паветах " [176, арк. 24].

Акрамя "Просвіты", ліквідацыяй непісьменнасці ўкраінскага насельніцтва займалася таксама Украінскае педагагічнае таварыства "Рідна школа", якое было заснавана яшчэ ў 1881 г. Хоць з сярэдзіны 1920-х гг. назіраўся рост арганізацыйных структур "Рідней школы" у Галіцыі, аднак яго дзеячы (сярод іх пераважалі прыхільнікі УНДА) у пачатку 1930-х гг. вырашылі актывізаваць сваю дзейнасць на Валыні і Палессі для ўзмацнення там гаспадарчага і культурнага ўплыву сярод украінскага насельніцтва [1069, с. 245]. Да разгорнутага ў канцы 1932 г. па ініцыятыве "Рідней школы" плебісцыту адносна адкрыцця ўкраінскіх школ далучыліся структуры "Просвіты". У студзені 1933 г. адпаведная агітацыйная кампанія праводзілася ў Брэсцкім, Драгічынскім і Кобрынскім паветах. Актыўны ўдзел у зборы подпісаў бацькоў ажыццяўлялі праваслаўныя святары – Г. Садоўскі, Р. Грудовік у Брэсцкім павеце, В. Катовіч, М. Шчур у Драгічынскім павеце і іншыя [226, арк. 118; 177, арк. 6адв.; 224, арк. 26]. У ходзе праведзенай акцыі ў шэрагу мясцовасцяў моладзь збірала грошы на падпіску заходнеўкраінскіх перыядычных выданняў, "у многіх дамах з'явіліся партрэты Шаўчэнкі" [225, арк. 301]. Аднак з-за адсутнасці нізавых структур кампанія плебісцыту на Палессі не атрымала поспеху [1144, с. 140; 440, с. 2], хаця ўсяго ў межах Польшчы (пераважна ў Галіцыі і на Валыні) было сабрана па розных падліках 200–250 тыс. дэкларацый [908, с. 53–54].

Польскія адміністрацыйна-паліцэйскія ўлады Палескага ваяводства пад пагрозай спынення дзейнасці "Просвіты" патрабавалі ад яе кіраўніцтва выдалення "падрыўных элементаў". У адказ кіраўнік "Просвіты на Палессі" А. Базылевіч закрыў 1 чэрвеня 1932 г. 30 бібліятэк-чытальняў [1144, с. 140]. У 1932 г. былі ліквідаваны ўсе вясковыя бібліятэкі-чытальні, засталася толькі 1 у Брэсце. Па палітычных матывах не была зацверджана

ў пачатку 1933 г. на пасаду кіраўніка ўкраінскай школы ў Брэсце В. Львова [177, арк. 25]. У 1933 г. засталіся толькі 2 гурткі "Просвіты". У сакавіку 1933 г. кіраўнік бібліятэкі-чытальні ў Дарапеевічах Кобрынскага павета склаў свае паўнамоцтвы і перадаў кнігазбор ва ўправу ў Брэст "з-за адсутнасці запатрабаванняў чытачоў" [177, арк. 43адв.]. У красавіку 1933 г. "Просвіта" мела ўсяго 3 чытальні – у Брэсце, Арэхаве Брэсцкага павета, Блотах Кобрынскага павета [177, арк. 62адв.]. Крытычным было становішча адзінай украінскай школы ў Брэсце. Спынілі сваю дзейнасць гурткі Сельраба, які быў забаронены ў верасні 1932 г. Кіраўнікі ўправы "Просвіты" звярталіся ў 1933 г. за матэрыяльнай дапамогай у таварыства "Рідна школа" у Львове, Земскі іпатэчны банк, таварыства "Дністро", да ўкраінскіх парламентарыяў. Украінскі кааператыўны банк у Брэсце выдзеліў крэдыт. Аднак і "Просвіта", і "Рідна школа" не маглі аказаць істотнай дапамогі, бо знаходзіліся ў складаным фінансавым становішчы. Яны рэгулярна наладжвалі акцыі па збору ахвяраванняў. Пасля ліквідацыі Сельрабу і чытальняў "Просвіты" з вясны 1933 г. арганізаваны ўкраінскі культурна-асветніцкі рух на Палессі спыніўся. У 1935 г. польскія ўлады забаранілі "Просвіту на Палессі".

Свой уклад у грамадска-культурнае жыццё ўносілі і прадстаўнікі ўкраінскіх эміграцкіх колаў. Галоўным каардынуючым органам украінскай палітычнай эміграцыі з'яўляўся Украінскі цэнтральны камітэт (УЦК), створаны ў красавіку 1921 г. у Варшаве. На месцах ствараліся яго аддзелы. У 1934 г. іх налічвалася 54 [1202, с. 38]. На тэрыторыі Заходняй Беларусі такія аддзелы дзейнічалі ў Брэсце, Гродна, Баранавічах, Слоніме, Івацэвічах, Парэччы Пінскага павета. Нешматлікія групы ўкраінскіх эмігрантаў былі зафіксаваны ў Пінску, Кобрыне, Янаве, Лясной, Мілавідах, Стаўбцах. Аддзелы праводзілі для былых вайскоўцаў-пятлюраўцаў лекцыі, курсы ўкраіназнаўства і іншую культурна-асветніцкую працу. З канца 1920-х гг. штогод праводзіліся мерапрыемствы ў гонар С. Петлюры, Т. Шаўчэнкі, Ю. Пілсудскага, лекцыі па гісторыі Украіны. У 1930 г. Галоўная управа УЦК планавала адкрыць у 16 аддзелах стацыянарныя бібліятэкі [1202, с. 44]. У бібліятэкі выпісвалі "Тризуб" (Парыж), "Шляхом незалежности" (орган УЦК), "За незалежність", альманах "Дніпро", "Вісти УЦК" і іншыя друкаваныя выданні ўкраінскіх эмігрантаў.

Аддзел УЦК у Брэсце, створаны ў 1929 г., з'яўляўся адным з буйных у міжваеннай Польшчы, меў з 1931 г. стацыянарную бібліятэку [1196, с. 605–606]. Пасля набыцця ў 1935 г. уласнага памяшкання там размясцілася "Хата казака". Пазней быў створаны дзіцячы садок. Немалое значэнне надавалася дабрачынным акцыям – збору сродкаў на бібліятэку С. Пятлюры ў Парыжы, для беспрытульных дзяцей. Аддзел УЦК у

Слоніме, які быў створаны таксама ў 1929 г., аб’ядноўваў украінскіх рабочых, якія працавалі на дрэваапрацоўчых прадпрыемствах у Слонімскім павеце [316]. У студзені 1933 г. у Слоніме адбыўся сход, на якім была перавыбрана ўправа. Старшынёй аддзела быў выбраны Я. Ваўкагон з Альбярціна (змяніў на гэтай пасадзе І. Казіенка), сакратаром – І. Шклярэнка са Слоніма, скарбнікам – В. Брадоўскі (Альберцін) [314, арк. 17; 180, арк. 33]. Пры дапамозе Галоўнай управы УЦК у Слоніме была створана бібліятэка. У сакавіку 1938 г. там упершыню было праведзена свята Т. Шаўчэнкі [1196, с. 602–603]. Адзел УЦК у Гродна, які дзейнічаў у першай палове 1930-х гг., меў уласную бібліятэку-чытальню [1202, с. 39]. Варта адзначыць, што ўкраінскія эміграцкія структуры мелі даволі напружаныя адносіны з рускімі арганізацыямі.

У адрозненне ад Палесся, галаўная арганізацыя “Просвіта” у Галіцыі з 1933 г. умацоўвала свае пазіцыі. На момант правядзення 26 снежня 1933 г. агульнага з’езда “Просвіты” у Львове ў яе налічвалася 3 032 чытальні. Разам з “Рiднай школай” “Просвіта” мела 4 550 культурна-асветніцкіх пляцовак [906, с. 57, 83]. За перыяд з 1933 па 1936 гг. колькасць членаў таварыства павялічылася ў 2 разы і перавысіла 300 тыс. чалавек [1121, с. 39; 778, арк. 555]. Акцэнт рабіўся на грамадска-культурную працу ў вясковай мясцовасці ў структурах “Рiднай школы” і “Просвіты”, кааператывах. Таварыства імкнулася разгортваць культурна-асветніцкую працу і на Палессі, аднак перашкоды з боку польскіх уладаў не давалі магчымасці для яе правядзення. У Галоўнай управе “Просвіты” была створана асобная секцыя “нацыянальнай абароны”, якая павінна была праводзіць працу ў мясцовасцях, якім пагражала паланізацыя, куды ўключалася і Палессе. Планавалася праз падрыхтаваных інструктараў па культурна-асветніцкай працы ажыццяўляць дзейнасць праз украінскія кааператывы, сельскагаспадарчыя гурткі [906, с. 61]. На працягу 1935–1936 гг. адносна паспяхова разгортвалася дзейнасць таварыства “Рiдна школа”.

Акрамя культурна-асветніцкіх таварыстваў, у Львове дзейнічаў шэраг іншых украінскіх грамадскіх арганізацый. Актыўна працавала Навуковае таварыства імя Т. Шаўчэнкі, якое ўтрымлівала створаную ў 1894 г. бібліятэку (налічвала каля 100 тыс. тамоў, у тым ліку рукапісы з XIV ст., старадрукі XVI–XVIII стст.), а таксама музей, кнігарню, друкарню [1068, с. 87–88, 308–309]. Сярод выданняў арганізацыі неабходна адзначыць “Записки Наукового Товариства ім. Т. Шевченкі”, “Збірник историчнофилозофічної секциї”, “Пам’ятки до історіі українско-руской мови і літератури”, “Жерала до історіі України-Русі”, “Стара Україна” і інш. У музеі Навуковага таварыства імя Т. Шаўчэнкі ў сакавіку-красавіку 1938 г. была наладжана этнаграфічная выстава, прысвечаная Палессю, сярод

экспанатаў якой былі малюнкі палескіх тыпаў са збораў Віленскага беларускага музея [206, арк. 33–34адв.]. Пытаннямі папулярызацыі ўкраінскай культуры займалася Таварыства прыяцеляў Нацыянальнага музея імя Т. Шаўчэнкі. У Львове існавалі таксама бібліятэка Народнага дома (мела рукапісы і старадрукі), бібліятэкі "Просвіты", "Ріднай школы" і іншых арганізацый.

У 1930 г. пры міністэрстве веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы ў Варшаве быў створаны Украінскі навуковы інстытут, мэтай якога з'яўлялася даследаванне гісторыі, культуры, гаспадаркі ўкраінскага народа, падрыхтоўка навуковых кадраў. Працавалі там пераважна ўкраінцы-эмігранты, таму ўстанова не знайшла шырокай падтрымкі з боку заходнеўкраінскай інтэлігенцыі. Усяго Украінскі навуковы інстытут выдаў больш 70 прац, сярод якіх былі даследаванні па гісторыі Украіны Д. Дарашэнкі ("Нарыс гісторыі Украіны" у 2-х тт.), Б. Крупніцкага, А. Якоўліва, М. Хандельсмана, успаміны па гісторыі ўкраінскага нацыянальнага руху Л. Васілеўскага, А. Латоцкага (дырэктара інстытута да 1938 г.) і іншыя [867, с. 473]. З сярэдзіны 1930-х гг. у Варшаўскім універсітэце праводзіліся лекцыі па ўкраіністыцы, у 1936 г. у Львоўскім універсітэце была адкрыта кафедра ўкраінскай мовы [908, с. 58].

Нягледзячы на ідэйна-палітычную раз'яднанасць, розныя ўкраінскія структуры вылучаліся згуртаванасцю ў адстойванні нацыянальна-культурных інтарэсаў. Як адзначаў беларускі дзеяч С. Грынкевіч, які наведаў Галіцыю ў 1936 г., "амаль няма такой вёскі, дзе не было б чытальні "Просвіты". У адрозненне ад беларусаў, украінцы актыўна прапагандавалі нацыянальныя каштоўнасці па-за межамі кампактнага пражывання [100, с. 19, 85]. На агульным з'ездзе таварыства "Рідна школа" (Львоў, 25 снежня 1936 г.) уздымалася пытанне аб пашырэнні працы ў напрамку ўзмацнення нацыянальнай свядомасці ўкраінскага насельніцтва [908, с. 36]. Планавалася надаць працы "Ріднай школы" большую дынамічнасць, супрацьстаяць працэсу паланізацыі рэгіёнаў, дзе было ўкраінскае насельніцтва, у тым ліку Палесся [906, с. 88].

Міжкультурныя ўзаемаадносіны беларусаў і ўкраінцаў мелі пазітыўны характар, асабліва ў 1920-я гг. У час выбарчых кампаній, на парламенцкім узроўні, паміж асобнымі партыямі і арганізацыямі адбывалася цеснае беларуска-ўкраінскае супрацоўніцтва [559, с. 269–272]. У студзені 1933 г. група беларускіх пісьменнікаў, публіцыстаў, якая гуртавалася вакол радыкальнай "Беларускай газеты", выказвала пратэст супраць закрыцця гурткоў "Просвіты" і ТБШ [316, арк. 156]. У 1930-я гг. заходнебеларуская інтэлігенцыя спрабавала наладзіць больш цесныя кантакты з заходнеўкраінскімі арганізацыямі, у тым ліку з "Просвітай" у Львове. Створаны ў Вільні ТБШ і БІГіК Школьны сакратарыят 17 ліпеня 1936 г.

звяртаўся да "Просвіты", часопіса "Рідна школа" у Львове за дапамогай у справе абароны інтарэсаў беларусаў у друку, польскім сейме і сенаце [525, арк. 59–60].

Аднак даўнія спрэчкі аб этнічным характары і тэрытарыяльнай прыналежнасці Палесся перашкаджалі плённаму беларуска-ўкраінскаму ўзаемадзеянню. У. Кубійовіч і іншыя ўкраінскія даследчыкі, спасылаючыся на працы дарэвалюцыйных рускіх вучоных, уключалі заходнепалескі рэгіён у склад украінскай этнічнай тэрыторыі. Паўночную мяжу ўкраінскіх зямель яны праводзілі ад Нарвы на ўсход праз Бельскі, Пружанскі паветы, Выганашчанскае возера да Прыпяці, далей па Прыпяці да Дняпра [206, арк. 33–34адв.]. Усе ўкраінскія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі адстойвалі ідэю стварэння незалежнай Украіны, у межы якой уключалася і Палессе. Восенню 1931 г. група польскіх сацыялістаў спрабавала ўнесці на разгляд польскага сейма праект аб аўтаноміі ўкраінскіх зямель (Станіславаўскага, Цярнопальскага, Валынскага ваяводстваў, часткі Львоўскага ваяводства, 2-х паветаў Палескага ваяводства – Камень-Кашырскага і Сарненскага, населеных пераважна ўкраінцамі), аднак ён быў адхілены пасля разгляду ў адміністрацыйнай камісіі [42, арк. 10]. 3 снежня 1938 г. група ўкраінскіх паслоў выступала з праектам канстытуцыйнага закона Галіцка-Валынскай зямлі, у склад якой прапаноўвалася ўключыць значна большую тэрыторыю, у тым ліку амаль усё Палескае ваяводства (за выключэннем Косаўскага і Лунінецкага паветаў), Бельскі павет Беластоцкага ваяводства [42, арк. 4]. Гэты праект выклікаў негатыўную рэакцыю з боку заходнебеларускай інтэлігенцыі. 24 лютага 1939 г. прадстаўнікі заходнебеларускага руху, нягледзячы на рознасць ідэйна-палітычных платформ, выказалі пратэст у асобным лісце да ўкраінскіх парламентарыяў. "Аўтары праекту аўтаноміі далучаюць да ўкраінскай нацыянальнай тэрыторыі цэлы шэраг паветаў Палескага ваяводства (Столінскі, Пінскі, Драгічынскі, Кобрынскі, Брэсцкі, Пружанскі) і Беластоцкага ваяводства (Бельскі), не ўлічваючы пры гэтым ні агульнапрыняты этнаграфічны прынцып, ні волю беларускіх мас гэтых паветаў" [42, арк. 13]. Адназначна была выказана пазіцыя аб прыналежнасці згаданых паветаў да беларускай этнічнай тэрыторыі. Варта дадаць, што наладжванню супрацоўніцтва паміж беларускімі і ўкраінскімі дзеячамі таксама перашкаджалі спробы польска-ўкраінскага паразумення сярэдзіны 1930-х гг. [1040, с. 87].

Ажыўленне ўкраінскага грамадска-культурнага руху на Палессі пачалося ў другой палове 1930-х гг. У 1937 г. былы сенатар, дзеяч УНДА А. Кісялеўская надрукавала ў часопісе "Жіноча доля" (Львоў) серыю нарысаў "З маіх вандровак па роднаму краю Палесся", якая пазней выйшла

асобным выданнем. Публікацыя атрымала станоўчыя водгукі ва ўкраінскай прэсе. Украінскае навуковае таварыства імя Т. Шаўчэнкі (Львоў), украінская студэнцкая арганізацыя (Кракаў) выступілі з ініцыятывай больш дэталёвага азнаямлення з палескім краем. Летам 1937 г. былі наладжаны этнаграфічныя экспедыцыі, турыстычна-краязнаўчыя вандроўкі выкладчыкаў ВНУ і студэнтаў-украінцаў. Першая такая экспедыцыя на чале з У. Кубійовічам прайшла ў ліпені-жніўні 1937 г. па 7 паветах. Палессе наведала таксама група грамадскіх украінскіх дзеячаў.

У лістападзе 1937 г. таварыства "Рідна школа" разгарнула чарговую акцыю збору подпісаў за адкрыццё ўкраінскіх школ (школьнага плебісцыту)[906, с. 88]. Правядзенне гэтай кампаніі планавалася і на тэрыторыі Палесся. 15 снежня 1937 г. грамадска-палітычны аддзел Палескага ваяводскага ўпраўлення разаслаў усім павятовым старастам ліст, у якім загадаў рашуча не дапускаць сходаў, збору подпісаў, стварэння камітэтаў "Ріднай школы", канфіскоўваць інструкцыі, адозвы і іншую друкаваную літаратуру таварыства. Дапускалася магчымасць правядзення такога плебісцыту толькі ў асобных гмінах Брэсцкага і Кобрынскага паветаў [205, арк. 12]. Жорсткія абмежавальныя меры польскія ўлады тлумачылі тым, што "Рідна школа" не мела права разгортваць сваю дзейнасць па-за межамі Галіцыі. Прадугледжвалася не дапускаць да школьнай акцыі "Просвіту" і іншыя культурна-асветніцкія таварыствы [205, арк. 13]. У снежні 1937 г. Н. Козак і былы солтыс Ю. Лукашук збіралі ў в. Паляцічы Кобрынскага павета подпісы пад дэкларацыяй за адкрыццё ўкраінскай школы [205, арк. 7]. За выключэннем нешматлікіх прыкладаў, акцыю школьнага плебісцыту на Палессі правесці не ўдалося.

Аднак украінскія культурна-асветніцкія арганізацыі ажыццяўлялі мэтанакіраваную працу па ўкраінізацыі мясцовага насельніцтва Палесся [708, с. 3–4, 11]. Па заданню ЦК УНДА пасол І. Завалыкут праводзіў у Брэсце кансультацыі з кіраўнікамі, актывістамі "Просвіты" В. і У. Крыніцкімі, А. Бадзюкевічам адносна ажыўлення дзейнасці "Просвіты", наведаў Кобрын, Пінск, Лунінец [206, арк. 35–35адв.]. Было прапанавана наладзіць праз "Просвіту" экскурсіі ўкраінскай моладзі ў Галіцыю. 23 ліпеня 1938 г. першая такая група (20 чалавек) накіравалася з Брэста ў Львоў. Польскія ўлады перашкаджалі правядзеню такіх экскурсій, ажыццяўлялі захады па абмежаванню кантактаў украінцаў Палескага ваяводства і Галіцыі. Так, 19 кастрычніка 1938 г. МУС Польшчы накіравала адпаведны ліст львоўскаму і цярнопальскаму ваяводам. "Прымяняць больш радыкальную цэнзуру ўкраінскіх прапагандысцкіх артыкулаў у прэсе і выданняў пра Палессе, не дапускаць у Львове больш маштабных украінскіх прапагандысцкіх палескіх імпрэз, як гэта было з

палескай выставай у бягучым годзе” [204, арк. 35–36]. Прадугледжвалася правядзенне строгага кантролю за ўсімі экскурсіямі.

У канцы 1930-х гг. нацыянальна-культурнае становішча ўкраінцаў у Польшчы заставалася складаным. Больш 30% дзяцей не вучылася, у школах з роднай мовай навучанне праходзіла толькі 5% украінскіх дзяцей. Сярод украінцаў непісьменныя складалі каля 80% [908, с. 55]. У 1936/1937 навуч. годзе з 9 тыс. студэнтаў ВНУ Львова ўкраінцаў было толькі 11,5% [391, с. 456]. У заходнеўкраінскіх землях важнае значэнне ў захаванні нацыянальнай культуры і асветы ігралі вядучыя культурна-асветніцкія ўстановы. Па розных ацэнках таварыства “Рідна школа” у 1939 г. налічвала каля 2 074 гурткоў, якія аб’ядноўвалі каля 105 тыс. чалавек [908, с. 37; 419, с. 2519; 1126, с. 114–115]. “Просвіта” у 1939 г. мела 3 075 чытальняў (каля 360 тыс. чалавек) (пераважна ў Галіцыі), ахоплівала рознымі напрамкамі працы 15% дарослых [906, с. 63; 411, с. 2366].

Хоць на Валыні польскія ўлады актыўна прымянялі рэпрэсіўныя меры супраць украінскага культурна-асветніцкага руху (на працягу 1928–1936 гг. там было ліквідавана 630 структурных адзінак “Просвіты” [946, с. 149], аднак валынскі ваявода Г. Юзэфскі спрабаваў рэалізаваць праект па пераўтварэнню рэгіёна ў своеасаблівы “ўкраінскі П’емонт” [1080, с. 330]. Нягледзячы на абмежаванне ўплыву з Галіцыі, на Валыні рознымі мясцовымі нацыянальнымі арганізацыямі было ахоплена каля 1/3 украінскага насельніцтва [572, с. 12].

У адрозненне ад Галіцыі і Валыні грамадска-культурная дзейнасць украінскай супольнасці на Палессі была вельмі абмежаванай, насіла эпізадычны характар. У канцы 1930-х гг. на тэрыторыі Палескага ваяводства асобныя групы ўкраінскага насельніцтва гуртаваліся вакол нешматлікіх кааператываў, звязаных з арганізацыямі Львова, управы “Просвіты” у Брэсце, украінскіх кааператыўных банкаў у Брэсце і Кобрыне. Украінская прапаганда ажыццяўлялася праз прэсу, літаратуру, якія бясплатна накіроўвалі па пошце мясцовым актывістам ці нелегальна завозілі з Львова, Луцка [204, арк. 80](паводле некаторых падлікаў, у 1930-я гг. у Польшчы выдавалася больш 140 украінскіх перыядычных выданняў [373, с. 496]). Адпаведная агітацыя назіралася і з боку ксяндзоў, манахаў, псаломшчыкаў грэка-каталіцкага і візантыйска-славянскага абрадаў [206, арк. 32–33]. Нягледзячы на такое ажыўленне, у той час на Палессі адсутнічалі арганізацыйныя структуры культурна-асветніцкага руху.

У цэлым, нацыянальна-культурнае жыццё ўкраінцаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі разгортвалася толькі ў асобных паветах Палескага ваяводства, на беларуска-ўкраінскім памежжы. Намаганнямі мясцовай украінскай інтэлігенцыі была створана рэгіянальная арганізацыя культурна-асветніцкага таварыства “Просвіта” – “Просвіта Палесся”.

Цесная сувязь з радыкальнымі беларускімі і ўкраінскімі нацыянальна-вызваленчымі партыямі і арганізацыямі дазволіла таварыству "Просвіта" стварыць у Палескім ваяводстве ў другой палове 1920-х – пачатку 1930-х гг. разгалінаваную сетку гурткоў і бібліятэк-чытальняў. Таварыства "Просвіта" ажыццяўляла культурна-асветніцкую працу праз бібліятэкі-чытальні і народныя дамы, утрымлівала нешматлікія ўкраінскія школы, развівала розныя формы асветніцкай працы як сярод моладзі, так і дарослых, клапацілася пра захаванне гісторыка-культурнай спадчыны ўкраінскага насельніцтва. З-за мэтанакіраванай палітыкі польскіх улад таварыства "Просвіта" на Палессі ў пачатку 1930-х гг. прыйшло ў заняпад. Заходнеўкраінскія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і культурна-асветніцкія арганізацыі праяўлялі асаблівы інтарэс да Палесся (асабліва ў 1930-я гг.), разглядаючы яго ў якасці часткі ўкраінскай этнічнай тэрыторыі, аднак не змаглі арганізаваць там украінскі грамадска-культурны рух.

## 4.3. Дзейнасць літоўскіх грамадскіх і асветніцкіх арганізацый

Пытанне аб дзяржаўнай прыналежнасці Віленшчыны на працягу ўсяго міжваеннага часу аказвала рашаючы ўплыў на польска-літоўскія ўзаемаадносіны, прадвызначала нацыянальна-культурнае жыццё літоўскай супольнасці ў Польшчы і адпаведна палякаў у Літве [1216, с. 112; 1015, с. 221–228; 845, с. 230]. Ва ўмовах мэтанакіраванай палітыкі нацыянальнай асіміляцыі літоўцаў, якая праводзілася ў Польшчы дзяржаўнымі ўстановамі, адукацыяй, каталіцкім касцёлам, друкам, для літоўцаў праблема этнічнага самазахавання набыла важнае значэнне. Дзякуючы мабілізацыі знешняга фактару (маральнага і матэрыяльнага ўплыву Літвы), удалося стварыць арганізаваны літоўскі грамадска-культурны рух, які польская адміністрацыя не прызнавала ў якасці самастойнага.

Адной з уплывовых арганізацый з'яўлялася Літоўскае асветніцкае таварыства "Рытас" ("Ранак") (Lietuvių Švietimo Draugija „Rytas"), якое ўзнікла яшчэ ў 1913 г. у Вільні, распачало сваю дзейнасць у складаных абставінах пачатку 1920-х гг. у межах Сярэдняй Літвы [1010, с. 428]. Рэпрэсіўныя дзеянні супраць літоўскага руху, якія суправаджалі праведзеныя ў студзені 1922 г. выбары ў віленскі сейм і далучэнне Сярэдняй Літвы да Польшчы, прывялі да спаду актыўнасці таварыства "Рытас" вясной 1922 г., асабліва ў паветах, дзе літоўская прысутнасць была нязначнай. Так, у Ашмянскім павеце "літоўская агітацыя ў цэлым заціхла", літоўскі рух праявіў сябе толькі ў гміне Дзевянішкі [364, арк. 17].

Пасля непрацяглага заняпаду з 1923 г. назіраўся ўздым актыўнасці "Рытас". У Лідскім павеце ўзмацняліся антыпольскія настроі з-за

"ўзмоцненай дзейнасці агітатараў у памежнай зоне", да якой далучаліся таксама ксяндзы і настаўнікі-літоўцы [311, арк. 6–7]. Як адзначалі польскія ўлады, мясцовыя кіраўнікі "Рытас", ксяндзы-літоўцы перайшлі ад асцярожнай да "цалкам адкрытай, смелай, выразна антыдзяржаўнай дзейнасці, накіраванай на рэалізацыю прэтэнзій і дамаганняў Ковенскай Літвы" [320, арк. 7–8]. У справаздачы аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў Лідскім павеце ў верасні 1925 г. адзначалася, што літоўскае насельніцтва імкнулася да адкрыцця школ на роднай мове, пазбягала выкарыстання польскай мовы, карысталася выключна літоўскай мовай і на зададзеныя пытанні адмаўлялася адказваць па-польску [312, арк. 79]. Настаўнікі прыватных літоўскіх школ распаўсюджвалі звесткі аб магчымым польска-літоўскім узброеным канфлікце з-за Віленшчыны [313, арк. 106]. Як адзначаў паліцэйскі пастарунка дзяржпаліцыі ў в. Бершты Гродзенскага павета, літоўскае насельніцтва максімальна аддалялася ад усяго польскага, вучыла сваіх дзяцей толькі ў літоўскіх школах [626, арк. 201адв.; 629, арк. 37адв.].

Пытанні асветы літоўскай супольнасці мелі выключнае значэнне для таварыства "Рытас", якое асноўныя намаганні накіроўвала не столькі на ўласныя гурткі, колькі на літоўскія школы. Паводле афіцыйных звестак, у лістападзе 1924 г. у Віленскім ваяводстве дзейнічала 131 літоўская пачатковая школа (77 прыватных і 54 дзяржаўных) – пераважна ў Свянцянскім і Віленскім паветах. У Браслаўскім павеце налічвалася 4 прыватныя і 2 дзяржаўныя літоўскія школы [974, арк. 370]. Паводле ацэнак Віленскага школьнага папячыцельства, па стану на 1 кастрычніка 1927 г. дзейнічала 44 дзяржаўныя, 76 прыватных літоўскіх школ [1204, с. 581]. Нягледзячы на адсутнасць дакладнай статыстыкі, выразнай была тэндэнцыя да павелічэння колькасці школ "Рытас" – з 16 (619 вучняў) у 1923/1924 навуч. годзе да 91 (3 тыс. вучняў) у 1926/1927 навуч. годзе (у Віленскім павеце – 42, Лідскім – 21, Гродзенскім – 18, Браслаўскім – 5, Ашмянскім – 4, Свянцянскім – 1) [830, арк. 1; 867, с. 197; 385, с. 84]. Паводле іншых звестак, у 1927 г. было 86 [1010, с. 428] ці 100 прыватных літоўскіх пачатковых школ (3,6 тыс. вучняў) [954, с. 143]. Існуючая сетка школ не задавальняла адукацыйныя патрэбы літоўскага насельніцтва. Аднак выклікае сумненне лічба ў 800 школ (паводле В. Марцінкенаса, які спасылаўся на архіўныя крыніцы культурна-асветніцкіх арганізацый [1027, с. 28]).

Становішча літоўскіх школ ускладнялася недахопам педагагічных кадраў, адмовамі ў зацвярджэнні наяўнага настаўніцкага персаналу, арыштамі. Так, у канцы 1925 г. прадстаўленыя таварыствам "Рытас" настаўнікі літоўскіх школ ў Дзядзюлах, Рымошах, Мацюцях, Шудойнях Ашмянскага павета не атрымалі дазволу на працу з-за адсутнасці

адпаведнай прафесійнай кваліфікацыі [975, арк. 303]. У вучэбным працэсе нельга было выкарыстоўваць падручнікі, надрукаваныя ў Каўнасе, бо ў іх на картах Віленшчына была паказана як “зямля, акупаваная Польшчай”. Пасля інспекцыі ў 1932 г. літоўскай школы ў в. Біжы гміны Марцінканцы Гродзенскага павета там выявілі адсутнасць карты Польшчы, наяўнасць вучэбнай літоўскамоўнай літаратуры, выдадзенай у Каўнасе [979, арк. 9].

Акрамя пачатковых школ, у Вільні дзейнічала літоўская гімназія імя Вітаўта Вялікага (з 1915 г.), якую ўтрымлівала таварыства “Рытас” (гімназія імя Кейстута існавала ў Свянцянах у 1919–1937 гг.), а таксама настаўніцкая семінарыя. “Існаванне школы і семінарыі ў Вільні знаходзіцца пад пагрозай”, – адзначалася ў мемарандуме літоўскага ўрада ў Генеральны сакратарыят Лігі нацый 17 снежня 1923 г. [974, арк. 278]. Пасля праведзенай праверкі гімназіі ў лютым 1924 г. было адзначана: “Агульны ўзровень школы з’яўляецца нізкім, настаўнікі не маюць ні прафесійнай, ні навуковай падрыхтоўкі” [974, арк. 36]. Пасля асабістых захадаў Л. Васілеўскага і выступлення Часовага літоўскага камітэта з 1924/1925 навуч. года гімназія атрымала правы грамадскай установы, якіх пазбавілася ў 1938 г. У міжваенны час яе скончылі 420 чалавек [1018, с. 203]. Там дзейнічалі музычны, рысавальны, літаратурны, тэатральны, музычна-тэатральны гурткі, гурток аматараў эсперанта, з 1923 г. – вучнёўская хрысціянска-дэмакратычная арганізацыя. Гімназісты выпускалі газету “Lietuviški Varpai” (“Літоўскія званы”), “Žagrė” (“Саха”) і іншыя літаратурна-мастацкія выданні. З 1933 г. у гімназіі дзейнічаў спартыўны гурток, там займаліся краязнаўчымі і этнаграфічнымі даследаваннямі.

Дзяржаўныя структуры Літвы, замежная літоўская дыяспара аказвалі матэрыяльную падтрымку (асабліва ў 1920-я гг.) грамадскім, культурна-асветніцкім арганізацыям літоўцаў Віленшчыны. У 1924 г. грашовая дапамога літоўскага ўрада складала 1 153 тыс. літаў (каля 1 млн. злотых), у 1925 г. – 1 879 тыс. літаў, у 1926 г. – 2 706 тыс. літаў [1018, с. 175]. Значная частка гэтых сродкаў накіроўвалася на прыватную адукацыю. Настаўнікі літоўскіх школ, кіраўнікі бібліятэк, чытальняў атрымоўвалі дадатковую плату [1015, с. 159]. Пэўную дапамогу аказваў і СССР, які не быў зацікаўлены ў згасанні польска-літоўскага канфлікту [680, с. 12].

Літоўская дзяржава ў розных формах аказвала падтрымку этнічным меншасцям Польшчы, выступала за салідарнасць літоўцаў з беларусамі, украінцамі. Ва ўмовах канфлікту з Польшчай літоўскія ўлады ў пачатку 1920-х гг. актыўна выкарыстоўвалі беларускую карту [1014, с. 57]. У самой Літве беларускія арганізацыі атрымалі ў 1924 г. 150 тыс. літаў (каля 135 тыс злотых), у 1925 г. – 250 тыс. літаў (225 тыс. злотых) [1013, с. 202]. Аднак стабілізацыя міжнароднага становішча, зацвярджэнне ўсходняй мяжы Польшчы Канферэнцыяй паслоў Антанты 15 сакавіка 1923 г.,

мэтанакіраваная праца французскай дэмакратыі па скасаванню антыпольскага літоўска-беларускага саюза, адмова беларускіх дзеячаў займацца выключна культурна-асветніцкай працай, раскол беларускага руху, варожыя адносіны да яго з боку палякаў і рускіх, што жылі ў Літве, дамінаванне русафільскай ці паланафільскай тэндэнцый і іншыя прычыны прывялі да заняпаду пасля 1923 г. палітычнага супрацоўніцтва паміж літоўцамі і беларусамі [441, с. 6; 48, арк. 6–7; 45, арк. 326–327; 410, с. 269]. Вясной 1925 г. Часовы літоўскі камітэт на чале з Д. Альсейкам у Вільні спрабаваў наладзіць адносіны з радыкальна настроенымі беларускімі дзеячамі [704, с. 269]. Аднак ажывіць ўзаемаадносіны (асабліва на месцах) не ўдалося. Як паведамлялі восенню 1928 г. служачыя паліцэйскага пастарунка ў Берштах Гродзенскага павета, літоўцы праводзілі асобную палітыку і з беларусамі не салідарызаваліся [630, арк. 71].

Узмацненне з 1926 г. аўтарытарных тэндэнцый ва ўнутраным жыцці Польшчы і Літвы (усталяванне рэжыма “санацыі” Ю.Пілсудскага, прыход да ўлады ўрадаў А. Вальдэмараса, А. Сметоны) рэзка пагоршыла нацыянальна-культурнае жыццё адпаведна літоўскай і польскай меншасцей. Кожны з бакоў памылкова разглядаў ганенні і рэпрэсіўныя дзеянні ў якасці сродкаў уздзеяння для паляпшэння становішча сваіх суайчыннікаў. У пачатку кастрычніка 1927 г. польскія ўлады закрылі літоўскую настаўніцкую семінарыю ў Вільні, 45 літоўскіх школ (большасць з іх размяшчалася ў Віленска-Трокскім павеце, у Лідскім павеце было закрыта 18 школ – у вёсках гмін Радунь, Эйшышкі, Мацкішкі, Жырмуны, Бенякoні, Седлішкі [954, с. 147]), арыштавалі ў Вільні і на Віленшчыне 120 літоўскіх дзеячаў і актывістаў (дырэктараў і настаўнікаў школ, ксяндзоў і інш.), значную частку якіх дэпартавалі ў Літву [1062, с. 584]. Праводзіліся шматлікія рэвізіі ў суполках “Рытас”.

Гвалтоўнае абмежаванне літоўскага нацыянальна-культурнага жыцця з канца 1927 г. азначала завяршэнне перыяду часовага ўздыму ў дзейнасці “Рытас” (1923–1927 гг.), прывяло да страты ранейшых дасягненняў і прадвызначыла пераход таварыства да самазахавання. Такая тэндэнцыя яшчэ больш узмацнілася ў пачатку 1930-х гг. Школы таварыства “Рытас” закрываліся, замест іх у некаторых мясцовасцях адкрывалі дзяржаўныя польска-літоўскія школы. Праведзены аналіз статыстычных звестак паказвае, што найбольш негатыўныя наступствы (у выглядзе закрыцця школ) былі характэрны менавіта для памежных беларуска-літоўскіх мясцовасцей. Так, у Гродзенскім павеце колькасць пачатковых школ “Рытас” зменшылася з 22 (з іх 16 знаходзіліся ў гміне Марцінканцы, 4 – Парэчча, 2 – Бершты) у 1930 г. да 17 у 1931/1932 навуч. годзе (з іх у Парэцкай гміне засталася толькі 1 (Азёры), у Берштаўскай гміне ўцалелі 2 (Кабелі II і Шумы)), а праз год засталося толькі 7 польска-літоўскіх школ

(515 вучняў) [295, арк. 135; 979, арк. 22; 978]. У лютым 1932 г. паліцэйскія органы адзначалі, што настаўнікі школ “Рытас” праводзяць у Гродзенскім павеце “ціхую антыпольскую агітацыю сярод мясцовага насельніцтва” супраць польскай адукацыі [798, арк. 31]. У гміне Бершты ў школах “Рытас” дзяцей вучылі размаўляць толькі па-літоўску. Агульная характарыстыка мясцовага насельніцтва была наступнай: “Крымінальная злачыннасць выключна малая, рэлігійная вера і салідарнасць моцныя” [612, арк. 349]. У в. Віцюны гміны Марцінканцы кіраўнік мясцовага гуртка “Рытас” праводзіла хатняе навучанне літоўскіх дзяцей, якіх не пускалі бацькі ў новую польскую школу. [801, арк. 62]. У 1934 г. у Відзах Браслаўскага павета дабіваліся адкрыцця школы “Рытас”, але беспаспяхова. Усяго таварыства ўтрымлівала ў 1934/1935 навуч. годзе 15 школ [1018, с. 121, 191].

З 1932 г. асноўная ўвага таварыства “Рытас” была звернута на стварэнне бібліятэк-чытальняў – звычайна там, дзе раней існавалі літоўскія школы. Кіраўнікамі бібліятэк-чытальняў прызначаліся пераважна былыя літоўскія настаўнікі [799, с. 218; 800, с. 218]. Як і літоўскія школы, гэтыя ўстановы таксама разглядаліся польскімі ўладамі як “ачагі антыдзяржаўнай дзейнасці”. У сакавіку 1934 г. стараста Валожынскага павета не дазволіў таварыству “Рытас” адкрыць народныя чытальні, бібліятэкі ў в. Лаздуны і Баброўічы [341, арк. 97адв.]. Восенню 1934 г. Галоўная ўправа таварыства “Рытас” загадала кіраўнікам вясковых чытальняў ствараць пры іх гурткі для дзяцей дашкольнага ўзросту, агітаваць мясцовае насельніцтва за тое, каб дамагалася прызначэння ў літоўскія школы настаўнікаў-літоўцаў [183, арк. 301адв.]. У лютым 1936 г. кіраўнікі чытальняў “Рытас” заклікалі мясцовае насельніцтва адмаўляцца ад усялякага супрацоўніцтва з польскімі грамадскімі арганізацыямі [802, арк. 11]. Паводле розных крыніц, агульная колькасць створаных на працягу 1932–1936 гг. бібліятэк-чытальняў “Рытас” вагалася ад 97 да 157 [1027, с. 122; 1018, с. 214].

Літоўскія дзеячы ліберальных палітычных поглядаў (пераважна людоўцы (liaudininkai)), якія імкнулася абмежаваць клерыкальны характар таварыства “Рытас”, у 1927 г. стварылі асобнае Літоўскае асветніцкае таварыства “Культура” (Lietuvių „Kultūros” Švietimo Draugija) [743, арк. 54]. Некаторыя мясцовыя арганізацыі гэтага таварыства знаходзіліся пад уплывам камуністаў. Кіраўніцтва “Рытас” рашуча выступала супраць новага таварыства. Самастойнае ад Часовага літоўскага камітэта ў Вільні таварыства “Культура” не знайшла адабрэння ў Каўнасе [191, арк. 47адв.]. Новая арганізацыя была нешматлікай, абмяжоўвала сваю дзейнасць толькі асобнымі мясцовасцямі. Па стану на 1 кастрычніка 1934 г., таварыства “Культура” мела ў Свянцянскім павеце 10 гурткоў (250 чалавек),

9 бібліятэк, 3 школы (119 вучняў), Віленска-Трокскім павеце – 3 гурткі (64 чалавекі) – у гміне Гервяты (Гелюны, Зарэчча), у Вільні – усяго 52 чалавекі, 2 бібліятэкі, 1 школу (49 вучняў) [781, арк. 96–98]. Вясной 1935 г. адносіны паміж "Рытас" і "Культурай" абвастрыліся, асабліва з-за змяншэння Часовым літоўскім камітэтам субсідый для апошняй

Акрамя "Рытас", уплывовай арганізацыяй сярод вяскоўцаў-літоўцаў з'яўлялася Літоўскае таварыства выхавання і апекі моладзі імя Св. Казіміра (таварыства Св. Казіміра) (Lietuvių šv. Kazimiero Jaunimui Auklėti ir Globoti Draugija), якое знаходзілася пад кантролем літоўскіх хрысціянскіх дэмакратаў. Гэтая культурна-асветніцкая і рэлігійная арганізацыя пачала дзейнічаць намаганнямі віленскай літоўскай інтэлігенцыі і асабліва ксяндзоў яшчэ ў пачатку 1920-х гг., але была зарэгістравана польскімі ўладамі толькі ў кастрычніку 1925 г. [6, арк. 208–213]. У адрозненне ад "Рытас", таварыства Св. Казіміра арганічна спалучала ў сваёй дзейнасці нацыянальны і рэлігійны фактары, што спрыяла пашырэнню яго ўплыву сярод літоўскага насельніцтва. Пад уплывам як настаўнікаў, так і ксяндзоў-літоўцаў, літоўскае насельніцтва ў асобных мясцовасцях імкнулася пазбягаць ўсяго польскага, праяўляла непрыхільнае і нават варожае стаўленне да Польскай дзяржавы [629, арк. 37–37адв.; 611, арк. 1–1адв.].

Таварыства Св. Казіміра праводзіла шэраг масавых акцый, сярод якіх вылучалася школьная кампанія. Так, летам 1930 г. у гміне Марцінканцы Гродзенскага павета аддзелы таварыства актывізавалі прапаганду ў падтрымку літоўскіх школ. Удзельнікаў гэтай акцыі польскія ўлады кваліфікавалі "рашучымі ворагамі польскай дзяржаўнасці" [796, арк. 198]. У лістападзе 1932 г. заснавальніца аддзела таварыства, настаўніца літоўскай школы А. Чыбірова ў в. Біжы той жа гміны заклікала не пускаць дзяцей у польскія школы [979, арк. 10].

Выразны антыпольскі характар мела разгорнутая таварыствам Св. Казіміра ў 1930 г. масавая акцыя, прымеркаваная да 500-годдзя смерці князя ВКЛ Вітаўта. У Гродзенскім і іншых паветах ставіліся юбілейныя крыжы і помнікі, нярэдка іх размалёўвалі ў літоўскія нацыянальныя колеры [796, арк. 120–121, 175]. У канцы 1933 г. на пляцы перад касцёлам у Марцінканцах літоўскае насельніцтва неаднаразова дэманстратыўна ўсталёўвала крыж, аздоблены ў літоўскія нацыянальныя колеры [799, арк. 251]. Члены аддзелаў таварыства Св. Казіміра ў гмінах Марцінканцы і Бершты Гродзенскага павета апраналі аднолькавыя аксамітныя шапкі са стужкамі літоўскіх нацыянальных колераў і спецыяльнымі металічнымі значкамі [798, арк. 167]. Літоўская сімволіка актыўна выкарыстоўвалася ў час святочных нацыянальных і рэлігійных мерапрыемстваў. У кастрычніку 1931 г. літоўская супольнасць адзначала ўсеагульны дзень жалобы ў сувязі

з захопам Вільні польскімі войскамі Л. Жалігоўскага ў кастрычніку 1920 г. [797, арк. 187].

Таварыства Св. Казіміра здолела стварыць разгалінаваную сетку структурных адзінак – да 1932 г. колькасць яго аддзелаў дасягнула 298, з іх у Віленскім ваяводстве размяшчаліся 233, Навагрудскім – 40, Беластоцкім – 25 [1168, с. 128]. У мясцовага літоўскага насельніцтва папулярнасцю карысталіся радыёперадачы з Каўнаса. У 1934 г. агульная колькасць гурткоў дасягнула 405 (каля 16 тыс. чалавек), у 1935 г. – 477 (каля 20 тыс. чалавек), больш паловы якіх прыходзілася на Свянцянскі, Віленска-Трокскі, Сувалкаўскі паветы [1018, с. 138–139; 954, с. 153; 867, с. 197]. У памежных беларуска-літоўскіх мясцовасцях сетка аддзелаў таварыства не была такой густой: у Лідскім павеце – 30, Браслаўскім – 26, Ашмянскім – 14, Гродзенскім – 9 [1018, с. 138–139, 141; 954, с. 153]. Менавіта таму з сярэдзіны 1930-х гг. кіраўніцтва таварыства Св. Казіміра шмат увагі надавала арганізацыйнай і прапагандысцкай працы ў гэтым рэгіёне. У лістападзе 1934 г. таварыства Св. Казіміра правяло пэўную рэарганізацыю сваіх структур, пры аддзелах стваралі асобныя сектары [183, арк. 324]. У 1935 г. таварыства Св. Казіміра разгарнула ў Лідскім павеце інтэнсіўную агітацыю для папаўнення сваіх радоў [187, арк. 25адв.]. У лістападзе 1935 г. ў в. Пеляса Лідскага павета адбыўся з’езд прадстаўнікоў таварыства пад кіраўніцтвам старшыні В. Ташкунаса. Акрамя Радуньскай гміны, куды ўваходзіла в. Пеляса, у тым жа Лідскім павеце аддзелы таварыства Св. Казіміра дзейнічалі таксама ў гмінах Беняконі, Воранава, Жырмуны [314, арк. 17]. У Ашмянскім павеце ажыўленне было ў гміне Дзевянішкі, дзе яшчэ ў пачатку 1920-х гг. адзначаўся ўплыў каталіцкіх ксяндзоў-літоўцаў на мясцовае літоўскае насельніцтва [366, арк. 114]. У Браслаўскім павеце гурткі, чытальня і некалькі літоўскіх школ дзейнічалі ў мястэчку Опса і суседніх вёсках.

Табліца 4.10 – Стан Таварыства Св. Казіміра ў Віленскім ваяводстве (1.10.1935 г.)

| Паветы | Аддзелы | Члены | Бібліятэкі | Кнігарні | Прытулкі | Дзіцячыя садкі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Браслаўскі | 27 | 807 | 5 | - | - | - |
| Ашмянскі | 13 | 526 | - | - | - | - |
| Свянцянскі | 186 | 9 000 | 124 | - | - | - |
| Віленска-Трокскі | 83 | 3 391 | 1 | - | 4 | - |
| Вільня | 3 | 90 | 21 | 1 | - | 2 |
| Усяго | 312 | 13 814 | 131 | 1 | 4 | 2 |

Разам з разгортваннем сеткі аддзелаў таварыства ствараліся бібліятэкі-чытальні, дзе праводзіліся лекцыі, гутаркі, сельскагаспадарчая

самаадукацыя, выступалі самадзейныя аматарскія калектывы, хоры. Там таксама нярэдка працавалі прыватныя літоўскія школы пасля іх закрыцця, займаліся хатнім навучаннем, размяшчаліся дзіцячыя прытулкі. Паводле афіцыйных польскіх звестак, у кастрычніку 1935 г. таварыства Св. Казіміра мела 131 бібліятэку, з іх абсалютная большасць (124) размяшчалася ў Свянцянскім павеце, адзінкі – у Браслаўскім і Гродзенскім паветах. З усіх бібліятэк толькі 5 знаходзіліся ў Браслаўскім павеце: у гміне Браслаў (Бужаны, Узяны, Мар'ямполь), гміне Дрысвяты (Ванішкі), гміне Опса (Опса) [табліца 4.10 [781, арк. 90]; 781, арк. 90–94; 1018, с. 215]. Такая мізэрная колькасць бібліятэк у беларуска-літоўскім мясцовасцях істотна абмяжоўвала нацыянальна-культурнае жыццё літоўцаў.

Табліца 4.11 – Літоўскія культурна-асветніцкія арганізацыі ў Польшчы (1934–1937 гг.)

| Таварыства "Рытас" | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1934/1935 г. | | Люты 1937 г. | |
| | Гурткі (аддзелы) | бібліятэкі | Гурткі (аддзелы) | бібліятэкі |
| Віленска-Трокскі павет | 2 | 39 | - | 5 |
| Свянцянскі павет | 21 | 42 | 3 | 8 |
| Ашмянскі павет | 3 | 13 | - | 4 |
| Браслаўскі павет | 3 | 16 | - | - |
| Усяго ў Віленскім ваяводстве | 29 | 110 | 3 | 17 |
| Гродзенскі павет | - | 18 | - | - |
| Сувалкаўскі павет | - | 2 | - | - |
| Усяго ў Беластоцкім ваяводстве | - | 20 | | - |
| Усяго ў Навагрудскім ваяводстве | 20 | 30 | 3 | - |
| Усяго | 49 | 160 | 6 | 17 |
| Таварыства "Культура" | | | | |
| Віленска-Трокскі павет | 5 (з бібліятэкамі) | - | 2 | - |
| Свянцянскі павет | 24 | 19 | 10 | 10 |
| Ашмянскі павет | 4 | 3 | - | - |
| Браслаўскі павет | 5 | 2 | - | - |
| Усяго ў Віленскім ваяводстве | 38 | 24 | 12 | 10 |
| Усяго ў Навагрудскім ваяводстве | 1 | - | - | - |
| Усяго | 39 | 24 | 12 | 10 |
| Таварыства Св. Казіміра | | | | |
| Віленска-Трокскі павет | 93 (з 89 бібліятэкамі) | 3 | - | - |
| Свянцянскі павет | 234 | 203 | - | - |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Ашмянскі павет | 24 (з бібліятэкамі) | - | 1 | 1 |
| Браслаўскі павет | 37 | 11 | - | - |
| Усяго ў Віленскім ваяводстве | 388 | 217 | 4 | 1 |
| Гродзенскі павет | 16 | - | - | - |
| Сувалкаўскі павет | 29 (з чытальнямі) | - | - | - |
| Усяго ў Беластоцкім ваяводстве | 45 (з чытальнямі) | - | - | - |
| Усяго ў Навагрудскім ваяводстве | 44 (з чытальнямі) | - | 4 | - |
| Усяго | 477 | 217 | 8 | 1 |

У ходзе ажыццяўлення культурна-асветніцкай работы адбывалася актыўнае супрацоўніцтва аддзелаў таварыства Св. Казіміра са структурамі “Рытас”. Літоўскае насельніцтва не рабіла вялікіх адрозненняў паміж імі. Вясной 1934 г. дзве арганізацыі праводзілі сумесную прапагандысцкую кампанію на тэрыторыі Лідскага павета [341, арк. 204]. Разгорнутая вясной 1936 г. сумесная акцыя па пабудове народных дамоў у Гродзенскім павеце набыла масавы характар і “карысталася вялікім задавальненнем літоўцаў” [802, арк. 33, 45]. Агульная арганізацыйная структура культурна-асветніцкіх таварыстваў у той час прадстаўлена ў табліцы 4.11 [783, арк. 46].

Да сумеснай працы са структурамі “Рытас” і таварыства Св. Казіміра далучаліся і іншыя грамадскія арганізацыі літоўцаў Віленшчыны. Актыўна супрацоўнічала з імі ў час канікулаў, праводзіла гутаркі, лекцыі нешматлікая навучэнцкая моладзь, якая належала да Віленскага літоўскага студэнцкага саюза (Vilniaus Lietuvių Studentų Sajunga) [179, арк. 33]. Арганізацыя ўзнікла ў 1925 г., аднак была легалізавана сенатам Віленскага універсітэта імя С. Баторыя толькі 18 сакавіка 1927 г. Адной з яе мэтаў была культурна-асветніцкая праца сярод літоўскага вясковага насельніцтва Віленшчыны. У структуру Віленскага літоўскага студэнцкага саюза ўваходзілі драматычная (на яе аснове ў 1936 г. узнік Літоўскі аматарскі тэатр у Вільні), жаночая, грамадская, спартыўная (у кастрычніку 1935 г. пачаў дзейнічаць літоўскі спартыўны клуб) секцыі, секцыя каталіцкай акцыі. У 1930–1938 гг. драматычная секцыя падрыхтавала і паказала ў Вільні і на Віленшчыне 274 спектаклі, 80 прадстаўленняў, на якіх прысутнічала больш 55 тыс. гледачоў [1018, с. 132]. Аднак малалікасць Віленскага літоўскага студэнцкага саюза перашкаджала яго дзейнасці. Па некаторых звестках, Віленскі універсітэт імя С. Баторыя змаглі скончыць за ўвесь міжваенны час каля 20 літоўцаў [374, с. 203].

У асобных населеных пунктах дзейнічалі аддзелы Саюза літоўскіх настаўнікаў (Lietuvių Mokytojų Sajunga), створанага ў снежні 1922 г. у Вільні. Арганізацыя павінна была аб’яднаць усіх настаўнікаў-літоўцаў для павышэння іх матэрыяльнага стану, умоў працы, аказання ім маральнай і прававовай дапамогі, уздыму культурнага ўзроўню [749, арк. 30]. У 1936 г. налічвалася 289 чалавек [1018, с. 126]. Аддзелы арганізацыі існавалі ў Алькеніках, Марцінканцах, Гервятах, Ротніцы, Дукштах, Кабелях, Калесніках. Яны наладзілі ў 1936 г. байкот польскіх школ і чытальняў [743, арк. 327].

Папулярызацыяй літоўскай культуры займалася Літоўскае навуковае таварыства (Lietuvių Mokslo Draugija), якое ўзнікла ў Вільні яшчэ ў 1907 г. Да 1927 г. яго ўзначальваў Ё. Басанавічус [781, арк. 100; 1174, с. 3–5; 1009, с. 427]. Пасля 1927 г. умовы яго дзейнасці былі вельмі складанымі – актывісты падвяргаліся ганенням з боку польскіх уладаў, даводзілася ўвесь час шукаць адпаведнае памяшканне для бібліятэкі, аддзела рукапісаў, правядзення пасяджэнняў таварыства. Музейныя каштоўнасці Літоўскага навуковага таварыства, сярод якіх былі багатая нумізматычная калекцыя, арнаты, абразы, кафля, мінералы, археалагічныя знаходкі і іншыя матэрыялы, звязаныя з Віленшчынай [28, арк. 5], захоўваліся пераважна ў скрынях і заставаліся недаступнымі шырокай грамадскасці. Дзеячы таварыства актыўна займаліся падрыхтоўкай вучэбнай літаратуры, падручнікаў для літоўскіх школ [779, арк. 135]. Была працягнута традыцыя выдання штогодніка Літоўскага навуковага таварыства “Lietuvių tauta” (Літоўскі народ) (першая кніга была выдадзена яшчэ ў 1907 г.), дзе змяшчаліся артыкулы, нарысы-вандроўкі і іншыя матэрыялы. У міжваенны час з’явіліся асобныя часткі кн. 3–5 штогодніка. Даследчыкі актыўна карысталіся фондамі бібліятэкі Літоўскага навуковага таварыства (у 1936 г. там налічвалася 44 тыс. кніг [1038, с. 301], паводле іншых звестак у 1937 г. – 40 тыс. экз. [831, с. 612, 705]. У 1935 г. Літоўскае навуковае таварыства далучылася да акцыі збору звестак аб становішчы літоўскай меншасці на Віленшчыне. Гэтую ініцыятыву Саюза вызвалення Вільні падтрымалі Саюз літоўскіх настаўнікаў, Віленскі літоўскі студэнцкі саюз, а потым і таварыства “Рытас”. Студэнты, кіраўнікі літоўскіх бібліятэк, чытальняў нелегальна збіралі звесткі на месцах. У маі 1936 г. такі збор быў зафіксаваны польскімі ўладамі ў наваколлі в. Беняконі Лідскага павета [342, арк. 2, 6, 11]. Такая акцыя адназначна разглядалася мясцовай адміністрацыяй у якасці збору шпіёнскіх звестак [784, арк. 106]. З 1934 г. не ўдалося правесці ніводнага пасяджэння Літоўскага навуковага таварыства. У 1938 г. арганізацыя была забаронена і толькі напярэдадні верасня 1939 г. было дазволена аднавіць дзейнасць у якасці Літоўскага

таварыства сяброў навукі (Lietuvių Mokslo Myletoju Draugija) [779, арк. 135].

З-за нешматлікасці літоўскай інтэлігенцыі вузкую сацыяльную базу мела створанае ў 1932 г. ліберальнымі і памяркоўнымі дзеячамі ў Вільні Літоўскае таварыства літаратуры і мастацтва (Lietuvių Meno ir Literatūros Draugija). Гэтае таварыства сваю дзейнасць абмежавала Вільняй, дзе праводзіла літаратурныя вечары, дыскусіі, лекцыі, канцэрты, займалася выдавецкай працай. Наогул, паводле няпоўных даных, на працягу 1919 – 1928 гг. у Вільні было выдадзена 255 літоўскіх кніг, наклад якіх вагаўся ад 250 да 800 экзэмпляраў [1018, с. 135–136]. У 1928 г. у Вільні выходзіла 10 літоўскіх перыядычных выданняў (13 тыс. экзэмпляраў) [1065, с. 362], іх колькасць у 1925–1937 гг. вагалася ад 3 да 10 [1018, с. 244]. Сярод іх вылучаліся "Vilniaus aidas"("Віленскае рэха")(1924–1928 гг.), орган Часовага літоўскага камітэта ў Вільні – „Vilniaus rytojus"("Будучыня Вільні")(1927–1937 гг.) (у 1934 г. тыраж дасягаў 5 тыс. экз.). Нелегальна распаўсюджвалася і прэса, выдадзеная ў Каўнасе – „Lietuvos aidas" ("Рэха Літвы") (1928–1940 гг.), „Lietuva"("Літва") (1919–1928 гг.) і іншыя выданні.

Літоўскі мастак В. Кайрукшціс да 1932 г. выкладаў маляванне ў літоўскай гімназіі ў Вільні, арганізоўваў мастацкую студыю для моладзі. Яго ўласныя творы і працы вучняў былі паказаны на выставе ў 1931 г. у Вільні [1074, с. 70–71]. Сярод арганізатараў Віленскага таварыства незалежных мастакоў быў і скульптар Р. Яхімовіч, які ўдзельнічаў у шматлікіх выставах. Да ўтворанай у 1937 г. Віленскай групы належаў мастак, графік, мастацтвазнаўца В. Дрэма, які пазней працаваў у беларускім музеі ў Вільні.

Вядучыя літоўскія палітычныя лагеры аказвалі моцнае ўздзеянне на культурна-асветніцкія арганізацыі. Пад уплывам хрысціянскіх дэмакратаў знаходзілася таварыства "Рытас", часткова Літоўскае навуковае таварыства, Віленскі літоўскі студэнцкі саюз, таварыства Св. Казіміра, нарадоўцы (tautininkai) кантралявалі Саюз літоўскіх настаўнікаў, людоўцы (liaudininkai) – таварыства "Культура". Уплыў камуністаў быў абмежаваны. Кіраўнікі Кампартыі Літвы З. Алекса-Ангарэціс і В. Міцкявічус-Капсукас звярталіся 23 снежня 1925 г. з заявай да IV канферэнцыі Кампартыі Польшчы аб няправільнасці лозунга далучэння Вільні і Віленскага краю да БССР, прапанаваўшы лозунг права нацый на самавызначэнне [592, с. 109–110]. З. Алекса-Ангарэціс у прывітальным слове на III канферэнцыі КПЗБ 5 студзеня 1926 г. прапанаваў гэта ўлічваць. "Насельніцтва ў Заходняй Беларусі вельмі пёстрае: у вёсках мы маем большасць беларусаў, у гарадах большасць палякаў і яўрэяў, а ў многіх акругах, у вёсках шмат літоўцаў. Пры такім змешаным

народанасельніцтве лёгка ўпасці ў нацыяналізм” [484, арк. 13–14]. У прынятай на канферэнцыі пастанове “Сітуацыя Польшчы і Заходняй Беларусі і задачы партыі” прызнавалася “права на самавызначэнне амаль да адзялення для літоўскага насельніцтва, што апынулася ў межах сучаснай Польшчы з-за рабаўніцкай палітыкі польскага імперыялізму (частка Свянцянскага і Віленска-Трокскага паветаў)”, а таксама выкладзены патрабаванні аб допуску ў дзяржаўных установах і органах самакіравання, справаводстве ўсіх мясцовых моў (у тым ліку літоўскай), супраць рэпрэсіўных дзеянняў адносна нацыянальных культурна-асветніцкіх арганізацый, друку [592, с. 11]. З канца 1920-х гг. ЦК КПЗБ пачало звяртаць увагу на нацыянальныя праблемы літоўцаў, у снежні 1930 г. пры Віленскім акруговым партыйным камітэце было створана літоўскае бюро па ўзору ўжо існуючага яўрэйскага. Аднак КПЗБ, якая ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. ігнаравала мясцовую спецыфіку і беспадстаўна фарсіравала рэвалюцыйны працэс, не магла канкурыраваць з літоўскімі нацыянальнымі палітычнымі сіламі. У інфармацыйна-прапагандысцкіх выданнях КПЗБ адзначаліся цяжкасці правядзення працы сярод літоўскіх працоўных (“тэрор, дэмагогія ксяндзоў і літоўскіх нацыяналістаў, ідэалізацыя Літвы, адсталасць”), аднак насуперак ісціне заяўлялася аб няўхільным росце ўплыву партыі [385, с. 83–84, 87]. Толькі са зменай стратэгіі і тактыкі заходнебеларускага камуністычнага руху назіралася часткова станоўчая дынаміка ў адносінах з літоўскім рухам. У прыватнасці, у верасні 1935 г. ЦК КПЗБ звярталася як да беларускіх, яўрэйскіх, так і літоўскіх арганізацый са зваротам аб сумеснай барацьбе за дзяржаўныя школы на роднай мове, супраць закрыцця няпольскіх школ [67, с. 364–365].

Нягледзячы на пастаяннае выкарыстанне паліцэйска-адміністрацыйных мер, польскія ўлады ў першай палове 1930-х гг. не змаглі паралізаваць літоўскі культурна-асветніцкі рух. У снежні 1933 г. на канферэнцыі павятовых старастаў Навагрудскага ваяводства ўлады Лідскага павета папракалі ў адсутнасці поўнай інфармацыі пра дзейнасць нелегальных літоўскіх школ, чытальняў, гурткоў. Валожынскі стараста выказаў занепакоенасць уцягваннем мясцовай моладзі ў літоўскі рух [317, арк. 258]. Навагрудскі ваявода С. Свідэрскі даручыў школьнаму папячыцельству забараніць навучанне польскіх дзяцей у літоўскіх школах, пры неабходнасці выдзяляць дапамогу вучням з незаможных сем’яў, каб “уберагчы іх ад літоўскіх уплываў”.

Рэпрэсіўныя акцыі польскіх уладаў супраць літоўскіх арганізацый набылі шырокамаштабны характар пасля прыняцця адпаведных рашэнняў у лютым-красавіку 1936 г. Усяго на працягу 1936 – пачатку 1938 гг. было закрыта 28 гурткоў, 118 чытальняў, 61 пачатковая школа віленскага

таварыства "Рытас", 217 бібліятэк таварыства Св. Казіміра [1018, с. 219]. У Віленскім, Свянцянскім, Ашмянскім, Браслаўскім паветах арыштам і штрафам былі падвергнуты больш 270 актывістаў літоўскіх таварystваў. Многіх настаўнікаў, кіраўнікоў літоўскіх чытальняў, ксяндзоў падвяргалі высяленню. Толькі ў першай палове 1936 г. на тэрыторыі Лідскага павета было закрыта 35 гурткоў, чытальняў "Рытас" і таварыства Св. Казіміра. У лютым 1938 г. у Лідскім павеце была закрыта апошняя літоўская грамадская пляцоўка – пачатковая школа ў в. Дайнова. За перыяд з сакавіка 1936 г. да сакавіка 1937 г. у Гродзенскім павеце было закрыта 18 чытальняў [954, с. 149]. Цэнтральная ўправа "Рытас" загадала кіраўнікам закрытых чытальняў заставацца на месцах і праводзіць нелегальную асветніцкую працу, займацца хатнім навучаннем дзяцей. У Гродзенскім павеце пасля вымушанай адсутнасці восенню 1936 г. яны вярталіся назад і выказваліся за адкрыццё сельскагаспадарчых кааператываў. Польскія ўлады нярэдка разглядалі гэтых асобаў у якасці літоўскіх шпіёнаў [802, арк. 93адв., 101адв., 113, 127–127адв.]. Атрымаўшы грошы ад таварыства "Рытас", былыя кіраўнікі чытальняў у Лідскім павеце заставаліся на месцах і працягвалі падпольную прапаганду [198, арк. 13], частка павінна была змяніць месца жыхарства і займацца хатнім навучаннем дзяцей [195, арк. 89]. Замест забароненых гурткоў "Рытас" планавалася ствараць пры парафіяльных касцёлах маладзёжныя хоры [195, арк. 48].

Аднак чарговыя крокі польскай адміністрацыі паралізавалі дзейнасць літоўскіх арганізацый. 21 лістапада 1936 г. беластоцкі ваявода не дазволіў дзейнічаць структурным адзінкам таварыства Св. Казіміра на тэрыторыі Сувалкаўскага і Гродзенскага паветаў, 3 снежня 1936 г. пад забаронай апынуліся ўсе яго аддзелы ў памежнай зоне. Канчаткова гарадскія ўлады Вільні забаранілі дзейнасць таварыства Св. Казіміра 31 снежня 1937 г. [6, с. 213; 196, арк. 111адв.; 1018, с. 142–143]. Такі ж лёс напаткаў 28 лютага 1938 г. і таварыства "Рытас".

Устанаўленне дыпламатычных адносін паміж Польшчай і Літвой у сакавіку 1938 г. мясцовае літоўскае насельніцтва ўспрыняло неадназначна. Значная частка літоўцаў (сярод іх жыхары Лідскага павета) ўспрыняла гэта як капітуляцыю Літвы перад сілай Польшчы [203, арк. 30]. Выказвалі меркаванні, што "лепш аддаць Літву бальшавіцкай уладзе, чым устанаўліваць адносіны з Польшчай" [203, арк. 40]. Так і не адбыліся пазітыўныя змены ў становішчы літоўскай меншасці ў Польшчы, што не аслабіла яе антыпольскіх настрояў, не адмяніла негатыўнага стаўлення Літвы адносна тэрытарыяльнай прыналежнасці Віленшчыны. Уступкі на карысць адкрыцця забароненых літоўскіх арганізацый зноў былі пастаўлены ў залежнасць ад адпаведных захадаў адносна палякаў у Літве.

Антыпольскія настроі літоўцаў узмацніліся ў канцы 1938 г. ў сувязі з захопам Польшчай Цешынскай Сілезіі [282, арк. 22]. Сярод мясцовага літоўскага насельніцтва пашыраліся спадзяванні на выбух вайны ў Еўропе, уступленне ў яе СССР і на магчымае далучэнне Віленшчыны да Літвы [803, арк. 117адв.].

Аднак існавалі некаторыя спадзяванні адносна адраджэння літоўскага нацыянальна-культурнага жыцця (у прыватнасці, у Гродзенскім павеце) [803, арк. 41–41адв.]. Былыя кіраўнікі чытальняў, настаўнікі пачалі збіраць подпісы пад пісьмовымі хадайніцтвамі аб атрыманні адпаведных дазволаў ад польскіх уладаў [803, арк. 74, 76]. Замест ліквідаваных літоўскіх арганізацый вясной 1938 г. у Лідскім павеце ўзнікалі каталіцкія маладзёжныя таварыствы, куды ўваходзілі былыя літоўскія актывісты, кіраўнікі закрытых чытальняў. Яны займаліся распаўсюджваннем літоўскіх кніг, газет [203, арк. 39адв.]. Ксёндз Я. Веножындзіс на ўроках рэлігіі ў пачатковых школах у в. Пеляса і Дубінцы Лідскага павету спрыяў пашырэнню нацыянальнай свядомасці сярод літоўскіх дзяцей [203, арк. 40]. Нягледзячы на забарону, літоўскае насельніцтва працягвала нелегальна слухаць радыёперадачы з Каўнаса, збіраючыся ў прыватных памяшканнях былых кіраўнікоў літоўскіх чытальняў [203, арк. 65]. У верасні 1938 г. жыхары вёсак Плікі, Дубічы Лідскага павета дамагаліся ўвядзення літоўскай мовы ў навучальны працэс мясцовых пачатковых школ [203, арк. 65адв.]. На тэрыторыі Лідскага павета восенню 1938 г. адбывалася нелегальна культурна-асветніцкая работа ў прыватных памяшканнях – наладжваліся лекцыі, гутаркі, кнігаабмен, чытанне газет і інш. [203, арк. 73адв.]. Летам 1938 г. у Гродзенскім павеце дамагаліся аднаўлення гурткоў таварыства Св. Казіміра [283, арк. 7]. Хоць гэтыя захады засталіся безвыніковымі, у пачатку 1939 г. праца па стварэнню такіх гурткоў у Гродзенскім павеце актывізавалася. Адначасова там складваліся дэкларацыі аб адкрыцці літоўскіх школ [804, арк. 14адв.].

У распрацаванай МУС Польшчы вясной 1939 г. "Дырэктыве па літоўскай палітыцы" прадугледжваліся не толькі ўзаемныя ўступкі, але і меры па лакалізацыі літоўскага руху, узмацненню яго лаяльнасці да дзяржавы. У такіх умовах было вельмі складана аднавіць ранейшую сетку літоўскіх арганізацый. Некаторае ажыўленне літоўскага культурна-асветніцкага жыцця назіралася летам 1939 г., што было выклікана ад'ездам напярэдадні з Вільні ваяводы Л. Бацянскага. Стараста Свянцянскага павета паведамляў у сваёй справаздачы за ліпень 1939 г. у Вілейскую павятовую камендатуру дзяржпаліцыі, што "літоўскае насельніцтва, а найперш літоўскія дзеячы, праявілі значную палітычную актыўнасць у справе арганізацыі гурткоў літоўскага асветніцкага таварыства "Рытас" [367,

арк. 6, 28]. Аднак пачатак Другой сусветнай вайны не дазволіў прадоўжыць аднаўленне арганізацыйнай сеткі таварыства.

У цэлым, нешматлікая літоўская інтэлігенцыя, каталіцкае духавенства прыклалі максімальныя намаганні ў правядзенні грамадска-культурнай дзейнасці. Знешні фактар (матэрыяльная і маральная падтрымка з боку Літвы) сыграў істотную ролю ў станаўленні і развіцці літоўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый у міжваеннай Польшчы. Нягледзячы на адміністрацыйна-паліцэйскія перашкоды і абмежаванні, менавіта гэтыя арганізацыі (найперш таварыствы “Рытас” і Св. Казіміра) змаглі рэалізаваць на практыцы свае статутныя задачы, спрыялі адраджэнню нацыянальнай самасвядомасці літоўцаў на памежжы, хоць яна там заставалася слабой. У адрозненне ад Свянцянскага, Віленска-Трокскага, Сувалкаўскага паветаў, дзе літоўскі культурна-асветніцкі рух набыў масавы характар, у памежных беларуска-літоўскіх мясцовасцях таварыствы не атрымалі такой шырокай падтрымкі з боку мясцовай літоўскай грамадскасці, аднак з’яўляліся вядучымі арганізаванымі структурамі, якія найбольш паслядоўна і эфектыўна адстойвалі яе нацыянальна-культурныя і рэлігійныя інтарэсы. Пры гэтым нельга пагадзіцца з высновамі папярэдніх даследчыкаў аб тым, што літоўцы ў цэлым падвергліся татальнай асіміляцыі [374, с. 214] ці аб значным росце іх нацыянальнай свядомасці на беларуска-літоўскім памежжы ў канцы 1930-х гг. [1018, с. 300].

## 4.4. Грамадска-культурная дзейнасць татараў

У грамадскім жыцці татараў кансалідуючым і этнавызначальным фактарам заставаўся іслам. У снежні 1936 г. у Польшчы (пераважна ў заходнебеларускім рэгіёне) функцыянавала 19 мусульманскіх абшчын, якія мелі 17 мячэцяў і 3 малітоўныя дамы (19 мулаў, 23 муэдзіны (мязімы)(намеснікі мулаў)) [764, арк. 20–21; 941]. Размяшчэнне мячэцей і мусульманскіх малітоўных дамоў у заходнебеларускіх паветах прадстаўлена ў табліцы 4.12 [933, с. 333; 934, с. 475; 563, с. 19–21, 27–29, 35–37; 849, с. 44–79; 763, арк. 1–2, 59–60, 62–63; 542, с. 665; 545, с. 199; 625, арк. 13; 544, с. 430–431; 14, с. 96–98; 394, с. 93; 940, с. 15–17; 1102, с. 12–13; 395, с. 29–39]. Польская дзяржава выдзяляла фінансавыя сродкі для аплаты працы мулаў, рамонту і будаўніцтва мячэцяў і на іншыя патрэбы татараў-мусульман: у 1924 г. – 21 016 злотых, 1925 г. – 57 736 злотых, 1927–1928 гг. – 63 тыс. злотых штогод, 1929–1930 гг. – 65 тыс. злотых штогод, на працягу 1931–1939 гг. па 57 тыс. злотых аднаразова ў 2 гады [1023, с. 342; 1143, с. 12]. Акрамя дзяржаўных датацый, пры аднаўленні мячэцяў у Ляхавічах, Мядзелі, Відзах, Некрашунцах [1102,

с. 12–13], а таксама пры рамонце мусульманскіх храмаў у Навагрудку, Міры, Іўі, Слоніме, Асмолаве выкарыстоўваліся таксама прыватныя ахвяраванні, дапамога татарскай дыяспары ЗША [939, с. 11–13], урада Егіпта. У Іўі дапамогу аказваў землеўладальнік граф Т. Замойскі [766–767]. Для будаўніцтва мячэці ў Некрашунцах у красавіку 1926 г. польскі ўрад выдзеліў толькі 500 злотых замест неабходных 2 тыс. злотых [767, арк. 105], таму асноўную частку сродкаў складалі ахвяраванні татараў-эмігрантаў, мясцовых жыхароў, генерала А. Рамановіча, а таксама выкарыстоўвалася пазыка сельскагаспадарчага банка з Вільні, дапамога натурай (прадуктамі харчавання), бясплатная праца жыхароў навакольных населеных пунктаў [59]. На перакрыццё даху абшчыннага дома ў Некрашунцах збіралі па 1 злотаму з кожнай гаспадаркі [60].

Табліца 4.12 – Мячэці на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. (пазначаныя* не маюць звестак)

| Месцазнаходжанне | Стан мячэці (час заснавання, будаўніцтва, рамонту), колькасць вернікаў у абшчыне | Кіраўнік мусульманскай абшчыны |
|---|---|---|
| Даўбуцішкі (Даўбучкі) (Маладзечанскі павет) | Мячэць з 1558 г. Адбудавана ў XVIII ст. 1937 г. – 402 чал. | Імамы: Б. Рафаловіч (1898–1926 гг.), Я. Мухля (1926–1933 гг.), Л. Мухля (1908 г. нар. (1933 (1934 г.)–1946 гг.) |
| Мядзел (Пастаўскі павет) | Мячэць з 1840 г. Пабудавана новая мячэць у 1923 г. Рамонт мячэці ў 1930 г. 1938 г. – 243 чал. | * |
| Навагрудак (Навагрудскі павет) | Мячэць 1796 г. Рамонт мячэці і мінарэта ў 1936 г. 1937 г. – 752 чал. | Імам: С. Сафарэвіч (1915–1945 гг.) |
| Лоўчыцы (Навагрудскі павет) | Абшчына заснавана ў 1420 г. Мячэць пабудавана ў 1688 г. На мізары – магіла Св. Эўліі Контуся. 1938 г. – 38 чал. | Імам: Я. Александровіч (1922–1938? гг.). |
| Слонім (Слонімскі павет) | Абшчына існавала з 1410 г., мячэць з 1804 г., пабудавана ў 1883 г. замест спаленай у час пажару 1881 г. Рамонт мячэці ў 1930 г. 1937 г. – 414 чал. | Імамы: Я. Смольскі (1901–1929 гг.), М. Радкевіч (1922–1929 гг.), К. Смольскі, 1868 г. нар. (1929–1940-я гг.) |

| | | |
|---|---|---|
| Ляхавічы<br>(Баранавіцкі павет) | Мячэць адбудавана 2.06.1928 г. замест спаленай у час Першай сусветнай вайны (аўтар праекта – Г. Шчавінская). Фундатары будаўніцтва: польскія ўлады, татарскія эмігранты ў ЗША, кароль Егіпта Фуад I.<br>1937 г. – 199 чал. | Імам: Д. Мурзіч<br>(1900–1938? гг.) |
| Мураўшчызна (Іўе)<br>(Лідскі павет) | Мячэць дзейнічала з 1884 г. (1886 г.).<br>Рамонт (замена мінарэта) у 1922 г. Фундатары: татарскія эмігранты ў ЗША.<br>20.07.1934 г. – усталявана памятная дошка ў гонар графіні Е. Замойскай.<br>1937 г. – 478 чал. | Імамы: Я. Шабановіч (1898–1936 гг.),<br>А. Шабановіч (1938 г.),<br>М. Шабановіч<br>(1939–1994 гг.) |
| Некрашунцы<br>(Лідскі павет) | Замест мячэці XVIII ст., спаленай у 1915 г., існаваў малітоўны дом.<br>Адбудавана 8.10.1926 г. на сродкі Я. Рамановіча і датацыі польскіх улад.<br>1937 г. – 244 чал. | Імамы: А. Асановіч<br>(1915–1932 гг.),<br>А. Крыніцкі<br>(1932–1939 гг.) |
| Асмолава<br>(Нясвіжскі павет) | Мячэць з 1834 г. Не дзейнічала ў першай палове 1920-х гг.<br>Перабудавана ў 1924–1925 гг.<br>205 чал. (сярэдзіна 1930-х гг.) | Імамы: Ю. Шоломбек<br>(1910–1934 гг.),<br>А. Байрашэўскі, 1894 г. нар. (1934–1946 гг.) |
| Мір<br>(Стаўбцоўскі павет) | Мячэць пабудавана да 1795 г. Адноўлена ў 1840 г. Рамонт мячэці ў 1925, 1928 гг.<br>1937 г. – 95 чал. | Імамы: А. Шумкевіч<br>(1898–1923 гг.),<br>Я. Міскевіч, 1894 г. нар.<br>(1923–1938? гг.) |
| Крушыняны<br>(Гродзенскі павет) | Мячэць пабудавана ў другой палове XVIII ст.<br>1924 г. – 572 чал. | Імамы: М. Паплаўскі (у 1924 г.), К. Смольскі, 1868 г. нар.(з 1926 г.) |
| Багонікі<br>(Сакольскі павет) | Мячэць пабудавана ў XVII ст.Згарэла ў час пажару вёскі. Адноўлена не пазней канца XIX–пачатку XX ст. | Імам: С. Муха (у 1924 г.) |

| | | |
|---|---|---|
| | 1924 г. – 306 чал. | |
| Відзы<br>(Браслаўскі павет) | Мячэць пабудавана ў 1860–1865 гг., згарэла ў час Першай сусветнай вайны.<br>У 1927 г. пабудаваны абшчынны малітоўны дом. Мячэць адбудавана на старым месцы 15.06.1934 г.<br>1938 г. – 760 чал. | Імам: А. Радкевіч |
| Клецк<br>(Нясвіжскі павет) | Мячэць пабудавана ў 1881 (1883 г.).<br>Рамонт мячэці ў 1930–1931 гг. Фундатары: татарскія эмігранты ў ЗША.<br>1937 г. – 228 чал. | Імам: Я. Ждановіч, 1866 г. нар. (1895–1939 гг.) (паводле іншых звестак – 1888–1935 гг.),<br>М. Александровіч<br>(з 1936 г.) |
| Докшыцы (Дзісенскі павет) | Малітоўны дом | Імам: С. Якубоўскі (сярэдзіна 1920-х гг.) |
| Глыбокае (Дзісенскі павет) | Малітоўны дом пабудаваны ў 1931 г. | * |

Каштоўнасці ісламу вызначалі традыцыйны ўклад жыцця, побыт татарскіх сем’яў, асабліва ў вёсках і малых мястэчках. Паводле статута Мусульманскага рэлігійнага саюза ў Польшчы, кожны святар мог быць адначасова настаўнікам рэлігіі ў школах сваёй абшчыны [762, арк. 380]. Мовай літургіі абвяшчалася арабская. Пачатковая адукацыя і традыцыйнае выхаванне татарскіх дзяцей першапачаткова ажыццяўлялася імамамі, муэдзінамі ці годжыямі (прызначанымі настаўнікамі) ў мектэбэ (школах чытання Карана) [396, с. 138]. Зрэдку яны размяшчаліся ў асобных будынках, часцей – у непрыстасаваных для вучобы прыватных памяшканнях годжыяў. Пачынаючы з 6-гадовага ўзросту, у гарадах і вялікіх мястэчках дзеці наведвалі мусульманскую школу зранку і пасля абеду, у малых населеных пунктах – толькі ў пятніцу. Пасля засваення напісання арабскага алфавіту вучні чыталі Каран, хамаіл (малітоўнік), дзе былі як арабскія, так і старажытнататарскія тэксты [397, с. 6]. У польскіх школах у праграме навучання па рэлігіі былі асноўныя палажэнні Суны. З другога году навучання ішло засваенне палажэнняў ісламскай веры. Дзецям даводзілася запамінаць вялікія тэксты на арабскай мове [943, с 213–215]. Нешматлікія прадстаўнікі татарскай моладзі працягвалі навучанне ў медрэсэ (сярэдніх навучальных установах) у Югаславіі, у ВНУ арабскага свету. Напрыклад, у 1933 г. на вучобу ў мусульманскі універсітэт Аль-Азхар у Каіры былі накіраваны А. Варановіч, М. Александровіч [934, с. 469, 471].

Нягледзячы на патрабаванні аб стварэнні асобных дзяржаўных мусульманскіх школ у Вільні і Навагрудку, на працягу ўсяго міжваеннага часу татарскія дзеці вымушаны былі наведваць польскія школы. У адным з лістоў да школьных улад татары Клецка прасілі не караць іх за тое, што не пускаюць сваіх дзяцей да 11 гадоў у польскую школу, бо яны навучаюцца ў рэлігійнай школе [770, арк. 16].

Разам з устойлівай прыхільнасцю да каштоўнасцей іслама ў асяроддзі татарскай інтэлігенцыі ўзрастала цікаўнасць да свецкай культуры, адукацыі, навукі. Неабходна ўдакладніць сцвярджэнне аб тым, што Культурна-асветніцкі саюз татараў Польшчы (КАСТП) быў створаны ў 1923 г. [398, с. 45]. Тады ў Варшаве ўзнік легальны Мусульманскі саюз, які сапраўды лічыўся польскімі ўладамі пачатковым этапам у развіцці КАСТП [768, арк. 40]. Хоць грамадска-культурны рух татараў назіраўся ў Вільні яшчэ ў пачатку 1920-х гг., аднак толькі ў 1925 г. старшыня духоўнай управы мясцовай мусульманскай абшчыны А. Мурза-Мурзіч, прафесар Віленскага універсітэта імя С. Баторыя С. Базарэўскі, А. Рамановіч і іншыя татарскія дзеячы ў ходзе падрыхтоўкі да правядзення Усяпольскага з’езда дэлегатаў мусульманскіх абшчын выступілі з ініцыятывай аб стварэнні асобнага культурна-асветніцкага таварыства [951, с. 13–14].

На Усяпольскім з’ездзе дэлегатаў мусульманскіх абшчын, які адбыўся 28–29 снежня 1925 г. у Вільні, найбольш прадстаўнічай была дэлегацыя абшчын Навагрудка і Слоніма [765, арк. 29, 37–40]. З’езд выступіў за аўтакефалію мусульманскай царквы ў Польшчы, выбраў муфціем Я. Шынкевіча, стварыў асобныя рэдакцыйныя камісіі па падрыхтоўцы статутных дакументаў аб прававым становішчы мусульманскай царквы і аб яе адносінах з Польскай дзяржавай [765, арк. 29, 37–40, 43–54; 933, с. 321–322]. На згаданым з’ездзе быў прадстаўлены ўжо зацверджаны польскімі ўладамі ў жніўні 1925 г. статут КАСТП [933, с. 329–330; 1134, с. 12]. Працэс урэгулявання прававога становішча мусульманскай царквы працягваўся з пераменным поспехам да сярэдзіны 1930-х гг. У 1933–1934 гг. падрыхтаваныя дакументы разглядаліся польскімі ўладамі на ваяводскім і агульнадзяржаўным узроўнях [1109, с. 515–518; 1104, с. 180–197; 930, с. 199–200]. У ходзе працы над зместам закона і статута Мусульманскага рэлігійнага саюза муфціят супрацоўнічаў з Міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы. Паводле аднаго з праектаў закона аб адносінах дзяржавы да Мусульманскага рэлігійнага саюзу Польшчы (рэдакцыя ад 29 мая 1933 г.), кіраўніком мусульманскай абшчыны з’яўляўся імам, яго намеснікам – муэдзін. Імам і муэдзін выбіраліся на агульным сходзе рэлігійнай абшчыны, зацвярджаліся муфціем пасля яго ўпэўненасці ў лаяльнасці да Польскай дзяржавы кандыдата на пасаду. Рабіўся адпаведны запыт ваяводскім уладам, пры атрыманні адмоўнага

адказу кандыдатура адхілялася. Канчатковае рашэнне аб зацвярджэнні мулы і муэдзіна прымаў міністр веравызнанняў і грамадскай асветы [762, арк. 267–279]. Толькі 7 лютага 1936 г. польскі сейм прыняў закон аб адносінах дзяржавы да Мусульманскага рэлігійнага саюза, 21 красавіка 1936 г. яго зацвердзіў сенат. Статут Мусульманскага рэлігійнага саюза быў зацверджаны польскім урадам 26 сакавіка 1936 г. [734, арк. 2–12].

Нягледзячы на актыўную грамадска-палітычную дзейнасць, асабліва ў час выбараў у польскі сейм і сенат у 1928 г., калі быў створаны асобны татарскі камітэт і падтрыманы Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам [933, с. 327], дзеячы КАСТП адной з галоўных задач лічылі разгортванне сеткі мясцовых аддзелаў арганізацыі пры кожнай мусульманскай абшчыне. На працягу 1926–1928 гг. быў створаны 21 аддзел КАСТП – пераважна ў мясцовасцях, якія былі цэнтрамі мусульманскіх абшчын. Сярод іх вылучаліся Вільня, Сорак Татараў, Немож, Відзы, Докшыцы, Мядзел Віленскага ваяводства, Навагрудак, Слонім, Ляхавічы, Іўе, Некрашунцы, Клецк, Асмолава, Мір, Ластаі (каля Крэва) Навагрудскага ваяводства, Гродна, Крушыняны, Багонікі, Скідэль Беластоцкага ваяводства, а таксама Варшава і Роўна [1206, с. 25–28; 769, арк. 18]. У 1930 г. быў створаны аддзел у Глыбокім, а ў 1936 г. – у Іванава і Ардзе Нясвіжскага павета (апошні быў зарэгістраваны толькі ў верасні 1937 г. [195, арк. 48адв.]).

Асноўныя напрамкі дзейнасці КАСТП былі вызначаны на I Усяпольскім з’ездзе дэлегатаў яго аддзелаў (Вільня, 26 снежня 1928 г.) [1206, с. 13–22]. Галоўнай мэтай КАСТП абвяшчалася “аб’яднанне татарскага насельніцтва Польшчы, абарона і падтрымка эканамічных, культурных і прафесійных інтарэсаў сваіх членаў, уздым іх разумовага, этычнага ўзроўняў” [734, арк. 2–4; 1206, с. 23]. Для выканання пастаўленай мэты арганізацыя ставіла задачы па стварэнню школ для выхавання моладзі, выдавецкай дзейнасці, заснаванню бібліятэк, кааператываў, дабрачынных устаноў і г. д. Цэнтральную раду КАСТП узначаліў А. Крычынскі. У склад Цэнтральнай рады КАСТП уваходзілі таксама Я. Багдановіч, А. Якубоўскі, Д. Яновіч-Чаінскі, С. Мурза-Мурзіч (сакратар), Ш. Шайкевіч, А. Шчуцкі. Прадстаўленая на з’ездзе ідэалогія, якая была распрацавана групай віленскай татарскай інтэлігенцыі, прадугледжвала захаванне этнічнай адметнасці татараў не толькі ў межах традыцыйных ісламскіх каштоўнасцей, але і свецкай культурна-асветніцкай працы, праз папулярызацыю гістарычных ведаў, адкрыццё нацыянальнага музея, заснаванне ўласнага друкаванага органа [1206, с. 18–20]. Такую пазіцыю адносна шырокай культурна-асветніцкай дзейнасці падтрымалі татарскія актывісты на месцах, якія займаліся як справамі мусульманскай абшчыны, так і працай аддзелаў КАСТП. Толькі пасля 1936 г., калі адбылося строгае размежаванне рэлігійнай і свецкай

дзейнасці, уся культурна-асветніцкая праца перайшла да мясцовых аддзелаў КАСТП.

Кожны аддзел арганізацыі меў уласны клуб (святліцу), які звычайна размяшчаўся ў рэлігійнай школе, прыватным памяшканні ці абшчынным доме. Створаныя пры клубах (святліцах) аматарскія мастацкія калектывы былі станоўча ўспрыняты мясцовым татарскім насельніцтвам. Аднак у сваёй дзейнасці гэтыя самадзейныя калектывы адчувалі рэпертуарны голад. У сваіх выступленнях яны выкарыстоўвалі пераважна беларускія і польскія песні, танцы. Рабіліся спробы ўзбагаціць рэпертуар за кошт мастацкіх калектываў паволжскіх і крымскіх татараў (папулярызацыяй народнай творчасці апошніх займаўся К. Кембіраў), аднак іх мова для мясцовых татараў была незразумелай, іх мову ведалі толькі асобныя прадстаўнікі татарскай інтэлігенцыі. Адчувалася таксама і адсутнасць кваліфікаваных спецыялістаў у галіне харэаграфіі, музычнай аранжыроўкі. З-за няразвітасці пластычнага і выяўленчага мастацтва аддзелы КАСТП не наладжвалі мастацкія выставы.

Адной з форм культурна-асветніцкай працы з’яўляліся лекцыі па гісторыі, культуры, рэлігіі беларуска-літоўскіх, паволжскіх, крымскіх татараў, актуальныя агляды падзей у свеце. З дзяцінства ў татарскіх сем’ях выхоўвалася павага да кніг і вучобы, адукаваныя людзі мелі вялікі грамадскі аўтарытэт. Аднак толькі асобныя аддзелы КАСТП змаглі адкрыць уласныя бібліятэкі. Заснаваная ў жніўні 1927 г. бібліятэка аддзела КАСТП у Слоніме ўтрымлівалася на сродкі А. і С. Смольскіх і стала самым буйным татарскім кнігазборам – у 1934 г. там было 544 тамы кніг [1044, с. 110]. Фонды бібліятэкі Віленскага аддзела КАСТП на працягу 1932–1938 гг. павялічыліся з 114 да 318 тамоў кніг [933, с. 322; 1044, с. 110].

З усіх рэгіянальных падраздзяленняў менавіта аддзел КАСТП у Вільні з’яўляўся найбольш актыўным. Праведзеныя лекцыі закраналі актуальныя рэлігійныя, навуковыя, грамадскія праблемы, аднак іх аўдыторыя да пачатку 1930-х гг. абмяжоўвалася толькі членамі мясцовага аддзела. Выразнай была тэндэнцыя да змяншэння колькасці нешматлікіх лекцый: у 1926 г. – 11, у 1927 г. – 5, у 1928 г. – 3, 1930 г. – 1 [933, с. 330–331]. Толькі з 1932 г. гэты напрамак культурна-асветніцкай працы ажывіўся, а кантынгент слухачоў папаўняўся за кошт запрошаных асоб.

Л. Крычынскі з’яўляўся з 1931 г. не толькі кіраўніком аддзела КАСТП, але і захавальнікам татарскага музея ў Вільні, заснаванага Цэнтральнай радай КАСТП у маі 1929 г. Менавіта яго прыватныя зборы склалі аснову фонда музея, які размяшчаўся ў будынку муфціяту і нагадваў больш музейную экспазіцыю [952, с. 2–5]. Пры музеі ў 1931 г. быў створаны архіў. У 1932 г. у музеі захоўвалася больш 50 каштоўных помнікаў:

рукапісныя караны, кітабы, хамаілы, збор дакументаў з татарскімі пячаткамі, куфічныя манеты, старадрукі (сярод іх – антытатарскі па свайму характару “Альфуркан татарскі праўдзівы…” М. Чыжэўскага 1617 г.), дакументы з подпісам караля Рэчы Паспалітай С. Аўгуста Панятоўскага, малюнкі і фатаграфіі мячэцяў і інш. [933, с. 331; 918, с. 1–8; 1054, с. 409; 28, арк. 5адв.]. Пасля пераезду ў 1934 г. захавальніка Л. Крычынскага ў Замосце музейныя і архіўныя матэрыялы размяшчаліся ў сховішчы муфціяту.

Даволі выніковым напрамкам КАСТП з’яўлялася выдавецкая дзейнасць. У 1929 г. быў выдадзены “Гербоўнік татарскіх сем’яў у Польшчы” С. Дзядулевіча [850], у якім прааналізаваны генеалогія і гісторыя шматлікіх татарскіх родаў ВКЛ з XV ст. Сродкі для выдання збіраліся асобным камітэтам на чале з Л. Крычынскім [933, с. 329]. Нягледзячы на асобныя заўвагі, выданне атрымала станоўчыя водгукі.

Цэнтральная рада КАСТП выдала ў 1932–1938 гг. 3 тамы навуковага, літаратурнага часопіса “Rocznik Tatarski”(“Татарскі штогоднік”), галоўным рэдактарам якога быў таксама Л. Крычынскі [1037, с. 205–215]. У першых 2-х тамах “Татарскага штогодніка” змяшчаліся публікацыі па гісторыі, культуры татар на польскіх, беларускіх і літоўскіх землях, пра іх сувязі з мусульманскім Усходам. Сярод шэрагу публікацый вылучаліся артыкулы караімскага гахама Х.С. Шапшала аб страце літоўскімі татарамі сваёй роднай мовы, А. Ахматовіча аб прававым становішчы татарскага насельніцтва ў XVIII–XX стст., Т. Стрыкеніча-Корзана “Гістарычны нарыс пра літоўскіх татар у Мінску Літоўскім і яго ваколіцах”, муфція Я. Шынкевіча пра рэлігійную літаратуру, імама А. Варановіча пра ўцалелыя пласты мовы татар. Ваеннай гісторыі былі прысвечаны артыкулы “Літоўскія татары ў польскім войску ў паўстанні 1831 г.” Л. Крычынскага, “Генерал Ю. Беляк (1741–1794)”, “Матэрыялы па гісторыі татарскіх палкоў у Польшчы (1777–1791)” С. Крычынскага, пра ўдзел у паўстанні 1863 г. Л. Найманскага і інш. На старонках часопіса прыводзілася хроніка грамадска-палітычнага, рэлігійнага, этнакультурнага жыцця татар Заходняй Беларусі і ўсёй Польшчы, змяшчаліся літаратурныя творы, рэцэнзіі і інш. У 3-м томе была апублікавана кніга С. Крычынскага “Літоўскія татары: Спроба гісторыка-этнаграфічнай манаграфіі” [943]. На падставе друкаваных матэрыялаў, архіўных дакументаў, рукапісаў, запісаных успамінаў людзей і іншых крыніц аўтар у 12 раздзелах асвятляў гісторыю пасялення татараў, іх рода-племянныя традыцыі, рэлігію, традыцыйныя заняткі, абрады і звычаі, назвы населеных пунктаў і прозвішчы татарскага паходжання, нацыянальныя рысы характару, творы матэрыяльнай культуры, мову і пісьменнасць, школы і кнігі, могілкі (мізары), народную медыцыну. Манаграфія з’яўлялася ў польскай

гістарыяграфіі першым цэласным даследаваннем татарскай праблематыкі, заснаваным на саліднай крыніцазнаўчай базе [921, с. 215; 1149, с. 399], атрымала станоўчыя рэцэнзіі вучоных. Кніга была сур'ёзным укладам у вывучэнне татарскай праблематыкі, гістарыяграфіяй якой актыўна займаўся аўтар [840]. Усяго ў міжваеннай Польшчы было надрукавана каля 500 прац (найперш артыкулаў), прысвечаных гісторыі і культуры татараў.

Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы аказвала падтрымку "Татарскаму штогодніку". На выданне 2-га тома было выдзелена 900 злотых, 3-га тома – 500 злотых, 4-га тома – 1 тыс. злотых [769, арк. 223–224, 230; 761, арк. 175–176, 216]. Дапамогу аказваў таксама польскі Фонд народнай культуры. Выданне падрыхтаванага для друку 4-га тома "Татарскага штогодніка" было перанесена на пачатак 1940 г. (у лістападзе 1939 г. па загаду нямецкіх акупацыйных улад яго набор у варшаўскай друкарні быў знішчаны) [1044, с. 133]. У жніўні 1939 г. была наладжана перапіска адносна падрыхтоўкі 5-га тома.

Са студзеня 1934 г. Віленскі адддзел КАСТП пачаў выдаваць штомесячны часопіс "Życie tatarskie"("Татарскае жыццё"), галоўнай мэтай якога з'яўляўся ўздым культурнага ўзроўню вёскі [934, с. 473]. На старонках выдання закраналіся пытанні гісторыі, рэлігіі, традыцыйных заняткаў татараў, іх асветы, змяшчалася хроніка падзей грамадска-культурнага і рэлігійнага жыцця і г. д. Аднак інтарэс да часопіса з боку татарскага насельніцтва быў слабым. Толькі ў Вільні каля 13,6% (у Варшаве – 6,6%) мясцовых татар выпісвалі гэты часопіс, у іншых мясцовасцях гэты паказчык вагаўся ад 0,6% да 3%. З-за бяздзеяння мясцовага аддзела КАСТП у Навагрудку ўсяго 1% татараў выпісвалі часопіс [882, с. 2]. Цэнтральная рада КАСТП садзейнічала падпісцы і распаўсюджванню часопіса "Przegląd Islamski" ("Ісламскі агляд"), які выдаваўся мусульманскай абшчынай у Варшаве ў 1930–1931, 1934–1937 гг. Намаганнямі муфціята ў Вільні для задавальнення духоўных патрэб мясцовых татараў выпускаліся мусульманскія календары, падручнікі, асобныя суры з Карана на арабскай і польскай мовах.

Для татарскага культурна-асветніцкага руху адмоўныя вынікі меў канфлікт паміж Цэнтральнай рады КАСТП і муфціятам, які імкнуўся быць адзіным прадстаўніком татарскай меншасці. 27 снежня 1929 г. II Усяпольскі з'езд дэлегатаў аддзелаў КАСТП заклікаў муфціят склікаць Усяпольскі мусульманскі кангрэс для выбараў часовай Вышэйшай мусульманскай калегіі [933, с. 330]. Так як муфціят ігнараваў гэтыя заклікі, то аналагічныя захады рабіліся і на III з'ездзе дэлегатаў аддзелаў КАСТП 4 кастрычніка 1930 г. у Вільні (створаны на з'ездзе татарскі выбарчы камітэт ухіліўся ад уласнага ўдзелу ў выбарах ў польскі сейм, сенат і зноў падтрымаў Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам). Асаблівую

вастрыню канфлікт набыў у пачатку 1930-х гг. у ходзе палемікі аб прававым статусе Мусульманскага рэлігійнага саюза. Толькі пасля ўмяшальніцтва віленскіх ваяводскіх улад удалося дасягнуць паразумення паміж Цэнтральнай радай і муфціятам. Пытанне аб месцазнаходжанні муфціята таксама абвастрала адносіны паміж татарскай інтэлігенцыяй Варшавы і Вільні.

У пачатку 1930-х гг. пад уздзеяннем адзначанага канфлікту, іншых аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў адбыўся заняпад дзейнасці большасці аддзелаў КАСТП. Актыўнай працай займаліся толькі аддзелы ў Варшаве і Вільні. Аддзелы ў Слоніме і Навагрудку, якія ўтрымлівалі бібліятэкі, сваю дзейнасць абмежавалі правядзеннем забаўляльных танцавальных мерапрыемстваў. Татарскі дзеяч з Варшавы А. Пултажыцкі падзенне цікаўнасці з боку татараў да культурна-асветніцкай працы тлумачыў нізкім ўзроўнем іх грамадскай свядомасці. Ён прапаноўваў замест аддзелаў стварыць дэлегатуры КАСТП [1085, с. 8–11]. Таксама гучалі прапановы адносна практыкі правядзення ў кожную пятніцу ў святліцах спатканняў для сумеснага чытання і абмеркавання прэсы [951, с. 13–14]. Адзін з актывістаў са Слоніма самакрытычна прызнаваўся, што для правядзення паўнацэннай асветніцкай дзейнасці не хапала кніг, папулярных займальных гульняў [931, с. 16].

Ва ўмовах заняпаду мясцовых аддзелаў КАСТП у Навагрудку і Слоніме татарскія дзеячы ўключыліся ў стварэнне асобных аддзелаў Стралецкага саюза, польскай ваенізаванай грамадскай арганізацыі. Летам 1933 г. па ініцыятыве І. Міскевіча ў Навагрудку былі створаны 2 татарскія аддзелы Стралецкага саюза – мужчынскі (кіраўнік – С. Шчэнсновіч) і жаночы (кіраўнік – А. Аліевіч). Былі таксама арганізаваны курсы турэцкай мовы [934, с. 469–470; 317, арк. 142адв.]. Заснавальнікам аналагічнага мужчынскага аддзела ў Слоніме на чале з Я. Шагідэвічам у лістападзе 1933 г. выступіў М. Байрашэўскі. У канцы 1930-х гг. пры навагрудскім аддзеле была створана дружына арлянят, куды ўваходзілі дзеці 14–16-гадовага ўзросту. У 1937 г. татарская моладзь Клецка таксама гуртавалася ў адддзел Стралецкага саюза.

Новыя структурныя адзінкі праводзілі як прапольскую ідэалагічную дзейнасць, так і культурна-асветніцкую працу сярод татарскага насельніцтва. Пры татарскіх аддзелах Стралецкага саюза ў Навагрудку і Слоніме пачалі працаваць драматычныя секцыі [932, с. 15–16]. Летам 1935 г. татарская моладзь у Слоніме наладзіла некалькі таварыскіх сходаў, у час якіх ставіліся тэатральныя пастаноўкі, дэкламацыі, спевы на татарскай і польскай мовах, выконваліся татарскія танцы ў нацыянальных касцюмах. Спектаклі выклікалі цікаўнасць у татарскага насельніцтва, асабліва моладзі. Прыбытак ад танцавальных забаў у Слоніме

выкарыстоўваўся для культурна-асветніцкіх патрэб, папаўнення бібліятэкі [187, арк. 27, 73, 92]. 27–29 жніўня 1936 г. татарскі аддзел Стралецкага саюза ў Навагрудку арганізаваў велізарнае спатканне (фэст) для татарскай моладзі з розных мясцовасцей [1218, с. 230]. Па ініцыятыве аддзела КАСТП у Іванаве Нясвіжскага павета з 1936 г. урачыста праводзіліся штогадовыя агульнататарскія дажынкі. Дзеячы КАСТП змаглі дабіцца правядзення ў 1937 г. у Іўі рамесніцкіх курсаў для гарбароў, у пачатку 1939 г. – у Клецку.

У татарскім грамадска-культурным руху ў Вільні актыўна ўдзельнічалі студэнты. З-за малалікасці (у 1933/1934 г. у Віленскім універсітэце імя С. Баторыя вучылася 16 татар, у 1936/1937 г. – 7, у 1938/1939 г. – 11 [1044, с. 75; 934, с. 470]) яны не змаглі стварыць асобную нацыянальную студэнцкую арганізацыю. Аднак частка нацыянальна настроенай татарскай моладзі наладзіла з сярэдзіны 1930-х гг. уласную спробу ажыўлення культурна-асветніцкай дзейнасці. У пачатку 1935 г. пры мясцовым аддзеле КАСТП у Вільні ўзнік гурток татарскай моладзі, адным з лідэраў якога з'яўляўся Э. Шынкевіч [934, с. 480]. Для каардынацыі татарскага маладзёжнага руху ў маі 1937 г. гурток быў пераўтвораны ў часовую раду гурткоў татарскай моладзі пры Цэнтральнай радзе КАСТП. Такім чынам, у татарскім руху вызначылася супрацьлеглая тэндэнцыя аб наданні яму нацыянальнага характару, нацыянальна-культурным адзінстве ўсіх татараў, у тым ліку паволжскіх і крымскіх [1044, с. 69–70]. Хоць ідэі нацыянальна-культурнага адзінства ўсіх татараў абудзілі частку татарскай моладзі да грамадскай працы, аднак яны супярэчылі ідэалагічным пастулатам аб польскасці татараў, не знайшлі шырокай падтрымкі на месцах, асабліва з боку татарскіх аддзелаў Стралецкага саюза ў Навагрудку і Слоніме [1179, с. 210]. Найбольш актыўны гурток татарскай моладзі дзейнічаў пры аддзеле КАСТП у Міры, дзе была створана бібліятэка, функцыянаваў аматарскі мастацкі калектыў, планавалі пабудаваць татарскі дом культуры.

У ходзе разгорнутай у 1937 г. дыскусіі аб стане і перспектывах татарскага культурна-асветніцкага руху яго лідэры сярод прычын яго заняпаду адзначалі нізкі ўзровень жыцця, галечу татарскіх сялян і рамеснікаў, слабы інтарэс да грамадскіх праблем з боку заможных слаёў татарскага насельніцтва, інтэлігенцыі, канфлікт паміж маладым і старэйшым пакаленнем [942, с. 6–9; 1199, с. 5–6; 1164, с. 5–6; 1086, с. 14–17]. Татараў заклікалі да захавання этнічнай салідарнасці і павышэння актыўнасці ў грамадскай працы.

Канчаткова канфлікт паміж муфціятам і свецкімі лідэрамі татарскага руху вычарпаў сябе пасля I Усяпольскага мусульманскага кангрэса (Вільня, 31 студзеня 1938 г.), на якім была выбрана Вышэйшая

мусульманская калегія, у склад якой увайшлі імамы А. В票ановіч, А. Крыніцкі, у якасці іх намеснікаў – імамы Я. Міскевіч, Л. Мухля, а таксама свецкія асобы – А. Крычынскі, Я. Рамановіч (намеснікі – К. Мурза-Мурзіч, С.-М. Рамановіч) [1219, с. 6]. На другі дзень пасяджэння кагрэса дэлегаты КАСТП падвялі папярэднія вынікі грамадска-культурнай дзейнасці.

У пачатку 1939 г. у Вільні быў створаны гурток татарскіх кабет на чале з жонкай муфція Л. Шынкевіч, які супрацоўнічаў з Віленскім аддзелам КАСТП. На восень 1939 г. Цэнтральнай радай КАСТП планавалася правядзенне агульнататарскага з’езда ў Навагрудку.

У міжваеннай Польшчы татарская праблема не набыла палітычнай значнасці. На ўзроўні польскіх урадавых колаў і мясцовай адміністрацыі нешматлікая татарская супольнасць не кваліфікавалася нацыянальнай меншасцю. У якасці этнічнай (этнаграфічнай) групы прызнавалі татараў і даследчыкі міжваеннага часу. Татарскае насельніцтва з яго этнічнымі і рэлігійнымі асаблівасцямі не ўяўляла вялікай пагрозы для польскіх нацыянальных інтарэсаў і дзяржаўнай бяспекі. Для польскіх уладаў датацыі і афіцыйная падтрымка татарскага грамадска-культурнага руху насіла прагматычны характар і мела вялікае прапагандысцкае значэнне [953, с. 34]. У сваю чаргу татарскія лідэры ўсяляк падкрэслівалі патрыятычныя пачуцці і лаяльнасць татараў адносна Польскай дзяржавы, аказвалі падтрымку палітычнаму лагеру “санацыі”. У прыватнасці, гэта было прадэманстравана ў канцы чэрвеня 1930 г. пры наведванні Вільні прэзідэнтам І. Масціцкім [957, арк. 13–56]. Татарскія ідэолагі ўхіляліся ад вызначэння татараў як народа, падкрэсліваючы пры гэтым толькі асобныя спецыфічныя нацыянальныя рысы – рэлігію, традыцыйныя абрады і звычаі, паходжанне [1057, с. 24]. З польскіх нацыянальных пазіцый ідэалогія татараў была не нацыяналістычнай, а патрыятычнай. Татарскія актывісты ўдзельнічалі ва ўрачыстасцях, прымеркаваных да польскіх нацыянальных і дзяржаўных святаў, мелі дачыненне да прапаганды культу Ю. Пілсудскага [407, с. 72–73]. Насуперак гістарычнай праўдзе, нярэдка татарскія ідэолагі ўхвалялі талерантную польскую этнаканфесійную палітыку ў мінулым і сучаснасці, якая дазволіла татарам захаваць уласную этнічную самабытнасць. Татары паказваліся ў якасці пасярэднікаў паміж еўрапейскай і азіяцкімі цывілізацыямі.

Хоць у міжваенны час татары захоўвалі рэлігійную адметнасць, традыцыі і звычаі, аднак працягваўся працэс іх культурна-моўнай асіміляцыі, які пачаўся яшчэ ў папярэднія стагоддзі. Паводле С. Крычынскага, татарская інтэлігенцыя падверглася поўнай паланізацыі, сялянска-мяшчанскае насельніцтва – значнай беларусізацыі [1044, с. 159; 943, с. 1]. Татары ў Навагрудку, як і ў іншых кампактных цэнтрах іх

пражывання, у паўсядзённым жыцці выкарыстоўвалі пераважна беларускую мову [85, с. 94]. Хоць у Валожынскім павеце каля мястэчка Вішнева татарская прысутнасць была непрыкметнай, аднак яны прытрымліваліся беларускай мовы [66, с. 80]. Паводле С. Міскевіча, у пачатку міжваеннага перыяду толькі частка татараў выкарыстоўвала ў побыце беларускую мову і ідэнтыфікавала сябе з беларусамі, астатнія гаварылі на польска-беларускім дыялекце [1044, с. 159]. Такая выснова зроблена ім на падставе сумніўных вынікаў апытання Цывільнага урада ўсходніх зямель у 1919 г.: з 1,5 тыс. татараў Віленшчыны 38% назваліся палякамі, 49,3% – татарамі і 4,6% – беларусамі. Даследчык схематычна перанёс гэтыя суадносіны на тэрыторыю ўсёй Заходняй Беларусі і ўсходняй Літвы [1044, с. 160]. Безумоўна, што ступень інтэграванасці татараў найперш у польскую культуру ў канцы міжваеннага часу ўзмацнілася. У пачатку 1939 г. беластоцкі ваявода адзначаў адносна татарскага насельніцтва ў Крушынянах і Багоніках наступнае: “Мусульмане жывуць у сваіх рэлігійных абшчынах у культурнай адасобленасці ў беларускім акружэнні і з-за адсутнасці ўласнай інтэлігенцыі павольна спольшчваюцца” [207, арк. 31–32] (нягледзячы на гэта, татары гэтых населеных пунктаў працягвалі захоўваць рысы этнакультурнай самабытнасці і пасля Другой сусветнай вайны [924; 841]. Аналагічныя працэсы ў пачатку 1939 г. фіксавалі і ўлады Віленскага ваяводства. Сярод татараў вылучалася невялікая частка, якая прытрымлівалася традыцый, звычаяў, але ўжо не была звязана з рэлігіяй. “Шлюбныя адносіны з хрысціянкамі спрыяюць асіміляцыі татараў, іх поўнай рэлігійнай індэферэнтнасці” [210, арк. 28]. Аналіз разнастайных крыніц не дае падстаў для ідэалізацыі нацыянальна-культурнага становішча татараў у заходнебеларускім краі, што прысутнічае ў польскіх і асобных беларускіх навукова-папулярных выданнях [453, с. 21].

У цэлым, у этнакультурным жыцці татараў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–30-я гг. назіраліся разнастайныя тэндэнцыі. Іслам садзейнічаў устойлівай тэндэнцыі да захавання культуры, традыцый татараў. Акрамя рэлігійных дзеячаў, да грамадска-культурнай працы далучылася нешматлікая свецкая інтэлігенцыя, татарская моладзь. Іх намаганнямі былі створаны культурна-асветніцкія, навуковыя арганізацыі і ўстановы, сярод якіх выдзялялася КАСТП і яго аддзелы, выдавалася перыядычная і навуковая літаратура, папулярызавалася гісторыка-культурная спадчына, рэлігійныя каштоўнасці татараў. Адначасова польская культура аказвала значны ўплыў на татарскую грамадска-культурную дзейнасць, адбывалася паланізацыя татарскай інтэлігенцыі і іншых сацыяльных слаёў, паглыбіўся працэс культурна-моўнай асіміляцыі татарскай супольнасці.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У духоўным жыцці грамадства Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. адбываліся працэсы, разнастайныя па свайму характару і зместу. Яны былі выкліканы напружанай грамадска-палітычнай сітуацыяй, шматлікімі сацыяльнымі, нацыянальна-культурнымі і рэлігійнымі фактарамі. Культурнае жыццё заходнебеларускіх зямель вылучалася сваім полікультурным характарам. Разам з нацыянальнай большасцю (беларусамі) пражывалі і палякі, якія прадстаўляліся ісціннымі носьбітамі дзяржаўнасці, атрымалі пры дзяржаўнай пратэкцыяніснкай палітыцы прывілеяваны статус. У Заходняй Беларусі спрадвеку пражывалі яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы, татары і іншыя этнічныя супольнасці.

Выкарыстоўваючы сістэмны падыход, у вызначаны храналагічны перыяд у нацыянальна-культурным жыцці заходнебеларускага грамадства, якое прадстаўлена адзінай сістэмай, удалося вылучыць 2 асноўныя падсістэмы – тыпы дэтэрмінацый этнакультурных адносін, якія адрозніваліся паміж сабой характарам, дынамікай узаемаадносін. У якасці надсістэмы выступаў цэлы комплекс дзяржаўна-прававых, грамадскіх, сацыяльна-псіхалагічных і іншых кампанентаў, якія існавалі ў Польскай дзяржаве ў перыяд ад Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. да верасня 1939 г. Першы тып дэтэрмінацый этнакультурных адносін ахопліваў нацыянальную большасць (беларусаў) і палякаў, якія знаходзіліся паміж сабой у канфрантацыйных адносінах. Дзяржаўная падтрымка павінна была забяспечыць польскай культуры пануючыя пазіцыі ў Заходняй Беларусі. Ва ўмовах пастаянных абмежаванняў, прыгнечання і гвалту супраць культуры, адукацыі, мовы, традыцый беларусаў замест узаемадзеяння, дыялога культур назіралася іх жорсткае супрацьстаянне. Дамінуючай была тэндэнцыя культурна-моўнай асіміляцыі беларускага насельніцтва, якая ажыццяўлялася дзяржаўным апаратам, рымска-каталіцкім касцёлам і іншымі грамадскімі інстытутамі. Характар беларуска-польскіх культурных узаемаадносін вызначаўся нераўнапраўным становішчам беларускай культуры ў межах Польскай дзяржавы. Агульнанацыянальны патрыятычны ўздым палякаў, які назіраўся адразу пасля аднаўлення іх дзяржаўнасці, змяніўся міфалагізаванымі месіянскімі канцэпцыямі, якія знайшлі ўвасабленне ва ўрадавай палітыцы, дзеяннях мясцовага адміністрацыйнага апарату і грамадскай свядомасці, для якой стала характэрнай большая эгаістычнасць і неталерантнасць у адносінах да беларусаў, а таксама адносна іншых этнасаў.

Адставанне заходнебеларускіх зямель па сетцы культурна-асветніцкіх, адукацыйных установаў у параўнанні з цэнтральнымі і заходнімі рэгіёнамі краіны (на момант уключэння ў склад Польшчы) патрабавала

кардынальнага пераразмеркавання фінансавых, матэрыяльна-тэхнічных, кадравых рэсурсаў для выпраўлення такой дыспрапорцыі. Аднак на працягу 1921–1939 гг. польскія ўлады не здолелі выканаць прапагандаваную цывілізатарскую місію ў Заходняй Беларусі. Польская адміністрацыя перашкаджала падрыхтоўцы кадраў беларускай інтэлігенцыі. Падаўленне беларускай культуры адбывалася на фоне гвалтоўнага насаджэння польскай культуры і асветы. Метады іх пашырэння ніяк не маглі спрыяць засваенню духоўных каштоўнасцей, што прапагандаваліся польскімі школамі, культурна-асветніцкімі ўстановамі. У тагачасных абставінах у свядомасці беларусаў яны ўспрымаліся чужымі.

У такіх неспрыяльных умовах палітычныя партыі, культурна-асветніцкія арганізацыі, інтэлігенцыя Заходняй Беларусі імкнуліся захаваць і прадоўжыць нацыянальныя традыцыі. Заходнебеларускія духоўныя каштоўнасці арганічна дапоўнілі агульнанацыянальную спадчыну. Рух у абарону беларускай культуры садзейнічаў развіццю барацьбы шырокіх пластоў насельніцтва за сацыяльнае вызваленне, за ўз’яднанне ў адзіны дзяржаўны арганізм. Вопыт заходнебеларускага руху паказаў, што нацыянальна-культурныя каштоўнасці маглі атрымаць масавую падтрымку толькі ў цеснай сувязі з патрабаваннямі радыкальных змен у сацыяльна-эканамічным жыцці.

Нягледзячы на складаныя абставіны, таленавітыя творцы праяўлялі сябе ў народным і прафесійным мастацтве, паказвалі прыклады самаадданага служэння свайму народу. Нацыянальна-вызваленчы рух, супраціўленне народных мас не дазволілі польскім уладам выкараніць у беларусаў пачуццё нацыянальнай свядомасці, цягу да культуры і асветы. Хоць у Заходняй Беларусі не было належных умоў для правядзення фундаментальных навуковых даследаванняў, аднак асобныя грамадскія арганізацыі і дзеячы займаліся распрацоўкамі ў галіне гуманітарных навук (гісторыі, культуралогіі і інш.). У заходнебеларускіх гісторыка-культуралагічных працах міжваеннага часу выразнай была нацыянальна-дэмакратычная гістарыяграфічная канцэпцыя, рамантычная па свайму характару. Заходнебеларускія дзеячы спрабавалі знайсці ў гісторыі беларускага народа эпохі ВКЛ і Рэчы Паспалітай пазітыўныя асновы для грамадска-палітычнага, этнаканфесійнага развіцця. На тым этапе развіцця гістарычнай навукі дапускалася пэўная ідэалізацыя асобных з’яў і працэсаў айчыннай гісторыі, рабіліся некаторыя памылковыя сцвярджэнні і высновы. У 1930-я гг. заходнебеларускія гісторыка-культуралагічныя даследаванні набылі канцэптуальныя разыходжанні з беларускай савецкай гістарычнай навукай. Адначасова польскія вучоныя не вылучалі асобна праблемы гісторыі і культуры беларускага народа, не давалі іх нацыянальнай інтэрпрэтацыі, часта трактавалі ў рэчышчы польскай

гістарыяграфічнай традыцыі. Акрамя таго, некаторыя пастулаты заходнебеларускіх гістарычных, публіцыстычных, мастацкіх твораў адмаўляліся з боку інтэлектуальнай эліты суседніх народаў, спадкаемцаў ВКЛ.

Нават у такіх абставінах нешматлікая беларуская інтэлігенцыя, студэнцкая і вучнёўская моладзь актыўна займаліся навукова-асветніцкай дзейнасцю, зборам і захаваннем артэфактаў матэрыяльнай і духоўнай спадчыны. Стваральная дзейнасць інтэлігенцыі, розных грамадскіх, культурна-асветніцкіх, навуковых, творчых арганізацый садзейнічала захаванню традыцыйнай культуры беларусаў і іншых этнасаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Беларускі музычны фальклор, сабраны ў заходнебеларускім краі ў 1920–1930-я гг. Р. Шырмай, А. Грыневічам і іншымі дзеячамі, арганічна ўвайшоў у агульнанацыянальную мастацкую скарбніцу. Хоць польскія ўлады імкнуліся абмежаваць культурнае жыццё беларусаў выключна фальклорам і традыцыйнай культурай, аднак не дапусцілі развіцця масавай народнай самадзейнасці. Заходнебеларуская элітарная мастацкая культура была цесна звязана з народнай. Нацыянальна-рамантычная тэндэнцыя была вызначальнай у глыбока народнай творчасці беларускіх мастакоў Я. Драздовіча, П. Сергіевіча, М. Сеўрука, Я. Горыда і іншых.

У складаных умовах канфесійнага жыцця нацыянальна-культурная праблематыка набывала палітыка-ідэалагічнае значэнне. Улічваючы патэнцыял царкоўных структур у справе ўздзеяння на свядомасць заходнебеларускіх вернікаў, польскія ўлады спрыялі дзейнасці рымска-каталіцкага касцёла, ажыццяўлялі меры ў напрамку падпарадкавання праваслаўнай царквы, яе дэрусіфікацыі і паланізацыі. Спробы беларусізацыі грамадска-царкоўнага жыцця розных веравызнанняў з-за шэрагу аб’ектыўных і суб’ектыўных прычын не змаглі істотна змяніць яго характар.

Нягледзячы на ліквідацыю інстытуцыянальных форм нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у канцы 1930-х гг., беларуская культура не пацярпела паражэння ў супрацьстаянні з польскай, бо паўнацэннага іх саперніцтва не было. Былі задзейнічаны ўсе мабілізацыйныя механізмы этнакультурнага самазахавання беларусаў ва ўмовах рэальнай страты іх самастойнага існавання, пры правядзенні дзяржаўнага курса па замацаванню данінуючых пазіцый польскіх культурных каштоўнасцей. Гэта было істотным фактарам, які паўплываў на тое, што польская культурная экспансія на тэрыторыі Заходняй Беларусі не ажыццявілася ў запланаваных маштабах.

Нягледзячы на раз’яднанасць беларускіх зямель, у заходнебеларускім грамадстве на працягу ўсяго адзначанага храналагічнага перыяду

адчуваўся ўплыў знешняга фактару. Дынамічныя працэсы нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг. аказвалі пазітыўнае ўздзеянне на культурна-асветніцкі рух, захаванне нацыянальна-культурных каштоўнасцей у Заходняй Беларусі, хаця і не маглі ўнесці кардынальных змен у становішча беларускага насельніцтва ў межах Польскай дзяржавы. З канца 1920-х гг. такога ўплыву не назіралася, што было выклікана значнымі зменамі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Савецкай дзяржавы. Тым не менш, фактары нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у міжваеннай Польшчы былі ўлічаны пры ажыццяўленні савецкай палітыкі ў галіне культуры і адукацыі ў заходніх абласцях БССР у канцы 1939–1941 гг.

Другі тып этнакультурных узаемаадносін у заходняй частцы Беларусі ў 1920–1930-я гг. ахопліваў малыя этнічныя супольнасці (яўрэяў, рускіх, літоўцаў, украінцаў, татараў) і характарызаваўся пераважна неспрыяльнымі ўмовамі для іх грамадска-культурнага развіцця. Адносіны да нацыянальных меншасцей польскія ўлады наладжвалі з улікам розных унутраных і знешніх фактараў, але іх характар таксама вагаўся паміж канфрантацыяй і часовым суіснаваннем. У адносінах да славянскіх меншасцей (рускіх, украінцаў) польская адміністрацыя ажыццяўляла палітыку нацыянальнай асіміляцыі. Пад прыкрыццём дэрусіфікацыі адбывалася насаджэнне рускім польскай мовы, культуры, традыцый. Украінскае насельніцтва заходнепалескага рэгіёна было пазбаўлена магчымасці (асабліва з пачатку 1930-х гг.) мець уласныя культурна-асветніцкія і адукацыйныя ўстановы. Адасоблены характар этнаканфесійнага жыцця яўрэйскай супольнасці выключаў перспектывы паскоранай яе асіміляцыі, таму актыўна выкарыстоўваліся самыя разнастайныя абмежавальныя меры, аказвалася спрыянне эміграцыі яўрэяў. Нацыянальна-культурныя інтарэсы літоўцаў разглядаліся польскімі ўладамі выключна праз прызму напружаных польска-літоўскіх міждзяржаўных адносін. У параўнанні з паветамі, дзе літоўская прысутнасць была даволі адчувальнай, у памежных заходнебеларускіх паветах літоўскае насельніцтва было слабей ахоплена дзейнасцю літоўскіх грамадскіх, культурна-асветніцкіх арганізацый, што спрыяла яго асіміляцыі. Нешматлікае татарскае насельніцтва прызнавалася ў міжваеннай Польшчы ў якасці этнічнай (этнаграфічнай) групы, а татарская праблема ўяўлялася нязначнай для нацыянальнай палітыкі Польскай дзяржавы. Нягледзячы на захаванне рэлігійных, культурных і грамадскіх традыцый, татарская інтэлігенцыя падвяргалася паланізацыі. У цэлым, не толькі беларусы, але і іншае няпольскае насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час не мела магчымасцей для паступальнага, прагрэсіўнага нацыянальна-культурнага развіцця.

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. А усё-такі жывём і працуем // Шлях моладзі. – 1938. – № 6. – С. 2.
2. Аб адкрыцці 9 снежня 1922 г. у будынку староства ў Гродна дзяржаўнага музея // ДАГВ. – Фонд 17. – Воп. 1. – Спр. 24. – Арк. 27.
3. Аб забароне выкарыстання ў метрыках імён рускай транскрыпцыі (28 чэрвеня 1933 г.) // ДАБВ. – Фонд 2036. – Воп. 1. – Спр. 18. – Арк. 107–109.
4. Аб указанні ЦК КПЗБ студэнтам-камуністам арганізоўваць "гурткі" ТБА (1934 г.) // ЗДАМ. – Фонд 509. – Воп. 1. – Спр. 387. – Арк. 101.
5. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам : дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч; прадмова С. Дубаўца. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
6. Агляд дзейнасці таварыства Св. Казіміра // BAML SM. – F. 175. – B. 437. – L. 208–213.
7. Аграновский, Г. Литовский Иерусалим / Г. Аграновский, И. Гузенберг. – Вильнюс : ЛИТУАНУС, 1992. – 75 с.
8. Аграновский, Г.Г. Памятники еврейской истории и культуры в Вильнюсе / Г.Г. Аграновский; Общество "Еврейское наследие". – М., 1997. – Режим доступа : http://www.jewish-heritage.org/agran.htm. – Дата доступа : 29.12.2004.
9. Агульны гадавы сход Рады БІГіК // Беларуская крыніца. – 1935. 14 красавіка. – С. 1.
10. Агульны сход БНТ // Крыніца. – 1924. – 29 красавіка.
11. Агульны сход БІГіК // Беларуская крыніца. – 1933. – 14 мая.
12. Адамушка, У. Справа № 233771 : Беларускі нацыянальны цэнтр / У. Адамушка // Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 3-4. – С. 45–52; № 5-6. – С. 56–63.
13. Адзінец, А. Паваенная эміграцыя : скрыжаванні лёсаў : зборнік успамінаў / А. Адзінец. – Мінск : Медисонт, 2007. – 704 с.
14. Александровіч, Р. З пазнакамі вечнасці : асаблівасці архітэктуры мячэцяў на Беларусі / Р. Александровіч // Роднае слова. – 2004. – № 4. – С. 96–98.
15. Аляхновіч, Ф. Беларускі тэатр / Ф. Аляхновіч. – Вільня, 1924. – 114 с.
16. Антон Луцкевич : материалы следственного дела НКВД БССР / подгот. к печати, введение и комментарии В.Н. Михнюка, Н.М. Климовича и А.Н. Гесь. – Минск : БелНИИДАД, 1997. – 204 с.
17. Бабёр, Я. Час надзеі / Я. Бабёр // Куфэрак Віленшчыны. – 2000. – № 2 (2). – С. 87–111.
18. Беларуская думка XX стагоддзя : філасофія, рэлігія, культура / склад. Ю. Гарбінскі. – Варшава : Ін-т славістыкі Польскай акадэміі навук, 1998. – 740 с.
19. Беларуская зарніца. – 1928. – № 1. – С. 6.
20. Беларуская крыніца. – 1926. – 26 лістапада.
21. Беларуская крыніца. – 1934. – 25 верасня.
22. Беларуская крыніца. – 1935. – 30 чэрвеня.
23. Беларуская крыніца. – 1935. – 3 лістапада.
24. Беларуская нацыя : уз'яднанне. Верасень 1939 г. – чэрвень 1941 г. : зб. дакументаў і матэрыялаў / аўт.-уклад. У.Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 2004. – 199 с.
25. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 1. Перапіска з арганізацыямі аб рэчавых экспанатах і матэрыяльнай падтрымцы … (1936–1939 гг.).
26. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 3. БНТ у Вільні. Статут 1920 г.

27. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 4. Пратаколы пасяджэнняў, перапіска, спіс членаў, фінансавыя дакументы 1920–1937 гг.

28. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 12. Лорэнц С. Агляд віленскіх музеяў : даклад на X з’ездзе музеязнаўцаў у Вільні (4–25.06.1934 г.).

29. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 13. Грышкевіч В. Роля беларускіх зямель у польска-літоўскіх уніях : даклад VI Усяпольскага з’езда гісторыкаў (1935 г.).

30. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 19. Дакументы арганізацыйнай камісіі па падрыхтоўцы I з’езда педагогаў беларускіх школ у Вільні (1923 г.)

31. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 22. Дакументы Беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Прасвета”, г. Вільня (1926–1930 гг.).

32. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 23. Таварыства беларусаведы пры Віленскім універсітэце (21.06.1931 г. – 12.12.1934 г.).

33. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 24. Статут, перапіска і інш. Таварыства беларусаведы пры Віленскім універсітэце. – Т. 1 (1931–1937 гг.).

34. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 25. Статут, перапіска і інш. Таварыства беларусаведы пры Віленскім універсітэце. – Т. 2 (1936–1939 гг.).

35. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 31. Статут ТБА у Вільні (1933 г.).

36. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 61. Часопіс “Маланка” (1926–1929 гг.).

37. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 62. Часопіс “Маланка” (1926–1928 гг.).

38. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 195. Справаздача польскай паліцыі аб дзейнасці БСРГ у Польшчы ў 1926 г.

39. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 197. Наказ Галоўнай рады Цэнтрасаюза кандыдадам у паслы ў сейм і сенат (27.09.1930 г.).

40. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 198. Дакументы ЦБПК у Вільні (1930 г.).

41. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 202. Праграма БНА (1936 г.).

42. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 215. Праект канстытуцыйнага статута Галіцка-Валынскай зямлі … (1938–1939 гг.).

43. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 235. Дакументы Л. Вітан-Дубейкаўскага.

44. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 236. Дакументы Л. Вітан-Дубейкаўскага.

45. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 241. Нататкі, нарысы і даклады К. Дуж-Душэўскага аб беларускім нацыялістычным руху … (1918–1930, 1935 гг.).

46. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 271. Луцкевіч А. Нарадавольцы-беларусы і іх орган “Гоман” (выступленне, 1935 г.).

47. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 280. Станкевіч, А. Беларусы як нацыянальная меншасць у Польшчы (даклад; варыянты) (1935–1936 гг.).

48. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 282. Дакументы А. Цвікевіча (перапіска, інтэрв’ю) 1919–1925 гг.

49. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 302. Праграма выставы жывапісу, графічных і скульптурных прац артыстаў у г. Вільня (1933 г.).

50. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 309. Ліст украінскіх паслоў і сенатараў варшаўскаму мітрапаліту Дыянісію … (11 чэрвеня 1924 г.).

51. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 314. Вопісы № 1, 2 калекцыі дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея імя І. Луцкевіча (1935–1942 гг.).

52. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 315. Унутраны вопіс калекцыі дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея імя І. Луцкевіча (1935–1942 гг.).

53. БДАМЛіМ. – Фонд 55. – Воп. 1. – Спр. 322. Рукапісы Ф.І. Стацкевіча. З мінуўшчыны беларускага руху : успаміны [1937 г.].

54. БДАМЛіМ. – Фонд 66. – Воп. 1. – Спр. 1034. Артыкулы аб літаратурным руху на Беларусі, творчасці асобных пісьменнікаў.

55. БДАМЛіМ. – Фонд 81. – Воп. 1. – Спр. 23. Пастановы СНК і Наркамасветы СССР і БССР аб аўтарскім праве, матэрыялы пасяджэнняў.

56. БДАМЛіМ. – Фонд 293. – Воп. 1. – Спр. 331. Шутовіч Я. На вышынях мастацтва (1971 г.).

57. БДАМЛіМ. – Фонд 293. – Воп. 1. – Спр. 340. Дзень беларускай культуры : нататка пра канцэрт М.І. Забэйды (1937 г.).

58. БДАМЛіМ. – Фонд 293. – Воп. 1. – Спр. 341. Нататкі пра гастрольныя канцэрты М.І. Забэйды (1938–1939 гг.).

59. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі. – Фонд рукапісаў. – КП-8604/18. Ліст ахвярадаўцаў на будаўніцтва мячэці ў Некрашунцах (1926 г.).

60. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі. – Фонд рукапісаў. – КП-8604/42. Пратаколы пасяджэнняў управы мусульманскай абшчыны ў Некрашунцах.

61. Беларускі каляндар на 1927 г. – Вільня : Друк., б. г. – 110 с.

62. Беларускі каляндар на 1929 г. – Вільня : Беларус. друк. імя Ф. Скарыны, б. г. – 223 с.

63. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя / уклад. Ю. Гарбінскі. – Мінск-Мюнхен : Беларускі кнігазбор, 1999. – 752 с.

64. Бергман, А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча : гіст.жыццяпіс / А. Бергман. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 192 с.

65. Бергман, А. Сымон Рак-Міхайлоўскі / А. Бергман // Беларускі каляндар на 1980 г. – Беласток : ГПГКТ, 1980. – С. 126–133.

66. Бітэль, П. Вішнева і вішнеўцы : краязнаўчы нарыс / П. Бітэль // Куфэрак Віленшчыны. – № 2 (2). – Маладзечна, 2000. – С. 68–86.

67. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР : документы и материалы. – Т. 1 : 1921–1929 гг. – Минск : Госиздат БССР, 1962. – 620 с.

68. Броўкін, Я. Эканоміка Польшчы ў 1921–1929 гг. / Я. Броўкін // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 3. – С. 25–31.

69. Будова народного дому в Бересті // Селянський шлях. – 1927. – 7 травня.

70. Быхаўцаў, М. Георгій Пех – заснавальнік музея ў Ваўкавыску / М. Быхаўцаў // Местная газета. – 2002. – 7 февраля. – С. 4.

71. В. К. Клецкая беларуская гімназія / В. К. // Віці. – 1957. – № 1 (10). – С. 13–14.

72. В.М. Шукаюць аблічча / В. Майстровіч (Р. Шырма) // Наша воля. – 1936. – 20 студзеня.

73. Вабішчэвіч, А.М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.

74. Вабищевич, А. Усадьба Радзивиллов в Маньковичах / А. Вабищевич // Radziwiłłowe. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne / red. K. Stępnik. – Lublin : Wydawnictwo UMCS, 2003. – S. 455–463.

75. Валахановіч, А.І. Споведзь у надзеі застацца жывым : аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча / А.І. Валахановіч, У.М. Міхнюк; рэд. А.С. Ліс. – Мінск : БелНДІДАД, 1999. – 200 с.

76. Вашкевіч, А. Галасы з мінулага стагоддзя (перапіска заходнебеларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў з Пятром Сяўруком) / А. Вашкевіч // Białoruskie zeszyty historyczne. – Białystok : BTH, 2007. – № 28. – S. 203–222.

77. Вашкевіч, А. Грошы для партыі. Фінансаванне партыйнай дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (1921–1939 гг.) / А. Вашкевіч // Białoruskie zeszyty historyczne. – Białystok : BTH, 2007. – № 28. – S. 69–81.

78. Вашкевіч, А. Супрацоўніцтва паміж КПЗБ і БХД (восень 1935 – восень 1936 гг.) / А. Вашкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 10. – С. 19–24.

79. Ващукувна-Каменецка, Д. Брест – город незабываемый / Д. Ващукувна-Каменецка. – Брест : Изд-во С. Лаврова, 1999. – 284 с.

80. Відкриття філії "Рідної хати" // Наше життя. – 1923. – 9 грудня.

81. Винниченко, І. Українці Берестейщини, Підляшшя й Холмщини в першій половині ХХ століття : хроніка подій. – Київ : ВАТ "Книжкова друкарня наукової книги", 1997. – 288 с.

82. Воззвание // Воскресное чтение. – 1931. – 22 марта. – С. 121.

83. Воскресное чтение. – 1925. – № 11. – 15 марта.

84. Гадавік Беларускага навуковага таварыства. – Кн. 1. – Вільня : Друкарня Я. Левіна, 1933. – 212 с.

85. Гайба, М. Наваградак і ягоныя жыхары ў польскай краязнаўчай літаратуры першай трэці 20 ст. / М. Гайба // Гістарычны альманах. – Гродна : Беларускае гістарычнае таварыства, 1998. – С. 91–94.

86. Гарашкевіч, Р. Столінскі павет : гістарычныя нататкі / Р. Гарашкевіч; прадмова і пераклад з польск. мовы А. Вабішчэвіча // Спадчына. – 2002. – № 2/3. – С. 159–173.

87. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі ; уклад. і падрыхт. тэксту Т.С. Голуб. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 479 с.

88. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. – Ч. 2 : люты 1917 г. – 1997 г. : вучэб. дапам. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 464 с.

89. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : М. Касцюк (гал рэд.) [і інш.].– Мінск : Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.

90. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 4 : 1917–1941 гг. / рэдкал.: С.В. Марцэлеў [і інш.]. – 1990. – 352 с.

91. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983–1987. – Т. 2. –1985. – 607 с.

92. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 1999–2003. – Т. 2. –1999. – 903 с.

93. Глагоўска, Х. Дзейнасць Лукаша Дзекуць-Малея сярод баптыстаў на Палессі / Х. Глагоўска // Загароддзе-2 : матэрыялы навук.-краязн. канф. "Палессе – скрыжаванне культур і часу", Пінск, 25–27 верасня 1999 г. / уклад. і агульн. рэд. Ф.Д. Клімчука, В.А. Лабачэўскай. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – С. 32–35.

94. Глагоўская, А. Кар'еру пачынаў у Цеханаўцы / А. Глагоўская // Спадчына. – 1994. – № 6. – С. 13–24.

95. Говін, С.В. Друк Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / С.В. Говін.– Мінск : Выд-ва БДУ, 1974. – 95 с.

96. Голад, Л. Нацыянальная мова ў праваслаўнай царкве / Л. Голад // Праваслаўная Беларусь. – 1927. – № 1. – С. 8.

97. Грыбоўскі, Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фармаваннях 1918–1945 : манаграфія / Ю. Грыбоўскі. – СПб. : Неўскі Прасцяг, 2006. – 832 с.

98. Грынкевіч, С. Аб тэатры / С. Грынкевіч. – Вільня : Выдавецтва “Беларускай крыніцы”, 1927. – 54 с.

99. Грынкевіч, С. Асьвета : аб народным універсітэце і іншых способах асьветнае працы / С. Грынкевіч. – Вільня : Друк. імя Ф. Скарыны, 1936. – 55 с.

100. Грынкевіч, С. У братоў украінцаў / С. Грынкевіч. – Вільня : Выданне бел. кнігарні “Пагоня”, 1937. – 88 с.

101. Грэсь, С.М. Аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / С.М. Грэсь ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2007. – 21 с.

102. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 176 с.

103. Да акруговых сходаў // Летапіс ТБШ. – 1933. – № 5-6. – С. 73–74.

104. Да арганізацыі! // Chryścijanskaja Dumka. – 1932. – № 2. – С. 1–2.

105. Даніловіч, В.В. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне” ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) / В.В. Даніловіч. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 159 с.

106. Дварчанін, І. Аб годзе нараджэння Ф. Скарыны / І. Дварчанін // Родныя гоні. – 1927. – № 1. – С. 30–36.

107. Дзень беларускай культуры ў Вільні // Калоссе. – 1937. – № 1 (10). – С. 53–57.

108. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 489. Цыркуляры міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы … (13.07.1926 г. – 28.11.1930 г.).

109. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 1017. Справаздача палескага ваяводы аб стане ваяводства са звесткамі аб дзейнасці органаў самакіравання (люты 1939 г.).

110. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 1067, 1068. Справаздачы Пружанскага павятовага староства аб грамадска-палітычным руху.

111. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 2516. Звесткі аб колькасці, нацыянальным складзе і маёмасным стане насельніцтва Палесся (1924–1929 гг.).

112. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 2528. Статыстычныя звесткі аб нацыянальным складзе насельніцтва Палескага ваяводства ў 1928 г.

113. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 2. – Спр. 2019. Даклад Т. Каменабродскага аб стане рэлігіі на тэрыторыі Палескага ваяводства (1939 г.).

114. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 2. – Спр. 2087. Статыстычныя звесткі аб каталіцкіх храмах … (1930 г.).

115. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 2. – Спр. 2203. Спісы праваслаўных свяшчэннікаў са звесткамі аб землеўладанні і даходах царкоўных прыходаў … (1925–1927 гг.).

116. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 2608. Цыркуляры і распараджэнні міністэрства сельскай гаспадаркі … (2.05.1935 г. – 24.08.1939 г.).

117. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 107. Указанні палескага ваяводы аб устанаўленні паліцыяй нелегальнага надзору … (1931 г.).

118. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8 – Спр. 248. Цыркуляры і распараджэнні МУС, рашэнні палескага ваяводы, заявы грамадзян … (12.07.1926 г. – 22.12.1931 г.).

119. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 254. Цыркуляр МУС аб выдачы дазволаў на адкрыццё кінатэатраў … (16.11.1931 г. – 24.10.1933 г.).

120. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 258. Рашэнні МУС, палескага ваяводы, заявы грамадзян і перапіска з павятовымі старастамі … (12.02. – 8.12.1930 г.).

121. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 286. Рашэнні палескага ваяводы і перапіска з пружанскім павятовым старастам … (1932 г.).

122. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 292. Рашэнне грамадска-палітычнага аддзела Валынскага ваяводскага ўпраўлення … (1936 г.).

123. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 297. План на 1938 г. і справаздачы аб дзейнасці тэатра імя Ю. Нямцэвіча ў Брэсце ў 1938 г.

124. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спра. 298. Праграма дзейнасці вандроўнага аматарскага тэатра “Przodownica” і перапіска … (1935 г.).

125. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 299. Статыстычныя звесткі аб колькасці бібліятэк на тэрыторыі Палескага ваяводства, іх спісы (31.10.1933 г. – 15.12.1934 г.).

126. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 301. Данясенні павятовых старастаў аб дзейнасці перадавых украінскіх тэатраў … (5.11.1928 г. – 11.11.1929 г.).

127. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 335. Спісы фільмаў, якія дэманстраваліся ў кінатэатрах Палескага ваяводства ў 1935 г.

128. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 336. Спісы фільмаў, якія дэманстраваліся ў кінатэатрах Палескага ваяводства ў 1936 г.

129. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 338. Спісы фільмаў, якія дэманстраваліся ў кінатэатрах Палескага ваяводства ў 1937 г.

130. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 794. Цыркуляры МУС, палескага і навагрудскага ваявод, перапіска з павятовымі старастамі … (1927–1934 гг.).

131. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 939. Справа аб выданні П. Хінічам у Пінску рускай газеты “Под небом Полесья” (1931–1932 гг.).

132. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 948. Спісы часопісаў і газет … (1937 г.).

133. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1087. Цыркуляры палескага ваяводы, указанні МУС аб прынцыпах нацыянальнай палітыкі … (1925–1927 гг.).

134. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1089. Указанні палескага ваяводы органам самакіравання аб прынцыпах правядзення імі нацыянальнай палітыкі …(1938 г.).

135. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1091. Пратаколы канферэнцыі ваявод і камандзіраў карпусоў па пытанню нацыянальнай палітыкі … (1932–1938 гг.).

136. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1092. Агляд нацыянальнага складу, эканамічнага і грам.-паліт. жыцця насельніцтва Віленскага ваяводства (1939 г.)

137. ДАБВ. – Фолнд 1. – Воп. 8. – Спр. 1104. Статыст. звесткі, інфармацыя аб нацыян. складзе і колькасці насельніцтва Палескага ваяводства (1921–1928 гг.).

138. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1652. Цыркуляры МУС і Палескага ваяводскага ўпраўлення аб дзейнасці навуковай камісіі … (1936 г.).

139. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1654. Указанні палескага ваяводы … (люты 1933 г.).

140. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1656. Прапановы палескага ваяводы аб мерах павышэння адукацыйнага ўзроўню насельніцтва … (1933–1938 гг.).

141. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1657. Пратакол пасяджэння навуковай камісіі па вывучэнню ўсходніх зямель Польшчы ад 8.10.1934 г.

142. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1663. Справаздачы навуковай камісіі па вывучэнню ўсходніх зямель аб праведзенай навукова-даследчыцкай працы ў 1935 г.

143. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1664. Статыстычныя звесткі аб колькасці школ нацыян. меншасцей Палескага ваяводства і іх спісы (1927–1930 гг.).

144. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1669. Перапіска з міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы … (25.05.1934 г. – 21.10.1936 г.).

145. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 11. Статут, пратакол сходу … управы таварыства добраахвотнай пажарнай аховы ў Камень-Кашырску (1924–1933 гг.).

146. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 45. Даклад, справаздачы і звесткі Палескага ваяводскага ўпраўлення аб украінск. палітычным руху … (1918–1934 гг.).

147. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 46. Месячныя справаздачы палескага ваяводы аб беларускім і ўкраінскім палітычным руху … (1933–1934 гг.).

148. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 47. Справаздачы палескага ваяводы, павятовых старостваў аб беларускім грамадска-палітычным руху (1922–1933 гг.).

149. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 71. Статуты саюзаў асаднікаў, рамеснікаў, настаўнікаў грамадскіх школ …(1931–1932 гг.).

150. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 112. Паведамленне Палескага ваяводства ўпраўлення аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў маі–жніўні 1925 г.

151. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 114. Паведамленне … аб грамадска-палітычнай сітуацыі і дзейнасці партый, грамадскіх арганізацый (1925 г.).

152. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 186. Статут і перапіска з павятовымі стараствамі аб рэгістрацыі польскіх грамадскіх арганізацый (1926–1934 гг.).

153. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 238. Статут, справаздача аб дзейнасці і звесткі аб легалізацыі таварыства царкоўных спеваў у Брэсце (1927–1936 гг.).

154. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 240. Статут, справаздачы аб дзейнасці, звесткі аб складзе і перапіска з пружанскім павятовым старастай … (1927–1935 гг.).

155. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 243. Статут, перапіска з пружанскім павятовым старастай … (21.06.1927 г. – 21.03.1934 г.).

156. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 297. Пратакол нарады старастаў Палескага ваяводства па пытаннях грамадскай бяспекі, нацыянальнай палітыкі.

157. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 326. Рэестр легальных грамадскіх арганізацый Палескага ваяводства (21.12.1927 г. – 24.08.1934 г.).

158. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 336. Рэестр легальных грамадскіх арганізацый Палескага ваяводства (21.12.1927 г. – 24.08.1934 г.).

159. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 375. Статут Таварыства падтрымкі народных промыслаў на Палессі (5.03.1928 г.).

160. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 442. Справаздачы яўрэйскіх легальных грамадскіх арганізацый аб дзейнасці ў 1928–1930 гг.

161. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 616. Квартальныя справаздачы камандавання IX КАП аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў 1929 г.

162. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 866. Справа аб ліквідацыі павятовага камітэта КПЗБ у Трылісках Драгічынскага павета (1929 г.).

163. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 879. Справа аб выдачы яўрэйскаму таварыству "Тарбут" дазволу на збор ахвяраванняў … (1929–1931 гг.).

164. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1007. Агляд стану і дзейнасці яўрэйскіх палітычных і грамадскіх арганізацый (1.10.1930 г.).

165. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1182. Справаздачы і паведамленні … аб рускім палітычным руху на тэрыторыі Польшчы ў 1930–1934 гг.

166. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1183. Справаздачы палескага ваяводы аб стане і дзейнасці яўрэйскіх палітычных партый і грамадскіх арганізацый (1930 г.).

167. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1306. Паведамленні палескага, беластоцкага, віленскага ваяводаў і данясенні павятовых старастаў (1930–1937 гг.).

168. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1334. Паведамленні аддзела грамадскай бяспекі Беластоцкага ваяводскага ўпраўлення … (5–17.07.1930 г.).

169. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1395. Аб дзейнасці гурткоў ТБШ у Палескім ваяводстве (1930 г.).

170. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1442. Статуты таварыства "Польска мацеж школьна" … (1931–1937 гг.).

171. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1590. Месячныя справаздачы МУС і квартальная справаздача IX КАП … (1931 г.).

172. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1836. Паведамленне грамадска-палітычнага аддзела Віленскага ваяводскага ўпраўлення … (1936 г.).

173. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 1853. Данясенні павятовых старастаў і перапіска … (8.07.1931 г. – 14.10.1932 г.).

174. ДАБВ. – Фонд 1. – Оп. 9. – Спр. 1854. Данясенні павятовых старастаў Палескага ваяводства аб дзейнасці рускіх палітычных арганізацый (1931–1932 гг.).

175. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2176. Звесткі аб стварэнні, структуры, дзейнасці і спіс польскіх грамадскіх арганізацый на тэрыторыі Польшчы (1932 г.).

176. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2253. Мемарандум палескага ваяводы … (1932 г.).

177. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2408. Месячныя справаздачы палескага ваяводы … (студзень-чэрвень 1933 г.).

178. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2428. Месячныя і квартальныя справаздачы віленскага ваяводы …(студзень-май 1933 г.).

179. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2429. Месячныя і квартальныя справаздачы віленскага ваяводы … (чэрвень-снежань 1933 г.).

180. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2438. Месячныя і квартальныя справаздачы навагрудскага ваяводы … (студзень-май 1933 г.).

181. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2596. Паведамленні грамадска-палітычнага аддзела Палескага ваяводства ўпраўлення … (3.04.1933 г. – 22.07.1938 г.).

182. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 62. Квартальныя справаздачы палескага ваяводы … (1934 г.).

183. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 63. Квартальныя і месячныя справаздачы віленскага ваяводы … (1934 г.).

184. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 132. Справаздачы і паведамленні аддзелаў Палескага і Валынскага ваяводскіх упраўленняў … (1934–1936 гг.).

185. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 139. Справаздачы павятовых старастаў, паведамленні МУС … (1934 г.).

186. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 606. Паўгадавыя справаздачы палескага ваяводы і павятовых старастаў Палескага ваяводства … (1935–1936 гг.).

187. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 627. Квартальныя і месячныя справаздачы навагрудскага ваяводы … (студзень-снежань 1935 г.).

188. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 712. Звесткі аб метадах араганізацыі і дзейнасці гурткоў Саюза асаднікаў у 1935–1936 гг.

189. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 832. Прапановы IX КАП … (1936 г.).

190. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 909. Даклад … аб размяшчэнні і грамадска-палітычным жыцці рускіх на Палессі (1936 г.).

191. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 952. Месячныя справаздачы віленскага, валынскага і навагрудскага ваяводаў … (ліпень-жнівень 1936 г.).

192. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1028. Паведамленні урадавага камітэта г. Варшавы … (11.11.1936 г. – 24.06.1938 г.).
193. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1086. Справа аб заснаванні і дзейнасці Саюза грамадскіх арганізацый (1936 г.).
194. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1160. Пратакол агульнага сходу членаў гуртка таварыства “Польска мацеж школьна” у Брэсце … (1937–1938 гг.).
195. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1174. Паўгадавыя справаздачы палескага, беластоцкага, люблінскага і іншых ваяводаў … (1937 г.).
196. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1176. Паўгадавыя справаздачы віленскага ваяводы (1937–1938 гг.).
197. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1180. Паўгадавыя справаздачы навагрудскага ваяводы (1937–1938 гг.).
198. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1243. Месячныя справаздачы навагрудскага ваяводы … (ліпень-жнівень 1937 г.).
199. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1281. Месячныя справаздачы павятовых старастаў Палескага ваяводства … (2.10.–21.12.1937 г.).
200. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1393. Распараджэнне МУС аб рэгістрацыі грамадскіх арганізацый … (14.12.1938 г.).
201. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1427. Рэфераты аб умацаванні сярэдняга саслоўя і ролі інтэлігенцыі … (20.06.1938 г.).
202. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1436. Месячныя справаздачы палескага ваяводы … (1938 г.).
203. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1445. Месячныя справаздачы навагрудскага ваяводы … (студзень-май, ліпень, верасень-лістапад 1938 г.).
204. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1507. Паведамленне МУС … аб украінскім нацыяналістычным руху на Палессі (30.07.1938 г. – 26.01.1939 г.).
205. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1517. Паведамленне … аб дзейнасці ўкраінскай арганізацыі “Рідна хата” (21.01.1938 г. – 1.01.1939 г.).
206. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1518. Паведамленне … аб украінскім нацыяналістычным руху на Палессі (1938 г.).
207. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1574. Рэферат беластоцкага ваяводы аб праблемах умацавання становішча … (30.01.1939 г.).
208. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1721. Звесткі аб стане і дзейнасці аддзелаў Саюза асаднікаў у Палескім ваяводстве.
209. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2088. Данясенні палескага ваяводы аб здарэннях у Палескім ваяводстве ў ліпені 1925 г.
210. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2305. Справаздачы палескага і беластоцкага ваявод … (27.07.1933 г. – 10.04.1939 г.).
211. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2316. Звесткі аб мовах, якімі карыстаецца праваслаўнае духавенства (5.01.1933 г. – 10.02.1934 г.).
212. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2329. Інфармацыя Палескага ваяводскага ўпраўлення.
213. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2331. Інфармацыя, характарыстыкі і перапіска … аб службе праваслаўнага духавенства (28.06.1927 г. – 4.04.1939 г.).
214. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2355. Справа аб выкарыстанні польскай мовы ў праваслаўных царкоўных канцылярыях (1930–1933 гг.).
215. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2358. Справа аб правядзенні ў праваслаўнай царкве богаслужэння на польскай мове (13.06.1933 г. – 18.05.1938 г.).

216. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2835. Характарыстыка палітыка-рэлігійнага становішча на тэрыторыі Палескага ваяводства (14.01.1939 г.).

217. ДАБВ. – Фонд 2.– Воп. 1. – Спр. 119. Цыркуляр Палескага ваяводскага ўпраўлення аб дзейнасці палітычнай дэфензівы … (27.06.1921 г. – 30.04.1926 г.).

218. ДАБВ. – Фонд 2. – Воп. 1. – Спр. 123. Статуты, справаздачы і перапіска … аб дзейнасці ўкраінскага таварыства "Просвіта" у Брэсце (1921–1929 гг.).

219. ДАБВ. – Фонд 2. – Воп. 1. – Спр. 385. Заявы і паведамленні грамадскіх арганізацый аб правядзенні лекцый і інш. (27.05.1922 г. – 29.12.1924 г.).

220. ДАБВ. – Фонд 2. – Воп. 1. – Спр. 928. Справаздачы Палескага ваяводскага ўпраўлення і Брэсцкага павятовага старасства … (1925 г.).

221. ДАБВ. – Фонд 2. – Воп. 1. – Спр. 1679. Статут, пратаколы сходаў … украінскага таварыства "Просвіта" у Брэсце (11.07.1928 г. – 15.03. 1930 г.).

222. ДАБВ. – Фонд 2. – Воп. 2. – Спр. 917. Паведамленні Брэсцкага павятовага старасства аб яўрэйскім палітычным руху … (4.05.1933 г. – 9.11.1934 г.).

223. ДАБВ. – Фонд 3. – Воп.1. – Спр. 2. Пастановы, распараджэнні, цыркуляры і аб'явы кобрынскага павятовага старасты … (6.01.–21.12.1921 г.).

224. ДАБВ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 87. Месячныя справаздачы аб грамадска-палітычнай сітуацыі на тэрыторыі Кобрынскага павета (1933 г.).

225. ДАБВ. – Фонд 3. – Воп. 3. – Спр. 6. Справаздачы кобрынскай павятовай камендатуры дзяржпаліцыі аб палітычнай сітуацыі ў павеце (1932 г.).

226. ДАБВ. – Фонд 3. – Воп. 3. – Спр. 11. Справаздачы палескага ваяводы аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў ваяводстве (1933 г.).

227. ДАБВ. – Фонд 6. – Воп. 1. – Спр. 2214. Справаздача IX КАП (1936 г.).

228. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 1. – Спр. 134. Рашэнні папячыцельства Брэсцкай школьнай акругі і перапіска … аб адкрыцці музычнай школы ў Брэсце.

229. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 1. – Спр. 1351. Распараджэнні і паведамленні павятовых школьных инспекцый … (15.01.1938 г. –24.03.1939 г.).

230. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 623. Статут прыватнай рэлігійнай школы для хлопцаў агульнага навучання "Хорэў" у Пінску … (1933–1934 гг.).

231. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 652. Справаздачы дырэктара яўрэйскай талмуд-торы ў Пінску … (1931/1932 і 1932/1933 навуч. гг.).

232. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 695. Справа аб дазволе рабіну Давіду–Берка адкрыць 2-класную яўрэйскую рэлігійную школу ў Пінску (1929–1932 гг.).

233. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 703. Справа аб дазволе для Пінскага аддзела таварыства яўрэяў-артадоксаў на ўтрыманне рэлігійнай школы (1930 г.).

234. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 766. Спісы прыватных школ агульнага навучання Брэсцкай школьнай акругі (1923–1936 гг.).

235. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 768. Спісы прыватных школ агульнага навучання Палескай школьнай акругі (1927–1930 гг.).

236. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 771. Спісы прыватных школ агульнага навучання Брэсцкай школьнай акругі ў 1931/1932 навуч. годзе.

237. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 855. Паведамленні … аб навучанні дзяцей у школах агульнага навучання на роднай мове (1932 г.).

238. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп 2. – Спр. 1314. Заява жыхароў Нясвіжскага павета Навагрудскага ваяводства аб адкрыцці рускай гімназіі (5.07.1921 г.).

239. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 2. – Спр. 2124. Справаздачы сярэдніх навучальных устаноў аб дзейнасці краязнаўчых гурткоў (1933 г.).

240. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 3. – Спр. 1298. Спіс музычных школ (1938 г.).

241. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 3. – Спр. 1310. Перапіска … аб адкрыцці харавой і тэатральнай секцыі … (1936 г.).

242. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп 5. – Спр. 6679. К. Разеновіч (1932–1935 гг.).

243. ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 8. – Спр. 234. Справаздача аб дзейнасці Брэсцкай прыватнай гімназіі агульнага навучання РДТ у 1932/1933 навуч. годзе.

244. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 11. Загады, распараджэнні міністэрства вайсковых спраў, IX КАП … (1920–1922 гг.).

245. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 17. Справаздачы і паведамленні IX КАП аб грамадска-палітычным руху … (1921–1922 гг.).

246. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 364. Справаздачы Палескага ваяводскага ўпраўлення аб грамадска-палітычным руху (чэрвень-верасень 1923 г.).

247. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 365. Справаздачы і данясенні Палескага ваяводскага ўпраўлення … (кастрычнік-лістапад 1923 г.).

248. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 762. Справаздачы аб правядзенні Дня нараджэння Ю. Пілсудскага на тэрыторыі IX КАП (30.04.1923 г.).

249. ДАБВ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 932. Справаздача IX КАП аб грамадска-палітычным руху на тэрыторыі корпуса ў IV квартале 1928 г.

